ПАМЯТЬ

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ДА ЧЫТАЧА

Шаноўны чытач! Чарговая кніга серыі гісторыка-дакументальных хронік Памяці, якія выдаюцца ў Рэспубліцы Беларусь, прысвечана гораду Мазыру і Мазырскаму раёну — іх далёкаму і нядаўняму мінуламу. Хочацца верыць, што і вам перадасца тое глыбокае хваляванне, якое зведалі шматлікія аўтары кнігі: археолагі, гісторыкі, краязнаўцы, журналісты... Бо сапраўды — якое невычэрпна багатае мінулае ў гэтай шматпакутнай і гераічнай надпрыпяцкай зямлі, як шчодра паліта яна крывёю і потам нашых продкаў! Безліч разоў падымалася Мазыршчына на змаганне з варожым нашэсцем, і цяпер ужо ніхто не зможа назваць пайменна ўсіх, хто ў даўнія часы бараніў родную зямлю ад лютай навалы. А калі час не такі даўні? Многія старонкі ў кнізе займае бясконцы спіс воінаў, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў, што загінулі на Мазыршчыне пад час самай страшнай у гісторыі чалавецтва вайны — другой сусветнай, якая для нашага народа стала Вялікай Айчыннай. Гэты, як і другі спіс — тых нашых землякоў, хто прыняў геройскую смерць або прапаў без вестак далёка ад роднага дому, — самы запамінальны ўрок патрыятызму, урок усім нам, як трэба любіць, шанаваць і берагчы ў грозны час сваю Бацькаўшчыну.

Напэўна, спіс герояў і ахвяр вайны ў кнізе яшчэ не поўны — пошукі будуць працягвацца; рана падводзіць рысу і пад трагічным спісам ахвяр масавага палітычнага тэрору 30-х гадоў, які і на Мазыршчыне пакінуў свой жудасны след; гэтак жа і ў самім змесце кнігі нешта запатрабуе ўдакладнення, — што ж, «прыйдзе новы — а мудры — гісторык», — наступныя выданні кнігі будуць больш поўныя і дасканалыя. Пакуль жа хочацца спадзявацца, што і ў цяперашнім яе выглядзе кніга Памяці дапаможа вам, шаноўны чытач, прасякнуцца пачуццём глыбокай удзячнасці мінулым пакаленням, бо, нягледзячы на іхнія часам трагічныя заблуджэнні і памылкі, якія ў многім абумовілі і драматызм сённяшняга нашага жыцця, яны здзейснілі для сваіх нашчадкаў галоўнае — зберагліі і перадалі нам у спадчыну самае дарагое на свеце — цудоўную, непаўторна прыгожую палескую зямлю, імя якой Мазыршчына.

Мозырская городская ЦБС

2 Зак. 914



МАЗЫР — горад абласнога падпарадкавання, цэнтр Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. Размешчаны на маляўнічай узгорыстай мясцовасці ў межах Мазырскай грады. За 133 км на паўднёвы захад ад Гомеля, 5 км ад чыгуначнай станцыі Мазыр. Буйнейшы ў Беларусі порт (Пхоў) на р. Прыпяць. Насельніцтва на 1.1.1996 г.— 107,7 тыс.

З 1924 г.— цэнтр раёна (у 1926—1927 гг.— горад у Слабадскім раёне), у 1924—1930 гг. і 1935—1938 гг.— цэнтр Мазырскай акругі, у 1938—1954 гг.— цэнтр Палескай вобласці. З 1954 г. у Гомельскай вобласці.

Плошча — 3674 га. У межах горада працякае рака Прыпяць. Архітэктурна-планіровачная сістэма горада абумоўлена складаным рэльефам (р. Прыпяць, мноства яроў з розніцай адзнак вышыні 25—30 м). Галоўная вуліца — Ленінская, на якой размешчаны цэнтральны пляц. Адсюль пачынаецца паркавая зона. Новы раён жыллёвай забудовы — верхняе плато, якое прылягае да Оўручскай шашы.

Прамысловасць: машынабудаўнічая і металаапрацоўчая, дрэваапрацоўчая, лёгкая, харчовая, нафтаперапрацоўчая і іншыя. Буйнейшыя прадпрыемствы: нафтаперапрацоўчы завод, завод меліярацыйных машын, «Мазыркабель», завод кармавых дражджэй, «Мазырсельмаш» і аўтарамонтны завод, вытворчае дрэваапрацоўчае і мэблевае аб'яднанні, трыкатажная і мастацкіх вырабаў, швейная фабрыкі, малочны, піваварны і хлебапякарны заводы, леспрамгас, солевыварачны камбінат. Непадалёку ад Мазыра адкрыта вялікае радовішча каменнай солі, праходзіць нафтаправод «Дружба».

Мазыр — гэта і культурны цэнтр Палесся. Да паслуг жыхароў Мазыршчыны драматычны тэатр імя Івана Мележа (раней эксперыментальны тэатр «Верасень», а яшчэ раней народны тэатр), 12 палацаў, дамоў культуры і клубаў, больш за 50 бібліятэк, тры кінатэатры, педінстытут, палітэхнікум, музычнае, медыцынскае і 4 тэхнічныя вучылішчы, 4 музычныя школы, дзіцячая мастацкая школа; 11 калектываў мастацкай самадзейнасці маюць званне «народны». Да паслуг насельніцтва Мазырскі краязнаўчы музей, музей прыкладнога мастацтва, гарадская выставачная зала.

Каля 9 тысяч спецыялістаў з вышэйшай і 12,5 тысяч з сярэдняй адукацыяй, 90 кандыдатаў і дактароў навук працуюць на прадпрыемствах, у навучальных і іншых установах горада.

У 15 сярэдніх школах і гімназіі, дзіцячых спартыўных школах працуюць звыш 2000 настаўнікаў, у 35 дзіцячых садках 6300 выхаванцаў.

На варце здароўя працоўных Мазыра каля 400 урачоў, звыш 1200 сярэдніх медыцынскіх работнікаў, якія працуюць у бальнічных установах, дзвюх паліклініках, 10 аптэках.

Выдаецца аб'яднаная газета «Жыццё Палесся».

МАЗЫРСКІ РАЁН размешчаны на паўднёвым захадзе Гомельскай вобласці. Утвораны 17.7.1924 г. Плошча 1,6 тыс. кв. км. Горад абласнога падпарадкавання Мазыр — цэнтр раёна. 93 сельскія населеныя пункты, 10 сельскіх Саветаў: Асавецкі, Барбароўскі, Каменкаўскі, Козенскі, Крынічанскі, Махнавіцкі, Міхалкаўскі, Прудкоўскі, Скрыгалаўскі, Слабадскі. Насельніцтва на 1.1.1996 г.— 22 600 чалавек.

Паверхня раёна — узгорыста-раўнінная, на правабярэжжы ніжняй Прыпяці з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход больш як на 30 кіламетраў працягнулася Мазырская града шырынёй 3—10 км. 77 % тэрыторыі знаходзіцца вышэй 150 м над узроўнем мора (каля 20 % вышэй 170 м). Найвышэйшы пункт — 220 м на ўсходзе раёна (паміж Мазыром і в. Бабраняты).

Карысныя выкапні: Мазырскае радовішча каменнай солі: прамысловыя запасы каля 600 млн. т, перспектыўныя 24 млрд. т, 11 радовішчаў торфу з агульнымі запасамі 4,1 млн. т (найбольшае ў раёне в. Майсееўка), 11 радовішчаў пяску з агульнымі запасамі 30,1 млн. куб. м (найбольшыя Барыскавіцкае, Козенскае, Бярозаўскае, Васькаўскае), радовішчы глін і суглінкаў — Лешня, Махнавічы, Ляскі.

Сярэдняя тэмпература студзеня —6,4°, ліпеня + 18,8 °С. Ападкаў 600 мм за год. Вегетацыйны перыяд 199 сутак. Рэкі — Прыпяць з прытокамі Трэмля, Іпа, Ненач, Тур, Мытва, Скалодзінка; Чэрцень (прыток Славечны). Даўжыня меліярацыйнай сеткі 1,7 тыс. км. Глебы дзярнова-падзолістыя — 48,2 %, дзярнова-падзолістыя забалочаныя — 18 %, поймавыя — 22,4 %, тарфяна-балотныя — 7,2 %.

Сельгасугоддзі складаюць 44 708 га, або 27,8 % плошчы раёна, у т. л. ворыва 26 337 га (16,4 %), сенажаці і пашы 16 344 га (10,1 %). Асноўныя землекарыстальнікі — 13 калгасаў і 8 саўгасаў. Пад лесам 52,4 % плошчы, найбольшыя лясныя масівы на захадзе раёна. Пераважае хвоя, з лісцевых — бяроза, вольха, дуб. 18 % лясоў — штучныя насаджэнні.

Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгунка Калінкавічы — Оўруч, аўтамабільныя дарогі Мазыр — Оўруч, Мазыр — Нароўля, Мазыр — Лельчыцы, Мазыр — Петрыкаў. Суднаходства на Прыпяці.

У раёне 11 сярэдніх, 9 базавых, 6 пачатковых школ, у якіх у 1995—1996 гг. навучалася 3477 чалавек, працавала 487 настаўнікаў, 21 дашкольная дзіцячая ўстанова, дзе выхоўвалася 813 дзяцей. У вёсках раёна дзейнічаюць 33 масавыя бібліятэкі, 36 клубных устаноў, 22 кінаўстаноўкі, 3 музычныя школы, 4 бальніцы, 31 фельчарска-акушэрскі пункт, 5 амбулаторый і аптэк, 11 комплексных прыёмных пунктаў і вытворчых участкаў бытавога абслугоўвання насельніцтва, у в. Гурыны — філіял Беларускага дзяржаўнага мастацкага музея.

На тэрыторыі раёна 58 помнікаў, абеліскаў і мемарыяльных дошак па гісторыі і культуры раёна, больш за 30 помнікаў археалогіі, архітэктуры, прыроды і сядзібна-паркавага мастацтва.

Пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС для перасяленцаў з зоны жорсткага радыяцыйнага кантролю пабудавана 8 пасёлкаў.

На Мазыршчыне


ФРАГМЕНТ КАРТЫ МІНСКАЙ ГУБЕРНІ. КАНЕЦ XVII — пачатак XVIII ст. ст.
Коленовичи
Рудня
Гулевичи
Бесечка
Слинка
Костюковичи
Загораны
Петриковъ
Богранова
Скрыгалов
Изногорской
Туръ
Мозыръ
Прудокъ
Моосевка
Цасчерскис
Былавск
Лешня
Барисковичи
Сидельники
Слобода
Раенка
Слабовъ
Глиница
Стрельскъ
Юровичи
М. Зимовище
Юровичи
Осовецъ
Казимировка
Осовецъ
Василькова
Березовъ
Острожанка
Бабичъ
Пенка Чожъ
Бибики
Мелешковичи
р. Уборть
Березовка
Буйкавичи
Буховщина
Махалки
Дуброва
Кусчовица
р. Припять
Махновичи
М. Боковъ
Наровля
Ремезы
Ельскъ-Королин Чожъ
Пусъошка

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Пра што расказалі курганы

Пошукі першабытных помнікаў ва ўсходняй частцы беларускага Палесся ажыццяўляліся археолагамі-аматарамі і краязнаўцамі яшчэ ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзяў. Вынікам далейшых даследаванняў некалькіх пакаленняў археолагаў з'явілася знаходка больш як трох сотняў старажытных стаянак людзей, гарадзішчаў, пасяленняў, курганных груп, у тым ліку на Мазыршчыне — каля вёсак Акулінка, Баравікі, Барыскавічы, Глініца, Загорыны, Жахавічы, Касцюковічы, Лешня, Лубня, Лучажэвічы, Майсееўка, Махнавічы, Мерабель, Міхалкі, Надаткі, Скрыгалаў, Слабада, Стрэльск, Ясенец і інш.

Як адно са шматлікіх пасяленняў старажытнага чалавека на Мазыршчыне можна назваць выяўленае ў 1962 годзе пасяленне ранняга неаліту каля вёскі Загорыны. Яно знаходзіцца на паверхні надпойменнай тэрасы Прыпяці і падымаецца на схіл марэннага ўзвышша.

Умацаваныя паселішчы — гарадзішчы ўпершыню на тэрыторыі Беларусі з'явіліся ў раннім жалезным веку. Яны будаваліся на стромкіх берагах рэк, а таксама на невялікіх астраўках сярод балот. Як правіла, гарадзішчы ўмацоўваліся глыбокімі равамі і высокімі валамі. Людзі звычайна жылі на ўнутранай пляцоўцы, дзе трымалі жывёлу і размяшчалі гаспадарчыя пабудовы. Балотныя гарадзішчы часта выконвалі функцыю часовага прытулку, дзе людзі хаваліся ў час небяспекі. Лічыцца, што такія помнікі пакінуты плямёнамі Мілаградскай культуры, якая існавала на тэрыторыі Беларусі ў VII — III стст. да н. э. Адно з такіх гарадзішчаў — Ясенецкае.

У выніку археалагічных раскопак на першым Ясенецкім гарадзішчы знойдзена шмат каштоўных рэчаў: некалькі шпілек, фрагмент бранзалета, крыжападобны гузік, арнаментаванае прасла. Найбольш цікавая знаходка — бронзавы наканечнік стралы скіфскага тыпу, які датуецца VII — VI стст. да н. э. Знойдзены таксама фрагменты ляпной керамікі. Усё гэта сведчыць аб інтэнсіўнай дзейнасці на гарадзішчы. Прыкладна каля дзвюх з паловай тысяч гадоў назад людзі плавілі тут бронзу, займаліся ткацтвам, мелі кантакты са скіфскімі плямёнамі.

Другое Ясенецкае гарадзішча ўдвая большае за першае. Але тут выяўлена ўсяго некалькі фрагментаў ляпнога посуду. Магчыма, гэта гарадзішча выконвала функцыю толькі сховішча, дзе людзі ратаваліся ў час небяспекі.

Натуральна, што асаблівую цікавасць у нас выклікаюць тыя археалагічныя помнікі, па якіх можна меркаваць пра ўзрост Мазыра і пра першапачатковае месца яго ўзнікнення.

На тэрыторыі сучаснага Мазыра ёсць некалькі месцаў, дзе каля 2—2,5 тысяч год назад жылі людзі. Адным з іх з'яўляецца гарадзішча па вуліцы

Археалагічныя знаходкі бронзавага веку (3—2-е тысячагоддзе да н. э.). Каменны таўкач для здрабнення зерня. Крэмневыя клінападобныя шліфаваныя сякеры



Знаходкі археолагаў каля в. Ясенец



Археалагічныя знаходкі ў Мазыры (XI—XIII стст.)

Гогаля (былая Кімбараўка) і гарадзішча на Гары Камунараў (былая Спаская, Замкавая гара). На першым з іх, як сказана ў заметцы Г. М. Залашкі «Колькі гадоў Мазыру?», надрукаванай у газеце «Звязда» восенню 1983 г., адзначаны знаходкі з гліны трох-, чатырохтысячагадовай даўнасці. Яны павялічваюць узрост нашага горада ў чатыры-пяць разоў. Другое гарадзішча цікавае тым, што на месцы, якое акружана плошчай імя Леніна (былой Базарнай) і плошчай М. Горкага (былая Жыто-

мірская), вуліцамі Савецкай (былая Кіеўская набярэжная) і Камсамольскай (былая Замкавая), пачынаўся амаль дзевяць стагоддзяў назад сучасны Мазыр.

Гарадзішча Кімбараўка знаходзіцца на паўночна-ўсходняй ускраіне Мазыра на адным з узвышшаў Мазырскай грады, размешчана на правым беразе Прыпяці прыкладна за 200—250 метраў ад яе рэчышча і ўзвышаецца над поймай ракі на 60—70 метраў. У далёкім мінулым рака была шырэйшая і падыходзіла да самага падножжа ўзвышша.

Археалагічныя раскопкі гарадзішча пачаліся з першай паловы 50-х гадоў нашага стагоддзя, калі тут, у цэнтры пляцоўкі, Ю. В. Кухарэнкам быў закладзены невялікі шурф. Па знойдзеных рэштках вырабаў з гліны даследчык вызначыў верхнюю і ніжнюю мяжу існавання пасялення. Вучоны прыйшоў да высновы, што гарадзішча ўзнікла ў эпоху бронзы і перастала існаваць у часы Кіеўскай Русі.

Гэтыя вывады былі пацверджаны П. Ф. Лысенкам, які даследаваў шурфоўку помніка ўжо ў канцы 70-х гадоў. Стацыянарныя раскопкі на пасяленні пачаліся ў 1982 годзе. Праводзіліся яны Палескім атрадам археалагічнай экспедыцыі АН Беларусі пры актыўным удзеле выкладчыкаў і студэнтаў гістарычнага факультэта Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта. Работы працягваліся і ў 1983 г.

Знаходкі Кімбараўскага гарадзішча разнастайныя. Гэта вялікая колькасць гліняных вырабаў, як ляпных, так і выкладзеных на ганчарным крузе, косці жывёлы і рыб, рэчы з металу — нажы, стрэлы, прыколкі, бронзавыя ювелірныя вырабы і інш. Яны даюць уяўленне аб жыцці і гаспадарчай дзейнасці жыхароў гарадзішча.

Металаграфічны аналіз знаходак археолагаў, праведзены М. Ф. Гурыным, выявіў якасць матэрыялу вырабаў, ступень дасканаласці кавальскай тэхналогіі і комплекс прыёмаў і аперацый для вытворчасці асобных прылад працы, зброі, бытавых і гаспадарчых прадметаў: нажоў, наканечнікаў для кап'я, стрэлаў, цвікоў, спражак, крэсіваў, скоб і г. д. Кавалі рацыянальна выкарыстоўвалі метал. Так, для вырабу нажоў выкарыстоўвалася сталь, а для наканечнікаў стрэл і цвікоў, разлічаных на разавае скарыстанне, — жалеза. У некаторых выпадках яно было нізкай якасці.

Майстры валодалі ўсімі прыёмамі гарачай і свабоднай коўкі. Аб гэтым сведчыць знешняя форма многіх вырабаў (наканечнікі стрэл, фібула, крэсіва). Ведалі кавалі і гарачую зварку. Часта практыкавалася загартоўка сталі. Наяўнасць у культурных напластаваннях гарадзішча металургічных шлакаў дае падставу лічыць, што тут была наладжана вытворчасць жалеза і сталі-сырцу з балотнай жалезнай руды. Аднак нельга выключаць і паступленне паўфабрыкатаў і гатовых вырабаў з аддаленых цэнтраў.

Але асноўнай і самай шматлікай групай археалагічных знаходак Кімбараўскага гарадзішча з'яўляюцца вырабы з гліны. Абломкі гліняных рэчаў на гарадзішчы сустракаюцца ва ўсёй таўшчыні культурнага пласта, а таксама ў шматлікіх ямах, што выяўлены ў мацерыковым пяску. У размеркаванні па слаях ляпной і ганчарнай керамікі заўважаецца пэўная заканамернасць: працэнт ганчарнага посуду павялічваецца ад трэцяга пласта к першаму (ад ніжняга к верхняму) і адпаведна змяншаецца працэнт ляпной.

Ляпны посуд гарадзішча прадстаўлены ў асноўным гаршкамі рознай формы. Так, гаршкі з прамым венчыкам знойдзены ў асноўным у ніжнім гарызонце культурнага пласта і з'яўляюцца, магчыма, самымі старажытнымі на пасяленні. Выраблены яны з гліны дрэннай якасці са значнай прымессю драсвы і рачнога пяску. Вышыня венчыка гэтых гаршкоў 2—4 см, а тулава пачынаецца амаль пад прамым вуглом к венчыку. Сасуды гэтай формы не маюць арнаментаў, толькі на краі венчыка рабіліся насечкі. У гаршкоў іншай фор-

мы венчык прагнуты злёгку на вонкавы бок, на канцы ён мае патаўшчэнне ў выглядзе валіка. Такога посуду на пасяленні большасць. Знойдзены ён у трэцім і другім напластаваннях. У першым гарызонце такія знаходкі з гліны не сустракаюцца. Частка посуду выраблена з больш якаснай гліны з нязначнымі прымесямі, маюцца сляды падпраўленняў на ганчарным крузе. Арнамент адсутнічае. Падобны ляпны посуд адносіцца да VI — IX стст. нашага тысячагоддзя.

Ганчарная кераміка адрозніваецца ад ляпной разнастайнасцю форм. Акрамя гаршкоў знойдзена некалькі місак, якія, відаць, з'яўляюцца самай закончанай формай ганчарнага посуду на гэтым гарадзішчы, бо яны былі знойдзены толькі ў верхнім пласце і выраблены з гліны добрай якасці з нязначнымі прымесямі. Мяркуючы па тым, як загнуты венчык, вышыня місак дасягала 10—12 см, дыяметр — 18—20 см. Арнамент не выяўлены. Гаршкі, выкабленыя на ганчарным крузе, маюць роўную, прыгладжаную паверхню, колер іх ад светла-шэрага да цёмна-шэрага. Трапляюцца фрагменты охры, зрэдку з арнаментам.

Апошні, найбольш блізкі па часе да нас, этап існавання гарадзішча Кімбараўка можна вызначыць прыблізна канцом VI — сярэдзінай XI стст. н. э. Не супярэчыць гэтаму вызначэнню і знаходка палавінкі сярэбранага дырхема 70-х гадоў VIII ст. — сярэдневяковай арабскай манеты: Прыпяць, як гандлёвы шлях, шырока выкарыстоўвалася нашымі продкамі.

На гарадзішчы Кімбараўка ў верхнім пласце сустракаўся посуд яшчэ больш развітых форм — гаршкі з венчыкам у выглядзе плешкі цвіка, міскі. Малюнак на ім застаецца ранейшым. Няма ніякага сумнення ў тым, што падобныя вырабы адносяцца да больш позняга часу, чым X стагоддзе.

Параўноўваючы позні посуд Кімбараўскага гарадзішча з керамікай ніжніх гарызонтаў Замкавай гары, можна знайсці падабенства. На Замкавай гары яна датуецца сярэдзінай і другой паловай XI ст. Такім чынам, сярэдзіна XI ст. з'яўляецца верхнім рубяжом існавання пасялення Кімбараўка.

Старажытныя мазыране пакідаюць свой «стары дом» і перасяляюцца ў новы. Якія ж прычыны прымусілі іх зрабіць гэта? Расла колькасць насельніцтва, і стала малою тэрыторыя, і таму людзі пераходзілі на новае месца жыхарства, прыблізна за 4 км уверх па цячэнні Прыпяці, дзе выбралі сабе «новы дом» — Замкавую гару, ці ўзгорак, які мы цяпер называем Гара Камунараў. Праўда, і старое гарадзішча не было забыта, доўгі час, амаль да татара-мангольскага нашэсця, на ім размяшчаўся вартавы ваенны пост, што ахоўваў подступы да горада з паўднёва-ўсходняга боку.

Перасяленне магло быць звязана з распаўсюджваннем у гэтых краях новай, хрысціянскай веры. Старое пасяленне, дзе жылі язычнікі, хрысціяне маглі палічыць «нячыстым». Цэнтрам, дзе адбываліся язычніцкія абрады, па меркаванні пецярбургскага вучонага В. А. Булкіна, мог быць узгорак, які вядомы цяпер пад назвай Шайтан-гара. Размешчана яна на стыку цяперашніх трох вуліц: Фрунзе, Калініна і 17 верасня, побач з новым мікрараёнам па вул. Ульянаўскай. Ад Шайтан-гары ў старое пасяленне лёгка і хутка можна трапіць праз сучасную вёску Булаўкі.

Новае пасяленне з пабудаванай на ім царквою, нягледзячы на больш блізкае размяшчэнне да Шайтан-гары, лепш адпавядала не толькі эканамічным, але і духоўным запатрабаванням часу.

Існуе легенда (яе запісаў у сярэдзіне XIX ст. этнограф П. М. Шпілеўскі), якая не толькі высвятляе прычыны перасялення колішніх жыхароў на новае месца, але і тлумачыць паходжанне назвы Мазыр.

«Предание приписывает начало построения Мозыря двум братьям, киевским выходцам, которые поселились на высоких крутых берегах Припяти с целью промышлять рыбьим жиром. Братья недолго жили между собой согласно. Старший был страшный урод и возненавидел младшего,

Злева ўверсе: бурштын. Набор славянскіх жаночых упрыгожанняў. Датуюцца эпохай Кіеўскай Русі (IX — XIII стст.). Знойдзены ў межах Мазыра.

Унізе: кольцы бронзавыя, датуюцца X — XI стст. Знойдзены на Гары Камунараў.

Пасярэдзіне: убранне дрыгавіцкай дзяўчыны (X — XI стст., рэканструкцыя). Крыжыкі нацельныя, датуюцца эпохай Кіеўскай Русі (X — XIII стст.). Знойдзены на Гары Камунараў.

Справа: бранзалеты шкляныя (фрагменты), датуюцца XII — XIII стст. Знойдзены на Гары Камунараў

статного красавца, за предпочтение, оказанное ему молодой соседкой, а главное, за быстрое обогащение: младшему все удавалось в торговле, и он был богаче старшего. Чтобы избавиться от завистливого близкого родственника, младший брат хотел отстать от старшего и поселиться подальше от него. Это вызвало еще большее раздражение злого брата, и когда младший действительно объявил о своем намерении, старший не хотел выдать ему половины приходившегося на его долю товара (жира) и велел своим работникам вытолкать его вон без всего. Младший собрал дружину и объявил войну старшему. Застигнутый врасплох, старший брат обратился к помощи чаровницы (колдуньи), жившей по соседству на высокой остроконечной горе, и чаровница явилась к нему на помощь с несметным числом подвластных ей духов. Бой завязался неравный, и младший брат должен был погибнуть от сил чаровницы. Но красота спасла его: во время боя чаровница до того была поражена дивной красотой младшего героя, что велела остановить сражение и предложить ему мир. Но старший брат не согласился и требовал войны. «Мой жир! — кричал он.— Я не уступлю ему ни одной мерки!» — И с этими словами устремился на полчища духов. Оскорбленная чаровница взмахнула волшебным мечом, и гора распалась на две части. В образовавшейся посреди пропасти погиб старший брат, не переставая кричать: «Мой жир!» — «Нет, мой жир! — воскликнул младший брат, стоя на обрыве разделенной горы.— Тебе не удалось обидеть меня».

...Народное предание ищет начало самого города, название которого производит от слов: «Мой жир»,— «Можирь» — Мозы́рь (по-белорусски название города произносится как «Мазыр», с ударением на втором слоге). Догадки свои основывает на созвучии сохранившегося названия близлежащего притока (маленькой речки, впадавшей в Припять): Монжирье».

Гарадзішча Замкавая гара, ці Гара Камунараў, доўгі час не вывучалася ні даследчыкамі-вучонымі, ні краязнаўцамі. З мэтай азнаямлення яе даследаваў у 1951 г. Ю. В. Кухарэнка, праз дзесяць год — П. Ф. Лысенка. Матэрыял, які многія гады трапляў у фонды гарадскога краязнаўчага музея, не мог даць поўнага ўяўлення аб узнікненні і гістарычным развіцці горада. У 1978 г. супрацоўнікі Акадэміі навук БССР П. Ф. Лысенка і Т. Н. Каробушкіна, заклаўшы 12 шурфаў на тэрыторыі гарадзішча, вызначылі пачатак наслядоўных археалагічных работ на працягу першай паловы 80-х гадоў.

Даследаванні праводзіліся экспедыцыямі Беларускага рэстаўрацыйнага праектнага інстытута пад кіраўніцтвам А. А. Трусава, І. Н. Чарняўскага, А. М. Кушняровіча, І. І. Сіньчука, Н. І. Здановіча, Т. С. Бубенькі. Актыўны ўдзел у даследаваннях прымалі выкладчыкі В. А. Булкін, В. А. Рачкоўскі, М. І. Фёдараў, В. С. Смірноў і студэнты гістарычнага факультэта Ленінградскага універсітэта. Вялікую дапамогу археолагам аказвалі вучні 10-й, 4-й і 5-й школ Мазыра. Была сабрана вялікая калекцыя гаспадарчага посуду, кафлі, вырабаў са шкла, косці і металу, якія склалі найбольш значную частку археалагічнай экспазіцыі Мазырскага краязнаўчага музея. Знаход-

кі адносяцца да XII — XVIII стст., яны дапамагаюць скласці пэўнае ўяўленне аб жыцці горада і шэрагу населеных пунктаў у гэты гістарычны перыяд. У час раскопак была адкрыта значная плошча гарадзішча — каля 600 кв. м. Асноўная маса матэрыялу ў цэнтры гарадзішча і ў паўночнай яго часткі адносіцца да XIV — XVII стст., хоць сустракаюцца і знаходкі XI — XII стст.

У паўночна-ўсходняй частцы гарадзішча Замкавай гары знойдзены два шыферныя крыжыкі — сведчанне першых крокаў хрысціянскай рэлігіі, якая прыйшла на замену язычніцтву.

Формы няпоўнай керамікі іншых гарадоў Тураўскай зямлі аналагічныя формам мазырскай калекцыі. З 17 тыпаў тураўскіх гаршкоў 10, з 12 тыпаў Давыд-Гарадка 8 — дакладныя аналагі мазырскім. Гэта сведчыць аб цесных сувязях пасяленняў у ніжнім цячэнні Прыпяці. Ювелірныя вырабы з Полацка, Кіева, далёкай Візантыі, якія датуюцца XI — XIV стст., указваюць на шырокія гандлёвыя сувязі Мазыршчыны з буйнымі гаспадарчымі, палітычнымі і культурнымі цэнтрамі таго часу. Амаль на мацерыковым пласце знойдзен жалезны нарог, які датуецца XII ст. Такія нарогі былі знойдзены ў Навагрудку і Пінску.

У канцы XI ст., калі, па ўсёй верагоднасці, узнік наш горад, гэта было невялікае паселішча, летапіснае ўпамінанне аб ім адносіцца толькі да 1155 г. Калі на тэрыторыі Мазыра пачаліся археалагічныя раскопкі, задача высвятлення паходжання горада не ставілася. Гістарычныя помнікі: Замкавая гара, ці Гара Камунараў, і Кімбараўскае гарадзішча лічыліся розначасовымі па паходжанні, пытання аб іх узаемасувязі не ўзнікала. Пасяленне на Кімбараўцы адносіцца да позняй бронзы, да часоў Кіеўскай Русі, Спаская, ці Замкавая гара цікавіла даследчыкаў як месца, дзе з канца XIV па канец XVII ст. існаваў умацаваны замак. Аднак ужо ў пачатку работ на гэтым месцы археолагі знайшлі значна ранейшыя пласты. Выявілася, што яны адносяцца да канца XI — пачатку XII стст. Верхнія гарызонты пасяленняў на Кімбараўцы датуюцца XII ст. Так узнікла гіпотэза аб паходжанні старажытнага Мазыра шляхам пераносу пасёлка Кімбараўка на Замкавую гару. Гіпотэза атрымала новае пацвярджэнне, калі ў 1983 г. на паўднёвай ускраіне пляцоўкі гарадзішча Замкавай гары быў зроблены раскоп, аналагічны тром іншым на Кімбараўцы.

Славянскія помнікі — гарадзішча Кімбараўка і пасяленне на Замкавай гары раздзяляе адлегласць 4—5 км. Абодва яны знаходзяцца на Прыпяці, маюць аднолькава выгаднае геаграфічнае становішча. Прыпяць, буйнейшая рака ва ўсходняй частцы беларускага Палесся, была значна шырэйшая, чым сёння. Русла яе не было пастаянным. Берагі знаходзіліся каля самых падножжаў узвышшаў, дзе жылі людзі, што было зручна і выгадна. Усё гэта акрамя рыбнай лоўлі стымулявала развіццё рамеснай вытворчасці, гандлю. У канцы X — пачатку XI стст. малыя памеры гарадзішча Кімбараўка перастаюць задавальняць патрэбнасці насельніцтва, становіцца неабходным мець большую прыстань. Было выбрана месца для новага пасялення — Замкавая гара. Пачынаўся новы этап у гістарычным развіцці горада.

А. Бобр, М. Сузько

Археалагічныя помнікі Мазыра

Гарадзішча

На месцы былой в. Кімбараўка, каля Мазырскай мэблевай фабрыкі, паміж ярамі, на правым беразе Прыпяці. Пляцоўка памерам 130×80 м, з боку поля ўмацавана валам вышынёй каля 4 м і ровам глыбінёй каля 3 м. З паўночнага, паўднёвага і ўсходняга бакоў мае стромкія схілы (вышыня над поплавам Прыпяці каля 20 м). У раскопе плошчай

Мазырскае гарадзішча

136 кв. м ва ўсходняй частцы пляцоўкі выяўлены культурны пласт 0,2—0,7 м. Знойдзены абломкі ляпнога і ганчарнага посуду. Сярод ляпной керамікі — рэшткі гаршкоў роменска-боршаўскага тыпу з арнаментам у выглядзе кручанага шнура і кераміка бронзавага веку. Ганчарны посуд з лінейным арнаментам, тыповым для XI стагоддзя. Выяўлены рэшткі частаколу, які ішоў паўкольцам і аддзяляў пляцоўку ад ракі. У мацерыку трапляюцца ямы. 2 з іх ад жытлаў (памеры 5,2×2,4 м і 6×2,4 м) размешчаны каля частаколу. Сярод знаходак — бронзавыя паясныя бляшкі, шыферныя і гліняныя прасліцы, сердалікавая пацерка, фібула, бразготка з крыжападобным прарэзам, жалезныя і крамянёвыя наканечнікі стрэл, тыгель, крамянёвае крэсіва, жалезныя нажы, наканечнікі кап'я-суліцы X ст. Знойдзена палавіна сярэбранага арабскага дырхема (манетны двор аль-Мухамедзія, 798 — 799 гг.). Гарадзішча ўзнікла на месцы больш ранняга паселішча бронзавага веку. Адносіцца да Роменска-боршаўскай культуры, датуецца VIII — XI стст.

Селішча

На захад ад гарадзішча, за валам. Культурны пласт 0,16—0,4 м на адлегласці 0,3 км уздоўж поймы ракі. У шурфах выяўлены фрагменты ляпной і ганчарнай керамікі, кавалак аплаўленага шкла. Адносіцца да Роменска-боршаўскай культуры, датуецца VIII — XI стст.

Паселішчы

Паселішча 1 вядома пад назвай Пхоў 1. За 1 км на паўднёвы ўсход ад Пхова (цяпер у межах Мазыра), у месцы павароту Прыпяці на паўднёвы захад. Даўжыня паселішча 70 м. У раскопе агульнай плошчай 100 кв. м і ў траншэі плошчай 20 кв. м знойдзены 190 апрацаваных крамянёў, 39 крамянёвых прылад працы, 220 абломкаў ляпной керамікі.

Паселішча 2 — Пхоў 2. На Заходняй ускраіне пас. Пхоў, на першай надпоймавай тэрасе. Даўжыня паселішча 300 м. Культурны пласт 0,2 м захаваўся не поўнасцю. На месцах моцна разбураных жытлаў знойдзены 32 крамянёвыя прылады працы, 180 апрацаваных крамянёў, абломкі 3—4 вастрадонных гаршкоў.

Паселішча 3 — Мазыр 1. За 1 км на поўнач ад цэнтра горада, займае высокі ўчастак поплава Прыпяці. Вядома з 1926 г. Даўжыня паселішча 150 м. У культурным пласце 0,3 м знойдзены 36 крамянёвых прылад працы, 150 апрацаваных крамянёў, абломкі 8—9 гаршкоў.

Паселішча 4 — Мазыр 2. За 2 км на паўночны ўсход ад былой в. Кімбараўка (цяпер вул. Гогаля). Вядома з 1926 г. Даўжыня паселішча 200 м. Культурны пласт да 0,2 м. Знойдзены крамянёвыя прылады працы, апрацаваныя крамяні, рэшткі гаршкоў.

Паселішчы адносяцца да ўсходнепалескага варыянта Днепраданецкай культуры, датуюцца 3—2-м тысячагоддзямі да н. э.

У. Ісаенка

Археалагічныя помнікі на Мазыршчыне

в. Акулінка, Крынічанскі сельскі Савет

Гарадзішча. (Мясцовая назва Вокунь-гарадок.) На ўсходняй ускраіне вёскі, ва ўрочышчы Гарадок. Пляцоўка 85×60 м была ўмацавана падковападобным валам вышынёй каля 2 м і ровам глыбінёй 1,5 м, сярэдняя частка вала знесена. Культурны пласт 0,5 м. Знойдзены ляпная кераміка, рэшткі ганчарнага посуду. Адносіцца да Зарубінецкай культуры ранняга жалезнага веку (II ст. да н. э.— II ст. н. э.) і да эпохі Кіеўскай Русі.

Могільнік 1. За 0,6 км на паўднёвы ўсход ад гарадзішча, за ярам, ва ўрочышчы Лоўчык. 32 курганы вышынёй 0,5 м, дыяметрам 2—3 м, раскапаны 4 насыпы. Выяўлены пахаванні ў ямах.

Могільнік 2. За 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на першай тэрасе Прыпяці, ва ўрочышчы Капцы, 20 насыпаў вышынёй 0,5 м, дыяметрам 3—6 м. З курганы вышынёй 2—2,5 м, дыяметрам 12—14 м. Раскопкі не праводзіліся.

в. Барыскавічы, Прудкоўскі сельскі Савет

Могільнік 1. На заходняй ускраіне вёскі. 15 курганоў вышынёй 1—3 м, дыяметрам 3—6 м. На грунце пад курганамі выяўлены рэшткі вогнішчаў, знойдзены фрагменты гліняных гаршкоў. Могільнік належаў дрыгавічам, датуецца X — XII стагоддзямі.

Могільнік 2. На ўсходняй ускраіне вёскі. 12 насыпаў вышынёй 1—3 м, дыяметрам 4—7 м. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў ямах, на 0,7 м ніжэй мацерыка, пахавальны інвентар: пярсцёнкападобныя скроневыя і трохпацеркавыя кольцы, бронзавыя, шкляныя і зярнёныя пацеркі. Могільнік належаў дрыгавічам, датуецца X — XII стагоддзямі.

в. Глініца, Асавецкі сельскі Савет

Гарадзішча 1. За 1,5 км на паўночны ўсход ад вёскі, на паўднёвым беразе воз. Глініцкае, ва ўрочышчы Печ. Пляцоўка круглая, дыяметрам каля 40 м, абкружана валам вышынёй каля 1,5 м. З усходняга боку вал пашкоджаны ямай. З вонкавага боку вала — лагчына (верагодна, апоўзлы роў). Раскопкі не праводзіліся.

Гарадзішча 2. За 2,5 км на паўднёвы захад ад вёскі на беразе воз. Святое. Пляцоўка круглая, дыяметрам 150 м, умацавана двума валамі і ровам глыбінёй 0,7—0,8 м. Вышыня ўнутранага вала 2,5—3 м, вонкавага 1 м. Культурны пласт 0,2 м. Раскопкі не праводзіліся.

в. Дзербінка, Махнавіцкі сельскі Савет

Могільнік 1. За 1,5 км на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Дубовіна, 43 насыпы вышынёй 0,5—1 м, дыяметрам 8—12 м, займаюць плошчу 6 га. Курганы добра захаваліся. Раскопкі не праводзіліся.

Могільнік 2. За 1 км на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Цымбалы. 23 насыпы вышынёй 0,5—1 м, дыяметрам 8—12 м. Раскопкі не праводзіліся.

в. Загорыны, Прудкоўскі сельскі Савет

Гарадзішча. За 0,6 км на захад ад вёскі, на беразе Прыпяці (пляцоўка 75×45 м). З паўночнага ўсходу гарадзішча — абрыў вышынёй 25—30 м да старыцы ракі, з боку поля — дугападобныя роў глыбінёй 2 м, шырынёй 15 м і вал вышынёй 2—4 м, шырынёй 10 м. У агаленнях выяўлены культурны пласт да 1 м. Знойдзены рэшткі керамікі XII — XIII стст., косці жывёл. Адносіцца да эпохі Кіеўскай Русі.

Паселішча. За 0,3 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, каля схілу карэннага берага, на паверхні першай надпо-

Могільнік ва ўрочышчы Цымбалы каля в. Дзербінка

плаўнай тэрасы Прыпяці. Даўжыня ўздоўж берага 300 м, шырыня 120 м, вышыня над поплавам ракі 4 м. Культурны пласт складаецца з верхняга і ніжняга гарызонтаў. У ніжнім гарызонце, які залягаў пад гумусавым пластом глебы, знойдзена 57 крамянёвых прылад працы і зброі (мікраліты, скрабкі, нажы, наканечнікі стрэл), 30 фрагментаў ляпнога вастрадоннага посуду. Адносіцца да позняга мезаліту і ранняга неаліту, датуецца 7—4-м тысячагоддзямі да н. э. У верхнім гарызонце, які залягаў у гумусавым пласце, знойдзены крамянёвыя прылады працы і рэшткі ляпнога посуду (400 расшчэпленых крамянёў і абломкі ад 9—11 ляпных гаршкоў). Адносіцца да позняга неаліту і бронзавага веку, датуецца канцом 3-га — 2-м тысячагоддзем да н. э.

в. Лешня, Скрыгалаўскі сельскі Савет

Курганны могільнік. За 1,5 км на ўсход ад вёскі. 40 абкружаных раўкамі курганоў вышынёй 1—3 м, дыяметрам 3—6 м. Пахавальны абрад — трупапалажэнне на гарызонце, галавой на захад. Драўляныя дамавіны змацаваны па вуглах жалезнымі цвікамі. Могільнік належаў дрыгавічам, датуецца X — XII стст., раскапана 13 насыпаў.

в. Лубня, Крынічанскі сельскі Савет

Паселішча 1. За 1 км на паўночны ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Лысая Гара. У культурным пласце знойдзены крамянёвыя рэчы эпохі мезаліту (пласцінкі, скрабкі, наканечнікі стрэл). Адносіцца да эпохі мезаліту, датуецца 8—5-м тысячагоддзямі да н. э.

Паселішча 2. За 0,5 км на захад ад вёскі, на першай надпоплаўнай тэрасе р. Закаванка. Працягласць паселішча ўздоўж ракі больш за 120 м. У культурным пласце знойдзены крамянёвыя прылады працы і ляпная кераміка эпохі неаліту і бронзавага веку.

Паселішча 3. За 3 км на поўнач ад вёскі, каля возера Вялікае. У культурным пласце каля 0,4 м знойдзены крамянёвыя прылады і ляпная кераміка.

Паселішчы 2 і 3 датуюцца 4-м — пачаткам 1-га тысячагоддзя да н. э.

в. Майсееўка, Слабадскі сельскі Савет

Гарадзішча. За 2 км ад вёскі, ва ўрочышчы Акопы (Буклеўка, Гарадзінка), на мысе рэчкі. Памер гарадзішча 230×120 м. З усходу і захаду ад яго глыбокія яры, з поўначы і з поўдня — 2 падковападобныя валы вышынёй 2—4 м. 2 пляцоўкі — вялікая паўднёвая (130×120 м) аддзелена ад меншай паўночнай 2 валамі вышынёй 2—3 м. Культурны пласт 0,3 м ускрыты на плошчы 80 кв. м. Выяўлены рэшткі вогнішчаў, каменне, знойдзены фрагменты ляпных гліняных гаршкоў Мілаградскай культуры (II — III стст. да н. э.) і керамікі эпохі Кіеўскай Русі.

в. Надаткі, Скрыгалаўскі сельскі Савет

Курганны могільнік. За 2 км на паўднёвы захад ад вёскі, ва ўрочышчы Машчанскае, на беразе ручая. 12 насыпаў вышынёй 0,5—1 м, дыяметрам 5—8 м. Каля падножжа курганоў

выяўлены раўкі. У адным пахаванне парнае: адно на гарызонце, другое ў яме. Знойдзены 3 скроневыя кольцы, пярсцёнак, 3 падвескі — пацеркі, рэшткі візантыйскай тканіны з залатымі ніткамі і ляпнога посуду. У другім кургане пахаванне на гарызонце на попельна-вугальным пласце, галавой на захад. Знойдзены складаная арнаментаваная расчоска, лірападобная спражка, нож. У трэцім кургане пахаванне на гарызонце. Могільнік належаў дрыгавічам, датуецца X — XI стст.

в. Скрыгалаў, цэнтр сельскага Савета

Могільнік 1. За 2 км на поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Перахрэсце. 11 насыпаў вышынёй каля 2,5 м, дыяметрам каля 15 м. Знойдзены рэшткі дамавін, змацаваных па вуглах жалезнымі цвікамі. Могільнік належаў дрыгавічам, датуецца X — XIII стст., раскапана 8 курганоў.

Могільнік 2. За 2 км ад вёскі, ва ўрочышчы Забуклявечча. Захавалася 13 насыпаў вышынёй 0,5—1,5 м, дыяметрам 5—12 м. Пахавальны абрад — трупапалажэнне на гарызонце. Знойдзены бронзавая спражка, паясныя кольцы, нажы, крэсіва, гаршчок. Могільнік належаў дрыгавічам, датуецца X — XIII стст., раскапана 13 з 43 насыпаў.

в. Слабада, цэнтр сельскага Савета

Могільнік 1. За 3 км на паўднёвы захад ад вёскі, у лесе, ва ўрочышчы Турава балота. 32 насыпы вышынёй да 1 м, дыяметрам каля 3 м, абкружаны раўкамі. У. З. Завітневіч раскапаў 9 курганоў. У 8 курганах пахавальны абрад — трупапалажэнне на грунце, галавой на захад, у адным — трупаспаленне. Знойдзена некалькі гаршкоў. Могільнік належаў палянам, датуецца IX — XI стст.

Могільнік 2. За 2 км на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Гарадок. 19 насыпаў вышынёй 1—1,5 м. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў ямах, знойдзены рэшткі драўляных дамавін. Могільнік належаў палянам, датуецца X — XI стст.

Гарадзішча ў в. Стрэльск

в. Стрэльск, Крынічанскі сельскі Савет

Гарадзішча. У цэнтры вёскі. Памер 42×40 м. З заходняга боку ўмацавана ровам і валам, з іншых — абмежавана ярамі. Вышыня над поплавам Прыпяці — каля 20 м. Раскопкі не праводзіліся.

в. Ясенец, Скрыгалаўскі сельскі Савет

Гарадзішча 1. За 1 км на поўдзень ад вёскі, у лесе, ва ўрочышчы Сухалістак. Пляцоўка авальная, памерам 90×60 м, умацавана двума кальцавымі валамі. Унутраны вал вышынёй 2,5 м, шырынёй 10 м. Вонкавы вал адпаведна 0,5 і 7 м. Культурны пласт 0,2—0,3 м. Знойдзены рэшткі грубай ляпной керамікі (на асобных венчыках посуду жамчужны арнамент), бронзавая шпілька, фрагмент бронзавага бранзалета, каля двух дзесяткаў гліняных гузікаў разнастайнай формы, бронзавы наканечнік стралы, шкляная пацерка, крамянёвы нож. Выяўлены рэшткі некалькіх вогнішчаў і вялікая колькасць гаспадарчых ям. Гарадзішча адносіцца да ран-

няга этапа Мілаградскай культуры, датуецца канцом VII — пачаткам VI стст. да н. э.

Гарадзішча 2. За 1 км на паўднёвы захад ад вёскі, ва ўрочышчы Вал Скрыгалаўскі (Астравок). Пляцоўка гарадзішча памерам 160×170 м, умацавана двума кальцавымі валамі. Вышыня ўнутранага вала 2 м, шырыня 10 м. У раскопках плошчай 148 кв. м выяўлены культурны пласт 0,2—0,3 м. Знойдзены рэшткі ляпной керамікі з венчыкамі, упрыгожанымі арнаментамі наляпным валікам. Адносіцца да ранняга этапа Мілаградскай культуры, датуецца канцом VII — пачаткам VI стст. да н. э.

Селішча. За 3 км на поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Селішча. Працягласць уздоўж паўднёвага берага возера Міхайлаўка 0,4 км. Культурны пласт 0,5 м. Знойдзена ганчарная кераміка раннефеадальнага часу.

Стаянка. За 1 км на поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Загуменька. У культурным пласце 0,1 м знойдзены крамянёвыя прылады працы, рэшткі ляпнога посуду. Адносіцца да эпохі неаліту і бронзавага веку.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гомельская вобласць. Мн., 1985. С. 249—264.

МАНЕТНЫЯ СКАРБЫ, ЗНОЙДЗЕНЫЯ НА ТЭРЫТОРЫІ МАЗЫРА І МАЗЫРСКАГА РАЁНА

У Мазыры знойдзена 6 манетных скарбаў, на тэрыторыі раёна — больш за 20.

Мазыр

1870 г. — знойдзена 350 адзінак 1661 г. (дынары Вялікага княства Літоўскага, саліды Рэчы Паспалітай, Прусіі, Шведскай Прыбалтыкі, білон, серабро); 1913 г. — 1 адзінка 1761 г. (дукат Галандыі, золата); 1951 г. — 1 адзінка III ст. (манета Фракіі, бронза); 1960 г. — 13 адзінак 1647 г. (паўгрошы Вялікага княства Літоўскага, Польшчы, 1,5-грошавік, трайны грош, грош Рэчы Паспалітай, драйпелькер курфюршэства Брандэнбург, талер Злучаных Правінцый, грошы Чэхіі, білон, серабро); 1961 г. — 196 адзінак 1770 г. (грошы Расіі, трайныя грошы Рэчы Паспалітай, медзь); 1927 г. — 2 адзінкі, сярэбраныя зліткі; 1979 г. (вул. Л. Талстога, былая Салаўёўка) — скарб білонавых манет (баратынак) XVI — XVII стст., 25 адзінак; 1976 г. (бераг ракі Прыпяць) — скарб білонавых манет XVI — XVII стст., 244 адзінкі; 1979 г. (вул. А. Чэхава) — скарб білонавых манет (сярэбраны талер) XVI — XVII стст., каля 1000 адзінак.

Мазырскі раён

Вёскі Акулінка і Барыскавічы, 1890 г. — 148 адзінак 3-й чвэрці XVII ст. (капейкі Расіі, паўгрошы, грошы Вялікага княства Літоўскага, дынары, саліды, грош, трайныя грошы, 6-грошавікі Рэчы Паспалітай, грошы Прусіі, саліды Шведскай Прыбалтыкі, білон, серабро); в. Вялікія Зімовішчы, 1890 г. — 307 адзінак 3-й чвэрці XVII ст. (саліды, грош, трайныя грошы Рэчы Паспалітай, трайны грош Прусіі, саліды Шведскай Прыбалтыкі, білон, серабро); в. Каменка, 1890 г. — 10 адзінак 4-й чвэрці XVII ст. (саліды Шведскай Прыбалтыкі, білон); в. Касцюковічы, 1963 г. — дынар 1651 г., часоў Вялікага княства Літоўскага, серабро; в. Лешня, 1907 г. — 59 адзінак 1651 г. (6-грошавікі, орты Рэчы Паспалітай, талеры Іспанскіх Нідэрландаў, Злучаных Правінцый, серабро); в. Матрункі, 1907 г. — знойдзены рублі Расіі 1789 г., серабро; в. Міхалкі, 1940 г. — 208 адзінак XV ст. (грошы Чэхіі, серабро); в. Новая Ніва, 1957 г. — 150 адзінак 1654 г. (паўгрошы Вялікага княства Літоўскага, Польшчы, грошы Прусіі, серабро); в. Навікі, 1961 г. — 30 адзінак 1-й чвэрці XVIII ст. (грошы Рэчы Паспалітай, серабро); в. Раманаўка, 1962 г. — 1-я чвэрць XIX ст., ігімірлік Турцыі, бронза; в. Скрыгалаў, 1925 г. — каля 200 адзінак 3-й чвэрці XVII ст. (саліды Рэчы Паспалітай, медзь); в. Слабада, 1961 г. — манета Візантыі XI ст., медзь; грош Чэхіі, серабро; манета дзяржавы Цімуратаў XVII ст., медзь; двайны дынар Рэчы Паспалітай, білон.

Частка манетных скарбаў захоўваецца ў Эрмітажы, у Дзяржаўным музеі Рэспублікі Беларусь, Гомельскім абласным краязнаўчым музеі.

У складзе Кіеўскай Русі

Распад племянных адносін у славян на зыходзе першага тысячагоддзя нашай эры прывёў да стварэння ва Усходняй Еўропе старарускай дзяржавы з цэнтрам у Кіеве, у склад якой увайшла тэрыторыя Мазыршчыны. Мясцовасць, дзе цяпер знаходзіцца горад і іншыя старажытныя паселішчы — Скрыгалаў, Барбароў, Мялешкавічы, калісьці была заселена ўсходнеславянскім племенем дрыгавічоў. «А друзии седоша межю Припятью и Двиною и нарекшеся дреговичи», — гаворыцца ў «Аповесці мінулых гадоў». У раёне Мазыра на правым беразе Прыпяці і каля іншых мазырскіх вёсак знаходзяцца самыя раннія на беларускім Палессі дрыгавіцкія курганы.

Упамінанне ў летапісе пра пасяленне дрыгавічоў паміж Прыпяццю і Дзвіною дае падставы лічыць, што расселенне ішло з поўдня на поўнач. Дрыгавіцкі племянны саюз не распаўся і не знік бясследна, а перарос у палітычнае аб'яднанне — Тураўскае княства. Летапісныя і археалагічныя даныя сведчаць аб яго з'яўленні ў канцы X ст. Размяшчэнне Турава ў непасрэднай блізкасці ад Кіева вымушала яго знаходзіцца ў сферы палітычнага прыцяжэння сталіцы старажытнай Русі.

Развіццё вытворчасці ў гэтым рэгіёне, аддзяленне рамёстваў ад сельскай гаспадаркі з'явілася прычынай росту не толькі Турава, а і іншых пасяленняў і пераўтварэння іх у гарады, якія станавіліся цэнтрам рамёстваў і гандлёвай дзейнасці насельніцтва. На месцы ўмацаванага дрыгавіцкага гарадзішча вырас і горад Мазыр, хоць яго насельніцтва доўгі час працягвала займацца сельскай гаспадаркай.

Апрача легендарнай версіі паходжання назвы «Мазыр», якая прыводзілася ўжо ў гэтай кнізе, ёсць і версія навуковая. Як лічаць беларускія даследчыкі В. Жучкевіч і А. Рагалёў, вытокі назвы «Мазыр» можна звязваць з назвай этнаграфічнай групы заходнеславянскага (польскага) насельніцтва — мазуры. Даследаванні апошніх гадоў сведчаць аб этнічных сувязях паміж усходнімі і заходнімі славянамі яшчэ ў VIII — X стст. У XI — XII стст. актывізуюцца гандлёва-эканамічныя, палітычныя і культурныя сувязі заходніх славян з насельніцтвам Беларусі. Мабыць, у гэты час сюды з Захаду і пранікаюць геаграфічныя назвы ад этнічнага тэрміна «мазуры», хоць ён сустракаецца ў пісьмовых крыніцах толькі з XV ст. Адсюль вынікае, што назвы, роднасныя «мазурам», маглі паявіцца на Беларусі не пазней гэтага часу. Мазуры былі адной з найбольш вялікіх этнічных груп Польшчы, рускія князі хадзілі на іх паходамі яшчэ ў XI ст. Тады была вядома толькі назва «мазаўшаны». Кіеўскія дружыны прыводзілі палонных, якія рассяляліся ў ваколіцах Кіеўскага княства. Шлях на мазавецкія землі ішоў па Прыпяці, і мазаўшаны маглі асесці на пастаяннае месца жыхарства на беларускім Палессі.

А. Рагалёў прапануе і яшчэ адно тлумачэнне тапоніма. У іранскіх мовах ёсць слова «мазар», «мосар» ці «мазор» — старажытныя пахаванні, курганы, пагоркі. Мазыр раскінуўся на ўзвышшах сярод балот і багнаў Палескай раўніны, таму назва Мазыра ад слова «мосар» можа тлумачыцца і асаблівасцямі геаграфічнага ландшафту... У той час пасяленні знаходзіліся адно ад аднаго за дзесяткі вёрст і былі ізаляваны працяглы час, асабліва ў паводку. Водныя шляхі дапамаглі абжываць гэты край, немалую ролю ў гэтым адыгрывалі і волакі. Таму А. Рагалёў звяртае ўвагу на тое, што слова «мосар» па сваім гучанні напамінае слова «мосер» ці «мосьер», што ў мове народаў комі азначае «волак», «шлях па водараздзеле», «лагчына».

І яшчэ адна версія. У канцы першага — пачатку другога тысячагоддзя многія гандлёвыя гарады Кіеўскай Ру-

сі ўзбройваліся, запасаліся «ратнымі людзьмі». Магчыма, Мазыр з'яўляўся адным з гандлёвых пунктаў на водным шляху ў старажытнасці «из варяг в греки». Уверх па цячэнні Прыпяці — у раёне вёсак Загорыны і Лучажэвічы, уніз — Акулінкі і Стрэльска знаходзіліся вартавыя пасты, якія абаранялі подступы да горада. Не абышлося тут без варагаў. У X і XI стст. варагі часта прыходзілі на Русь — з гандлёвымі мэтамі ці па закліку рускіх князёў, якія набіралі з іх свае дружыны. «Аповесць мінулых гадоў» называе варагаў жыхарамі Паўночнай Еўропы, што жылі па берагах Варажскага (Балтыйскага) мора. Гэта былі шведы, нарвежцы, датчане, готы, англы. Многія з іх засталіся тут назаўсёды, жаніліся. Дзеці іх былі паўварагамі, унукі — дасканалымі славянамі, але пэўная частка моўнай культуры варагаў перадалася жыхарам Палесся. Словы «масур» — клён і «мосыр» — сырасць — са старажытнаскандынаўскай мовы. Калі вольна інтэрпрэціраваць іх значэнне, паводле В. Жучкевіча, назву горада Мазыр можна перакласці як «горад пад клёнамі» ці «сырое месца».

Першае ўпамінанне аб Мазыры адносіцца да 1155 г. у «Аповесці мінулых гадоў» — Іпацьеўскім летапісе.

Прыпяць, буйнейшы прыток Дняпра, стварала насельніцтву горада спрыяльныя ўмовы для гандлю, рамеснай вытворчасці, рыбнай лоўлі, умацаванню і росту горада. Але ва ўмовах феадальнай раздробленасці, маючы моцных суседзяў — на захадзе Тураў, па паўднёвым усходзе — Кіеў, на ўсходзе — Чарнігаў, Мазыр не мог сфарміравацца як цэнтр самастойнага княства. Тэрыторыя Мазыршчыны стала арэнай пастаянных княжацкіх усобіц. Часта над горадам падымаўся дым ваенных пажарышчаў.

У 1170 г. каля Мазыра адбылася ўзброеная сутычка паміж князямі Рурыкам, Давідам Расціслававічам і Міхаілам Юр'евічам. Першыя два былі саюзнікамі Андрэя Багалюбскага, сына Юрыя Далгарукага, які вёў барацьбу за Ноўгарад з кіеўскім князем Мсціславам Валынскім. Міхаіл Юр'евіч падтрымліваў бок кіеўскага князя, папераменна знаходзіўся ў залежнасці ад варожых, больш моцных княстваў.

З канца XII ст. на Мазыршчыне з'яўляюцца са сваімі дружынамі літоўскія князі. П. М. Шпілеўскі, спасылаючыся на летапіс Нарбута, паведамляе, што ў 1174 г. Мазыр быў захоплены літоўскім князем Скірмундам. «После поражения хана Балаклая Койданова Скирмунд занимает Мозырь, Чернигов, Стародуб, Карачев». Літоўскія феадалы імкнуліся падпарадкаваць землі па сярэднім цячэнні Прыпяці, але ў 20-я гады XIII ст. у іх з'яўляецца сапернік — татара-манголы. Здзяйсняючы волю феадальнай знаці, Чынгісхан, стаўшы ў 1203 г. уладаром манголаў, накіраваў вялікія орды на пакарэнне бліжэйшых народаў, імкнучыся стварыць вялікую дзяржаву, «куды ступіць капыт мангольскага каня». У 1223 г. на рацэ Калцы татара-манголы нанеслі сакрушальны ўдар па сілах палавецкіх ханаў і рускіх князёў і накіраваліся на захад, памятаючы, што там ляжыць багатая, але аслабленая ўзаемнай варожасцю феадалаў зямля. Асабістыя амбіцыі ўдзельных вялікіх і малых правіцеляў трымалі верх над агульнадзяржаўнымі інтарэсамі. І, мабыць, першы з конных атрадаў татара-манголаў з'явіўся пад Мазыром праз чатыры гады пасля бітвы на Калцы. У 1228 г. ён уступіў у бой з дружынай літоўцаў і мазыран, захапіў, разрабаваў і спаліў горад, яго ваколіцы. На працягу больш як дзесяці гадоў пасля гэтага не было чуваць пра заваёўнікаў.

Наступіў 1241 год. Унук Чынгісхана Батый пасля таго, як захапіў і разбурыў Кіеў, накіраваў вялізную арду на захад, у Венгерскую даліну, каб даць адпачынак воінам і забяспечыць корм коням. Адзін з атрадаў пад камандаваннем Койдана і Каюна (пляменніка Батыя) у студзені падышоў да Мазыра. Горад зноў быў разбураны, яму не хутка ўдалося адбудавацца.

Археалагічныя знаходкі канца XIII — пачатку XIV стст. на мазырскім гарадзішчы вельмі рэдкія і фрагментарныя. Відаць, жыццё тут толькі адраджалася. Жыхары, якія засталіся жывымі, напалоханыя жорсткім прыгнётам заваёўнікаў, разышліся і схаваліся ў нетрах палескіх лясоў, у непраходных балотах. Уладанне татара-манголаў на Мазыршчыне было нядоўгім. У 40—50-я гады XII ст., імкнучыся як мага больш сабраць даніны з мясцовага насельніцтва ў міжрэччы Прыпяці і Дняпра, татара-манголы займаліся павальным рабаўніцтвам. У 1259 г. хан Койдан (яго атрад даходзіў да Давыд-Гарадка і, мяркуючы па тапоніму Койданава, дасягнуў заходніх рубяжоў Мінска) раскінуў свой стан недалёка ад вусця Прыпяці. Літоўска-беларускія дружыны незаўважна, лясамі падкраліся да ворага, нечакана напалі на яго і знішчылі. Тое ж здарылася і з другімі атрадамі рабаўнікоў. Кароткаму і жорсткаму татара-манголь-скаму гаспадаранню на гэтых землях быў пакладзены канец, хаця набегі крымскіх татар працягваліся.

У час мірных перадышак Мазыр кожны раз адраджаўся з попелу, адбудоўваўся ўпартай працай яго жыхароў. Да саракавога года XIV ст. Мазыршчына канчаткова ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага. На чатыры з паловай стагоддзі Мазыршчына адыходзіць ад рускай дзяржавы, з якой звязаны пачатковы перыяд яе летапіснай гісторыі.

Культура старажытнай Русі, у склад якой у XI — XIII стст. уваходзіў Мазыр, развівалася на аснове традыцый папярэдняга перыяду. Значнае месца ў культурным жыцці народа займала рэлігія. Пасля пераходу ў канцы X ст. ад язычніцтва да хрысціянства афіцыйнай рэлігіяй пануючага класа феадалаў становіцца праваслаўе. З распаўсюджаннем уплыву праваслаўнай царквы звязана і з'яўленне на Русі школ. Першыя школы на Мазыршчыне ствараліся пры цэрквах, а іх з'яўленне адносіцца да часу старажытнай Тураўскай епархіі, якая ўзнікла, як сцвярджае І. Зяленскі, у пачатку XII ст. Але М. Ермаловіч стварэнне епіскапата ў Тураве адносіць да 991—992 гг., г. зн., ён быў адзін з першых на беларускай зямлі. У школах выкладалася чытанне, пісьмо, першапачатковыя догматы рэлігіі на славянскай мове.

Зараджэнне і развіццё культурных і асветніцкіх пачаткаў на Мазыршчыне звязана з імем вядомага пісьменніка, публіцыста і царкоўна-палітычнага дзеяча Кірылы Тураўскага (каля 1130—1182). Нарадзіўся ён у багатай сям'і і атрымаў вельмі добрую для свайго часу адукацыю. Пазней стаў епіскапам Тураўскім. Гэта быў высокаадукаваны чалавек. Ён выступаў супраць рэшткаў язычніцтва, крытыкаваў адмоўныя бакі быту манахаў, звяртаўся да філасофіі, займаўся літаратурай, быў выдатным прамоўцам і вучоным. Кірылам Тураўскім па праву ганарыцца не толькі Палессе, але і ўся беларуская зямля.

Час Кіеўскай Русі на Мазыршчыне быў нялёгкім. Многа разоў горад і навакольныя вёскі знішчаліся заваёўнікамі. Не прынясе асаблівага спакою насельніцтву Палесся і час знаходжання ў складзе Вялікага княства Літоўскага і Польскай дзяржавы, які працягваўся чатыры з паловай стагоддзі. Такая доля насельніцтва, якое жыве сярод іншых, больш шматлікіх народаў.

А. Бобр

Даследчык старажытнай Мазыршчыны

Завітневіч Уладзімір Зянонавіч нарадзіўся 2(14).3.1853 г. у в. Ліцвяны цяпер Уздзенскага раёна Мінскай вобл. У 1878 г. скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію, працаваў настаўнікам у Варшаве, з 1884 г. — у Кіеўскай духоўнай акадэміі. Прафесар. Беларускі археолаг.

Уладзімір Завітневіч асабліва лю-

біў прыязджаць з блізкага адсюль Кіева на Мазыршчыну. У Скрыгалаве жылі яго родзічы. Адзін з іх, Васіль Завітневіч, таксама вялікі патрыёт роднага краю, служыў свяшчэннікам скрыгалаўскай царквы. Вынікам цікавых размоў блізкіх па духу людзей з'явілася тое, што Уладзімір Зянонавіч вырашыў шукаць сляды далёкіх продкаў на поўдні Беларусі.

Нястомны даследчык за свае сродкі арганізаваў некалькі палескіх экспедыцый, выявіў каля 700 курганоў, звыш 80 могільнікаў дрыгавічоў і палян. Толькі ў ваколіцах вёсак Барыскавічы, Лешня, Скрыгалаў, Слабада ў 1889 г. Завітневіч даследаваў больш за 200 старажытных курганоў, на 60 з іх правёў раскопкі. Ён знайшоў пахаванні далёкіх продкаў, шматлікія прадметы, якімі яны карысталіся, — посуд, нажы, крэсівы, жаночыя ўпрыгожанні і іншыя прадметы, што дазволілі зрабіць значныя вывады і адкрыцці ў галіне археалогіі. Вучоны вызначыў межы рассялення дрыгавічоў, іх этнічныя вызначальныя прадметы ў час нараджэння старажытнай дзяржаўнасці ў VIII—XII стст. Даследаваў ён не толькі Мазыршчыну — арганізаваў экспедыцыі і ў іншыя гарады Палесся.

Вынікамі археалагічных даследаванняў У. З. Завітневіча з'явіліся ягоныя кнігі: «У археалагічнай экскурсіі ў Прыпяцкае Палессе» (1890), «Другая археалагічная экскурсія ў Прыпяцкае Палессе» (1891) і іншыя. Матэрыялы даследаванняў і цяпер захоўваюцца ў археалагічных музеях Мінска, Кіева, Масквы.

Памёр У. З. Завітневіч у сакавіку 1927 г.

М. Капач

У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай

На пачатак XV ст. межы Вялікага княства Літоўскага распасціраліся ад Жмудзі (Жэмайціі — заходняй часткі сучаснай Літвы) і Падляшша на поўначы да прычарнаморскіх стэпаў на поўдні. Пры вялікім князю Вітаўце была захоплена тэрыторыя паміж вусцем Дняпра і Днястра, воіны княства выйшлі да берагоў Чорнага мора.

У складзе Вялікага княства Мазыр працягваў развівацца як гандлёва-рамеснае пасяленне, статус яго — «гаспадарскі горад», што азначае — Мазыр з'яўляўся маёмасцю дзяржавы.

Паступова паблізу Мазыра ўтвараліся «іншыя вясковыя пасяленні людзей». У дакументах XIII ст. з'явілася першае ўпамінанне аб Скрыгалаве. Каля 1432 г. упершыню ўпамінаюцца і вёскі Міхалкі, Барбароў, Мялешкавічы, у 1515 г. — Прудок.

У 1413 г. на Гродзенскім сейме ў Літве было вырашана стварыць ваяводствы па польскім узоры. Мазыр з ваколіцамі ўвайшоў у склад Мінскага ваяводства, якое падзялялася на тры паветы — Мінскі, Рэчыцкі і Мазырскі.

Мазырскія гандляры ў XV ст. мелі вялікія сувязі, прыпяцкі гандлёвы шлях звязваў іх з Кіевам, Пінскам, Брэстам, а праз гэтыя гарады — з Масковіяй, Польшчай, Прыбалтыкай. Але ўлада вялікага літоўскага князя не магла абараніць горад і навакольныя вёскі ад разбурэнняў, якія адбываліся ў час частых набегаў крымскіх і нагайскіх татар — у 1497, 1521 і нават 1534 гг.

Час быў вельмі нялёгкі, амаль штогод неўраджай, частыя татарскія набегі. Вясною 1498 г. пачаўся голад. Яшчэ больш цяжкім аказаўся апошні набег ворагаў. П. М. Шпілеўскі пісаў: «З першых гадоў улады Сігізмунда I перакопскія татары пачалі трывожыць заходнерускі край Мазыр, адзін з першых гарадоў, які стаў ахвярай заваёўнікаў. Татарскія набегі на Мазыр нарадзілі герояў, сярод якіх народныя песні праслаўляюць храбрасць бясстрашнага Базара, родам з Грэцыі. Базар не раз граміў татараў,

ва ўзнагароду за гэта ад Сігізмунда атрымаў маёнтак Іпагор, што знаходзіўся недалёка ад Мазыра. Праз два гады татары захапілі Базара ў палон і забілі. Іпагор перайшоў ва ўладанне другога храбрага воіна, Дзям'яна Ленкі, якога называлі Ленка Іпагорскі. Прозвішча Ленка, пазней — Лянкевіч, вядомае на Мазыршчыне тым, што адзін з Лянкевічаў быў першым мазырскім старастам. У 1534 г. татары зноў спалілі горад, перарэзалі ўсіх жыхароў. Мазыр перастаў існаваць як горад на працягу амаль стагоддзя — да 1609 г. ...»

Звесткі аб гібелі горада ад татарскага набегу, магчыма, перабольшаны аўтарам.

Пад уражаннем татарскага нападу на Кіеў у 1482 г. староста Міхаіл Гашны пабудаваў Мазырскі замак і ўдасканаліў былы гарадскі дзядзінец. Першыя датаваныя сведкі пра гарадскі замак адносяцца да 1509 г. Ён складаўся з трох вежаў за ўмацаваным парканам, злучаных агароджай, і некалькіх збудаванняў між імі, якія таксама выконвалі абаронную ролю. У замку знаходзілася царква св. Спаса, некалькі жылых і гаспадарчых пабудоў, калодзеж. Рэшткі аднаго з будынкаў знойдзены пры раскопках паўночнай часткі замчышча.

У 1507 г. пачалася вайна з Рускай дзяржавай. Частка беларускіх і ўкраінскіх феадалаў на чале з Міхаілам Глінскім спрабавала перайсці ў падданства маскоўскага князя. Глінскі адкрыта выступаў супраць Сігізмунда I. Глінскага падтрымалі жыхары Мазыра, Гомеля, Бабруйска і іншых гарадоў. Па некаторых звестках, ён пры падтрымцы рускіх войск захапіў Мазыр і ў 1508 г. тайна заключыў тут пагадненне з крымскім ханам Менглі Гірэем.

Не паспеў горад адбудавацца пасля пагромаў, нанесеных перакопскімі татарамі ў 1521 і 1534 гг., як пачалася новая вайна з Масквой. Маскоўская рацць пад кіраўніцтвам князя Фёдара Аўчыны — Целяпнёва-Абаленскага рушыла са Старадуба ў паход на захад, знішчыла ваколіцы Магілёва, Турава, не ўступаючы па лютасці татарам. У 1536 г. быў разбураны Мазыр.

Але горад працягваў існаваць, пра гэта сведчаць апісанні маёмасці, якія былі праведзены ў 1552 і 1576 гг. у Мазырскім замку. Намеснікам польскага караля мазырскім старастам Міхалаем Падляцкім быў адноўлены замак. Староста зазначаў, што ён будзе сімвалам вечнага ўладання тут польскай кароны.

Пабудова ўяўляла ўжо ўмацаванне. На ўзбраенні мелася 10 гармат (5 вялікіх і 5 малых), 53 гакаўніцы, дастатковая колькасць ядраў, свінцу і серы. Да замка былі прыпісаны дзве воласці: Мазырская (28 сёл) і Бчыцкая (14 сёл). У дакументах упамінаюцца Мялешкавічы — 29 мужчын, Барыскавічы — 13, Скрыгалаў — 28 мужчын і 2 удавы, Касцюковічы — 17 мужчын...

Мазырская воласць займала тэрыторыю ад р. Пціч на захадзе да р. Віць на ўсходзе. Мазырскі замак лічыўся дзяржаўным, на яго працавалі не толькі мазырскія мяшчане, але і сяляне прыпісаных да замка валасцей. Мяшчанскае насельніцтва горада і сяляне валасцей неслі на карысць замка шэраг павіннасцей, акрамя таго — цяглае. Насельніцтву патрэбна было плаціць таксама пазямельны падатак. Мяшчане мелі магчымасць нарыхтоўваць дровы, лес для будоўляў, касіць сена. 30 мяшчанскіх двароў мелі ворную зямлю, якую яны арандавалі і куплялі ў вакольных сялян. За гэтыя надзелы яны плацілі падаць куніцамі і 7 грошаў. Тыя, у каго не было ворнай зямлі, плацілі «паваротшыну» — падворную падаць па 1 грошу і 2 пенязі.

Для патрэб замка бралі дарожную пошліну — «мыта вадзяное» (з гандляроў, што плылі па рацэ), а таксама з тых, хто ездзіў «сухой дарогай». Меліся пабудаваць мост цераз Прыпяць, для яго патрэб з воза бралі 0,5 гроша, а калі везлі соль, рыбу, гарэлку, то асобную плату.

Склад гарадскога насельніцтва на мяжы Беларусі і Украіны быў разнастайны і непастаянны, некаторых жыхароў называлі «прахожымі». Па запісу 1552 г. у Мазыры жыло 1500 чалавек, з іх мяшчане падзелены на тры групы: нізавыя — 73, мужчынскага полу (да іх адносілася адна ўдава дадаткова), верхавыя — таксама 73, сярэднія — 53 чалавекі. Баярскіх людзей зарэгістравана 53, слуг — 5.

Паводле «Статусу на валокі» Сігізмунда II Аўгуста, прынятага ў 1557 г., у сялян адразалі зямлю. Нормай надзелу для адной гаспадаркі была валока зямлі (21,3 га), разбітая на тры полі. Беднякі атрымалі надзелы ў паўвалокі. Дварышчы распадаліся на асобныя «дымы», якія звычайна складаліся з

дзвюх простых сем'яў (бацька і жанаты сын, два сыны і г. д.). Устанаўлівалася паншчына: 2 дні ў тыдзень з валокі, плата аброку грашыма і прадуктамі. Селянін пазбаўляўся права пераходу да другога феадала, павінен быў аддаваць дзесяціну на карысць царквы, выконваць дзяржаўныя павіннасці (рамонт замкаў, дарог, перавозкі і інш.). Жыхары Мазыра адмовіліся плаціць натуральныя павіннасці, матывуючы гэта наступным чынам: «Мы, как люди городские, будем жить торговлей, ремеслом и рекой». Гэтая з'ява сведчыць пра тое, што ў сярэдзіне XVI ст. горад, нягледзячы на свае невялікія памеры, пачынае выдзяляцца з сялянскай акругі.

У 1564 г. у склад Мазырскага павета ўвайшла Брагінская воласць. З 1566 г. Мазырскі павет па рэформе Вялікага сейма перайшоў у склад Кіеўскага ваяводства. Але пасля прыняцця Люблінскай уніі і ўтварэння ў 1569 г. Рэчы Паспалітай — аб'яднанай польска-літоўскай феадальнай дзяржавы, куды ўвайшлі беларускія і ўкраінскія землі, Мазыр зноў становіцца павятовым цэнтрам Мінскага ваяводства.

У снежні 1576 г. у гарадскім замку пад кіраўніцтвам Матэвуша Вазніцкага была праведзена інвентарызацыя.

У справаздачы аб ёй чытаем: «Спачатку, ля ўвахода ў замак, першая вежа каля замкавых варот, з левага боку з 6 выпраўленымі ярусамі (вароты замка знаходзіліся ў пачатку сучаснай вуліцы Гара Камунараў, насупраць ваенкамата). Другая вежа, па левы бок ад увахода ў замак — з 6 ярусамі, 2 без насцілаў. Трэцяя вежа — Пцічская, на ёй купал, накрыты белай бляхай, 6 ярусаў, толькі 3 з насціламі. У гэтай вежы святліца з печчу, вокны без шкла. Таксама ў 6 ярусаў, 5 з насціламі і чацвёртая вежа, з аднаго боку якой — святліца, насупраць яе — клець без шкла, з другога боку вежы — другая святліца з печчу, насупраць — пакой з вокнамі без шкла. З правага боку — пятая вежа з 6 цэлымі ярусамі. Пасярод замка — царква св. Спаса, перад царквою на ганку — звон. Знізу 2 святліцы з печамі, вельмі дрэннымі, і 2 клеці падгнілыя, без шкла. Трэцяя вялікая святліца незашклёная каля самай зямлі. Насупраць яе — сенцы з абадранаю страхою. Грыдніца ў замку таксама з абадранай страхой, насупраць яе — кухня. Калодзеж крыты, з адным вядром. З добрых свірны, адзін пограб добры, другі завалены. Усё ў замку, як вежы, так і сцянныя зубцы, у значнай частцы не пакрыты.

Агнястрэльная зброя ў замку — медная гармата, якая стаіць каля варот, у 9 з паловай пядзяў, другая гармата на той жа вежы; каля варот таксама гармата ў 9 з паловай пядзяў, трэцяя ў той жа вежы на трэцім ярусе — у 13 пядзяў, чацвёртая — па правы бок ля ўвахода ў замак, у 9 з паловай пядзяў. Усе гарматы стаяць на акаваных калёсах з усімі прыналежнасцямі. Тры акаваныя жалезныя малакаліберныя гарматы. Старая жалезная гармата ў 3 пядзі прывязана да лафета. Жалезная ступа, каб здрабняць порах, 46 пішчаляў. Клець, абмазаная глінай, для захоўвання пораху, 2 рыбныя бочкі і палова бочачкі пораху. Порах для пішчаляў — першая бочка няпоўная на тры кольцы, другая няпоўная на пядзю, трэцяя няпоўная на далонь, чацвёртая — поўная, пятая бочка на пядзю, але бочкі не аднолькавыя, вялікія, таксама мазырскія рыбныя. Порах для ружжаў — першая бочка на далонь няпоўная, другая бочка ў куце каля яе зусім поўная, трэцяя і чацвёртая на далонь няпоўныя. У пятай бочцы, таксама рыбнай мазырскай, больш паловы серы... Ядраў на дзвюх вялікіх гармат каменных — 190 аднаго калібра, да трэцяй гарматы доўгай — 22 ядры, аблітыя свінцом, да яе ж і 4 каменныя ядры. Да чацвёртай малой гарматы, якая знаходзіцца ў вежы, справа ад увахода ў замак, 20 ядраў, аблітых свінцом. Малых ядраў, аблітых свінцом, для малакаліберных гармат — 18. Куль для пішчаляў — 600, падпорак гарматных — 18, 2 жалезныя кліны ляжаць каля ядраў. 11 парахаўніц для пішчаляў.

Мост да замка высокі, стары, моцна пашкоджаны, пешшу па ім не пройдзеш. Перад замкам — дзве святліцы, адна насупраць другой, у якіх бэлькі падгнілі, няма печаў і часткова даху, няма шкла. Пякарня і насупраць яе кухня з абадраным дахам. Канюшня з аднаго боку падгніла...»

Згодна з дакументам, у Мазыры налічвалася 550 дамоў, рынак з 44 каморамі (лаўкамі), 5 цэркваў, шпіталь. Насельніцтва горада — каля 2 тысяч чалавек.

28 студзеня 1577 г. кароль Рэчы Паспалітай Стэфан Баторый падпісаў грамату, па якой Мазыр удастойваўся Магдэбургскага права — некаторай самастойнасці ў кіраванні.

Па Магдэбургскаму праву парадак выбараў у органы самакіравання ў Мазыры быў аднаступенчатым: мяшчане з войтам выбіралі ўвесь склад гарадской улады. Гэты орган самакіравання на чале з бургамістрам збіраўся не радзей як адзін раз у тыдзень «ці столькі, колькі будзе неабходна». Гарадскім войтам

быў назначаны падкамарый віленскі — Мікалай Ясінскі, якому была дадзена поўная ўлада «па ўсіх справах аб крымінальных злачынствах». У дапамогу войту гараджане павінны былі выбіраць чатырох асоб, якія пастаянна жылі ў горадзе. Мазыру была «даравана» ўласная пячатка. Гарадское насельніцтва мела права высечкі ў лесе дрэў для гаспадарчых патрэб — на чатыры мілі вакол Мазыра. У дадатак да рыначнага гандлю, які праводзіўся кожную пятніцу, былі зацверджаны два кірмашы ў год: у жніўні ў дзень святога Іллі і ў студзені на святога Васілія.

Пасля заключэння ў 1596 г. Брэсцкай царкоўнай уніі кароль Рэчы Паспалітай Сігізмунд III даў рускаму духавенству Мазыра поўную свабоду ад ваяводы і «ўсялякіх грамадзянскіх улад», што на гэты час было актам выключнай верацярпімасці. Але не ўсё было добра ў жыцці гараджан і вяскоўцаў. Летапісец пісаў у 1587 г.: «Мало не пуста земля была ... неурожай, голоды великие, болезни, мор, лета ненастные, неурожайные...» А тут яшчэ пастоі войскаў. У 1596 г. у Мазыры стаяў гетман Палоус, казакі прынеслі жыхарам многа крыўд і разбурэнняў. У «Геаграфічным слоўніку каралеўства Польскага» ў 1885 г. паведамлялася: «Около 1603 г. произошло великое бедствие в Мозыре. Управлял тогда староством некто Полонский, привлеченный якобы сокровищами местных замковых стен, приблизил к себе замковую казну и, предав огню замок и город, пропал без вести. Выгорел тогда замок и город полностью, закрыл тайну низкого поступка в пожарищах и руинах, так как Полонский исчез бесследно, оставив только домыслы для истории».

На пачатку XVII ст. мяшчане Мазыра прынялі рашучыя меры супраць феадалаў, якія мелі вока на горад. Прычынай незадаволенасці быў мазырскі староста, які падпарадкаваў частку мяшчан горада, аб'явіўшы іх сваімі падданымі: «...яны знаходзяцца пад юрысдыкцыяй замка, гэта значыць пабаўлены Магдэбургскага права ...» З кастрычніка 1615 г. даведзеныя да адчаю феадальнымі паборамі, самавольствамі гарадскога старасты, замкавай адміністрацыі і арандатараў жыхары Мазыра, на чале з бургамістрам Жданам Мушам, гараджанамі Іванам Крыцкім, Іванам Валчковым, Астапам Лаўрыновічам і іншымі, узброіліся і захапілі замак. У сутычцы былі забіты тры прадстаўнікі замкавай адміністрацыі і некалькі арандатараў. Улада перайшла ў рукі магістрата, але да поўнай перамогі было далёка. Каралеўскі намеснік не захацеў вярнуць пад юрысдыкцыю магістрата тую частку жыхароў Мазыра, якую ён хацеў падпарадкаваць сабе. Летам 1616 г. мазыране зноў узяліся за зброю і напалі на замак, да іх далучыліся жыхары ваколь ных вёсак. З вялікай цяжкасцю каралеўскім войскам і шляхце ўдалося падавіць паўстанне, але праз некалькі месяцаў яно разгарэлася з большай сілай. Яго ўдзельнікам стала ў асноўным гарадская бедната, ці, як гаворыцца ў дакуменце, «люди свовольные, людные». Мяшчане арганізавалі атрад у некалькі соцень чалавек. Паўстанцы адмовіліся плаціць пошліны і паборы ў казну, арыштоўвалі жыхароў горада, якія не прымалі ўдзелу ў паўстанні. Гнеў паўстанцаў быў скіраваны на арандатараў і шляхту. Шляхце з ваколіц было забаронена выязджаць у горад пад страхам смерці. Акружыўшы замак, паўстанцы захапілі ўладу, выбралі войта, захапілі казну. Паборы, якія паступалі ў казну, накіравалі ў даход горада.

Паўстанне гараджан Мазыра, якое пачалося як барацьба за захаванне іх саслоўных прывілей, разгарнулася ў сацыяльна-палітычны рух гарадскіх нізоў супраць феадальнага класа і гарадской вярхушкі. Але вынікамі перамогі паўстанцы доўга карыстацца не маглі. Некалькі месяцаў цягнуўся судовы разгляд у велікакняжацкім судзе. Паўстанцы абвінавачваліся, акрамя ўсяго іншага, у тым, што «з-за бунту некалькі

месяцаў не засядаў замкавы суд». Усё ж улады вымушаны былі пайсці на некаторыя ўступкі. У 1622 г. суд прыняў рашэнне: мяшчане, якія знаходзіліся пад уладай замка, атрымалі Магдэбургскае права і перадаваліся пад юрысдыкцыю гарадскога самакіравання. На карысць горада аддавалася частка збораў з гандлю і рамесніцтва. У 1588 г. быў прыняты трэці Статут Вялікага княства Літоўскага, які юрыдычна аформіў запрыгоненне беларускіх сялян, а ў кастрычніку 1596 г. у Брэсце была заключана царкоўная унія, якая фактычна паставіла ў Рэчы Паспалітай праваслаўную царкву ў залежнасць ад каталіцызму. Да эканамічнага і нацыянальнага прыгнёту дабавіўся і рэлігійны — гвалтоўнае насаджэнне каталіцкай веры сярод жыхароў Мазыра і Мазырскага павета, бо тутэйшае насельніцтва ў большасці было праваслаўным.

Незадаволенасць народа феадальнымі паборамі, узмацненне нацыянальнага і рэлігійнага гнёту расло. У 1648 г. гэта вылілася ў нацыянальна-вызваленчую вайну, якая разгарнулася на Украіне і ў Беларусі. Асноўнай сілай паўстанцаў былі запарожскія казакі пад кіраўніцтвам гетмана Багдана Хмяльніцкага. Сваю ролю ў гісторыі «казацкіх войн» адыгралі і жыхары Мазыршчыны.

Паўстанне, якое пачалося на Украіне, перакінулася на тэрыторыю Беларусі. Узняліся многія беларускія гарады, у ліку першых — Брэст, Пінск, Тураў, Мазыр. Багдан Хмяльніцкі надаваў гэтаму вялікае значэнне, — беларускія гарады прыкрывалі правы фланг войска казакаў і прыцягвалі значныя ваенныя сілы Рэчы Паспалітай. На дапамогу беларусам ён прыслаў атрады казакаў на чале з Галавацкім, Крывашапкам, Мікуліцкім, Гаркушам, Сакалоўскім, Гутам і іншымі атаманамі. Разумелі значэнне гэтых гарадоў і ў Рэчы Паспалітай, сюды накіраваў першыя ўдары свайго войска віленскі польны (пагранічны) ваявода Януш Радзівіл. Яго харугвы, якія складаліся з наёмнікаў і шляхты, разлічвалі, захапіўшы Тураў, Пінск і Мазыр, перарэзаць шляхі казацкім атрадам з Украіны на Беларусь, скіраваць удар на фланг і тыл войска Хмяльніцкага. Да пачатку лета 1648 г. Мазыр стаў важным пунктам сканцэнтравання атрадаў паўстанцаў, байцамі якіх станавіліся жыхары горада, сяляне навакольных вёсак. Іх узначаліў мазырскі рамеснік Іван Столяр. Гараджане складалі асобую харугву на чале з рамеснікам Седляром.

У пачатку жніўня ў Мазыр прыбыў пасланы Хмяльніцкім двухтысячны атрад атамана Яна Сакалоўскага, які пайшоў адсюль на Слуцк. На змену яму прыйшлі казакі палкоўніка Міхненкі, што знаходзіліся на Тураўшчыне. Атрад шляхты і наёмнікаў пад кіраўніцтвам Баловіча быў разбіты нечаканым ударам каля Мазыра, рэшткі яго разбегліся. Мазырскія паўстанцы аб'ядналіся з казакамі Міхненкі, расправіліся з прыхільнікамі каталіцкай царквы і старой улады.

Захапіўшы ў кастрычніку 1648 г. Пінск, войскі Радзівіла накіраваліся трыма калонамі ўздоўж берагоў Прыпяці на ўсход. Каля Нобеля да яго далучылася войска Мірскага. Шляхціцы мелі звесткі аб тым, што да канца жніўня — пачатку верасня сілы паўстанцаў у Мазыры складалі «400 человек из черни здешних краёв. Среди этих 400 набрана одна хоругвь из самого города». Колькасць казакаў сярод паўстанцаў, як здавалася Радзівілу, была невялікай. 18 студзеня 1649 г. харугвы шляхціцаў і наёмнікаў падышлі да Турава. У горадзе знаходзілася каля 2 тысяч паўстанцаў, кіраўніком якіх быў Кандрат Цэўка — «палкоўнік тураўскі». У яго атрадзе налічвалася каля чатырохсот казакаў. Жыхары Турава, даведаўшыся аб падыходзе да горада вялікіх сіл праціўніка, адышлі да Мазыра без бою.

Пакінуўшы ў Тураве абоз, Радзівіл рушыў уніз па Прыпяці, да Мазыра. Шэсць лёгкіх харугваў ён накіраваў

у Оўручскі брод, каб не даць магчымасці падысці падмацаванням з Украіны і перарэзаць шляхі адступлення паўстанцаў. Захапіўшы Скрыгалаў і Скрыгалаўскую Слабаду, Радзівіл выслаў да Мазыра разведку — адну з асабістых харугваў.

Размешчаны на правым беразе Прыпяці, па вяршынях і схілах узвышша, Мазыр быў добра ўмацаваны. На самым высокім месцы ўзвышаўся драўляны замак, вежы якога былі злучаны сценамі вышынёй ад 8 да 10 метраў з тоўстых дубовых бярвенняў, абмазаных са знешняга боку глінай. Вакол замка — высокі вал і роў, праз які быў перакінуты мост, што злучаў крэпасць з пасадам. Па схілах узвышша вакол замка — дамы, лаўкі, майстэрні, гаспадарчыя пабудовы пасада. З трох бакоў горад, як і замак, абнесены драўлянай сцяною, валам і глыбокім ровам — да 10 метраў. З боку высокага і абрывістага берага Прыпяці ўмацаванняў не было. Хвалі ракі пляскаліся там, дзе зараз размешчана набярэжная вуліца, а плошчы, што акружаюць Замкавую гару, былі залівамі Прыпяці...

Мазырскія і тураўскія паўстанцы рыхтаваліся да бою, умацоўвалі гарадскія і замкавыя сцены, вуліцы перагароджвалі ледзянымі глыбамі і драўлянымі зрубамі, запоўненымі зямлёй. Перад гарадской сцяной былі пабудаваны дадатковыя ўмацаванні з завостранымі бярвеннямі, укапанымі ў зямлю. Схілы валоў і бастыёны паўстанцы залілі вадою, уздоўж берага Прыпяці былі прасечаны шырокія палонкі. З гэтага боку да горада немагчыма было падступіцца.

Радзівіл накіраваў да паўстанцаў ганца з пісьмом, у якім патрабаваў адмовіцца ад супраціўлення і даць магчымасць яго войску ўвайсці ў горад, за што абяцаў гараджанам і казакам дазволіць свабодны выхад з горада. Але мазыране ўжо ведалі цану такім абяцанням: жыхары Турава і Пінска паверылі і па загаду Радзівіла былі знішчаны. Прапанова аб капітуляцыі была адхілена, а ганца закавалі ў ланцугі і пасадзілі ў склеп.

Харугвы, пасланыя ў бок Оўручскага броду, падышлі да Мазыра з поўдня і спыніліся на адлегласці каля мілі ад горада ў вёсцы Наружавічы (магчыма, цяперашнія Булаўкі ці Бабраняты). Паўстанцы на чале з Міхненкам зрабілі вылазку з асаджанага горада. Па паведамленні шляхціца Багуслава Машковіча, які знаходзіўся ў войску князя ў якасці храніста, наёмнікі і шляхціцы, якіх заспелі нечакана, ледзь уцяклі. Іх сцяганосец бег босы. Каля Наружавічаў драгуны стрымалі атрад Міхненкі, паўстанцы вымушаны былі вярнуцца ў горад.

У сярэдзіне студзеня харугвы Радзівіла падышлі да Мазыра і акружылі яго. На досвітку 20 студзеня ваявода загадаў пачаць штурм горада. Шляхта рынулася ў наступ, але атака не мела поспеху. Вораг панёс вялікія страты і быў адкінуты ад гарадскіх сценаў. Спроба ўварвацца з другога боку таксама скончылася няўдачай. Не прынеслі поспеху і атакі на пазіцыі мазыран і казакаў у конным страі. Тады Радзівіл загадаў войску спешыцца і пасля абстрэлу горада з гармат пачаў штурм з трох бакоў. Паўстанцы некалькі разоў адкідвалі ворагаў ад сцен, але доўга супрацьстаяць прафесійнай арміі не маглі. Драгуны пад прыкрыццем саней, нагружаных дровамі, наблізіліся да варот (па ўсёй верагоднасці, з боку цяперашняй вуліцы Фрунзе), выбілі іх цяжкім бервяном і ўварваліся ў горад. На вуліцах пачаліся жорсткія рукапашныя баі. Наёмнікі і шляхціцы адціснулі паўстанцаў ад гарадской сцяны, яны паміралі ва ўпартых баях, абараняючы кожны дом і барыкаду.

На зыходзе дня ворагі ўварваліся ў замак. Адна з груп паўстанцаў была адкінута на бераг Прыпяці і прыціснута да палонак, дзе адбылася апошняя адчайная бойка. Мазыране змагаліся да апошняга, гінулі ў ледзяной вадзе, але ў палон не здаваліся.

Адзін з кіраўнікоў паўстання, Сяд-

ляр, выкарыстаўшы цемру, вырваўся на кані з горада. Драгун ледзь не дагнаў яго, нават узняў шаблю, але конь аступіўся, і ён вылецеў з сядла. Конь драгуна пабег за паўстанцам, той пераскочыў на яго і ўцёк.

Асабліва вызначыліся сваёй жорсткасцю ў час штурму Мазыра камандзіры харугваў Н. Гонзеўскі і К. Тузенгаўз. Ворагі захапілі параненага палкоўніка Міхненку. Радзівіл загадаў скінуць яго з самай высокай, Пціцкай вежы замка, адсечаную галаву казацкага атамана насадзілі на піку гарадскіх варот.

Ворагі палілі дамы ў горадзе, жорстка распраўляліся з яго жыхарамі, дабівалі параненых. Па загаду Радзівіла замак быў падпалены. Што не згарэла ў агні — каменне падмуркаў, сцен і вежаў, кафля і чарапіца, бляха і рэшткі драўляных сцен, людзі разабралі на аднаўленне дамоў і гаспадарчых пабудоў. Мазырскі замак больш не аднавіўся.

Войска Радзівіла стаяла лагерам каля Мазыра на працягу тыдня, залечваючы атрыманыя ў час штурму раны. Наёмнікі і шляхціцы рабавалі не толькі горад, але і вакольныя вёскі, забівалі сялян, якія прымалі ўдзел у паўстанні. Затым з прыбыўшымі з Турава абозамі войска накіравалася ў напрамку Бабруйска на дапамогу паўтаратысячнаму атраду харунжага Валовіча.

Шляхце не ўдалося запалохаць беларусаў. Барацьба за незалежнасць працягвалася. Пасля Пераяслаўскай Рады ў 1654 г. разгарэлася новая вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. Паслаы з Кіева на Беларусь казацкі атрад падышоў 7 ліпеня таго ж года да Мазыра. Шляхціцы на чале з ротмістрам Паўшам уцяклі ў Петрыкаў. Жыхары Мазыра адчынілі казакам гарадскія вароты і прысягнулі на вернасць Расіі. Казакі не затрымаліся ў горадзе, праз некалькі дзён яны вярнуліся ў Кіеў.

Мазыршчына трапіла на некаторы час у зону дзеянняў рускіх войск. У 1659 г. Мазыр быў заняты атрадамі маскоўскага ваяводы Валконскага і знаходзіўся пад яго ўладай.

Па Андрусаўскім перамір'і 1667 г. Мазыр застаўся пад уладай Рэчы Паспалітай. У перыяд «казацкіх» войнаў горад вельмі пацярпеў, колькасць насельніцтва ў ім значна скарацілася. Пры каралі Яне Сабескім у 1676 г. была прынята пастанова аб бестэрміновым вызваленні Мазыра ад усякіх праходаў і пастояў войск. Між тым хваляванні на Мазыршчыне працягваліся. Як і раней, частымі гасцямі тут былі ўкраінскія казакі. У сакавіку 1677 г. у адказ на скаргі феадалаў Вялікага княства Літоўскага вялікі гетман Д. Вішнявецкі загадаў, каб ніхто «ў Літоўскім Палессі і найперш у Мазырскім і іншых паветах Вялікага княства Літоўскага не асмельваўся спыняцца, выбіраць правіянт і ўчыняць якія-небудзь хоць бы самыя малыя крыўды». Гетман папярэджваў, што тых, хто будзе разбураць шляхецкія маёнткі, чакае жорсткая кара. Аднак гэтае ўказанне не дало жаданых вынікаў.

Страты насельніцтва павета да канца XVII ст. склалі 60 працэнтаў. Кароль Аўгуст II вымушаны быў выдаць у 1698 г. спецыяльныя прывілеі на вызваленне горада ад усіх павіннасцей «з нагоды нанесеных яму разбурэнняў і варожых спусташэнняў». Мазыр паступова рос, мацнеў, ажыўляўся.

Для планіроўкі горада першай паловы XVIII ст. характэрная так званая веерная сістэма, утвораная вуліцамі, якія разыходзіліся ад рыначнай плошчы ў розныя кірункі. У інвентары 1724 г. упамінаюцца вуліцы Кіеўская, Оўручская, Свідоўская, Нагорная і Гончая. Вуліцы праходзілі ўздоўж ракі і каля Замкавай гары, іх назвы ў інвентары не прыводзяцца. За межамі горада ўздоўж дарог знаходзіліся вялікія памесці. Упамінаюцца два замкі — Верхні (Стары), які знаходзіўся на Замкавай гары, і Ніжні. Відавочна, гэтыя назвы адлюстроўвалі толькі памяць пра тыя часы, калі яшчэ не быў знішчаны сапраўдны замак.

Каля падножжа Замкавай гары знаходзілася рыначная плошча, на паўночны захад ад яе, на месцы цяперашняй цэнтральнай плошчы, — адміністрацыйныя будынкі. Тут размяшчаліся но-

Б) Копія пляну г. Мазыра 1769 году.

Копія плана Мазыра. 1769

вая гарадская ратуша, пякарня, канюшня. Акружалі плошчу 56 гандлёвых крам, тут знаходзіўся і шпіталь (багадзельня). У Мазыры быў шэраг культавых пабудоў: Мікалаеўская царква, царква св. Пятра, праваслаўны жаночы манастыр з царквой св. Пятніцы, заснаваны ў 1615 г. Фёдарам Абуховічам, царква св. Міхаіла, якая знаходзілася на Кіеўскай вуліцы, манастыр бернардзінцаў, касцёл езуітаў. На рыначнай плошчы размяшчаўся фарны (галоўны прыходскі) касцёл, заснаваны ў 1618 г. старастам Стравінскім — першая каталіцкая культавая пабудова ў Мазырскім старостве.

Участкі гарадской тэрыторыі, на якіх размяшчаліся двары мяшчан, вымяраліся ў прынтах (23,7 кв. м) і падзяляліся на пустыя, вольныя, аседлыя і бакавыя. Агульная колькасць іх у горадзе складала 2158 прынтаў, налічвалася 360 участкаў (пляцаў) пад забудову. Вольных — вызваленых ад усіх павіннасцей — 45 участкаў. Яны былі маёмасцю духоўных і свецкіх феадалаў. Такім чынам, у пачатку XVIII ст. трэць тэрыторыі Мазыра прыпадала на вольныя і пустыя плошчы, якія былі выключаны са сферы падаткаабкладання і выканання розных павіннасцей.

Памеры гарадскіх пляцаў былі неаднолькавымі. Сярэднія і буйныя мяшчанскія двары знаходзіліся на Оўручскай і Свідаўскай вуліцах, тут жылі і прадстаўнікі гарадской адміністрацыі. На Свідаўскай вуліцы знаходзіўся і дом маршалка павета і войта Мазыра Антонія Аскеркі. Найменшыя памеры ўчасткаў былі на Кіеўскай вуліцы. Была ў Мазыры карчма, млын, васкабойня.

Разам з рамесніцтвам гараджане займаліся сельскай гаспадаркай. За горадам знаходзілася 45 засценкаў (хутароў), найбольш буйныя — Бабры, Козенкі, Бакачы, Сушкі. Ва ўладанні жыхароў горада было 85 валок, ці 1815 га ворнай зямлі. Мяшчане з кожнай валокі плацілі па 5 злотых, з 1 прэнта гарадскога пляца — 1 грош. Агульная сума грашовай рэнты, паводле інвентарызацыі 1724 г., складала 1052 злотых. Недалёка ад горада размяшчаўся замкавы фальварак (памесце) і вёска Лучажэвічы.

Нацыянальны склад насельніцтва горада быў неаднародны. Большасць складалі беларусы, жылі ў Мазыры палякі, літоўцы, яўрэі. (У 1765 г. апошніх налічвалася 3074 чалавекі.) Упамінаецца, што сума падатковага збору з яўрэйскага насельніцтва горада склала 100 злотых. У горадзе было 170 дымоў (двароў). Сюды не ўвайшлі вольныя пляцы, вызваленыя ад падаткаў, а таксама бакавыя, дзе жыла частка гараджан. Агульная колькасць насельніцтва ў Мазыры складала каля 1,5 тыс. чалавек. На працягу наступных дзесяцігоддзяў назіраўся пастаянны яго рост, к канцу XVIII ст. гарадское насельніцтва складала каля 2,4 тыс. жыхароў.

Неспакойна было на Мазыршчыне ў сярэдзіне другой паловы XVIII ст. Пад уплывам падзей на Украіне пачаліся бунты і хваляванні прыгонных сялян, а таксама часткі збяднелага гарадскога насельніцтва. У лістападзе 1736 г. гетман Вялікага княства Літоўскага Радзівіл загадаў палкоўніку Слізне прывесці сваю харугву ў баявую гатоўнасць. Такія ж загады атрымалі і іншыя харугвы, якія павінны былі размясціцца ў Мазырскім павеце ўздоўж мяжы з Украінай, — улады ВКЛ асцерагаліся паходаў казацкіх атрадаў на Мазыр-

шчыну. Полк, які стаяў у Мазыры, быў не гатовы супрацьстаяць магчымаму паўстанню ў горадзе. У лютым 1738 г. у Мазырскі павет накіраваны з харугвай палкоўнік Неслухоўскі, пад камандаванне якога перадаваліся таксама харугвы маршалка Сангушкі, Панятоўскага і навагрудскага кастэляна Незабыткоўскага.

З гэтымі сіламі і татарскімі харугвамі, якія знаходзіліся ў Мазыры, Неслухоўскі павінен быў «пільна назіраць» за дзеяннямі паўстанцаў і не дапусціць гайдамакаў у межы Вялікага княства Літоўскага. У снежні 1747 г. гетман ВКЛ загадаў польнаму стражніку Барановічу накіраваць на падаўленне хваляванняў у Мазырскі павет яшчэ дзве харугвы: Бараноўскага і Лісоўскага. Летам 1750 г. ва ўрочышчы Кімбараўка (пад Мазыром) быў разбураны нядаўна пабудаваны манастыр. Відавочна, не абышлося без удзелу казакаў, яны і раней часта з'яўляліся ў горадзе. Атрад украінскіх казакаў пад камандаваннем Падаляка, хаваючыся ўдзень у чаротах Прыпяці, размясціўся ў ваколіцах Мазыра. Ужо быў захоплены казакамі Брагін, разбураны размешчаныя ўздоўж ракі многія маёнткі феадалаў.

Мясцовыя ўлады разам з накіраванымі раней у Мазыр войскамі не маглі справіцца з хваляваннямі. У сакавіку 1751 г. паслы ад Мазырскага павета скардзіліся літоўскаму гетману на пастаянныя набегі гайдамакаў і бунты падданых, прасілі прыслаць падмацаванне. Гетман накіраваў у Мазыр палкоўніка Бараноўскага з чатырма харугвамі ВКЛ. Войскам было неабходна прыбыць у Мазыр 12 мая і паступова граміць атрады паўстанцаў і гайдамакаў. Але зрабіць гэта было нялёгка. Падсуддзя Мазырскага павета Я. Прыжыбора пісаў у снежні 1755 г. сакратару рускага пасольства ў Рэчы Паспалітай Ржычэўскаму, што «показанные в реестре, собственные мои поданные» ўцяклі ў Расію, сталі гайдамакамі і, вярнуўшыся назад, разбураюць маёнтак. Прыжыбора прасіў абараніць яго жыццё і маёмасць.

У 1756 г. пачалося паўстанне сялян у мазырскіх уладаннях князя Радзівіла. Мясцовыя ўлады не змаглі нічога зрабіць. За справу ўзяўся сам князь Радзівіл, паўстанне было падаўлена, а яго кіраўнікі пакараны. Варшаўскі сейм 1764 г. прыняў спецыяльнае рашэнне аб забеспячэнні парадку ў рэгіёне. А ў 1769 г. паўстанцы захапілі цэлую воласць Мазырскага павета — Камянецкую.

Заканчвалася XVIII стагоддзе. Мазыр паступова станавіўся добраўпарадкаваным горадам, цэнтрам культурнага і гаспадарчага жыцця краю. У канцы стагоддзя ён быў уключаны ў склад Расійскай імперыі. Вакол горада цяснілiся прыгарадныя пасяленні: Калачоўка (Сідзельнікі), Ясеньшчына, Пянькі, хутары Матрункі, Козенкі, Бабры, Булаўкі, Пранькі, Лучажэвічы, Целяпуны. У Мазыры вылучаліся вуліца Пятніцкая (цяпер Куйбышава), Слуцкая (Савецкая — ад Прымаставой плошчы да плошчы Леніна), найбольш густанаселеная Кіеўская (ад цэнтральнай плошчы да рынку), якая была забудавана толькі з боку ракі, Жытомірская (Горкага), Базарная плошча. Было многа цэркваў і манастыроў. Жыхароў налічвалася каля 1,5 тыс. чалавек. Усяго ў Мазыры было каля 220 двароў, 6 царкоўных участкаў, ратуша, дзве цагельні.

Частыя войны і хваляванні, пастоі войск і прыцясненні з боку феадалаў прывялі ў заняпад гаспадарку. Сейм 1762 г. вызваліў жыхароў горада ад падаткаў у каралеўскую казну. У 1776 г. амаль усе гарады Беларусі былі пазбаўлены Магдэбургскага права, Мазыр і яшчэ некалькі гарадоў не ўвайшлі ў гэты пералік. Павольна аднаўлялася жыццё гараджан. Асноўным заняткам, як і раней, заставалася рыбная лоўля, гандаль буйной рагатай жывёлай і коньмі. У мястэчку Скрыгалаў збіралася два кірмашы — 9 мая і 6 снежня, куды прыязджалі купцы з многіх гарадоў

Польшчы і Беларусі. Тут, а таксама ў Мялешкавічах, Міхалках, Барбарове кожны тыдзень праводзіўся гандаль.

Гарадскія і павятовыя старасты, якія кіравалі Мазыршчынай у складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай: Альберт Гаштольд (1530), Мікалай Радзівіл Чэрні (1544), Мікалай Нарбут (1547), Мікалай Радзівіл (1566), Мікалай Радзівіл (1581—1587), Вальцар Стравінскі (1607), Яўстахій Ян Тышкевіч (1613), Бальтазар Стравінскі (1620), Аляксандр Смашко (1636), Геронім Кароль Хадкевіч (1648), Мацяш Троцкевіч (1653), Станіслаў Ліпскі (1672), Міхаіл Халецкі (1690—1697), Фларыян Леон Катоўскі (1696), Пётр Кароль Катоўскі (1696), Міхаіл Чалецкі (1698—1710), Гервазій Людвік Аскерка (1724—1738), Ежы Антоні Аскерка (1765—1771), Гедзэн Яленскі (1772—1785), Казімір Аскерка (1773), Ян Яленскі (1787—1794).

Павятовыя маршалкі: Ян Каленскі (1592), Стэфан Лозка (1598), Канстанцін Катоўскі (1664), Станіслаў Ліпскі (1674), Ян Рабецкі (1675), Іеранім Канстанцін Катоўскі (1696), Рафал Алазізі Аскерка (1738—1767), Казімір Чалецкі (1771—1776), Мацей Казімір Аскерка (1772—1793).

Займалі пасаду кастэляна мазырскага: Фелікс Яленскі (1807), Піліп Абуховіч (1809—1811), Казімір Кланскі (1822), Гжегорж Навакоўскі (1822—1923).

У выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай, які адбыўся ў 1793 г., Мазыр і тэрыторыя Мазырскага павета перайшлі ў склад Расійскай імперыі.

* * *

У канцы XVI ст. у Мазыры жыў Стэфан Лован, земскі суддзя. У 1592 г. па даносу Стэфана Лозкі, які абвінавачваў Лована ў атэізме, ён быў выкліканы ў Галоўны літоўскі трыбунал. У віну Лована ставілася, быццам ён сцвярджаў: «души в человеку, раю и пекла нет, и судного дня не будет, и человек же, яко пёс кровью... сходит, и что колвек есть на свете, то всё само праз себя, земля, древо, вода и иншие речи, и так веки веком будет, и кому же лихо тут пекло, а кому добре тут рай...» Далейшы лёс Стэфана Лована невядомы...

Трагічны лёс прывёў 28 верасня 1794 г. у нядобрай славы Салавецкі манастыр 38-гадовага збяднелага мазырскага шляхціца Язэпа Яленскага — «для непреходного под стражей пребывания». Восенню 1792 г. Яленскі накіраваўся ў Санкт-Пецярбург, дзе пад уражаннем падзей французскай буржуазнай рэвалюцыі і польскага паўстання пад кіраўніцтвам Касцюшкі пачаў займацца дзейнасцю, якая супярэчыла законам імперыі. У 1794 г. па даносу капітана Цыбульскага Яленскі быў арыштаваны, у яго знайшлі некалькі крамольных рукапісаў. Адзін з іх напісаны ў форме маніфеста і адрасаваны каралю Рэчы Паспалітай. У ім гаварылася аб неабходнасці ліквідацыі прыгоннага права, кароль прызнаваўся роўным з людзьмі іншых саслоўяў. У рукапісе гаварылася пра «свабоду, роўнасць, братэрства». Другі дакумент — прысяга караля, які адмяніў прыгоннае права, аб'явіў свабоду веравызнання (што было вельмі важным для Беларусі) і роўнасць грамадзян; павінны былі быць спалены ўсе паперы, якія замацоўвалі правы памешчыкаў на зямлю і сялян, зацверджана выбарнасць духоўных (царкоўных) і грамадзянскіх пасадавых асоб. Трэці дакумент — незакончаны зварот да ўсіх народаў Рэчы Паспалітай. У ім пісалася: «И чего ж, любезнейшие братья, в течение тысячи с лишним лет вашей неволи не испытывали, чего не перетерпели ... Например, не одного из вас, невольников, горяч барин, рассердясь на лошадь, человека убил, за небрежный удар собаки барской — человека замучил, за неснятие шапки перед барином до смерти засек, за разбитие стакана — зубов нескольких или жизнь терял ... И того не случалось ли, ежели барину понравилась ваша жена, сестра или какакая-нибудь девка, а вы ... не согласились или не дозволили на беззаконие, сколько то вас тысяч умертвлено, и один ли с вас променен на лошадь, на собаку, на свинью, на какую-нибудь безделицу барину, один ли на карту поставлен, продан на деньги, от жены, детей, от родителей и родни, несмотря на слезы и плачевные рыдания хуже, как скатину какую».

Яленскаму пагражала шыбеніца, але ён напісаў у маі 1794 г. прашэнне аб прыняцці праваслаўнай веры і ссылцы ў манастыр. Улады згадзіліся. Атрымаўшы праваслаўную веру, Яленскі назваўся Аляксеем. У Салавецкім манастыры, куды яго адправілі ў ссылку, бунтар не адмовіўся ад сваіх поглядаў. 27 чэрвеня 1794 г. ён перадаў архімандрыту рукапіс «Благовесть к Израилю российскому», нібыта атрыманую ад аднаго камердынера. Павел I, прачытаўшы рукапіс, гаварыў «о дерзости, неистовстве, коварстве сочинителя». У гэтым дакументе прапаведавалася пра адзінства славянскіх народаў у барацьбе супраць царызму. Крытыкуючы непарадкі, аўтар нічога не мог сказаць пра будучае краіны. Пасля смерці імператара Паўла ў 1801 г. трон заняў Аляксандр I. Яленскі быў вызвалены з Салавецкага астрога. Стомленасць, беднасць, расчараванне (задушана паўстанне Касцюшкі, не вырашыла многія праблемы французская рэвалюцыя, ніякай упэўненасці на перамены ў палітычным і сацыяльным жыцці ў Расійскай імперыі) зламалі дух бунтара. Яленскі доўгі час блукаў па краіне, пакуль не трапіў у Аляксандра-Неўскую лаўру, дзе ён стаў прыхільнікам фанатычнай секты скапцоў. У 1804 г. за распаўсюджванне скапічнай ерасі яго выслалі ў Суздаль, у Спаса-Яфім'еў манастыр, дзе Яленскі і памёр 23 сакавіка 1813 г.

А. Бобр, М. Сузько

Герб Мазыра

У Вялікім княстве Літоўскім, куды з XIII ст. уваходзілі землі Мазыршчыны, гербы і гербавыя знакі меў 41 горад. Герб — гэта знак, які адлюстроўвае ў сімвалах час стварэння і акрэслівае сацыяльную і мясцовую прыналежнасць асобы, горада або дзяржавы; горад, які яго мае, узняўся ў сваім дзяржаўна-палітычным развіцці на якасна новую прыступку. У перыяд феадалізму набыццё горадам герба было сведчаннем яго росту ў параўнанні з суседнімі пасяленнямі. Беларускім гарадам гербы звычайна даваліся разам з Магдэбургскім правам.

У Прывілеі, які давала Мазыру Магдэбургскае права, гаворыцца: «Надаем тому месту нашому печать месткую, то есть Орел ... с вырысованым S, которую урад месткій на судах і іных справах і потребах печатовать і того гербу ужівать мают вечные часы ...» Ёсць і другі Прывілей, які быў выдадзены Мазыру каралём Міхаілам Корбут-Вішнявецкім. У ім сказана, што гораду даецца герб — у блакітным полі чорны арол з чырвонаю шыльдаю на грудзях. Для даследчыкаў геральдыкі вельмі важнай аказалася фраза, што мазыранам гэты герб дазволіў ужываць подпіс «вяльможа трокскі староста Мазырскі».

На мазырскім гербе ў блакітным полі чорны аднагаловы арол з срэбранай шыльдай на грудзях, на ёй чырвоная літара S. Затым — срэбраная шыльда была заменена на чырвоную. Знак быў сімвалам каралеўскай улады і сведчыў, што горад 10 верасня 1609 г. атрымаў герб ад караля Сігізмунда III.

Вылучаюць у асноўным два тыпы гербаў — функцыянальныя і штучныя. Функцыянальныя гербы перадаюць якую-небудзь адметную рысу геаграфічнага становішча, ролю горада ў абароне дзяржавы, гандлі, гаспадарцы. Абарончымі сімваламі на беларускіх гербах выступалі выявы вежаў, брам, гарадскіх муроў. Штучныя гербы —



Герб Мазыра

больш умоўныя, звычайна маюць выяву святога, магчыма, заступніка ці ўладальніка горада. На гербе Мазыра спалучаюцца каралеўская і велікакняжацкая атрыбутыка.

На пячатцы мазырскай ратушы, прыкладзенай да дакумента 1639 г., бачна выява арла з радзівілаўскім гербам — так званыя «ражкі». Вядома, што Радзівілы мелі на гербе чырвонага арла, на грудзях якога — шыльда з выявай трох паляўнічых ражкоў. Поле герба залатое, шыльда — чырвоная, лапы і дзюба арла — залатыя. Гэта сведчыць аб параўнальнай слабасці каралеўскай улады і моцы магнатаў, якія маглі зняважыць каралеўскі ініцыял і замяніць яго выявай уласнага герба.

Пасля трох перадзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795) Беларусь, у тым ліку Мазыр, далучаны да Расійскай імперыі. Былі заменены амаль усе

гербы беларускіх гарадоў. Абавязковым атрыбутам новых гербаў, афармленых па агульнарасійскім узоры, з'яўляецца наяўнасць двухгаловага арла. 22 студзеня 1796 г. набыў но́вы герб і Мазыр, хаця ён захоўваў элементы старога: у верхняй частцы шчыта — двухгаловы арол, у ніжняй — стары герб: на блакітным фоне чорны аднагаловы арол з чырвонай шыльдай на грудзях.

В. Шур

З ЗАЯВЫ ВАЯВОДСТВАЎ І ПАВЕТАЎ ПРА ІХ ЗГОДУ НА ВЫПЛАТУ ПАДЫМНАГА ПАДАТКУ 1661 г.

...Мозырский повет, как ранее, так и в настоящее время, находясь в руках неприятеля, не может ни платить налогов, ни нести службу в ополчении и уже в прошлом освобождался от уравнения. А теперь изгнанники при условии возврата своих владений и абъюраты в отношении опустошенных и сожженных неприятелем обязуются, если будет из чего... принять посильное участие в уплате подымного на жалованье для войска и оказать иное содействие налогами. Поскольку отчетный сеймик не может состояться в Мозыре ввиду нахождения там врага, а до Кобрина далеко, он должен собраться в Ляховичах, там же и сеймик для выборов послов в будущий сейм...

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. С. 185.

КОЛЬКАСЦЬ ДЫМОЎ У ВАЯВОДСТВАХ І ПАВЕТАХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І АГУЛЬНАЯ СУМА ЗБОРУ З ІХ ПАДАТКАЎ, УСТАНОЎЛЕНЫХ ГЕНЕРАЛЬНАЙ СЕСІЯЙ ВАРШАЎСКАГА СЕЙМА Ў 1717 г.

Мозырский повет: гиберна — 4000 злотых; чоповое и шеляжное — 3300 злотых; дымов земских — наследственных, шляхетских, духовных и королевских экономий (с дыма по 7 злотых и 20 грошей) — 1000, злотых — 7666.

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. С. 194—195.

З ПАСТАНОВЫ ВАРШАЎСКАГА КАНВАКАЦЫЙНАГА СЕЙМА АБ УЗМАЦНЕННІ АХОВЫ МАЗЫРСКАГА ПАВЕТА АД НАБЕГАЎ ГАЙДАМАКАЎ. 1764 г.

Поскольку пограничный Мозырский повет не охраняется от набегов гайдамаков, уже неоднократно имевших место, поэтому, проявляя заботу о безопасности, мы поручаем вельможному гетману Вел. кн. Лит., чтобы он обеспечил безопасность этого повета в соответствии с его требованиями и настояниями при помощи постоянных войск Вел. кн. Литовского.

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. С. 401.

ПІСЬМО ПАДСУДДЗІ МАЗЫРСКАГА ПАВЕТА ЯНА ПРЖЫБОРА САКРАТАРУ РАСІЙСКАГА ПАСОЛЬСТВА Ў РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ РЖЫЧЭЎСКАМУ АБ ЗВАРОЦЕ ПРЫГОННЫХ СЯЛЯН, ЯКІЯ ЗРАБІЛІ НАПАД НА ЯГО ДОМ, А ЗАТЫМ ЗБЕГЛІ Ў РАСІЮ

1755 г., декабрь 14

Не получа от Вас на письма мои ответу, ныне в третий раз с нижайшем моим почтением приемлю смелость к Вам писать, в той надежде пребывая, что не получу ли я хоть ныне в прошении моем ныне резолюции, я в прежних моих письмах писал, прося о милостивом защищении, и доносил, что показанные в реестре собственнные мои поданные и что в том же реестре изображены 2 войты, в гайдамаки обратились и разбивают, которые более меня устрашают, нежели самые гайдамаки, ибо о гайдамаках издали только слышно, а они имеют в деревнях моих своих родных братьей и сродственников и, находясь в близости за границею, могут ведать каждого дня, где я обращаюсь. И для того я принужден находиться во всегдашней опасности и себя беречь, а особливо от соседов моих, имея

известие, что им поданные их доносят, что помянутые мои 2 войта с протчими всеконечно намерены меня живота лишить, кои уже и ожидали приезду моего из Кенигсберга, укрываясь в леса: чрез 2 недели и у своих сродственников и чиня разные грабительствы, а потом, не дождавшись меня, дом покрали, ружье забрали, також и церковь покрали и паки заграницу назад возвратили, у которых на форпосте Добранском пару ружей отняли.

Я не столь настою о выдаче их, сколь стараюсь о безопасности живота моего и потом нижаише донесть о том двору вашему, чтоб мне сатисфакция доставлена была...

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. С. 400—401.

Ці помнім мы ўсіх?

З гісторыяй Мазыршчыны XVI ст. звязаны імёны многіх выдатных дзяржаўных і палітычных дзеячаў Вялікага княства Літоўскага — літаратараў, кіраўнікоў паўстанцкіх атрадаў на Беларусі, прадстаўнікоў кіруючай эліты.

Прадстаўнік вядомага роду Гаштольдаў — Альбрэхт (памёр у 1539 г.) быў ваяводам навагрудскім, полацкім, трокскім, віленскім, канцлерам літоўскім, а ў 1515 г. — старастам мазырскім. Альбрэхт Гаштольд удзельнічаў у руска-літоўскай вайне 1507—1508 гг. На Віленскім сейме ў 1529 г. абвясціў Сігізмунда II Аўгуста наследнікам літоўскага трона, рэдагаваў Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 г. Як паведамляецца ў «Кароткай энцыклапедыі БССР», род Гаштольдаў згас у 1542 г., іх уладанні перайшлі да вялікага князя.

З мазырскай шляхты быў вядомы дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, дыпламат і пісьменнік Філіп Казімір Абуховіч. Ён скончыў Замойскую акадэмію, з 1649 г. (у некаторых крыніцах з 1651—1653 гг.) — пісар Вялікага княства Літоўскага. Ездзіў паслом княства ў Венецыю і Маскву. З 1653 г. — ваявода смаленскі, узначальваў абарону горада і пасля доўгай асады здаў яго рускім войскам. Абуховіча абвінавацілі ў здрадзе, але неўзабаве апраўдалі. Відавочна, яму адрасавана ананімнае «Пасланне да Абуховіча». «Нешта, пане, ето родом дому деется! Дзед Твоей Мілості, колі генералом быв в Мозыру, то, — слышав, — што за малые грошы неправду продавав. Пан отец Вашмості, судею будучы мозырскім за моей памяті, у кого больш взяв, того хороше осудів. Колі небошык з таго света уступів, мозыране вельмі рады былі!..» Памёр Філіп Казімір Абуховіч у 1656 г.

У 30-х гадах XVI ст. намеснікам мазырскім быў Юрый Радзівіл (1480—1541), сын Мікалая Старога, прадстаўнік буйнейшага магнацкага роду Вялікага княства Літоўскага. Юрый Радзівіл быў дзяржаўцам лідскім, скідзельскім, беліцкім. Кіраваў маёнткам, сачыў за своечасовым зборам падаткаў, адказваў за абарону ўручаных яму земляў, з'яўляўся начальнікам мясцовага дзяржаўнага кіравання і суда. За перамогі ў 30 бітвах яго празвалі Пераможцам.

Сын Юрыя Радзівіла — Мікалай Рыжы (1512—1584) быў старастам ашмянскім, слонімскім, барысаўскім і мазырскім. У час падрыхтоўкі і заключэння Люблінскай уніі 1569 г. стаяў на чале па-сепаратысцку настроеных магнатаў. Да 1579 г. кіраваў падрыхтоўкай Статута ВКЛ, з пачатку 70-х гадоў XVI ст. — неабмежаваны правіцель княства.

Іван Мялешка — ураджэнец Смаленшчыны, меў некалькі маёнткаў, у тым ліку Жыровічы. У 1598 і 1601 гг. займаўся размежаваннем зямель паміж Мазырскім паветам і Кіеўскім ваяводствам, быў падкаморыем мазырскім. Выступаў супраць засілля польскіх феадалаў у Беларусі. Яму прыпісваюць сатырычны твор «Прамова Мялешкі», дзе ёсць упамінанне пра Мазыр. Гэта твор вялікага сацыяльнага палітычнага гучання, аўтар смела высту-

пае супраць замежных парадкаў у Беларусі, высмейвае норавы мясцовых феадалаў.

У Мазыры жыў Стэфан Рыгоравіч Лован (Ян Лавейка). Ён служыў у Мазырскім земскім судзе, у гісторыю ўвайшоў як матэрыяліст і атэіст. Спачатку Лован прытрымліваўся радыкальнага пратэстантызму, затым — эпікурызму. У 1591 г. прыцягнуты да адказнасці віленскім Галоўным літоўскім трыбуналам за тое, што не верыў у Хрыста, бессмяротнасць душы, уваскрасенне з мёртвых, судны дзень. Лічыў, што свет не створаны Богам, а існуе вечна. Сутнасць поглядаў Лована выкладзена ў трактаце «Позаў аднаму рускаму секты эпікураванай».

М. Сузько

Мітрапаліт Кіеўскі і Усея Русі Макарый

У цэнтры вёскі Скрыгалаў захавалася старадаўняя цагляная капліца. Ва ўрочышчы Падселіца на беразе старадаўняга рэчышча Прыпяці ўзвышаецца абеліск... Абодва помнікі пабудаваны ў 1897 г. да 400-годдзя гібелі ў гэтай вёсцы мітрапаліта Кіеўскага і Усея Русі Макарыя.

...У другой палове XV ст. з-за пастаянных набегаў і грабяжоў крымскіх качэўнікаў жыццё ў Кіеве стала немагчымым. Цэнтр рускай праваслаўнай царквы часткова перамясціўся ў Вільню, там знаходзіліся мітрапаліты царквы, якая, як і раней, называлася Кіеўскай. Архімандрытам віленскага Свята-Троіцкага манастыра быў Макарый. У пачатку 1495 г. саборам епіскапаў праваслаўнай царквы ён быў «рукоположен» на Кіеўскую мітрапалітаўскую кафедру і стаў мітрапалітам Кіеўскім і Усея Русі. Мітрапаліт адстойваў праваслаўе, актыўна супрацьдзейнічаў пашырэнню каталіцкай царквы на тэрыторыі Украіны і Беларусі.

Вясной 1497 г. Макарый вырашыў наведаць Кіеўскую кафедру і прыходы, галоўным чынам тыя, што пацярпелі ад набегаў татар. Па дарозе ён спыняўся ў праваслаўных прыходах, правіў богаслужэнні. Такі прыпынак быў зроблены і ў Скрыгалаве, хоць паблізу лютавалі татары. Летапісец у Супрасельскім летапісе гаворыць: «...В 1497 г. мая 1-го на шестой неделе после Великага дня в понедельник безбожные перекопские татары убили преосвященного митрополита Киевскага и Всея Руси архиепископа Макария. Вторглись они в нашу землю скрытно от всех и настигли его в селе Скрыгалове на реке Бчичь за пять миль от Мозыря, из бывших с ним одних убили, а других взяли в плен».

Падрабязнасці той даўняй трагедыі ў народнай памяці на працягу стагод-



Помнік каля в. Скрыгалаў на месцы забойства мітрапаліта Макарыя

дзяў ператварыліся ў легенды, яны жывуць да сённяшняга дня. Паводле адной з іх насельніцтва Скрыгалава схавалася ад татар у царкве, дзе ў гэты час знаходзіўся мітрапаліт Макарый. Ворагі патрабавалі ад мітрапаліта заклікаць насельніцтва пакарыцца, заплаціць даніну і даць праваднікоў, каб рухацца ў глыбіню беларускіх земляў. Гэта гарантавала б насельніцтву і гасцям з Вільні выратаванне. Высока падняўшы над галавой крыж, Макарый сказаў: «Святы крыж не дазваляе, каб ворагі веры праваслаўнай ішлі далей і знішчалі яе жыхароў. Далей дарогі няма...» Раз'юшаныя ворагі накінуліся на Макарыя, павялі яго да ракі, адсеклі галаву і на дошцы пусцілі ўніз па цячэнні Прыпяці: «Ты ехаў у Кіеў, туды мы цябе і адпраўляем!» Тым часам людзі разбегліся па навакольным лесе...

Маецца некалькі ўскосных упамінанняў пра вёску (мястэчка) Скрыгалаў, першыя з іх — 1240, 1387, 1435 гг. і г. д. Але шмат нямых сведкаў далёкай мінуўшчыны ў ваколіцах Скрыгалава — курганы, рэшткі гарадзішчаў, разваліны муроў, сведчаць, што гэты населены пункт значна старэйшы. Скрыгалаў знаходзіўся на перакрыжаванні гандлёвых і ваенных шляхоў у Слуцк, Пінск, Мазыр, Оўруч, Тураў, якія ў XII і XIII стст. былі ўжо буйнымі гарадамі.

Па сведчанні Нарбута Стрыйкоўскага, сын літоўскага князя Мантвіла — Ердвіл, першы з князёў літоўскіх, у 1240 г. разбіў тут мангольскіх заваёўнікаў, іх военачальнік Койдан выратаваўся ўцёкамі. Назву Скрыгалаў атрымаў, напэўна, не раней 1387 г. ад імя князя літоўскага Скіргайлы, якому вялікі князь літоўскі Ягайла ў гэтым годзе ўступіў большую частку Палесся.

У 1497 г. наваколлі Мазыра падвергліся страшнаму апусташэнню крымскімі татарамі. Каля Скрыгалава быў забіты мітрапаліт Кіеўскі і Усея Русі Макарый, які ехаў з Вільні (часовай сталіцы Рускай праваслаўнай царквы) у Кіеў.

Да XVIII ст. мястэчка было каралеўскім уладаннем, затым перайшло ў прыватныя рукі. У пачатку XVIII ст. Скрыгалаў належаў Аскеркам, у 1877 г. маёнтак быў куплены Карлам Шэпелерам. На падставе Прывілеі Станіслава Аўгуста ад 28 мая 1782 г. у Скрыгалаве збіраліся два кірмашы — 9 мая і 6 снежня. Кожны тыдзень праводзіўся гандаль, куды з'язджаліся сяляне навакольных вёсак. У адной з кніг «Літоўскай метрыкі» ёсць запісы, якія сведчаць, што ў 1552 г. у Скрыгалаве жыў 31 чалавек, у 1590 г. было чатырнаццаць дымоў (дамоў), 15 служб. У 1702 г. памешчык Аскерка пабудаваў рудню, дзе працавалі сяляне, «якія прыйшлі невядома адкуль больш як 170 гадоў назад».

У 1863 г. у Скрыгалаве адкрыта народнае вучылішча. У 1878/79 навучальным годзе вучылішча наведвала 27 дзяцей. Вучыла іх Еўдакія Шэнец. У наступным навучальным годзе ў вучылішчы займалася 35 вучняў, з іх — 31 хлопчык. Дзяцей навучала новая настаўніца Кацярына Паўлаўна Хаховіч.

У кнізе «Волости и важнейшие селения Европейской Росии» (1886) гаворыцца: «Скрыгалов — дворов 57, жителей 495, имеется церковь православная, еврейский молитвенный дом, школа, лавка».

У 1905 г. у кнізе «Россия. Полное географическое описание Отечества. Том IX» аб Скрыгалаве напісана: «Мястэчка мае 102 двары і больш за 600 жыхароў. Ёсць драўляная царква святога Мікалая, пабудаваная Казімірам Аскеркам, а таксама валасное праўленне і станавая кватэра. Жыхары займаюцца гандлем, земляробствам, рыбалоўствам, рознымі рамёствамі і часткова сплавам лесу... У Скрыгалаве ёсць прыстань на Прыпяці, з якой адпраўляецца ўсіх грузаў разам з плытамі каля 500 тысяч пудоў».

У другой палове XIX ст. у Скрыгалаве быў закладзены на плошчы больш як пяць гектараў пейзажны парк з разнастайным наборам дрэў і кустоўя. Парк часткова захаваўся і ў наш час.

М. Сузько

«Живописная Россия» пра Скрыгалаў і Барбароў

При той же Припяти находится древнее поселение Скрыгалов, бедное местечко. Но оно замечательно великолепным городищем, которое народ зовет Городком. Городище окружено высоким валом и глубоким рвом. Вблизи протекает небольшая речка. На городище видны следы существовавшего большого здания, вероятно, укрепленного замка, хотя об нем и не упоминают летописи. По крайней мере, на самой вершине городища или городка находят во множестве кирпич, камни и даже мраморные плиты. Вблизи городища, в лесах, около деревушки Слободы Скрыгаловской много курганов... При местечке на Припяти есть пристань.

Тоже при Припяти и на берегу большого озера расположен Барбаров, с развалинами большого

замка, с башнями, валами и рвами, вотчина Оскерков.

Во всех этих местечках есть православные церкви, римско-католические костелы и еврейские молитвенные дома.

Как ни малозначительны эти местечки, они имеют здесь громадное значение. Это оазисы среди мрачной и пустынной природы, куда хоть раз или два в год стекаются жители таких же меньших оазисов, чтобы удовлетворить свои нужды, чтобы взглянуть на людей и убедиться в собственном существовании. Они важны для окрестных жителей и в торговом отношении как пункты, где они могут продать или отдать на комиссию свои произведения...

«Живописная Россия». 1882. Т. 3.

Слабада

Вёска Слабада на Мазыршчыне яшчэ нядаўна называлася Слабадой Скрыгалаўскай. Гэта невыпадкова. Гістарычны шлях вёсак быў амаль аднолькавы. У ваколіцах Слабады і Скрыгалава захаваліся месцы старажытных паселішчаў, могільнікі і курганы палян і дрыгавічоў, якія жылі тут у IX — XIII стагоддзях. Археолагі карпатліва даследавалі гэтыя помнікі. Шмат зроблена ў гэтай справе У. З. Завітневічам, які ў 1889—1890 гг. у ваколіцах Слабады даследаваў больш як 15 курганоў.

Невялікае паселішча на пустэчы, куды адсяліліся са Скрыгалава некалькі жыхароў, назвалі Слабадой Скрыгалаўскай. Першапасяленцам на пэўны тэрмін уладальнікі земляў давалі некаторыя льготы, так званыя «слабоды». Адсюль і назва Слабада.

Многа разоў мяняліся ўладальнікі вёскі. Недзе з XVI ст. навакольныя землі належалі Аскеркам, князям Радзівілам, з сярэдзіны XIX ст. — памешчыкам Снядзецкім. Слабаду і іншыя вёскі не раз знішчалі крымскія татары. Так было ў 1497 і 1521 гг. Ёсць у дакументах спасылкі і на тое, што ў Слабадзе ў студзені 1649 г. польскія войскі Радзівіла рыхтаваліся да штурму Мазыра, які праз некалькі дзён разам з жыхарамі быў цалкам знішчаны. Такі ж лёс спасцігнуў і многія іншыя вёскі Мазыршчыны, жыхары якіх прымалі актыўны ўдзел у нацыянальна-вызваленчай вайне Багдана Хмяльніцкага супраць панавання польскіх феадалаў.

У 1755 г. на сродкі памешчыка Казіміра Аскеркі была пабудавана драўляная царква Архістратыга Міхаіла. Прыход ахопліваў 11 бліжэйшых вёсак з насельніцтвам 2360 чалавек.

У 1870 г. у Слабадзе было 198 жыхароў. Тут знаходзіўся цэнтр Слабада-Скрыгалаўскай воласці. У 1876 г. у вёсцы адкрыта царкоўнапрыходская школа. У зборніку «Волости и важнейшие селения Европейской России», выдадзеным у 1886 г., аб Слабадзе дадзены наступныя звесткі: «Слобода Скрыгаловская — дворов 47, жителей 498, от уездного центра Мозыря 18 верст, в селе волостное правление, церковь православная, школа».

Старшынёй воласці ў тыя гады быў Сямён Кліменка, пісарам — Казімір Заслаўскі. Настаўнічаў у Слабадскім народным вучылішчы Якаў Трыфанавіч Чэрнік. Прыходскім свяшчэннікам быў Антоній Чайкоўскі.

Медыцынскіх устаноў не было. Людзей лячылі шаптухі і знахары. А першы кваліфікаваны фельчар у Слабадзе з'явіўся толькі ў пачатку нашага стагоддзя. Больш за паўвека настаўнічаў у вёсцы Петр Адамавіч Турко.

Буйным землеўладальнікам у Слабадзе ў канцы мінулага стагоддзя быў дваранін польскага паходжання Снядзецкі Казімір Осіпавіч. Зямельныя ўгоддзі яго складалі звыш 5400 дзесяцін. Два яго маёнткі знаходзіліся ў Слабадзе і Касцюковічах. У параўнанні з Снядзецкім другі пан Піятровіч Мікалай Якаўлевіч быў «бедны», меў 142 дзесяціны ў Слабодцы.

У 1909 г. у Слабадзе і Слабодцы ўжо было 195 двароў і 1615 жыхароў. Памешчыкі і найбольш заможныя сяляне складалі ў тыя гады 3 працэнты ўсяго насельніцтва, сяляне-сераднякі — каля 30 працэнтаў, беднякі і батракі — звыш 67 працэнтаў. Ёсць звесткі, што ў 20 сялянскіх гаспадарках не было ні коней, ні валоў.

Малазямелле і беднасць прымушалі сялян шукаць работу ў іншых месцах, пашыраўся адыходны промысел. Важнае значэнне мелі высечка і сплаў лесу, выганка смалы і дзёгцю, выпальванне вугалю, нарыхтоўка бяросты. Далёка за межамі воласці і павета былі вядомы цесляры Слабады Скрыгалаўскай. Яны будавалі дамы, розныя гаспадарчыя пабудовы. Асабліва іх шанавалі за будаўніцтва рачных суднаў. Тут слабадскім майстрам роўных не было.

М. Капач, У. Робак

Па дарозе на Тураў і Гарадок Давыдаў

Пра паўднёва-прыпяцкую Мазыршчыну ў 1905 годзе ў кнізе «Россия. Полное географическое описание нашего Отечества» сказана: «Менее всего населена часть Полесья по южную сторону р. Припяти между ее долиной и притоками Горынью и Убортью, в этой части находятся и самые обширные пространства сплошных болот...»

Сярод лясоў і балот на невялікім узвышшы, на адлегласці каля двух дзесяткаў вёрст ад Мазыра, узніклі першыя пасяленні будучай вёскі Мялешкавічы. Упершыню аб ёй можна знайсці ўпамінанне, якое адносіцца да XVI ст., у «Географическом указателе выборных документов», у актавых кнігах Віленскага цэнтральнага архіва. Паводле граматы, якую выдаў у 1568 г. польскі кароль Сігізмунд Аўгуст, сялом Мялешкавічы, у якім налічвалася каля двух дзесяткаў двароў, валодаў Ельяш Будзіл.

У 1845 годзе маёнтак належаў калежскай асэсаршы памешчыцы Антаніне Снядзецкай. У ім налічвалася 78 двароў, у вёсцы Васькаўка, якая ўваходзіла ў склад маёнтка, — 9 двароў. У дзвюх вёсках пражывала 333 чалавекі мужчынскага полу і 322 жаночага. Маёмасць сялян складала: 10 коней, 180 кароў, 241 авечка, 167 свіней, 222 вуллі з пчоламі, 143 быкі і 116 ялавак. У маёнтку было 20 404 дзесяціны зямлі, 305 — сенажаці, 12 873 дзесяціны займаў лес. Кожнаму двару быў выдзелены надзел зямлі: 1 1/3 дзесяціны сядзібнай, 15 2/3 — ворнай, 5 дзесяцін сенажаці, за што кожны сялянскі двор — мужчыны ад 16 да 55 і жанчыны ад 15 да 50 гадоў павінны былі на працягу кожнага тыдня адпрацаваць на карысць памешчыка па 3 дні — апрацоўваць палі, араць, жаць збожжа, касіць сена. Па 12 дзён у год кожная сялянская сям'я мусіла працаваць на будаўніцтве і рамонце панскіх будынкаў, млыноў, мастоў, дарог.

Кожны сялянскі двор штогод плаціў даніну: адзін рубель грашыма, а таксама — адну куру, 10 яек, 3 гарцы ягад, сотню грыбоў, 2 чацверыкі хмелю. Кожная жанчына прала з дваровага льну пражу і па адным таліку даўжынёй 5 чвэрцяў у 40 пасмаў аддавала гаспадару маёнтка. На сваёй гаспадарцы сяляне апрацоўвалі зямлю, разводзілі жывёлу, займаліся пчалярствам і рыбалоўствам. Нарыхтоўвалі будаўнічую драўніну і клёпку, звозілі лес для сплаву на бераг Прыпяці, збіралі ў лесе ягады і грыбы, хмель.

У абавязкі сялян уваходзіла быць праваднікамі ў начальства, якое праязджала па шляху з Мазыра ў Пінск, на Тураў, ахоўваць «чыноўніцкі люд», даваць коней, «дабы начальство не имело малейшего замедления в пути». Аб гэтым было запісана ў спецыяльным раздзеле «Общие повинности крестьян» інвентарнага вопісу памешчыцкага маёнтка Мялешкавічы.

З 1878 года непадалёку ад вёскі дзейнічаў смалакурны завод, які належаў памешчыку Генрыху Шэплеру. У ведамасцях 1885 года запісана, што на заводзе ёсць 10 печаў і 10 катлоў, працуюць трое мужчын і 10 чалавек «на стороне». Для таго, каб атрымаць 80 бочак прадукцыі па 58 вёдраў, скарыстоўвалася 120 сажняў дроў. Загадваў вытворчасцю мешчанін Гобель Гольвер. Меўся таксама конны млын, які належаў Янкелю Фрыдману. Другі млын быў у Паўла Лузана на хутары Млынок.

Мемарыяльная дошка на будынку СШ у в. Мялешкавічы — аб узнагароджанні вёскі ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР у 1929 г.

У «Памятной книжке Минской епархии на 1887 г.» паведамлялася, што «в селе Мелешковичи находится церковь во имя Рождества Просвятое Богородицы». Была таксама прыходская школа, адчыненая ў 1863 годзе. Навучаліся 41 хлопчык і 6 дзяўчынак. Праз некаторы час школа была пераўтворана ў народнае вучылішча. 29 лістапада 1914 г. Канстанцін Панкееў ахвяраваў вучылішчу ўчастак зямлі ў 1375 квадратных сажняў з маёнтка Мялешкавічы, купленага ім 11 лістапада 1885 г. у графіні Ігнацьевай:

«Участок этот дарится Мелешковичскому народному училищу исключительно для устройства на нем образцового сада и огорода с целью распространения среди местного населения практических сведений по садоводству и огородничеству, что должно быть возложено на учителя, знающего выше указанные отрасли сельского хозяйства или вообще имеющего свидетельство о слушании сельскохозяйственных курсов, с тем, чтобы все доходы с означенного сей дарственной участка земли поступали бы в пользу местного же учителя как вознаграждение за его труды по устройству и поддержанию в порядке образцового сада и огорода...»

Некалькі стагоддзяў Мялешкавічы былі цэнтрам воласці. У 1886 г. у вёсцы было 87 двароў і 860 жыхароў. З другой паловы мінулага стагоддзя жыхары Мялешкавіч пачалі адсяляцца на хутары Іванкаўшчына, Млынок, Зяленка і інш.

М. Галенка, М. Капач

Барбароў

Вёска Барбароў калісьці адносілася да Рэчыцкага павета, пазней — Нараўлянскага раёна, з 1963 г. — Мазырскага. Размешчана яна ў маляўнічым месцы на высокім абрывістым беразе ракі Прыпяць. «Мястэчка Барбароў, якое раней называлася Бабічы, знаходзіцца ў чацвёртай благачыннай акрузе Рэчыцкага павета пры рацэ Прыпяць і ваенна-камунікацыйнай дарозе з Рэчыцы на Мазыр. Ад губернскага горада знаходзіцца за 380, ад павятовага — за 105, ад паштовай станцыі — за 25, ад Лібава-Роменскай чыгункі — за 150 вёрст», — гаворыцца ў адным з дакументаў, што захоўваюцца ў Нацыянальным дзяржаўным архіве Беларусі.

У дакуменце ад 20 снежня 1509 года сказана, што ў гэты дзень Сігізмундам I выдадзены гаспадарскі прывілей двараніну Аляксандру Багданавічу Гоцкаму з Бабіч. У 1680 г. невядомы ўладальнік Бабіч скардзіўся на свайго папярэдніка, які яго разарыў.

У сярэдзіне і другой палове XVIII ст. Бабічы неаднаразова аказваліся на шляху атрадаў, якія прымалі ўдзел у казацка-сялянскіх паўстаннях на Украіне, — пра гэта ёсць упамінанні ў гістарычных дакументах. Змена назвы вёскі адбылася недзе ў канцы XVIII ст. Так, у 1795 г. стацкаму саветніку Сіверсу было падаравана мястэчка Барбароў у вечнае і патомнае ўладанне з 1396 душамі сялян з зямлёй, якія былі адабраны ў літоўскага стражніка Яна Аскіркі. Мястэчка трапіла да свайго новага ўладальніка ў ліку іншых вёсак пад час трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай.

Што датычыць назвы вёскі Барбароў, то ёсць некалькі меркаванняў навукоўцаў і краязнаўцаў. Некалі ў вёсцы жыў памешчык. У яго была прыгажуня дачка — Барбара. Яна спагадліва адносілася да сялян. Старажылы лічаць, што ў аснову назвы вёскі і пакладзена імя Барбара. Вось другая версія. Насупраць вёскі Барбароў, за Прыпяццю,



Палац Горватаў у в. Барбароў. Пачатак XX ст.

знаходзяцца Юравічы. У 1674 г. палавіна гэтай вёскі належала Барбары Лошчына з роду Юдзіцкіх. Не выключана, што Барбара Лошчына бывала ў Бабічах і з'явілася прататыпам гераіні легенды.

У 1779 г. у Барбарове была пабудавана Успенская праваслаўная царква. У вёсцы была і каталіцкая капліца. Прыхаджанамі царквы былі 742 мужчыны і 786 жанчын Барбарова і іншых навакольных вёсак.

З першай паловы XIX ст. уладальнікам Барбарова стаў А. А. Горват. Ён пабудаваў у вёсцы на беразе возера вялізны палац, які славіўся на ўсю губерню. Падарожнік і гісторык П. М. Шпілеўскі ў кнізе «Мазыршчына» так пісаў пра гэты палац: «Старажытная архітэктура гэтага замка — зубчатыя вежы, калоны, шпілі, глыбокія яры, канавы, падземныя хады, навясныя масты надавалі будынку характар нейкага асаблівага часу, ледзь не рыцарскага, калі рыцарства існавала ў заходне-рускім краі».

Палац знаходзіўся ў ландшафтным парку, не менш вядомым, чым сам будынак.

Уладальнік маёнтка гандляваў жывёлаю, салам, хлебам і лесам з паўднёвымі губернямі і Польшчай. З барбароўскай прыстані па Прыпяці вывозілася ўсіх грузаў да 250 тысяч пудоў у год. Ёсць звесткі пра тое, што ў Барбарове была ў мінулым стагоддзі фабрыка па вырабе тканіны з воўны.

У 1863 г. у вёсцы было адкрыта народнае вучылішча. Першымі настаўнікамі былі Ягор Сцяпанавіч Салінавіч, які скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю, і свяшчэннік Сава Рыгоравіч Сулкоўскі. Наступным настаўнікам быў П. Юдзіцкі, які працаваў у Барбарове каля 40 гадоў.

У 1886 г. у Барбарове налічвалася 32 двары і 226 жыхароў, а праз 23 гады, у 1909 г., — 120 двароў і 807 жыхароў.

М. Капач, М. Сузько

Шумяць стогадовыя дрэвы...

На высокім беразе Прыпяці, над лукавінай яе старога рэчышча ў Барбарове раскінуўся адзін з найбольш старых на Мазыршчыне паркаў, сфарміраваны ў сярэдзіне XIX ст. У канцы галоўнай вуліцы вёскі захаваліся рэшткі сядзібнага ансамбля Горватаў, які ў свой час уключаў палац, флігель і пейзажны парк. Мураваны флігель — аднапавярховы будынак з чатырохкалонным порцікам. Добра захавалася ўязная брама з руставанымі калонамі, увенчанымі барочнымі дэкаратыўнымі вазамі. Ліпавая алея адсюль перасякае двухарачны цагляны мост цераз ручай.

Сядзіба — помнік архітэктуры позняга класіцызму.

Парк плошчай 5 гектараў складаецца з дзвюх частак. Больш высокая, заходняя, дзе знаходзіўся палац, аддзелена ад усходняй лагчынай. Алея абсаджана каштанам конскім. Парк засаджаны пераважна мясцовымі пародамі дрэў — клёнам, ліпай, таполяй, каштанам. Ёсць шаўкоўніца, розныя віды глогу. Шмат дэкаратыўных кустоў, а ўсяго звыш 40 парод.

Алеі пракладзены па прыбярэжным адхоне, адкуль адкрываюцца маляўнічыя, далёкія перспектывы — пойма, супрацьлеглы бераг з пясчанымі дзюнамі. Удалечыні ўгадваюцца муры старажытнага замка ў Юравічах.

Нават рэшткі былой велічы і раскошы ўражваюць. Продкі пакінулі аб сабе памяць, і нельга быць няўдзячным тым, хто пракладваў сцежку нашчадкам...

В. Грыгор'еў



Уваход у парк у в. Барбароў

Вёска майстроў

Адно з першых упамінанняў пра вёску Балажэвічы адносіцца да 1725 г., калі тут была пабудавана царква. Першыя хаты старадаўніх Балажэвіч будаваліся на месцы сённяшняга цвінтара, тут калісьці быў цэнтр вёскі. У 1811 г. частка зямлі была перададзена царкве князем Казімірам Радзівілам. Царкве належала таксама возера Падбароч і Паповы востраў. Наступнае ўпамінанне аб вёсцы адносіцца да 1826 г. Пры апісанні маёнтка Прудок за 1847 г., які існаваў з 1515 г., указваецца, што ў яго склад уваходзілі вёскі Шчакатава, Майсееўка, Мерабель, фальваркі Хамічкі і Балажэвічы. Фальварак Балажэвічы, як сведчаць дакументы, пабудаваны ў 1826 г.

Захавалася Статутная грамата маёнтка Асавец памешчыкаў Рудзеўскіх ад 28 лістапада 1862 г., з якой вынікае, што ў маёнтак уваходзіла Балажэвіцкае сельскае таварыства — 21 двор. У вёсцы жыло 40 мужчын. Прыводзяцца прозвішчы жыхароў Балажэвіч, якія існуюць і цяпер, — Дубень, Дамасевіч, Яцушка, Шаставец, Радовіч, Завенка, Ястрэмскі.

Пасля адмены прыгоннага права ў 1861 г. сяляне па закону маглі выкупляць зямлю ў памешчыка. У выкупным акце вёскі Балажэвічы ад 15 сакавіка 1870 г. сказана, што з 1862 г. з'явілася яшчэ 14 сялянскіх двароў, гэта значыць, сяляне купілі зямлю. Усяго ў карыстанні мясцовых сялян было 14 дзесяцін сядзібнай зямлі, 196 дзесяцін ворнай і 273 дзесяціны сенажаці. У 1862 г. сяляне былі пераведзены са здзельнай павіннасці на аброк, штогод ім трэба было выплачваць 456 руб. 96 кап. Жыхары неслі розныя павіннасці — галоўныя і дадатковыя. Усяго за год яны павінны былі адпрацаваць 104 дні пешшу і 104 дні з цяглом. Акрамя таго, сяляне былі абавязаны рамантаваць масты, агароджы, чысціць канавы, яры, несці даніну гаспадару за карыстанне ракою і лесам.

У даведачным выданні за 1886 г. «Воласці і важнейшыя сёлы Еўрапейскай Расіі» аб Балажэвічах напісана: двароў 25, жыхароў 171, ёсць праваслаўная царква, прыстань на рацэ, вадзяны млын.

Неўрадлівымі былі балажэвіцкія землі, мала вабілі вока паноў. Паме-

шчыкі прыстасоўвалі вядзенне гаспадаркі да запатрабаванняў рынку; намагаючыся павялічыць прыбытак, пашыралі пасевы за кошт сялянскіх надзелаў. Актыўна ішоў гандаль лесам. У 1880 г. да Балажэвіч ад Махнавіч для вывазу лесу была пракладзена вузкакалейка, якая падыходзіла да самай прыстані.

Праз дзесяць гадоў пры мясцовай царкве была адкрыта школа, размешчаная ў наёмным доме. Першым настаўнікам быў Цімафей Хмялеўскі, за навучальны год ён атрымліваў 20 рублёў.

У 1904—1913 гг. у Балажэвічах дзейнічаў шпулетакарны завод, меўся паравы рухавік магутнасцю 100 конскіх сіл. Тут працавалі 120 рабочых, якія выраблялі чаўнакі, бабіны, шпулькі і іншае абсталяванне для прадзільных і ткацкіх фабрык на 100 тыс. рублёў у год. Прадукцыя завода на міжнароднай выстаўцы 1905 г. у Бруселі была ўдастоена Вялікага залатога медаля, а ў 1912 г. у Бесарабіі — Малога залатога медаля.

Апошнім уладальнікам Балажэвіч у пачатку XX ст. быў дваранін В. Ф. Дрэцкі. Жыў ён у Польшчы, маёнткам кіраваў упраўляючы, нехта Дэмскі.

Цяпер аб паходжанні назвы вёскі. Тапонім Балажэвічы, на думку даследчыка Жучкевіча, паходзіць ад прозвішча Балашэвіч, у аснове якога ляжыць прозвішча цюркскага паходжання Балаш. Балаш — гэта вельмі шануемы на старажытным Усходзе камень лазурыт. Пацверджаннем версіі можа быць тое, што ў 1497 г. тут праходзілі крымскія татары, магчыма, ад іх і пайшла назва.

М. Сузько, М. Яцушка

Прудок

Вёска Прудок — старажытнае паселішча. Дакументы сведчаць, што маёнтак Прудок існаваў з 1515 г. Яму належалі вёскі Прудок, Шчакатава, Загорыны, Мерабель, Хамічкі і Майсееўка. У 1845 г. у маёнтку памешчыка Лянкевіча было 630 жыхароў, з іх 319 мужчын, налічвалася 95 дамоў. На кожны двор прыходзілася дзесяціна прысядзібнай зямлі, на кожную мужчынскую душу — дзевяць дзесяцін ворыва і тры дзесяціны сенажацяў.

У сярэдзіне XIX ст. ад маёнтка Прудок былі заведзены асобныя інвентары на новыя маёнткі Хамічкі і Загорыны, аддадзеныя ў спадчыну сынам Лянкевіча. На 1.1.1870 г. у Прудку па рэвізіі налічвалася 87 жыхароў. Да прудкоўскай сельскай абшчыны адносіліся вёска Шчакатава і хутар Лудзін.

М. Сузько

Побач з рэчкай Тур

Вёска Барыскавічы размешчана паміж двух маляўнічых узгоркаў. Побач рэчка Тур, у якой да меліярацыі было шмат рознай рыбы, ракаў. Вуліцы вёскі паралельныя. Адна з іх праходзіць у лесе і мае назву Хутар.

У «Геаграфічным слоўніку Каралеўства Польскага», выдадзеным у 1880 г. у Варшаве, сказана, што вёска Барыскавічы знаходзіцца побач з рэчкай Тур за 10 км на захад ад Мазыра. Адносілася яна да Слабада-Скрыгалаўскай воласці. У вёсцы ў 1861 годзе было ўсяго 13 двароў і каля 130 жыхароў, якія лічыліся за маёнткам Прудок.

Калісьці праз вёску працякала і рэчка Салакуча, якая брала пачатак каля вёскі Козенкі. Захавалася назва мясцовасці паміж Барыскавічамі і Козенкамі — Салакуча. Рэчка высахла, засталася толькі легенда, якую яшчэ можна пачуць ад старажылаў.

Жыла пані. І была ў яе дачка. Гэтая дачка пакахала хлопца, які не даспадобы быў яе маці. Маці вельмі старалася разлучыць дачку з каханым, але дарэмна, і яна кляла дачку. І вось аднойчы дачка плыла па гэтай рэчцы на лодцы. Лодка затанула. Патанула і дачка. Пасля гэтай трагедыі рака пачала ўвачавідкі мялець і зусім высахла.

Раней у вёсцы былі царква, тры млыны — адзін вадзяны і два вет-

ракі. Да 1905 года ў вёсцы зусім не было школы. Тут не было ніводнага пісьменнага чалавека. Ужо ў 80-х гадах XIX ст. у вёску зрэдку пачалі прыходзіць з арміі салдаты, якія ўмелі чытаць і пісаць. З 1905 года больш заможныя сяляне пачалі наймаць настаўніка, каб вучыць сваіх сыноў. Вучыць дзяўчынак лічылася неабавязковым. Іх справа — працаваць у гаспадарцы.

К. Цалуйка

Між лясоў і балот

За сорак кіламетраў ад Мазыра, ля дарогі ў Тураў, між лясоў і балот, пасяліліся ў сярэдзіне XVII стагоддзя першыя жыхары Махнавіч. Аб гэтым сведчыць геаграфічная карта Мінскага ваяводства канца таго ж стагоддзя, дзе ўжо была пазначана назва вёскі. На ранейшых картах такога пасялення не было.

Але новыя пасяленцы XVII ст. не былі першымі жыхарамі гэтай мясцовасці. Археалагічныя помнікі, якія захаваліся каля вёсак Махнавічы і Дзербінка, паказваюць іншае. Ва ўрочышчах Дубовіна і Цымбалы вучоныя выявілі і абследавалі звыш 60 насыпаў вышынёй 0,5—1 м і дыяметрам 8—12 м на плошчы каля 10 гектараў. На думку навукоўцаў, гэта могільнікі — пахаванні нябожчыкаў далёкіх продкаў — дрыгавічоў і палян. Яны жылі тут у IX — XII стст.

Ішлі гады, вякі. Павялічылася насельніцтва Махнавіч. Па адміністрацыйным падзеле Мінскай губерні ў 1870 г. сярод 75 вёсак і іншых пасяленняў у Махнавіцкай сельскай абшчыне Буйнавіцкай воласці значыліся: вёскі Махнавічы з насельніцтвам 157 душ, Забалацце — 35 душ, хутар Заводны Востраў — 18 душ. Дзесьці ў першай палове XIX стагоддзя на сродкі мясцовых багатых землеўладальнікаў у Махнавічах была пабудавана Увядзенская праваслаўная царква.

У статыстычным выданні «Воласти и важнейшие селения Европейской России» за 1886 г. (выпуск V, Санкт-Пецярбург) дадзены такія звесткі па Буйнавіцкай воласці: «Махновичи — дворов 61, жителей — 467, церковь православная».

Галоўным заняткам сялян Махнавіч на працягу стагоддзяў былі земляробства і жывёлагадоўля. Некаторы прыбытак сялянскім гаспадаркам прыносіў збор лясных ягад і грыбоў. Востра адчувалася малазямелле. Лепшыя землі, лясныя ўгоддзі ў акрузе належалі мялешкавіцкаму, рамязоўскаму і буйнавіцкаму памешчыкам, якія валодалі амаль 60 тысячамі дзесяцін зямлі.

Сяляне за свае надзелы зямлі павінны былі некалькі дзён на тыдні адпрацаваць на карысць памешчыка — апрацоўваць палі, касіць сена, рамантаваць панскія будынкі, дарогі, масты. Паколькі Махнавічы знаходзіліся на дзяржаўнай дарозе, што звязвала цэнтр павета Мазыр з многімі заходнімі валасцямі і гарадамі Тураў, Давыд-Гарадок і Пінск, у абавязкі сялян уваходзіла выдзяляць коней для праезду чыноўнікаў і быць іх праваднікамі і ахоўнікамі.

З другой паловы мінулага стагоддзя, пасля адмены прыгоннага права, пачалі развівацца лясныя промыслы. Нарыхтоўвалася будаўнічая драўніна і клёпка, лучына і бяроста для смалакурных заводаў, выраблялiся дзёгаць і паташ. У 1880 г. побач з Махнавічамі для вывазкі лесу на рачную прыстань Балажэвічы была пабудавана вузкакалейная чыгунка, цяглавай сілай на якой былі коні. Сляды гэтай «конкі» захаваліся і цяпер.

У цэнтры буйнога ляснога масіва за некалькі вёрст ад Махнавіч у сярэдзіне мінулага стагоддзя ўзнікла вёска Зялёны Мох, уладальнікамі якой былі мясцовыя памешчыкі. Яны ўсё больш займаліся гандлем лесу, прадукцыяй яго перапрацоўкі. Там жа быў пабудаваны дыхтоўны памешчыцкі дом, пасаджаны сад. Некалькі рэдкіх дрэваў з гэтага саду зберагліся да нашага часу.

У пачатку XX ст. у Махнавічах было адчынена аднакласнае народнае вучылішча, дзе вучылася да двух дзесяткаў хлопчыкаў і некалькі дзяўчынак. Настаўнікам быў Павел Рухло. Памяшканнем для школы служыла сялянская хата.

Па зямельнай рэформе з пачатку нашага веку пачалося рассяленне вясковых жыхароў на хутары. Больш чым 150 сялянскіх сем'яў перавезлі свае пабудовы на хутарскія надзелы сярод лясоў і балот, паводдаль хата ад хаты. А ў Махнавічах засталося каля трох дзесяткаў двароў, праваслаўная царква і карчма пры дарозе. Жылі тут і восем сем'яў яўрэяў, якія трымалі свае лаўкі і кузні.

З пачаткам сусветнай вайны ў 1914 г. амаль пяцьдзесят мужчын былі мабілізаваны на фронт, астатняе дарослае насельніцтва вёскі з цяглавай сілай удзельнічала ў будаўніцтве дарогі Мазыр — Лельчыцы — Тураў.

В. Бабкова, М. Капач

СПІС НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ МІНСКАЙ ГУБЕРНІ (1909)

Мазырскі павет

Населенный пункт	Душ обоих полов	Дворов	Населенный пункт	Душ обоих полов	Дворов
г. Мозырь	10 396		хут. Иванковщина	26	5
д. Акулинка	360	72	д. Казимировка	344	44
д. Антоновка	230	33	д. Каменка	419	62
д. Балажевичи	435	59	хут. Камень	34	4
д. Березовка	371	69	д. Мелешковичи	1730	231
д. Бибики	450	76	д. Мерабеля	158	22
Березовское имение Веселкино	18	1	д. Михалки	296	52
д. Боков Великий	193	29	им. Михалки	28	1
д. Боков Малый	336	56	д. Млынок Нижний	124	18
им. Боков Малый	11	1	д. Млынок Мелешковичский	38	8
им. Барбаров	32	8	д. Моисеевка	454	64
д. Барбаров	775	112	д. Новики	261	52
фольв. Барбаров	96	14	д. Осовец	445	64
д. Борисковичи	735	118	им. Осовец	19	1
д. Буда Зимовая	142	21	д. Пеньки	97	20
хут. Буда Казимировская	126	15	хут. Передрейка	161	23
хут. Буда Моисеевская	18	2	д. Провтюки	335	47
д. Буда Осовецкая	142	21	д. Прудок	466	62
д. Белая	165	28	им. Прудок	44	1
д. Васьковка	300	50	д. Романовка	430	75
д. Глиница	428	60	д. Рудня Каменская	209	30
хут. Гряда Криничная	74	11	д. Рудня Михалковская	139	27
д. Груд Кеневичев	192	31	д. Рудня Скрыгаловская	108	14
д. Дрозды	56	7	мест. Скрыгалово	1284	204
д. Жаховичи	915	122	им. Скрыгалово	35	1
хут. Забрачье	26	3	д. Слобода Скрыгаловская	1172	156
д. Заболотье	154	28	им. Слобода Скрыгаловская	129	1
д. Загорины	232	32	д. Слободка Скрыгаловская	314	38
им. Загорины	12	1	д. Слободка Михалковская	86	19
хут. Зеленка	35	5	д. Сколодин	188	21
д. Зимовищи Большие	338	42	д. Стрельск	120	19
им. Зимовищи Большие	10	1	д. Хомички	218	39
д. Зимовищи Малые	435	46	им. Хомички	20	1
им. Зимовищи Малые	11	1	д. Щекотова	202	24

1917

1941

У АГНІ РЭВАЛЮЦЫЙ І ВОЙНАЎ

За ўладу Саветаў

1917 год. Мазыр жыў напружаным трывожным жыццём прыфрантавога горада, вайна патрабавала ўсё новых ахвяр, падаў узровень жыцця насельніцтва, але ніхто не здагадваўся, якія небывалыя выпрабаванні, якія вялікія гістарычныя падзеі неўзабаве напаткаюць народ.

Праз некалькі дзён пасля таго, як у Петраградзе перамагла Лютаўская рэвалюцыя, мазыране даведаліся аб стварэнні Часовага ўрада. У горадзе і яго ваколіцах адбываліся сходы і мітынгі, удзельнікі якіх адзінадушна віталі перамогу над царызмам.

Прыкметную ролю ў лютаўскіх падзеях на Мазыршчыне адыгралі матросы Прыпяцкага атрада суднаў, якія базіраваліся ў Мазыры. Гэты атрад у першую сусветную вайну ўваходзіў у склад Заходняга фронту.

Пра падзеі тых дзён расказвае актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага руху на Мазыршчыне У. І. Мазуркевіч. «Пасля таго, як 28 лютага 1917 г. быў распаўсюджаны маніфест імператара Мікалая II аб адрачэнні ад трона і стала вядома, што ўлада перайшла ў рукі Часовага ўрада, у Мазыры быў праведзены агульнагарадскі мітынг. Вялікі двор мужчынскай гімназіі ўяўляў незвычайнае відовішча. Адзін за адным выступалі прамоўцы з палымянымі прамовамі. Гаварылі пра тое, што ўжо трэці год ідзе вайна за інтарэсы капіталістаў, з кожным днём усё больш ахвяр. Канец вайны можа прыблізіць толькі народ, калі ён завершыць рэвалюцыю і возьме ўладу ў свае рукі... Усюды палымнелі лозунгі «Далоў царскі ўрад!», «Далоў вайну!», «Няхай жыве дэмакратычная рэспубліка!»...»

Хутка былі прагнаны са сваіх пасад чыноўнікі старога рэжыму. Замест губернатараў, павятовых начальнікаў прызначаліся прадстаўнікі Часовага ўрада — губернскія і павятовыя камісары. Новая ўлада ахвотна падтрымлівала стварэнне камітэтаў, камісій і іншых арганізацый, якія супрацоўнічалі з ёй. Мэта іх была — накіраваць жыццё правінцыі ў рэчышча «парадку і цішыні», забяспечыць непадзельную ўладу Часовага ўрада і працяг вайны.

Мазырскім павятовым камісарам быў прызначаны памешчык А. А. Булгак-Флёраў, што выклікала незадаволенасць насельніцтва. Камісар вымушаны быў адмовіцца ад пасады. У інфармацыйным лісце губернскага аддзела па справах мясцовага самакіравання гаварылася, што памешчык пакінуў сваю пасаду «без асаблівага націску»... Па прадстаўленні губернскага камісара мазырскім павятовым камісарам быў зацверджаны таварыш пракурора Мінскай акругі П. М. Фалевіч, а Булгак-Флёраў узначаліў павятовую земскую ўправу.

Палітычнае жыццё ў Мазыры ажывілася. Розныя партыі спяшаліся стварыць у горадзе свае арганізацыі. Да

Дэлегаты 1-га акруговага з'езда Саветаў

ўлады імкнуліся бундаўцы, сацыялісты-рэвалюцыянеры (эсэры), прадстаўнікі Аб'яднанай яўрэйскай сацыялістычнай партыі, Польскі выбарны камітэт, Партыя народнай вольнасці... Пачала дзейнічаць арганізацыя РСДРП, большасць якой складалі меншавікі. Бальшавіцкая група не была нават створана. У красавіку 1917 г. арганізавалася аб'яднаная РСДРП — меншавікі і бальшавікі. З «аб'яднанкай» мелі сувязь і бундаўцы. Дзейнічала невялікая арганізацыя БСГ (Беларуская сацыялістычная грамада). Кожная арганізацыя карысталася падтрымкай розных груп насельніцтва па нацыянальных і класавых прыкметах.

У сакавіку адбыліся выбары ў мазырскія Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Большасць месцаў атрымалі эсэры, бундаўцы і меншавікі. Саветамі кіравалі эсэры Малыкін і Каменеў.

Сялянам цяжка было разабрацца ў складанай палітычнай сітуацыі ў павеце. Камісары Часовага ўрада, земствы, Савет рабочых і сялянскіх дэпутатаў пераконвалі сялян цярпліва чакаць лепшай долі, вырашэння зямельнай рэформы праз Устаноўчы сход. Памешчыкі між тым заставаліся пры сваіх інтарэсах.

У красавіку Саветы аб'ядналіся. Большасць месцаў захапілі прадстаўнікі згодніцкіх партый, якія падтрымлівалі Часовы ўрад. Амаль увесь дакастрычніцкі перыяд Мазырскім Саветам

кіраваў Малыкін. Сярод членаў выканкама Савета, у які ўваходзілі Лакін, Корнеў, Злотнікаў, Гафштэйн, Гурэцкая, Ермакоў і Каменеў, бальшавікоў не было, хоць у горадзе працавала нямала актыўных членаў гэтай партыі. Адзін з іх — дваццацігадовы рабочы фабрыкі «Маланка» Ф. І. Віршыц. У сакавіку 1917 г. яго выбралі старшынёй фабзаўкама. Разам з Ліўшыцам ён быў членам Савета. Пад іх кіраўніцтвам рабочыя фабрык «Маланка», «Прыма» адразу пасля Лютаўскай рэвалюцыі абязброілі канвой і гарадавых.

8 красавіка Мазырскі Савет рабочых дэпутатаў прыняў пастанову аб 8-гадзінным рабочым дні, якая насіла рэкамендацыйны характар: «На чаргу павінна быць пастаўлена правядзенне ў заканадаўчым парадку 8-гадзіннага рабочага дня ... без памяншэння заработнай платы». Адначасова Савет папярэджваў аб недапушчальнасці неарганізаваных выступленняў рабочых, заклікаў да пагаднення з прадпрымальнікамі.

11 мая 1917 г. у адным з першых нумароў газеты «Известия Мозырского Совета рабочих и солдатских депутатов» паведамлялася, што ўводзіцца 8-гадзінны рабочы дзень, пазаўрочныя работы дазваляюцца ў парадку выключэння за двайную плату, а напярэдадні святаў — 7-гадзінны рабочы дзень. Забаранялася жаночая і дзіцячая праца на прадпрыемствах са шкоднымі ўмовамі. Прадпрымальнікі ўспрынялі пераход да 8-гадзіннага рабочага дня без супраціўлення, таму што вялікі попыт і высокія цэны на тавары дазвалялі перакласці лішнія затраты на пакупніка...

У маі 1917 г. на фабрыцы «Маланка» была створана бальшавіцкая ячэйка. У яе ўваходзілі рабочыя Траццякоў, Ліўшыц, Віктар Чарнецкі, Лерман, Фрыдман, Кірпічнікаў і Віршыц. Старшынёй ячэйкі быў абраны Ліўшыц, сакратаром — Віршыц. Лёс многіх першых бальшавікоў склаўся трагічна. У барацьбе за ўладу Саветаў загінулі Траццякоў, Лерман, Фрыдман. У 1920 г. белапалякі павесілі Кірпічнікава.

У маі — чэрвені ў Мазыры прайшла забастоўка рабочых абутковых майстэрняў. У ходзе яе заработная плата была павышана ад 40 да 100 працэнтаў. Рабочыя актыўна падтрымлівалі забастоўку калектыву лесапільна-фанернага завода на ст. Пціч. У дапамогу забастоўшчыкам было сабрана 317 рублёў. На неспакойную станцыю прыбылі мазырскія рабочыя Малышкін і Петравец, якія рашуча падтрымлівалі рабочых завода. Забастоўка працягвалася 27 дзён і закончылася перамогай рабочых.

Вясной і ўлетку 1917 г. пад націскам рэвалюцыйнай барацьбы ў гарадах узмацніўся і сялянскі рух. Сяляне захоплівалі зямлю, маёмасць гаспадароў, высякалі казённы і памешчыцкі лес, праганялі з пасад чыноўнікаў Часовага ўрада. Батракі і малазямельныя сяляне падняліся супраць памешчыка Лянкевіча ў маёнтку Міхалкі. Уладальнік маёнтка Сідзельнікі Багдан Абуховіч, які меў 380 дзесяцін зямлі, тэлеграфаваў 26 чэрвеня міністру ўнутраных спраў, што Міхалкаўскі камітэт самавольна дзеліць зямлю. Барбароўскі памешчык Горват таксама прасіў абараніць яго ад самавольных дзеянняў сялян і мясцовых камітэтаў.

Сялянскія хваляванні пракаціліся па ўсім Мазырскім павеце. Першым арганізаваным мерапрыемствам стаў сялянскі з'езд, які адбыўся 29 красавіка. Пасля абмеркавання пытання аб зямлі з'езд запатрабаваў бясплатнай перадачы беззямельным сялянам усіх памешчыцкіх, царкоўных і іншых земляў. З такім жа патрабаваннем з'езд накіраваў дэлегатам на I Усерасійскі сялянскі з'езд старшыню Мазырскага павятовага зямельнага камітэта Ф. Цалко, які, аднак, не апраўдаў даверу сялян. З'езд прызнаў неабходным працяг вайны, адобрыў «заём свабоды», выказаў давер Часоваму ўраду.

Ліпеньскі расстрэл дэманстрацыі рабочых і салдат у Петраградзе выклікаў гнеўнае абурэнне мазыран. Была праведзена дэманстрацыя пратэсту, але

кіраўніцтва Мазырскага Савета ўпарта падтрымлівала дзеянні Часовага ўрада.

У жніўні мазырскія бальшавікі выйшлі з аб'яднанага камітэта, разарвалі адносіны з «абаронцамі» і стварылі самастойную арганізацыю. 23 жніўня Палескі камітэт РСДРП(б) накіраваў мазырскай арганізацыі бальшавікоў пісьмо, у якім ухваляў рашэнне «адда-ліцца ад «абаронцаў», абяцаў усемагчымую падтрымку, дапамогу літаратурай, сувязь з ЦК партыі і прапанаваў прыняць удзел у канферэнцыі бальшавікоў Паўночна-Заходняга краю ў Мінску.

Палітыка Мазырскага Савета была непастаяннай і супярэчлівай. Савет узяў пад свой кантроль, абапіраючыся на рабочыя дружыны, станцыі Мазыр, Калінкавічы, прыстань на Прыпяці, пошту, тэлеграф. На мітынгах салдаты адмаўляліся ісці на Петраград, арыштоўвалі афіцэраў. І адначасова Мазырскі Савет, кіраўнікі прафсаюза актыўна выступалі ў падтрымку Часовага ўрада. 30 жніўня Савет заявіў, што гатовы прыкласці ўсе намаганні, каб абараніць адзіную, прызнаную ўсёй краінай вярхоўную ўладу — Часовы ўрад.

У сярэдзіне мая адбыўся 2-гі з'езд сялянскіх дэпутатаў, у чэрвені — 3-ці. Яму папярэднічалі бурныя падзеі. Савет паспрабаваў збавіцца ад бальшавіка, афіцэра 3-й арміі В. Азарава, які карыстаўся вялікім аўтарытэтам у горадзе і павеце. Камандуючаму Заходнім фронтам быў накіраваны зварот з просьбай адклікаць з Мазыра Азарава, які актыўна выступаў «з прапагандай бальшавізму ў прыфрантавой паласе, што дрэнна ўздзейнічае на сялян і салдат», і перадаць яго справу ў франтавую пракуратуру. У рабоце з'езда ўдзельнічала вялікая група салдат.

5 верасня адбыўся 4-ты з'езд сялянскіх дэпутатаў, на рашэнні якога рашучы ўплыў аказалі бальшавікі. З'езд запатрабаваў стварыць кіруючыя органы з прадстаўнікоў рабочых і сялян, перадаць сялянам зямлю памешчыкаў, адмяніць смяротную кару на фронце, аб'явіць раўнапраўе нацый, неадкладна падпісаць дэмакратычны мір.

Уплыў бальшавікоў усё больш адчуваўся ў горадзе. Пад іх націскам 4 верасня Савет абмеркаваў контррэвалюцыйнае выступленне Карнілава, запатрабаваў устанавіць рабочы кантроль над вытворчасцю і размеркаваннем, нацыяналізаваць банкі і буйныя прадпрыемствы, спыніць вайну, распачаць барацьбу з разрухай, увесці прагрэсіўны падатак.

5-ты з'езд сялянскіх дэпутатаў Мазырскага павета адбыўся 6—7 кастрычніка. У прэзідыум яго ўваходзіў член Мінскага камітэта РСДРП(б) і Мінскага Савета М. І. Крывашэін, якога выбралі ганаровым старшынёй з'езда. У прэзідыуме былі В. Азараў, сяляне Чубар, Місачэнка, Ветраў. З'езд выпрацаваў рашучую, непрымірымую рэзалюцыю, якая патрабавала абмежавання правоў памешчыкаў, капіталістаў і банкіраў, неадкладную перадачу зямлі сялянам, скліканне Устаноўчага сходу.

Бальшавіцкі характар рэзалюцыі з'езда адзначылі газеты «Свободный народ» і «Речь», якія сцвярджалі, што гэтая рэзалюцыя з'яўляецца «пагрозай анархіі». Павятовы камісар П. Фалевіч дакладваў галоўнаму ўпраўленню міліцыі, што ў павеце разрастаюцца беспарадкі, сяляне захопліваюць і дзеляць зямлю памешчыкаў. «Становішча з кожным днём становіцца горшым. Хутка яно стане пагражальным дзякуючы бальшавіцкай рэзалюцыі сялянскага з'езда».

У верасні — кастрычніку ў населеных пунктах павета адбылося звыш дваццаці сялянскіх хваляванняў. Батракі патрабавалі перадаць ім зямлю памешчыкаў, царкоўнікаў і кулакоў, ліквідаваць кабальную арэнду, палегчыць падатковы цяжар.

Маскоўская эсэраўская газета «Зямля і воля» паведамляла, што на аснове пастановы Мазырскага павятовага зямельнага камітэта сяляне захопліваюць яравыя палі і сеюць жыта. Газета «Речь» — цэнтральны орган партыі ка-

дэтаў — змясціла паведамленне, што з'езд сялян, які адбыўся ў Мазыры, прыняў шэраг рэзалюцый бальшавіцкага характару.

Увосень 1917 г. рэвалюцыйны рух узняўся на самую высокую ступень. Становішча ў Беларусі было неспакойным: дэманстрацыі, сялянскія выступленні, хваляванні салдат Заходняга фронту. 25 кастрычніка Часовы ўрад быў звергнуты. II Усерасійскі з'езд Саветаў у Петраградзе ўтварыў Савет народных камісараў на чале з У. І. Леніным. Улада ў Мінску і ў Мінскай губерні перайшла ў рукі Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта.

У Мазыры Савецкая ўлада ўстанаўлівалася з вялікімі цяжкасцямі. Уплыў аказвала тое, што ў Савеце рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў бальшавікі, як і раней, былі ў меншасці. Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў не падтрымаў кастрычніцкі пераварот. Старшыня Савета Малыкін заявіў: «Нашы таварышы-бальшавікі памыляюцца, беручы ўладу ў свае рукі. Гэта прывядзе да анархіі...»

Савет пачаў сабатаваць мерапрыемствы Савецкай улады. Рабочыя фабрык «Прыма», «Маланка» і іншых прадпрыемстваў, матросы Прыпяцкага атрада суднаў патрабавалі зняць стаўленікаў Часовага ўрада з іхніх пасад і стварыць ваенна-рэвалюцыйны камітэт. Так былі прагнаны павятовы камісар Фалевіч і яго намеснік Ліякумовіч, начальнік міліцыі Несцярэнка і іншыя. Быў створаны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт на чале з радавым 510-га Васільсурскага палка М. І. Паўлавым. У Савет увайшлі бальшавікі Барабанаў, Азараў, Ліўшыц, матрос Сядых, Лук'яновіч і Э. Гурэцкая (Бунд).

Вялікую дапамогу пры ўстанаўленні Савецкай улады ў Мазыры аказаў накіраваны з Мінска Ваенна-рэвалюцыйным камітэтам Заходняй вобласці і фронту 24-гадовы большавік С. В. Федаровіч. Нягледзячы на маладосць, ён не раз арыштоўваўся царскімі ўладамі за палітычную агітацыю. Быў

М. І. Паўлаў

упаўнаважаным Мінскага камітэта РСДРП(б) па ўстанаўленні Савецкай улады на Мазыршчыне.

Хутка была створана новая міліцыя, у складзе якой налічвалася 30 чалавек. Начальнікам быў прызначаны бальшавік А. М. Кухнавец, жыхар вёскі Барбароў. Трэба было паставіць рашучы заслон крадзяжу дзяржаўнай маёмасці, спекуляцыі, хуліганству, бандытызму. Міліцыі дапамагалі рабочыя-дружыннікі.

На вёсцы таксама было неспакойна. Пасля таго як прыйшлі весткі аб пераваросе ў Петраградзе, сяляне вёскі Міхалкі П. С. Каленік, Н. С. Калеснік, Л. П. Краўчанка і іншыя, узброіўшыся хто чым мог, арыштавалі памешчыка Лянкевіча. Зямля і маёмасць былога гаспадара маёнтка перайшлі ў рукі валаснога рэвалюцыйнага камітэта. Так зрабілі сяляне амаль па ўсёй Мазыршчыне.

Стары гарадскі Савет у Мазыры так і не прыняў новай улады. 6-ты з'езд сялянскіх дэпутатаў 22 і 23 снежня, хоць і прызнаў ваенна-рэвалюцыйны камітэт адзінай уладай у павеце, запісаў у сваёй рэзалюцыі аб стварэнні сацыялістычнай улады з прадстаўнікоў некалькіх партый. Міліцыя напала на след падпольнай гарадской управы, спроба арганізаваць антысавецкую дэманстрацыю была спынена.

На выбарах ва Устаноўчы сход у лістападзе і снежні 1917 г. адзінаццаць партый і арганізацый прапаноўвалі сваіх кандыдатаў. Вялася настойлі-

Супрацоўнікі мазырскай міліцыі, узнагароджаныя імяннымі шаблямі. Стаяць (злева направа): К. І. Шыбут, Н. М. Гецька. Сядзяць (злева направа): С. Дземідзенка, К. П. Трапачка. 1923

вая агітацыя сярод насельніцтва, ствараліся кааліцыі. Бальшавікі не прынялі прапанову бундаўцаў аб вылучэнні адзіных кандыдатаў, але не паспелі паведаміць аб гэтым выбаршчыкам. Звесткі аб выніках галасавання былі пададзены са спазненнем. У Мазырскім павеце і гарнізоне поўную перамогу атрымалі бальшавікі, у Мазыры большасць галасоў атрымалі чатыры яўрэйскія арганізацыі.

Многа галасоў атрымана было і польскім нацыянальным спісам. Буржуазныя партыі (кадэты, рускі дэмакратычны спіс) падтрымала невялікая колькасць выбаршчыкаў. Каля трох тысяч галасоў атрымала БСГ. На поўную перамогу разлічвалі эсэры, але пад уплывам салдат-франтавікоў і матросаў Балтыйскага флоту, якія вярнуліся ў вёскі, сяляне аддавалі свае галасы бальшавікам.

Нестабільным заставалася становішча ў Мазыры на пачатку 1918 г. 5 студзеня на пасяджэнні Мазырскага Савета распрацоўваўся наказ дэлегату III Усерасійскага з'езда Саветаў матросу Выбарных: Устаноўчы сход павінен складацца з прадстаўнікоў рабочых і сялян, у ім павінны мець сваіх прадстаўнікоў сацыялістычныя партыі. Уся ўлада на месцах — Саветам. Эсэр Марціновіч, бундаўка Гурэцкая і іншыя выступілі супраць і прапанавалі выбраць іншага дэлегата. Патрабаванне было адхілена, але ў наказ увайшла прапанова аб устанаўленні Савецкай улады («сацыялістычнай улады») з прадстаўнікоў усіх небуржуазных партый.

На працягу студзеня 1918 г. Савецкая ўлада мірным шляхам усталявалася па ўсёй тэрыторыі Мазырскага павета. Сярод змагароў за новую ўладу былі розныя людзі. Адны з іх прысвяцілі рэвалюцыйнай барацьбе ўсё сваё жыццё, другія былі далучаны да актыўнай палітычнай дзейнасці апошнімі бурнымі падзеямі. Энергічным, валявым чалавекам і камандзірам быў В. І. Азараў, які знаходзіўся ў гушчы падзей амаль увесь 1917 год. Дзякуючы свайму службоваму становішчу (служба тылу 3-й арміі) ён мог без перашкод ездзіць па павеце, ажыццяўляць сваю работу. У пачатку 1917 г. ён быў выбраны ў склад Мазырскага Савета сялянскіх дэпутатаў. У чэрвені, на 3-м з'ездзе сялян, нягледзячы на засілле эсэраў, В. Азараў быў выбраны намеснікам старшыні павятовага Савета сялянскіх дэпутатаў. Мясцовыя ўлады варожа адносіліся да работы Азарава, спрабавалі арыштаваць і перадаць яго ваеннаму суду, і ён вы-

мушаны быў часова пакінуць горад. Але пасля вярнуўся і прымаў актыўны ўдзел у рабоце 4-га і 5-га з'ездаў, якія прынялі бальшавіцкія рэзалюцыі. Разам з С. В. Федаровічам В. І. Азараў прыехаў у Мазыр у лістападзе 1917 г. і прымаў актыўны ўдзел ва ўстанаўленні тут Савецкай улады.

Я. Фарбераў

С. В. Федаровіч

Федаровіч Сямён Васілевіч нарадзіўся 20.8.1893 г. у в. Грычынавічы Мазырскага павета, актыўны ўдзельнік барацьбы за ўладу Саветаў. За палітычную агітацыю сярод сялян арыштоўваўся царскімі ўладамі ў 1910, 1913 і 1916 гг. У чэрвені 1917 г. выбраны старшынёй салдацкага камітэта роты, удзельнік кастрычніцкіх падзей у Мінску. Упаўнаважаны Мінскага камітэта РСДРП(б) па ўстанаўленні ўлады Саветаў у Мазырскім павеце. У перыяд нямецкай акупацыі ўдзельнік камуністычнага падполля на Мазыршчыне, у савецка-польскую вайну камісар дывізіі на Заходнім фронце.

Пасля грамадзянскай вайны на партыйнай і савецкай рабоце ў Сібіры, на Паўночным Каўказе. З 1939 г. — старшыня планавай камісіі Ленінскага райвыканкама Пінскай вобласці. Удзельнік камуністычнага падполля і партызанскага руху на Піншчыне ў Айчынную вайну. З 1944 г. — дырэктар Дзяржаўнага выдавецтва БССР. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Памёр 10.3.1968 г.

Родам з Лубні

К. П. Марціновіч нарадзіўся ў 1894 г. у мнагадзетнай сялянскай сям'і, у якой было пяцёра сыноў і дзве дачкі. Вучыліся дзеці ў наёмных настаўнікаў толькі ў зімовы час. Ксенафонт быў здольным вучнем, бацька імкнуўся даць яму магчымасць вучыцца далей. Да пачатку першай сусветнай вайны Марціновіч працаваў вясковым настаўнікам у Магілёўскай губерні. У 1914 г. паступіў у Віленскі настаўніцкі інстытут.

Рэвалюцыйныя падзеі на Беларусі захапілі маладога настаўніка. З мая 1917-га і да пачатку нямецкай акупацыі Палесся вясной 1918 г. Ксенафонт Піліпавіч Марціновіч — член выканкама Мазырскага павятовага Савета і намеснік старшыні Мазырскага рэвалюцыйнага камітэта. Калі горад захапіў вораг, перайшоў на падпольную работу. Пагражаў арышт, таму ён перайшоў лінію фронту і ўступіў у Чырвоную Армію.

У грозным 1919 г. Марціновіч на Паўднёвым фронце, галоўны палявы кантралёр.

К. П. Марціновіч (сядзіць, першы справа)

Пасля грамадзянскай вайны Ксенафонт Марціновіч назначаецца начальнікам ваенна-марской інспекцыі Наркамата рабоча-сялянскай інспекцыі краіны. З 1937 г. ён начальнік Першага галоўнага ўпраўлення Наркамата абароннай прамысловасці СССР.

Працуючы ў Маскве на адказнай дзяржаўнай пасадзе, К. П. Марціновіч меў шырокія сувязі з культурным, у тым ліку пісьменніцкім асяроддзем краіны. Асабліва дарагімі і незабыўнымі былі для яго сустрэчы з А. М. Горкім.

Высокі быў яго аўтарытэт у армейскіх колах і ва ўрадзе. У 1930 г. быў зацверджаны статут новага баявога ордэна Чырвонай Зоркі. Пастановай Прэзідыума УЦВК СССР 23 мая 1930 г. К. П. Марціновіч быў узнагароджаны ордэнам пад № 2.

А праз некаторы час у Чырвонай Арміі раскруцілася страшэннае кола палітычных рэпрэсій, якое захапіла і загубіла разам з тысячамі вядомыхваеначальнікаў і К. П. Марціновіча...

М. Капач

АД МАЗЫРСКАГА САВЕТА СЯЛЯНСКІХ ДЭПУТАТАЎ

Браты-сяляне! Уступаючы ў 1918 год, Мазырскі павятовы Савет сялянскіх дэпутатаў звяртаецца да вас з брацкім заклікам згуртавацца ў адну агульную дружную і стойкую арганізаваную сілу для прывядзення ў парадак разбуранага гаспадарчага апарата і адміністрацыйна-судовага ўпраўлення.

Новая земская ўправа ўжо адкрыла сваю дзейнасць. Цяжка ёй будзе справіцца і наладзіць разбураны фінансавы механізм. Але, мяркуючы па яднанню на сялянскім з'ездзе, мы разлічваем на шырокую і дружную падтрымку ўсіх сялян.

Мы верым у сілу рускага чалавека, у яго творчы розум і таму галосна скажам: мы перажылі стагоддзі прыгнёту царызму, перажывем і гэты час, канчаткова замацаваўшы за сабою волю, зямлю і брацтва народаў.

Азараў

Старшыня Савета, член Усерасійскага выканаўчага камітэта Саветаў

«Известия Мозырского Совета рабочих и солдатских депутатов», 5 лютага 1918 г.

Адпор інтэрвентам

Пасля свайго першага ўсталявання Савецкая ўлада трымалася ў Мазыры нядоўга. 8 лютага 1918 г., парушыўшы пагадненне аб перамір'і, Германія накіравала свае войскі на ўсход. Нягледзячы на гераічнае супраціўленне толькі што створанай Чырвонай Арміі, немцы захапілі Мінск, Гомель, акупіравалі большую частку Беларусі. У пачатку сакавіка варожыя войскі ўзялі пад кантроль Мазыр і Мазырскі павет. Гэтая тэрыторыя ўвайшла ў склад «Палескай губерні», якая падпарадкоўвалася гетману Украіны Скарападскаму. За нямецкімі войскамі ў Мазыр прыйшло падраздзяленне гайдамакаў, пачала дзейнічаць іхняя «варта». Скарападскага хутка знялі з пасады, і гэтыя сілы сталі падпарадкоўвацца «галоўнаму атаману» Пятлюру.

На тэрыторыі, акупіраванай немцамі, было ўведзена ваеннае становішча. Жыхарам пасля 20 гадзін забаранялася выходзіць з дому, вокны яны павінны былі завешваць або закрываць аканіцамі. Усе газеты канфіскоўваліся, за выдачу палітычных агітатараў абяцалася ўзнагарода — 200 рублёў.

У свае маёнткі вярнуліся многія памешчыкі. Мясцовая ўлада ўвяла ўсемагчымыя грашовыя і натуральныя паданткі, у тым ліку пастаўкі буйной рагатай жывёлы, коней, авечак, свіней, курэй, збожжа. Усё вывозілася ў Герма-

нію. Нямецкая камендатура, «варта» і «дзяржаўная паліцыя» тэрарызавалі насельніцтва горада і вёсак.

Бальшавіцкая арганізацыя, ядром якой стала ячэйка на фабрыцы «Маланка», пайшла ў падполле. Яна падтрымлівала сувязь з бабруйскай падпольнай арганізацыяй і партыйным цэнтрам у Смаленску. У рабоце арганізацыі прымалі актыўны ўдзел М. А. Галадзец, С. Н. Дуброва, С. В. Федаровіч, Ф. І. Віршыц і іншыя.

Падпольшчыкі вырашылі адзначыць свята 1 Мая. Нямецкае камандаванне выдала загад аб забароне мітынгаў і дэманстрацый, але падрыхтоўка да свята працягвалася. Распаўсюджваліся лістоўкі не толькі сярод рабочых, але і сярод нямецкіх салдат.

Наступленне на Мазыр развівалася і з поўдня, дзе дзейнічаў левы фланг 24-й дывізіі. У Новай Рудні (цяпер Ельскі р-н) быў падбіты браняпоезд працiўніка «Сікорскі», які трапіў у рукі савецкіх войск. 27 чэрвеня кананерскія лодкі «Мощный», «Губительный» і «Грозный» падышлі да вёскі Нагорная і ўступілі ў артылерыйскую дуэль з батарэямі і бронепаяздамі працiўніка каля Мазыра і Калінкавіч. Сярод белапалякаў пачалася паніка, калі снарады канлодкі «Мощный» сталі рвацца на прыстані Мазыра і адзін з іх разарваўся каля борта парахода, дзе знаходзіўся штаб начальніка 9-й польскай пяхотнай дывізіі.

Трапіўшы патаемна ў горад, разведчыкі-маракі і чэкісты сустрэлі разведчыкаў 215-га палка 24-й дывізіі. Яны захапілі ў палон начальніка паліцыі Мазыра, аднаго з прыставаў і тых, хто караў патрыётаў. Быў арыштаваны мясцовы мільянер Зільберштэйн, які ўдзельнічаў у арганізацыі пакаранняў і тэроры супраць рабочых Мазыра і чыгуначнікаў Калінкавіцкага вузла. 20 карнікаў і контррэвалюцыянераў праз некаторы час былі прыгавораны да расстрэлу. *(РДАВМФ. Ф. р-402. Воп. 2. Спр. 210. Л. 5.)*

Раніцай 29 чэрвеня да мазырскай прыстані падышлі канлодкі «Мощный» і «Грозный», тральшчык «Патрон». На борце «Мощного» знаходзіўся камандуючы ДВФ П. І. Смірноў і ваенкам флатыліі Я. Я. Чадарайн. Маракі спешна прыступілі да тушэння падпаленага белапалякамі драўлянага моста. Аднак яго выратаваць не ўдалося. Узарваным быў і чыгуначны мост. У 15 гадзін 30 хвілін таго ж дня ў Мазыр уступіў 215-ты полк. За правядзенне аперацыі па вызваленні Мазыра камандуючы групай Ц. С. Хвесін быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Гэтым жа ордэнам быў узнагароджаны і камандзір 4-га палка 2-й кавалерыйскай брыгады Пётр Мусаеў. Полк пад яго камандаваннем вызначыўся ў баях каля вёсак Агароднікі, Шарэйкі, Лубня і Прудок, захапіў у палон 216 белапалякаў з 6 кулямётамі, 500 ручнымі гранатамі і іншымі трафеямі (усе вёскі Калінкавіцкага раёна, акрамя Лубні).

Расчысціўшы за некалькі гадзін праходы пад узарваным чыгуначным і спаленым драўляным мастамі, судны флатыліі пайшлі ўверх па Прыпяці. З іх дапамогай 30 чэрвеня вёскі Загорыны, Мерабель, Касцюковічы, Жахавічы, а 1 ліпеня Скрыгалаў і Слабада былі вызвалены. Усе воласці павета былі ахоплены паўстаннямі. Партызанскія атрады ў многіх месцах яшчэ да падыходу наступаючых часцей Чырвонай Арміі займалі вёскі. 8 ліпеня баі праходзілі ўжо на заходніх межах раёна. У зводках камандзіра Асобага стралковага дывізіёна М. Ефанешнікава і ваенкама А. Цярлецкага адзначалася, што к канцу дня 8 ліпеня дывізіён знаходзіўся на лініі Шаставічы — Глініца — Скалодзін — Астражанка. Вораг адступаў на Майсеевічы — Снядзін, на Буйнавічы — Злодзін (цяпер тэрыторыя Лельчыцкага і Петрыкаўскага раёнаў)...

Фронт ад Мазырскага раёна адышоў на захад. Жыццё ў Мазыры і павеце стала наладжвацца. Быў створаны Мазырскі павятовы ваенна-рэвалюцыйны камітэт на чале з У. Р. Кажурам, сакратаром стаў Я. Сарокін. 2 ліпеня камандуючы флатыліі П. І. Смірноў назначыў начальнікам гарнізона Мазыра начальніка дэсантнага атрада В. Федарэнку, а камендантам горада стаў камандзір першага кавалерыйскага эскадрона ваенмор Лейбнер. У першым загадзе В. Федарэнкі паведамлялася: «Всем гражданам, учреждениям, торговым предприятиям немедленно приступить к работе, приложить все усилия, чтобы быстрее возобновить мирную жизнь, разрушенную польской шляхтой, тем ужасом, который царил при поляках... Призываю население к спокойствию и порядку, помня, что враг оставил

своих агентов, кои будут играть на умах малосознательных и тем нарушать течение жизни и мешать налаживанию жизненного порядка...» *(Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 307. Воп. 1. Спр. 3. Л. 8.)*

Жыхары Мазыра і павета, спазнаўшы жорсткасць варожай акупацыі, падтрымлівалі Савецкую ўладу. Трэба было як мага хутчэй ліквідаваць цяжкія вынікі чатырохмесячнага гаспадарання польскай шляхты. Усё, што мела хоць якую каштоўнасць, было раскрадзена, вывезена. Склалася катастрафічнае становішча з забеспячэннем насельніцтва прадуктамі. Мазырскі валрэўкам паведамляў у тэлеграме ў Маскву, што павет зусім разрабаваны.

Валасныя рэвалюцыйныя камітэты тэрмінова былі арганізаваны ў Мялешкавічах, Міхалках, Слабадзе, Скрыгалаве і іншых вёсках.

У Мялешкавічах валрэўкам узначаліў К. Качэня, былы камандзір партызанскага атрада, членамі рэўкама абраны А. Жыльскі, М. Жыльскі, Ц. Паўленка, А. Дарашэвіч, 27 ліпеня 1920 г. быў скліканы 1-шы з'езд прадстаўнікоў сельскіх Саветаў Мялешкавіцкай воласці. Абмяркоўваліся пытанні аб дэзерцірах, пастаўцы падвод на дзяжурства валрэўкаму, зберажэнні лясоў ад пажараў, аказанні дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў і пацярпелым ад белапольскіх акупантаў.

Значна пацярпела ад белапольскага нашэсця і Міхалкаўская воласць. Браты Каленікі былі павешаны, ворагі жорстка здзекаваліся з іх трупаў. Селяніну Цыркуну на грудзях цвікамі прыбілі аркуш паперы з надпісам «Камуніст», калі ён быў яшчэ жывы. На агульным сходзе жыхары Міхалак гнеўна асудзілі зверствы белапалякаў і прынялі рэзалюцыю, якая заклікала да помсты ворагу: «Мы, грамадзяне сяла Міхалкі, зведаўшы на сабе цяжкі прыгнёт польскіх улад, далі клятву: усе сілы і сродкі аддаць на барацьбу з нізкім і лютым ворагам пралетарыяту, а ўсім здольным насіць зброю — па першым закліку ўзяць яе ў рукі і як адзін чалавек стаць у рады доблеснай Чырвонай Арміі... Усе, ад малога да вялікага, шлём лютаму ворагу і душагубу — польскаму панству сваё вечнае праклянне і помсту».



Дорах Адам Піліпавіч — жыхар в. Міхалкі, удзельнічаў у грамадзянскай вайне на Паўднёвым і Заходнім франтах, вызначыўся ў барацьбе з польскімі інтэрвентамі

Гарэлька Павел Паўлавіч — жыхар в. Міхалкі, удзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях у Маскве і ў грамадзянскай вайне на Заходнім фронце, арганізатар Савецкай улады ў Міхалкаўскай воласці

Міхалкаўскім валрэўкамам, які ўзначаліў М. Калеснік, была праведзена вялікая работа па ўстанаўленні грамадскага парадку ў воласці. Былі прызначаны вартаўнікі для аховы лясоў ад пажараў, пасеваў і сенажацяў, на ўлік узята рухомая і нерухомая маёмасць саўгасаў, якая аддавалася пад адказнасць батрацкіх камітэтаў, а таксама паравыя, вадзяныя і конныя млыны. З'езды прадстаўнікоў сельскіх Саветаў воласці вырашалі пытанні аб раздзеле зямлі паміж сялянамі і саўгасамі. Міхалкаўскі валасны рэўкам прымаў актыўны ўдзел у правядзенні нядзелі хворага і параненага чырвонаармейца.

Вялікую работу па аднаўленні і ўмацаванні Савецкай улады ў вёсках вёў і Скрыгалаўскі валрэўкам, створаны 8 ліпеня. У склад яго ўвайшлі М. Казнан, А. Белы, Н. Курмаз. У 14 населеных пунктах воласці былі арганізаваны сельскія Саветы, адкрыты валасная бібліятэка і культурна-асветніцкі гурток. Санітарныя камісіі змагаліся

з эпідэміямі. З вялікімі цяжкасцямі былі адноўлены і адрамантаваны масты і дарогі, наладжана сувязь з павятовым цэнтрам. З жніўня 1920 г. была склікана валасная канферэнцыя па правядзенні нядзелі хворага і параненага чырвонаармейца.

Слабадскі валрэўкам, які пачаў работу 1 ліпеня 1920 г., узначалілі М. Лук'яновіч, Казлоў і Чарняк, актыўныя ўдзельнікі барацьбы за Савецкую ўладу.

У Мазыры было адкрыта паштова-тэлеграфнае аддзяленне, у некаторых валасцях арганізавана конная сувязь. У. Ф. Кажура паведамляў старшыні Мінскага губваенрэўкама А. Р. Чарвякову, што ў Мазыр прыязджаюць людзі з мандатам Гомельскага губваенрэўкама, аддаюць свае распараджэнні. Пытанне, узнятае старшынёй Мазырскага рэўкама, было прынцыповым, размова ішла аб спробе ўключыць Мазыр у Гомельскую губерню, якая ўваходзіла тады ў склад РСФСР.

Пачаўся падзел памешчыцкай зямлі сярод беднаты. У саўгасах павета пасля выгнання польскіх інтэрвентаў амаль не засталося коней, буйной рагатай жывёлы. Быў узяты на ўлік і пад ахову саўгасны інвентар, пачаўся яго рамонт. У сувязі з вялікай небяспекай эпідэміі былі створаны дэзінфекцыйныя атрады, пачалася санітарная чыстка горада, закупляліся медыкаменты. Наладжвалася грамадскае харчаванне. У дакладзе аб дзейнасці валрэўкама 20 ліпеня адзначалася, што, нягледзячы на ўсе цяжкасці, настрой у горадзе і павеце добры, насельніцтва радуецца вызваленню ад белапалякаў, наступленню мірнага жыцця...

І. Краўцоў, Я. Фарбераў

Жыхар Мазыра Пратасавіцкі Мікалай Міхайлавіч сярод байцоў-чапаеўцаў (у першым радзе ў цэнтры)

Слабада партызанская

Жыхары вёскі Слабада Скрыгалаўская ў гады грамадзянскай вайны актыўна змагаліся ў тыле супраць нямецкіх і белапольскіх захопнікаў, пятлюраўцаў і балахоўцаў.

Ганчар Іван Дзмітрыевіч нарадзіўся ў 1889 г. у сям'і беднага селяніна. У дзяцінстве працаваў у маёнтку пана Снядзецкага, дзе спазнаў сацыяльную несправядлівасць. У 1908 г. быў мабілізаваны ў царскую армію, прымаў удзел у рэвалюцыйнай барацьбе.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі вярнуўся з арміі дадому і стаў адным з арганізатараў Савецкай улады ў роднай вёсцы. Праводзіў падзел панскай зямлі, арганізаваў камітэт беднаты.

Вясной 1918 г. Палессе акупіравалі нямецкія войскі. Іван Дзмітрыевіч звязаўся з мазырскім падполлем, пачаў выконваць яго заданні. Па даручэнні падпольнага цэнтра ён перайшоў лінію фронту, дабраўся да штаба Заходняга фронту, які знаходзіўся каля Рагачова, і прынёс туды звесткі аб становішчы ў глыбокім тыле. У штабе фронту Ганчару выдалі мандат на права арганіза-

І. Д. Ганчар

Ц. Б. Гнедзька

А. С. Мароз

П. С. Рухло

цыі партызанскага атрада, грошы і зброю, а таксама неабходныя інструкцыі. Партызанскі атрад сваімі дзеяннямі паскорыў вызваленне воласці ад ворага. У перыяд белапольскай акупацыі вясной 1920 г. І. Д. Ганчар зноў арганізаваў баявы атрад з мясцовага насельніцтва.

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны Іван Дзмітрыевіч працаваў старшынёй сельсавета ў Скрыгалаве і Слабадзе, быў арганізатарам калгаса ў роднай вёсцы. Памёр у 1938 г.

Гнедзька Цімох Барысавіч нарадзіўся ў 1897 г. у беднай сялянскай сям'і. З малых год зведаў цяжар сялянскай працы. З 1914 г. працаваў на чыгунцы, затым ваяваў на франтах першай сусветнай вайны. Атруціўся газам, які немцы скарыстоўвалі пры вядзенні вайны, доўгі час лячыўся, вярнуўся ў родную вёску. У 1918 г. зноў на вайне з немцамі, цяпер ужо ў якасці байца Слабадскога партызанскага атрада. Выгналі немцаў, а праз год і новых захопнікаў — белапалякаў. Служба ў Чырвонай Арміі і выкананне адказных разведвальных заданняў за мяжой — у Польшчы. З 1924 па 1937 г. працаваў старшынёй Слабадскога сельсавета, старшынёй калгасаў у Хойніцкім і Калінкавіцкім раёнах.

У 1937 г. па беспадстаўным абвінавачанні ў шпіянажы на карысць буржуазнай Польшчы быў асуджаны на 10 год. Прасіўся з лагера на фронт, але не дазволілі. Вярнуўся з месцаў заключэння толькі пасля вайны. Між іншым, малодшы брат «ворага народа» Іван Барысавіч змагаўся ўсю Айчынную вайну палітруком роты, камандзірам атрада і партызанскай брыгады ў Мінскай вобласці, і яму дарэчы прыдаліся ўспаміны старэйшага брата пра дзейнасць партызан у грамадзянскую вайну.

У 1967 г. Цімох Барысавіч за актыўны ўдзел у грамадзянскай вайне быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Памёр у 1970 годзе.

Мароз Аляксей Сцяпанавіч нарадзіўся ў 1894 г. Усю першую сусветную вайну прайшоў на фронце разведчыкам. Вопыт франтавой разведкі спатрэбіўся А. С. Марозу ў гады грамадзянскай вайны ў Слабадскім партызанскім атрадзе І. Д. Ганчара, дзе ён быў камандзірам атрада разведчыкаў. Пасля выгнання белапалякаў служыў у Чырвонай Арміі, некалькі гадоў — на савецка-польскай мяжы, неаднаразова выконваў спецыяльныя заданні на тэрыторыі Польшчы. Працаваў таксама старшынёй калгаса ў Майсееўцы і старшынёй выканкама Прудкоўскага сельсавета.

У 1938 г. А. С. Мароз быў беспадстаўна рэпрэсіраваны. Асноўнае абвінавачанне: калі ў 20-я гады служыў на мяжы, быў «завярбованы» польскай разведкай. Рэабілітаваны пасля 1953 г. У 1967 г. узнагароджаны медалём «За адвагу». Памёр у 1981 г.

Рухло Павел Сцяпанавіч нарадзіўся ў 1900 г. у сям'і беднага селяніна. У 1918 г. стаў членам Слабадскога партызанскага атрада, мужна ваяваў супраць нямецкіх захопнікаў. Пасля заключэння Брэсцкага міру ваяваў у Чырвонай Арміі да канца грамадзянскай вайны, затым служыў на мяжы.

Вярнуўшыся з вайсковай службы, Павел Сцяпанавіч стаў актывістам і арганізатарам новага жыцця ў вёсцы. Доўгія гады быў членам сельскага Савета і членам праўлення калгаса. У 1941—1945 гг. ваяваў на фронце і партызанскім атрадзе. Пасля вайны працаваў у калгасе. Памёр у 1954 г.

Чатыры біяграфіі партызанаў Слабадскога атрада, а ўсіх больш за 50 жыхароў Слабады змагаліся тады ў тыле ворага. Невыпадкова, і праз дваццаць гадоў, у Вялікую Айчынную, з гэтай вёскі больш як 150 чалавек ваявалі ў партызанскіх атрадах і звыш 300 — на фронце. Гераічныя традыцыі мінулага захаваліся і памножыліся.

М. Капач, М. Каян

З ДАНЯСЕННЯ КАМАНДЗІРА 72-й БРЫГАДЫ 24-й СІБІРСКАЙ ЖАЛЕЗНАЙ ДЫВІЗІІ

№ 100/По г. Мозырь *29 чэрвеня 1920 г.*

Доношу, что после продолжительной перестрелки у дер. Раевской и при энергичной поддержке Днепровской флотилии, которая своим выходом к г. Мозырю наводила панику и беспорядки у противника, 29 июня... 215-м полком был взят г. Мозырь... По оставлении города противник зажег деревянный мост через р. Припять и взорвал железнодорожный мост, от которого уцелела одна ферма. В г. Мозыре оставлено противником: 300 артснарядов, 30 тыс. немецких патронов, одна кухня, 2 повозки, 5 винтовок и взято в плен 2 солдата. На видном месте противник оставил двух повешенных жителей...

Комбриг 72-й 24-й Железной *Устинов*
Заввоенкома *Лебединский*

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. Сборник документов. Мн., 1971. Т. 2. С. 335—336.

З ПРАТАКОЛА МЯЛЕШКАВІЦКАГА ВАЛРЭЎКАМА АБ ЗВЕРСТВАХ БЕЛАПАЛЯКАЎ У ВЁСЦЫ МЯЛЕШКАВІЧЫ МАЗЫРСКАГА ПАВЕТА

6 ліпеня 1920 г.

...В ночь с 26 на 27 июня с. г. в село Мелешковичи прибыл из Ельска 22-й пехотный польский полк. Остановившись, все солдаты приступили к повальному грабежу всего находящегося в квартирах обывателей имущества. Грабилось все: одежда, обувь и продукты. Входя в дом, бандиты-шляхтичи приставляли к груди обывателей винтовки и другого рода оружие, требуя деньги, причем избивали до потери сознания. Беспощадно насиловали женщин.

Грабеж и насилие продолжались с 11 часов вечера 26 июня до 10 часов вечера 27 июня с. г. Заграбив все имущество, сложив на подводы и отправив все за село, одна рота солдат осталась в селе и подожгла его в шести местах и начала обстреливать, дабы жители не могли спасти подожженных построек.

При этом одну семью бывшего советского служащего, секретаря Мелешковичского исполкома заперли в дом, наложив туда соломы, и подожгли снаружи здание и внутри, поставив у окон караул. Но благодаря тому, что в задней комнате здания окно выходило в глухой переулок, жертвам удалось незаметно бежать через таковой.

Было арестовано 16 человек, из коих один человек, отец сельского старосты Игнатий Жильский, 60 лет, расстрелян за то, что в селении не оказалось больше подвод увести награбленное имущество, и 5 молодых людей, которые подозревались якобы партизанами. Все арестованные были подвергнуты телесному наказанию шомполами и резинами до 50 ударов, после истязания были приговорены к расстрелу и приставлены к стенке, но

расстрелян только упомянутый старик, а остальным было приказано разбежаться и по бежавшим было выпущено несколько залпов, и после чего оказался раненым один, а остальные спаслись благодаря огородам, находящимся вблизи.

Пожаром уничтожено 136 домов со всеми холодными постройками, скотскими и хлебными сараями. Человеческих жертв от огня — 3, которые болели тифом и не могли спастись.

Того же числа 41-м пехотным польским полком, проходившим через село Ремезы Мелешковичской волости, было зажжено в трех местах упомянутое село, где сгорело 36 домов со всеми холодными постройками... Грабилось не только то, что находилось в домах, но раздевали обывателей, оставляя босыми и нагими.

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 307. Воп. 1. Спр. 2. Л. 50—51.

Зверствы польскіх акупантаў. 1920

Палескі Жалязняк

Нарадзіўся А. А. Брэгман у 1895 г. у сям'і мазырскага рамесніка. Тут вучыўся, стаў на рэвалюцыйны шлях. А ў дваццаць два гады ён ужо член Бабруйскага камітэта РСДРП(б), член Бабруйскага Савета, камісар па харчаванні.

У час акупацыі Беларусі нямецкімі захопнікамі ў 1918 г. Аляксандр Абрамавіч знаходзіўся на падпольнай рабоце ў Барысаве і Магілёве. Пасля вызвалення Беларусі восенню 1918 г.— сакратар Магілёўскага павятовага камітэта РСДРП(б), член губернскага рэвалюцыйнага камітэта. Калі частку Беларусі захапілі польскія легіянеры, на Мазыршчыне надоўга спынілася лінія фронту. Для адпору ворагу была створана група войск, вядомая як Мазырская.

У лютым 1919 г. камісарам адной з брыгад групы быў прызначаны А. А. Брэгман. Чырвоная Армія вяла цяжкія баі з акупантамі. Камісар А. А. Брэгман пад псеўданімам Жалязняк вёў вялікую агітацыйную работу сярод чырвонаармейцаў і насельніцтва прыфрантавых вёсак у тыле ворага.

У адным з баёў летам 1919 г. камісар быў паранены і з групай чырвонаармейцаў захоплены ў палон.

Асабліва жорстка здзекаваліся палякі з А. А. Брэгмана. Білі шомпаламі, калі страчваў прытомнасць, аблівалі вадой. Потым па шыю закапалі ў зямлю, білі па галаве, пасыпалі раны соллю, пасля адсеклі галаву... Месца пахавання яго невядома.

М. Капач

Яшчэ адна напасць — балахоўцы

Жыхароў Палесся і Мазыра чакала яшчэ адна напасць у тым жа дваццатым годзе. З Польшчы пачалося наступленне войск генерала Станіслава Булак-Балаховіча. У яго фарміраванне ўваходзілі тры пяхотныя і кавалерыйская дывізіі, атрады Барыса Савінкава і рускіх манархістаў. У іх было 36 гармат і 150 кулямётаў.

Захапіўшы 7 лістапада 1920 г. Петрыкаў, армія балахоўцаў рухалася дзвюма групамі на Калінкавічы і Мазыр. 10 лістапада паўднёвая група заняла Скрыгалаў, вёскі Раманаўка, Мялешкавічы, Слабада і ўварвалася ў Мазыр. У той жа дзень паўночная група захапіла Калінкавічы. Іх не маглі стрымаць малалікія сілы Чырвонай Арміі і мясцовых актывістаў. Забойствамі, разбоем і жорсткімі расправамі над мірнымі жыхарамі пазначаны шлях на Палессі бандытаў-балахоўцаў, крывавым было 10-дзённае гаспадаранне ў Мазыры «борцов за свободу».

Для таго каб ліквідаваць фарміраванне Булак-Балаховіча, камандаванне Чырвонай Арміі выдзеліла спецыяльную групоўку (4-ю, 10-ю, 17-ю, 48-ю стралковыя дывізіі), якая сканцэнтраванымі ўдарамі разграміла асноўныя сілы балахоўцаў на подступах да Мазыра з усходу. Сам Булак-Балаховіч з часткай войск стараўся ўтрымацца ў Мазыры. Яго аднадумцы, Савінкаў і брат генерала Юзэф Балаховіч, уцяклі з Мазыра, але на захадзе ад горада трапілі ў акружэнне. Разгарнуліся жорсткія баі, якія цягнуліся на працягу чатырох сутак.

18 лістапада 1920 г. 60 байцоў і разведчыкаў 145-га, 146-га і 147-га палкоў 49-й брыгады 17-й стралковай дывізіі пераправіліся на лодках цераз Прыпяць. У вёсцы Касцюковічы байцоў сустрэлі 7 перабежчыкаў-балахоўцаў. Яны далі каштоўныя звесткі аб праціўніку. Камандаванне даведалася, што ў Мазыры ўжо быў нацыянальны ўрад — Беларускі палітычны камітэт у складзе П. Алексіюка, В. Адамовіча, І. Міткевіча і іншых.

Раніцай 19 лістапада ўся 49-я брыгада пераправілася цераз Прыпяць, заняла Майсееўку і накіравалася да вёскі Прудок. Групоўка Б. Савінкава і Ю. Балаховіча, якая выступіла з Мазыра, аказалася адрэзанай. Яны адчайна рваліся на Петрыкаў — Тураў па дарозе праз Слабаду — Скрыгалаў — Балажэвічы. Вёскі некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі. Часці 49-й дывізіі мелі страты забітымі і параненымі.

Увесь дзень з ранку да вечара балахоўцы атакавалі Загорыны, Хамічкі, Майсееўку, Слабаду, Белую. Нарэшце балахоўцам цаной шматлікіх страт удалося ненадоўга захапіць Белую, Скрыгалаў і праз іх па бальшаку на Петрыкаў часткай войск з абозамі вырвацца з акружэння. З імі ўцёк і авантурыст Савінкаў. Ю. Балаховіч з групоўкай ноч на 20 лістапада правёў у Прудку і, упэўніўшыся, што шлях для адступлення яго групе па бальшаку на Скрыгалаў — Петрыкаў адрэзаны канчаткова, павярнуў на паўднёвы захад па дарозе на Малыя Зімовішчы — Мялешкавічы — Махнавічы — Буйнавічы — Злодзін — Тураў. Ноччу 21 лістапада ля вёскі Махнавічы адбыўся бой 146-га палка з балахоўцамі. Перарэзаць дарогу да адступлення ворагу батальёны 146-га палка не паспелі. Гэта скарыстаў Ю. Балаховіч. Цяжка паранены, ён здолеў з узводам асабістай аховы ўцячы ў напрамку Буйнавіч, звозячы з сабой найбольш каштоўнае дабро, нарабаванае ў Мазыры. Аднак 300 легіянераў былі ўзяты тут у палон.

Сам Булак-Балаховіч за братам і Савінкавым не пайшоў, з асноўнай часткай войска застаўся ў Мазыры, хацеў ператварыць горад у крэпасць. З Савінкавым у генерала былі розныя погляды на далейшае палітычнае ўпарадкаванне дзяржаўнай улады ў Расіі. Пад ударамі Чырвонай Арміі планы гэтых «вождей» як у Расіі, так і ў Беларусі праваліліся. Да Мазыра тым часам на ліквідацыю галоўнай групоўкі бала-

хоўцаў тэрмінова былі накіраваны 51-я брыгада 17-й стралковай дывізіі і іншыя часці.

Разгарнуліся баі за Мазыр. Чырвонаармейцы і чырвоныя камандзіры праяўлялі гераізм і мужнасць. Так, камандзір 6-й роты 151-га палка, ураджэнец Рагачоўшчыны М. В. Петракоў, прабраўшыся ў Мазыр, два дні з дапамогай падпольшчыкаў вёў разведку сіл балахоўцаў. А калі 151-шы полк пачаў бой за Мазыр, далучыўся да сваіх. За гэты подзвіг адважны камандзір быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Жорсткі бой разгарэўся 21 лістапада паміж 151-м стралковым палком і кавалерыйскім палком балахоўцаў за авалоданне Міхалкамі. Умелыя дзеянні чырвонаармейцаў не толькі забяспечылі вызваленне вёскі, але і прымусілі генерала пакінуць Мазыр.

Пацярпеўшы паражэнне пад Міхалкамі і пад пагрозай поўнага акружэння балахоўцы кінуліся з горада на паўночны ўсход, пераправіліся цераз Прыпяць, нечаканым ударам збілі невялікія атрады Чырвонай Арміі і, пакідаючы на шляху адступлення смерць і разруху, пайшлі на захад. У раёне Турава і Давыд-Гарадка польскія ўлады вымушаны былі раззброіць «армію» авантурыста.

Такім чынам за 16 сутак баёў войскі Булак-Балаховіча былі разгромлены. У палон было захоплена 4540 салдат, 120 афіцэраў, 4 гарматы, 40 кулямётаў, 7 аўтаматаў, 1286 вінтовак, сцяг, аўтамабіль і матацыкл.

Дзесяткі байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, каштоўнымі падарункамі. Ардэнаносцамі сталі камандзір 49-й брыгады Касабуцкі Іван Сцяпанавіч, памочнік камандзіра 146-га палка Нарушэвіч Аляксандр Пятровіч, камандзір брыгады Віталь Дзмітрыевіч Каўшоў. Такой жа ўзнагароды быў удастоены вядомы латышскі бальшавік Аскар Юр'евіч Калнін, камандзір брыгады 48-й дывізіі, які загінуў ля вёскі Крышычы Калінкавіцкага раёна. У баях з балахоўцамі вызначыліся мазырскія камсамольцы В. Харужая, Г. Саф'ян, А. Ціханаў.

У данясенні Мазырскага рэўкама ад 4 снежня 1920 г. паведамлялася: «В связи с последним нашествием банд Балаховича город Мозырь был жестоко разграблен и разгромлен. Все имущество городского населения разграблено или уничтожено. Теперь город переживает как продовольственный, так и хозяйственно-экономический кризис». Мазырская павятовая камісія выявіла страты, якія былі нанесены белапалякамі і балахоўцамі. Было ўстаноўлена, што па Мазырскім павеце яны склалі 19 721 448 руб. 56 кап. (у залатой даваеннай валюце).

Савецкая дзяржава не пакінула народ у бядзе. Урад БССР выдзеліў фінансавыя сродкі для будаўніцтва жылля, аднаўлення бытавога абслугоўвання, пешаходнага і чыгуначнага мастоў цераз Прыпяць, арганізацыі дастаўкі прадуктаў. Мазыркі рэўкам пасля прад'яўлення справаздачы аб памерах прычыненых ворагамі матэрыяльных страт атрымаў 8 мільёнаў рублёў.

Мазыране і жыхары павета пачалі нарэшце аднаўляць мірнае жыццё, будаваць сваё будучае.

І. Краўцоў

Цяжкія выпрабаванні

На прыкладзе адной толькі вёскі Махнавічы пераконваешся, колькі няшчасцяў і бедаў давялося перажыць вясковаму насельніцтву Мазыршчыны ў суровы паслярэвалюцыйны час. Небывалыя выпрабаванні ў гады грамадзянскай вайны выпалі на долю жыхароў гэтай вёскі.

У самым пачатку акупацыі Палесся германскімі войскамі жыхары Махнавіч і суседніх вёсак арганізавалі партызанскі атрад. Увесь 1919 г. і палову наступнага 1920 г. ішла вайна з пятлюраўцамі і белапольскімі захопнікамі. Махнавічы і другія вёскі на

Тураўскім бальшаку не раз станавіліся арэнаю баявых дзеянняў, пераходзілі з рук у рукі. Зноў, як і ў час барацьбы з кайзераўцамі, патрыёты Махнавіч і навакольных вёсак у складзе некалькіх партызанскіх атрадаў і груп ваявалі з захопнікамі. Групай партызан з Махнавіч камандаваў Машчыц Іларыён Нікіфаравіч. Архівы зберагліі звесткі пра сумесныя баі Чырвонай Арміі і партызан у гэтых месцах. Так, 16 і 17 верасня 1919 г. у жорсткім баі белапалякамі былі захоплены Буйнавічы, Махнавічы і Мялешкавічы, але праз дваты дні яны былі выгнаны з гэтых вёсак. 18 студзеня 1920 г. Махнавічы зноў былі захоплены ворагам. На гэты раз захопнікі пратрымаліся тут да 27 студзеня. Цяжкія баі пад Мазыром не сціхалі. Палякі імкнуліся захапіць горад — важны стратэгічны пункт. На мазырскім напрамку значна павялічылася колькасць войск і баявой тэхнікі праціўніка. Часці Чырвонай Арміі былі абяссілены бесперапыннымі баямі і сыпным тыфам, які лютаваў сярод насельніцтва і вайскоўцаў. 421-шы полк Чырвонай Арміі, штаб якога ў сярэдзіне лютага 1920 г. размяшчаўся ў Махнавічах, у баях 20 і 23 лютага панёс страты. 5 радавых было забіта, 4 — прапалі без вестак, некалькі дзесяткаў паранена.

Ранняя вясна і бездарожжа затрымлівалі папаўненне і абозы Чырвонай Арміі. Баі на подступах да Мазыра разгараліся ўсё больш. 5 сакавіка горад быў захоплены легіянерамі. Мазыршчына на некалькі месяцаў аказалася ў белапольскай акупацыі.

Не скарыліся захопнікам жыхары Палесся. Разгарэлася полымя партызанскай барацьбы, у якой удзельнічала больш за 50 жыхароў Махнавіч, Забалацця і іншых бліжэйшых вёсак. Канопліч Пётр Платонавіч, Канопліч Канстанцін Сцяпанавіч, Канопліч Захар, Фралоў Сцяпан загінулі ў баях з белапалякамі.

Вораг помсціў мясцоваму насельніцтву за падтрымку падпольнага і партызанскага руху. 26 чэрвеня была цалкам спалена суседняя вёска Мялешкавічы. Забітыя акупантамі былі амаль у кожнай вёсцы. А Чырвоная Армія ішла на дапамогу. 29 чэрвеня з баямі быў вызвалены Мазыр, праз некалькі дзён — Мялешкавічы і Махнавічы. Да 8 ліпеня ўся тэрыторыя раёна была вызвалена ад акупантаў.

Мірнае жыццё ў павеце і кожнай вёсцы стала наладжвацца. Аднавілі работу валасны рэвалюцыйны камітэт у Мялешкавіцкай воласці, куды адносіліся і Махнавічы. На месцах сталі працаваць сельскія Саветы. Махнавіцкі ўзначаліў Канопліч Іван Андрэевіч. Была адноўлена работа пачатковай школы, настаўнікам якой быў Дарашэвіч. Пачаўся падзел памешчыцкай зямлі.

А хутка новая бяда над Мазыршчынай — балахоўцы, якія выступілі з Польшчы. Тры пяхотныя і кавалерыйскую дывізіі, некалькі атрадаў манархістаў пры 36 гарматах і 150 кулямётах не змаглі затрымаць малалікія сілы Чырвонай Арміі. 9 лістапада былі захоплены Махнавічы, 10-га — Мялешкавічы, Скрыгалаў, Мазыр. Пачалося рабаўніцтва, расправы і здзекі з мірных жыхароў.

Камандаванне Чырвонай Арміі сканцэнтравала супраць балахоўцаў групоўку войск, якія 20 лістапада пасля жорсткіх чатырохсутачных баёў вызвалілі Мазыр. Ноччу 21 лістапада ля Махнавіч адбыўся бой 146-га палка Чырвонай Арміі з адступаючымі балахоўцамі. 300 легіянераў тут былі ўзяты ў палон.

В. Бабкова, М. Капач

Легендарны камбрыг

У вёсцы Праўцюкі на адным з будынкаў установлена мемарыяльная дошка. «Тут 11 лістапада 1920 г. загінуў камандзір брыгады Чырвонай Арміі Каўшоў Віталій Дзмітрыевіч». Са здымка 1919 г. глядзіць малады чалавек з энергічнымі рысамі твару. В. Д. Каўшову — 24. А праз год ён загінуў.

В. Д. Каўшоў

Віталій Каўшоў з юнацкіх гадоў звязаў свой лёс з рэвалюцыйным рухам. Адразу ж пасля Лютаўскай рэвалюцыі ўступіў у бальшавіцкую партыю. У Златаусце В. Д. Каўшоў, выбраны старшынёй рэвалюцыйнага камітэта, праводзіў вялікую арганізатарскую работу па станаўленні Савецкай улады на Урале. Калі чэхі ўзнялі мяцеж, Віталій Каўшоў сфарміраваў конную дружыну, якая ўступіла ў няроўны бой з іх корпусам. Кавалерысты два месяцы дзейнічалі па тылах праціўніка, затым злучыліся з Чырвонай Арміяй.

Таленавітыя, адданыя Радзіме камандзіры патрэбны былі Чырвонай Арміі, і камандаванне пасылае Віталія Каўшова ў толькі што адкрытую вышэйшую ваенную навучальную ўстанову — Акадэмію Генеральнага штаба.

З курсантаў маскоўскіх ваенных навучальных устаноў восенню 1919 г. тэрмінова была сфарміравана 3-я Маскоўская стралковая брыгада, яе накіроўвалі на абарону Петраграда ад войск Юдзеніча, і камісарам брыгады быў прызначаны В. Д. Каўшоў. За доблесць і мужнасць Віталій Дзмітрыевіч быў узнагароджаны імянной зброяй.

Вясной 1920 г. на Савецкую краіну рушылі польскія войскі. Віталій Дзмітрыевіч зноў на фронце — памочнік начальніка аператыўнага аддзела штаба 8-й стралковай дывізіі 16-й арміі, затым начальнік штаба 2-й кавалерыйскай брыгады 13-й дывізіі. Неўзабаве ён прызначаецца камандзірам 28-й брыгады. Нялёгкія баі давялося весці брыгадзе Каўшова.

У кастрычніку 1920 г. быў падпісаны дагавор аб перамір'і, папярэдніх умовах міру з Польшчай і ўстаноўлена дзяржаўная граніца. Але ў лістападзе ў Беларусь уварваліся шматлікія, добра ўзброеныя войскі Булак-Балаховіча. Яны захапілі многія раёны Палесся, у тым ліку і Мазыр. На падмогу мясцовай міліцыі і атрадам, якія былі сфарміраваны з камуністаў і камсамольцаў, прыйшлі рэгулярныя часці Чырвонай Арміі. З маршу прыняла баявы парадак і 28-я брыгада. Завязаліся жорсткія баі.

Стомленыя коннікі брыгады Каўшова 11 лістапада размясціліся на адпачынак у Праўцюках. Мясцовым кулакам-хутаранам удалося ноччу правесці ў вёску атрад балахоўцаў. Дом, дзе знаходзіўся Каўшоў і іншыя камандзіры, быў акружаны. Каўшоў адстрэльваўся, пакуль варожая куля не абарвала яго неспакойнае, гераічнае жыццё.

В. Д. Каўшоў быў пахаваны на могілках у Праўцюках. Потым яго прах перавезлі ў Маскву і перазахавалі там на Краснай плошчы.

5 лютага 1921 г. загадам Рэўваенсавета В. Д. Каўшоў быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

М. Капач

«АРМИЯ» БУЛАК-БАЛАХОВИЧА В МОЗЫРЕ

...Отряд, растянувшись на добрые две версты, приближался к Мозырю. Вернулись высланные вперед разведчики, они доложили, что в городе, кроме десятка комсомольцев-чоновцев, нет никого. А город богатый. Эта новость, сопровождаемая ликующими криками, как вихрь пронеслась по колонне.

Бой за Мозырь начался в сумерках, и не понять было — действительно ли шел бой на самом деле, или просто так, на скаку стреляя во все стороны, передовой эскадрон ворвался

в город, и тотчас взметнулись над городом несколько пожаров. Когда Савинков и старший Балахович въехали на центральную площадь города, младший Балахович уже творил там суд и расправу — на балконе здания почты уже были повешены двое, а третьего вешали на фонаре. Иосиф Балахович подскакал к брату на разгоряченном коне:

— Стась! Красных гадов вешаем! Хошь сам побаловаться?

— Успеется,— отмахнулся старший и спросил, где его квартира.

Иосиф показал плетью на здание почты, где качались повешенные, и крикнул:

— Вон там, с украшением!

Балахович и Савинков расположились на втором этаже. Здесь, очевидно, жил заведующий почтой — это была большая, давно и хорошо обжитая квартира. Куда только подевались ее обитатели?

Савинков занял маленькую комнатку рядом с кухней, заперся и, не раздеваясь, повалился в постель. Потом он много раз просыпался от пьяного ора, всю ночь играла гармошка, визжали женщины, раздавались выстрелы — братья Балаховичи справляли победу.

...Однако выехать в этот день Савинков не мог. Вскоре после полудня балаховцы вынуждены были вступить в бой с частью Красной Армии, прибывшей в Мозырь из Гомеля. Бой завязался на восточной окраине города, и до вечера нельзя было понять, выдержат ли балаховцы натиск красных. Уезжать в этой обстановке Савинков считал неприличным. Поздно вечером стало известно, что к Мозырю движется еще одна красноармейская часть, и тогда Балахович принял решение временно выйти из города...

З кнігі: Василий Ардаматский. «Возмездие».

ЗАГАД № 1 МАЗЫРСКАГА ПАВЯТОВАГА ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТА

21 лістапада 1920 г.

О возобновлении деятельности комитета после разгрома банд Булак-Балаховича

1. Сего числа военно-революционный комитет в старом составе вернулся в г. Мозырь и приступил к исполнению своих обязанностей.
2. Доводится до сведения граждан г. Мозыря и уезда, что банда Булак-Балаховича разбита. Рассеянные по уезду незначительные отряды бандитов не представляют никакой опасности, и приняты меры по их поимке.

   Граждане г. Мозыря и уезда призываются к полнейшему спокойствию, не придавать значения провокационным слухам, распространяемым провокаторами и агентами бандитов, при обнаружении таковых задерживать и препровождать в военревком, который с ними поступит по закону военно-революционного времени.
3. Всем жителям, коим известно местопребывание солдат балаховской банды, немедленно сообщать в увоенревком. Укрыватели остатков банд понесут самое строгое наказание вплоть до расстрела...

Предвоенревкома *В. Кожуро*
Члены военревкома *Барсуков, Краснов, Бежик*

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 307. Воп. 1. Л. 263.

ДАНЯСЕННЕ МАЗЫРСКАГА ПАВЯТОВАГА ВАЕНРЭЎКАМА Ў РЭЎАРМ 16 І РЭЎКАМБЕЛ АБ ВЫЗВАЛЕННІ МАЗЫРСКАГА ПАВЕТА АД БАНД БУЛАК-БАЛАХОВІЧА І ЎСТАНАЎЛЕННІ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў МАЗЫРЫ І ПАВЕЦЕ

26 лістапада 1920 г.

Доношу, что Мозырский уезд почти весь очищен от балаховской банды, а ее отдельные части, рассеявшиеся по уезду незначительными кучками, энергично вылавливаются.

В освобожденных волостях уезда, а именно: Михалковской, Мелешковичской, Слободской, Скрыгаловской — уже организованы волвоенревкомы, но для назначения на ответственные должности в уезде ощущается недостаток в опытных политических работниках, об откомандировании коих убедительно прошу.

Для расследования и выяснения жертв балаховских банд по гор. Мозырю и уезду образована особая комиссия из пяти человек, которая уже приступила к своим обязанностям.

Отделы ревкома постепенно возвращаются в Мозырь, вместе с своими сотрудниками приступают к организационной работе.

Связь с волвоенревкомами уезда налаживается.

В заключение, прошу необходимую материальную поддержку.

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 307. Воп. 1. Спр. 5. Л. 8.

ДАНЯСЕННЕ МАЗЫРСКАГА ПАВЯТОВАГА ВАЕНРЭЎКАМА Ў РЭЎКАМ БЕЛАРУСІ АБ РАЗГРОМЕ МАЗЫРА БАНДАМІ БУЛАК-БАЛАХОВІЧА І АБ НЕАБХОДНАСЦІ АКАЗАННЯ ДАПАМОГІ НАСЕЛЬНІЦТВУ МАЗЫРА І ПАВЕТА

4 снежня 1920 г.

В связи с нашествием банд Балаховича город Мозырь подвергся небывалому разгрому. Все имущество городского населения разгромлено и разбито... Город переживает как в продовольственном, так и в хозяйственно-экономическом отношении небывалый кризис.

Излишне упоминать, что местные органы не располагают никакими ресурсами, а потому необходима немедленная помощь центра. Крестьянское население уезда за весь период не получило никаких фабрикатов, в то время как, находясь в фронтовой полосе, переносило все тяжести гражданской войны. В настоящее время опродкомдив 17 выполняет разверстку по уезду. В связи с этим Мозырский увоенревком просит Ревком Белоруссии об энергичном воздействии на соответствующие органы, как-то: компродбел, губсоюз, совнархоз об отпуске в самом срочном порядке для Мозырского уезда всевозможных фабрикатов и предметов широкого потребления. В случае неимения потребного количества фабрикатов в Минске увоенревком просит выдать члену коллегии Мозырского райпродкома тов. Розенману мандат на право получения этих предметов непосредственно из Москвы в счет компродбела.

Предувоенревкома
Секретарь

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 307. Воп. 1. Спр. 5. Л. 22.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ АБ РАБОЦЕ КАМІСАРЫЯТА САЦЫЯЛЬНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ РЭЎКАМА БССР ПА АКАЗАННІ ДАПАМОГІ НАСЕЛЬНІЦТВУ, ШТО ПЕРАЖЫЛО АКУПАЦЫЮ

12 снежня 1920 г.

Работа по оказанию помощи крестьянству и жертвам контрреволюции идет быстрыми темпами. Полученные ранее из Смоленска и Рославля 3 вагона мануфактуры распределяются среди бедноты и красноармейцев.

Между уездами мануфактура распределена следующим образом:

Мозырский уезд — 20 000 аршин.

«Советская Белоруссия», 12 снежня 1920 г.

Ваяваў і працаваў на Прыпяці

Каралёў Пётр Яўхімавіч — патомны прыпяцкі рачнік, жыхар пасёлка Пхоў (цяпер мікрараён Мазыра), актыўны ўдзельнік першай сусветнай і грамадзянскай войнаў.

Нарадзіўся ў 1890 г. у Маскоўскай губерні. У час рэвалюцыйных падзей 1905 г. удзельнічаў у забастоўках маскоўскіх рабочых, выконваў заданні старэйшых. У 1912 г. быў прызваны на флот і пасля пачатковай падрыхтоўкі ў балтыйскім флоцкім экіпажы служыў камендорам на Амурскай ваеннай флатыліі. У 1916 г. яго за бунтарскі характар адлічылі з флатыліі і накіравалі на Заходні фронт.

Ваяваў кулямётчыкам і разведчыкам каля Маладзечна. Там жа сустрэў Лютаўскую рэвалюцыю, быў абраны франтавікамі членам палкавога камітэта. У 1917 г. як былы марак і рачнік быў накіраваны служыць на бранякатэры Прыпяцкага атрада рачных суднаў За-

ходняга фронту, галоўнай базай якога былі Мазыр і Пхоў.

У гэтым атрадзе служыла нямала маракоў-балтыйцаў, накіраваных сюды з флоту за рэвалюцыйную дзейнасць, з якімі П. Я. Каралёў удзельнічаў у стварэнні органаў Савецкай улады на Мазыршчыне ў кастрычніку 1917 года.

Першую палову 1918 г. П. Я. Каралёў у Маскве, бо Беларусь была захоплена нямецкімі войскамі. Восенню таго ж года ён зноў накіроўваецца ў Гомель і Кіеў, дзе фарміравалася Дняпроўская ваенная флатылія. Пётр Яўхімавіч назначаецца старшым камендорам (камандзірам гарматы) кананерскай лодкі «Малый». Пачаліся ўпартыя баі з дзянікінцамі, пятлюраўцамі, рознымі бандыцкімі фарміраваннямі на Дняпры і яго прытоках, а потым і з белапалякамі, якія рваліся на ўсход.

Значнай баявой аперацыяй з удзелам канлодкі «Малый», іншых суднаў флатыліі быў вядомы ў гісторыі грамадзянскай вайны Лоеўскі прарыў, калі ноччу з 1 на 2 чэрвеня 1920 г. у жорсткім баі караблі флатыліі прарваліся каля Лоева ўверх па Дняпры і Прыпяці. Збераглося баявое данясенне камандзіра канлодкі «Малый» А. П. Эрдмана і паліткама Саднікава, у якім аб Каралёве і яго сябрах па зброі напісана:

«...Доношу, что во время боев по прорыву обороны белополяков каждый моряк исполнял приказания точно и скоро, несмотря на неприятельский артиллерийский и пулеметный огонь. Общим желанием и старанием команды добить врага канлодка «Малый» прорвалась через неприятельские укрепления, нанеся удар ему. Боевой приказ от 1 июня за № 31 исполнен полностью...» (РДАВМФ. Ф. р.-139. Воп. 1. С. 349. Л. 111.)

Кананерская лодка «Малый» за баі ў час Лоеўскага прарыву была ўзнагароджана Ганаровым Чырвоным сцягам. У гэтыя дні П. Я. Каралёў быў паранены. Потым у якасці старшага камендора канлодкі «Губительный» вызваляў ад белапалякаў Мазыр, Петрыкаў, Тураў, іншыя прырэчныя гарады Беларусі.

У сакавіку 1921 г. Пётр Яўхімавіч дэмабілізаваўся з флатыліі і ўсё далейшае жыццё звязаў з Дняпром і Прыпяццю, з 1946 г. жыў і працаваў у рачным порце «Пхоў».

І. Краўцоў

За свабоду Беларусі

На тэрыторыі Мазыршчыны пасля грамадзянскай вайны засталося некалькі брацкіх і адзіночных магіл. У іх пахаваны воіны Чырвонай Арміі, партызаны і падпольшчыкі, якія аддалі сваё жыццё за ўладу Саветаў, мірныя жыхары — ахвяры захопнікаў. Захаваліся імёны некаторых з іх.

ГОРАД МАЗЫР
КАЛЯ СТАДЫЁНА «СПАРТАК»

АЛЕЙНІКАЎ Іван Емяльянавіч, н. у 1880 у Чарнігаўскай губ., камандзір вартавога карабля «Беркут», загінуў 10.10.1920.

ГАВЯДЗІНАЎ Васіль Іванавіч, н. у 1895 у Яраслаўскай губ.,

ГАНЧАРЭНКА Яўхім Сяргеевіч, н. у 1896 у Чарнігаўскай губ. — камендоры кананерскай лодкі «Мощный» Дняпроўскай ваеннай флатыліі — загінулі 10.7.1920.

ДАНІЛЕЎСКІ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1892, сакратар ЦВК Украіны ў 1918, камісар 139-й брыгады 47-й стралковай дывізіі, загінуў 5.3.1920.

КАНАВАЛАЎ Рыгор Савельевіч, н. у 1897 у Бранскай губ., старшы камендор канлодкі «Мощный», загінуў 10.7.1920.

КАЦМАН Хая, падпольшчыца г. Калінкавічы, павешана белапалякамі ў чэрвені 1920.

КІРПІЧНІКАЎ Ш., рабочы фабрыкі «Ма-

І. Е. Алейнікаў

Помнік загінуўшым у грамадзянскай вайне

ланка», падпольшчык г. Мазыр, павешаны белапалякамі ў чэрвені 1920.

МУРАЧОЎ Мікалай, камендор вартавога карабля «Ястреб», утапіўся пры размініраванні чыгуначнага моста 11.7.1920.

РУДЗІТ Юлій Янавіч, н. у 1890 у Віцебскай губ., сігнальшчык канлодкі «Мощный», загінуў 10.7.1920.

САЛАЎЁЎ Рыгор, палітработнік Чырвонай Арміі, падпольшчык г. Калінкавічы, павешаны белапалякамі ў чэрвені 1920.

ЯЎСЕЕНКА Андрэй Іванавіч, н. у 1896 у Бранскай губ., камендор канлодкі «Мощный», загінуў 10.7.1920.

25 воінаў Чырвонай Арміі і ўдзельнікаў падпольнага руху на Мазыршчыне. (Прозвішчы і імёны не ўстаноўлены.)

КАЛЯ КУРГАНА СЛАВЫ

ЧАРНЕЦКІ Васіль, ураджэнец Хмяльніцкай вобл., машыніст браняпоезда, загінуў у 1920.

ВЁСКА ПРАЎЦЮКІ (МОГІЛКІ)

Два чырвонаармейцы загінулі 11.11.1920.

ВЁСКА СЛАБАДА (МОГІЛКІ)

АЛЯКСАНДРАЎ Андрэй, шкіпер кананерскай лодкі «Грозящий» Дняпроўскай ваеннай флатыліі,

БАРТ Іаган Генрыхавіч, н. у г. Талін, машыніст міннага дывізіёна флатыліі — загінулі 1—5.3.1920.

БЕРКУМ-ВАСІЛЬЕЎ Георгій, камандзір атрада маракоў флатыліі, загінуў 20.12.1919.

ДЗМІТРЫЕЎ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1889 у Чувашыі, рулявы канлодкі «Молодецкий»,

ЖЫТНІКАЎ Ануфрый Паўлавіч, н. у 1882 у в. Н. Івакі Добрушскага р-на, сігнальшчык канлодкі «Молодецкий» — загінулі 5.3.1920.

ЗАТЫКАЙЧАНКА Іван, н. у Іванаўскай губ., кулямётчык канлодкі «Молодецкий»,

КАВАЛЁЎ Ілья Фёдаравіч, н. у Курскай губ., камендор канлодкі «Грозящий»,

КАРАЛЁЎ Захар Логвінавіч, н. у 1884 у Арлоўскай губ., мінёр флатыліі — загінулі ў 1920.

КАРЖАВІН Іван Сцяпанавіч, н. у Вяцкай губ., загадчык гаспадаркі канлодкі «Мудрый», загінуў 1.3.1920.

МЯРЭЖКА, матрос флатыліі, загінуў 20.12.1919.

РЫБІН Іван Паўлавіч, н. у Томскай губ., матрос тральшчыка «Міна»,

САВІЧ Мікалай Ільіч, н. у 1893 у Тульскай губ., матрос флатыліі,

ЦІМАФЕЕЎ Якаў Сяргеевіч, н. у Казанскай губ., начальнік каманды штаба флатыліі — загінулі ў 1920.

Страты 417-га палка ў баях на Мазыршчыне ў лютым 1920 г.

а) Загінулі ў баі каля в. Лешня 19.2.1920 (месца пахавання невядома):

КАЎГАН Піліп, чырвонаармеец 6-й роты

МАСЛАЎ Усцін, чырвонаармеец 6-й роты

ПЯТРОЎ Аляксей, памочнік камандзіра 6-й роты

УДАЛЬЦАЎ Аляксандр, чырвонаармеец 6-й роты

ЦЫГАНОЎ Рыгор, камандзір узвода 6-й роты

ЮШКОЎ Рыгор, камандзір узвода 1-й роты.

б) Прапалі без вестак у баі каля в. Лешня 19.2.1920:

ДАНЦОЎ Нікіфар, чырвонаармеец 1-й роты

ДРАБЫШЭЎСКІ Фёдар, камандзір аддзялення 1-й роты

КАРПЕНЕР Саламон, камандзір узвода 1-й роты

КОЛАСАЎ Васіль, камандзір аддзялення 1-й роты

ПЛІПАЎ Міхаіл, чырвонаармеец 6-й роты

ПЯТРОЎ Міхаіл, чырвонаармеец 1-й роты

ПЯТРУНІН Сцяпан, камандзір аддзялення 1-й роты

А. П. Жытнікаў

І. С. Каржавін

СУРКОЎ Васіль, чырвонаармеец 1-й роты.

в) Прапалі без вестак у баі каля в. Скрыгалаў 22.2.1920:

ІВАНОЎ Пётр, чырвонаармеец 4-й роты
ІВАНОЎ Сцяпан, чырвонаармеец 4-й роты
КАСЦЯЕЎ Сяргей, камандзір узвода 4-й роты
ЛЕВЯШЧОЎ Павел, чырвонаармеец 4-й роты
СМІРНОЎ Мікалай, чырвонаармеец 4-й роты, прапаў без вестак каля в. Слабада 23.2.1920.

РДВА. Ф. 36 835. Воп. 1. Спр. 6. Л. 47.

Загінулі 20 і 23 лютага 1920 г. у баях за вёскі Махнавічы, Рэмязы, Мялешкавічы чырвонаармейцы 421-га палка (месца пахавання невядома):

ГАРВОН Сямён,
ЛАДЫШ Мікіта,
МУЛЫГІН Мікалай,
САМАНЧУК Рыгор — разведчыкі палка.
ПЕТЫШКОЎ Андрэй — радавы 4-й роты.

Прапалі без вестак у тыя ж дні чырвонаармейцы 4-й роты:

БАНЬКОЎСКІ Кузьма
ДАВЕРАЎ Іван
ЛАЎРЫК Сямён
МЕЛЬНІКАЎ Антон.

РДВА. Ф. 3787. Воп. 1. Спр. 9. Л. 202, 203, 210.

Спіс воінаў 1-га Мазырскага берагавога атрада, якія прапалі без вестак у баях з белапалякамі 4—5 сакавіка 1920 г. у раёне вёсак Слабада, Майсееўка, Касцюковічы:

БАЗАРАЎ Іван Мітрафанавіч
БУРДЗІН Міхаіл Мацвеевіч
ВАСЬКОЎ Іван
ДАЗОРАЎ Іван Міхайлавіч
ЖАБІН Іван Васілевіч
ІВАНОЎ Іван
КАРАТКЕВІЧ Рыгор Фролавіч
КОСЦЕРАЎ Васілій Міхайлавіч
КУРЫН Аляксей Сцяпанавіч
КУЦЫ Іван Канстанцінавіч
ЛУК'ЯНЧАНКА Іван Іосіфавіч
МАЛЫХІН Мітрафан
РУТКЕВІЧ Уладзіслаў Уладзіслававіч
РЫЛЬЦАЎ Апанас Іванавіч
САВЕНКА Іван
СМІРНОЎ Апанас Іванавіч.

РДВА. Ф. 3787. Воп. 1. Спр. 19. Л. 105.

Ваеннаслужачыя і мірныя жыхары Мазыршчыны, якія загінулі ў гады першай сусветнай і грамадзянскай войнаў (1914—1920)

ГОРАД МАЗЫР

АРКІН Арон Сімхавіч, палітрук роты, загінуў у 1920 каля г. Полацк.

БОБР Дзмітрый, павешаны белапалякамі ў 1920.

БРЭГМАН Аляксандр Абрамавіч, н. у 1895, камісар брыгады Мазырскай групы Чырвонай Арміі, закатаваны белапалякамі летам 1920.

БРЭГМАН Лейба Саламонавіч, чырвонаармеец, загінуў 3.7.1919 у Валожынскім р-не Мінскай вобл.

БЯРНАЦКІ, загінуў у 1920.

ЗЕЛЬДЗІН Навум Беркавіч, чырвонаармеец, загінуў 3.7.1919 у Валожынскім р-не Мінскай вобл.

ЛОБАЧ Майсей Міхайлавіч, чырвонаармеец, загінуў 2.5.1920.

ПАЛЕЙ, загінуў у 1920.

ФІШБЕЙН Самуіл Арэф'евіч, прапаў без вестак у 1919.

ШУСТЭРМАН Барыс, камандзір партызанскага атрада, загінуў у чэрвені 1920.

ШЭЙКМАН, загінуў у 1920.

ШЭЙНМАН Самуіл Зельманавіч, чырвонаармеец, павешаны ў 1919 дзянікінцамі ў г. Харкаў.

ШЭЙНМАН Самуіл Ісакавіч, чырвонаармеец, загінуў у 1919 каля г. Віцебск.

КАМЕНКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА МЛЫНОК

КАДОЛ Ілья Дзям'янавіч, загінуў у 1917 каля г. Баранавічы.

І. М. Сузько

ВЁСКА МЯЛЕШКАВІЧЫ

ЖЫЛЬСКІ Ігнат, 60 гадоў, і пяць юнакоў — расстраляны 27.6.1920.
Тры чалавекі ў той дзень загінулі ў агні.

КОЗЕНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА КОЗЕНКІ

СУЗЬКО Ігнат Міхайлавіч, расстраляны ў 1918.
СУЗЬКО Сямён Мікітавіч, расстраляны ў 1920.

КРЫНІЧАНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АКУЛІНКА

БІГЕЛЬ Канстанцін Прохаравіч

МАХНАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА МАХНАВІЧЫ

ДЗЕНІСЕНКА Фама Конанавіч
ЗАЯЦ Канстанцін Яўменавіч
КАНОПЛІЧ Захар
КАНОПЛІЧ Канстанцін Сцяпанавіч
КАНОПЛІЧ Пётр Платонавіч
КОВАЛЬ Сцяпан
ФРАЛОЎ Сцяпан

МІХАЛКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА КУСТАЎНІЦА

БУНАС Іван, памёр ад ран 24.2.1921.

ВЁСКА МІХАЛКІ

КАЛЕНІК Павел Сцяпанавіч,
КАЛЕНІК Фёдар Сцяпанавіч,
КУХНАВЕЦ Іван Міхайлавіч — павешаны белапалякамі ў 1920.
РУДКОЎСКІ Мікалай, загінуў 10.4.1919.

ВЁСКА РУДНЯ МІХАЛКАЎСКАЯ

ДВОРАК Пётр Сцяпанавіч

ПРУДКОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ПРУДОК

ВАШКЕВІЧ Ермалай,
ЗЫНКОЎСКІ Раман Мітрафанавіч,
КІРЫЛАЎ Дзям'ян Андрэевіч, старшыня рабачкама маёнтка «Прудок»,
КУЧЫНСКІ Аляксандр — расстраляны балахоўцамі ў лістападзе 1920.
МАЗГОЎ Сямён Лявонавіч
МАРОЗ Рыгор
МІСЕВІЧ Максім Фёдаравіч
МІШКОЎ Фёдар
ПАШКОЎСКІ Ігнат Рыгоравіч
РАЖОК Фёдар Пятровіч

ВЁСКА БАРЫСКАВІЧЫ

КАБЗАР Андрэй Рыгоравіч
ПРЫХОДЗЬКА Андрэй Восіпавіч

ВЁСКА ЗАГОРЫНЫ

ЧУРЫЛА Нікіфар

СЛАБАДСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА В. ЗІМОВІШЧЫ

КЛІМЕНКА Андрэй Лявонавіч
ПАТАПАЎ Сцяпан Яўсеевіч

ВЁСКА МАЙСЕЕЎКА

КЛІМЕНКА Сафрон Канстанцінавіч
ПАЎЛАЎ Аркадзь Рыгоравіч
ШВАВАРАЎ Андрэй Яўхімавіч
РАК Рыгор Максімавіч

ВЁСКА КАЗІМІРАЎКА

КУРМАЗ Пётр Панкратавіч
СІДАРЭНКА Павел Лазаравіч
СІДАРЭНКА Сцяпан Лазаравіч

ВЁСКА РАМАНАЎКА

АСТРЭЙКА Васіль Вайстратавіч

КЛЮКА Фёдар Мікітавіч
ШЭЎКА Максім Карпавіч

ВЁСКА РУДНЯ КАМЕНСКАЯ

ГАРУЛЯ Савелій Ігнатавіч, загінуў у 1915 у Кобрынскім р-не Брэсцкай вобл.

ВЁСКА СЛАБАДА

АДАМАНСКІ Пётр Сцяпанавіч
СІТНІК Ілья Мацвеевіч
СІТНІК Іван Карпавіч
ЛАСЕВІЧ Аляксандр Сямёнавіч, загінуў у верасні 1919.

ВЁСКА ХАМІЧКІ

КУЛАГА Мікалай Іванавіч, загінуў у 1917.
СМАЛЯНІК Міхаіл Апанасавіч, загінуў у 1918 г.

ВЁСКА ЧАРАМАШНЯ

КОЦІК Нохім Янкелевіч, старшыня сельсавета, павешаны балахоўцамі ў лістападзе 1920.

СКРЫГАЛАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ЖАХАВІЧЫ

БАБРОЎНІК Міхаіл Фёдаравіч
БАБРОЎНІК Пётр Гапонавіч
КУГАН Кірыла Іосіфавіч
КУГАН Мікіта Іосіфавіч
ПІСАНІК Захар Арцёмавіч
РАБЧАНКА Несцер Уласавіч
РАСОШАНКА Кузьма Давыдавіч
ТКАЧ Яўхім Паўлавіч

ВЁСКА ЛЕШНЯ

БАКАВЕЦ Іван Антонавіч, пяць вяскоўцаў-яўрэяў — расстраляны белапалякамі ў 1920.
КАРАСЬ Сцяпан, партызан атрада В. Талаша, загінуў у 1920.
СІТНІК Міхаіл Ігнатавіч, загінуў у 1919.

ВЁСКА СКРЫГАЛАЎ

КАЛАСОЎСКІ Лука Іванавіч, намеснік камандзіра Скрыгалаўскага партызанскага атрада, загінуў у лютым 1920.
МАМАЙКА Дзмітрый Іванавіч, загінуў 21.11.1918.
ПАДЗІЛА Лук'ян,
ПРАКАПЕНКА Андрэй,
РУДЗЬКО Цімафей — партызаны Скрыгалаўскага атрада, расстраляны белапалякамі ў красавіку 1920.
ШАСТАКОВІЧ Пётр, памёр ад ран 21.5.1921.
ЯЦКО Андрэй, загінуў 24.4.1920.

Загінуўшыя землякі, месца нараджэння якіх не ўстаноўлена

ГУЗАВЕЦ Кузьма Якаўлевіч, н. у 1895, матрос Кранштацкага гарнізона,
ДРАГУНОЎ Макар Кузьміч, н. у 1895, матрос Балтфлоту,
КАСЦЯРОНАК Ананій Іванавіч, н. у 1895, матрос Балтфлоту,
ЛУГОЎСКІ Фёдар Трафімавіч, н. у 1891, матрос Балтфлоту,
ЯЦУК Дзмітрый Іванавіч, н. у 1897, матрос Балтфлоту — прапалі без вестак у час Кранштацкага мяцяжу 17—18.3.1921.
ЛАЗАРЧУК Аркадзь Марцінавіч, машыніст пасыльнага судна «Кречет» Балтфлоту, памёр ад хваробы 13.1.1920 у г. Петраград.
НЕКРАШЭВІЧ Марк Фёдаравіч, н. у 1888, камендор лінкора «Слава» Балтфлоту, памёр ад ран 6.4.1920 у г. Кранштат.
ШЧУР Герасім Сідаравіч, н. у 1892, матрос эсмінца «Свобода» Балтфлоту, загінуў 21.10. 1919.
ЮШКЕВІЧ Макар, разведчык Мазырскага стралковага палка, загінуў 30.9.1919 у баі з белапалякамі ў в. Злодзін Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.

На падставе архіўных матэрыялаў і сведчанняў насельніцтва спіс падрыхтавалі

М. Капач, І. Краўцоў

Да 50-годдзя Кастрычніка

28 кастрычніка 1967 г. у сувязі з 50-годдзем Кастрычніцкай рэвалюцыі Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў актыўных удзельнікаў рэвалюцыі, грамадзянскай вайны і барацьбы за ўстанаўленне Савецкай улады

ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

КРЫЎЧЫК Павел Апанасавіч

ОРДЭНАМ ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

ВЫСЛОЎЖЫЛ Іосіф Іосіфавіч
КУХНАВЕЦ Рыгор Іванавіч
ШЫБУТ Канстанцін Іванавіч

ОРДЭНАМ ЧЫРВОНАЙ ЗОРКІ

ГНЕДЗЬКА Цімафей Барысавіч
ДУБІНСКІ Мікалай Яўхімавіч
МАРОЗАЎ Даніл Яўстафіевіч
МЕЙЛАХ Лявон Іванавіч

ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

ЭЛЬМАН Андрэй Пятровіч

ОРДЭНАМ ЗНАК ПАШАНЫ

ЖУДРА Іван Ульянавіч
ШУМАК Іван Кузьміч
ЯРОМА Барыс Антонавіч

МЕДАЛЁМ «ЗА АДВАГУ»

АСТРЭЙКА Сцяпан Пракопавіч
БАГІНСКІ Ксенафонт Адамавіч
БАЛЮНОЎ Цімафей Акімавіч
КАРОТКІН Дзмітрый Фядосавіч
МАРОЗ Аляксей Сцяпанавіч
МЯТЛІЦКІ Андрэй Іосіфавіч
ПАДУТА Павел Сямёнавіч
СОБАЛЕЎ Фёдар Несцеравіч

МЕДАЛЁМ «ЗА БАЯВЫЯ ЗАСЛУГІ»

АГЕЕЎ Сяргей Васілевіч
АСТАПАЎ Сцяпан Аляксеевіч
БАРЫСАЎ Уладзімір Сямёнавіч
БОНДАР Пётр Міхайлавіч
ГРЫНГАЎЗ Самуіл Эмануілавіч
ДЗЕРАВЯНКА Фёдар Андрэеевіч
ДУБРОЎСКІ Павел Паўлавіч
ЗАЛЬЦМАН Якаў Абрамавіч
КАРПАЎ Аляксандр Цімафеевіч
КАЦМАН Абрам Мендзелевіч
ЛАПЕТА Васіль Міхайлавіч
ЛЕВЯНКОЎ Парфірый Іосіфавіч
ПІВАВАР Мікалай Фёдаравіч
САПРЫНОЎСКІ Канстанцін Іосіфавіч
СТАРОБІНСКІ Самуіл Лазаравіч
СЫЧОЎ Аляксандр Мікалаевіч
ФОКІН Яўсей Іванавіч
ХАРАВЕЦ Сямён Піліпавіч
ЧАПАЙКІН Васіль Іосіфавіч
ШАЎЧЭНКА Ганна Мікалаеўна
ЮШКЕВІЧ Пётр Макаравіч

МЕДАЛЁМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ АДЗНАКУ»

ГВОЗДЗЕЎ Міхаіл Максімавіч
ДУБАТАЎКА Макар Дзмітрыевіч
КАРОБКА Шая Ісаравіч
КУНГЕР Фёдар Цімафеевіч
РАЕЎСКІ Антон Паўлавіч
ТУРАК Георгій Піліпавіч
ТУРАЎСКІ Ісаак Ліпавіч
ЧАРНЕЦКІ Міхаіл Мартынавіч

МЕДАЛЁМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ ДОБЛЕСЦЬ»

ВАНГЭНГЭЎМ Вівея Аляксандраўна

ПАД ЗНАКАМ СЯРПА І МОЛАТА

Змаганне за сацыялізм

Перыяд, які працягваўся два дзесяцігоддзі — ад вайны грамадзянскай да Вялікай Айчыннай, можна, гаворачы пра Палессе, ахарактарызаваць адным купалаўскім радком: «Як на край балотны йшоў сацыялізм». На Мазыршчыне, як і ўсюды, змаганне за новы грамадскі лад было цяжкае, упартае, часта бязлітасна суровае.

Вынікі сямігадовых ваенных дзеянняў першай сусветнай і грамадзянскай войнаў для Мазыршчыны былі надзвычай цяжкімі. Прамысловая вытворчасць у параўнанні з узроўнем 1913 г. зменшылася ў пяць разоў, на 30 працэнтаў скараціласа колькасць рабочых. Большасць прадпрыемстваў бяздзейнічала, сельская гаспадарка прыйшла ў заняпад. Людзі былі на фронце. Шмат салдат загінула і было паранена. Насельніцтва горада не забяспечвалася прадуктамі, сяляне — таварамі першай неабходнасці. Каштоўнае абсталяванне лесапільнага завода, фанерных фабрык «Прыма», «Маланка» і іншых прадпрыемстваў было вывезена ці разраба-



Камсамольцы на будаўніцтве моста цераз Прыпяць. У апошнім радзе (стаіць, другі злева) сакратар Палескага акруговага камітэта камсамола І. П. Галадко. 1924

вана, а тое, што засталося, было ў нерабочым стане.

Да 1 мая 1922 г. у Мазыры працавалі млын, лесапілка, электрастанцыя, бляшаная майстэрня і бойня. На 7-м з'ездзе Саветаў Мазырскага павета ў снежні 1922 г. адзначалася, што да сярэдзіны года прадпрыемствы амаль не дзейнічалі, патрабаваўся капітальны рамонт. Млын перапрацоўваў за год 25 тыс. пудоў збожжа, выпускаў 200 пудоў круп.

Аднаўленчы перыяд на Мазыршчыне ішоў марудна і нездавальняюча. Бяздзейнічалі чыгунна-ліцейны завод «Таўра», гарбарныя заводы (былыя Фішмана і Гаравога). Электрастанцыя ў 1921 г. выпрацавала 6 тыс. свячэй энергіі.

Лепшымі былі справы на прадпрыемствах дрэваапрацоўчай прамысловасці. У 1923 г. на 200 працэнтаў павялічыўся выпуск прадукцыі фанернай фабрыкай «Чырвоны Кастрычнік», на 400 працэнтаў — лесапільным заводам «Пралетарый» (былыя фабрыкі «Прыма» і «Маланка»). Гэтыя прадпрыемствы ўваходзілі ў аб'яднанне «Лесбел», якое з'яўлялася састаўной часткай Аб'яднання экспартнай лясной прамысловасці Заходняга раёна. На знешні рынак, у Англію і Германію, ішлі фанерная сыравіна, мэблевая клёпка і фанера вышэйшых гатункаў.

Рабіліся першыя крокі ў аднаўленні буйной сельскагаспадарчай вытворчасці. Яшчэ ў 1919 г. пасля выгнання з Мазыршчыны нямецкіх і гетманаўскіх акупантаў на базе былых памешчыцкіх маёнткаў пачалі стварацца саўгасы, камуны і сельскагаспадарчыя арцелі. У вёсцы Скрыгалаўская Слабада на землях памешчыка Снядзецкага быў створаны саўгас «Слабада», якім кіраваў П. І. Баравік, прысланы павятовымі ўладамі. У перыяд белапольскай акупацыі гаспадарка была разбурана і разрабавана. У данясенні загадчыка зямельнага аддзела Мазырскага павета 16 ліпеня 1920 г. паведамлялася: «У саўгасе «Слабада» спалены дамы і раскрадзена большая частка інвентару. Няма ні коней, ні жывёлы...» З дапамогай дзяржавы гаспадарка саўгаса паступова ўмацоўвалася. Калі ў 1921 г. засявалася 65 дзесяцін жыта, 3 аўса, 8 грэчкі, то ў 1923 г. жытам засявалася 98 дзесяцін, аўсом — 15, канюшынай і бульбай — 30. У 1922 г. у гаспадарцы быў свой лакамабіль, малатарня і зернеачышчальная машына. У 1919 г. былі спробы арганізаваць калектыўныя гаспадаркі і ў іншых былых маёнтках — Барбарове, Сідзельніках, Мялешкавічах, Прудку, Асаўцы, але перашкодзіла белапольская акупацыя.

У Мазыры таксама вяліся аднаўленчыя работы, рамантавалася жыллё. Была рэканструявана гарадская электра-



станцыя. На ёй устанавілі новую дынама-машыну магутнасцю 78 конскіх сіл, што дазволіла амаль поўнасцю электрыфікаваць горад. Быў адноўлены водаправод, які налічваў 800 кранаў. У горадзе працавалі лазня і пральня.

Працоўныя Мазыршчыны аказвалі шэфскую дапамогу часцям Чырвонай Арміі. Для яе патрэб было сабрана 400 пудоў жыта, 1442 метры мануфактуры, 8 пудоў цукру. Працоўны люд Мазыршчыны дзяліўся апошнім кавалкам

хлеба і з галадаючым насельніцтвам Паволжа. Былі адкрыты два дзіцячыя дамы для дзяцей з галадаючых раёнаў. Адзін з такіх дамоў быў размешчаны ў Касцюковічах у былым маёнтку.

З наступленнем мірнага жыцця ў вёсцы пачалося размеркаванне зямлі. Яе атрымалі практычна ўсе сяляне. Толькі за 1922 г. у павеце было падзелена 7 тыс. дзесяцін зямлі, якую атрымалі 387 беззямельных і 1713 малазямельных сялян. Але становішча сельскай гаспадаркі па-ранейшаму заставалася цяжкім.

У сакавіку 1921 г. харчразвёрстка была заменена прадуктовым падаткам. Ствараліся ўмовы для стымулявання дробнай таварнай вытворчасці, вырашаліся многія пытанні гандлю. Хуткімі тэмпамі пачала развівацца саматужная вытворчасць. У Мазырскім павеце ў 1923 г. было 1853 такіх прадпрыемстваў.

Адной з найбольш сур'ёзных праблем з'яўлялася беспрацоўе. Значную частку беспрацоўных складала моладзь. Так, у Мазыры ў 1924 г. з 553 беспрацоўных, якія стаялі на ўліку, 141 былі юнакі і дзяўчаты. Каб заняць людзей, ствараліся новыя працоўныя калектывы, галоўным чынам па гарадскім і дарожным будаўніцтве. У 1925—1930 гг. на тэрыторыі раёна замест былога паштовага тракта Санкт-Пецярбург — Валынь, побач з чыгункай Калінкавічы — Оўруч — Корасцень, пабудаванай тэрмінова для ваенных мэт у гады першай сусветнай вайны, была пракладзена аўтамабільная дарога з цвёрдым пакрыццём Мазыр — Оўруч, мост цераз Прыпяць у раёне вёскі Навікі. Рамантаваліся грунтавыя дарогі: Мазыр — Скрыгалаў — Петрыкаў, Мазыр — Лельчыцы, Міхалкі — Нароўля, Слабада — Казіміраўка. На гэтым будаўніцтве былі заняты тысячы жыхароў Мазыршчыны. Да сакавіка 1925 г. у Мазыры было створана 13 працоўных калектываў, у якіх было занята 160 чалавек.

17 ліпеня 1924 г. у рэспубліцы былі ліквідаваны паветы і воласці, утворацы акругі і раёны. Мазырскі павет быў пераўтвораны ў Мазырскую акругу. На месцы былых валасцей — Міхалкаўскай, Слабадской, Мялешкавіцкай і часткі тэрыторыі сучаснага Калінкавіцкага раёна быў утвораны Мазырскі раён. Межы яго неаднаразова мяняліся. Мялешкавіцкі сельсавет да 1938 г. адносіўся да Ельскага раёна, Скрыгалаўскі — да Петрыкаўскага, Міхалкаўскі і польскі нацыянальны Кустаўніцкі спачатку да Нараўлянскага, затым — да Ельскага. Больш чым 10 сельсаветаў Калінкавіцкага раёна двойчы мянялі раённае падпарадкаванне, а да 1938 г. адносіліся да Мазырскага. Махнавіцкі, Асавецкі і Барбароўскі сельсаветы ўключаны ў склад Мазырскага раёна ў пасляваенны час.

Мяняў сваё геаграфічнае месца і цэнтр раёна. У 1926—1927 гг. ім была вёска Слабада. Сельскія Саветы неаднаразова разбуйняліся і ўзбуйняліся.

У сельскай гаспадарцы поруч з аднаасобнікамі працавалі і камунары. Піянерам калектыўнага валодання зямлёй была працоўная арцель «Сіла», створаная ў 1922 г. у Прудку, куды ўвайшлі дзевяць батрацкіх сямей. Праз год была ўтворана арцель «Чырвоная Зорка» ў Лешні і камуна «Міна» ў Хамічках.

У красавіку 1924 г. на землях былога землеўладальніка Горвата ў Барбарове сем'ямі беднякоў створаны калгас «Серп і молат», першым старшынёй якога быў абраны дэмабілізаваны чырвонаармеец Р. І. Кухнавец. У былым маёнтку Сідзельнікі ў вёсцы Гурыны была створана яўрэйскай беднатой калектыўная гаспадарка «Афрэер» («Уперад»).

Неадназначна адносілася насельніцтва Мазыршчыны да калектыўнага валодання зямлёй. Праз два месяцы ў калгасе «Серп і молат» былі спалены пабудовы грамадска-гаспадарчага двара, затым спалена гумно са збожжам. У агні загінулі два члены калгаса — Іван Наўныка і Мікалай Барысенка, Язэп Барысенка моцна абгарэў.

У Рудні Міхалкаўскай у час сходу з абрэза праз акно быў застрэлены С. І. Дворак, у Мялешкавічах сякерай забіты Я. З. Зіберман. Але найбольш абвастрылася барацьба ў вёсцы ў самым канцы дваццатых гадоў.

Складанай была ў пачатку 20-х гадоў эпідэміялагічная сітуацыя. Людзі часта хварэлі на брушны тыф, каросту, дыфтэрыт і іншыя інфекцыйныя захворванні. Медыцынскія ўстановы былі вельмі беднымі. Гарадская амбулаторыя размяшчалася ў непрыстасаваным памяшканні. Бальніца на 30 ложкаў знаходзілася ў пабудове барачнага тыпу. Існавала яшчэ адна бальніца на два аддзяленні, дзе прымалі парадзіх і інфекцыйных хворых. У сувязі з эпідэміяй сярод насельніцтва і ў арміі сыпнога тыфу быў адкрыты, як тады яго называлі, «заразны барак». Невялікія ўчастковыя бальніцы былі ў Слабадзе і Скрыгалаве, а ў Міхалках і Мялешкавічах — медыцынскія пункты.

Медыцынскіх работнікаў было ўсяго 41 чалавек, з іх — 6 урачоў, 8 лекарскіх памочнікаў, некалькі акушэрак і медыцынскіх сясцёр. Пры ўспышцы малярыі ў чэрвені 1924 г. Наркамздраў БССР камандзіраваў у Мазырскі павет тры атрады ўрачоў.

У канцы студзеня 1921 г. на Мазыршчыне пабываў старшыня ЦВК БССР А. Г. Чарвякоў, які наведаў некаторыя медыцынскія ўстановы. Ён адзначыў, што бальніцы знаходзяцца ў здавальняючым стане. Для медыцынскіх работнікаў гэта было пахвалой за іх самаадданую работу.

Значна паспрыяў паляпшэнню аховы здароўя насельніцтва на Мазыршчыне прысланы з Мінска ўрач Я. Кантаровіч, які быў першым загадчыкам павятовага аддзела аховы здароўя.

У канцы 20-х гадоў у Мазыры працавала 18 урачоў, 4 стаматолагі, 10 лекарскіх памочнікаў, 4 акушэркі, 16 сясцёр міласэрнасці, 13 фармацэўтаў. Былі адкрыты дзве бальніцы на 100 ложкаў, радзільны прытулак на 15 ложкаў, цэнтральная амбулаторыя на тры аддзяленні (тэрапеўтычнае, хірургічнае, зубаўрачэбнае), а таксама амбулаторыя на фанернай фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» і лесапільным заводзе «Пралетарый», дом дзіцяці, туберкулёзны дыспансер, хіміка-бактэрыялагічная лабараторыя, дэзінфекцыйны атрад. Пачалі дзейнічаць кансультацыі для немаўлят, цяжарных жанчын і кормячых маці, дом дзіцяці і маці, дзіцячая бальніца.

Павялічылася колькасць медыцынскіх устаноў і ў вёсцы. У цэнтры амаль кожнага сельскага Савета працавалі фельчарска-акушэрскія пункты, пашырылася матэрыяльная база адкрытай у канцы мінулага стагоддзя Скрыгалаўскай участковай бальніцы — адзінай у сельскай мясцовасці, дзе з 1914 па 1924 г. працаваў выдатны ўрач Л. С. Чычкоўскі. З дня заснавання да 1941 г. працавала тут акушэркай В. К. Захар'яш.

Для таго каб аказваць хірургічную дапамогу хворым, у Мазыр прыехаў хірург — будучы доктар медыцынскіх навук Ф. К. Абрамовіч. За гады сваёй нястомнай дзейнасці ён выратаваў жыццё многім тысячам людзей. Выдатны хірург Ф. К. Абрамовіч падрыхтаваў плеяду здольных урачоў-хірургаў. Добрая памяць захавалася аб яго вучнях — Куцаве, Кенігсбергу, Когане, якія сталі кандыдатамі медыцынскіх навук, працавалі ў Мазыры і ў іншых гарадах.

У 1928 г. ЦВК Беларусі за актыўны ўдзел у грамадзянскай вайне, аднаўленні народнай гаспадаркі ўзнагародзіў мазырскі завод «Чырвоны Кастрычнік» і вёску Мялешкавічы ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР.

У 1932 г. на Мазыршчыне існавала 22 дзяржаўныя, 82 кааператыўныя і 3 грамадскія прамысловыя прадпрыемствы, дзе працавала 3435 чалавек, або 2892 рабочыя і 378 служачых. Акрамя гэтага, 74 чалавекі былі заняты надомнай працай.

Асноўнымі прадпрыемствамі Мазыра з'яўляліся: электрастанцыя, дзе пра-

Выпуск курсаў малодшых медыцынскіх сясцёр пры Мазырскім раённым камітэце Чырвонага Крыжа. 1931

цавала 25 чалавек, арцель «Молат» — 56, цагельны завод — 34, Белхімлес — 104, цагельная арцель «Будаўнік» — 31, лесапільны завод «Пралетарый» — 301, фанерны завод «Чырвоны Кастрычнік» (былы «Прыма») — 427, шавецкія арцелі «Уперад» — 61 і «Чырвоны саматужнік» — 81, дрэваапрацоўчая фабрыка «Прафінтэрн» — 259 чалавек.

Сацыялістычным спаборніцтвам было ахоплена больш як палова рабочых фабрык «Чырвоны Кастрычнік», «Прафінтэрн», завода «Пралетарый». Калі ў краіне разгарнуўся стаханаўскі рух, у ім удзельнічала каля дзвюх трацей працуючых на прадпрыемствах Мазыра.

Паводле Усесаюзнага перапісу насельніцтва 1926 г. у Мазырскай акрузе пражывала 3274 рускія, 8803 украінцы, 277 344 беларусы, 8883 палякі, 486 чэхаў і славакаў, 1 серб, 150 латышоў, 104 літоўцы, 2 латгальцы, 3356 немцаў, 1 шведка, 1 малдаванін, 2 грэкі, 27 254 яўрэі, 1 фінка, 11 эстонцаў, 1 марыец, 8 мардоўцаў, 2 мадзьяры, 3 чувашы, 31 татарын, 1 башкір, 3 найгабакі, 165 цыганоў, 1 грузін, 1 чачэнец, 1 армянін, 114 чалавек прыналежнасць да нацыянальнасці не ўказалі. Усяго грамадзян СССР — 330 008, іншаземцаў — 16.

У гарадскіх пасяленнях Мазырскай акругі налічвалася 37 888 чалавек пастаяннага насельніцтва, у тым ліку ў Мазыры — 9818. Насельніцтва сельскай мясцовасці раёна ў 1933 г. складала 110 925 чалавек. Нацыянальны склад быў таксама разнастайны: 84,4 працэнта беларусаў, 12,1 — яўрэяў, 0,73 — палякаў, 1,66 — рускіх, 0,73 працэнта ўкраінцаў. У 1939 г. насельніцтва Мазыра складала 17,5 тыс. чалавек.

Т. Нікіціна

СПІС СЕЛЬСАВЕТАЎ У 1920—1924 гг. (да новага раяніравання)

Міхалкаўская воласць: Акулінкаўскі, Бібікаўскі, Бярозаўскі, Гурыноўска-Навікоўскі, Кустаўніцкі, Мала-Бокаўскі, Міхалкаўскі, Міцькоўскі, Пянькоўскі, Руднянскі, Санюкоўскі.

Мялешкавіцкая воласць: Васькаўскі, Вяліка-Бокаўскі, Гостаўскі, Заводна-Востраўскі, Махнавіцкі, Мялешкавіцкі, Раманаўскі, Рамязоўскі.

Нараўлянская воласць: Барбароўскі, Праўцюкоўскі, Стрэльскі.

Скрыгалаўская воласць: Асавецкі, Асавецка-Будскі, Балажэвіцкі, Валаўскі, Глініцкі, Крушніцкі, Лешнянскі, Скалодзінскі, Скрыгалаўскі, Шаставіцкі.

Слабадская воласць: Барыскавіцкі, Бельскі, Вяліка-Зімовіцкі, Драздоўскі, Жахавіцкі, Загорынскі, Каменкаўскі, Казіміраўскі, Касцюковіцкі, Кацуроўскі, Майсееўскі, Мала-Зімовіцкі, Міхнавіцкі, Прудкоўскі, Слабадскі, Рэдзька-Лычажэвіцкі, Чарамашня-Руднянскі.

Прыгарадныя (да Мазыра): Баброўскі, Булаўкаўскі, Козенскі, Лапцеўскі, Лубнянскі, Матрункаўскі, Раеўскі, Целяпуноўскі.

СПІС АСАБОВАГА СКЛАДУ ВАЛВЫКАНКАМАЎ МАЗЫРСКАГА ПАВЕТА НА 24 САКАВІКА 1924 г.

Михалковская волость: Козинцев Евгений Степанович (председатель); Толпыко Мартын Михайлович (член сельсовета, зав. волостным земельным отделом); Сергейчук Иосиф Исидорович (член сельсовета); Никитенко Павел Исидорович (секретарь).

Мелешковичская волость: Возняк Михаил Павлович (председатель); Сухоницкий Кирилл Емельянович (член сельсовета, зав. волостным земельным отделом); Терешкович Иван Степанович (член сельсовета); Волков Дмитрий Александрович (секретарь).

Скрыгаловская волость: Веронич Адам Демьянович (председатель); Хмелевский Никонор Тимофеевич (член сельсовета, зав. волостным зем. отделом); Прохоренко Василий Ефимович (член сельсовета); Мицкевич Вячеслав Терентьевич (секретарь).

Слободская волость: Бублис Иосиф Александрович (председатель); Цывунчик Емельян Михайлович (член сельсовета, зав. волостным земельным отделом); Балбатун Юльян Антонович (член сельсовета); Бурак Игнатий Романович (секретарь).

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 60. Воп. 1. Спр. 389. Л. 1—2.

СПІС НАСЕЛЕНЫХ МЕСЦ НА ЖНІВЕНЬ 1924 г.

Асавецкі сельсавет. Асавец (вёска) двароў — 98, жыхароў — 696; Асавецкая Буда (хут.) — 27, 139; Зімавая Буда (вёска) — 35, 341; Кяневічаў Груд (хут.) — 62, 331; Крушнікі (вёска) — 99, 571; Перадрэйка (хут.) — 53, 265; Спрымачоў (хут.) — 21, 116; Турбінка (хут.) — 34, 219.

Усяго па сельсавеце: нас. месц — 8, двароў — 429, жыхароў — 2678.

Барбароўскі сельсавет. Барбароў (сяло), двароў — 162, жыхароў — 732; Барбароў (фальварак) — 27, 100; Гранач (фальв.) — 2, 9; Млынок Верхні (вёска) — 37, 200; Млынок Ніжні (вёска) — 34, 137; Праўцюкі (вёска) — 76, 376; Стрэльск (вёска) — 74, 367; Стрэльская Гара (хут.) — 13, 81.

Усяго па сельсавеце: нас. месц — 9, двароў — 456, жыхароў — 2160.

Бібікаўскі сельсавет. Акулінка (вёска), двароў — 88, жыхароў — 450; Бібікі (сяло) — 101, 502; Гурыны (вёска) — 60, 327; Малажава (хут.) — 9, 41; Нізкі Лес (хут.) — 18, 99; Сафіеўка (хут.) — 1, 6; Сідзельнікі (маёнтак) — 1, 36; Ясеншчына (хут.) — 1, 30.

Усяго па сельсавеце: нас. месц — 8, двароў — 282, жыхароў — 1491.

Глініцкі сельсавет. Глініца (вёска), двароў — 92, жыхароў — 590; Скалодзіна (вёска) — 48, 300; Крынічная Града (хут.) — 15, 70.

Усяго па сельсавеце: нас. месц — 3, двароў — 145, жыхароў — 960.

Вяліка-Бокаўскі сельсавет. Антонаўка (вёска), двароў — 62, жыхароў — 332; Бярозаўка (вёска) — 79, 385; Васькаўка (вёска) — 71, 418; Вялікі Бокаў (вёска) — 58, 295; Гостаў (вёска з 5 хутарамі) — 85, 439; Каменка (вёска) — 102, 500; Рубеж (хут.) — 2, 19; Рудня (вёска) — 58, 254; Чарамашня (вёска) — 19, 104; Шчакатава (вёска) — 40, 228.

Усяго па сельсавеце: нас. месц — 15, двароў — 576, жыхароў — 2974.

Махнавіцкі сельсавет. Заводны Востраў і Забалацце (хут.), двароў — 53, жыхароў — 322; Махнавічы (вёска з 55 хутарамі) — 302, 1667.

Усяго па сельсавеце: нас. месц — 60, двароў — 355, жыхароў — 1989.

Міхалкаўскі сельсавет. Буда (хут.), двароў — 3, жыхароў — 11; Ляхаўцы (вёска) — 36, 185; Малыя Міцькі (хут.) — 8, 47; Малы Бокаў (вёска) — 92, 419; Міхалкі (сяло) — 215, 1044; Міхалкі (маёнтак) — 5, 16; Міцькі (вёска) — 107, 499; Пянькі (вёска) — 39, 196; Рудня (вёска) — 54, 264; Сабінаў (хут.) — 4, 13; Староселле (вёска) — 42, 208; Тварычаўка (вёска) — 35, 189; Трасцяніца (калонія) — 2, 9; Чырвоны Араты (калонія) — 1, 30; Ягаднае (хут.) — 1, 9.

Усяго па сельсавеце: нас. месц — 15, двароў — 644, жыхароў — 3136.

Прудкоўскі сельсавет. Барыскавічы (вёска), двароў — 170, жыхароў — 808; Загорыны (вёска) — 70, 279; Мерабель (вёска) — 45, 218; Лычажэвічы (вёска) — 47, 217; Рэдзька (вёска) — 36, 186.

Прудок (сяло), двароў — 113, хутары: Паднеглі — 2, Зяленкі — 3. Жыхароў — 616.

Усяго па сельсавеце: нас. месц — 8, двароў — 486, жыхароў — 2319.

Скрыгалаўскі сельсавет. Асіцішча (хут.), двароў — 7, жыхароў — 33; Балажэвічы (вёска) — 138, 667; Востраў (хут.) — 1, 6; Жахавічы (вёска) — 171, 937; Казельцы (хут.) — 9, 30; Лешня (вёска) — 157, 914; Лясная (вёска) — 57, 200; Надаткі (хут.) — 17, 53; Рудня Скрыгалаўская (хут.) — 32, 152; Скрыгалаў (мястэчка) — 304, 1764; Ясенец (хут.) — 24, 60.

Усяго па сельсавеце: нас. месц — 11, двароў — 1017, жыхароў — 4641.

Слабадскі сельсавет. Слабада (сяло), двароў — 157, хутары: Адзічэц — 2, Буда — 1, Белькаў — 1, Ганчароўка — 1, Заложжа — 11, Замосце — 7, Камароўка — 1, Ліпнікі — 7, Мох — 1, Падтуркі — 3, Падрэчча — 9. Усяго жыхароў — 1173.

Белая (вёска), двароў — 52, жыхароў — 295; Буда Казіміраўская (хут.) — 30, 145; Вялікія Зімовішчы (вёска) — 87, 418; Малая Слабодка (вёска) — 67, 320; Майсееўка (вёска) — 104, 520; Раманаўка (вёска) — 108, 619; Хамічкі (вёска) — 72, 354.

Казіміраўка (вёска) — двароў 35, Нівішча (хут.) — 2. Жыхароў — 481.

Касцюковічы (вёска), двароў — 111, хутары: Гарохаўка — 1, Казлоў Рог — 2, Овач — 1. Жыхароў — 592.

Малыя Зімовішчы (вёска), двароў — 109, хутары: Змітраўка — 1, Забродцзе — 4, Казлоўшчына — 1, Круглы — 1, Мікалаеўка — 3, Падброддзе — 5. Насельніцтва — 559.

Усяго па сельсавеце: нас. месц — 32, двароў — 1057, жыхароў — 5476.

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 60. Воп. 1. Спр. 56. Л. 93—104.

ПІСЬМО АДДЗЕЛА ПА РАБОЦЕ Ў ВЁСЦЫ МАЗЫРСКАГА ПАВЯТОВАГА ГАРКАМА ПАРТЫІ ВАЛРЭЎКАМАМ І ЧЛЕНАМ ПАРТЫІ АБ ПРАВЯДЗЕННІ ПАДРЫХТОЎЧАЙ РАБОТЫ СЯРОД РАБОЧЫХ САВЕЦКІХ МАЁНТКАЎ ДА ПАВЯТОВАГА З'ЕЗДА РАБОТНІКАЎ ЗЯМЛІ І ЛЕСУ

15 снежня 1920 г.

Уважаемые товарищи! На 25 декабря с. г. в г. Мозыре созывается съезд работников земли и леса.

Этот съезд должен будет наметить общий план работ по поднятию сельскохозяйственного производства и лесоводства в Мозырском уезде. Поэтому отдел по работе в деревне при Мозырском укоме призывает Вас, товарищи, оказать самое огромное влияние на пролетариев — рабочих имений, чтобы они обязательно послали на этот съезд своих делегатов и более революционных передовых товарищей.

Рабочим широко разъяснить задачи Советской власти и ту обязанность рабочего в участии в этом великом деле и что рабочий советского имения является не тем простым орудием производства, как у помещика, а что он здесь не только рабочий, а член, участник этого советского хозяйства. И насколько он будет иметь прилежность в расширении этого хозяйства и контроль над управлением — настолько он сам обеспечит свое благосостояние и т. д.

Отдел просит Вас провести всюду выборы на уездный съезд работников леса и земли не позже 22 декабря с. г. по расчету: 1 делегат от 10 рабочих, 2 делегата от 10 до 25 рабочих и свыше 25 рабочих — 3 делегата.

Делегаты должны явиться с протоколом общего собрания, с подробными списками рабочих и их семей, ведомостями выплаты им жалования и ведомостями полученных и недополученных пайков.

Заведующий отделом по работе
в деревне Мозырского укома (подпись неразборчива)

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 79. Воп. 1. Спр. 14. Л. 33.

ЗВАРОТ МАЗЫРСКАГА ПАВЯТОВАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ ДА ЎСІХ ВАЛЯЧЭЕК МАЗЫРСКАГА ПАВЕТА

28 снежня 1920 г.

Дорогие товарищи!

На нас, победителей бесчисленных контрреволюционных банд, надвигается самый грозный враг — холод. Положение с топливом катастрофическое. В больницах и лазаретах мерзнут больные; в приютах болеют и гибнут от холода дети; фабрики и заводы стоят, грозит остановиться железная дорога — жизненный нерв республики!

Мы, коммунисты, всегда и всюду стоящие на передовых постах, должны личным примером, словом, разъяснением увлечь за собой беспартийных рабочих и крестьян на борьбу с новым врагом и общими усилиями выйти победителями из крайне тяжелого положения.

Организуйте митинги и собрания по деревням, разъясняйте крестьянам значение топлива для Рабоче-Крестьянской Республики, побуждайте их не уклоняться от исполнения гужевой повинности, а с особой энергией стремитесь вывезти из лесу как можно больше дров к железной дороге. Постарайтесь организовать субботники и воскресники под лозунгом: «Все на топливный фронт!»

О всех мерах, принятых Вами в этом направлении, сообщайте укому.

С коммунистическим приветом!

Секретарь укома
Заведующий отделом по работе в деревне

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 293. Воп. 1. Спр. 6. Л. 19.

ПАСВЕДЧАННЕ АБ УЗНАГАРОДЖАННІ КАШТОЎНЫМ ПАДАРУНКАМ САКРАТАРА МАЗЫРСКАГА ПАВЯТОВАГА КАМІТЭТА ПАРТЫІ ТАВ. БАБЕНКІ АЛЯКСЕЯ ЯКАЎЛЕВІЧА

17 сакавіка 1923 г.

Дано ответственному секретарю Мозырского укома и члену Президиума Мозырского уездного исполнительного комитета тов. Бабенко Алексею Яковлевичу в том, что за умелое руководство партийной организацией, советской работой и проявленную в этих областях необыкновенную энергию награжден золотыми часами с надписями:

«А. Я. Бабенко — товарищеский подарок от Мозырской парторганизации 16 марта 1923 г.», «Члену Президиума А. Я. Бабенко от Мозырского уисполкома 16 марта 1923 г.».

Что подписями и приложением печати удостоверяется.

Секретарь Мозырского укома *Розенман*
Председатель Мозырского
уисполкома *В. Луцкевич*
Секретарь *Микулич*

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 88. Воп. 1. Спр. 5. Л. 527.

З МАТЭРЫЯЛАЎ ДА ДАКЛАДА АБ РАБОЦЕ МАЗЫРСКАЙ МІЛІЦЫІ

1 красавіка 1924 г.

...Главные задачи милиции ... сводятся к следующему:

1) Борьба с самогоноварением, 2) борьба с контрабандой, 3) борьба с дезертирством и бандитизмом, 4) предупреждение различного рода преступлений.

	1.4.22—1.4.23 гг.	1.4.23—1.4.24 гг.
Обнаружено случаев выделки самогонки	268	757
Задержано самогоночных аппаратов	144	337
Задержано самогонки в ведрах	148	122
Задержано людей	316	889
Заявлено случаев ограбления и убийств	9	38
Задержано людей	32	26
Раскрыто краж	217	180
Задержано людей	122	196
Задержано военных дезертиров	442	133

Начальник Мозырской уездмилиции *Бальзовский*

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 60. Воп. 1. Спр. 40. Л. 112, 113.

СА СПРАВАЗДАЧЫ ДЗЕЙНАСЦІ МАЗЫРСКАЙ АКРУГОВАЙ ІНСПЕКЦЫІ ПРАЦЫ З 1 СТУДЗЕНЯ 1924 г. ПА 1 САКАВІКА 1925 г.

Меры борьбы с безработицей

Первым методом уменьшения кадра безработных является чистка каталога, чтобы изъять из числа безработных чуждый элемент ... Таких чисток в течение года было две — в феврале и в августе, причем февральская чистка дала обратное явление тем, что как раз в это время подоспела демобилизация Красной Армии, за счет которой произошло увеличение. Но та цель, которую преследовала чистка, была достигнута. Августовская чистка дала 57,5 % уменьшения, это касается главным образом непролетарского элемента, которые стремятся попасть на учет биржи, преследуя цель облегчения себя от налога.

Что же касается пролетарского числа безработных, то для поддержания их выдавалось пособие страхкассы в среднем 31,6 % общего числа на 6859 руб. 95 коп. Остальная часть безработных, менее нуждающаяся в нашей мизерной поддержке, пособием не снабжалась... Пособия выдавались по 1-й категории в размере 6 рублей и по 2-й — 4 рубля. Несмотря на довольно мизерное число удовлетворенных пособием, обеспечение безработных недостаточно.

Радикальным средством борьбы с безработицей является организация трудколлективов, что дает положительные результаты.

В настоящее время во всех коллективах, состоящих при инспекции труда, работает 160 человек... Организованы следующие коллективы:

сапожников «Труд»	— 48 чел.	белошвейниц	— 6 чел.
мужских портных	— 18 чел.	парикмахеров	— 6 чел.
дамских портных	— 20 чел.	папиросников	— 7 чел.
кузнецов	— 9 чел.	часовых мастеров	— 5 чел.
заготовщиков	— 13 чел.	торговый	— 6 чел.
фотографов	— 9 чел.		160 человек
жестянщиков	— 8 чел.		
изготовление бумажных мешков	— 6 чел.		

Кроме того, по обязательному постановлению СНК БССР был проведен месячник «Безработным», и собранные в ходе его средства предназначались для организации новых коллективов и усиления существующих ...

В Мозырском округе в течение месячника было собрано 3320 руб., а также для вышеуказанной цели отпущено по общереспубликанскому бюджету СНК 1500 руб.

ФІЛ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 60. Воп. 1. Спр. 39. Л. 141.

СПРАВАЗДАЧА-ДАКЛАД МАХНАВІЦКАГА СЕЛЬСКАГА САВЕТА МАЗЫРСКАГА РАЁНА ЗА ПЕРЫЯД З 23 ЖНІЎНЯ 1924 г. ПА ЖНІВЕНЬ 1925 г.

1. Организационная работа:

а) Сельсовет существует с 1919 года.

б) Последние выборы в ноябре месяце 1923 года.

в) Мужчин — 14, женщин — 1, все члены беспартийные, социальное положение: крестьян — 13, рабочих — 1, служащих — 1 и бедняков — 12, середняков — 3.

г) Заседаний сельсовета: было с 23 августа — 6 с повесткой дня: значение районирования, польза от такового крестьянству, сельхозналог, школьное дело (ремонт школ), эпизоотия, ремонт дорог, дело помощи жертвам интервенции. Все вопросы разбирались в положительном смысле.

д) Отношение населения к сельсовету вполне хорошее за исключением небольшой группы зажиточных крестьян и спекулянтов. Посещаемость населения увеличилась.

е) За время с 23 августа по отчетный день сельсовет посетили: председатель районного исполнительного комитета т. Родькин, члены исполкома т. Терешкович и Дорошевич, из окружного исполкома т. Межуев, окружного земельного управления вет. врач т. Ключарев 2 раза и вет. врач Наркомзема Белоруссии т. Иоффе 2 раза. Всеми приезжими товарищами делались на общих собраниях доклады, отчеты и разъяснения по всякого рода отраслям.

ж) Население крайне нуждается в сем. ссуде рожью вследствие градобития, сельсоветом своевременно было возбуждено ходатайство об отпуске таковой, но до сего времени ответа не получено.

з) В настоящее время население нуждается в заработках вследствие недорода хлебов и градобития. Кроме того, в лесоматериалах для построек.

2. Налоговая работа:

а) Поступило сельхозналога к 6 ноября с/г. р. 1462 к. 42, осталось после срока, т. е. после календарного срока, каковой установлен Махновичскому Совету приказом РИКа за № 1 от 5 ноября с/г. — нет.

б) Был местный налог на ремонт школ и общественного здания под канцелярию сельского Совета, общая сумма налога 150 руб. (основания: постановление общего собрания гр. с. Махновичи и х. Заводный Остров). В счет этого налога поступило руб. 17 коп. 75.

в) Ненормальностей при сборе налога не наблюдалось.

г) Комитеты Взаимопомощи при сборе сельхозналога никакого участия не принимали, а ячеек КПБ и КСМ в районе Махновичского сельсовета нет.

3. Народное образование:

а) Школ в районе сельсовета — 2, типа 0 — 3 с тремя учителями, учащихся 115 чел.

б) Детей школьного возраста от 7 до 16 лет 390 душ не посещают школы потому, что имеющиеся 2 школы малы и не могут обслуживать, т. е. вместить в себя всех детей школьного возраста.

в) Изб-читален в районе сельсовета нет, и открыть таковую в настоящее время за неимением помещения нет возможности.

г) Доклады и собеседования всего было — 6 случаев, местными учителями, на тему С. Х. кредит, кооперация, улучшение С. Х. скотоводства, и окружным вет. врачом на тему эпизоотия и борьба с ней. Постановки спектакля не было за неимением помещения.

д) Хорошей постановке в народном образовании до сих пор мешало то обстоятельство, что в районе сельсовета нет хорошо оборудованных школ, т. е. помещений, мебели и учебных пособий, и, кроме того, то обстоятельство, что население района поселено по хуторам и находится на далеком расстоянии от школ. Присланное количество книг составляет 30 % потребного количества. По внешкольному образованию те же обстоятельства, отсутствие хороших помещений, а главное, расселенность по хуторам.

е) Что нужно сделать новому составу сельского Совета в области улучшения народного образования? Принять срочные меры к сбору средств на окончание ремонта школ и мебели, принять срочные меры к получению книг, необходимых для школ, т. к. отпущенное количество учебников удовлетворяет потребности на 30 % таковой. По внешкольному образованию: исходатайствовать необходимый лесоматериал для постройки здания под избу-читальню, будировать население пойти навстречу в этой области, взять на себя постройку здания. Временно до сооружения нового здания под избу-читальню открыть таковую по вечерам в канцелярии сельского Совета. Выписать газеты и журналы.

ж) Поднять работоспособность комитета общественной взаимопомощи, в чем сельсовет должен принять деятельное участие лично.

з) Принять меры по борьбе с винокурением и другими уголовными преступлениями, пчелодерством и пр.

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 72. Воп. 1. Спр. 102—103.

На калектыўную форму гаспадарання

На працягу 1928—1934 гг. ва ўсіх населеных пунктах раёна было арганізавана больш як 100 калектыўных гаспадарак. У некаторых вёсках іх стваралася некалькі, напрыклад, у Слабадзе — 4 (тры калгасы і адзін саўгас), у вёсцы Скрыгалаў — 3, у Мялешкавічах — 2, Прудку — 3.

Значная частка сялян пад уздзеяннем прапаганды і вопыту перадавых калектыўных гаспадарак, якім па магчымасці дапамагала дзяржава, уступала ў калгасы добраахвотна з верай у лепшае будучае. Нават у назвах калгасаў «Светлы шлях», «Новае жыццё», «Уперад», «Наша праўда», «Вольны селянін», «Крыніца камунізма», «За новае Палессе», «Бальшавіцкі змагар», «Прамень Кастрычніка» і іншых выказвалася надзея і ўпэўненасць людзей у светлым заўтрашнім дні.

На Мазыршчыну накіроўваліся прадстаўнікі рабочага класа — дваццаціпяцітысячнікі, арганізатарскі вопыт якіх і пралетарская загартоўка павінны былі дапамагчы ў арганізацыі калектыўных гаспадарак. Добрую памяць пра сябе пакінуў пасланец рабочых Ленінграда П. І. Акуленка. Зімою 1929 г. ён прыехаў у Слабаду. Вывучаў жыццё вяскоўцаў, хадзіў ад хаты да хаты, знаёміўся з жыхарамі, прыглядаўся да кожнага, многа апавядаў ім аб жыцці рабочых. Калі пачаўся агульны сход сялян, школа была перапоўнена. Даступна, зразумела для вяскоўцаў тлумачыў Акуленка значэнне калектывізацыі, паказваў шляхі паляпшэння ўмоў жыцця. Адразу пасля сходу некалькі дзесяткаў слабаджан падалі заявы ў калгас, старшынёю якога выбралі Акуленку. Такімі ж арганізатарамі і кіраўнікамі новых калектыўных гаспадарак былі А. І. Сазонаў (в. Перадрэйка), Г. Е. Кузьменка (в. Бокаў). Вялікі ўклад у калектывізацыю ўнеслі таксама дваццаціпяцітысячнікі М. В. Палхоўскі, П. С. Пашкевіч, Зелікоўскі і іншыя.

Няведанне калектыўнага жыцця, падчас няўмелае кіраўніцтва, сцісłыя і жорсткія тэрміны абагулення сельскагаспадарчага інвентару і ўсёй жывёлы (у тым ліку птушак і парасят) прымушалі разважлівых па натуры сялян з асцярогай адносіцца да калектывізацыі. Часта толькі што створаныя калгасы распадаліся. Адной з прычын гэтага было неабгрунтаванае размеркаванне даходаў, якое ў многіх выпадках ішло не па выніках працы, а па колькасці едакоў. Але калгаснае жыццё з кожным годам усталёўвалася і ўмацоўвалася.

Хлеб дзяржаве. «Чырвоны абоз» са збожжам. 1929

З нашымі поспехамі не маглі мірыцца кулакі. На калгасным полі частымі сталі патравы, нам падкідвалі паперкі з пагрозамі забойства кіраўнікоў калгаса і падпалу новых пабудоў. І гэта былі не пустыя пагрозы. Калі звезлі ў гумно ўраджай, яго падпалілі. Згарэла ўсё калгаснае збожжа, былі і чалавечыя ахвяры — калгаснікі Іван Наўныка і Мікалай Барысенка. Гэта было вялікім нашым горам. Але зноў мы праявілі вытрымку, яшчэ больш згуртаваліся. Ды і дзяржава не пакінула нас у бядзе. Уся маёмасць была застрахаваная, мы атрымалі вялікую кампенсацыю, купілі кармы для жывёлы, а яшчэ і дваццаць кароў, шэсць пар коней. Для калгаснікаў закупілі 250 пудоў мукі, 50 кілаграмаў мяса.

КОММУНИСТИЧЕСКИЙ ОАЗИС

В районе Слободской волости Мозырского уезда есть настоящий оазис — коммуна «Мина». Здесь в 1920 г. глубокой осенью поселилось трое красноармейцев, возвратившихся с фронта. За два года из ничего создано хозяйство, благодаря самоотверженному труду и дисциплине, которая имеется среди членов коммуны. Отношение с крестьянами у коммуны хорошее. Крестьянам нравится жизнь членов коммуны, их усердие в труде, товарищеские чувства, обеды, ужины и завтраки в общей столовой. Крестьяне часто посещали коммуну, члены которой, нуждаясь в рабочей силе, приглашали крестьян поступить в коммуну.

Крестьяне охотно вступили бы в нее, но их останавливает опасение, что будет война с Польшей, могут еще прийти паны и т. п. Слухи эти, особенно в последнее время, среди крестьян существуют. В связи с этим, между прочим, пробудилось у наиболее сознательных крестьян стремление читать газеты, чтобы знать, что творится на белом свете.

От редакции: Нелепые слухи о войне должны рассеиваться членами коммуны.

«Белорусская деревня», 10 лютага 1923 г.

З ДАВЕДКІ ІНСТРУКТАРА АДДЗЕЛА КАЛГАСНАЙ І СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ КААПЕРАЦЫІ НАРКАМЗЕМА БССР Т. Г. ГУЛЬКО ПА ВЫНІКАХ ПРАВЕРКІ СТАНУ КАЛГАСАЎ, АРЦЕЛЯЎ І КАМУН У МАЗЫРСКІМ ПАВЕЦЕ

Не раней 11 красавіка 1923 г.

Согласно выданному мне удостоверению от 11 апреля 1923 года за № 1627, я выехал в Мозырский уезд, где и произвел обследование 9 колхозов, из них две коммуны, и организовал новую артель...

...Артель «Красная зорька» организована в 1921 г., объединяет 5 семейств в числе 19 едоков и крестьян дер. Лешня. Земли артели не отграничены, что является одним из основных тормозов в развитии артели, и сейчас можно сказать, что артель не существует. Но она дает большие надежды на то, что при отводе ей участка будет примерной организацией, так как все члены имеют сильное стремление к артели, и необходимо в этом районе данную организацию удержать. Главным тормозом в ее развитии является Скрыгаловское лесничество. Намеченный в 1921 г. участок под артель ныне большей своей частью находится в пользовании единоличных крестьян, а против пользования артелью лесничество протестует. Лесное управление Наркомзема, пожалуй, неправильно информировано...

Состав артели довольно социальный и вполне подходящий, в данное время очень осторожно подходит к приему новых членов...

Живой инвентарь в артели следующий: лошадей три, рабочих быков 1, телят 3, овец 11 и свиней 6. Мертвый инвентарь и земледельческие орудия также имеются, в данное время приняты меры к перевозу построек на артельный участок, уже поставлен один дом...

Артель «Сила» организована в марте 1922 г. из местных крестьян, объединяет 9 семейств в числе 37 едоков. Организаторами были два крестьянина Ильюки, один из них член совета, а другой — председатель.

Земля отграничена в числе 71 дес., в т. ч. луга 15 дес. 23 саж. Живой инвентарь следующий: лошадей 4, рабочих быков 4, коров 7, телок 5, бычков 1, телят 5, овец 39, свиней 29. Земледельческие машины и орудия имеются, на полученный инвентарь вместе с усадьбой имения Прудок мной составлена опись. При организации артели был следующий живой инвентарь: лошадей 3, рабочих быков 2, коров 6, телят 3, свиней 4, овец 12. Живой инвентарь, введенный при вступлении в артель, в данное время заменен, теперь артель имеет хороших лошадей и лучший скот. Посевы следующие: ржи озимой 10 дес., пшеницы яровой 2 дес., ячменя 1 дес., овса 3 дес., гречихи 10 дес., картофеля 8 дес., огорода 3 дес., а в 1922 г. всего посева было 11 десятин...

Тип хозяйства скотоводческо-зерновой, севооборот 4-польный. Ведется отчетность, хотя и не формальная, но все же имеются записи прихода и расхода, имеются кассовая и продуктовая книги, отсутствует книга инвентарная...

Зимой текущего года группой членов артели в числе пяти семейств был произведен опыт общего питания в течение 3-х месяцев, в результате сэкономили до 45 пудов ржи, в данное время общее питание прервано ввиду отсутствия котлов и кухни. На усадьбе артели имеется мельница и крупорушка...

Коммуна «Мина» организована в д. Хомички в 1921 г., организатором ее был демобилизованный красноармеец т. Ратушняк. Объединяет 8 семейств в числе 23 едоков, при организации была группа из 4-х демобилизованных красноармейцев, которые объединили свое имущество и стали организовывать хозяйство. В настоящее время имеется следующий живой инвентарь: лошадей 5, жеребенок 1, коров 6, телок 5, бычок 1, свиней 18, поросят 34, овец 2...

В хозяйстве отсутствует план севооборота ввиду того, что нет навоза и почва истощена, а засевы производятся кусками, где лучшая земля. В коммуне нет членов, которые хорошо бы знали сельское хозяйство, отчетность не заведена и нет никаких книг для этой цели.

Внутренняя спайка членов в коммуне великолепная, жизнь построена на взаимном доверии; председатель коммуны т. Ратушняк пользуется большой репутацией как среди членов коммуны, так и между окрестным населением...

Колхозно-кооперативное строительство в Белорусской ССР (1917—1927). С. 179.

АРГАНІЗАЦЫЯ І АПЛАТА ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ МАЗЫРСКАГА РАЁНА

З матэрыялаў праверкі за люты 1930 г.

Сельгасарцель «Колас Кастрычніка» (в. Міхалкі). Нормы выпрацоўкі — здзельшчына, стаўка I разраду — 55 к., авансы выдаюцца ў размеры 50 % грашыма і прадуктамі. Правілы ўнутранага распарадку ўведзены. Дысцыпліна ў калгаснікаў слабая, ёсць выпадкі нявыхаду на работу. Бюро працы арганізавана, але не працуе. Табель работ вядзецца, вытворчыя нарады не праводзіліся. Сацспаборніцтва адсутнічае.

Сельгасарцель «Серп і Молат» (в. Барбароў). Нормы выпрацоўкі ўведзены, але ў жыццё не праводзяцца, стаўка I разраду — 75 кап. Правілы ўнутранага распарадку прыняты. Выхад на працу ўзорны, па званку. Брыгадны парадак не прывіваецца, вытворчыя нарады не практыкуюцца. Выдача авансу праводзіцца без сістэмы, прадукты выдадзены калгаснікам да новага ўраджаю, на дзяцей выдаецца 25 % да заработку. Запазычанасць па зарплаце дасягае 300—350 руб. у год на сям'ю. Сацспаборніцтва адсутнічае.

Сельгасарцель «Ільіч», яўрэйскі (в. Рэдзька). Існуе падзёншчына — 1 руб. 50 кап., працадзень. Праца падлеткаў аплачваецца 90 кап. Брыгадны парадак не існуе, адыходніцтва займае 40 % мужчынскай рабочай сілы. Працоўная дысцыпліна адсутнічае, меліся выпадкі нявыхаду на працу.

Сельгасарцель «Новы свет» (в. Белая). Работа ў калгасе выконваецца ўсімі калгаснікамі дружна, уведзены разрады. Нормы выпрацоўкі не ўведзены. Калгас не землеўпарадкаваны, настрой у калгаснікаў дрэнны.

Сельгасарцель «Рухавік Рэвалюцыі» (в. Булаўкі). Па арганізацыі працы амаль што нічога не зроблена, бюро працы і вытворчыя нарады не працуюць, брыгады не арганізаваны. Правілаў унутранага распарадку няма, вытворчыя нарады не праводзяцца.

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 174. Воп. 1. Спр. 39. Л. 284.

ПРАТАКОЛ № 1
агульнага сходу грамадзян вёскі Васькаўка ад 3.1.1931 г.

Парадак дня:

Аб суцэльнай калектывізацыі в. Васькаўка. Дакладчык Паўлаў.

Пытанні да дакладчыка. Усяго больш 30 пытанняў. Частка з іх: На якіх умовах атрымліваюць сродкі працаздольныя? Ці можа наша зямля даць добры ўраджай без жывёлы? Што рабіць, калі ў сям'і ўсе непрацаздольныя, акрамя 1 чалавека? Як будзе пабудаваны калектыў? Ці змогуць жанчыны добра жыць паміж сабою, як будуць даваць прадукты сябрам калектыву? Што рабіць тады, калі адна цётка не жадае працаваць, ці другой прыйдзецца за яе працаваць? Ці дазваляць у калектыве святкаваць рэлігійныя святы? Ці заставацца членам калектыву жыць у сваіх хатах, або для іх будзе агульная?

Якую зямлю дадуць тым сялянам, якія не захочуць уступіць у калектыў і ў якіх адбяруць цяперашнюю зямлю? Калі хто захоча працаваць у выхадныя дні ці святы, ці будуць за гэта асобна плаціць? З колькіх чалавек можна арганізаваць калектыў? Ці ўсе жанчыны будуць выходзіць на работу ў адзін дзень і час? Як будзе ў калгасе з гультаямі? Ці з'яўляецца швейная машынка ўласнасцю члена калгаса? Ці можна будзе за дзяржаўны кошт выхоўваць дзяцей? Ці не прыйдзецца і ў калгасе плесці лапці? Ці мае права калектыў адной вёскі заняць зямлю ў другой вёсцы? Калі ў нашым калектыве будзе недахоп сродкаў, дзе іх возьмуць? Па колькі гадзін будуць працаваць у калектыве ў сезонны час? Якія падаткі будуць для калгаснай гаспадаркі? Ці прымуць кулакоў у калгасную гаспадарку? Як будзе размяркоўвацца праца і кім?

Спрэчкі:

Арцішэнка — гаварыў аб тым, што кулакі выдумваюць, што ў калектыве дрэнна жывуць, нічога не будуць за працу атрымліваць. А нам, бедным, трэба ісці туды.

Мішота Павел — аб тым, што пры ўступленні ў калектыў прыходзіцца сварыцца з жонкаю, якая хоча жыць самастойна.

Лузан Васіль — аб тым, што беднякам, батракам і маламоцным сераднякам неабходна ўступаць у калгас.

Лузан Домна — можа, у калектыве палепшыцца доля жанчыны.

Пастанавілі: Арганізаваць калгас у в. Васькаўка пад назвай «Чырвоны круг».

Галасавалі: За — 35, супраць — няма.

У склад праўлення абраць т. Мішоту Паўла, Жыльскага Піліпа, Лузана Васіля, Інавера Лявона, Шута Рыгора. Старшынёй — Інавера Лявона.

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 72. Воп. 1. Спр. 240. Л. 3—5.

З ПРАТАКОЛА № 1 ПАСЯДЖЭННЯ ПРЭЗІДЫУМА МЯЛЕШКАВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТА АД 30 СТУДЗЕНЯ 1930 г.

Павестка дня:

Аб раскулачванні кулака і высяленні некаторых кулацкіх гаспадарак.

Пастанавілі: Ліквідаваць кулака як клас... Прызнаць кулакамі і выселіць М. Качэню, Голіка, Я. Гусака, С. Бандарэнку, С. Цімохава, С. Долгага, Я. Дубаўца, У. Жыльскага.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ГРУПЫ БЕДНАТЫ МЯЛЕШКАВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТА АД 10 СТУДЗЕНЯ 1931 г.

Слухалі: у гаспадарцы П. І. Бегляка ёсць прыбытак ад двух кватарантаў у 1929 г. у суме 190 рублёў, у 1930 г. з пяці вучняў ён браў па 5 рублёў за месяц, а ўсяго за пяць месяцаў — 125 рублёў. Такім чынам з кватарантаў узята 365 рублёў... Ён жа наймаў рабочую сілу для копкі бульбы і на час сенакосу, усяго каля 50 дзён у годзе.

Пастанавілі: прызнаць гаспадарку П. І. Бегляка кулацкай.

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 50. Воп. 1. Спр. 140. Л. 201.

ВОПІС МАЁМАСЦІ КУЛАКА АСТРЭЙКІ ПЯТРА С. З в. РАМАНАЎКА, ПЕРАДАДЗЕНАЙ КАЛГАСУ «ЛЕНІНАЎКА» 19.2.1930 г.

Хата 9×8 м — 1, сені 10×8 м — 1, хлявы — 2, сцёбка — 1, хлеў развалены — 1, гумно — 1, конь — 1, каровы — 2, валы — 2, бычкі — 3, авечкі — 3, ягняты — 2, свінні — 5, вазы — 2, плугі — 1, воз стары — 1, барана жалезная — 1, салома — 15 пудоў, сена — 10 вазоў, кулёў — 73 шт., малатарня ручная — 1, вуллі-калоды з пчоламі — 2, вуллі без пчол — 13, яблыні — 3, грушы і прышчэпкі — 10, дошкі — 32 шт., сенавал — 1, жыта — 96 пудоў, грэчка — 14 пудоў, авёс — 6 пудоў, ячмень — 3 пуды, проса — 1 пуд, пшаніца — 1 пуд 10 фунтаў, бульба — 2 капцы, семя канопляў — 13 фунтаў, семя льну — 25 фунтаў, вотруб'е — 2 пуды 20 фунтаў, мука жытняя — 6 пудоў, грэцкая мука — 3 пуды, аўчыны — 3 шт., бочкі вялікія — 7 шт., бочкі малыя — 4 шт., піла папярочная — 1, розных іншых рэчаў — 22.

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 80. Воп. 1. Спр. 226. Л. 35.

ЗВЕСТКІ АБ КАНФІСКАВАНАЙ МАЁМАСЦІ Ў КУЛАЦКІХ ГАСПАДАРКАХ МАХНАВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТА

	коней, штук	рабочых валоў, штук	рагатай жывёлы, штук	маладняка раг. жывёлы, штук	насення, пудоў	с/машын	інш. рэчаў	авечкі і свінні, штук	агульны кошт у руб.
1. Сельвіч Фёдар Самсонаў	1	—	3	6	24	2	22	11	632 р. 80 к.
2. Гольдман Нохім Вульфавіч	1	—	2	—	2	—	23	—	512 р. 40 к.
3. Гольдман Янкель Вульфавіч	1	—	2	2	2	8	8	—	342 р. 40 к.
4. Хлістун Пётр Міронавіч	—	2	2	3	44	3	17	7	829 р. 80 к.
5. Заяц Апанас Сямёнавіч	—	2	2	3	20	—	7	11	405 р. 00 к.
6. Хлістун Алесь Андрэевіч	2	—	5	3	62	2	15	14	786 р. 40 к.
7. Капыловіч Пётр Сіліч	2	—	2	3	33	—	7	15	649 р. 60 к.
8. Капыловіч Анціп Сцяпанавіч	1	3	4	2	43	3	14	22	905 р. 60 к.
9. Машчыц Алесь Раманавіч	3	3	4	5	64	—	10	19	905 р. 80 к.
10. Вягера Янка Агеевіч	2	2	3	3	19	—	14	9	564 р. 40 к.
11. Заяц Яўстрат Гаўрылавіч	1	2	6	9	29	—	9	27	1084 р. 80 к.
12. Заяц Анупрэй Мікалаевіч	1	—	5	1	16	1	7	18	579 р. 20 к.
13. Высоцкі Лука Дзмітрыевіч	3	2	6	4	11	3	8	20	1076 р. 50 к.
14. Капыловіч Янка Сіліч	2	—	5	9	35	—	7	19	712 р.

Старшыня сельсавета (подпіс)

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 72. Воп. 1. Спр. 61. Л. 19.

У паход супраць непісьменнасці

Згодна з дэкрэтам і дэкларацыяй Усерасійскага выканаўчага камітэта ад 16 кастрычніка 1918 г., усе школы, якія існавалі ў дарэвалюцыйны час (земскія, царкоўнапрыходскія, гімназіі, хедары і іншыя) замяняліся адзінай працоўнай школай. Яна падраздзялялася на школу першай (I — VII класаў) і другой (VIII — IX класаў) ступеняў. Сямігодка — асноўная агульнаадукацыйная школа. Яна магла існаваць як у поўным складзе, так і ў выглядзе асобных канцэрнаў. Першы канцэрн сямігодкі (0 — III класы) даваў пачатковую адукацыю, другі (IV — VII класы) — агульнаадукацыйная школа.

Справу адукацыі ў цяжкія пасляваенныя гады даводзілася пачынаць з нуля. Настаўнік Махнавіцкай школы Адам Якаўлевіч Дарашэвіч у дакладной запісцы раённаму кіраўніцтву пісаў: «Школа адкрыта ў 1904 г. земствам. Да 1920 г. размяшчалася ў наёмнай кватэры, затым пад школу адышоў дом былога маёнтка. У час грамадзянскай вайны белапалякамі і балахоўцамі знішчана амаль уся школьная маёмасць. Няма ні школьнай шафы, ні класных сталоў, ні класнай дошкі. Вучнёўскія парты сапсаваны, засталося ўсяго 18 двухмесных парт. Кніг для чытання таксама няма. Школу неабходна забяспечыць падручнікамі па гісторыі, рускай і краявой, прыродазнаўстве і геаграфічнымі картамі. У канцы мінулага года было ўсяго 85 вучняў, хлопчыкаў 74, дзяўчынак 6». Такое становішча было характэрным практычна для ўсіх школ горада і павета.

Да 1924 г. у Мазыры працавалі чатыры школы, у тым ліку дзве поўныя і дзве няпоўныя сямігадовыя, у якіх займалася 1350 вучняў, чвэрць з іх дзяўчынкі, і працавала 40 настаўнікаў. На тысячу душ насельніцтва ў горадзе вучылася 197 чалавек, у мястэчках 140, у вёсцы — 80 чалавек.

У раёне (у сучасных межах) існавала 37 школ, з якіх 26 былі аднакамплектныя, 7 — двухкамплектныя і 1 — трохкамплектная. Працавала на сяле 48 настаўнікаў. Школы адкрываліся ва ўсіх вёсках, дзе былі ўмовы — неабходная колькасць дзяцей, памяшканне.

Выпуск Слабадской школы. 1931

Працавалі школы ў вёсках Пянькі, Рэдзька і іншых.

Дзяржаўнымі мовамі ў 20-я гады ў Беларусі лічыліся 4 мовы — беларуская, руская, польская і яўрэйская, а навучанне ў школах вялося на 8 мовах.

Паводле Усесаюзнага перапісу 1926 г. у Мазыры жыло 4666 мужчын і 4957 жанчын, з іх адукаванымі адпаведна лічыліся 3527 і 3333.

Беларусізацыя школ ішла паступова. Напрыклад, у мазырскіх школах у 1924 г. выкладанне на беларускай мове пачыналася з малодшых класаў, у старэйшых навучанне ішло на рускай мове, а беларуская вывучалася як адзін з прадметаў. Да 1928 г. 80 працэнтаў школ рэспублікі былі беларускамоўнымі.

Валоданне беларускай мовай было абавязковым для кожнага дзяржаўнага служачага. Яны здавалі экзамен па веданні мовы. Даваўся час на яе вывучэнне, праводзіўся паўторны экзамен. Калі чалавек і ў другі раз не здаваў экзамен, яго вызвалялі з работы. У аддзелах народнай адукацыі прадугледжваліся работнікі, якія б ведалі польскую, яўрэйскую і іншыя мовы, на якіх вялося навучанне ў школах.

Вырашалася і праблема ліквідацыі непісьменнасці дарослага насельніцтва. Па звестках на 1 студзеня 1925 г. колькасць непісьменных па Мазырскім раёне складала 3294 чалавекі. Для ліквідацыі непісьменнасці адкрываліся школы рабочай моладзі і школы для дарослых. У сярэдзіне 20-х гадоў у Мазыры ў такіх школах навучалася 120 чалавек, з іх 90 вучылася ў школе на фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік». У 1927/28 навучальным годзе працавалі і тры апорныя пункты ліквідацыі непісьменнасці. Гэта работа актывізавалася ў 1929 г., калі было створана таварыства «Прэч непісьменнасць».

Школы па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых (лікбезы) былі арганізаваны практычна ва ўсіх населеных пунктах раёна. Для стварэння ячэек таварыства «Прэч непісьменнасць» у вёсках праводзіліся сходы насельніцтва. 5 снежня 1929 г. на сходзе ў Бібіках у ячэйку таварыства запісаліся 33 чалавекі. Заняткі праводзіліся тры разы ў тыдзень — у аўторак, сераду і пятніцу. Праводзілі іх настаўнікі Бібікаўскай школы.

У 20-я гады кожны год заканчвалі школу лікбеза каля 150 жыхароў раёна. Усяго атрымалі веды па пісьму, чытанні, арыфметыцы і іншых прадметах больш за 3000 чалавек. Настаўнікі патрабавалі ад навучэнцаў сур'ёзных адносін да вучобы. На экзаменах выпускнога класа лікбеза пры Слабадской школе выпускная камісія атэставала 17 чалавек, 12 пакінула на паўторны год навучання.

У 1924 г. урад Беларусі прыняў пастанову аб развіцці школьнай сеткі, каб на працягу дзесяці гадоў ажыццявіць усеагульную пачатковую адукацыю і пачаць пераход да сямігадовай. Ствараліся пачатковыя школы з разлікам на 100 вучняў — 50 на настаўніка. У цэнтрах сельскіх Саветаў будаваліся сямігадовыя школы на 320 вучняў. Гэтая пастанова мела важнае значэнне і для Мазырскага раёна, дзе школьным навучаннем было ахоплена толькі 2379 дзяцей, або 60 працэнтаў.

Былы настаўнік М. І. Варабей расказвае аб радасці сялян Стрэльска, калі ў 1932 годзе тут была адкрыта пачатковая школа. Яна мела два класныя пакоі, у кожным заняткі вёў настаўнік з двума класамі. Вучыліся дзеці ва ўзросце 8—12 гадоў.

Першая ў сельскай мясцовасці сямігодка была адкрыта ў 1924 г. у Слабадзе, дзе вучыліся дзеці з 10 населеных пунктаў. Затым гэтая школа ў 1936 г. была пераўтворана ў сярэднюю. Першы яе выпуск адбыўся ў 1939 г. З цягам часу такія школы былі адкрыты ва ўсіх цэнтрах сельскіх Саветаў. Дзеці пасля пачатковай школы ахвотна ішлі ў пяты клас сямігадовай школы, хоць многім прыходзілася пераадольваць па 10—20 кіламетраў. Хадзіць пешшу ў сямігадовыя школы было звычайнай з'явай.

У 1932/33 навучальным годзе Савет народных камісараў БССР прыняў рашэнне аб абавязковай сямігадовай адукацыі. У верасні 1939 г. у 10 сярэдніх і няпоўных сярэдніх школах Мазыра вучылася 3547 школьнікаў.

Акрамя агульнаадукацыйных школ у Мазыры працавалі спецыяльныя навучальныя ўстановы. У 1923 г. была адкрыта прафесійная школа па дрэваапрацоўцы, у 1926 г. — педагагічны тэхнікум, у 1937 г. — медыцынскае вучылішча.

Яскравай была статыстыка і культурных пераўтварэнняў. З 1935 г. працаваў калгасна-саўгасны тэатр, у 1938 г. ён быў рэарганізаваны ў Палескі абласны драматычны тэатр. Было 15 клубаў, гарадская бібліятэка, а таксама некалькі бібліятэк на прадпрыемствах. Ва ўсіх буйных населеных пунктах — Асаўцы, Глініцы, Скрыгалаве, Слабадзе, Міхалках, Мялешкавічах і іншых былі адкрыты хаты-чытальні. У Міхалках, Скрыгалаве, Мялешкавічах створаны духавыя аркестры.

З мая 1921 г. пачала выходзіць гарадская, а затым аб'яднаная газета, з 1938 па 1953 г. выдавалася абласная газета «Бальшавік Палесся». На кожным прадпрыемстве і ў калгасе выходзілі насценныя газеты. У Мазыры з 1932 г. працаваў кінатэатр, сельскіх жыхароў абслугоўвалі тры перасоўныя кінаўстаноўкі.

М. Капач, М. Мельчанка

Мазыршчына ў рыштаваннях

У 30-я гады горад і раён нагадвалі вялікую будаўнічую пляцоўку: узводзіліся новыя карпусы прамысловых прадпрыемстваў, будаваліся жылыя дамы і ўстановы. У кожнай вёсцы таксама

ішло будаўніцтва школ, магазінаў, клубаў, хат-чытальняў, гаспадарчых калгасных пабудоў. У гады даваенных пяцігодак уведзена ў дзеянне Мазырская ГЭС (пасёлак чыгуначнай станцыі Мазыр), якая забяспечыла электраэнергіяй прамысловыя прадпрыемствы і камунальныя патрэбы горада і многіх прыгарадных калгасаў. За дваццаць гадоў у Мазыры пабудавана 500 жылых дамоў і грамадскіх пабудоў, сярод іх гарадскі тэатр, пошта, выканкамы гарадскога, раённага і абласнога Саветаў, будынкі абкама партыі, Дома абароны, гарадской паліклінікі, школ, дзетсадоў-ясляў, рачнога вакзала.

Мянялася і аблічча вясковых населеных пунктаў. Ліквідоўваліся хутары, яны сцягваліся ў вёскі. Усяго па раёне былі перавезены на новае месца 402 хутары. У вёсках паявіліся новыя, прамыя, правільна спланаваныя вуліцы.

Пачалося наступленне на балоты. Каля вёсак Лешня, Скрыгалаў, Раманаўка, Мялешкавічы з'явіліся асушаныя і асвоеныя землі.

У 30-я гады цэнтры сельсаветаў і калгасаў звязала з раёнам тэлефонная сувязь. У вёсках Асавец, Скрыгалаў, Слабада, Казіміраўка, Прудок, Міхалкі, Мялешкавічы былі адчынены аддзяленні сувязі. У той жа час у Мазыры ўступіў у эксплуатацыю прыёмна-трансляцыйны радыёвузел. Для многіх вясковых клубаў і школ набыты радыёприёмнікі.

У 1928 г. у горадзе было два легкавыя аўтамабілі і два аўтобусы, з якіх адзін паштовы, а ў сярэдзіне 30-х гадоў быў адкрыты рэгулярны рух пасажырскіх аўтобусаў, якія звязвалі Мазыр з Калінкавічамі, пасёлкам чыгуначнай станцыі Мазыр, Нароўляй і іншымі буйнымі населенымі пунктамі Палесся.

У 1939 г. у раёне налічвалася 70 калгасаў, якія аб'ядналі больш за 15 тысяч сялянскіх двароў. Павялічвалася колькасць грамадскай жывёлы на калгаснай ферме, расла ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур. Калгаснікі змагаліся за атрыманне ўраджаю збожжавых 12—13 цэнтнераў з гектара, бульбы — 150—170, пянькі і льновалакна — 4—5 цэнтнераў.

Т. Нікіціна, Т. Піліпчук

ТЭЛЕФАНАГРАМА ДНЕПРАДЗВІНСКАМУ ПАРАХОДСТВУ І БАСЕЙНАВАМУ КАМІТЭТУ РАЧНІКОЎ

18 красавіка 1936 г.

Сегодня ровно в 9 часов вышел в стахановский рейс на Киев товаропассажирский пароход «Беларусь». Машинная команда во главе с механиком Гойловым взяла обязательство хорошей работой машины обеспечить прибытие парохода в Киев на 20—30 минут раньше расписания... Команда парохода обратилась с призывом к стахановцам фабрики «Красный Октябрь», которая является главным поставщиком грузов (фанеры) для перевозки водным путем, своевременно обеспечить доставку грузов на пристань. Стахановцы фабрики горячо откликнулись на призыв, выделили специальную стахановскую бригаду грузчиков и автобригаду. Вместо обычной доставки фанеры утром она была доставлена в 2 часа ночи. Это дало возможность погрузить пароход раньше срока на 8 часов.

Руководство порта Пхов

«Белорусский фарватер», 18 красавіка 1936 г.

«УСЕ РАЁНЫ БССР» СА СТАТЫСТЫЧНАГА ЗБОРНІКА БССР 1933 г.

Мазырскі раён

Бліжэйшая чыгуначная станцыя — Мазыр (6 кіламетраў), другая станцыя Калінкавічы (14 кіламетраў). Раён падзяляецца на 32 сельсаветы, 2 гарсаветы. Агульная тэрыторыя — 305 532 га, у тым ліку зямель сельскагаспадарчага прызначэння — 63,8 %, лясоў — 35,4 %; сельскагаспадарчага прызначэння ўжыткоўнай — 87,8 %, неўжыткоўнай — 12,2 %.

Насельніцтва на 1.1.1933 г. — 110 925 чалавек.

У 1931 г. існавала 168 прадпрыемстваў з агульнай колькасцю рабочых 2589 чалавек: электрастанцыі — 2, кузняў — 29, кавальскіх арцеляў — 3, камбінат — 1, бляшана-рамонтная арцель — 1, смалакурная арцель — 1, цагельных заводаў — 7, чарапічных заводаў — 2, вапняных — 1, лесазаводаў — 3, лесакамбінат — 1, фанерны завод — 1, фабрыка унітазаў — 1, лубяных вырабаў — 2, бандарная арцель — 1, лазапляцельная арцель — 1, тэкстыльная арцель — 1, ваўначосак — 4, сукнавалак — 2, сушылка — 1, рымарная арцель — 1, лучыначная — 1, шавецкіх — 4, кравецкіх — 6, панчошная арцель — 1, фарбавальня — 1, мэблевых арцеляў — 2, друкарня — 1, млыноў паравых — 14, конных — 3, ветракоў — 46, крупарушак — 7, вадзяных млыноў — 3, маслабойняў — 4, бойня — 1, хлебазаводаў — 2, кандытарская арцель — 1, крухмальных заводаў — 2, завод фруктовых вод — 1, харчовая арцель — 1, водаправодная арцель — 1, водаправод — 1.

У 1932 г. у раёне налічвалася 177 прамысловых прадпрыемстваў з колькасцю рабочых 3803.

Асноўныя прадпрыемствы раёна: электрастанцыя — 25 рабочых, валавы прыбытак 66,6 тыс. руб. у 1932 г., арцель «Молат» — 56 рабочых, валавы прыбытак 199,0 тыс. руб., цагельны завод (34 і 38,9), Белхімлес, здабыча жывіцы (108 і 29,8), цагельная арцель будаўнікоў (31 і 41,8), шпалярэзны завод (38 і 93,9), лесапільны завод «Пралетарый» (310 і 1060,9), фанерны завод «Чырвоны Кастрычнік» (427 і 1157,5), саматужная арцель «Чырвоны тэкстыльшчык (175 і 221,3), шавецкая арцель «Уперад» (61 і 156,2), шавецкая арцель «Чырвоны Кастрычнік» (81 і 252,9), дрэваапрацоўчая фабрыка «Прафінтэрн» (259 і 406,3), крухмальны завод у в. Прудок (10 і 68,7).

Спажыўкааперацыя мела 20 сельпо з гандлёвай сеткай 72 адзінкі, пайшчыкаў — 20 958 чалавек.

Выяўлены карысныя выкапні: гліны — в. Нагорны Бераг, пяскі — вв. Гурыны, Барыскавічы, г. Мазыр, фасфарыты — г. Мазыр, жалезнякі — вв. Прудок, Антонаўка, Слабада, Бярозаўка.

Саўгасаў у раёне — 3: «Ліпава» з малочна-жывёлагадоўчай спецыялізацыяй (2474 га і 207 рабочых), «Молатава» (1166 га і 161 рабочы), «Слабада» з насенняводчай спецыялізацыяй (1299,3 га і 191 рабочы).

Прыгарадных гаспадарак — 4, з іх фермаў — 3 (2201 га і 182 рабочыя).

У раёне маецца 14 664 гаспадаркі, з якіх на 1.1.1933 г. калектывізавана 5650 — 38,5 %. Калгасаў 150, якія па плошчы ворыва займаюць 31,2 %. У калгасах маюцца фермы: жывёлатаварных — 43 з агульнай колькасцю пагалоўя 2386, малочнатаварных — 28 з пагалоўем 2872, па вырошчванні маладняку — 25 з пагалоўем 1286, конегадоўчых — 1 з пагалоўем 30.

У калгасах маецца складаных сельскагаспадарчых машын: сенакасілак — 40, конных грабляў — 79, жняярак-самаскідак — 90, снопавязалак — 8, бульбакапалак — 10, сеялак радковых — 80, трактароў — 5, складаных малатарняў — 6.

Пасяўная плошча ў 1932 г. складала 65 731 га, у тым ліку: збожжавых — 71,4 %, бульбы — 16,5 %, тэхнічных культур — 5,9 %, траў — 3,2 % і інш. — 3 %. Нарыхтоўкі на 1.2.1933 г. (у тонах): збожжавыя — 781, бульба — 5856, ільновалакно — 87, пянька — 44, ільнасемя — 177, каноплі — 112, салома — 1016, сена — 1094.

У раёне маецца 1 МТС, 36 трактароў, МТС абслугоўвае 50 калгасаў.

Сетка навучальных устаноў на 1.1.1933 г.: тэхнікумаў — 1 (Белпедтэхнікум), настаўнікаў — 12, студэнтаў — 165; ФЗС — 1, настаўнікаў — 12, вучняў — 608; сямігодак — 36, настаўнікаў — 248, вучняў — 8044; чатырохгодак — 98, настаўнікаў — 185, вучняў — 9047; каапшкола, настаўнікаў — 4, вучняў — 153; прафшкола — 1, настаўнікаў — 6, вучняў — 185. Працэнт пісьменнасці ў раёне — 86.

Выдаецца раённая газета «Калгаснік Мазыршчыны», тыраж — 4900 экз. Арганізаваны палітаддзел пры МТС.

Партарганізацыя раёна аб'ядноўвае 60 ячэек, камуністаў 1012, з іх членаў ВКП(б)Б — 616, кандыдатаў — 396; камсамольская арганізацыя — 89 ячэек, 1279 камсамольцаў.

Сцежкамі роднага краю

Аляксандр Іосіфавіч Крукоўскі нарадзіўся 23.2.1901 г. у вёсцы Загалле Ляскавіцкай воласці (цяпер Петрыкаўскі раён) у мнагадзетнай сялянскай сям'і. Хлопчыкам пасвіў жывёлу ў мясцовых багацеяў, а дарослага яго чакалі плуг, каса, сявенька... Яго чакаў звычайны лёс селяніна. Толькі хлопца з малых гадоў не пакідала неадольная цяга да кнігі, да вучобы.

Пачатковую адукацыю Аляксандр Крукоўскі атрымаў у Загальскай царкоўнапрыходскай школе. Самастойна падрыхтаваўся і паступіў у Слуцкую духоўную семінарыю — там вучылі за казённы кошт. Семінарыю скончыў з адзнакай, але святаром не стаў — марыў аб педагагічнай рабоце.

У 1919 г. Крукоўскі настаўнічаў у роднай вёсцы. Потым уладкаваўся ў Мазыры, выкладаў беларускую мову і літаратуру ў сямігадовай школе № 2, чытаў лекцыі на курсах перападрыхтоўкі настаўнікаў, некаторы час (з 1923 г.) займаў пасаду інспектара выхавання пры акруговым аддзеле народнай асветы.

У Мазыры А. І. Крукоўскі стаў ініцыятарам краязнаўчага руху. Узначаліў праўленне акруговага таварыства краязнаўства, якое хутка стала лепшым у рэспубліцы. У 1928 г. таварыства налічвала 30 мясцовых краязнаўчых аб'яднанняў (10 раённых таварыстваў, 11 школьных гурткоў і 18 гурткоў пры сельсаветах) з 1103 членамі.

Мясцовыя краязнаўчыя аб'яднанні займаліся выяўленнем і рэгістрацыяй здабыткаў матэрыяльнай і духоўнай культуры Мазыршчыны, даследаваннем і апісаннем прыроды і населеных пунктаў, адкрыццём музеяў, розных выставак і метэаралагічных станцый, наладжваннем экскурсій, лекцый. Яны падзяляліся на тры секцыі: прыродна-геаграфічную, грамадска-эканамічную і культурна-гістарычную. А. І. Крукоўскі накіроўваў і кантраляваў дзейнасць секцый, вёў вялікую даследчую работу. Выступаў у мясцовым і рэспубліканскім друку з артыкуламі аб карысных выкапнях на тэрыторыі Мазырскай акругі. Асабліва многа ўвагі ўдзяляў даследаванню вуснай народнай творчасці і матэрыялаў для геаграфічнага і дыялектнага слоўнікаў.

У рэспубліканскім друку ў тыя гады паведамлялася: «У справе збірання народнай творчасці з усіх акруговых краязнаўчых таварыстваў звяртае на сябе ўвагу Мазырскае, на чале якога стаіць т. Крукоўскі, сваім сталым, сур'ёзным падыходам да справы». «...Мазырская акруга з'яўляецца адзінай акругай у сучаснай Беларусі, дзе збіранне вуснай народнай творчасці ахапіла ўсе раёны акругі. Кіраўнік Мазырскага акруговага таварыства краязнаўства Крукоўскі прыцягнуў да збірання фальклорнага матэрыялу шмат асоб, пераважна настаўнікаў, якія сабралі 518 запісаў народнай творчасці».

А. І. Крукоўскі сабраў звыш трох тысяч дыялектных слоў і выразаў, а ўсяго да канца 1927 г. праўленне акруговага таварыства мела картатэку з 20 135 лексічных адзінак жывой мовы. На жаль, друкаванне слоўніка было адкладзена, рукапіс яго ў Вялікую Айчынную вайну згарэў... Загінулі і іншыя багатыя матэрыялы аб асаблівасцях мазырскіх гаворак, сабраныя мясцовымі краязнаўцамі пад кіраўніцтвам А. І. Крукоўскага.

У 1928 г. Мазырскім акруговым таварыствам краязнаўства было таксама зроблена поўнае дыялекталагічнае апісанне звыш 50 вёсак Мазырскай акругі з ілюстраваннем гэтага апісання слоўнікавым і фальклорным матэрыялам, выяўлена каля 400 мясцовых батанічных тэрмінаў.

У чэрвені 1930 г. А. І. Крукоўскі быў прызначаны намеснікам дырэктара Інстытута геалогіі і гідрагеалогіі Акадэміі навук БССР. На новай пасадзе з уласцівай яму самаадданасцю вучоны заняўся даследаваннем прыродных рэсурсаў Беларусі.

Некаторы час А. І. Крукоўскі зай-

маў пасаду дырэктара Інстытута геалогіі і гідрагеалогіі АН БССР. Потым ён быў звольнены з Акадэміі навук — рэпрэсіі не абмінулі і яго.

Памёр А. І. Крукоўскі 2.8.1945 г.

І. Германовіч

Адна з краязнаўчых прац А. Крукоўскага другой паловы 20-х гадоў — «Горад Мазыр і яго ваколіцы». Урывак з яе (з захаваннем моўных нормаў і назваў вуліц таго часу) прыводзіцца ніжэй.

Вуліцы Мазыра

У горадзе 17 вуліц: Ленінская (былая Пакроўская), Новае Страенне, Свідоўка, Розы Люксембург (былая Слуцкая), Слуцкая Набярэжная, вул. Лекерта (былая Мікалаеўская), Аляксандраўская, вул. Камсамольская (былая Замкавая), Гара Камунараў (былая Спаска-Замкавая і Спаская), вул. Карла Лібкнехта (былая Кіеўская), вул. Жытомірская, Кіеўская Набярэжная, вул. Калініна (б. Калінік), Нагорная, Першая Пралетарская (б. Пятніцкая), вул. доктара Саета (б. Рамашоў Роў); завулкаў — пяць: Гімназічны, Камсамольскі (б. Свята-Міхайлоўская вуліца), Лекерта (б. вул. Мала-Мікалаеўская), Кіеўскі, Праразны завулак. Адзін пляц, які мае назву Плошча Свабоды (б. Базарная).

Будуецца новая частка горада, якая мае назву Рабочы гарадок. Прыгарадамі з'яўляюцца: Кімбараўка (яна часта завецца Кімбараўскай вуліцай), Салаўёўка і хутар Цяляпуны, каля якога знаходзіцца фабрыка «Чырвоны Кастрычнік».

Брукаваныя толькі наступныя вуліцы: Новае Страенне, Ленінская, Аляксандраўская, Карла Лібкнехта, Камсамольская, частка Слуцкай Набярэжнай, Камсамольскі завулак ды Плошча Свабоды.

У горадзе 2 сады (паркі): адзін — на Плошчы Свабоды, другі, «Гарадскі сад» — на краі ўзгорка, які завецца Ксяндзоўка. Гэта — бярозавы гаёк, размешчаны на вышыні 165 метраў над схіламі ўзгорка. Па некрутым схіле ўзгорка з Ленінскай вуліцы зроблены ўсходкі для пераходу ў сад, лік усходак — 164.

Трэба адзначыць яшчэ тое, што паміж раўчаковымі далінамі, якія перараэаюць горад, знаходзяцца ўзгоркі, кожны з іх мае сваю назву. Так, паміж Ленінскай і Мікалаеўскай вуліцамі знаходзіцца ўзгорак «Жучта», а на ім — могілкі з царквою; паміж Ленінскай і Калінікам — Ксяндзоўка; у чатырохкутніку, бакамі якога служыць Плошча Свабоды, Камсамольскі завулак, вул. К. Лібкнехта, Камсамольская вуліца — гістарычная Спаска-Замкавая гара (цяпер — Гара Камунараў); каля Калініка, пралягаючы да Жытомірскае вуліцы,— Капітанская горка, прарэзаная раўчаком, па якім у кірунку да в. Міхалкі праходзіць Ленінградска-Кіеўскі гасцінец.

Узгоркі хоць рэдка, але пакрыты рознымі дрэвамі, ад чаго набываюць больш хараства і прыхарошваюць горад, калі на яго глянуць з якога-небудзь узгорка.

Вуліцы ж у горадзе пакрыўленыя і вузкія. Больш простымі і шырокімі з'яўляюцца: Ленінская, Розы Люксембург, Карла Лібкнехта. Асвятляецца Мазыр электрычнасцю, устаноўлена 24 фанары, на асвятленне якіх у снежні 1926 г. траціласа 720 кілават энергіі. Ні конкі, ні трамвая, ні аўтобусаў у Мазыры няма. З прычыны невялікіх канцоў горада і да вознікаў насельніцтва зварочваецца звычайна толькі тады, калі трэба прывезці доктара да хворага або калі трэба адвезці хворага ў бальніцу...

Частцы горада (вул. К. Лібкнехта, Кіеўская Набярэжная), што размешчана на больш нізкім беразе ракі, часам пагражаюць веснавыя паводкі, хоць адвод русла ракі ад гэтых месц зроблены пры дапамозе гатак. Глыбіня ракі — каля горада месцамі дасягае 230 см, шырыня — 0,5 км, шпаркасць цячэння — 3,2 км у гадзіну. Нармальны ўзровень лічыцца ў 200 см, але ў гады найвялікшых паводак, якімі ў апошнія гады былі 1917, 1924, 1926 г., узровень вады падымаўся на 360 (1926 г.) і нават на 413 (1924 г.). Самы нізкі ўзровень вады быў у 1925 г., калі ён дасягаў 68 см.

Ад школьнай парты

Амаль 60 гадоў, тры пакаленні жыхароў вёскі Скрыгалаў, вучыў Канстанцін Міхайлавіч Захар'яш. Нарадзіўся ён у 1877 г. у мнагадзетнай сялянскай сям'і. Закончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю разам з Якубам Коласам і ў пачатку стагоддзя быў прызначаны загадчыкам Скрыгалаўскага народнага вучылішча. Яшчэ ў семінарыі, каб плаціць за вучобу, мусіў падзарабляць — вучыў сялянскіх дзяцей.

У Скрыгалаве К. М. Захар'яша ведалі не толькі як настаўніка, але як і заступніка сялян, дарадцу, хадака па справах абшчыны. Ён заўсёды жыў паўсядзённымі клопатамі вяскоўцаў, вёў сярод іх вялікую асветніцкую работу. Сярод былых вучняў К. М. Захар'яша ёсць военачальнікі і вучоныя, дзеячы культуры і ўрачы, дзяржаўныя і гаспадарчыя работнікі, настаўнікі і хлебаробы. Усім ім выдаў пуцёўку ў жыццё іх першы настаўнік.

У 1949 г. К. М. Захар'яшу ў ліку першых на Мазыршчыне прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР». Праз год ён быў удастоены вышэйшай узнагароды — ордэна Леніна. У 1956 г. К. М. Захар'яш памёр.

М. Капач

Кампазітар С. А. Шварц

Шварц Самуіл Аронавіч нарадзіўся ў 1896 г. у Мазыры, вядомы музыкант і кампазітар. Вучыўся ў Кіеўскай музычна-драматычнай школе пад кіраўніцтвам выдатнага кампазітара Н. В. Лысенкі, у 1925 г. скончыў Кіеўскую кансерваторыю. Шмат гадоў С. А. Шварц жыў і працаваў кампазітарам і дырыжорам у Вольскім драматычным тэатры Саратаўскай вобл. Стварыў нямала музычных твораў — танцавальных п'ес, сюіт, маршаў, апрацаваў шэраг народных песень, напісаў музыку да некалькіх спектакляў.

В. Шур

Трагедыя народа

Па трывожных, хісткіх рэйках пайшло жыццё ў супярэчлівых 30-х гадах. Як быццам радасныя, напоўненыя працоўным рытмам дні, і — неспакойныя, страшныя ў чаканні незаслужанага абвінавачання ночы... Хваля за хваляй каціліся палітычныя рэпрэсіі. Спачатку яны былі накіраваны на знішчэнне рэшткаў кулакоў, нэпманаў, заможных слаёў насельніцтва горада і вёскі, старой інтэлігенцыі. Затым рэпрэсіі абрушыліся на партыйны, савецкі і камсамольскі апарат, камандны састаў арміі, гаспадарнікаў, кіраўнікоў і радавых працаўнікоў — на ўсіх...

Гэта была вялікая трагедыя народа. Толькі ў Мазыры і ў прыгарадных мясцовасцях расстраляны 2922 жыхары Палесся. Ва ўрочышчах Бярозаўка па дарозе Міхалкі — Рудня Міхалкаўская расстраляна 558 чалавек, Гулевічах — 134 чалавекі, Пеніцы — 39, Баравіках — 18... Было знішчана звыш 140 жыхароў горада. Сярод іх А. В. Дубіна, старшыня акруговага выканаўчага камітэта, А. А. Бычкоўскі, сакратар акруговага камітэта камсамола, В. І. Шылянок, сакратар акруговага выканаўчага камітэта, Н. М. Аронаў, загадчык аддзела мясцовай прамысловасці акрвыканкама, І. Ц. Салавей, загадчык аддзела рэдакцыі газеты «Бальшавік Палесся», М. Ф. Гарадзецкі і многія іншыя. Больш за 500 чалавек амаль з усіх вёсак Мазырскага раёна былі падвергнуты рэпрэсіям. Вядома, што ў Асавецкім сельсавеце расстраляна 76 чалавек, у Крынічанскім — 59, у Махнавіцкім — 62, у Міхалкаўскім — 81, у Козенскім — 48...

Сярод рэпрэсіраваных — сакратар Мазырскага райкама партыі Е. А. Левін, рэдактар раённай газеты А. А. Васільеў, старшыні калгасаў П. С. Пашкевіч (Махнавічы), Я. І. Берднік (Крынічная Града), П. К. Кашэвіч (Зімавая Буда), М. В. Палхоўскі (Раманаўка), Л. М. Лемба (Шчакатава), С. В. Гарбатоўскі (Пянькі), настаўнікі А. К. Кунгер, (Козенкі), Г. В. Серапін і Г. Н. Фрыдман (Скрыгалаў), А. І. Дробыш (Тварычаўка), работнікі лясгаса К. І. Ляўковіч (Нараўшчызна), Е. П. Шурынаў (Мялешкавічы), свяшчэннікі і служкі царквы — В. І. Жох (Слабада), В. К. Бягляк (в. Мялешкавічы), Ф. В. Чулкевіч (Балажэвічы) — больш як 400 чалавек рабочых і калгаснікаў.

Пачынаючы з 1953 г. справы практычна ўсіх рэпрэсіраваных былі перагледжаны і спынены з-за адсутнасці складу злачынства, а неабгрунтаваныя прыгаворы адменены.

С. Касцян, Т. Нікіціна

Апошняя пасада былога наркама

У 1929 г. дырэктарам Палескай пясчанай сельскагаспадарчай станцыі, якая знаходзілася ў Скрыгалаве, быў прызначаны Д. Ф. Прышчэпаў. Раскручвалася страшнае кола масавых рэпрэсій, і Дзмітрый Філімонавіч, першы народны камісар земляробства, адзін з першых трапіў пад яго. Абвінавачаны ў здрадзе Радзіме, ва ўсемагчымых ухілах, «шкодных думках», ён быў зняты з усіх пасад, выключаны з партыі, двойчы прыгавораны да расстрэлу...

Нарадзіўся Д. Ф. Прышчэпаў у 1896 г. на Віцебшчыне. Пасвіў кароў, батрачыў, потым — акопы першай сусветнай вайны, якія сталі своеасаблівымі універсітэтамі будучага вучонага. У грамадзянскую вайну яму даверылі камандаванне атрадам, потым палком Чырвонай Арміі, яго выбіраюць старшынёю Сенненскага павятовага выканкама і рэўкама.

Наступілі мірныя гады. Землякі выбралі Д. Ф. Прышчэпава намеснікам старшыні Віцебскага губернскага выканкама, затым ён працаваў намеснікам наркама земляробства. У 1924 г. абраны народным камісарам земляробства Беларусі. Пяць гадоў працаваў ён на гэтай пасадзе — так, як падказвала сумленне, сялянскі розум і прыродная кемлівасць. А ў 1929 г. здарылася бяда. Дзмітрыя Філімонавіча абвінавацілі ў тым, што ён хацеў, каб сяляне жылі заможна. Прышчэпаў быў супраць паскоранай, часта неабдуманай калектывізацыі.

Усяго два гады працаваў Дзмітрый Філімонавіч на Мазыршчыне. Незабыўны след пакінуў ён у рабоце навуковай доследнай станцыі, у яе гаспадарчым уладкаванні, паляпшэнні жыцця ў вёсцы. У Скрыгалаве дзякуючы Дзмітрыю Філімонавічу з'явілася электрычнасць. Ён дабіўся ў Саўміне выдзялення паравога лакамабіля і турбіны, іншага абсталявання. Лакамабіль быў дастаўлены па Прыпяці, а ад прыстані да вёскі — на валах. Вырашаліся многія іншыя пытанні па ўмацаванні матэрыяльнай базы станцыі, падборы кадраў. Станцыя была пераўтворана ў сельскагаспадарчы саўгас-тэхнікум — першую навучальную ўстанову на Палессі.

Помнік расстраляным у 1937—1939 гг. Па дарозе Міхалкі — Рудня Міхалкаўская

У ліпені 1930 г. Дзмітрый Філімонавіч быў арыштаваны і прыгавораны да 10-гадовага турэмнага зняволення. Карэлія, Сібір, Калыма — месцы пакут Д. Ф. Прышчэпава. У чэрвені 1937 г. быў датэрмінова вызвалены, але праз месяц, па дарозе на радзіму — новы арышт, тое ж самае абвінавачанне — і прыгавор да вышэйшай меры пакарання...

М. Капач

СА СПРАВАЗДАЧЫ МАЗЫРСКАГА АКРУЖКАМА КП(б) БЕЛАРУСІ ЗА ЧАС ПАСЛЯ II АКРУГОВАЙ ПАРТЫЙНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ З 6.6.1937 г. ПА 15.9.1937 г.

...Окружная парторганизация провела большую разоблачительную работу по очищению парторганизации от троцкистов и прочих врагов партии и народа. Всего исключено из партии за отчетный период 119 членов и кандидатов, в т. ч. 37 человек исключены как враги народа, 19 человек за связь с врагами народа, 12 троцкистов, 9 за связь с троцкистами, 10 за сопротивление исправлению последствий вредительства и 32 человека по другим причинам.

Анализ причин исключения показывает, что абсолютное большинство исключенных являлись врагами народа, врагами партии. Наиболее характерными из исключенных являются следующие: Бычковский — бывший секретарь окружкома ЛКСМБ, Гольдкварц — бывший редактор окружной газеты «Большевик Полесья», Драп — директор школы, и другие.

...Во главе руководства окружного совета Осоавиахима находился ставленник врага народа Милонова — Максимов, ныне исключенный из партии...

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 69. Воп. 4. Спр. 13. Л. 3.

Праходзіў па «мазырскай справе»

Адным з палітычных працэсаў на Беларусі ў канцы 30-х гадоў была так званая «мазырская справа». У ліпені 1938 г. яна набыла рэспубліканскі маштаб. Арыштавалі 17 чалавек, у асноўным дзяржаўных і партыйных дзеячаў, у тым ліку А. А. Ананьева.

Анатоль Андрэевіч меў тры класы адукацыі. Служыў у Чырвонай Арміі, у 1933 г. яго адкамандзіравалі ў распараджэнне ЦК ВКП(б).

Працоўная дзейнасць А. А. Ананьева ў Беларусі пачалася ў 1935 г. на Мазыршчыне, тут ён усё вышэй падымаўся па службовых прыступках. У 1937 г. А. А. Ананьеў — сакратар акружкама партыі. З Мазыра яго пераводзяць на пасаду намесніка старшыні СНК БССР, потым некалькі месяцаў ён працаваў сакратаром Віцебскага абкама КП(б)Б, а неўзабаве А. А. Ананьеў быў прызначаны другім сакратаром ЦК КП(б)Б.

Трагічны быў далейшы шлях гэтага чалавека. Арышт, турма, допыты... На допыце 16 студзеня 1939 г., магчыма, пад дыктоўку следчага Анатоль Андрэевіч паказаў, што ў чэрвені — ліпені 1936 г. атрымаў заданне падрыхтаваць

Выпуск курсаў тэхнікаў-жывёлаводаў. 1932

тэрарыстычны акт супраць К. Я. Варашылава, які павінен быў прыехаць у Беларусь на тактычныя вучэнні. «...Нам трэба было падрыхтаваць «дом паляўнічага», каб, па прыездзе Варашылава ў Беларусь, запрасіць яго на паляванне і здзейсніць тэракт... Мне было даручана падрыхтаваць людзей, так званых «паляўнічых». У абвінаваўчым заключэнні па «справе семнацаці» гэтыя паказанні, дапоўненыя іншымі вымысламі, выліліся ў фармуліроўку: «Абвінавачваныя па гэтай справе з'яўляліся ўдзельнікамі правацэнтрысцкай арганізацыі, якую ўзначальвалі Шаранговіч, Галадзед, Чарвякоў і Гікала, атрымалі заданне Рыкава падрыхтаваць і здзейсніць тэракт над наркамам абароны СССР Маршалам Савецкага Саюза К. Я. Варашылавым і правялі да гэтага падрыхтоўку. А. А. Ананьеў паказаў, што прамым вынікам наўмысных шкодніцкіх дзеянняў з'яўлялася нізкая ўраджайнасць, мізэрныя працадні калгаснікаў і да т. п. Каб выклікаць нездавальненне сярод калгаснікаў палітыкай савецкага ўрада, удзельнікі нацыянал-фашысцкай арганізацыі сабатавалі сталінскі статут сельгасарцелі, рашэнні партыі і ўрада аб надзяленні калгаснікаў прысядзібнымі ўчасткамі».

З пратакола закрытага судовага пасяджэння ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР ад 27 мая 1940 г. вынікае, што А. А. Ананьеў свае паказанні, дадзеныя ім на папярэднім следстве, на судзе не пацвердзіў. «Я мусіў даваць такія паказанні, бо з першага дня допыту мяне збівалі», — заявіў ён.

29 мая 1940 г. ваенная калегія Вярхоўнага суда СССР за падрыў дзяржаўнай прамысловасці, транспарту, гандлю, грашовай абарачальнасці прыгаварыла А. А. Ананьева да 20 год папраўча-працоўных лагераў з наступным пазбаўленнем на 5 год палітычных правоў. Ён памёр 25 мая 1942 г. у перасыльнай турме ў Саратаўскай вобласці.

В. Грыгор'еў

В партии восстановить посмертно...

Степан Матвеевич Романенко в партию вступил в декабре 1918 года в возрасте 27 лет. Работал секретарем Оршанского, Мстиславского, Тереховского, Богушевского райкомов КП(б)Б, вторым секретарем Мозырского окружкома партии. С мая 1937 по январь 1938 г. — председатель Мозырского окрисполкома. С февраля по август 1938 года был председателем оргкомитета ЦИК БССР по Полесской области. 27 августа арестован органами НКВД, а в ноябре решением III Пленума ЦК КП(б)Б исключен из партии и членов ЦК КП(б) как «враг народа».

С. М. Романенко были предъявлены стандартные обвинения, что, «будучи вторым секретарем Мозырского окружкома КП(б)Б, преступно халатно относился к своим обязанностям, в результате чего имели место искривления налоговой политики, выражавшиеся в переобложении крестьянских хозяйств и незаконном изъятии и реализации имущества у неплательщиков. Не пресекал нарушения устава сельхозартели по отводу приусадебных участков колхозникам и земли единоличникам, не принимал всех зависящих от него мер к ликвидации инфекционных заболеваний лошадей, что снижало рост конского поголовья».

В мае 1940 года военная коллегия Верховного суда СССР приговорила С. М. Романенко к лишению свободы сроком на четыре года без поражения в правах, с отбытием наказания в исправительно-трудовых лагерях. Позже он умер в заключении...

При рассмотрении дела в военной коллегии Верховного суда СССР Степан Матвеевич сказал: «Я прошу суд при вынесении приговора учесть, что у меня, пробывшего 20 лет в партии, не было никаких предпосылок сделаться врагом народа, как я в том признался на предварительном следствии. Эти признания были выбиты у меня следователем. Я вступил в коммунистическую партию тогда, когда велась борьба на фронтах

гражданской войны. Я активно участвовал в февральской и Октябрьской революциях. Я всегда честно проводил генеральную линию партии. Я никогда не был врагом народа и никогда им не буду. Прошу дать возможность мне честно работать, как работают миллионы трудящихся нашей страны, и так, как я работал до моего ареста. Я несу ответственность за недочеты в Мозырском районе, но это не было вредительством».

Определением военной коллегии Верховного суда СССР от 4 апреля 1957 года приговор в отношении С. М. Романенко отменен и дело за отсутствием состава преступления прекращено.

В феврале 1989 года Бюро ЦК КПБ восстановило С. М. Романенко членом КПСС с 1918 года (посмертно).

«Политический собеседник». 1989. № 4.

ДАВЕДКА-ДУБЛІКАТ

Справа ў адносінах Рэута Лявона Мацвеевіча, 1892 года нараджэння, ураджэнца і жыхара в. Зімавая Буда Мазырскага раёна Гомельскай вобласці, да арышту 3 жніўня 1937 года — рабочы смалакурнага завода, перагледжана ваенным трыбуналам Беларускай ваеннай акругі 27 чэрвеня 1978 года.

Пастанова камісіі НКУС і Пракурора СССР ад 28 лістапада 1937 года па абвінавачванні Рэута Лявона Мацвеевіча ў прыналежнасці да шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі і асуджанага да вышэйшай меры пакарання адменена і справа аб ім спынена за адсутнасцю складу злачынства.

Па гэтай справе Рэут Л. М. рэабілітаваны пасмяротна.

Старшыня Беларускага ваеннага суда палкоўнік юстыцыі *П. Лізуноў*

12 чэрвеня 1996 г.

Прозвішчы на абеліску

...Ціхія вясковыя могілкі ў вёсцы Крушнікі, сціплыя помнікі, драўляныя і металічныя крыжы. Помнік з чырвонага граніту на высокім месцы кідаецца ў вочы. Восем прозвішчаў на ім. Усе — Юніцкія. Але пахавана тут толькі Анастасія Барысаўна Юніцкая — жонка, маці, свякроў... Астатнія — муж Юніцкі Антон Пятровіч, сыны Пётр, Фёдар, Яфрэм, Васіль і Іван, нявестка Ефрасіння Іванаўна знайшлі вечны прытулак далёка ад гэтых мясцін, і невядома дакладна — дзе на шматпакутнай мазырскай зямлі... Аб'яднаў іх усіх агульны надпіс на помніку: «Бязвінна расстраляным і пасмяротна рэабілітаваным. Вашыя бязвінныя мукі балюча аддаюцца ў нашых сэрцах. Удзячныя вам дзеці, пляменнікі, унукі».

Жылі ціха і спакойна ў вёсцы, якой была і сама вёска, шчырыя, сумленныя людзі, працаўнікі, гаротнікі. Мала ведалі адпачынку, цяжкім было дзяцінства. Пасвілі жывёлу, аралі, сеялі. Былі добрымі хлебаробамі, будаўнікамі, пчалярамі. Пачалася калектывізацыя. І ў калгасе нядрэнна працавалі. Таму і жылі. Крыху лепш, чым іншыя. Заўсёды мелі кавалак хлеба, а да яго ў святы, у касавіцу — кавалак сала... Гэта выклікала зайздрасць і нянавісць тых, хто не любіў працаваць. Яны сталі «аўтарамі» сігналаў ва ўсе інстанцыі пра тое, што «ў Крушніках звілі сабе гняздо кулакі, ворагі народа і польскія шпіёны...». За некалькі начэй «чорны воран» значна паменшыў колькасць мужчын у Крушніках.

Зніклі бясследна больш як 40 чалавек на чале са старшынёй калгаса А. А. Юніцкім. Забралі і некалькі жонак «ворагаў народа». Прыгавор часцей быў адзін — расстрэл. Вядома, што ў ваколіцах Мазыра расстраляна 33 чалавекі з Крушнікаў. Сярод іх — муж, пяцёра сыноў, нявестка Анастасіі Барысаўны. Такую трагедыю маці трэба было вытрымаць, перажыць... Памерла яна ў 1947 г.

Мемарыяльная дошка, устаноўленая на будынку Свята-Міхайлаўскага сабора ў памяць аб ахвярах палітычных рэпрэсій 1937—1938 гг.

...У гады вайны дзеці і родныя «ворагаў народа» адважна змагаліся з ворагам на фронце, у партызанскіх атрадах. У мірны час працавалі шчыра, сумленна, як Э. П. Юніцкі (бацька і маці, дзед і чатыры дзядзькі якога расстраляны) — вопытны арганізатар вытворчасці, які ўзначальваў буйнейшыя будаўнічыя арганізацыі ў Мазыры і ў Гомелі.

М. Капач

Слаўнае імя

Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі нарадзіўся ў 1867 г., вучыўся ў Мазырскай гімназіі, затым у Кіеўскім універсітэце. Была цікавая работа ў Маскоўскім архіве Міністэрства юстыцыі. З 1899 г. М. В. Доўнар-Запольскі — прыват-дацэнт Маскоўскага універсітэта, праз тры гады — Кіеўскага, прафесар гісторыі, доктар гістарычных навук. У 1925 г. ён працаваў правадзейным членам і кіраўніком гісторыка-археалагічнай камісіі Інбелкульта ў БДУ.

Навуковая і грамадская дзейнасць Доўнар-Запольскага яшчэ і сёння пасапраўднаму не ацэнена. Гэты вучоны-патрыёт займае пачэснае месца сярод такіх выдатных беларускіх гісторыкаў, як Я. Тышкевіч, А. Кіркор, У. Пічэта, У. Ігнатоўскі. Яго імя вядома не толькі гісторыкам, але і этнографам, фальклярыстам, мовазнаўцам. Ёсць усе падставы назваць Доўнар-Запольскага «бацькам беларускай гістарычнай навукі». Яго гістарычныя працы, напісаныя паводле архіўных матэрыялаў, — «Палітычны лад старажытнай Русі», «Зараджэнне міністэрстваў Расіі», «Нарыс па арганізацыі заходнерускага сялянства», «Нарыс сацыяльна-эканамічнай структуры Беларусі ў XVI — XVIII стст.», «Народная гаспадарка Беларусі 1861—1914 гг.» маюць і сёння вялікую навуковую вартасць...

М. В. Доўнар-Запольскі працаваў у розных навуковых установах Кіева, Мінска, Баку і Масквы, але ўсё жыццё і творчую дзейнасць прысвяціў вывучэнню роднай Беларусі, дзе ён нарадзіўся і вырас. Ён прапаноўваў друкаваць літаратуру на беларускай мове, вывучаць культуру і побыт народа, адкрыць беларускі універсітэт. Жывучы па-за межамі рэспублікі, ніколі не губляў сувязі з беларускімі вучонымі і пісьменнікамі, цікавіўся падзеямі, якія тут адбываліся. Менавіта М. В. Доўнар-Запольскі ўдакладніў этнічныя межы Беларусі. Ён улічыў усе фактары — ад лінгвістычных да культурна-эканамічных і гістарычных — пры вызначэнні месцаў пасялення беларусаў. Граніца паміж Украінай і Беларуссю праходзіць і цяпер амаль так, як яе вызначыў гісторык.

Ён думаў пра Беларусь, імкнуўся сюды, запісваў народныя песні, вывучаў быт, рабіў археалагічныя раскопкі... На жаль, чорнае крыло сталіншчыны не мінула і М. В. Доўнар-Запольскага, яго добрае імя на доўгі час было забыта.

Загінуў М. В. Доўнар-Запольскі ў 1934 г.

Г. Каханоўскі

М. А. Адамовіч

Вернутыя з забыцця

Расстраляны, расстраляны, высланы ў Сібір, памёр у зняволенні... Сотні ахвяр сталінскіх рэпрэсій 30-х гадоў... Адпаведнымі судовымі інстанцыямі ўсе яны рэабілітаваныя ў пасляваенны час, але такім жа неабходным актам у адносінах да бязвінных пакутнікаў з'яўляецца і публікацыя іхніх імёнаў у гэтай кнізе. Ніхто іх не верне ўжо з вечнага небыцця, але галоснае вяртанне ні ў чым не вінаватых людзей з ганебнага забыцця стане хоць бы малым суцяшэннем іхнім нашчадкам, а ўсім нам — суровым папярэджаннем, каб на роднай зямлі такое ніколі больш не паўтарылася... Вось ён, магчыма, яшчэ не поўны спіс нашых землякоў, якія загінулі ў гады масавых палітычных рэпрэсій:

ГОРАД МАЗЫР

АБРАМАЎ Уладзімір Карнеевіч, н. у 1903, расстраляны 16.2.1938.

АДАМОВІЧ Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1904, расстраляны 24.12.1937.

АЛЕКСАНДРОВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. у 1865, быў святаром, расстраляны ў 1938.

АЛЬХА Рыгор Дзмітрыевіч, н. у 1900, расстраляны ў 1938.

АЛЬШЭЎСКІ Уладзіслаў Вікенцьевіч, н. у 1867, расстраляны 11.3.1938.

АРОНАЎ Навум Мееравіч, н. у 1897, працаваў загадчыкам аддзела мясцовай прамысловасці Мазырскага акруговага выканкама, расстраляны 30.10.1937 у Мінску.

БАЛЮК Іван Сцяпанавіч, н. у 1898, расстраляны 24.12.1937.

БАРАВІК Апанас Іванавіч, н. у 1893, працаваў бухгалтарам рыбучастка, расстраляны 11.3.1938.

БАРАНОЎСКІ Леанід Антонавіч, н. у 1891, расстраляны 28.1.1938.

БЕЖЫК Іван Паўлавіч, н. у 1873, працаваў рахункаводам калгаса, расстраляны 16.2.1938.

БЕКАРЭВІЧ Васіль Фёдаравіч, н. у 1896, быў святаром, расстраляны 20.10.1937.

БІБІК Клім Карнеевіч, н. у 1878, расстраляны 22.3.1933.

БЛІНКОЎСКІ Вячаслаў Казіміравіч, н. у 1891, расстраляны 24.12.1937.

БОБР Іван Кандратавіч, н. у 1898, расстраляны 16.2.1938.

БОБР Піліп Архіпавіч, н. у 1872, працаваў возчыкам на фабрыцы «Прафінтэрн», расстраляны 16.2.1938.

БОБР Уладзімір Цярэнцьевіч, н. у 1888, расстраляны 16.2.1938.

БЫЧКОЎСКІ Антон Антонавіч, н. у 1911, працаваў сакратаром Мазырскага акружкама камсамола, расстраляны 24.11.1937 у Мінску.

БЯРНАЦКІ Клім Карнеевіч, н. у 1878, расстраляны 22.3.1933.

ВАРШАЎСКІ Станіслаў Юльянавіч, н. у 1906, працаваў загадчыкам Мазырскага акружнога фінансавага аддзела, расстраляны 30.10.1937 у Мінску.

ВІЗАНОВІЧ Юрый Васілевіч, н. у 1884, расстраляны 24.12.1937.

ВОЛЬФМАН Генах Моўшавіч, н. у 1897, расстраляны 29.12.1937.

ГАЛАВАЦКІ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1913, расстраляны 16.2.1938.

ГАРАДЗЕЦКІ Моўша Фрэімавіч, н. у 1913, расстраляны 24.12.1937.

ГАРЭЛАЎ Аляксандр Піліпавіч, н. у 1893, расстраляны 22.5.1938.

ГАЎШТЭЙН Лейзер Пейсахавіч, н. у 1905, расстраляны 29.12.1937.

ГАЎШТЭЙН Янкель Ісаравіч, н. у 1898, расстраляны 29.12.1937.

ГАЯВЫ Тарас Дзям'янавіч, н. у 1871, вартаўнік царквы, расстраляны 11.3.1938.

ГЕЙШТЭР Антон Міхайлавіч, н. у 1890, працаваў начальнікам Мазырскай сплаўной канторы, расстраляны 30.10.1937.

ГЛЕЗА Іван Антонавіч, н. у 1895, расстраляны 28.1.1938.

ГЛІНСКІ Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1890, працаваў бухгалтарам арцелі «Молат», расстраляны 16.2.1938.

ГОФМАН Давід Сіманавіч, н. у 1897, працаваў загадчыкам магазіна «Белплодаагародніна», расстраляны 3.3.1938.

ГУЛЕЦКІ Васіль Іванавіч, н. у 1890, расстраляны 29.12.1937.

ГУЛЬБІНОВІЧ Андрэй Андрэевіч, н. у 1874, працаваў механікам электрастанцыі, расстраляны 19.11.1937.

ГУРАЛІС Віктар Восіпавіч, н. у 1913, расстраляны 24.12.1937.

ГУРЫН Васіль Паўлавіч, н. у 1866, расстраляны 5.1.1938.

ДАМАШЭВІЧ Сафрон Фёдаравіч, н. у 1900, расстраляны 22.11.1938.

ДЗЕЛЯС Браніслаў Купрыянавіч, н. у 1897, расстраляны 28.1.1938.

ДЗЕНІШЧУК Станіслаў Купрыянавіч, н. у 1900, расстраляны 29.12.1937.

ДЗІКАН Ігнат Кузьміч, н. у 1902, працаваў цесляром на Мазырскай электрастанцыі, расстраляны 11.3.1938.

ДРОЗД Ісідар Піліпавіч, н. у 1884, расстраляны 20.10.1937.

ДУБЕРШТЭЙН Іван Карлавіч, н. у 1897, расстраляны 27.4.1938.

ДУБІНА Антон Васілевіч, н. у 1885, працаваў старшынёй Мазырскага акрвыканкама, расстраляны 29.10.1937.

ДУБІНСКІ-ІВАШКЕВІЧ Мікалай Лаўрэнцьевіч, н. у 1904, расстраляны 22.5.1938.

ДУБРАВІЦКІ Майсей Нахімавіч, н. у 1900, расстраляны ў 1938.

ДУБРАЎ Аляксандр Акімавіч, н. у 1868, расстраляны 16.2.1938.

ДУБРАЎ Яўхім Міхайлавіч, н. у 1894, расстраляны 11.3.1938.

ЕФІМОВІЧ Андрэй Вікенцьевіч, н. у 1898, расстраляны 29.12.1937.

ЗАХАРАЎ Іван Іванавіч, н. у 1878, працаваў загадчыкам базы Мазырскага рыбучастка, памёр у 1944 у месцы зняволення.

ЗУБАР Кузьма Сцяпанавіч, н. у 1895, расстраляны 29.12.1937.

ІВАШКЕВІЧ Клаўдзія Аляксандраўна, н. у 1900, расстраляна 14.10.1938.

ІВАШКЕВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1894, расстраляны 29.12.1937.

КАТЛЯРОЎСКІ Саламон Абрамавіч, н. у 1901, расстраляны 28.7.1938.

КУЗЬМЕНКА Андрэй Васілевіч, н. у 1871, служачы рэлігійнага культу, расстраляны 11.3.1938.

КУЗЬМІЧ Янкель Натанавіч, н. у 1888, расстраляны 11.3.1938.

КУНЕЦ Восіп Якаўлевіч, н. у 1895, расстраляны 24.12.1937.

ЛАНЬКО Пётр Якаўлевіч, н. у 1895, расстраляны 7.12.1937.

ЛЕВАНЧУК Іван Паўлавіч, н. у 1864, расстраляны 11.3.1938.

ЛЕВІН Афроім Абрамавіч, н. у 1885, працаваў упаўнаважаным Народнага камісарыята нарыхтовак па Мазырскім раёне, арыштаваны 2.7.1938, асуджаны 6.2.1940 на 5 гадоў зняволення, дзе і памёр 16.1.1944.

ЛЕВІН Яўсей Якаўлевіч, н. у 1898, працаваў сакратаром Мазырскага райкама КП(б)Б, арыштаваны ў 1938, асуджаны 29.5.1940 на 5 гадоў зняволення, далейшы лёс невядомы.

ЛЁТКІН Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1908, расстраляны 16.2.1938.

ЛІПСКІ Мацвей Васілевіч, н. у 1892, расстраляны 27.9.1937.

ЛУШКАРОЎ Сяргей Фаміч, н. у 1904, расстраляны 7.12.1937.

ЛЯСОТА Іван Мар'янавіч, н. у 1883, расстраляны 24.12.1937.

МАЗАЛЕЎСКІ Іван Васілевіч, н. у 1875, расстраляны 5.1.1938.

МАСЛА Андрэй Паўлавіч, н. у 1889, расстраляны 27.9.1937.

МІШКЕВІЧ Арэст Вікенцьевіч, н. у 1871, расстраляны 19.10.1937.

МУРАШКА Якім Паўлавіч, н. у 1881, расстраляны 16.2.1938.

МЯДЗВЕДЗЬ Аляксей Максімавіч, н. у 1888, расстраляны 16.2.1938.

МЯДЗВЕДЗЬ Фёдар Захаравіч, н. у 1874, расстраляны 11.3.1938.

НАЛІВАЙКА Апанас Якімавіч, н. у 1903, начальнік штаба дывізіі, расстраляны 24.4.1938.

ПАДАЛІНСКІ Дзямід Назаравіч, н. у 1894, расстраляны 24.4.1938.

ПАЛЕЙ Іосіф Шаламавіч, н. у 1884, расстраляны 29.12.1937.

ПАТАПЧУК Несцер Гардзеевіч, н. у 1903, расстраляны 27.4.1938.

ПАТАПЧУК Павел Гардзеевіч, н. у 1904, расстраляны 27.4.1938.

ПАЦАПНЯ Даніла Сцяпанавіч, н. у 1888, расстраляны 5.1.1938.

ПРАТАСАВІЦКІ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1895, расстраляны 7.12.1937.

ПРОХАРАЎ Яўген Сямёнавіч, н. у 1890, працаваў прарабам на будоўлі, расстраляны 16.2.1938.

ПРЫБЫЛОЎ Іосіф Эдуардавіч, н. у 1908, працаваў інструктарам Мазырскага аддзялення Дзяржбанка, расстраляны 11.3.1938.

ПРЫШЧЭПА Іван Сямёнавіч, н. у 1895, расстраляны 27.9.1937.

ПУРЫХ Ізраіль Лейзеравіч, н. у 1907, працаваў дырэктарам мукамольнага трэста, расстраляны ў 1938.

ПЫШНЯК Барыс Міхайлавіч, н. у 1900, расстраляны 16.2.1938.

ПЯТКЕВІЧ Антон Антонавіч, н. у 1897, працаваў планавіком-эканамістам, расстраляны ў 1938.

ПЯЧКОЎСКІ Вікенцій Васілевіч, н. у 1874, працаваў фельчарам, расстраляны 16.2.1938.

РАЖКО Андрэй Фёдаравіч, н. у 1893, расстраляны 29.12.1937.

РАМАНЕНКА Сцяпан Мацвеевіч, н. у 1891,

працаваў старшынёй Мазырскага акружнога выканкама, з лютага 1938 — старшынёй аргкамітэта ЦВК БССР па Палескай вобл., арыштаваны 27.8.1938, асуджаны 5.5.1940 на 4 гады зняволення, дзе і памёр у 1941.

РАНЦЭВІЧ Дзмітрый Андрэевіч, н. у 1889, расстраляны 16.2.1938.

РАТНЕР Залман Мордухавіч, н. у 1915, працаваў сакратаром Мазырскага райкама ЛКСМБ, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

РАШУТНЯК Міхаіл Лук'янавіч, н. у 1910, працаваў механікам аўтабазы, расстраляны 29.11.1937.

РУДЗЬКО Іван Рыгоравіч, н. у 1916, расстраляны 16.2.1938.

РУСІЛКА Кліменцій Аляксандравіч, н. у 1898, расстраляны 22.5.1938.

РЭХТМАН Гірш Шлёмавіч, н. у 1894, расстраляны 11.3.1938.

САВЕНКА Адам Кандратавіч, н. у 1904, расстраляны 11.3.1938.

САКАЛОЎ Міхаіл Паўлавіч, н. у 1903, расстраляны 28.1.1938.

САЛАВЕЙ Іван Цімафеевіч, н. у 1912, працаваў загадчыкам сельгасаддзела рэдакцыі газеты «Бальшавік Палесся», расстраляны 5.1.1938.

САПРЫНОЎСКІ Яўген Іосіфавіч, н. у 1902, расстраляны 16.2.1938.

САСНАВЕЦ Захар Іванавіч, н. у 1881, расстраляны 16.2.1938.

СВЯНЦЕЦКІ Банед Віктаравіч, н. у 1903, расстраляны 7.12.1937.

СВЯНЦЕЦКІ Карл Іванавіч, н. у 1902, расстраляны 29.11.1937.

СІНКЕВІЧ Іван Паўлавіч, н. у 1892, расстраляны 24.12.1937.

СЛАВУЦІН Барыс Зусевіч, н. у 1902, расстраляны 24.12.1937.

СМІРНОЎ Павел Цітавіч, н. у 1882, расстраляны 20.10.1937.

СЧАСНЫ Фама Сцяпанавіч, н. у 1907, расстраляны 29.12.1937.

ТРОЦ Іван Андрэевіч, н. у 1897, працаваў намеснікам дырэктара лесазавода «Пралетарый», расстраляны 22.11.1938.

ФЕШЧАНКА Піліп Кандратавіч, н. у 1883, расстраляны 20.10.1937.

ФІАЛКАЎ Майсей Яўсеевіч, н. у 1892, расстраляны 29.12.1937.

ФРЫДМАН Самуіл Годзіч, н. у 1892, расстраляны 29.12.1937.

ХАМЕНКА Мечыслаў Антонавіч, н. у 1911, расстраляны 27.4.1938.

ХАРКАВЕЦ Цімафей Парфіравіч, н. у 1892, расстраляны 29.12.1937.

ЦЕЛЯПУН Данііл Іванавіч, н. у 1902, расстраляны 5.1.1938.

ЦІХАНАЎ Фёдар Іванавіч, н. у 1901, расстраляны ў 1937.

ЧАРНЕЦКІ Канстанцін Вікенцьевіч, н. у 1893, расстраляны 29.12.1937.

ЧУГАЙ Антон Антонавіч, н. у 1912, расстраляны 21.7.1938.

ШАДЗЬКО Франц Андрэевіч, н. у 1907, расстраляны 21.7.1938.

ШАХНО Мікалай Іванавіч, н. у 1871, расстраляны 11.3.1938.

ШВЕР Антон Сідаравіч, н. у 1879, расстраляны 20.10.1937.

ШПАКОЎСКІ Мікалай Мікалаевіч, н. у 1893, расстраляны 22.5.1938.

ШУМАК Максім Пракопавіч, н. у 1890, расстраляны 5.1.1938.

ШУМАК Павел Арцёмавіч, н. у 1871, расстраляны 16.2.1939.

ШУМАК Прохар Якаўлевіч, н. у 1881, расстраляны 16.2.1938.

ШЫЛЯНОК Васіль Іванавіч, н. у 1904, працаваў сакратаром Мазырскага акрвыканкама, расстраляны 29.12.1937.

ШЧЫПАНАЎ Іван Пятровіч, н. у 1875, слесар Мазырскай электрастанцыі, расстраляны 11.3.1938.

ЭЛЬКІН Якаў Беньямінавіч, н. у 1899, расстраляны 30.10.1937.

ЯКУБОЎСКІ Віктар Адамавіч, н. у 1908, расстраляны 28.1.1938.

ЯНЧАРУК Аляксандр Лаўрэнцьевіч, н. у 1907, расстраляны 27.4.1938.

ЯРМАК Павел Пятровіч, н. у 1895, расстраляны 27.9.1937.

АСАВЕЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АСАВЕЦ

ДУБЕНЬ Захар Фёдаравіч, н. у 1890, высланы ў 1934 у Сібір, далейшы лёс невядомы.

ПАШАК Іван Іванавіч, н. у 1899, расстраляны 25.5.1938.

УШЧЭНКА Яўгеній Міхайлавіч, н. у 1909, расстраляны 28.1.1938.

ВЁСКА АСАВЕЦКАЯ БУДА

БЯЛЯЦКІ Адам Іпалітавіч, н. у 1870, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

КАРАСЕВІЧ Ігнат Сцяпанавіч, н. у 1871, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА ГІНЕВІЧАЎ ГРУД

БЫЧКОЎСКІ Макар Аляксандравіч, н. у 1861, высланы ў 1933 на Поўнач, далейшы лёс невядомы.

ПАШАК Андрэй Пятровіч, н. у 1890, высланы ў 1934 на Поўнач, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА ГЛІНІЦА

ВЫСОЦКІ Сяргей Барысавіч, н. у 1886, высланы ў 1933 на Поўнач, далейшы лёс невядомы.

РАДАЎНЯ Карп Назаравіч, н. у 1900, арыштаваны ў 1938, далейшы лёс невядомы.

ЦАЛКА Пётр Мікалаевіч, арыштаваны ў 1938, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА ЗІМАВАЯ БУДА

ЖУРАЎСКІ Мікалай Сцяшанавіч, н. у 1872, расстраляны 10.11.1937.

КАШЭВІЧ Аляксандр Андрэевіч, н. у 1897, расстраляны 7.11.1937.

КАШЭВІЧ Іван Казіміравіч, калгаснік, расстраляны 16.2.1938.

КАШЭВІЧ Пётр Казіміравіч, н. у 1894, старшыня мясцовага калгаса, расстраляны 16.2.1938.

КАШЭВІЧ Іван Канстанцінавіч, н. у 1899, арыштаваны ў 1937, памёр у лагеры 25.3.1938.

КАШЭВІЧ Рыгор Адамавіч, н. у 1870, расстраляны 26.10.1937.

РЭВУТ Васіль Адамавіч, н. у 1881, расстраляны 26.10.1937.

РЭВУТ Іван Мацвеевіч, н. у 1904, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

РЭВУТ Іосіф Мікалаевіч, н. у 1881, расстраляны 2.11.1937.

РЭВУТ Лявон Мацвеевіч, н. у 1902, расстраляны 5.1.1938.

РЭВУТ Міхаіл Мацвеевіч, н. у 1900, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

РЭВУТ Уладзімір Васілевіч, н. у 1903, расстраляны 7.12.1937.

РЭВУТ Уладзімір Мацвеевіч, н. у 1899, расстраляны 7.12.1937.

ХМЯЛЕЎСКІ Піліп Фёдаравіч, н. у 1883, расстраляны 5.1.1938.

ЧЫРЫЧ Лявон Рыгоравіч, н. у 1898, расстраляны 5.1.1938.

ЯШЧЫКОЎСКАЯ Кацярына Рыгораўна, н. у 1894, расстраляна 26.10.1937.

ЯШЧЫКОЎСКІ Антон Аляксандравіч, н. у 1868, расстраляны 26.10.1937.

ЯШЧЫКОЎСКІ Іван Іосіфавіч, н. у 1859, арыштаваны ў 1938, памёр у лагеры 17.11.1938.

ЯШЧЫКОЎСКІ Лук'ян Антонавіч, н. у 1921, арыштаваны ў 1937, загінуў у лагеры ў 1943.

ЯШЧЫКОЎСКІ Міхаіл Іванавіч, н. у 1905, расстраляны 26.10.1937.

ЯШЧЫКОЎСКІ Рыгор Станіслававіч, н. у 1902, расстраляны 16.2.1938.

ЯШЧЫКОЎСКІ Сямён Іванавіч, н. у 1900, расстраляны 16.2.1938.

ЯШЧЫКОЎСКІ Фёдар Станіслававіч, н. у 1908, расстраляны 16.2.1938.

ЯШЧЫКОЎСКІ Яўхім Іванавіч, н. у 1902, расстраляны 16.2.1938.

ВЁСКА КАМЕНЬ

МАРЦІНОВІЧ Фёдар Арэнавіч, н. у 1879, расстраляны 16.2.1938.

ВЁСКА КРУШНІКІ

ЗДАНЕВІЧ Карп Іванавіч, н. у 1895, забіты пры арышце ў 1937.

ЗДАНЕВІЧ Уладзімір Іванавіч, н. у 1881, расстраляны 24.11.1937.

ЗДАНЕВІЧ Фёдар Іванавіч, н. у 1901, расстраляны 26.10.1937.

КАШАЕД Павел Пятровіч, н. у 1892, расстраляны 26.10.1937.

КАШАЕД Пётр Фёдаравіч, н. у 1884, расстраляны 16.2.1938.

КАШАЕД Рыгор Мікалаевіч, н. у 1888, расстраляны 24.12.1937.

КАШАЕД Фёдар Фёдаравіч, н. у 1901, расстраляны 26.10.1937.

КАШЭВІЧ Іосіф Іванавіч, н. у 1902, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

КАШЭВІЧ Іосіф Мікалаевіч, н. у 1900, расстраляны 26.10.1937.

КАШЭВІЧ Франц Мікалаевіч, н. у 1891, расстраляны 26.10.1937.

КРУПА Дзмітрый Юльянавіч, н. у 1890, расстраляны 1.12.1937.

КРУПА Лявон Пятровіч, н. у 1901, расстраляны 26.10.1937.

КРУПА Мікалай Іванавіч, н. у 1895, расстраляны 26.10.1937.

КРУПА Пётр Аўгуставіч, н. у 1865, расстраляны 26.10.1937.

КРУПА Пётр Іванавіч, н. у 1900, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

КРУПА Якаў Пятровіч, н. у 1889, расстраляны 26.10.1937.

РЭВУЦКІ Андрэй Васілевіч, н. у 1898, расстраляны 26.10.1937.

РЭВУЦКІ Апанас Васілевіч, н. у 1892, расстраляны 26.10.1937.

ФАЛІНСКАЯ Сабіна Іосіфаўна, н. у 1887, расстраляна 16.2.1938.

ФАЛІНСКІ Віктар Іосіфавіч, н. у 1899, расстраляны 26.10.1937.

ФАЛІНСКІ Пётр Іосіфавіч, н. у 1901, расстраляны 26.10.1937.

ФІЦНЕР Іосіф Адамавіч, н. у 1889, высланы ў красавіку 1930 у Сібір, далейшы лёс невядомы.

ЮНІЦКІ Аляксандр Антонавіч, н. у 1889, старшыня мясцовага калгаса, расстраляны 26.10.1937.

ЮНІЦКІ Антон Пятровіч, н. у 1872, расстраляны 26.10.1937; яго сыны: **Пётр,** н. у 1890, арыштаваны ў 1930, асуджаны на 10 гадоў і загінуў у месцах зняволення, **Фёдар,** н. у 1897, расстраляны 26.10.1937, **Яфрэм,** н. у 1903, расстраляны 26.10.1937, **Васіль,** н. у 1912, расстраляны 26.10.1937, **Іван,** н. у 1914, расстраляны 24.12.1937, нявестка **Ефрасіння Іванаўна ЮНІЦКАЯ,** н. у 1897, расстраляна 20.3.1938.

ЮНІЦКІ Васіль Антонавіч, н. у 1912, расстраляны 26.1.1937.

ЮНІЦКІ Іосіф Іванавіч, н. у 1904, расстраляны 16.2.1938.

Я. А. Юніцкі

ЮНІЦКІ Лявон Карпавіч, н. у 1896, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

ЮНІЦКІ Пётр Юзэфавіч, н. у 1900, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

ЮНІЦКІ Мацвей Юльянавіч, н. у 1912, расстраляны 16.10.1938.

ЮНІЦКІ Юльян Людвікавіч, н. у 1896, расстраляны 29.2.1937.

ЮНІЦКІ Антон Адамавіч, н. у 1884, расстраляны 26.10.1937.

ЮНІЦКІ Пётр Адамавіч, н. у 1887, расстраляны 26.10.1937.

ЮНІЦКІ Мікалай Адамавіч, н. у 1910, расстраляны 26.10.1937.

ЮНІЦКІ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1886, расстраляны 26.10.1937.

ЮНІЦКІ Пётр Іосіфавіч, н. у 1887, расстраляны 26.10.1937.

ВЁСКА КРЫНІЧНАЯ ГРАДА

БАГІНСКІ Антон Іванавіч, н. у 1891, расстраляны 21.7.1938.

БАГІНСКІ Эдвард Антонавіч, н. у 1880, расстраляны 21.7.1938.

БЕРДНІК Якаў Іванавіч, н. у 1892, старшыня мясцовага калгаса, расстраляны 21.7.1938.

МАЛАК Караль Антонавіч, н. у 1911, арыштаваны ў 1937, загінуў у 1943 у Магаданскай вобл.

ПІНКОЎСКІ Юльян Іосіфавіч, н. у 1889, расстраляны 19.11.1937.

ВЁСКА СКАЛОДЗІН

БАБЁР Станіслаў Іванавіч, н. у 1890, высланы ў 1932 у Архангельскую вобл., дзе і загінуў.

ЦАЛКА Іосіф Мікалаевіч, н. у 1905, высланы ў 1933 у Сібір, далейшы лёс невядомы.

ЦАЛКА Мікалай Рыгоравіч, н. у 1879, сын **Пётр Мікалаевіч,** н. у 1902, **яго жонка і 4 дзяцей,** высланы ў 1932 у Сібір, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА СПРЫМАЧОЎ (цяпер не існуе)

БЕК Павел Іванавіч, н. у 1866, расстраляны 19.11.1937.

КОРЖ Фёдар Пятровіч, н. у 1900, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

КРУПА Андрэй Юльянавіч, н. у 1893, расстраляны 24.12.1937.

КРУПА Уладзімір Юльянавіч, н. у 1904, расстраляны 24.12.1937.

МАЗУРКЕВІЧ Уладзімір Ігнатавіч, н. у 1902, расстраляны 10.2.1937.

МІЦУРА Мацвей Пятровіч, н. у 1898, расстраляны 28.5.1938.

САНЧУКОЎСКІ Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1901, расстраляны 24.12.1937.

СУРЖЫЦКІ Адам Станіслававіч, н. у 1907, расстраляны 5.1.1938.

СУРЖЫЦКІ Арсен Адамавіч, н. у 1904, расстраляны 16.2.1938.

ФІЦНЕР Мікалай Адамавіч, н. у 1889, расстраляны 16.2.1938.

ФІЦНЕР Пётр Адамавіч, н. у 1907, расстраляны 5.1.1938.

ВЁСКА ТУРБІНКА

ГАЛЕНЯ Рыгор Іванавіч, н. у 1900, расстраляны 27.11.1937.

ГАЛІЦКІ Лука Іосіфавіч, н. у 1870, арыштаваны ў 1937, загінуў у лагеры 3.1.1940.

ЖУРАЎСКІ Віктар Якаўлевіч, н. у 1892, расстраляны 21.3.1937.

БАРБАРОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БАРБАРОЎ

КОТ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1892, расстраляны 20.10.1937.

КУНЕЦ Іосіф Якаўлевіч, н. у 1895, расстраляны 24.12.1937.

НАВІЦКІ Сцяпан Яўстратавіч, н. у 1890, расстраляны 21.7.1938.

ШСКУН Канстанцін Ульянавіч, н. у 1896, расстраляны 20.10.1937.

ВЁСКА ГОРНАЯ

АЛЬХОЎСКІ Мечыслаў Іосіфавіч, н. у 1904, расстраляны 29.11.1938.

КАМЕНКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БЯРОЗАЎКА

АНТОНЕНКА Мікалай Васілевіч, н. у 1890, высланы ў пачатку 30-х гадоў у Сібір, далейшы лёс невядомы.

АСІПОВІЧ Васіль Васілевіч, н. у 1904, расстраляны 28.1.1938.

ВАСКЕВІЧ Сцяпан Данілавіч, н. у 1900 у в. Бярозаўка, рабочы ў Хабараўскай вобл., расстраляны 22.5.1938 у Мазыры.

СТАНКЕВІЧ Адольф Паўлавіч, н. у 1895, расстраляны 16.2.1938.

СТАНКЕВІЧ Браніслаў Паўлавіч, н. у 1902, расстраляны 28.1.1938.

ФЕДАРЭНКА Клімянцій Рыгоравіч, н. у 1899, расстраляны 16.2.1938.

ВЁСКА ВАСЬКАЎКА

ЖЫЛЬСКІ Сцяпан Іванавіч, н. у 1903, высланы ў пачатку 30-х гадоў у Сібір, далейшы лёс невядомы.

КАЧЭНЯ Герасім Емяльянавіч, н. у 1870, расстраляны 10.11.1937.

МІШОТА Апанас Аляксеевіч, н. у 1872, расстраляны 27.9.1937.

МІШОТА Дзям'ян Яўтухавіч, н. у 1890, высланы ў пачатку 30-х гадоў у Сібір, дзе і памёр.

САЧУК Ігнат Сцяпанавіч, н. у 1895, высланы ў пачатку 30-х гадоў у Сібір, далейшы лёс невядомы.

СУПОНЕНКА Радзівон Сцяпанавіч, н. у 1904, асуджаны ў 1937 на 10 гадоў, загінуў 1.4.1942.

ВЁСКА ВЯЛІКІ БОКАЎ

КАЛАЦЭЙ Рыгор Аўрамавіч, н. у 1900, высланы ў пачатку 30-х гадоў у Сібір, далейшы лёс невядомы.

РЭПІЧ Якаў Яўлампіевіч, н. у 1893, расстраляны 21.7.1938.

ВЁСКА ГОСТАЎ

БЕРАЗОЎСКІ Гаўрыла Пятровіч, н. у 1895, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

БЕРАЗОЎСКІ Павел Пятровіч, н. у 1890, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

МАЗУРКЕВІЧ Аляксей Ігнатавіч, н. у 1890, расстраляны 24.12.1937.

ВЁСКА МЛЫНОК

АБРАМЕНКА Іван Сяргеевіч, н. у 1903, **АБРАМЕНКА Сяргей Сцяпанавіч,** н. у 1880, **ГОЛІК Нічыпар Іванавіч,** н. у 1900 — высланы ў пачатку 30-х гадоў у Сібір, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА МЯЛЕШКАВІЧЫ

БЕЛЫ Васіль Аляксандравіч, н. у 1900, арыштаваны ў пачатку 30-х гадоў і высланы ў Сібір, далейшы лёс невядомы.

БІКША Іван Аўгуставіч, н. у 1903, расстраляны 2.10.1937.

БЯГЛЯК Васіль Калінікавіч, н. у 1900, царкоўны стараста, расстраляны 11.3.1938.

БЯГЛЯК Макар Парфёнавіч, н. у 1892, расстраляны 11.3.1938.

ВІКЕНЦЕЎ Франк Пятровіч, н. у 1900, высланы ў пачатку 30-х гадоў, далейшы лёс невядомы.

ПЕТРУШЭВІЧ Баляслаў Феліксавіч, н. у 1914, расстраляны 7.12.1937.

ЦІХАНАЎ Калінік Несцеравіч, н. у 1898, арыштаваны ў 1937, асуджаны да 10 гадоў зняволення, памёр 13.10.1941.

ШУРЫНАЎ Яфім Платонавіч, н. у 1898, ляснічы, расстраляны 29.12.1937.

КОЗЕНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БАБРАНЯТЫ

БОБРЫК Даніла Пракопавіч, н. у 1872, расстраляны 2.10.1937.

ПОТАР Максім Лук'янавіч, н. у 1909, сакратар Бабраняцкага сельсавета, асуджаны ў 1932 на 5 гадоў зняволення, далейшы лёс невядомы.

ХАЗАНОВІЧ Вульф Майсеевіч, н. у 1886, старшыня калгаса імя Калініна, асуджаны 27.8.1936 на 5 гадоў зняволення, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА БУЛАЎКІ

БУЛАЎКА Пётр Ісакавіч, н. у 1899, расстраляны 27.9.1937.

ВЁСКА ДРАЗДЫ

АЛЬШЭЎСКІ Альбін Канстанцінавіч, н. у 1897, арыштаваны ў 1937, загінуў у месцах зняволення 27.9.1938.

АЛЬШЭЎСКІ Уладзіслаў Вікенцьевіч, н. у 1868, расстраляны 11.3.1938.

БАНДАРЭНКА Віктар Пятровіч, н. у 1891, расстраляны 10.11.1937.

ВЯРАКСА Іосіф Станіслававіч, н. у 1891, загадчык фермы, расстраляны 15.11.1938.

ВЯРАКСА Казімір Баляслававіч, н. у 1888, арыштаваны ў 1938 і асуджаны на 8 гадоў зняволення, дзе і памёр 17.4.1942.

ВЯРАКСА Леанард Іванавіч, н. у 1883, арыштаваны ў 1933 і асуджаны на 10 гадоў зняволення, дзе і памёр 20.9.1939.

ВЯРАКСА Пётр Уладзіміравіч, н. у 1876, высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

ГРЫГАРОВІЧ Аляксандр Лявонавіч, н. у 1896, арыштаваны ў 1938 і асуджаны на 8 гадоў зняволення, далейшы лёс невядомы.

ДРАЗДОВІЧ Казімір Станіслававіч, н. у 1874, расстраляны 2.4.1933.

Сям'я Ромбакаў. 1936

РАКІЦКІ Пётр Карлавіч, н. у 1913, расстраляны 11.3.1938.

РОМБАК Адам Вікенцьевіч, н. у 1887, брыгадзір мясцовага калгаса, расстраляны 27.9.1937.

РОМБАК Генадзь Адамавіч, н. у 1915, трактарыст МТС, расстраляны 24.1.1938.

РОМБАК Генрых Адамавіч, н. у 1916, расстраляны 16.2.1938.

РОМБАК Міхаіл Адамавіч, н. у 1911, бухгалтар аддзялення сувязі, расстраляны 29.12.1937.

РОМБАК Франц Адамавіч, н. у 1918, расстраляны 27.4.1938.

ХУТАР МОЛАЖАВА

ХАРАШУК Яфрэм Канстанцінавіч, н. у 1890, расстраляны 24.12.1937.

ВЁСКА НЕ ЎСТАНОЎЛЕНА

ШУРМЕЛЬ Рыгор Міхайлавіч, н. у 1899, расстраляны 22.5.1938.

МАХНАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ДЗЕРБІНКА

КАНОПЛІЧ Барыс Аляксеевіч, н. у 1878, расстраляны 24.12.1937.

КАСАК Майсей Антонавіч, н. у 1884, расстраляны 1.11.1937.

СЕЛЬВІЧ Пракоп Сямёнавіч, н. у 1885, расстраляны 19.11.1937.

ВЁСКА ЗАБАЛАЦЦЕ

КУЛІЦКІ Антон Іосіфавіч, н. у 1895, расстраляны 16.2.1938.

КУЛІЦКІ Карп Іосіфавіч, н. у 1896, расстраляны 20.10.1937.

КУЛІЦКІ Тамаш Іосіфавіч, н. у 1908, расстраляны 16.2.1938.

МАШЧЫЦ Рыгор Самойлавіч, н. у 1898, арыштаваны ў 1937, памёр у зняволенні 24.8.1937.

МУРАШКА Васіль Захаравіч, н. у 1893, расстраляны 16.2.1938.

ПОЛЯК Вацлаў Людвігавіч, н. у 1907, расстраляны 16.2.1938.

ПОЛЯК Іван Людвігавіч, н. у 1887, расстраляны 2.11.1937.

ПОЛЯК Іосіф Людвігавіч, н. у 1898, расстраляны 16.2.1938.

ПОЛЯК Людвік Мацвеевіч, н. у 1866, расстраляны 16.2.1938.

ПОЛЯК Станіслаў Людвігавіч, н. у 1901, расстраляны 16.2.1938.

ПОЛЯК Эдуард Людвігавіч, н. у 1914, расстраляны 16.2.1938.

ТРОШКА Іларыён Пятровіч, н. у 1891, расстраляны 11.3.1938.

ХАРЛАНЧУК Павел Захаравіч, н. у 1888, расстраляны 10.11.1937.

ВЁСКА ЗАВОДНЫ ВОСТРАЎ

АБРАМЧУК Мікалай Ермалаевіч, н. у 1904, расстраляны 7.12.1937.

АЛЬХОЎСКІ Браніслаў Пятровіч, н. у 1904, расстраляны 28.1.1938.

АЛЬХОЎСКІ Вячаслаў Іосіфавіч, н. у 1908, расстраляны 29.11.1937.

АЛЬХОЎСКІ Іван Вікенцьевіч, н. у 1888, расстраляны 1.12.1937.

АЛЬХОЎСКІ Лявонцій Вікенцьевіч, н. у 1898, расстраляны 1.12.1937.

АЛЯНЦЭВІЧ Аляксандр Іосіфавіч, н. у 1893, расстраляны 10.11.1937.

БРАНІЦКІ Іван Рыгоравіч, н. у 1896, расстраляны 16.2.1938.

ВАЛЮЖЫНЕЦ Банед Альбінавіч, н. у 1894, расстраляны 10.11.1937.

ГАНЕЦКІ Пётр Ігнатавіч, н. у 1884, расстраляны 10.11.1937.

ГРЫШКЕВІЧ Іван Фёдаравіч, н. у 1907, расстраляны 1.12.1937.

ДАВЫД Пётр Іосіфавіч, н. у 1910, расстраляны 1.12.1937.

ДЗЕРАНГОЎСКІ Антон Людвігавіч, н. у 1897, расстраляны 10.11.1937.

ДЗЕРАНГОЎСКІ Баляслаў Людвігавіч, н. у 1890, расстраляны 5.11.1937.

ДЗЕРАНГОЎСКІ Вікенцій Людвігавіч, н. у 1885, расстраляны 19.11.1937.

ДЗЕРАНГОЎСКІ Станіслаў Людвігавіч, н. у 1912, расстраляны 1.12.1937.

КАЗЛЯКОЎСКІ Аляксей Сяргеевіч, н. у 1904, расстраляны 1.12.1937.

КАЗЛЯКОЎСКІ Дзмітрый Сяргеевіч, н. у 1901, расстраляны 20.3.1938.

ЛЯШЧЫНСКІ Адам Феліксавіч, н. у 1863, расстраляны 31.1.1938.

ЛЯШЧЫНСКІ Станіслаў Адамавіч, н. у 1890, расстраляны 9.6.1937.

ЛІТВІНЧУК Аляксей Сцяпанавіч, н. у 1903, расстраляны 10.11.1937.

ЛІТВІНЧУК Ігнат Сцяпанавіч, н. у 1907, расстраляны 16.2.1938.

ЛІТВІНЧУК Канстанцін Міхайлавіч, н. у 1908, расстраляны 26.10.1937.

ЛІТВІНЧУК Міхаіл Панцялеевіч, н. у 1877, расстраляны 24.12.1938.

ЛІТВІНЧУК Сцяпан Панцялеевіч, н. у 1878, расстраляны 24.8.1937.

ЛІТВІНЧУК Якаў Андрэевіч, н. у 1904, расстраляны 24.12.1937.

МАЛІНОЎСКІ Спірыдон Іванавіч, н. у 1904, расстраляны 1.12.1937.

НОВАК Антон Францавіч, н. у 1884, расстраляны 1.12.1937.

ПАЎЛЕНКА Фёдар Фёдаравіч, н. у 1901, расстраляны 19.11.1937.

ВЁСКА ЗЯЛЁНЫ МОХ

ВЯРАКСА Валерый Марцінавіч, н. у 1898, расстраляны 26.10.1937.

ГЛЕЗА Іосіф Іванавіч, н. у 1894, расстраляны 11.3.1938.

ЧАРНЕЦКІ Эдуард Іосіфавіч, н. у 1913, расстраляны 22.5.1938.

ЮДЗІЦКІ Стэфан Яўхімавіч, н. у 1892, расстраляны 5.1.1938.

ВЁСКА МАХНАВІЧЫ

ГУРЫН Сцяпан Ільіч, н. у 1890, расстраляны ў 1930.

ДЗЕНІСЕНКА Пётр Сцяпанавіч, ЗАЯЦ Дзмітрый Ануфрыевіч, ЗАЯЦ Емяльян Аляксандравіч, ЗАЯЦ Ігнат Савіч — высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

КАНОПЛІЧ Ілья Нікіфаравіч, н. у 1900, расстраляны 24.12.1937.

КАНОПЛІЧ Іван Сіліч, КАНОПЛІЧ Пётр Сіліч, н. у 1890, **КАНОПЛІЧ Сямён Платонавіч,** н. у 1895, **КАПЫЛОВІЧ Анісім Сцяпанавіч,** н. у 1870, **КАПЫЛОВІЧ Сава Іванавіч** — высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

ЛЕЎЧЫК Дзяніс Васілевіч, н. у 1900, расстраляны 7.12.1937.

ЛУЗАН Сідар Міхайлавіч, н. у 1886, **ЛЯДВІГ Міхаіл Пятровіч,** н. у 1890, **МАШЧЫЦ Емяльян Васілевіч** — арыштаваны ў пачатку 30-х гадоў, далейшы лёс невядомы.

МАШЧЫЦ Рыгор Самуілавіч, н. у 1898, расстраляны 24.8.1937.

ПАШКЕВІЧ Павел Сцяпанавіч, н. у 1888, старшыня мясцовага калгаса, арыштаваны ў 1936 і прыгавораны да 6 гадоў зняволення, далейшы лёс невядомы.

ПАШЭЎСКІ Арсень Лаўрэнцьевіч, н. у 1901, расстраляны 2.12.1937.

РАЖОК Карп Філарэтавіч, н. у 1892, расстраляны 24.12.1937.

СЕЛЬВІЧ Фёдар Сямёнавіч, н. у 1890, царкоўны стараста, расстраляны ў 1930.

ХЛІСТУН Пётр Іванавіч, высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА ПАДЛЯДЗІЧЫ

КАНОПЛІЧ Андрэй Якаўлевіч, н. у 1904, расстраляны 19.11.1937.

КАНОПЛІЧ Ігнат Ермалаевіч, н. у 1886, расстраляны 29.11.1937.

КАНОПЛІЧ Іларыён Савіч, н. у 1905, расстраляны 19.11.1937.

КАНОПЛІЧ Пракоп Фёдаравіч, н. у 1901, расстраляны 24.12.1937.

КАНОПЛІЧ Якім Зіноўевіч, н. у 1872, расстраляны 7.12.1937.

ЛАСОЎСКІ Міхаіл Абрамавіч, н. у 1893, расстраляны 1.12.1937.

МАЦЮК Герасім Мікітавіч, н. у 1883, расстраляны 10.11.1937.

СТЭЦКІ Аляксей Антонавіч, н. у 1898, расстраляны 10.11.1937.

СТЭЦКІ Сяргей Антонавіч, н. у 1905, расстраляны 29.11.1937.

МІХАЛКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА КУСТАЎНІЦА (цяпер не існуе)

АБРАМОВІЧ Адам Адольфавіч, н. у 1890, арыштаваны ў 1937 і асуджаны на 10 гадоў зняволення, памёр 13.4.1943.

АБРАМОВІЧ Аляксандр Уладзіслававіч, н. у 1895, расстраляны 21.1.1938.

АБРАМОВІЧ Аляксандр Фларыянавіч, н. у 1908, расстраляны 16.2.1938.

АБРАМОВІЧ Геранім Баляслававіч, н. у 1902, расстраляны 11.3.1938.

АБРАМОВІЧ Іван Баляслававіч, н. у 1904, расстраляны 28.1.1938.

АБРАМОВІЧ Іосіф Леапольдавіч, н. у 1893, расстраляны 26.1.1937.

АБРАМОВІЧ Іосіф Уладзіслававіч, н. у 1909, расстраляны 11.3.1938.

АБРАМОВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1885, расстраляны 28.1.1938.

АБРАМОВІЧ Сігізмунд Баляслававіч, н. у 1883, расстраляны 22.5.1938.

АБРАМОВІЧ Станіслаў Тафілевіч, н. у 1916, расстраляны 21.6.1938.

АБРАМОВІЧ Тафіль Іванавіч, н. у 1890, расстраляны 21.6.1938.

АБРАМОВІЧ Фелікс Юльянавіч, н. у 1864, расстраляны 19.11.1937.

АБРАМОВІЧ Фларыян Іванавіч, н. у 1880, расстраляны 19.11.1937.

АВАДОЎСКІ Іосіф Фадзеевіч, н. у 1882, расстраляны 21.6.1938.

АМБРАЖЭВІЧ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1915, расстраляны 24.12.1937.

БАРОЎСКІ Адам Кліменцьевіч, н. у 1910, расстраляны 19.11.1937.

ВІСЛАВУХ Адольф Іосіфавіч, н. у 1910, расстраляны 28.1.1938.

ВІСЛАВУХ Дамінік Андрэевіч, н. у 1906, арыштаваны ў 1937, асуджаны на 10 гадоў зняволення, далейшы лёс невядомы.

ВІСЛАВУХ Іосіф Кліменцьевіч, н. у 1895, расстраляны 27.11.1938.

ВІСЛАВУХ Іосіф Уладзіслававіч, н. у 1905, расстраляны 16.2.1938.

ВІСЛАВУХ Міхаіл Аўгусцінавіч, н. у 1897, расстраляны 19.11.1937.

ВІСЛАВУХ Міхаіл Кліменцьевіч, н. у 1883, расстраляны 27.4.1938.

ВІСЛАВУХ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1917, расстраляны 27.7.1938.

ВІСЛАВУХ Фелікс Апанасавіч, н. у 1888, расстраляны 19.11.1937.

ВІСЛАВУХ Часлаў Аўгусцінавіч, н. у 1887, расстраляны 11.10.1938.

ДЗЕРАНГОЎСКІ Вільгельм Францавіч, н. у 1905, расстраляны 11.3.1938.

ДЗЕРАНГОЎСКІ Іван Мікалаевіч, н. у 1905, расстраляны 16.2.1938.

ДЗЕРАНГОЎСКІ Кліменцій Антонавіч, н. у 1883, расстраляны 29.11.1937.

ДЗЕРАНГОЎСКІ Напалеон Францавіч, н. у 1902, расстраляны 11.3.1938.

А. І. Віславух

Ю. А. Дзерангоўскі

Ф. Б. Дзетнер

Ф. І. Збароўскі

ДЗЕРАНГОЎСКІ Станіслаў Мікалаевіч, н. у 1907, расстраляны 27.4.1938.

ДЗЕРАНГОЎСКІ Юльян Антонавіч, н. у 1902, расстраляны 28.1.1938.

ДЗЕРАНГОЎСКІ Эразм Фадзеевіч, н. у 1860, расстраляны 26.10.1937.

ДЗЕТНЕР Антон Баляслававіч, н. у 1904, расстраляны 16.2.1938.

ДЗЕТНЕР Франц Баляслававіч, н. у 1895, расстраляны 21.7.1938.

ДУБІНЕЦКІ Іван Іванавіч, н. у 1898, расстраляны 19.11.1937.

ЗБАРОЎСКІ Аляксандр Рэанальдавіч, н. у 1905, расстраляны 14.10.1937.

ЗБАРОЎСКІ Андрэй Яраслававіч, н. у 1896, расстраляны 20.10.1937.

ЗБАРОЎСКІ Баляслаў Іосіфавіч, н. у 1867, расстраляны 2.12.1937.

ЗБАРОЎСКІ Іосіф Ануфрыевіч, н. у 1897, расстраляны 28.1.1938.

ЗБАРОЎСКІ Станіслаў Яраслававіч, н. у 1894, расстраляны 28.1.1938.

ЗБАРОЎСКІ Уладзіслаў Вітольдавіч, н. у 1909, расстраляны 28.1.1938.

ЗБАРОЎСКІ Франц Іосіфавіч, н. у 1892, расстраляны 14.10.1937.

У. В. Збароўскі

А. В. Ламановіч

Ф. У. Пятроўскі

Х. М. Міхальчук

ЗУБРЫЦКІ Аляксандр Іванавіч, н. у 1899, арыштаваны ў 1938 і асуджаны на 10 гадоў зняволення, далейшы лёс невядомы.

КЕЛЬ Станіслаў Актавільянавіч, н. у 1895, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

КУНЦЭВІЧ Баляслаў Сцяпанавіч, н. у 1882, расстраляны 14.10.1937.

ЛАМАНОВІЧ Аляксандр Вітольдавіч, н. у 1904, расстраляны 28.1.1938.

ЛАМАНОВІЧ Франц Вітольдавіч, н. у 1908, расстраляны 16.2.1938.

ПЯТРОЎСКІ Адам Мечыслававіч, н. у 1896, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

ПЯТРОЎСКІ Вацлаў Адамавіч, н. у 1864, расстраляны 26.10.1937.

ПЯТРОЎСКІ Іосіф Ануфрыевіч, н. у 1871, расстраляны 14.10.1937.

ПЯТРОЎСКІ Уладзіслаў Мечыслававіч, н. у 1903, расстраляны 19.11.1937.

ПЯТРОЎСКІ Франц Уладзіслававіч, н. у 1896, расстраляны 26.10.1937.

РАКІЦКІ Іосіф Купрыянавіч, н. у 1878, расстраляны 19.11.1937.

РАКІЦКІ Іосіф Феліксавіч, н. у 1908, расстраляны 21.7.1938.

РАКІЦКІ Мар'ян Дамінікавіч, н. у 1904, расстраляны 19.11.1937.

РАКІЦКІ Франц Канстанцінавіч, н. у 1888, расстраляны 14.10.1937.

РАКІЦКІ Франц Купрыянавіч, н. у 1876, расстраляны 26.10.1937.

РОМБАК Уладзіслаў Савінавіч, н. у 1899, расстраляны 7.12.1937.

САПЛІЦ Казімір Пятровіч, н. у 1877, расстраляны 10.11.1937.

САПЛІЦ Канстанцін Емяльянавіч, н. у 1903, расстраляны 16.2.1938.

САПЛІЦ Напалеон Пятровіч, н. у 1898, расстраляны 28.1.1938.

СТАНКЕВІЧ Мар'ян Іванавіч, н. у 1907, расстраляны 20.10.1937.

СТАНКЕВІЧ Уладзіслаў Іванавіч, н. у 1887, арыштаваны ў 1937, асуджаны на 10 гадоў зняволення, далейшы лёс невядомы.

СТАНКЕВІЧ Уладзіслаў Эдуардавіч, н. у 1887, высланы ў пачатку 30-х гадоў у Сібір, далейшы лёс невядомы.

ШАРАЙ Баляслаў Іванавіч, н. у 1881, расстраляны 27.4.1938.

ШАРАЙ Рамуальд Амбросавіч, н. у 1897, расстраляны 16.2.1938.

ВЁСКА МАЛЫ БАКАВЕЦ

ДАВЫДОВІЧ Аляксей Васілевіч, н. у 1893, брыгадзір будаўнічай брыгады калгаса, расстраляны 14.10.1937.

ДУБРАЎ Аляксей Паўлавіч, н. у 1893, расстраляны 14.10.1937.

КАЗАРЧУК Іван Мікітавіч, н. у 1897, расстраляны 9.10.1938.

ШУЛЬГА Максім Патапавіч, н. у 1888, расстраляны 27.9.1937.

ШУЛЬГА Мікіта Радзівонавіч, н. у 1890, высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

ШУЛЬГА Піліп Барысавіч, н. у 1888, арыштаваны ў 1939 і асуджаны на 5 гадоў зняволення, далейшы лёс невядомы.

ШУЛЬГА Сцяпан Барысавіч, н. у 1888, расстраляны 14.10.1937.

ВЁСКА МІХАЛКІ (цяпер не існуе)

АХРАМЕНКА Дзмітрый Аляксеевіч, н. у 1887, расстраляны 27.9.1937.

ГАЛІЕНКА Уладзімір Якаўлевіч, н. у 1896, расстраляны 21.7.1938.

ГАРЭЛЬКА Іван Пятровіч, н. у 1855, расстраляны 10.11.1937.

ГНЕДЗЬКА-МАНЕВІЧ Лявон Аляксеевіч, н. у 1908, арыштаваны ў 1937, памёр у зняволенні 9.1.1942.

ГРЫБОЎСКІ Васіль Цярэнцьевіч, н. у 1892, расстраляны 20.10.1937.

ДАНІЛЬЧУК Пётр Банедавіч, н. у 1880, расстраляны 14.10.1937.

КАЧАНОЎСКІ Адам Іванавіч, н. у 1877, расстраляны 27.4.1938.

КАЧАНОЎСКІ Ігнат Уладзіслававіч, н. у 1875, расстраляны 27.9.1937.

МІХАЙЛАЎ Мікалай Радзівонавіч, н. у 1913, расстраляны 11.3.1938.

МІХАЛЬЧУК Хрыстафор Мікалаевіч, н. у 1883, расстраляны 14.10.1937.

НІКІЦЕНКА Пётр Андрэевіч, н. у 1875, расстраляны 24.8.1937.

НІКІЦЕНКА Фёдар Андрэевіч, н. у 1874, арыштаваны ў 1938, далейшы лёс невядомы.

РУДНІЦКІ Аляксандр Антонавіч, н. у 1896, расстраляны 11.3.1938.

ВЁСКА МІЦЬКІ

СУХОЦКІ Антон Іванавіч, н. у 1892, прыгавораны 12.2.1933 да 10 гадоў зняволення, расстраляны 9.12.1937.

СУХОЦКІ Вікенцій Амброжавіч, СУХОЦКІ Людвіг Амброжавіч – высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА ПРАЎЦЮКІ

ЖОЛУДЗЬ Нічыпар Верамеевіч, н. у 1893, расстраляны 20.10.1937.

ТАКВЭЛЬ Іван Васілевіч, н. у 1908, расстраляны 28.1.1938.

ВЁСКА РУДНЯ МІХАЛКАЎСКАЯ

ГАРБАР Емяльян Васілевіч, н. у 1893, расстраляны 27.9.1937.

ГЛЮЗ Іван Фёдаравіч, н. у 1891, расстраляны 15.2.1938.

ДВОРАК Іван Васілевіч, н. у 1872, расстраляны 11.3.1938.

ДУБРОВА Андрэй Іосіфавіч, н. у 1882, расстраляны 12.3.1938.

НОВІК Васіль Рыгоравіч, н. у 1908, расстраляны 11.3.1938.

ВЁСКА СТАРАСЕЛЛЕ

ВАКУЛЬЧУК Лявон Іванавіч, н. у 1901, расстраляны 27.10.1937.

ПРУДКОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БАРЫСКАВІЧЫ

ЕЎЖЫК Міхаіл Ульянавіч, н. у 1886, арыштаваны ў 1933, далейшы лёс невядомы.

КАПОРА Емяльян Трафімавіч, н. у 1900, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

КОЗЫР Якім Сцяпанавіч, н. у 1885, расстраляны 27.9.1937.

ТАКАРСКІ Фёдар Мікалаевіч, н. у 1895, арыштаваны ў 1933, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА ЗАГОРЫНЫ

ІСКРЫЦКІ Генадзь Фёдаравіч, н. у 1910, расстраляны 31.8.1938.

КАМЕНСКІ Аляксандр Платонавіч, н. у 1888, асуджаны ў 1937 на 10 гадоў зняволення, дзе і памёр 30.4.1938.

ЛУК'ЯНОВІЧ Павел Сцяпанавіч, н. у 1890, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

МІРАНЧУК Аляксандр Харытонавіч, н. у 1884, расстраляны 21.7.1938.

ШІСКУН Ананій Сямёнавіч, н. у 1896, арыштаваны ў 1933, далейшы лёс невядомы.

СІКОРСКІ Аляксандр Іванавіч, н. у 1896, расстраляны ў 1937.

ВЁСКА МЕРАБЕЛЬ

ЛУК'ЯНОВІЧ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1895, расстраляны 13.5.1933.

ПРУС Уладзімір Максімавіч, н. у 1894, расстраляны 27.11.1938.

ПРУС Цімафей Максімавіч, н. у 1892, расстраляны 27.11.1938.

ВЁСКА ПРУДОК

АБРАМАЎ Леанід Дзмітрыевіч, н. у 1914, расстраляны 21.7.1938.

ВАРАБ'ЁЎ Іван Яфрэмавіч, н. у 1891, арыштаваны ў 1937, асуджаны на 10 гадоў зняволення і памёр 1.6.1942.

ВЯДРЫЦКІ Міхаіл Кузьміч, н. у 1895, расстраляны 21.7.1938.

ДАЛІНЧУК Даніла Апанасавіч, н. у 1890, арыштаваны ў пачатку 30-х гадоў, далейшы лёс невядомы.

ЛЯВОНЧЫК Еўдакім Міхайлавіч, н. у 1877, расстраляны 31.1.1938.

МАЗГОЎ Анісім Анісімавіч, н. у 1855, высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

МУРАШКА Якаў Віктаравіч, н. у 1865, расстраляны 31.11.1938.

САЛЯНІК Давыд Архіпавіч, н. у 1891, расстраляны 21.7.1938.

САЛЯНІК Марк Давыдавіч, н. у 1913, расстраляны 21.7.1938.

ТРЫНКУН Вікенцій Вікенцьевіч, н. у 1888, арыштаваны ў 1938, асуджаны на 5 гадоў зняволення і памёр у 1944.

ХАЙКМАН Меер В., н. у 1894, высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

ХАЙКМАН Фая М., н. у 1894, высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

ЧАРНЯКОЎ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1900, арыштаваны ў 1938, далейшы лёс невядомы.

СКРЫГАЛАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БАЛАЖЭВІЧЫ

ДАМАСЕВІЧ Міхаіл Пятровіч, н. у 1890, высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

ЧУЛКЕВІЧ Уладзімір Фёдаравіч, н. у 1870, настаяцель мясцовай царквы, расстраляны 14.10.1937.

ШАСТАВЕЦ Карп Савіч, н. у 1896, расстраляны 27.9.1937.

ШПАКОЎСКІ Сямён Мікалаевіч, н. у 1892, расстраляны 27.9.1937.

ЯГЛІНСКІ Уладзімір Амбросавіч, н. у 1908, расстраляны 5.1.1938.

ЯСТРЭМСКІ Мікіта Яўхімавіч, н. у 1900, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА БЕЛАЯ

ГРАМОВІЧ Яўстафій Іванавіч, н. у 1907, расстраляны 16.2.1938.

ВЁСКА ЖАХАВІЧЫ

БАБРОЎНІК Аляксандр Цімафеевіч, н. у 1900, арыштаваны ў 1939, загінуў у месцах зняволення.

ЛАЎРАНЧУК Нікан Якаўлевіч, н. у 1870, высланы ў 1935 за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

ЛЕВАНОВІЧ Адам Севасцьянавіч, н. у 1855, расстраляны 27.9.1937.

ЛЕВАНОВІЧ Андрэй Адамавіч, н. у 1895, высланы ў 1935 за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

НАСТУПЕЕЎ Якім Іванавіч, н. у 1890, высланы ў 1934 у Сібір, далейшы лёс невядомы.

РАБЧАНКА Андрэй Піліпавіч, н. у 1902, арыштаваны ў 1941, памёр у 1942 у зняволенні.

ТКАЧ Фёдар Марцінавіч, н. у 1887, расстраляны 16.2.1938.

ВЁСКА ЛЕШНЯ

МІЦУРА Мацвей Пятровіч, н. у 1900, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

ПУЗАН Ігнат Сямёнавіч, н. у 1874, расстраляны 19.10.1938.

ВЁСКА НАДАТКІ

БАРАНОЎСКІ Адам Ігнатавіч, н. у 1896, арыштаваны ў 1937, асуджаны на 10 гадоў зняволення, далейшы лёс невядомы.

ДАМАСЕВІЧ Цімафей Сямёнавіч, н. у 1857, расстраляны 27.9.1937.

КУЛАКОЎСКІ Макар Рыгоравіч, н. у 1890, расстраляны 27.9.1937.

КУЛАКОЎСКІ Павел Рыгоравіч, н. у 1890, расстраляны 27.9.1937.

КАЧЭНЯ Марк Фядотавіч, КАЧЭНЯ Рыгор Маркавіч — высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА СКРЫГАЛАЎ

АБРАМОВІЧ Антон Міхайлавіч, н. у 1879, расстраляны 16.2.1938.

КОЙХМАН Шмуэль Вульфавіч, н. у 1895, расстраляны 17.3.1938.

ЛЯНСКІ Рувім Мееравіч, н. у 1908, расстраляны 29.12.1937.

ЛЯХЕВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1860, высланы ў 1932 за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

ПКУЗА Аляксандр Мацвеевіч, н. у 1883, расстраляны 27.9.1937.

ПКУЗА Антон Піліпавіч, н. у 1890, высланы ў пачатку 30-х гадоў у Сібір, далейшы лёс невядомы.

ПКУЗА Мікалай Ільіч, н. у 1879, расстраляны 14.10.1937.

РАДЗЕВІЧ Аляксандр Антонавіч, н. у 1901, аграном саўгаса, арыштаваны ў пачатку 30-х гадоў, далейшы лёс невядомы.

РАДЗЕВІЧ Уладзімір Антонавіч, н. у 1889, рахункавод мясцовага калгаса, расстраляны 14.10.1937.

СЕРАПІН Рыгор Васілевіч, н. у 1897, расстраляны 14.10.1937.

ФРЫДМАН Гілько Нохімавіч, н. у 1910, загадчык гаспадаркі школы, расстраляны 20.10.1937.

ЧАРНЕЦКІ Антон Аляксандравіч, н. у 1907, расстраляны 24.12.1937.

ВЁСКА РУДНЯ СКРЫГАЛАЎСКАЯ

ЧАРКАСАЎ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1902, высланы ў пачатку 30-х гадоў у Томскую вобласць, дзе і расстраляны ў 1937.

ВЁСКА ЯСЕНЕЦ

КАМЕНСКІ Андрэй Адамавіч, н. у 1900, высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

СЛАБАДСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БУДА КАЗІМІРАЎСКАЯ

АСТРЭЙКА Раман Паўлавіч, н. у 1905, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

ВАРАБЕЙ Аляксандр Андрэевіч, н. у 1909, расстраляны 20.10.1937.

ВЁСКА ВЯЛІКІЯ ЗІМОВІШЧЫ

АСТАПЕНКА Іван Пятровіч, н. у 1902,

АСТАПЕНКА Сцяпан Іванавіч, н. у 1900, **КРАСЮК Сямён Рыгоравіч,** н. у 1874 — высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

КРАСЮК Сцяпан Захаравіч, н. у 1885, расстраляны 16.2.1938.

ВЁСКА МАЛЫЯ ЗІМОВІШЧЫ

КОЛАС Сямён Раманавіч, н. у 1903, арыштаваны ў 1937, памёр у месцах зняволення, 18.12.1941.

ВЁСКА КАЗІМІРАЎКА

КАЗАК Васіль Антонавіч, н. у 1875, расстраляны 27.9.1937.

ВЁСКА КАСЦЮКОВІЧЫ

ГРАД Васіль Фаміч, н. у 1896, расстраляны 16.2.1938.

МІСЕВІЧ Фёдар Кузьміч, н. у 1879, расстраляны 11.3.1938.

ШЭЎКА Адам Сцяпанавіч, ШЭЎКА Ганна Міхайлаўна, ШЭЎКА Павел Адамавіч — высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА МАЙСЕЕЎКА

НАЗАРАНКА Мікалай Рыгоравіч, н. у 1898, расстраляны 10.3.1938.

ВЁСКА РАМАНАЎКА

АСТРЭЙКА Пётр Сідаравіч, н. у 1880, **ЖУРАЎСКІ Васіль Андрэевіч,** н. у 1898, **ЖУРАЎСКІ Сцяпан Андрэевіч,** н. у 1901, **ЛУШНА Агей Маркавіч,** н. у 1897 — высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

НАВУМЕНКА Віктар Мікалаевіч, н. у 1896, высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

НАВУМЕНКА Улас Паўлавіч, н. у 1910, арыштаваны ў 1933 і прыгавораны да 5 гадоў зняволення, далейшы лёс невядомы.

ПАЛХОЎСКІ Міхаіл Венядзіктавіч, н. у 1894, старшыня мясцовага калгаса, расстраляны 16.2.1938, яго жонка **ПАЛХОЎСКАЯ Ганна Фёдараўна,** н. у 1901, настаўніца мясцовай школы, асуджана на 8 гадоў зняволення.

СУПОНЕНКА Гаўрыла Яўтухавіч, н. у 1896, высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

М. І. Налівайка

ВЁСКА СЛАБАДА

БАРАНОЎСКІ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1883, расстраляны 14.3.1930.

БЕЛЬСКІ Захар Яўстратавіч, н. у 1880, расстраляны 16.2.1938.

ГНЕДЗЬКА Лаўрэнцій Фёдаравіч, н. у 1908, **ГНЕДЗЬКА Фёдар Васілевіч,** н. у 1888, **ДАШКЕВІЧ Васіль Сцяпанавіч,** н. у 1882 — высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

ЖОГ Уладзімір Іванавіч, н. у 1893, настаяцель мясцовай царквы, расстраляны 27.9.1937.

ЗБАРОЎСКІ Уладзімір Іосіфавіч, н. у 1899, расстраляны 21.7.1938.

ПАПАВЕЦ Андрэй Максімавіч, н. у 1890, расстраляны 16.2.1938.

ВЁСКА ХАМІЧКІ

КУХАРЭНКА Андрэй Сямёнавіч, н. у 1900, высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

НІКІЦЕНКА Якім Пракопавіч, н. у 1903, **НІКІЦЕНКА Іосіф Данілавіч,** н. у 1900 — арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА ШЧАКАТАВА

КАЧАН Павел Ігнатавіч, н. у 1902, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

КАЧАН Харытон Адамавіч, н. у 1908, расстраляны 21.7.1938.

КАШАВЕНКА Іван Аляксандравіч, н. у 1891, расстраляны 21.7.1938.

КАШАВЕНКА Мацвей Андрэевіч, н. у 1888, расстраляны 21.7.1938.

КАШАВЕНКА Пётр Парфіравіч, н. у 1894, расстраляны 21.7.1938.

КАШАВЕНКА Фёдар Парфенавіч, н. у 1890, арыштаваны ў 1937, далейшы лёс невядомы.

КАШАВЕНКА Яўхім Арцёмавіч, н. у 1880, расстраляны 21.7.1938.

КУРМАЗ Якаў Іванавіч, н. у 1900, высланы ў пачатку 30-х гадоў за межы рэспублікі, далейшы лёс невядомы.

ЛЕМБА Лявон Мацвеевіч, н. у 1897, старшыня мясцовага калгаса, расстраляны 29.12.1937.

НАЛІВАЙКА Мікіта Іванавіч, н. у 1901, арыштаваны ў 1937, асуджаны на 10 гадоў зняволення, дзе і памёр 15.3.1944.

СУЛІМСКІ Іван Фёдаравіч, н. у 1895, арыштаваны ў пачатку 30-х гадоў і асуджаны на 8 гадоў зняволення, далейшы лёс невядомы.

СЧЫСЛЁНАК Аляксей Андрэевіч, н. у 1913, дырэктар пачатковай школы, арыштаваны ў 1937, памёр у зняволенні ў жніўні 1938.

ТАРАСЕВІЧ Даніла Юльянавіч, н. у 1896, расстраляны 3.10.1938.

ШАЦЬКО Іван Пятровіч, н. у 1900, брыгадзір калгаса, арыштаваны ў 1938, далейшы лёс невядомы.

Па матэрыялах КДБ, філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр і сельскіх Саветаў спіс падрыхтавалі

І. Піліпчук, П. Шут

Ваяваў на Хасане

За вузкай паласой граніцы — чужая краіна Маньчжурыя... Праз паўгода службы Купрыян Мельчанка быў прызначаны наводчыкам гарматы. У часці аказаліся землякі. Мазыранінамі былі камандзір дывізіі Бацюня, саслужыўцы Пазняк, Галушкевіч...

У канцы лета 1938 г. дывізію падняліпа баявой трывозе. Паходным маршам часці накіроўваліся да граніцы. «Самураі напалі», — пачуў Мельчанка.

Падыход да граніцы быў надзвычай цяжкім. Артылерыю перапраўлялі на руках па водмелях заліва Пятра Вялікага. Зброя была пакрыта ржою — ад салёнай вады...

Над сопкамі Заазёрнай і Безыменнай клубіўся парахавы дым. Пяхота вяла няспынны агонь. Батарэя Мельчанкі размясцілася на схіле сопкі, пачалася артылерыйская дуэль. Японцы пачалі танкавую атаку, гармата нашага земляка біла прамой наводкай... Асколак снарада трапіў у нагу. Наспех перавязаўшы рану, Мельчанка працягваў весці агонь.

Пяхота несла страты. Пакінуўшы гарматы, у атаку пайшлі артылерысты. Загінуў камандзір батарэі. Камандаванне прыняў на сябе Мельчанка. Шэсць разоў вадзіў ён байцоў у атаку.

У Крамлі М. І. Калінін уручаў узнагароды героям Хасана. Ва ўрачыстай цішыні прагучала прозвішча Мельчанкі. Міхаіл Іванавіч уручаў яму медаль «За баявыя заслугі».

У гады Вялікай Айчыннай вайны К. Мельчанка змагаўся з ворагам у партызанскім атрадзе, быў камандзірам узвода разведкі.

А. Камароў

Загінулі ў 1939—1940 гг.

ПРЫ ВЫЗВАЛЕННІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

ДУБРОВА Аляксей Іванавіч, н. у 1919 у Міхалкаўскім сельсавеце, рад., загінуў у баявых дзеяннях 26.9.1939.

У ВАЙНЕ З ФІНЛЯНДЫЯЙ

БЫЧКОЎСКІ Іван Дзям'янавіч, н. у 1915 у Асавецкім сельсавеце, рад., загінуў у 1940.

ДАНІЛЬЧУК Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1908 у в. Міхалкі, у Чырвонай Арміі з 1928, капітан, начальнік разведкі 27-й стралковай дывізіі, загінуў зімой 1940.

ДОРАХ Пётр Аляксандравіч, н. у 1903 у в. Міхалкі, рад., загінуў зімой 1939.

ЗАЯЦ Васіль Адамавіч, н. у 1917 у в. Дзербінка, рад., загінуў у 1940.

І. Д. Бычкоўскі

П. А. Дорах

КАНОПЛІЧ Фёдар Архіпавіч, н. у в. Падлядзічы, рад., загінуў зімой 1940.

КУЗЬМЕНКА Сяргей Пятровіч, н. у в. Рудня Каменская, рад., загінуў 9.2.1940.

КУРМАЗ Рыгор Маркавіч, н. у 1919 у в. Лешня, рад., загінуў зімой 1939.

МЕЛЬЧАНКА Дзмітрый Яўтухавіч, н. у в. Барбароў, памёр ад ран 2.10.1940 у г. Ленінград.

ТАРУН Сцяпан, н. у в. Козенкі, рад., загінуў у 1939.

ШЧЭРБІН Пётр, н. у в. Бібікі, рад., загінуў зімой 1939.

Па даных гаррайваенкамата
спіс падрыхтаваў

П. Шут

Мазыр — цэнтр Палескай вобласці

15 студзеня 1938 г. пастановай ЦВК БССР была ўтворана Палеская вобласць з цэнтрам у г. Мазыр. У склад яе ўвайшло 17 раёнаў былой Мазырскай акругі, якая існавала з 1924 г.: Акцябрскі, Брагінскі, Васілевіцкі, Глускі, Дамановіцкі, Ельскі, Жыткавіцкі, Калінкавіцкі, Камарынскі, Капаткевіцкі, Лельчыцкі, Мазырскі, Нараўлянскі, Парыцкі, Петрыкаўскі, Тураўскі, Хойніцкі; гарады Мазыр, Калінкавічы, Петрыкаў.

Вобласць была адной з найменш населеных у Беларусі: на 26 тыс. кв. км жыло каля 680 тыс. чалавек. У абласным цэнтры — 18 тыс. чалавек.

Вялікую плошчу вобласці займалі балоты і лясы. Большасць насельніцтва было занята ў сельскай гаспадарцы. У канцы 1940 г. налічвалася 1065 калгасаў, 8 саўгасаў, 26 МТС. Працавалі прадпрыемствы дрэваапрацоўчай прамысловасці, будаўнічых матэрыялаў, 5 торфазаводаў; найбольш буйное металаапрацоўчае прадпрыемства — арцель «Молат» (200 рабочых). На ўсіх прамысловых прадпрыемствах вобласці на 1.1. 1941 г. працавала 15 590 рабочых. Вяліся вялікія меліярацыйныя работы (толькі ў 1939 г. асушана звыш 6 тыс. га балот).

Адкрыта звыш 900 школ, у тым ліку 83 сярэдніх, 258 сямігодак, у якіх навучалася звыш 130 тыс. вучняў, працавала 4783 настаўнікі. Мазырскае педагагічнае вучылішча за 15 год існавання да чэрвеня 1941 г. падрыхтавала 1155 настаўнікаў. Першыя 360 медработнікаў выйшлі з медыцынскага вучылішча.

Вялікай павагай у насельніцтва Мазыра і вобласці карыстаўся абласны драматычны тэатр, на сцэне якога ішлі п'есы Ф. Шылера, А. Астроўскага, К. Транёва, К. Крапівы, Э. Самуйлёнка і іншых драматургаў.

Бюджэт вобласці на 1940 г. складаў звыш 102 млн. рублёў, у тым ліку на народную асвету асігнавалася каля 54 млн. рублёў, на ахову здароўя насельніцтва — 19 млн., на сельскую гаспадарку — 4 млн., на мясцовую прамысловасць — 2 млн. рублёў.

Зразумела, што кіраўніцтва ўсім гаспадарчым і культурным будаўніцтвам у вобласці ажыццяўлялася з Мазыра абласнымі партыйнымі і савецкімі органамі, і гэта быў той вялікі кадравы, арганізацыйны патэнцыял, які асабліва актыўна быў выкарыстаны, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, — ужо ў першых мабілізацыйных мерапрыемствах, а затым і ў шырокім разгортванні на Мазыршчыне падпольнай барацьбы і ўсенароднага партызанскага руху.

Я. Фарбераў

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

У прыфрантавой паласе

У гісторыю Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа з нямецка-фашысцкімі захопнікамі Мазыршчына ўпісала сваю адметную яркую старонку.

Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР Палеская вобласць перастала быць прыгранічнай. Але ўжо на шосты дзень вайна дакацілася да яе мяжы. Баі на тэрыторыі вобласці ішлі з 28 чэрвеня па 3 верасня 1941 года. Два месяцы знаходзіўся ў прыфрантавой паласе абласны цэнтр Палесся — горад Мазыр.

Своечасова, у сцісłыя тэрміны была праведзена мабілізацыя ў армію. Прадпрыемствы горада пачалі працаваць на абарону. Быў сфарміраваны і пачаў дзейнічаць знішчальны батальён. На ўкамплектаванне каманднага і палітычнага складу 75-й стралковай дывізіі была накіравана група партыйных і савецкіх работнікаў горада і вобласці. Звыш 400 чалавек улілося ў склад 3-й арміі генерала В. І. Кузняцова, часці якой, выходзячы з варожага акружэння, зноў фарміраваліся ў раёне Мазыра.

Партыйныя, савецкія, камсамольскія арганізацыі Палескай вобласці прыступілі да арганізацыі спецыяльных атрадаў, якія атрымалі потым назву знішчальных батальёнаў. Яны ствараліся ў гарадах і райцэнтрах, у сельсаветах вобласці. У Мазыры, напрыклад, знішчальны батальён налічваў 300 чалавек, а асабовы склад такіх батальёнаў у вобласці — 4250 чалавек. Яны сачылі за месцамі магчымага прызямлення варожых шпіёнаў і дыверсантаў, неслі ахову чыгуначных вузлоў, станцый і іншых асабліва важных аб'ектаў, вялі разведку на фронце і ў тыле праціўніка, прымалі ўдзел у абарончых баях Чырвонай Арміі.

Баец-камсамолец Уладзімір Кіркавец з Мазырскага знішчальнага батальёна атрымаў ад адной з часцей Чырвонай Арміі заданне — разведаць размяшчэнне варожых войск у мястэчку Пціч. Ён паспяхова выканаў заданне. Дастаўленыя ім звесткі дазволілі нашай авіяцыі нанесці раптоўны і дакладны ўдар па скапленні войск і тэхнікі праціўніка. За гэты подзвіг адважны камсамолец быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Амаль адначасова з фарміраваннем знішчальных батальёнаў у гарадах і раёнах ствараласа народнае апалчэнне. У яго ішлі людзі, якія па розных прычынах не падлягалі прызыву ў дзеючую армію. Толькі ў Мазыры ў ліпені 1941 г. было сфарміравана 7 атрадаў народнага апалчэння з колькасцю байцоў у іх 238 чалавек, у сельскіх Саветах — групы народнага апалчэння. Потым на базе знішчальных батальёнаў, атрадаў і груп апалчэння ствараліся партызанскія атрады.

Знішчальныя батальёны і атрады народнага апалчэння аказвалі эфектыўную дапамогу часцям Чырвонай Арміі, якія вялі баі на подступах да Мазыра.

Праводзілася вялікая работа па арганізацыі падполля і партызанскіх атрадаў. Мірнае насельніцтва было мабілізавана на будаўніцтва ліній абароны. Такія лініі ствараліся па рэках Прыпяць і Пціч. Было таксама пабудавана некалькі вузлоў абароны, прыкрытых супрацьтанкавымі равамі.

На Мазыршчыне і ў іншых раёнах Палесся дзейнічала кавалерыйская група нашых войск. На подступах да Мазыра вялі жорсткія баі 75-я стралковая дывізія генерала С. І. Нядзвігіна і часці Мазырскага ўмацаванага раёна. У той час, калі нямецкія войскі ўжо выйшлі ў раён Смаленска і Вялікіх Лук, часці Заходняга фронту працягвалі абарончыя баі на Палессі...

Нежаданне гітлераўскіх стратэгаў разгортваць шырокае наступленне ў напрамку славутых Пінскіх балот, сумна вядомых ім яшчэ з гадоў першай сусветнай вайны, дзе назаўсёды спыніўся руска-германскі фронт, а таксама баявыя дзеянні савецкіх войск, упартае, гераічнае іх супраціўленне дазволіла мясцовым партыйным і савецкім органам Гомельскай і Палескай абласцей на працягу амаль двух месяцаў выкарыстоўваць усе людскія і матэрыяльныя рэсурсы для ўмацавання фронту, эвакуацыі на ўсход людзей, прадпрыемстваў і калгасна-кааператыўнай маёмасці.

Цяжкае становішча, якое склалася ў першыя дні вайны, настойліва патрабавала хуткай перабудовы прамысловасці, транспарту, сельскай гаспадаркі на ваенны лад. Мазырская арцель «Молат» за некалькі дзён асвоіла выпуск карпусоў гранат. Усе швейныя фабрыкі і майстэрні перайшлі на пашыў ваеннага абмундзіравання і амуніцыі, а хлебазаводы — да выпечкі галет. Усе аўтамайстэрні Мазыра і раёнаў Палескай вобласці прыступілі да рамонту франтавых машын. На прадпрыемствах Мазыра значна ўзрасла прадукцыйнасць працы. Камсамольцы фабрыкі «Прафінтэрн» Мар'ян Вінцукоўскі, Міхаіл Глега, Гапаякіна, Панкраценка, Рэвут і іншыя выконвалі вытворчыя заданні на 200 і больш працэнтаў.

У ліпені 1941 г. пачалася эвакуацыя насельніцтва і матэрыяльных каштоўнасцей ва ўсходнія раёны краіны. Мазырскія фанерныя заводы «Чырвоны Кастрычнік» і «Звязда», мэблевая фабрыка «Прафінтэрн», лесазавод «Пралетарый» былі вывезены ў Архангельскую, Пензенскую, Арлоўскую і іншыя вобласці. Усяго з Мазыра і іншых раёнаў Палескай вобласці было эвакуіравана 14 буйных прадпрыемстваў. З калгасаў вывезлі або эвакуіравалі сваім ходам 66 працэнтаў буйной рагатай жывёлы, 77 працэнтаў авечак і 15 працэнтаў свіней. Была эвакуіравана і значная частка сельскагаспадарчай тэхнікі.

Масавы ратны і працоўны подзвіг мазыран знайшоў працяг і развіццё ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў партызанскіх атрадах і ў патрыятычным падполлі. Але перавага сіл была на баку нямецкіх войск. Чырвоная Армія 22 жніўня 1941 г. пакінула апошні яшчэ не захоплены ворагам абласны цэнтр Беларусі — Мазыр.

А. Васько, Я. Фарбераў

З ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ЗАПІСКІ № 2 САКРАТАРА МАЗЫРСКАГА РАЙКАМА КП(б)Б У ЦК І ПАЛЕСКІ АБКАМ КП(б)Б АБ ХОДЗЕ МАБІЛІЗАЦЫІ Ў ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ ПА РАЁНЕ

24 чэрвеня 1941 г.

Сов. секретно.

Оповещение о мобилизации в РККА по сельсоветам, колхозам, населенным пунктам Мозырского района проходило путем проведения митингов, бесед среди населения, а также вручения повесток призываемым. Трудящиеся района выразили, что они готовы выполнить

любое задание партии и правительства. Тов. Артюшенко П. И. в Бобринятах на митинге сказал, что у него имеются 2 брата, которые служат в рядах РККА. Он также идет в армию добровольцем, чтобы вместе с братьями беспощадно бить зарвавшихся фашистских гадов.

Все призываемые из сельских советов своевременно, организованно, к установленному сроку явились на сборные пункты и направлены по воинским частям, согласно указаниям райвоенкомата.

Необходимо было призвать в РККА по району 788 чел. Призвано 701 чел. 87 чел. не явились потому, что они в день мобилизации [находились] и по настоящее время находятся на спецстроительстве в гор. Минске, Калинковичах, а также часть из них ранее призвана в РККА на сборы. В числе мобилизованных призвано коммунистов 20 чел., которые активно выступали на митингах, собраниях, а также проводили политмассовую работу среди призываемых.

Усиленно проходит работа по прополке полей в большинстве колхозов района («Коминтерн», им. Ворошилова и в др.).

Необходимо было направить в РККА 253 лошади, доставлено — 223, в связи с тем, что часть лошадей для артиллерии не подошла по стандарту. Для выполнения наряда присланы другие лошади. Повозок необходимо было предоставить 124, предоставлено — 108. Недоукомплектовано за счет двухколок, которые отсутствуют в районе, заменяются одноконными...

В настоящее время парторганизация района проводит большую политмассовую работу среди населения, организуя его на поднятие политической бдительности, охрану социалистического имущества, на укрепление дисциплины и увеличение производительности* труда на социалистических полях.

Секретарь Мозырского РК КП(б)Б *Голуб*

НА РБ. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 73. Л. 1, 2. Арыгінал.

Падрыхтаваў да друку
У. Лемяшонак

* У дакументе «продуктивности».

З ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ЗАПІСКІ САКРАТАРА ПАЛЕСКАГА АБКАМА КП(б)Б П. А. ЛЯВІЦКАГА АБ СТВАРЭННІ І ДЗЕЙНАСЦІ ЗНІШЧАЛЬНЫХ БАТАЛЬЁНАЎ У ВОБЛАСЦІ

8 ліпеня 1941 г.

...В г. Мозыре истребительный батальон состоял из 300 человек... В районе от 200 до 300 чел. В связи с всеобщей мобилизацией значительная часть бойцов батальона призвана в Красную Армию. В настоящее время, по состоянию на 8 июля, в гор. Мозыре в батальоне осталось 120 человек, в районах области осталось 1276 человек, из них 1249 мужчин и 27 женщин. На вооружении истребительных батальонов и работников НКВД области имеется 974 винтовки, 3 станковых и 4 ручных пулемета. Пулеметами вооружены батальоны гор. Мозыря, Туровского района, Октябрьского и Домановичского районов...

Секретарь Полесского обкома КП(б) Белоруссии *Левицкий*

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Документы и материалы. Мн., 1967. Т. 1. С. 60—62.

ПАСТАНОВА ПАЛЕСКАГА АБКАМА КП(б)Б АБ ВЫКАНАННІ ДЫРЭКТЫВЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА АБАРОНЫ СССР АД 22 ЛІПЕНЯ 1941 г.*

23 ліпеня 1941 г.

1. Директиву Государственного комитета обороны СССР от 22 июля принять к немедленному выполнению.

2. Обязать секретарей райкомов КП(б)Б и председателей исполкомов райсоветов и земельные органы Туровского, Житковичского, Петриковского, Копаткевичского, Глусского, Паричского, Октябрьского, Домановичского, Лельчицкого, Ельского, Василевичского, Калинковичского районов уничтожить все посевы сахарной свеклы, кок-сагыза, льна-

* З пратакола.

долгунца, конопли и других технических культур, произведенные колхозами, совхозами и другими государственными организациями, путем скашивания, скармливания, вытаптывания скотом и другими способами.

3. Из общественных или государственных посевов зерновых культур и картофеля передать остающимся колхозникам по 1,5—2 га на хозяйство. Всю остальную часть посевов зерновых культур и картофеля уничтожать путем скашивания в зеленом виде на фураж для нужд Красной Армии, скармливания и вытаптывания скотом, сжигания и т. п.

4. Обком КП(б)Б обязывает Наровлянский, Хойникский, Брагинский, Комаринский и Мозырский райкомы КП(б)Б и райисполкомы распространить действие настоящего решения в случае, если будет создаваться угроза занятия территории районов противником.

НА РБ. Ф. 4126. Воп. 1. Спр. 2. Л. 18. Арыгінал.

Падрыхтаваў да друку
У. Лемяшонак

ПАСТАНОВА ПАЛЕСКАГА АБКАМА КП(б)Б АБ АРГАНІЗАЦЫІ БАРАЦЬБЫ Ў ТЫЛЕ ГЕРМАНСКІХ ВОЙСК

23 ліпеня 1941 г.

1. В соответствии с постановлением ЦК ВКП(б) об организации борьбы в тылу германских войск утвердить областную тройку по руководству подпольно-коммунистическими ячейками и партизанским движением.

5. Поручить председателю облисполкома тов. Зайцеву выделить необходимое количество денег, одежды, продовольствия и радиоприемников для партизанских отрядов и подпольных парторганизаций.

6. Предложить начальнику УНКВД тов. Строкину и первым секретарям РК КП(б)Б подготовить переход истребительных батальонов в партизанские отряды, причем руководствоваться принципом строгого индивидуального отбора каждого бойца, посылаемого в партизанские отряды.

Всенародное партизанское движение ... Т. 1. С. 73—74.

Як ратавалі жывёлу

З успамінаў Р. С. Шуера

Нарадзіўся я ў 1927 годзе ў вёсцы Раманаўка Мазырскага раёна. З 1932 г. жыў з бацькамі ў суседняй вёсцы Надаткі. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны вучыўся ў Скрыгалаўскай сярэдняй школе, збіраўся паступаць у Ленінградскае чыгуначнае вучылішча. Але не давялося. Пачалася вайна...

22 чэрвеня 1941 г. жыхароў вёскі склікалі на мітынг, які адбыўся каля школы. Старшыня калгаса А. Навуменка і яго намеснік Церашковіч паведамілі, што Германія напала на СССР і пачалася вайна. Адразу людзі не паверылі. У газетах пісалі, што Германія дружалюбная краіна, забаранялася называць яе фашысцкай, а Гітлера і Мусаліні — фашыстамі. Таму паведамленне аб вайне было нечаканым. Але давялося паверыць, і некаторыя жанчыны заплакалі.

Пасля мітынгу мне і маім таварышам Віктару Казаку і Аркадзю Байдзе далі коней і даручылі ездзіць у Скрыгалаўскі сельсавет, вазіць справаздачы, а назад прывозіць распараджэнні, што паступалі туды ад вышэйшай улады.

На фронт з калгаса пайшло 47 чалавек, у тым ліку ўсе мясцовыя камуністы і 7 камсамольцаў. Кіраваць гаспадаркай даручылі пажылому калгаснік у Кузьме Кадолу. У камсамольскай арганізацыі засталіся Ганна Чарэўка, Віктар Казак, Аркадзь Байда, Емяльян Мішота, Мікалай Навуменка, Уладзімір Чарэўка і я. На мяне былі ўскладзены абавязкі сакратара.

Камсамольская арганізацыя выконвала распараджэнні партыйных і савецкіх органаў: мы выходзілі на дзяжур-

ствы, сачылі, каб не парушаліся правілы святломаскіроўкі і г. д. У адно з нашых дзяжурстваў мы атрымалі распараджэнне спаліць на палях неабмалочанае збожжа або раздзяліць снапы між калгаснікамі.

У пачатку ліпеня 1941 г. паступіў загад аб эвакуацыі калгаснай жывёлы, таму што немцы падышлі да нашай вобласці. Мне і маім таварышам Віктару Казаку і Аркадзю Байдзе было даручана гнаць на ўсход калгасных кароў, цялят, валоў, коней і авечак. Гналі праз вёскі Слабада, Зімовішчы, Каменка, Навікі (мост цераз Прыпяць) і далей на Лоеў Гомельскай вобласці. Каля Мазыра нас абстраляў нямецкі разведвальны самалёт «рама». Але мы здолелі пераправіцца з жывёлай па мосце цераз Прыпяць і пагналі яе ўздоўж ракі. Тут жывёлу можна было і папасвіць. Дабраліся да вёскі Града Калінкавіцкага раёна, што ля Юравіч. Пасвілі там жывёлу каля двух тыдняў. Туды ж нам прывезлі новы загад — коней і валоў вярнуць у Надаткі. Тром камсамольцам — С. Грамовічу, П. Дробышу і М. Навуменку перадалі кароў, цялят і авечак, якіх яны пагналі далей на ўсход, а я з таварышамі коней і валоў павярнуў назад. Нашы зменшчыкі за Лоевам перадалі жывёлу мясцовым пагоншчыкам. Там нашых хлопцаў мабілізавалі ў армію.

Праз некалькі дзён мы прыгналі коней і валоў у свой калгас. Перад самай акупацыяй на нарадзе членаў праўлення калгаса з удзелам старых калгаснікаў было вырашана падзяліць калгасных коней і валоў: адзін конь або вол на дзве калгасныя сям'і. У першую чаргу надзяляліся рабочай жывёлай сем'і, з якіх хто-небудзь ваяваў на фронце.

У канцы жніўня 1941 г. праз нашы Надаткі на Казіміраўку праехалі нямецкія матацыклісты — мясцовасць апынулася ў тыле ворага. Камсамольцам давялося дзейнічаць у новых умовах. Пачалі са збору зброі і боепрыпасаў. Выходзілі на дарогі, часцей за ўсё на шлях Петрыкаў — Скрыгалаў — Мазыр, па якім нядаўна адступалі чырвонаармейцы і мусілі пакінуць разбітыя машыны і фурманкі. Падбіралі гранаты, патроны, вінтоўкі. Сам я знайшоў некалькі соцень патронаў, дзве скрынкі гранат, а таварышы падабралі ручны кулямёт, аўтамат, некалькі вінтовак. Усё гэта хавалі ў патаемных месцах у лесе. Так для нас, учарашніх школьнікаў, пачаліся чорныя дні фашысцкага «новага парадку», з якім кожны сумленны чалавек змагаўся, як толькі мог...

Чэкісты ў сорак першым

З успамінаў А. Г. Скокава, былога супрацоўніка Палескага абласнога ўпраўлення НКУС

Я працаваў у Палескім абласным упраўленні НКУС упаўнаважаным сакрэтна-палітычнага аддзела. Напярэдадні вайны быў пасланы на курсы пры вышэйшай школе НКУС СССР, вярнуўся ў Мазыр у красавіку 1941 г. Мяне прызначылі намеснікам начальніка аддзела, а ў пачатку вайны — яго начальнікам.

У ноч на 22 чэрвеня 1941 г. увесь асабовы склад упраўлення працаваў да 2—3 гадзін ночы, ніхто не ішоў дамоў. У 4 гадзіны 20 мінут памочнік дзяжурнага па НКУС Васільеў паведаміў, што германскія войскі напалі на нашу краіну. Намеснік начальніка ўпраўлення НКУС Р. І. Слепаў выклікаў усіх супрацоўнікаў па трывозе. (Начальнік аблупраўлення НКУС І. Н. Івашчанка напярэдадні выехаў у службовую камандзіроўку ў Беласток.) На нарадзе Слепаў сказаў, што германскія войскі перайшлі граніцу, вядуць баі з нашай арміяй, а нямецкая авіяцыя бамбіла Кіеў. Аб'явіў для ўсіх супрацоўнікаў НКУС казарменнае становішча.

У панядзелак прыехаў І. Н. Івашчанка і на нарадзе расказаў, што на

дарогах у раёне Беластока бачыў страшныя вынікі вайны — загінуўшых людзей, разбітыя аўтамашыны. Ён паставіў супрацоўнікам аддзелаў канкрэтныя задачы аператыўнай работы і сказаў: «Не выключана, што нам прыйдзецца часова пакінуць сваю тэрыторыю. Вораг яе можа захапіць, таму трэба стварыць падполле...»

У раённыя аддзелы перадаваліся ўказанні І. Н. Івашчанкі па арганізацыі патрыятычнага падполля. Рабіў гэта і я. У Мазыры было створана каля 10 падпольных груп на выпадак акупацыі горада.

У пачатку ліпеня 1941 г. мяне выклікаў І. Н. Івашчанка. Ён сказаў, што ў абласным камітэце партыі фарміруецца абласная тройка, куды патрэбен супрацоўнік упраўлення НКУС. Задача тройкі — аб'яднаць работу ўсіх органаў, якія займаюцца стварэннем падполля, арганізацыяй партызанскага руху ў вобласці, і, магчыма, застацца на акупіраванай ворагам тэрыторыі. Вырашана ўключыць у тройку і мяне. У дапамогу Івашчанка выдзеліў маладога і энергічнага работніка контрразведвальнага аддзела ўпраўлення Чыгіра. У гэты ж дзень я быў выкліканы да першага сакратара Палескага абкама КП(б)Б П. А. Лявіцкага, дзе ўжо былі старшыня аблвыканкама Т. Г. Зайцаў, першы сакратар Мазырскага гаркама партыі Кавалёў. Тройка займалася пытаннямі забеспячэння падполля зброяй, прадуктамі і г. д. На пасяджэнні выслухалі мяне, што зроблена і робіцца ўпраўленнем НКУС па забеспячэнні ўсім неабходным створанага падполля.

Дадзеныя мне партыйнымі органамі і органамі НКУС даручэнні былі ў асноўным выкананы. Падрыхтаваны для работы ў тыле ворага спецгрупы. Для кіраўніцтва імі і іншымі падпольнымі арганізацыямі пакінуты некалькі вопытных супрацоўнікаў НКУС, што прыбылі з заходніх абласцей Беларусі. Сярод іх былі Мурзікаў і Пазнякоў. Яны добрасумленна выконвалі даручэнні. Пазнякова потым выдаў здраднік, яго расстралялі ў пачатку 1942 г., а Мурзікаў і іншыя пайшлі ў партызанскі атрад.

На адным з пасяджэнняў тройкі мне было даручана арганізаваць склад медыкаментаў і перавязачных сродкаў, каб перадаць іх потым у партызанскія атрады. Да вайны я добра ведаў фельчара Мазырскай санэпідстанцыі М. Я. Рудніцкага. Ён без ваганняў згадзіўся з маёй прапановай прыняць удзел у арганізацыі склада і дапамагчы будучаму атраду медыкаментамі.

У першыя дні вайны паступіла распараджэнне аб пасылцы 5 супрацоўнікаў контрразведкі з Мазыра ў Пінск на дапамогу мясцоваму ўпраўленню НКУС. Праз некаторы час стала вядома, што тры супрацоўнікі з пасланых загінулі ў Пінску. На жаль, прозвішчы іх засталіся невядомымі.

Адным з важнейшых мерапрыемстваў у тыя дні было стварэнне знішчальных батальёнаў. Яны лавілі варожых парашутыстаў, папярэджвалі паніку, нярэдка ўдзельнічалі ў эвакуацыі калгаснай жывёлы ў савецкі тыл. Супрацоўнікам упраўлення, якія знаходзіліся ў раёнах, было сказана, што ў выпадку, калі раёны будуць захоплены ворагам, яны павінны ўступіць у партызанскія атрады.

Вайна толькі пачыналася, але ўжо былі страты. У ліпені 1941 г. у Дамановічах пры бамбардзіроўцы райцэнтра загінуў Барыс Хайкін.

У пачатку вайны немцы, каб забяспечыць паспяховы рух сваіх войск у глыб нашай краіны, часта арганізоўвалі ў прыфрантавых раёнах правакацыі, сеялі паніку сярод насельніцтва. Звычайна звесткі, атрыманыя ад невядомых па тэлефоне, не пацвярджаліся. Але былі сігналы і іншага характару. Неяк з Калінкавіцкага аддзела НКУС паведамілі, што падбіты нямецкі самалёт зрабіў у полі вымушаную пасадку. Па трывозе быў падняты знішчальны батальён, якім камандаваў Мятліцкі. Байцы батальёна вялі бой з нямецкімі лётчыкамі, якія знялі з самалёта буй-

накаліберны кулямёт, іншае ўзбраенне і доўга супраціўляліся. Байцы ўзялі ў палон лётчыка і перадалі яго ў абласны ваенкамат, а стралок і радыст былі забіты.

Жнівеньскія дні 1941 г. былі заняты арганізацыяй сувязі паміж падполлем Мазыра і раёнаў вобласці. 20 жніўня па заданні сакратара АК КП(б)Б Турыка і старшыні аблвыканкама Зайцава я з супрацоўнікам Чыгіром выехаў у Хойніцкі і Брагінскі раёны, каб падрыхтаваць базы ўзбраення і харчоў, наладзіць з мясцовым кіраўніцтвам сувязі.

20—21 жніўня 1941 г. у Брагіне мы займаліся стварэннем партызанскага атрада. У яго былі ўключаны работнікі партыйнага апарата, міліцыі і іншыя актывісты. Турык і Зайцаў паехалі ў Чарнігаў, дзе ў гэты час знаходзіўся штаб 21-й арміі, членам Ваеннага савета якой быў П. А. Лявіцкі.

Калі яны вярнуліся ў Брагін, нам было прапанавана адшукаць начальніка Палескага ўпраўлення НКУС І. Н. Івашчанку і паступіць у яго распараджэнне. У канцы жніўня мы знайшлі Івашчанку ў Болхаве Арлоўскай вобласці. Ён сказаў, што па ўказанні Наркамата ўнутраных спраў СССР усе супрацоўнікі органаў з Палескай вобласці павінны на месцы кіраваць партызанскім рухам і патрыятычным падполлем. Нам было загадана выехаць на фронт у напрамку Палескай вобласці і па заданні асобых аддзелаў весці разведку праціўніка. Шлях наш ляжаў назад, у занятую к гэтаму часу ворагам вобласць.

Чорныя дні акупацыі

Акупіраваўшы Палессе, Мазыр і раён, гітлераўцы пачалі ўстанаўліваць свой «новы парадак». Людзі пазбаўляліся ўсіх правоў на чалавечае існаванне, бо знішчаліся ўстановы культуры, асветы, аховы здароўя, а ўрэшце гэта быў крывавы чалавеканенавісніцкі рэжым масавага знішчэння насельніцтва.

Тэрыторыя Беларусі была падзелена на часткі. Паўднёвыя раёны Палескай, Гомельскай і Брэсцкай абласцей былі адарваны ад Беларусі і далучаны да рэйхкамісарыята Украіны. На Палессі ўтварылі чатыры акругі — Мазырскую, Васілевіцкую, Ельскую і Петрыкаўскую, якія падпарадкоўваліся жытомірскаму гебітскамісарыяту. У гарадах і райцэнтрах з'явіліся назначаныя акупантамі бургамістры, у сельскай мясцовасці — старасты. Былі створаны паліцэйскія ўчасткі, лагеры, гета.

Кожнага, хто выклікаў хоць невялікае падазрэнне акупацыйных улад, арыштоўвалі, адпраўлялі ў турмы ці лагеры, адкуль мала хто мог выйсці жывым. У першую чаргу забівалі камуністаў, камсамольцаў, савецкіх работнікаў, калгасных актывістаў. Поўнаму знішчэнню падлягала яўрэйскае насельніцтва Мазыра і раёна. З восені 1941 г. па вясну 1942 г. адбываліся масавыя расстрэлы яўрэяў, якія не паспелі эвакуіравацца ў савецкі тыл.

З ростам партызанскага руху, узмацненнем супраціўлення захопнікам узмацняліся і рэпрэсіі. У шалёнай ярасці гітлераўцы знішчалі мірнае насельніцтва, жанчын, дзяцей, старых. Часта людзей забівалі па стандартным абвінавачанні «за сувязь з партызанамі».

Ад расстрэлаў асобных людзей гітлераўцы перайшлі да масавага знішчэння насельніцтва многіх вёсак раёна. 22 сакавіка 1943 г. у вёсцы Казіміраўка былі расстраляны 358 чалавек, у тым ліку жанчыны і дзеці, спалена 76 хат. У той жа дзень у Будзе Казіміраўскай было забіта 127 жыхароў, спалена 32 хаты. У чэрвені 1943 г. была спалена вёска Раманаўка, забіта 30 сялян.

Жудасную расправу ўчынілі гітлераўцы над жыхарамі вёскі Касцюковічы, дзе 30 чэрвеня 1943 г. былі кінуты

жывымі ў калодзежы і спалены каля 200 чалавек. У сям'і Цімафея Місевіча, напрыклад, загінулі страшнай смерцю яго жонка Пелагея, дарослы сын Мікалай і пяцёра дзяцей ад 3 да 14 гадоў. У крывавай расправе ўдзельнічалі абверкаманда 10-СА (начальнік К. Крыстман) і мазырская паліцыя.

Былі спалены многія вёскі раёна. Ад рук акупантаў у раёне загінула звыш 1770 чалавек, а ў Мазыры за час акупацыі гітлераўцы і іх памагатыя забілі і закатавалі больш як 5500 чалавек. З раёна на катаржную працу ў Германію было вывезена звыш 1800 чалавек.

Акупанты лічылі, што такім чынам яны запалохаюць насельніцтва, прымусяць яго поўнасцю падпарадкавацца іх «новаму парадку», згадзіцца з рабскім існаваннем.

Але атрымалася наадварот. Як і на ўсёй тэрыторыі Беларусі, на Мазыршчыне разгарнуўся ўсенародны рух супраціўлення ворагу.

А. Васько

З ЛІСТОЎКІ МАЗЫРСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКАМА КП(б)Б

3 верасня 1943 г.

...У 220 дзяцей, бацькоў якіх пагналі ў праклятую Нямеччыну, у г. Мазыры бяруць кроў для раненых фашыстаў. Да чаго толькі дакаціліся гітлераўскія падлюгі...

Усю вопратку і хлеб, закапаныя жыхарамі ў вёсцы Мялешкавічы, гітлераўцы забралі, а ямы напоўнілі трупамі расстраляных людзей. Усіх злачынстваў гітлераўскіх катаў не пералічыць. Ці можна ім усё гэта дараваць? Ніколі! Ім няма, не можа быць і не будзе ніякай літасці!

Партызаны! Да помсты кліча кроў замучаных бацькоў, матак, братоў, сясцёр.

Біце фашыстаў, адсякайце іх крывавыя лапы!

Вечнае праклятце гітлераўскім катам!

Выданне Мазырскага падпольнага райкама КП(б) Беларусі.

Зборнік лістовак усенароднай партызанскай барацьбы. Мн., 1952. С. 207.

Адных забівалі, другіх палілі...

З успамінаў Н. Ф. Марціновіч, былой жыхаркі в. Спрымачоў

У вайну мне не было і дзесяці гадоў, а ўсяго нас, дзяцей, было пяцёра. Малодшы брацік нарадзіўся ўлетку 1941 г. Колькі мы нацярпеліся!..

Бабулю фашысты спалілі. Сястру Фросю, ёй было васемнаццаць гадоў, хацелі таксама спаліць. Яна цудам выратавалася з палаючага будынка. Калі дым напоўніў памяшканне, Фросі ўдалося непрыкметна выскачыць праз акно ў каморы і ўцячы ў лес. Увечары вярнулася. Маці думала, што яна ўжо загінула... Але страшныя пакуты чакалі нас наперадзе.

Калі карнікі палілі Спрымачоў, мы ўцяклі, рассыпаліся як гарох у розныя бакі. Навокал моцная страляніна, людзі беглі хто куды, і мы з імі. Нас схавала суседка ў хмызняку. Маці і старэйшую сястру згубілі. Немцы, як маглі, здзекаваліся з мірных жыхароў, большасць з іх забілі. На маіх вачах фашыст падняў на штык немаўля ў пялёнках, якое маці схавала ў траве каля лазовага карча...

Нам пашанцавала, засталіся жывымі, хоць немцы ўсё ж злавілі нас і пагналі ў Германію на пакуты.

Цяжка ўспамінаць...

Расказвае жыхарка в. Жахавічы
Д. С. Леановіч

...Канец ліпеня 1943 г. Пайшла я ў поле жыта жаць. Дзяцей кінула дома. Я хоць была маладая, а ўжо трое дзяцей на руках мела... Дык вось пайшла... Кажу сваім: «Будзьце дома, а я пайду пажну». Дайшла да лесу, чую: машыны равуць. Наталля, суседка, кажа: «Мо самалёты?» А я крычу: «Цётка, машыны!» А тут страляць пачалі. Як загалашу! Каб жа ведала, то дзяцей з сабою забрала б... Я ўжо не знаю, куды бегчы. Ці па дзяцей, ці далей уцякаць. Усе з вёскі бягуць у лес. А я, наадварот, з лесу бягу ў вёску, бо што ж я без дзяцей?! Дзе ж маё сэрца будзе мацярынскае?!

З таго пуду бягу дзяцей ратаваць. Прыбягаю — а ў мяне яшчэ бабуля была, маёй маткі маці. Яна ўжо клункі пазгортвала, пазвязвала. Мяне ўбачыла, загаласіла: «Чаго ж ты прыбегла, нас паб'юць, то хоць бы засталася!» Кажу: «Што будзе дзецям, і мне тое». Ужо мы тыя клункі пазвязвалі, ужо нас да вазоў павялі. Людскія пажыткі пачалі на вазы грузіць. Якраз у Жахавічах было чацвера коней. Куды ж павядуць?..

Пачалі нас сартыраваць. Партызанскія сем'і — у левую старану, а нас — у правую. У мяне муж на фронце быў. Немцы з паліцаямі тыя клункі паразвязвалі, лепшае сабе пазабіралі.

Адвялі нас далей ад вёскі. Мо метраў трыццаць, а чуем па дзярэўні: «Бах! Бах!» Запальнымі кулямі. І быстра ж так усё гарыць. Палаюць Жахавічы. Мы едзем і галосім. Авечкі бекаюць, худоба раве, дзеці галосяць, мы галосім...

А там адзін калодзеж з аднае стараны, другі — з другое. Абодва зямлёй пазасыпаныя. Зямля ходзіць як жывая. То ж людзей у калодзеж пакідалі жыўём і пазасыпалі. А партызанскія сем'і расстрэльвалі на яўрэйскіх могілках. У дзевяці ямах...

З ПАКАЗАННЯЎ ЦАРАШНА МАЙСЕЯ ПЯТРОВІЧА АБ АКУПАЦЫІ МЯСТЭЧКА СКРЫГАЛАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ Ў 1941—1943 гг.

Оккупировав м. Скрыгалов, немецко-фашистские власти прежде всего уничтожали активистов Советской власти и еврейское население. 15.1.1942 г. прибывший отряд СД и местная полиция собрали еврейские семьи в одно помещение — к Фридману Нохиму. Всего 45 душ. Вывели из помещения на польское кладбище в 500 метрах от Скрыгалова и расстреляли из пулемета.

Гражданку Гельтман Лукерью с ребенком расстреляли за то, что была замужем за евреем.

В сентябре 1941 г. арестованного активиста Советской власти Падило Павла Степановича полицаи по команде жандарма положили на землю, накрыли его бороной зубьями вниз. На борону положили колоду. Павел от страшной боли тут же скончался.

С первых же дней оккупации фашисты начали вылавливать красноармейцев, не успевших отступить с частями Красной Армии и оставшихся жить в деревнях. Их объявили военнопленными. Одного военнопленного красноармейца по имени Аркадий мучили голодом, потом избили до потери сознания и пристрелили. Таким же мучительным пыткам немцы и полицаи подвергли в 1941 г. четырех пленных красноармейцев.

Всего по местечку было расстреляно и замучено ни в чем не повинных граждан 83 человека, увезено в Германию 40 человек.

З дакументаў Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 72. Воп. 1. Спр. 241. Л. 85—86.

Такое забыць нельга

Адной з самых жахлівых праяў фашысцкага акупацыйнага рэжыму быў генацыд у адносінах да яўрэйскага насельніцтва. Па ўказанні Гітлера летам 1941 года пачалі распрацоўваць планы «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання». Гэтае «канчатковае вырашэнне» азначала знішчэнне ўсіх яўрэяў. Па звестках начальніка 4-га аддзела гестапа Германа Эйхмана, якому Гітлер даручыў правядзенне ў жыццё гэтай праграмы, было забіта 6 мільёнаў яўрэяў, што складала трэцюю частку яўрэяў усяго свету[1].

Звярыную палітыку знішчэння савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці гітлераўскія галаварэзы з бясприкладнай жорсткасцю ажыццяўлялі на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі, у тым ліку на Мазыршчыне. У снежні 1941 г. у раёне Рамашоў Роў было створана яўрэйскае гета, дзе людзі жылі ў невыносных умовах.

Напярэдадні новага 1942 г. гітлераўцы арганізавалі масавы расстрэл насельніцтва гета. Звыш 700 чалавек утапілі ў Прыпяці. Частка людзей, якіх папярэдзіў падпольшчык Крыцкі, паспела схавацца і пражыць яшчэ некаторы час. Апошнія ахвяры гета былі расстраляны ў чэрвені 1942 г. Расстрэлам кіравалі начальнік жандармерыі оберлейтэнант Тыццэ, обер-вахмістр Урліх і начальнік мазырскай паліцыі Падбярэзны, які выдзеліў «у дапамогу» нямецкай жандармерыі 10 паліцаяў. Масаваму знішчэнню падвергліся і цыганы, што на той час знаходзіліся ў Мазыры і на тэрыторыі раёна.

Успаміны людзей, што ўратаваліся ад смерці ў час крывавых антыяўрэйскіх акцый, пераканаўча сведчаць аб тым, як фашысцкі рэжым «вырашаў яўрэйскае пытанне» на Мазыршчыне.

[1] Приговор Международного Военного трибунала. Сборник «Нюрнбергский процесс». М., 1961. Т. 7. С. 401–402.

З успамінаў Д. Д. Шульман

Мая цётка Р. Л. Шнітман у часы нямецка-фашысцкай акупацыі жыла на станцыі Мазыр са сваім бацькам і дзвюма дочкамі трох і пяці гадоў. Муж яе знаходзіўся на фронце. Калі ў 1941 г. пачаліся масавыя расстрэлы яўрэяў, Роза Лейбаўна з бацькам і дзецьмі, узяўшыся за рукі, пайшлі ў Прыпяць і ўтапіліся. У 1945 г. вярнуўся з фронту яе муж. Ад суседзяў даведаўся аб гібелі жонкі, дзяцей і цесця. Пражыў ён нядоўга, ад раненняў і гора хутка памёр.

З успамінаў Ф. М. Курцэр

У пачатку вайны мае бацька і маці эвакуіраваліся з горада. Маці трапіла ў акружэнне і загінула, бацька не вярнуўся з фронту. Загінулі і мае два браты, Хаім і Арон. Я засталася з дзецьмі трох і пяці гадоў — Валяй і Валодзем. У пачатку акупацыі нямецкія карныя органы распачалі масавае знішчэнне мірнага насельніцтва. Асабліва жорстка яны адносіліся да яўрэяў і тых, каго падазравалі ў сувязях з партызанамі. Днём і ноччу не сціхалі стрэлы ў Мазыры і яго ваколіцах. Я бачыла, як псіхічна хворы мазыранін кінуўся з палкай на нямецкага афіцэра і тут жа быў застрэлены. Забілі гітлераўцы і майго дзеда Лазара Мільмана.

У верасні 1941 г. я бачыла расстрэл сям'і з трох чалавек. Іх гітлераўцы падазравалі ў захоўванні прадуктаў і вопратку для партызан. Многіх мазыран-яўрэяў заганялі ў Прыпяць і там расстрэльвалі. Да студзеня 1942 г. усё яўрэйскае насельніцтва было сагнана ў гета па вуліцы Рамашоў Роў. Там была і я з дзецьмі. У пачатку 1942 г. адною ноччу немцы пачалі масавы расстрэл яўрэяў. У загадзя вырытыя траншэі кідалі і забітых і жывых, засыпалі ўсіх зямлёй.

Калі нас вялі на расстрэл, мне ўдалося з дзецьмі ўцячы з калоны і дабрацца да Васілевіч. Там я ўладкава-

лася ў камісарыят прыбіральшчыцай. Перад вызваленнем Васілевіч, у канцы 1943 г., мяне вывезлі ў Германію. Працавала ў баўэра. Вясной 1945 г. нас вызваліла Чырвоная Армія.

З успамінаў Р. А. Шэрман

У гады вайны я была эвакуіравана на ўсход, вярнулася ў родны горад у верасні 1944 г. Суседзі, якія перажылі нямецкую акупацыю, расказалі мне, як нямецкія карнікі расстрэльвалі, вешалі, тапілі мазыран, асабліва яўрэяў. Каб пазбегнуць здзекаў і пакут, яўрэі спрабавалі ўцякаць, хавацца і нават канчалі жыццё самагубствам.

Так, у канцы 1941 г. вялікая група старых яўрэяў, якія не маглі схавацца або ўцячы, вырашылі спаліць сябе ў доме № 19 па вул. Пушкіна, па суседстве з домам, дзе я жыла да вайны. У доме сабралася да 40 чалавек. Падпаліць дом па жэрабю павінна была Гафштэйн Хая, якая і зрабіла гэта падрыхтаваным факелам. Згарэлі гаспадар дома Гафштэйн Эля, яго жонка Фейга, нявестка Соша, суседзі Гафштэйн Эер, ягоная жонка Хая, сын Шлёма, Коган Ізлаэль і іншыя.

Пасля вайны некаторыя жыхары Мазыра спрабавалі на месцы былога пажару пабудаваць дом. Але адмаўляліся ад гэтай задумы, бо пры падрыхтоўцы пляцоўкі выкопвалі шмат чалавечых касцей.

З успамінаў К. У. Харавец

Я бачыла жудасныя злачынствы, якія ўчынялі акупанты. У 1941 г. я пешшу хадзіла ў Магілёў, дзе быў вялікі лагер савецкіх ваеннапалонных. Там, па звестках, знаходзіўся мой швагер. З вялікімі цяжкасцямі я адшукала яго і выпрасіла ў немцаў. Ён быў змардаваны, вельмі худы.

Паўз наш дом гітлераўцы вадзілі на расстрэл людзей — туды, дзе сёння трыкатажная фабрыка і СШ № 4. Асуджаных на смерць прымушалі капаць сабе яму-магілу. Мне давялося бачыць знявечаных падпольшчыкаў Казачэнку, Міцуру, Майсеева, Канаша перад расстрэлам.

Была я сведкай і масавых расстрэлаў яўрэяў у раёне цяперашняга Кургана Славы. Іх вадзілі сюды па панядзелках і серадах. Расстрэльвалі яў-

Расстрэл мірных жыхароў Мазыра. 1943

Былы вязень канцлагера Баклеева Алена Савельеўна. Фота 1946 г.

рэяў і на тэрыторыі, дзе цяпер пед-інстытут. Помню, было гэта ў каляднае свята. У немцаў граў патэфон, даносіліся гукі іх маршаў...

Аднойчы на яўрэйскія могілкі гітлераўцы прывялі на расстрэл старога партызана з унукам-хлопчыкам гадоў пяці-сямі. Прымусілі старога капаць магілу, хлопчык плакаў...

З успамінаў А. М. Ваера

У пачатку вайны нам эвакуіравацца не ўдалося. Для барацьбы з варожымі дыверсантамі ствараліся знішчальныя батальёны з моладзі, якая не была мабілізавана на фронт. Пайшоў туды і я разам са сваім сябрам Мішам Салянікам. Нас уключылі ў групу разведкі. Салянікy выдалі вінтоўку, а мне, невысокаму ростам, чэхаславацкі карабін. Даручылі ахоўваць будынак абкама камсамола.

З набліжэннем фронту батальён пакінуў горад, але мне аб гэтым ніхто не паведаміў. Я не ведаў, дзе шукаць сваіх, і застаўся адзін. Маці параіла мне ісці з горада. Падаўся я ў вёску Кустаўніца. Мясцовыя здраднікі аб'явілі мяне партызанам, а маці маю, як яўрэйку, хацелі расстраляць. У гэты час у вёску прыйшла савецкая дыверсійная група і вызваліла нас. Тыя, хто нас хацеў забіць, былі расстраляны...

Маці вырашыла ісці ў вёску Навікі, дзе жыла яе стрыечная сястра з дочкамі. Аднойчы яны паслалі мяне ў Мазыр па соль. Гэта было складана. У горадзе я сустрэў цётку Голду з жоўтымі нашыўкамі на паліто, спераду і на спіне, — такія нашыўкі загадвалі насіць яўрэям.

Сярод ночы пачалася страляніна. Мы схаваліся ў склепе. Раніцай паліцэйскія нас адшукалі і выцягнулі. Дзяцей сагналі ў адзін дом. Потым усіх вывелі на вуліцу, пастроілі ў рады, скамандавалі ўзяцца за рукі і павялі. Куды нас гоняць, мы ведалі, усе плакалі. У канцы вуліцы Саета мяне аклікнуў паліцэйскі. Ён да вайны працаваў у міліцыі і часта дзяжурыў на плошчы Леніна, ведаў мяне. Спытаў, як я сюды трапіў. Падышоў да другіх паліцэйскіх і штосьці ім сказаў. Мяне вывелі з калоны. Дзяцей павялі да Прыпяці. Іх на маіх вачах напаткаў горкі лёс. Усіх загналі ў раку і расстралялі. Тую жудасную карціну я не здолею забыць да канца свайго жыцця...

Падрыхтаваў да друку

І. Піліпчук

Населеныя пункты Мазырскага раёна, знішчаныя гітлераўцамі і не адноўленыя пасля Вялікай Айчыннай вайны

Вёска Спрымачоў, у якой налічвалася 20 двароў і пражывала 123 чалавекі, знішчана 5 чэрвеня 1943 г. і пасля вайны не аднавілася. Такі ж лёс спасцігнуў і пасёлак на 27-м км вузкакалейнай чыгункі Ельск — Лельчыцы, каля в. Забалацце, дзе было 4 двары і жыло 18 чалавек. Пасёлак быў знішчаны карнікамі 28 ліпеня 1943 г. і не аднавіўся.

Бяроза, дубок, тры сасонкі...

Бяроза, дубок ды тры сасонкі... Гэта ўсё, што засталося ад вёскі Спрымачоў Асавецкага сельсавета, якая загінула ў агні ў 1943-м разам з большасцю яе жыхароў.

Прыгожыя тут мясціны... Паляны, густыя лясы і цяжкапраходныя балоты. Па лясных дарогах іншы раз цяжка

Населеныя пункты Мазырскага раёна, поўнасцю або часткова знішчаныя і адноўленыя пасля Вялікай Айчыннай вайны

Населены пункт	Двароў	Жыхароў	Знішчана		Час правядзення акцыі
			двароў	жыхароў	
Асавец	96	457	96	74	чэрвень 1943 г.
Асавецкая Буда	31	153	31	9	чэрвень 1943 г.
Балажэвічы	165	727	165	42	студзень 1943 г.
Барыскавічы	179	867	4	23	студзень 1944 г.
Белая	86	268	24	21	студзень 1944 г.
Буда-Казіміраўская	32	233	32	131	22 сакавіка 1943 г.
Булаўкі	48	246	4	1	студзень 1944 г.
Васькаўка	70	319	6	11	ліпень 1943 г.
Гіневічаў Груд	54	243	51	6	ліпень 1943 г.
Глініца	144	722	144	35	снежань 1942 г.
Дзербінка	63	281	63	30	14 ліпеня 1943 г.
Жахавічы	200	1000	200	52	30 ліпеня 1943 г.
Забалацце	67	320	61	46	сакавік 1943 г.
Заводны Востраў	76	396	76	32	5 жніўня 1943 г.
Зімавая Буда	57	253	57	9	лістапад 1942 г.
Зімовішчы Вялікія	96	307	96	11	чэрвень 1943 г.
Зімовішчы Малыя	126	390	126	27	чэрвень 1943 г.
Зялёны Мох	54	221	54	11	26 ліпеня 1943 г.
Казіміраўка	76	420	76	372	22 сакавіка 1943 г.
Камень	34	169	34	30	чэрвень 1942 г.
Каменка	84	328	84	20	ліпень 1943 г.
Касцюковічы	150	468	150	162	30 чэрвеня 1943 г.
Крушнікі	72	288	72	19	чэрвень 1943 г.
Крынічная Града	29	88	26	5	снежань 1942 г.
Летавішчы	19	80	19	15	ліпень 1943 г.
Лешня	245	686	233	34	ліпень 1943 г.
Лубня	60	320	59	2	чэрвень 1943 г.
Майсееўка	109	340	109	50	жнівень 1943 г.
Махнавічы	197	893	197	71	13 чэрвеня 1943 г.
Млынок	23	79	23	8	24 ліпеня 1943 г.
Мялешкавічы	370	860	370	90	24 ліпеня 1943 г.
Надаткі	64	200	17	20	1943 г.
Падлядзічы	35	158	35	8	12 чэрвеня 1943 г.
Перадрэйка	60	235	60	51	ліпень 1943 г.
Прудок	175	793	13	34	студзень 1944 г.
Раманаўка	98	383	98	28	чэрвень 1943 г.
Рудня Каменская	35	125	35	9	ліпень 1943 г.
Скалодзін	59	250	59	32	снежань 1942 г.
Скрыгалаў	334	1093	219	109	1943 г.
Слабада	264	845	23	98	1943 г.
Турбінка	36	196	36	2	ліпень 1943 г.
Хамічкі	101	312	7	21	ліпень 1943 г.
Шчакатава	68	177	68	20	ліпень 1943 г.

Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі. Мн., 1995.

было не тое што праехаць, але і прайсці. А навокал раздолле...

У гады першай сусветнай і грамадзянскай войнаў жыхары Спрымачова ваявалі на франтах і ў партызанскіх атрадах. У трыццатыя гады стварылі калектыўную гаспадарку. Была адкрыта пачатковая школа, магазін. Палепшаны дарогі. Толькі б жыць ды радавацца...

Бяда прыйшла ў Спрымачоў у 1937 г., калі за некалькі начэй былі арыштаваны і вывезены невядома куды каля двух дзесяткаў мужчын — «ворагаў народа»... Гэта былі лепшыя працаўнікі вёскі. Але ў якіх толькі грахах не абвінавачвалі іх! Людзі зніклі назаў-

сёды. Дзесяць з іх, як стала вядома, ляжаць у мазырскай зямлі, астатнія загінулі невядома дзе.

Вайна... Мужчыны, што яшчэ былі ў вёсцы, пайшлі на фронт, у партызанскія атрады. Засталіся дзеці, жанчыны, старыя. Фашысцкія карнікі жорстка адпомсцілі мірным жыхарам за свае няўдачы, за смелыя аперацыі партызан.

Ворагі накінуліся на вёску, як зграя дзікіх драпежнікаў, на досвітку 5 чэрвеня 1943 г. Тых, хто не паспеў схавацца, расстралялі ці спалілі ў хатах. А ў адну з хат загналі больш за сто чалавек жыхароў навакольных вёсак, што хаваліся ў лясах, і таксама падпалілі. Колькі людзей загінула тут у тую летнюю раніцу... Невядома і сёння.

Закончылася вайна. Жыхары Спрымачова, што засталіся жывымі, пабудавалі на былых селішчах зямлянкі. Але з цягам часу разышліся па навакольных вёсках. Засталася пустка...

Сярод збажыны, што наліваецца штогод у гадавіну трагедыі важкім коласам, на месцы вёскі расце бяроза, да якой прытуліўся дубок, побач — тры сасонкі. Яны абкружылі абеліск — выяву маці ў жалобе, якая плача аб загінуўшых родных, аб вёсцы, што знікла з твару зямлі, аб забытых магілах...

М. Капач

Ахвяры фашысцкага тэрору

ГОРАД МАЗЫР

З актаў Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў:

...В Мозырской тюрьме и застенках других немецких карательных организаций было умерщвлено немцами не менее 350 человек. Все еврейское население города, главным образом женщины, дети и старики осенью 1941 года были собраны в «гетто» по ул. Ромашов Ров, где затем были расстреляны или потоплены в реке.

Всего расстрелянных, замученных граждан — 5530 человек, из них расстреляно — 4730 человек. В ходе расследования обнаружено:

На еврейском кладбище — 18 могил, число трупов в каждой от 50 до 55 человек.

На ул. Пушкина, на бывшей усадьбе тюрьмы — 5 могил — 275 человек.

В урочище Ромашов Ров в овраге — 4 могилы — 850 трупов.

В овраге на пути из г. Мозыря в д. Бобры — 2 могилы — 1000 человек.

В конце ул. Свидовка — 2 могилы — 600 человек.

Часть расстрелянных зарывалась в землю живыми.

Извлечено трупов — 4032.

ДАРФ. Ф. 7021. Воп. 91. Л. 6—19.

Камісіі па падрыхтоўцы гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» удалося ўстанавіць імёны толькі 623 закатаваных і расстраляных жыхароў.

Загінулі ў 1941 г.

БЕКЕРМАН Абрам Майсеевіч (1902 г.)
БЕКЕРМАН Бейля Абрамаўна (1902 г.)
БЕКЕРМАН Доба Абрамаўна (1918 г.)
БЕКЕРМАН Рыгор Абрамавіч (1937 г.)
ВАЙСМАН Меер Юдкавіч (1867 г.)
ГАМБУРГ Моталь (1870 г.) і яго дзеці **Абрам** (20 гадоў) і **Рахіль** (18 гадоў)
ГАМБУРГ Рыва Абрамаўна (1880 г.)
ГАРЭЦКАЯ Геня (16 гадоў), **Фрыда** (5 гадоў) і **Янкель** (4 гады)
ГРАЙФЕР Хана Якаўлеўна (1911 г.) і яе дзеці **Геня** (10 гадоў), **Паліна** (8 гадоў) і **Лёва** (1 год)
ГУХМАН Бася Мееравна (1860 г.)
ГУХМАН Янкель Юдавіч (1860 г.)
ДУБРАЎ Аляксей Мікалаевіч (1890 г.), старшыня калгаса, расстраляны ў лістападзе 1941 за сувязь з партызанамі.
ЖУКОЎСКАЯ Марыля Лаўрэнцьеўна (1898 г.)

ЗАГАЛЬСКІ Барыс Янкелевіч (1881 г.) і яго жонка **Бася Зелікаўна** (1882 г.)
ЗАЛАТАРОВА Лідзія Паўлаўна (1904 г.)
ЗАЛАТАРОВА Ніна (5 гадоў)
ЗАЛАТНІК Нісель (1867 г.)
ЗАЛАТНІК Сара (1862 г.)
ЗАРЭЦКІ Янкель Майсеевіч (1882 г.)
ЗАЯЦ Фідга Рыгораўна (1890 г.)
ЗАЯЦ Беба Ісакаўна (1928 г.)
ЗАЯЦ Карл (11 гадоў) і **Роза** (10 гадоў)
ІОФЕ Лея Сіманаўна (1909 г.)
ІОФЕ Сара Лазараўна (1923 г.), **Броня** (1910 г.) і **Лёва** (10 гадоў)
КАГАБАЕЎ Эдзік (1 месяц)
КАГАНОВІЧ Бася Іцкаўна (1864 г.)
КАЛІНОЎСКІ Сімон Беркавіч (1899 г.)
КАЛІНОЎСКАЯ Марыля (16 гадоў), **Міра** (12 гадоў), **Соня** (9 гадоў) і **Абрам** (9 гадоў)
КАРПАЎ І. Я.
КАРЧЭЎСКІ Сёма Хаімавіч (1911 г.) і яго сын **Лёня** (7 гадоў)
КАЦМАН Бейля Рувімаўна (1896 г.) і яе дзеці **Алнір** (13 гадоў), **Мендэль** (10 гадоў) і **Бася** (7 гадоў)
КАЦМАН Янкель Нахімавіч (1875 г.)
КАЦМАН Яша Моўшавіч (1878 г.)
КАЧЭНЯ Кірыла Яўхімавіч (1907 г.), яго жонка **Антаніна Рыгораўна** (1900 г.) і сын **Коля** (4 гады)
КОЙФМАН Хая Беньямінаўна (1917 г.)
КОЙФМАН Барыс Аляксандравіч (4 гады)
КОЙФМАН Іда Аляксандраўна (3 гады)
КУТМАН Фіра Абрамаўна (1905 г.)
КУТМАН Хаім Давыдавіч (1902 г.) і яго дзеці **Фрыда** (4 гады) і **Додзік** (3 гады)
ЛУТЦ Юліс Отавіч, яго жонка **Лізавета Лявонаўна** і дачка **Паўліна**
МАРОЗ Ульяна (1886 г.)
МІНЕВІЧ Іосіф Хацкелевіч (1870 г.)
РАЕЎСКІ Фядос Яўхімавіч (1886 г.)
РАГАВА Клаўдзія Васілеўна (1919 г.)
РОЗІН Гірш Абрамавіч (1860 г.)
РУДАКОЎСКІ Меер Яўсеевіч (1880 г.)
РУДЗЯНЕЦ Андрэй Данілавіч (1902 г.)
РЭВУТ Якаў Рыгоравіч (1896 г.)
СУРШІН Фаня (11 гадоў), **Сіма** (10 гадоў), **Абрам** (9 гадоў) і **Рахіль** (8 гадоў)
УЗЕНЬ Праскоўя Маркаўна (1904 г.)
УЗЕНЬ Давыд Лазаравіч (1928 г.)
ФРЫДМАН Янкель Хайкавіч (1860 г.)
ФРЭНКЛАХ Соня Віктараўна (1880 г.)
ФРЭНКЛАХ Ісак Ніселевіч (1928 г.)
ФРЭНКЛАХ Віктар Ошаравіч
ФРЭНКЛАХ Шафіра Юдаўна (1870 г.)
ФРЭНКЛАХ Дзвейра Віктараўна (1890 г.)
ФРЭНКЛАХ Сара (8 гадоў)
ФРЭНКЛАХ Хая Самуілаўна (1884 г.)
ШАЙКО Надзея Аляксееўна (1908 г.)
ШВАРЦМАН Якаў (12 гадоў)
ШНІТМАН Берл Лейбавіч (1915 г.)
ШНІТМАН Роза (22 гады)
ШНІТМАН Рахіль (6 гадоў)
ШНІТМАН Эстэр (3 гады)
ШЭЙКІНА Сара Мендзелеўна (1868 г.)
ШЭЙКІН Лейба Іцкавіч (1879 г.)
ШЭЙКІНА Бася Пінхусаўна (1869 г.)
ШЭХТМАН Гірш Ісмайлавіч (1859 г.)
ШЭХТМАН Рахіль Моўшаўна (1874 г.)
ШЭХТМАН Сара Моталеўна (1878 г.)
ЭДЭЛЬШТЭЙН Сара Якаўлеўна (1891 г.)
ЭЛЬКІН Анатоль (4 гады)
ЭЛЬКІНА Голда (1894 г.)
ЭЛЬКІН Кім (5 гадоў)
ЭЛЬКІНА Марыля (1914 г.)
ЯКУШ Платон Мартынавіч (1865 г.)
ЯКУШ Хрысціна Аляксееўна (1885 г.)
ЯНДУЛЬСКАЯ Станіслава Лявонаўна (1902 г.)
ЯНДУЛЬСКІ Станіслаў Лявонавіч (1907 г.)
ЯНДУЛЬСКІ Тадэвуш Лявонавіч (1909 г.)
ЯЦКО Васіль Арцёмавіч (1924 г.)

Загінулі ў 1942 г.

АГАЛЕЦ Праскоўя Міхайлаўна (1913 г.)
АГАЛЕЦ Таццяна Міхайлаўна (1924 г.)
АГАЛЕЦ Міхаіл Арцёмавіч (1875 г.)
АНЦІПЕНКА Іосіф Маратавіч (1886 г.)
АНЦІПЕНКА Мара Міхайлаўна (1892 г.)
БАБРОЎСКАЯ Голда Шаелеўна (1881 г.)
БАГАТЫРЭВІЧ Аляксандр Пятровіч (1914 г.)
БАЛЕЎ Даніла Іванавіч (1907 г.)
БАРГМАН Нісель Хаімавіч (1892 г.)
БАРКОЎСКІ Канстанцін Рыгоравіч (1896 г.)
БАРКОЎСКІ Анатоль Канстанцінавіч (1925 г.)
БАРКОЎСКІ Леў Канстанцінавіч (1923 г.)
БАРКОЎСКАЯ Тамара (1927 г.)
БАРКОЎСКІ Іосіф Сцяпанавіч (1890 г.)
БАРКОЎСКАЯ Марыя Львоўна (1910 г.)
БАРКОЎСКІ Уладзімір Іосіфавіч (1923 г.)
БАРКОЎСКІ Язэп Аляксандравіч (1924 г.)
БАРКОЎСКІ Ігар Аляксандравіч (1931 г.)
БАШКІН Гірш Сіманавіч (1 год)
БАШКІНА Соня Лейбаўна (1917 г.)
БАШКІНА Фіма Сіманаўна (3 гады)
БЕЙНЕНСОН Вольф Рыгоравіч (1868 г.)
БЕЙНЕНСОН Соня Вольфаўна (1900 г.)
БЕКЕРМАН Рыгор Абрамавіч (1920 г.)
БЕКФМАН Абрам Майсеевіч (1901 г.)
БЕЛКІН Барыс Абрамавіч (1875 г.)
БІБЕРМАН Хая Натанаўна (1888 г.) і яе дзеці **Берта** (7 гадоў), **Берка** (5 гадоў) і **Фаня** (2 гады)
БІКМАН Фіра Ізраілеўна (5 гадоў)
БОБР Аляксей Паўлавіч (1889 г.)
БОБР Цімафей Пятровіч (1871 г.)
БРАГІНСКАЯ Гіта Шлёмаўна (1895 г.)
БРАГІНСКАЯ Роза Абрамаўна (1910 г.)
БРЫСКМАН Сара Яўсеевна (1911 г.)
БУДОЎСКІ Іосіф Янкелевіч (1928 г.)
БУДОЎСКАЯ Ося Аронаўна (1918 г.)
БУДОЎСКАЯ Фаня Якаўлеўна (1881 г.)
БУДОЎСКАЯ Фрума Мееравна (1903 г.)
БУДОЎСКАЯ Цыта Мееравна (1899 г.)
БУРНІШТЭЙН Леў Шаевіч (1912 г.)
БУРНІШТЭЙН Фаня Самуілаўна (1850 г.)

БУРШТЭЙН Шэйна-Фейга Шмулеўна (1860 г.)
БУХМАН Абрам Шлёмавіч (1916 г.)
БУХМАН Нахім Айзікавіч (1860 г.)
БЯРНАЦКАЯ Дзвейра Ісакаўна (1871 г.)
БЯРНАЦКІ Берка Мордухавіч (1 год)
БЯРНАЦКІ Лейба Беркавіч (1898 г.)
БЯРНАЦКАЯ Фрэйда Аронаўна (1898 г.)
БЯРНАЦКАЯ Хася Лейбаўна (1922 г.)
БЯРНАЦКІ Абрам Лейбавіч (1926 г.)
БЯРНАЦКІ Ісак Лейбавіч (1928 г.)
БЯРНАЦКІ Іосіф Янкелевіч (1890 г.)
ВАЙСМАН Барыс Аўрамавіч (1876 г.)
ВАЙСМАН Голда Тавелеўна (1913 г.)
ВАЙСМАН Тавель Рувімавіч (5 гадоў)
ВАЙСМАН Фейга Сролеўна (1883 г.)
ВАЙСМАН Хана Гіршаўна (1876 г.)
ВАЙСМАН Эстэр Іосіфаўна (1861 г.)
ВАЙСМАН Эстэр Еселеўна (1859 г.)
ВАЙСМАН Янкель Лейзаравіч (1931 г.)
ВАЙСМАН Фейга Меераўна (1881 г.)
ВАЛЬПЕРТ Сара Гіршаўна (1863 г.)
ВАСЕРМАН Голда (1907 г.)
ВАСЕРМАН Іосіф Бенцыянавіч (1905 г.) і яго сын **Леў** (13 гадоў)
ВЕКСЛЕР Сендэр Мееравіч (1891 г.), яго жонка **Нахіма Айзікаўна** (1886 г.) і іх дзеці **Мера** (1918 г.) і **Хая** (1911 г.)
ГАКХМАН Нахама Давыдаўна (1891 г.)
ГАМБУРГ Рахіль Мордухаўна (1926 г.)
ГАМБУРГ Соня Мордухаўна (1913 г.)
ГАМБУРГ Рыва Ізраілеўна (4 гады)
ГАНІКМАН Цыля Давыдаўна (1892 г.)
ГАРАВАЯ Хана Герцаўна (1903 г.) і яе дзеці **Геня** (17 гадоў), **Клара** (12 гадоў), **Лёва** (4 гады) і **Нісель** (3 гады)
ГАРАВАЯ Хана Зелікаўна (1876 г.)
ГАРЭЛІК Фейга (1886 г.)
ГАЎРЫЛЕНКА Ніна Майсееўна (1914 г.)
ГАФШТЭЙН Леў Якаўлевіч (1927 г.)
ГАФШТЭЙН Юрый Якаўлевіч (3 гады)
ГАФШТЭЙН Бэла Мулеўна (6 гадоў)
ГАФШТЭЙН Лейзер Іцкавіч (1863 г.)
ГАФШТЭЙН Зуся (1887 г.)
ГАФШТЭЙН Хана Цалераўна (1895 г.)
ГАФШТЭЙН Бася Мордухаўна (1870 г.)
ГЕЙДЭЛЬМАН Геся Беркаўна (1925 г.)
ГЕЙДЭЛЬМАН Роня Сролеўна (1870 г.)
ГЕРДАЎ Абрам Гіршавіч (1869 г.)
ГЕРДАВА Рыва Беркаўна (1877 г.)
ГІЗУНТЭРМАН Аркадзь (5 гадоў)
ГІНЗБУРГ Хая Фрэмаўна (1905 г.) і яе дзеці **Эдзік** (17 гадоў), **Дора** (4 гады) і **Клара** (3 гады)
ГІНЗБУРГ Мордух Самойлавіч (1890 г.)
ГЛІНЕР Ніна Паўлаўна (1933 г.)
ГЛІНЕР Леанід (3 гады)
ГОЛУБ Арон Вольфавіч (1880 г.)
ГОЛЬФМАН Ізя (3 гады)
ГОЛЬФМАН Арон Мошкавіч (1870 г.)
ГОЛЬФМАН Барыс Левімавіч (1918 г.)
ГОЛЬШМІТ Злата Абаўна (1907 г.)
ГОЛЬШСКІ Абрам Беніямінавіч (1926 г.)
ГОМАН Сара Ніселеўна (1925 г.)
ГОНІКМАН Цына Давыдаўна (1892 г.)
ГОНКІНА Эстэр (1870 г.)
ГОТЛІБ Эйдэль Гіршавіч (1872 г.)
ГОФМАН Хаім Гіршавіч (1892 г.)
ГРЫНБУРГ Мордух Самуйлавіч (1890 г.)
ГРЫЦКЕВІЧ Тацяна (90 гадоў), **Ліля** (5 гадоў) і **Валянцін** (4 гады)
ГРЭНАДЗЁР Роза Моўшаўна (1896 г.)
ГРЭНАДЗЁР Хася (1851 г.)
ГУЗМАН Мар'яна Майсееўна (1879 г.)
ГУЗМАН Гірш Сааравіч (1876 г.)
ГУРВІЧ Гейза Шайкаўна (1864 г.)
ГУТМАН Люба Шмуйлаўна (1872 г.)
ГУТМАН Малка Сролеўна (1917 г.)
ГУТМАН Рахіль Беркаўна (1861 г.)
ГУТМАН Хая Юдэлеўна (1891 г.)
ГУТЭРМАН Гэля Барысаўна (1892 г.)
ГУТЭРМАН Рыва Моўшаўна (1881 г.)
ГУХМАН Айзік Шмулавіч (1889 г.)
ГУХМАН Хася Яўхімаўна (1904 г.)
ДАМІНІКОЎСКІ Напалеон Карлавіч (1895 г.)
ДВОРАК Міхаіл Аляксандравіч (1912 г.)
ДЗЕХТУР Фісель Янкелевіч (1894 г.)
ДЗЕХТУР Фрыда Борухаўна (1894 г.)
ДЗЕХТУР Хаім Янкелевіч (1883 г.) і яго дзеці **Берта** (16 гадоў), **Борух** (16 гадоў), **Рыма** (15 гадоў), **Рахіль** (13 гадоў) і **Яша** (10 гадоў)
ДЗЕХТЭР Зелда Мордухаўна (1891 г.)
ДЗЯГЦЯР Міхаіл Вольфавіч (1895 г.)
ДЗЯГЦЯР Янкель Нехімавіч (1894 г.)
ДУБРАЎ Адам Аляксеевіч (1887 г.) і яго сын **Вадзім** (5 гадоў)
ДУБРОВА Надзея Лук'янаўна (1916 г.)
ДУБРОВА Ганна Аляксееўна (1920 г.)
ДУДЗЯНЕЦ Андрэй Данілавіч (1902 г.)
ДУХАН Меер (13 гадоў) і **Лізавета** (4 гады)
ДУХІНА Эля Меераўна (1917 г.)
ДУХІН Марат Саламонавіч (1928 г.)
ЕФІМОВІЧ Мікалай Андрэевіч (1925 г.)
ЗАЙЧЫК Цыля Іцкаўна (1883 г.)
ЗАЙЧЫК Фіра Іосіфаўна (1910 г.)
ЗАЙЧЫК Соня Анатольеўна (9 гадоў)
ЗАРЭЦКАЯ Бейля Хонаўна (1882 г.)
ЗАРЭЦКАЯ Гензель Янкелеўна (1876 г.)
ЗАРЭЦКАЯ Голда Самуілаўна (1900 г.)
ЗАРЭЦКАЯ Іда (17 гадоў), **Самуіл** (14 гадоў) і **Арон** (10 гадоў)
ЗАРЭЦКАЯ Броха Зелікаўна (1883 г.)
ЗАРЭЦКІ Барыс Янкелевіч (1876 г.)
ЗАРЭЦКАЯ Фейга Невахаўна (1875 г.)
ЗАРЭЦКІ Мулік Есупавіч (12 гадоў)
ЗАРЭЦКІ Есуп (1900 г.)
ЗАРЭЦКАЯ Сара Есупаўна (1929 г.)
ЗАХАРЧАНКА Ганна Аляксандраўна (1919 г.)
ЗАЯЦ Сара Ісакаўна (1919 г.)
ЗЕЛЬДЗІНА Сара Калманаўна (1876 г.)
ЗЕЛЬДЗІНА Раіса Хілеўна (1881 г.)
ЗЕЛЬДЗІНА Геня Лейбаўна (1924 г.)
ЗЕЛЬДЗІНА Ада Лейбаўна (1925 г.)
ЗІНДМАН Бася Лейбаўна (1865 г.)
КАВАЛЕРЧЫК Сара Абрамаўна (1865 г.)
КАГАН Фрума Германаўна (1879 г.)
КАГАНОВІЧ Лена Давыдаўна (1907 г.) і яе

дзеці **Уладзімір** (13 гадоў) і **Юрый** (3 гады)

КАЙНЕНСОН Вольф (1869 г.)

КАЙНЕНСОН Соня (1900 г.)

КАЛЕВАТАВА Ганна Ільінічна (1925 г.)

КАЛІНОЎСКАЯ Броня Сендэраўна (1874 г.)

КАЛІНОЎСКАЯ Роза Лейбаўна (1900 г.)

КАЛІНОЎСКІ Лёва (12 гадоў), **Марат** (7 гадоў) і **Фелікс** (5 гадоў)

КАЛІНОЎСКАЯ Броха Іоселеўна (1876 г.)-

КАЛІНОЎСКАЯ Рахіль Моталеўна (1876 г.)

КАМБАРОЎСКАЯ Вольга Дзям'янаўна (1897 г.)

КАМБАРОЎСКАЯ Стася Навумаўна (1914 г.)

КАМБАРОЎСКАЯ Хамеля (10 гадоў) і **Святлана** (2 гады)

КАМБАРОЎСКІ Лейба (1903 г.) і **Клара** (5 гадоў)

КАМІСАРЧЫК Абрам Залманавіч (1865 г.)

КАМІСАРЧЫК Тамара Моўшаўна (1874 г.)

КАМІСАРЧЫК Фейга Аронаўна (1871 г.)

КАМЯНЕВІЧ Гірш Сіманавіч (1890 г.)

КАМЯНЕВІЧ Софія Майсееўна (1920 г.)

КАНАВАЛЬЧУК Мікалай Мікалаевіч (1903 г.)

КАРАБКО Броха Лейбаўна (1906 г.)

КАРАБКО Хаім Мордухавіч (1874 г.)

КАРДАШ Ніна Сяргееўна (1923 г.), студэнтка педтэхнікума, закатавана ў хойніцкай турме 30.12.1942.

КАРОБАЧКА Роза Барысаўна (1900 г.)

КАРОБАЧКА Міхаіл Барысавіч (1920 г.)

КАРОБАЧКА Дзіма (9 гадоў) і **Святлана** (1 год)

КАРПМАН Шэйна Іцкаўна (1872 г.)

КАРСАКОЎ Трафім Іванавіч (1857 г.)

КАРЧЭЎСКАЯ Нейма Халілаўна (1875 г.)

КАРЧЭЎСКАЯ Соня Ісакаўна (1911 г.)

КАРЧЭЎСКІ Сёма (4 гады) і **Лёня** (17 гадоў)

КАЦАВА Хася Мордухаўна (1900 г.)

КАЦАЎ Бора Вольфавіч (1898 г.) і **Уладзімір** (1 год)

КАЦМАН Хая-Сара Аўнераўна (1866 г.)

КАЦМАН Ісак Цалеравіч (1896 г.) і яго дзеці **Валя** (7 гадоў) і **Любоў** (4 гады)

КАЦМАН Геня Іосіфаўна (1916 г.)

КАЦМАН Іцка Майсеевіч (1874 г.)

КАЦНЕЛЬСОН Міра Навахаўна (1896 г.)

КАЦНЕЛЬСОН Рыва (9 гадоў) і **Янкель** (6 гадоў)

КАШАЛЕВІЧ Гірш (1890 г.)

КЕБЕЦ Мікалай Лаўрэнцьевіч (1924 г.)

КІМБАРАЎСКІ Натан Лейбавіч (1925 г.)

КЛУГЕРМАН Хася Беркаўна (1872 г.) і **Ювa** (10 гадоў)

КЛЯМАР Леанід (14 гадоў)

КОЙХМАН Раіса Мендэлеўна (1900 г.)

КОЛІК Міхля Лейбаўна (1926 г.)

КОЛІК Дзвейра Янкелеўна (1923 г.)

КОЛІК Фрыда Сендэраўна (1890 г.)

КОЛІК Хая Яўсееўна (1852 г.)

КОЛІК Ханон Лейбавіч (1928 г.)

КОЛІК Сендэр Хонавіч (1888 г.)

КОЛІК Ася Мееараўна (1910 г.)

КОЛІК Соня (12 гадоў), **Іда** (9 гадоў) і **Беня** (7 гадоў)

КОФМАН Зяма Беньямінавіч (1903 г.)

КОФМАН Фая Ніселевіч (1892 г.)

КОФМАН Шая Ізраілевіч (1891 г.)

КОФМАН Рая Львоўна (1900 г.)

КОФМАН Грыша (12 гадоў) і **Бэла** (7 гадоў)

КОЦІК Невах Мордухавіч (1851 г.)

КОЦІК Эля Невахаўна (1905 г.)

КОЦІК Рыва Моталеўна (7 гадоў), **Берка** (6 гадоў) і **Лія** (2 гады)

КРУКОЎСКІ Антон Натанавіч (1920 г.) і яго сын **Іван** (4 гады)

КРУЦІКАВА Рая (5 гадоў)

КРЫЦКАЯ Эстэр-Голда Абрамаўна (1888 г.)

КУЗЬМІЧ Аляксандр Пятровіч (1902 г.)

КУЗЬМІЧ Эстэр (1865 г.)

КУРМАЗ Ганна Сцяпанаўна (1900 г.)

КУРМАЗ Матруна Сцяпанаўна (1909 г.)

МАСКОЎСКІ Зяма Аронавіч (1911 г.)

МІЛЬМАН Бася Элеўна (1876 г.)

МІЛЬМАН Лазар (1857 г.)

МІЛЯЎСКАЯ Хана Ашэраўна (1899 г.)

МІЛЯЎСКАЯ Клара Сцяпанаўна (1927 г.)

МІНЕВІЧ Нахман Шэвелевіч (1876 г.)

МІНКОЎСКІ Люсік Мордухавіч (1927 г.)

МІНЧУК Сынклеш Канстанцінавіч (1890 г.)

МІХАЙЛАЎ Уладзімір Іванавіч (1897 г.)

МУЗЫКАНТ Хая Бенцыянаўна (1892 г.)

МУЗЫКАНТ Клара Аронаўна (1917 г.)

НАЙМАН Бася (1874 г.)

НАРАЎЛЯНСКАЯ Хана Нахімаўна (1901 г.)

НАРАЎЛЯНСКІ Меер Нохімавіч (1902 г.)

НАРАЎЛЯНСКІ Іцка Нохімавіч (1901 г.) і яго дзеці **Фрыда** (14 гадоў), **Рафаэль** (12 гадоў), **Бася** (11 гадоў), **Ліза** (10 гадоў), **Моталь** (6 гадоў) і **Шлёма** (5 гадоў)

НЕЙТМАН Міхаіл Яўхімавіч (1915 г.) і яго дачка **Рыва** (13 гадоў)

НЕЙТМАН Хаім Шлёмавіч (1880 г.)

НІСНЕВІЧ Хаім Якаўлевіч (1882 г.)

НІСНЕВІЧ Генадзь Веньямінавіч (1918 г.) і яго дачка **Юля** (12 гадоў)

НІСНЕВІЧ Соня (8 гадоў), **Майсей** (6 гадоў), **Нэля** (4 гады) і **Генадзь** (1,5 года)

ПАРТНАЯ Хая Рыгораўна (1906 г.)

ПЕКУРОЎСКАЯ Фрэйда Рувімаўна (1860 г.)

ПЕТЛАХ Сямён Самуілавіч (1904 г.)

ПЕТЛАХ Роза Сіманаўна (1891 г.) і яе дзеці **Моня** (8 гадоў) і **Берта** (7 гадоў)

ПІКОЎСКІ Абрам Тэвелевіч (1882 г.)

ПІКОЎСКІ Тэвель Хаймавіч (1864 г.)

ПІНСКАЯ Сара Беркаўна (1904 г.) і яе дзеці **Барыс** (10 гадоў), **Нохім** (7 гадоў) і **Ева** (2 гады)

ПІНСКАЯ Фейга Аронаўна (1861 г.)

ПРАКОПЧЫК Яўхім'я Навумаўна (1869 г.)

РАБІНОВІЧ Эстэр Цалеўна (1884 г.)

РАБІНОВІЧ Меер Эльевіч (1892 г.)

РАВІКОЎСКІ Абрам Барысавіч (1885 г.)

РАВІКОЎСКІ Іцка Давыдавіч (1870 г.)

РАВІКОЎСКІ Меер Элевіч (1881 г.)

РАГІНСКАЯ Фаня Шлёмаўна (1876 г.)

РАДАМІСЕЛЬСКІ Гея Сіманавіч (1878 г.)
РАДАМІСЕЛЬСКІ Іосіф Лейбавіч (1876 г.)
РАДНЕЎСКІ Сяргей Паўлавіч (1908 г.)
РАСКІНА Бася Давыдаўна (1899 г.) і яе дзеці **Сара** (6 гадоў) і **Соня** (4 гады)
РАСОШАНКА Дзям'ян Васілевіч (1888 г.)
РОГАВА Хая Барысаўна (1918 г.) і яе дзеці **Фелікс** (4 гады) і **Анатоль** (1 год)
РОЗЕНБЕРГ Рахіль Моўшаўна (1868 г.)
РОЗЕНФЕЛЬД Рона (3,5 гады)
РОНЬКІНА Эстэр Самуйлаўна (1866 г.)
РУБІНШТЭЙН Яўхім Абрамавіч (1913 г.)
РУДЗЬКОЎСКІ Зяма Аронавіч (1911 г.)
РЫБАКОВА Анастасія Філімонаўна (1890 г.)
РЫБАКОЎ Андрэй Іванавіч (1900 г.)
РЭБАК Карл Андрэевіч
РЭЧЫЦКІ Міхаіл Фядосавіч (1906 г.) і яго **сястра**
САВІЧ Іван Сцяпанавіч (1872 г.)
САНДАМІРСКАЯ Цыля Янкелеўна (1896 г.)
САНДАМІРСКАЯ Генеша Янкелеўна (1871 г.)
САНДАМІРСКІ Янкель Саламонавіч (1871 г.)
САФОНАЎ Мітрафан Пятровіч (1906 г.) і яго дзеці **Валянціна** (2 гады) і **Софія** (1 год)
СЕЛІВОНЧЫК Яўген Уладзіміравіч (1894 г.)
СІМАНОВІЧ Вульф Іосіфавіч (1862 г.) і яго дачка **Раіса** (10 гадоў)
СІМАНОВІЧ Голда Вульфаўна (1888 г.)
СІРОТА Гейза Баркаўна (1871 г.)
СЛУЦКАЯ Соня Ісакаўна (1910 г.)
СЛУЦКАЯ Роза Ісакаўна (1912 г.)
СТАЛЯР Хана Лейбаўна (1870 г.)
СУХАРЭНКА Сара Яўсееўна (1870 г.)
ТРАЙБЕРМАН Лія Абрамаўна (1906 г.)
ТРАЙБЕРМАН Серфель (7 гадоў)
ТРАЙБЕРМАН Рахіль (5 гадоў)
УРЭЦКІ Нохім Беркавіч (1864 г.)
УРЭЦКАЯ Соня Сролеўна (1913 г.)
УРЭЦКАЯ Клара Аронаўна (1900 г.)
УРЭЦКАЯ Поля Якаўлеўна (1918 г.)
УРЭЦКАЯ Алена (12 гадоў)
УРЭЦКІ Якаў (7 гадоў)
УРЭЦКАЯ Клара Беніцыянаўна (1900 г.)
УРЭЦКІ Меер Залманавіч (1887 г.)
ФАЙНБЕРГ Соня Янкелеўна (1892 г.)
ФЕЙГЕН Іосіф Лейбавіч (1875 г.)
ФЕЙГЕН Феня Саламонавіч (1880 г.)
ФЕЙЧЫН Геня Беньямінавіч (1880 г.)
ФЕЛЬДЗЮН Хаім Мордухавіч (1924 г.)
ФІНБЕРГ Хая Нохімаўна (1885 г.)
ФІНБЕРГ Сулія Янкелеўна (1887 г.)
ФІТЭРМАН Соня Майсееўна (1924 г.)
ФІТЭРМАН Фаня Беркаўна (1908 г.)
ФІЦНЕР Беніямін Лейбавіч (1882 г.)
ФРУМАН Анатоль Давыдавіч (1913 г.)
ФРЫДМАН Лейзер Элевіч (1884 г.)
ФРЫДМАН Сямён Лазаравіч (1927 г.)
ФРЫДМАН Роза Лейбаўна (1888 г.)
ФРЫДМАН Ева Шмулеўна (1920 г.)
ФРЫДМАН Лейба (12 гадоў)
ФРЫДМАН Хая Меераўна (1873 г.)
ФРЫДМАН Берка Халімонавіч (1886 г.)
ФРЫДМАН Шлёма Лейбавіч (1990 г.)
ФРЫДМАН Эцыля Меераўна (1905 г.)
ФРЫДМАН Нісель Мееравіч (1866 г.) і яго дзеці **Рыва** (14 гадоў) і **Шлёма** (11 гадоў)
ФРЫДМАН Нахама Невахаўна (1885 г.)
ФРЫДМАН Нейля Мешараўна (1890 г.)
ФРЫДМАН Саралея Іцкаўна (1877 г.)
ФРЭНКЛАХ Юда (12 гадоў)
ФРЭНКЛАХ Мася (11 гадоў)
ФРЭНКЛАХ Цыля Меераўна (1912 г.)
ФРЭНКЛАХ Зіна Меераўна (1915 г.)
ФРЭНКЛАХ Любоў Львоўна (1909 г.)
ФРЭНКЛАХ Ента Хелеўна (1885 г.)
ФРЭНКЛАХ Софія (12 гадоў)
ФРЭНКЛАХ Анатлія Халоеўна (1892 г.) і яе дзеці **Якаў** (12 гадоў) і **Ida** (3 гады)
ФУНК Лея Вольфаўна (1902 г.) і яе дзеці **Уладзімір** (12 гадоў), **Маня** (5 гадоў) і **Гірш** (2 гады)
ФУРМАН Яўхім Маркавіч (1914 г.)
ФУТАРАНСКАЯ Рахіля Уладзіміраўна (1865 г.)
ХАОН Хая Ханонаўна (1888 г.)
ХАОН Сендэр Ханонавіч (1892 г.)
ХАОН Фрыда Сендэраўна (1890 г.)
ХАОН Двойра Якаўлеўна (1923 г.)
ХАОН Міхля Лейбаўна (1926 г.)
ХАОН Лейба (14 гадоў)
ХАРХУРЫН Рыгор (14 гадоў)
ХАЧЫНСКАЯ Вольга Абрамаўна (1913 г.)
ХАШКОВА Соня Рыгораўна (1913 г.)
ХАШКОВА Мая (8 гадоў) і **Леанід** (3 гады)
ХЛУСЦІНА Шэйна Янкелеўна (1865 г.)
ЦВЯТКОЎ Мікалай Якаўлевіч (1907 г.)
ЦЕЛЕШ Рыгор Антонавіч (1907 г.)
ЦЭЙЛЕЎСКАЯ Бейля Сролеўна (1902 г.)
ЦЭНТНЕР Моўша (1860 г.)
ЧУХМАН Айзік Лейбавіч (1895 г.)
ЧУХМАН Бася Тавелеўна (1869 г.)
ЧУХМАН Бася Меераўна (1860 г.)
ЧУХМАН Хася Яўхімаўна (1904 г.)
ЧУХМАН Янкель Юдавіч (1860 г.)
ШАБАНОВІЧ Абрам Ніселевіч (1868 г.)
ШПІТАЛЬНІК Матля Юдаўна (1866 г.)
ШУЛЬМАН Майсей Міхайлавіч (1868 г.)
ШУЛЬМАН Хаім Лейбавіч (1884 г.), яго жонка **Хася Лейзераўна** (1886 г.) і іх дзеці **Рыва** (17 гадоў), **Сара** (15 гадоў), **Лазар** (13 гадоў), **Рыгор** (11 гадоў), **Генік** (3 гады)
ШУЛЬМАН Барыс Майсеевіч (1892 г.), яго жонка **Маня Бенядзіктаўна** (1914 г.) і іх дзеці **Рыта** (16 гадоў) і **Сіма** (1 год)
ШУМАК Сяргей Кірэевіч
ШУСТЭРМАН Бейла Голдаўна (1905 г.)
ШУСТЭРМАН Ася (6 гадоў)
ШУСТЭРМАН Ліза Нохімаўна (1904 г.)
ШУСТЭРМАН Ханя (7 гадоў)
ШУСТЭРМАН Хая Элеўна (1890 г.)
ШУСТЭРМАН Яўгенія Нохімаўна (1906 г.)
ШЭХТМАН Янкель Іосіфавіч (1898 г.)
ШЭХТМАН Эстэр Майсееўна (1884 г.)
ШЭХТМАН Рахіля Абрамаўна (1858 г.)

Загінулі ў 1943 г.

БАРАНАЎ Міхаіл Кірылавіч (1899 г.)
БРЭГМАН Марыя (10 гадоў)
БРЭГМАН Абрам (9 гадоў)
БРЭГМАН Сямён (6 гадоў)
БРЭГМАН Ганна (4 гады)
БЫЧКОЎСКІ Пётр Захаравіч (1894 г.), старшыня калгаса, і яго дачка **Вольга** (17 гадоў)
КАЛЕВАТАВА Вольга Дзям'янаўна (1904 г.) і яе дачка **Ганна** (17 гадоў)
КАНАВАЛЬЧУК Мікалай Мікалаевіч (1903 г.), **Лізавета** (1902 г.), **Аляксандр** (1916 г.), **Мікалай** (1923 г.) і **Галя** (1 год)
КАЧЫНСКАЯ Рыва Абрамаўна (1905 г.)
КУЗНЕЦ Каліна Донаўна (1906 г.) і яе дзеці **Лёва** (14 гадоў), **Хася** (13 гадоў), **Міша** (12 гадоў) і **Хаім** (9 гадоў)
КУЛЕШ Акуліна Іванаўна (1914 г.)
МАСКАЛЕНКА Васіль Максімавіч (1927 г.)
ПАЛІВОДА Эма Генрыхаўна (1882 г.)
САВІЦКАЯ Аляксандра Васілеўна (1908 г.)
ШЭЙКМАН Абрам Янкелевіч (1925 г.)
ШЭЙКМАН Янкель Шлёмавіч (1881 г.)
ШЭХТМАН Сара Сордухаўна (1878 г.)

Загінулі 14.1.1944 пры бамбёжцы Мазыра

САВЕНКА Майсей Мартынавіч (1888 г.)
САВЕНКА Пелагея Дзмітрыеўна (1889 г.)
САВЕНКА Антаніна Канстанцінаўна (1871 г.)
САВЕНКА Павел Лявонавіч
САВЕНКА Герасім Мартынавіч (1882 г.)

Скончылі жыццё самагубствам

Па сцверджанні сведкаў, якія жылі ў Мазыры ў перыяд фашысцкай акупацыі, восенню 1941 г. група жыхароў горада яўрэйскай нацыянальнасці, каб пазбегнуць гібелі ад рук фашыстаў, вырашыла падвергнуць сябе самагубству праз самаспальванне, якое і адбылося ў доме № 19 па вул. Пушкіна.

ГАФШТЭЙН Эля (1900 г.)
ГАФШТЭЙН Фейга (1905 г.)
ГАФШТЭЙН Соша (1922 г.) падпаліла хату і згарэла разам з усімі.
ГАФШТЭЙН Эер (1913 г.)
ГАФШТЭЙН Хая (1915 г.)
ГАФШТЭЙН Шлёма Эеравіч (1935 г.)
ГАФШТЭЙН Роза (1917 г.)
ГОФМАН Эля (1870 г.)
ГОФМАН Малка (1910 г.)
ГУТМАН (1885 г.)
ГУТМАН Нісель (1860 г.)
ДОМНІЧ (1895 г.)
ДОМНІЧ (1896 г.)
ЗАРЭЦКАЯ Броха (1887 г.)
ЗАРЭЦКІ Берка (1897 г.)
КАГАН Ісраэл (1901 г.)
РАВІНОВІЧ Моўша (1905 г.)
РАГІНСКАЯ Соня (1908 г.)
САНДАМІРСКАЯ Гнейша Майсееўна (1872 г.)
ФАРБЕРГ Іцхак (1890 г.)
ШЭХТМАН Фаня (1907 г.)

АСАВЕЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АСАВЕЦ

БАБЕР Аляксей Архіпавіч, н. у 1926, расстраляны ў 1942.
ВАСКЕВІЧ Ганна Якаўлеўна, н. у 1906, яе дзеці **Вольга** (13 гадоў), **Аляксандра** (11 гадоў) і **Ніна** (9 гадоў), расстраляны ў 1943.
ГАЛІЦКІ Леанід Мікалаевіч (1 год),
ГАНЧАРЭВІЧ Апанас Макаравіч, н. у 1900,
ГАНЧАРЭВІЧ Апанас Максімавіч, н. у 1901,
ГЕРАСІМОВІЧ Максім Данілавіч, н. у 1923 — расстраляны ў 1942.
ДУБЕНЬ Генадзь Васілевіч (3 гады),
ДУБЕНЬ Міхаіл Аляксеевіч, н. у 1926,
ДУБЕНЬ Павел Калінікавіч, н. у 1902, яго дзеці **Іван** (16 гадоў), **Яўгенія** (8 гадоў), **Ніна** (5 гадоў) і **Каця,**
ДУБЕНЬ Паша (10 гадоў),
ДУБЕНЬ Яўхім Іванавіч, н. у 1897, яго жонка **Лізавета Васілеўна,** н. у 1903, іх дзеці **Марыя** (18 гадоў), **Сцяпан** (15 гадоў), **Мікалай** (11 гадоў), **Таццяна** (7 гадоў) і **Уладзімір** — спалены жывымі 5.6.1943 у в. Спрымачоў.
КАВАЛЬЧУК Дзмітрый Ігнатавіч, н. у 1860,
КАВАЛЬЧУК Дзмітрый (7 гадоў),
КАВАЛЬЧУК Кацярына Іванаўна, н. у 1932,
КАВАЛЬЧУК Міхаіл Ігнатавіч, н. у 1863,
КАВАЛЬЧУК Міхаіл Кірэевіч, н. у 1867 — расстраляны ў 1943.
КАНАВАЛЬЧУК Аксенцій Назаравіч, н. у 1873, расстраляны ў 1943.
КАНАВАЛЬЧУК Лізавета Міхайлаўна, н. у 1887, спалена жывой у 1942.
КАНАВАЛЬЧУК Марыя Васілеўна (7 гадоў),
КАНАВАЛЬЧУК Мікалай Аляксеевіч, н. у 1914, яго жонка **Аляксандра Ігнатаўна,** н. у 1920, іх дзеці **Галіна** і **Мікалай** (2 і 1 год),
КАНАВАЛЬЧУК Мікалай Данілавіч, н. у 1917 — расстраляны ў 1943.
КАНАВАЛЬЧУК Яўгенія Сцяпанаўна, н. у 1898,
МАНАХ Фядора, н. у 1910 — расстраляны ў 1942.
МАРЦІНОВІЧ Артур Логвінавіч, н. у 1930, загінуў у 1944.
МАРЦІНОВІЧ Ілья Станіслававіч, н. у 1897, расстраляны ў 1942.
МАРЦІНОВІЧ Кузьма Рыгоравіч, н. у 1868,

МАРЦІНОВІЧ Мікалай, н. у 1861,
МАРЦІНОВІЧ Міхаіл Аляксеевіч (1 год),
МАРЦІНОВІЧ Пелагея, н. у 1883 — расстраляны ў 1943.

МАСЦІЧ Таццяна Маркаўна, н. у 1918, яе дзеці **Аляксей** і **Вольга** (5 і 3 гады), расстраляны ў 1942.

МАСЦІЧ Фядора, н. у 1883, расстраляна ў 1943.

МІКСЮК Фама Пятровіч, н. у 1905, падарваўся на міне ў 1944.

МІКСЮК Фёдар Аляксеевіч, н. у 1906,
ПАШАК Аляксей Міхайлавіч, н. у 1923,
ПАШАК Аляксандр Міхайлавіч (8 гадоў),
ПАШАК Марыя Сямёнаўна (9 гадоў) — забіты ў 1943.

СУГРЭЙ Аўдоцця, н. у 1885, расстраляна ў 1943.

СУГРЭЙ Фёкла, н. у 1902, яе дачка **Насця** (7 гадоў), расстраляны ў 1943.

СУДЗІБАР Аграфена Паўлаўна, н. у 1888, расстраляна ў 1942.
СУДЗІБАР Марыя Іванаўна (1 год),
ЦАЛКА Адам Міхайлавіч (1 год),
ЧЫРЫЧ Валянціна Данілаўна (4 гады),
ЧЫРЫЧ Марыя Герасімаўна, н. у 1868,
ШАСТАВЕЦ Антон Захаравіч, н. у 1852,
ШАСТАВЕЦ Антон Дзям'янавіч, н. у 1900,
ШАСТАВЕЦ Анатоль Антонавіч (7 гадоў),
ШАСТАВЕЦ Макар Ануфрыевіч, н. у 1927,
ШАСТАВЕЦ Матрона Іванаўна, н. у 1873,
ШАСТАВЕЦ Павел Антонавіч, н. у 1915,
ШАСТАВЕЦ Праскоўя Максімаўна, н. у 1895 — расстраляны ў 1943.

ВЁСКА АСАВЕЦКАЯ БУДА

БРАТКОЎСКІ Аляксей Фёдаравіч, н. у 1914, расстраляны ў 1943.

БРАТКОЎСКАЯ Антаніна Фёдараўна, н. у 1921, расстраляна ў 1943.

ВІДЗІНЧУК Ульяна Аляксееўна, н. у 1882, расстраляна ў 1942.

ВІДЗІНЧУК Якаў Сцяпанавіч, н. у 1877, расстраляны ў 1942.

КЕБЕЦ Стэфа, н. у 1863,
КЛІМЕНКА Сямён Данілавіч, н. у 1863 — расстраляны ў 1943.

ЛАПІЦКІ Міхаіл Максімавіч, н. у 1925, расстраляны ў 1942.

ВЁСКА ГІНЕВІЧАЎ ГРУД

БЫЧКОЎСКІ Пётр Максімавіч, н. у 1925, расстраляны ў студзені 1944.

БЫЧКОЎСКІ Піліп Максімавіч, н. у 1928, спалены жывым у студзені 1944.

ДУДНІЦКІ Васіль, н. у 1895, расстраляны ў 1943.

ВЁСКА ГЛІНІЦА

АРЛОЎСКАЯ Аксеня Міхайлаўна, н. у 1923, вывезена ў 1943 на прымусовыя работы ў Германію, там і загінула.

АРЛОЎСКІ Мікалай Севасцьянавіч, н. у 1906, яго маці (імя і імя па бацьку не ўстаноўлены), расстраляны ў 1943.

БЕЛКАВЕЦ Пётр Ільіч, н. у 1906, расстраляны ў 1941, пахаваны ў в. Майсеевічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.

БЫЧКОЎСКІ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1896,
БЫЧКОЎСКІ Ціхан Паўлавіч, н. у 1880,
ВАСКЕВІЧ Алена Васілеўна, н. у 1902,
ВАСКЕВІЧ Герасім Якаўлевіч, н. у 1887,
ВАСКЕВІЧ Іван (14 гадоў), яго брат **Мікалай** (5 гадоў) і сястра **Алена** (3 гады) — расстраляны ў 1943.

ВАСКЕВІЧ Дзяніс Рыгоравіч, н. у 1886, загінуў пры бамбёжцы ў 1943.

ВАСКЕВІЧ Мікалай, н. у 1880, яго жонка **Матруна,** н. у 1884, расстраляны ў 1942.
ВАСКЕВІЧ Павел Якаўлевіч, н. у 1881,
ВАСКЕВІЧ Сямён Якаўлевіч, н. у 1884,
ВАСКЕВІЧ Яўхім'я, н. у 1840 — расстраляны ў 1943.

ВЫСОЦКАЯ Ганна Мікалаеўна, н. у 1923, падарвалася на міне ў 1944.

ВЫСОЦКІ Ахрым, н. у 1863, расстраляны ў 1943.

ВЫСОЦКІ Калінік Васілевіч, н. у 1902, вывезены ў 1943 на работу ў Германію, там і загінуў.

ДАМАСЕВІЧ Іван Сцяпанавіч, н. у 1926, падарваўся на міне 12.7.1944.

ДЗЯГТУР Фісель Борухавіч, н. у 1894, яго жонка **Эстэр,** н. у 1894, іх дзеці **Берта** (15 гадоў), **Рыма** (14 гадоў), **Рахіль** (12 гадоў), **Якаў** (9 гадоў) і **Борух** (5 гадоў), расстраляны ў 1941.

ЗДАНЕВІЧ Ісак Іосіфавіч, н. у 1894,
ЗДАНЕВІЧ Мальвіна Мяфодзьеўна, н. у 1930,

КАВАЛЕВІЧ Міхаіл, н. у 1884 — расстраляны ў 1943.

КАЛІНОВІЧ Марыя Міхайлаўна, н. у 1923,

КАШЭВІЧ Сцяпан Іосіфавіч, н. у 1901, яго сын **Мікалай** (16 гадоў) — у 1942 вывезены на работу ў Германію, дзе і загінулі.

МАКАРАВЕЦ Карп Архіпавіч, н. у 1927,
МАРЦІНОВІЧ Ульяна Сцяпанаўна, яе сястра **Ева** (па 16 гадоў) — расстраляны ў 1943.

МАСКАЛЕНКА Іван Пятровіч, н. у 1926, падарваўся на міне ў 1944.

МАСКАЛЕНКА Уладзімір Сямёнавіч, н. у 1915, яго сын **Міхаіл** (7 гадоў), расстраляны ў 1943.

НЕСЦЯРЭНЯ Ульяна Аляксееўна, н. у 1898, яе дзеці **Наталля** і **Уладзімір** (11 і 5 гадоў), расстраляны ў 1942.

ПІСКУН Рыгор Міхайлавіч, н. у 1926, расстраляны ў 1943.

РАДАЎНЯ Еўдакія Яўхімаўна, н. у 1870, расстраляны ў 1942.

РАДАЎНЯ Ганна Пятроўна, н. у 1924,

РУБЛЕЎСКІ Васіль Мікалаевіч, н. у 1927 — падарваліся на мінах у 1944.

СУПОНЕНКА Арына Якаўлеўна, н. у 1886, расстраляна ў 1942.

ТУРЧЫН Мар'я, яе дачка **Надзея**, расстраляны ў 1942 як члены яўрэйскай сям'і.

ЧЫРЫЧ Агафія Міхайлаўна, н. у 1896, вывезена ў 1943 на работу ў Германію, там і загінула.

ЧЫРЫЧ Аляксандра Іосіфаўна, н. у 1910, падарвалася на міне ў 1943.

ЧЫРЫЧ Міхаіл Дзмітрыевіч, н. у 1927, вывезены ў 1943 на работу ў Германію, там і загінуў.

ВЁСКА ЗІМАВАЯ БУДА

КАШЭВІЧ Віталь Людвігавіч, н. у 1930, загінуў летам 1944 пры размініраванні мясцовасці.

КАШЭВІЧ Марыя Іванаўна (4 месяцы), забіта ў 1943.

КАШЭВІЧ Міхаіл Пятровіч, н. у 1930,

КАШЭВІЧ Пётр Іванавіч, н. у 1930 — загінулі летам 1944 пры размініраванні мясцовасці.

ХМЯЛЕЎСКІ Міхаіл Іванавіч, н. у 1883,

ШЭНДЗЕР Вольга Уладзіміраўна, н. у 1908 — расстраляны ў 1943.

ЯШЧЫКОЎСКАЯ Анастасія Яўхімаўна (10 гадоў),

ЯШЧЫКОЎСКАЯ Ганна Міхайлаўна, н. у 1909 — расстраляны ў студзені 1944.

ВЁСКА КАМЕНЬ

З актаў Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў:

...В 1942 г. карательный отряд СС сжег деревню Камень Осовецкого сельсовета. Было сожжено заживо 28 человек. Из этой деревни угнали в немецкое рабство 22 человека...

Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 310. Воп. 1. Спр. 18. Л. 3.

ВАСКЕВІЧ Акуліна Навумаўна, н. у 1905 і яе дзеці **Навум** (17 гадоў), **Аляксандр** (10 гадоў), **Міхаіл** (8 гадоў) і **Васіль** (3 гады)

ВАСКЕВІЧ Варвара (1902 г.)

ВАСКЕВІЧ Вера Іванаўна (1902 г.)

ВАСКЕВІЧ Ганна, н. у 1909 і яе дзеці **Вольга** (16 гадоў), **Надзея** (14 гадоў), **Аляксандра** (10 гадоў) і **Ніна** (8 гадоў)

ВАСКЕВІЧ Іван Кузьміч (10 гадоў)

ВАСКЕВІЧ Сцепаніда Адамаўна (1898 г.)

ЖУРАЎСКІ Сцяпан Адамавіч, н. у 1922, яго жонка **Анастасія Сцяпанаўна** (1922 г.) і іх сын **Віктар** (2 гады)

ЗДАНЕВІЧ Вольга Адамаўна (1914 г.)

ЗДАНЕВІЧ Сцепаніда (1872 г.)

МАРЦІНОВІЧ Анастасія Яўстратаўна (1920 г.)

МАРЦІНОВІЧ Лізавета (1867 г.)

МІКСЮК Ганна Радзівонаўна (1922 г.)

ЦАЛКА Андрэй Рыгоравіч (1862 г.)

ШАСТАВЕЦ Алена Васілеўна (7 гадоў)

ШАСТАВЕЦ Наталля (1864 г.)

ШАЎЦОВА Тамара (1 год)

ШЭВЕЛЬ Аляксандр (7 гадоў)

ШЭВЕЛЬ Галіна Карпаўна (1867 г.)

ШЭВЕЛЬ Марыя (6 месяцаў)

ВЁСКА КРЫНІЧНАЯ ГРАДА

БАГІНСКАЯ Альбіна Антонаўна, н. у 1922, загінула ў 1941.

БАГІНСКАЯ Ганна, н. у 1908,

БЕРДНІК Васіль Іванавіч, н. у 1905 — расстраляны ў 1943.

ІШСКУН Алена Мікалаеўна, н. у 1930, загінула ў 1941.

ВЁСКА КРУШНІКІ

ЗДАНЕВІЧ Франц Данілавіч, н. у 1862,

КАНАВАЛЬЧУК Мікалай Антонавіч, н. у 1913, супрацоўнік міліцыі г. Петрыкаў — расстраляны ў 1942.

КАШАЕД Іван Мікалаевіч, н. у 1907, расстраляны ў 1942.

КРУПА Ульяна Ігнатаўна, н. у 1898, расстраляна ў 1943.

РАВУЦКІ Ігнат Іванавіч, н. у 1872,

ЧЫЖЭЎСКАЯ Антаніна Міхайлаўна, н. у 1898 — расстраляны ў 1942.

ЮНІЦКАЯ Ганна Пятроўна, н. у 1923, вывезена ў 1942 на работу ў Германію, там і загінула.

ЮНІЦКІ Іван Пятровіч, н. у 1931, загінуў пры бамбёжцы ў 1941 у Данецкай вобл.

ЮНІЦКАЯ Караліна, н. у 1878, яе сын **Адам** (19 гадоў), расстраляны ў 1943.

ВЁСКА ЛЕТАВІШЧЫ

У ліпені 1943 г. карная экспедыцыя спаліла ўсе 19 хат вёскі, жыхароў, якія не паспелі схавацца ў лесе, расстралялі.

БАБЁР Аляксей Арцёмавіч (1908 г.)

БАБЁР Варвара Сцяпанаўна, н. у 1908, яе дзеці **Кацярына** (8 гадоў), **Надзея** (5 гадоў) і **Любоў** (3 гады)

ДУБЕНЬ Анатоль (6 месяцаў)

ДУБЕНЬ Мікалай Захаравіч (1927 г.)
ЗУХТА Антон Лявонавіч (1908 г.)
КАВАЛЬЧУК Кацярына Іванаўна (9 гадоў)
КОЗЕЛ Юрый (7 гадоў)
МАРЦІНОВІЧ Антон Лявонавіч (1903 г.)
МАРЦІНОВІЧ Ева (1863 г.)
МАРЦІНОВІЧ Ніна (3 месяцы)
МАСЦІЧ Фёкла Васілеўна (100 гадоў)
САКАЛОЎСКАЯ Ніна (1 год)

ВЁСКА ПЕРАДРЭЙКА

Бацька ваяваў у партызанскім злучэнні С. А. Каўпака. 12 сакавіка 1943 г. ён загінуў. А я ўсё-такі той вясной уступіў у Мазырскі партызанскі атрад, быў яго байцом да самага вызвалення раёна.

А. Уласенка

АБ РАЗГРОМЕ МАЗЫРСКІМ ПАРТЫЗАНСКІМ АТРАДАМ СУМЕСНА З УКРАІНСКІМІ ПАРТЫЗАНАМІ ЗЛУЧЭННЯ А. САБУРАВА 30 ЖНІЎНЯ 1943 г. У в. ШЧАКАТАВА МАЗЫРСКАГА Р-НА ВАРОЖАГА ГАРНІЗОНА

(Са справаздачы. Не пазней 21 лютага 1944 г.)

Постоянную связь Мозырский партизанский отряд поддерживал с украинскими партизанами — соединением А. Н. Сабурова, находившимся в то время в соседнем Лельчицком районе. О гарнизонах противника в Мозырском районе Сабурову сообщалось ежедневно.

27 августа 1943 г. т. Сабуров с двумя ротами и взводом конников прибыл в населенный пункт Крушники. Командир отряда т. Жильский и зам. командира по разведке Кирюшкин прибыли к Сабурову с предложением о совместном разгроме одного из гарнизонов в Мозырском районе. Избрали гарнизон в д. Щекотова. Перед Мозырским партизанским отрядом была поставлена следующая задача: к 8.00 часам 28 августа 1943 г. дать подробные разведданные о силе и вооружении гарнизона в этой деревне.

...Одновременно в н. п. Крушники был намечен маршрут движения и конечный пункт сбора. Тут же были подсчитаны вооружение и силы партизан. В отряде из соединения Сабурова насчитывалось 250 человек и конный взвод в 40 человек из личной охраны. Вооружение: пушек 45 мм — 2, минометов ротных — 4, пулеметов ручных — 6, автоматов — 228, остальное — винтовки. В Мозырском партизанском отряде — 220 человек, вооружение: пулеметов ручных — 3, автоматов — 21, остальное — винтовки.

Путем опроса местных жителей дер. Щекотова разведка доложила, что гарнизон располагается в двух сараях западнее деревни (до 400 м), вокруг прорыты окопы. От военного городка Козенки проведена телефонная связь. Там же около сараев размещено 150 верховых лошадей. В д. Щекотова находится застава — 15 человек с винтовками и до 500 лошадей, на которых наложен карантин.

Сабуров и Жильский, получив данные о противнике гарнизона в Щекотове и в других населенных пунктах, совместно составили план наступления...

В 16.00 часов 19 августа 1943 г. Сабуров собрал командный состав, проверил готовность и отдал приказ...

1. Командиру первой роты автоматчиков выслать 30 чел. на дорогу из военного городка Козенки на Щекотову и в 3.00 часа 30 августа сделать засаду в 3 км от Щекотовы, заминировать дорогу минами для автомашины. В 3 час. 30 мин. порвать связь с Козенками.

2. Командиру Мозырского партизанского отряда т. Жильскому выделить 20 человек с винтовками (в качестве проводников), хорошо знающих населенный пункт Щекотову и окружающие деревни.

Группой в 40 человек (заслон от Слободы) руководил командир Мозырского отряда; группой в 30 человек (заслон от Козенок) руководил командир взвода группы автоматчиков соединения Сабурова, группой в 20 чел. (заслон от Рудни) руководил командир взвода Мозырского партизанского отряда, и главной ударной группой, до 400 чел., руководил помощник Сабурова.

К 4.00 30 августа все группы достигли намеченных рубежей и ожидали сигнала. В 4.00 Сабуров дал команду: «По городку Козенки двумя снарядами «Огонь!»

Фашистов, погрузившихся в глубокий сон, ошеломил оглушительный треск пулеметов, автоматов и винтовок, взрывы мин. Сараи, где они спали, загорелись. Гитлеровцы, успевшие выскочить в одном белье, под светом пожара расстреливались партизанами, подползшими к сараям на 20—30 метров.

Бой длился около 20 минут. Застава, находившаяся в Рудне, залезла в щели и не сделала ни единого выстрела. Только со стороны Щекотовы раздалось несколько ружейных выстрелов. Группа партизан до 15 человек с пулеметом подползла к конюшням в д. Щекотова и огнем уничтожила до 200 лошадей, остальные разбежались. Группа командира Мозырского отряда одновременно по сигналу открыла огонь по школе и прилегающему к ней дому в Слободе, в которых размещались немецкие вояки.

Противник пытался подбросить подкрепление из Козенок. Три автомашины с живой силой подорвались на минах, немецкие солдаты были обстреляны автоматным огнем, остальные пять машин с войском противника повернули обратно. Подобрав трофеи, в 4.55 был дан сигнал на отход (две зеленые ракеты).

Результаты операции: противник понес следующие потери — в гарнизоне Щекотова убито гитлеровцев 150 чел. По дороге Козенки — Щекотова уничтожено три автомашины, убито и ранено до 50 фашистов. В дер. Слобода убито 12 гитлеровцев. Трофеи: пулеметов ручных — 4, винтовок — 93, лошадей — 120, седел — 30, зерна в д. Слобода — 3 тонны...

Командир Мозырской партизанской бригады *Жильский*, комиссар партизанской бригады *Кирюшкин*, начальник штаба бригады *Заборов*

Всенародное партизанское движение... Т. 2, кн. 2. С. 646—651.

Помнік на месцы разгрому партызанамі нямецкага гарнізона ў в. Шчакатава

Партызан Ян Зэлінка

У барацьбе з фашызмам разам з палескімі партызанамі ўдзельнічалі і грамадзяне краін Еўропы. Так і ў складзе брыгады імя Аляксандра Неўскага ваявала: сербаў — 20, славакаў — 12, румынаў — 1, фінаў — 1 чалавек... Аб гэтым сказана ў выніковай справаздачы камандавання брыгады ад 20 лютага 1944 г.

...Цёмнай красавіцкай ноччу 1943 г. пяцёра салдат-славакаў уцяклі з нямецкага гарнізона Козенкі. Яны прыйшлі ў партызанскі атрад. У сваёй зямлянцы перабежчыкаў сустрэў камандзір партызанскай брыгады Аляксандр Жыльскі.

— Пан вяліцель! З'явіліся ў ваша падпарадкаванне! — далажыў Ян Зэлінка.

— Добры дзень, сябры! — Моцна паціснуў руку кожнаму з іх камандзір. Завязалася цёплая размова.

У зямлянцы з'явіўся камандзір атрада Андрэй Колас, разведчыкі Мікалай Кірушкін і Дзмітрый Гаруля. Доўга размаўлялі, успаміналі, як славакі перадавалі партызанам медыкаменты, соль, зброю, боепрыпасы, звесткі аб праціўніку... Праз некалькі дзён славакі сталі членамі падрыўной групы, якую ўзначаліў партызан Павел Лузан.

...У цішыні цёмнай, ціхай красавіцкай ночы зрэдку ўспыхвалі асвятляльныя ракеты. Як не любілі іх партызаны! Павісне над галавою — быццам распранае.

— Наперад! — загадаў камандзір.

Ян Зэлінка, Вячаслаў Крыжаноўскі і Антон Качаноўскі папаўзлі да рэек і спрытна пачалі працаваць сапёрнымі лапатамі. Міна замаскіравана.

Хутка цішыню ночы ўзарваў моцны выбух. Дваццаць пяць вагонаў з боепрыпасамі і фашысцкай аховай паляцелі пад адхон...

Аперацыі на чыгункі ў розных месцах адбываліся сістэматычна. Усе іх цяжка і пералічыць.

Пасля вайны Ян Зэлінка застаўся на Палессі, ажаніўся. Яго жонкай стала былая партызанская сувязная Лена. Разам вырасцілі дзяцей. Іван Іванавіч, як з павагай называлі Яна жыхары

Ян Зэлінка

Іванкаўшчыны, працаваў лесніком у Мазырскім лясгасе, быў у ліку лепшых. Наведваўся і на сваю далёкую радзіму — Славакію. Але цягнула на новую... Памёр Іван Іванавіч у кастрычніку 1978 г.

На новай радзіме, за якую ён ваяваў, якая стала яму па-сапраўднаму роднай, на якой, нарэшце, вырасціў дзяцей, яго памятаюць, часта ўспамінаюць Яна добрымі словамі баявыя сябры і жыхары Мазыршчыны.

І. Цітоў

Жыхары Мазыршчыны, якія змагаліся ў партызанскіх атрадах і загінулі на тэрыторыі раёна і за яго межамі

Архівы Мінска, Кіева і Кішынёва даюць дакладныя звесткі аб удзеле жыхароў Мазыршчыны ў масавым партызанскім руху. Так, у Мазырскай партызанскай брыгадзе імя Аляксандра Неўскага з 500 чалавек каля 400 былі жыхарамі горада і раёна. 250 чалавек ваявалі ў Петрыкаўскай брыгадзе, 100 — у Ельскай, нямала мазыран былі партызанамі і ў суседніх раёнах...

19 лістапада 1942 года на Мазыршчыну ў раёне вёсак Аравічы — Барбароў цераз Прыпяць пераправіліся ўкраінскія партызанскія злучэнні С. Каўпака, А. Сабурава і А. Фёдарава. Прыбыццё на беларускае Палессе значна ўмацавала іх сілы. У злучэнне А. Сабурава пайшлі ваяваць 300 жыхароў Мазыршчыны, А. Фёдарава — каля 100, С. Каўпака — больш за 50 чалавек. Некалькі дзесяткаў чалавек былі байцамі Вінніцкага і Ровенскага злучэнняў. Вясной 1943 г. тут, у лясах Палесся, фарміравалася і 1-е Малдаўскае партызанскае злучэнне, дзе толькі з двух сельсаветаў раёна, Асавецкага і Скрыгалаўскага, ваявала больш як 100 чалавек. Маюцца звесткі аб удзеле мазыран у партызанскай барацьбе ў Карэліі, Смаленскай, Бранскай, Чарнігаўскай і іншых абласцях. Вядомы імёны каля 250 жыхароў горада і раёна, якія загінулі ў баявых дзеяннях лясной арміі. Толькі на тэрыторыі раёна загінула і пахавана больш як 50 партызан з украінскіх і беларускіх атрадаў, у тым ліку з Мазырскай брыгады імя А. Неўскага — 25 чалавек.

ГОРАД МАЗЫР

АРЦЁМАЎ Аркадзь П., н. у 1918, партызан 99-й Калінкавіцкай брыгады, загінуў 25.10.1943 у в. Заходы Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.

ДУЛУБ Рыгор Васілевіч, н. у 1924, партызан, павешаны 10.8.1943 у г. Мазыр.

КАЗАЧУК Яўген Іванавіч, партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў г. Хойнікі.

КАРАСЁЎ Даніла Лазаравіч, н. у 1911, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 4.7.1943, пахаваны ў в. Раманаўка Мазырскага р-на.

КРЫЖАНОЎСКІ Антон Яўхімавіч, н. у 1891, партызан, памёр ад хваробы 10.10.1943 у в. Глазкі Ельскага р-на Гомельскай вобл.

КУЗМЯНЮК Лука Дзямідавіч, н. у 1918, партызан 101-й Даманавіцкай брыгады, загінуў 15.9.1943 у в. Узнаж Гомельскай вобл.

ЛЯЎКО Васіль Рыгоравіч, н. у 1919, намеснік камандзіра атрада 99-й Калінкавіцкай брыгады, загінуў 25.3.1944 у в. Хвойнае Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

МАКАРАНКА Максім Ігнатавіч, сакратар Мазырскага райкама КП(б)Б, камандзір Мазырскага партызанскага атрада ў жніўні — кастрычніку 1941, загінуў у 1943 у Магілёўскай вобл.

Я. І. Казачук

Д. Л. Карасёў

Р. А. Чавус

З. А. Пашак

СТАЧЫНСКІ Фёдар Ільіч, н. у 1909, камандзір аддзялення атрада імя М. Хрушчова, загінуў 1.4.1944 у в. Радаўніца Львоўскай вобл.

СЧАСЛАЎСКІ Пётр Ігнатавіч, камісар Мазырскага атрада ў жніўні – кастрычніку 1941, загінуў 16.5.1944 у Бялыніцкім р-не Магілёўскай вобл.

ТАЛКАЧОЎ Яўген Іосіфавіч, н. у 1924, камандзір узвода 99-й Калінкавіцкай брыгады, загінуў 16.9.1942 у в. Аўцюкі Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.

ЦІТАВЕЦ Альберт Уладзіміравіч, н. у 1924, партызан злучэння А. Фёдарава, прапаў без вестак 25.1.1943.

ЧАВУС Рыгор Антонавіч, н. у 1912, ст. лейтэнант, начальнік штаба партызанскага атрада імя Варашылава, загінуў 17.9.1942 у Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл.

ШКАРАДЗІК Ян Янавіч, н. у 1918, партызан, загінуў у сакавіку 1943 у в. Нахаў Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.

АСАВЕЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АСАВЕЦ

ВАСКЕВІЧ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1906, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў 27.3. 1944 у в. Яварнік Валынскай вобл.

КАНАВАЛЬЧУК Піліп Аўксенцьевіч, н. у 1911, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў 27.3.1944 у в. Яварнік Валынскай вобл.

РАБІНСКІ Нікіфар Піліпавіч, н. у 1902, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў 23.9.1943 у в. В. Студзень Ровенскай вобл.

СЕЛЬВІЧ Васіль Сяргеевіч, н. у 1922, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў 17.7. 1943 у в. Чырванаволе Ровенскай вобл.

ВЁСКА АСАВЕЦКАЯ БУДА

КОРЖ Тарас Якаўлевіч, н. у 1925, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў у чэрвені 1944 у Брэсцкай вобл.

СТАНКЕВІЧ Кандрат Данілавіч, н. у 1903, партызан злучэння А. Сабурава, з 1944 – у органах НКУС, загінуў у баі з нацыяналістамі ў 1945 у Хмяльніцкай вобл.

ВЁСКА ГІНЕВІЧАЎ ГРУД

БЫЧКОЎСКІ Міхаіл Лаўрэнцьевіч, н. у 1926, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1943 у Жытомірскай вобл.

ПАШАК Зыгмунд Андрэевіч, н. у 1903, камандзір аддзялення партызанскага атрада імя Катоўскага 1-га Малдаўскага злучэння, загінуў 18.11.1943 у в. Беразнякі Жытомірскай вобл.

ХАДАКОЎСКІ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1923, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у чэрвені 1943 у в. Залавы Ракітнянскага р-на Ровенскай вобл.

ВЁСКА ГЛІНІЦА

ВАСКЕВІЧ Васіль Кузьміч, н. у 1926, партызан, прапаў без вестак у 1944.

ВАСКЕВІЧ Васіль Сцяпанавіч, н. у 1897, партызан, прапаў без вестак у 1944.

ВАСКЕВІЧ Мікалай Васілевіч, н. у 1923, расстраляны ў 1942 за сувязь з партызанамі.

ВАСКЕВІЧ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1898, партызан, прапаў без вестак у 1943.

ВАСКЕВІЧ Нікіфар Іванавіч, н. у 1923, партызан 1-га Малдаўскага злучэння, прапаў без вестак у 1944 у Вінніцкай вобл.

ВЫСОЦКІ Міхаіл Паўлавіч, н. у 1924, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 10.5. 1944 у Заходняй Украіне.

ЖУКАВЕЦ Іван Калінікавіч, н. у 1920, партызан 1-га Малдаўскага злучэння, загінуў у кастрычніку 1943 у Цярнопальскай вобл.

МАКАРАВЕЦ Захар Пятровіч, н. у 1898, партызан, расстраляны ў 1943, пахаваны ў в. Асавец.

ФІЦНЕР Іван Адамавіч, н. у 1923, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў у 1943.

ЦАЛКА Яўхім Міхеевіч, н. у 1926, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943, пахаваны ў в. Уладзіміраўка Ровенскай вобл.

ГЛІНІЦКІ ПАСЁЛАК

ВАСКЕВІЧ Міхаіл Аксёнавіч, н. у 1923, партызан 136-га атрада Петрыкаўскай брыгады, памёр ад ран у 1943.

ВЁСКА ЗІМАВАЯ БУДА

РЭВУТ Нікадзім Лявонавіч, н. у 1923, партызан 1-га Малдаўскага злучэння, прапаў без вестак у 1944 у Вінніцкай вобл.

ВЁСКА КАМЕНЬ

ВАСКЕВІЧ Васіль Кузьміч, н. у 1926, партызан злучэння А. Фёдарава, прапаў без вестак у 1943.

ВЁСКА КРУШНІКІ

ЗДАНЕВІЧ Аляксей Францавіч, н. у 1908, старшыня калгаса, партызан Вінніцкага злучэння, прапаў без вестак у 1943.

ЗДАНЕВІЧ Уладзімір Уладзіміравіч, н. у 1903, партызан Вінніцкага злучэння, памёр ад ран 12.8.1944.

КАШАЕД Аляксандр Уладзіміравіч, н.у 1921, партызан Вінніцкага злучэння, загінуў 28.7.1943 у Хмяльніцкай вобл.

КАШАЕД Пётр Францавіч, н. у 1924, партызан атрада «Чырвоны» Вінніцкага злучэння, загінуў 28.7.1943 у в. Чамярыўцы Хмяльніцкай вобл.

КАШАЕД Фабіян Мікалаевіч, н. у 1910, партызан Вінніцкага злучэння, прапаў без вестак у верасні 1943.

КРУПА Лявон Казіміравіч, н. у 1923, партызан атрада «Чырвоны» Вінніцкага злучэння, загінуў 28.7.1943 у Хмяльніцкай вобл.

ПАШАК Іван Яўхімавіч, н. у 1918, партызан Ровенскага злучэння, загінуў 28.7.1943 у в. Чамярыўцы Хмяльніцкай вобл.

ФІЦНЕР Уладзімір Іванавіч, н. у 1920, партызан атрада «Чырвоны» Вінніцкага злучэння, загінуў 28.7.1943 у Хмяльніцкай вобл.

ЮНІЦКІ Аляксандр Іванавіч, н. у 1921, партызан атрада «Чырвоны» Вінніцкага злучэння, загінуў 28.7.1943 у в. Чамярыўцы Хмяльніцкай вобл.

ВЁСКА КРЫНІЧНАЯ ГРАДА

БАГІНСКІ Уладзімір Эдуардавіч, н. у 1927, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў пры размініраванні.

ВЁСКА ПЕРАДРЭЙКА

ЖУРАЎСКІ Андрэй Філарэтавіч, н. у 1923, партызан злучэння А. Фёдарава, прапаў без вестак восенню 1943.

ЖУРАЎСКІ Мікалай Лукашавіч, н. у 1923, партызан злучэння А. Фёдарава, прапаў без вестак у 1944 у Ровенскай вобл.

ЖУРАЎСКІ Сцяпан Мікалаевіч, н. у 1904, партызан 130-й Петрыкаўскай брыгады, загінуў 3.11.1943 каля в. Конкавічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.

КОРЖ Тарас Якаўлевіч, н. у 1925, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў 3.11.1943 у в. Машчаніда Цуманскага р-на Ровенскай вобл.

СЕМЕЧКА Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1925,

Т. Я. Корж

партызан злучэння А. Фёдарава, прапаў без вестак у 1943.

ШЛЯГА Мікалай Паўлавіч, н. у 1926, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў 6.11.1943 у в. Берасняны Цуманскага р-на Ровенскай вобл.

ВЁСКА СКАЛОДЗІН

СЯЎРУК Арсен Мікалаевіч, партызан, загінуў у 1943.

ЦАЛКА Сцяпан Ніканавіч, партызан, загінуў у 1943.

ЦАЛКА Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1905, партызан, загінуў у 1943 каля в. Астражанка Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.

ВЁСКА ТУРБІНКА

ВАНЬКОВІЧ Уладзімір Сямёнавіч, н. у 1920, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1944 у Польшчы.

БАРБАРОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ГОРНАЯ

ЗАЙЦАЎ Васіль Лук'янавіч, н. у 1924, партызан злучэння С. Каўпака, загінуў 9.2.1943 у Жытомірскай вобл.

ПАСЁЛАК ПЕРАДАВЫ

КУНЕЦ Пётр Клімавіч, н. у 1914, партызан злучэння С. Каўпака, прапаў без вестак у снежні 1942.

ПАПОК Ілья Міхайлавіч, н. у 1915, камандзір аддзялення злучэння С. Каўпака, загінуў 3.3.1944 у в. Дамбровіца Валынскай вобл.

ПАСЁЛАК ПРАГРЭС

КУНЕЦ Пётр Арцёмавіч, н. у 1915, партызан злучэння С. Каўпака, прапаў без вестак у 1943.

КАМЕНКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АНТОНАЎКА

ГАРМОНЕНКА Васіль Сямёнавіч, н. у 1925, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 16.11.1943 каля г. Оўруч Жытомірскай вобл.

ВЁСКА БЯРОЗАЎКА

ГУЛІК Павел Мікалаевіч, н. у 1916, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у верасні 1943 пры мініраванні чыгункі.

ВЁСКА ВАСЬКАЎКА

БАКУН Фёдар Іванавіч, н. у 1921, член Мазырскай падпольнай арганізацыі і партызан у 1941—1942, расстраляны ў чэрвені 1942.

ІЛЬЮК Міхаіл Мацвеевіч, н. у 1922, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943 каля г. Высоцк Ровенскай вобл.

КАДОЛ Сцяпан Лявонавіч, н. у 1900, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у студзені 1944 каля г. Мазыр.

РЫМША Ганна Іванаўна, н. у 1908, партызанка Мазырскага атрада ў 1941, расстраляна ў кастрычніку 1942.

САЧУК Павел Нікадзімавіч, н. у 1912, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1943.

ВЁСКА ГОСТАЎ

АЎДЗЯЙЧУК Іван Антонавіч, н. у 1924, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1943.

ДАНІЛЬЧАНКА Уладзімір Андрэевіч, н. у 1924, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1943 у Заходняй Украіне.

МАЗУРКЕВІЧ Пелагея Рыгораўна, н. у 1903, расстраляна з малым дзіцём у 1943 за сувязь з партызанамі.

ШУЛЯРЭНКА Іван Захаравіч, н. у 1924, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 10.8.1943, пахаваны ў в. Даўгань Ровенскай вобл.

ШУЛЯРЭНКА Павел Захаравіч, н. у 1926, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1943.

ВЁСКА ІВАНКАЎШЧЫНА

ПАТАПЕНКА Фёдар Давыдавіч, н. у 1910, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 21.12.1943.

СУХАНІЦКІ Васіль Рыгоравіч, н. у 1926, партызан, прапаў без вестак у 1945.

Ф. Д. Патапенка

В. Ф. Нягрэй

ВЁСКА КАМЕНКА

АНТОНЕНКА Іван Рыгоравіч, н. у 1910, старшыня калгаса ў в. Каменка, партызан Мазырскага атрада і злучэння С. Каўпака, загінуў у 1943 у Кіеўскай вобл.

НЯГРЭЙ Вольга Фёдараўна, н. у 1920, член Мазырскай падпольнай арганізацыі, сувязная партызанскага атрада, расстраляна ў лістападзе 1943.

УЛАСЕНКА Мікалай Філімонавіч, н. у 1904, член Мазырскай падпольнай арганізацыі, затым партызан злучэння С. Каўпака, загінуў 18.3.1943 у Кіеўскай вобл.

ВЁСКА МЯЛЕШКАВІЧЫ

БАКУН Іван Антонавіч, н. у 1909, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 18.4.1943 каля в. Слабада.

ВОЎК Іван Іосіфавіч, н. у 1907, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943 у Брэсцкай вобл.

ДУБАВЕЦ Мікалай Адамавіч, н. у 1910, партызан Мазырскага атрада, расстраляны 8.1.1942 у г. Мазыр.

ЖЫЛЬСКІ Ігнат Міхайлавіч, н. у 1922, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, прапаў без вестак у 1943.

ЖЫЛЬСКІ Сцяпан Міхайлавіч, н. у 1920, партызан атрада імя Багдана Хмяльніцкага Ровенскага злучэння, загінуў у 1944 у в. Грамячы Ровенскай вобл.

ЗАХАРАНКА Яўсей Рыгоравіч, н. у 1915, партызан Мазырскага атрада, загінуў 13.7.1943.

ЗДРОК Кірэй Якімавіч, н. у 1904, старшыня калгаса, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 23.12.1943.

ЗЯНКЕВІЧ Уладзімір Уладзіміравіч, партызан, загінуў у студзені 1944 у Жытомірскай вобл.

КАЧЭНЯ Кірыла Ерамеевіч, н. у 1903, партызан, расстраляны ў 1943.

ЛУЗАН Павел Максімавіч, н. у 1919, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, памёр ад ран 20.1.1944.

ПЯТРОЎСКІ Іван Фёдаравіч, н. у 1916, настаўнік, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, памёр ад хваробы 6.1. 1944.

СУХАНІЦКІ Якаў Паўлавіч, н. у 1916, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 12.4. 1945 у баі з украінскімі нацыяналістамі ў Львоўскай вобл.

УРЭЦКІ Хонан Айзікавіч, н. у 1904, старшыня калгаса, партызан Мазырскага атрада, расстраляны 8.1.1942.

КОЗЕНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БУЛАЎКІ

ФЕДАРЭНКА Аляксей Іванавіч, н. у 1907, працаваў старшынёй сельсавета, партызан злучэння С. Каўпака, прапаў без вестак у 1943.

ВЁСКА ДРАЗДЫ

РУДЗІНСКІ Антон Феліксавіч, н. у 1923, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, прапаў без вестак 12—13 студзеня 1944 у баі за Мазыр.

ВЁСКА КОЗЕНКІ

БЕЛЫ Пётр Сямёнавіч, н. у 1915, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 31.12.1943.

КРЫНІЧАНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БІБІКІ

ДУБРОВА Дзмітрый Калінікавіч, н. у 1906, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 10.11. 1943 у Жытомірскай вобл.

ДУБРОЎСКІ Ілья Адамавіч, партызан злучэння С. Каўпака, загінуў 25.12.1942 у Жытомірскай вобл.

ЗУБАР Купрыян Данілавіч, н. у 1913, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1944.

ЛЕВАНЧУК Рыгор Якаўлевіч, н. у 1917, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 8.4. 1944 у в. Падкамень Львоўскай вобл.

МАЙСЕЕНКА Яўхім Кірылавіч, партызан злучэння С. Каўпака, загінуў 15.3.1943 у Жытомірскай вобл.

СЕМЯНЕНКА Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1920, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у студзені 1943.

ЯРАШ Нікіфар Канстанцінавіч, н. у 1913,

А. Ф. Семяненка

Н. К. Ярош

М. П. Гарбарчук

П. К. Гурын

партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943 у в. Скароднае Ельскага р-на Гомельскай вобл.

ВЁСКА ГУРЫНЫ

ГАРБАРЧУК Мікалай Паўлавіч, н. у 1912, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 24.11. 1942 у в. Скароднае Ельскага р-на Гомельскай вобл.

ГУРЫН Павел Ксенафонтавіч, н. у 1920, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 24.11. 1942 у в. Скароднае Ельскага р-на Гомельскай вобл.

МАРДУСЕВІЧ Аляксандр Рыгоравіч, н. у 1896, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 30.4.1944 у Валынскай вобл.

МАРДУСЕВІЧ Браніслаў Антонавіч, н. у 1905, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943 у Заходняй Украіне.

САСНОВІЧ Іван Іосіфавіч, н. у 1918, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 24.11. 1942 у в. Скароднае Ельскага р-на Гомельскай вобл.

ФЕШЧАНКА Мікалай Фёдаравіч, н. у 1907, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у кастрычніку 1942.

А. Р. Мардусевіч

Б. А. Мардусевіч

ХУТАР МОЛАЖАВА

КРАЎЧАНКА Рыгор Андрэевіч, н. у 1915, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943.

МАХНАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ЗАБАЛАЦЦЕ

ГАЙДУК Якаў Іосіфавіч, н. у 1913, партызан Ельскай брыгады, загінуў 29.11.1943 у г. Ельск Гомельскай вобл.

КАНОПЛІЧ Рыгор Паўлавіч, партызан Махнавіцкага атрада ў жніўні — кастрычніку 1941, расстраляны ў красавіку 1942.

ХАРЛАНЧУК Пётр Фёдаравіч, н. у 1910, партызан Ельскай брыгады, загінуў 10.7.1943.

ВЁСКА ЗАВОДНЫ ВОСТРАЎ

КАСЦЮКЕВІЧ Ганна Антонаўна, н. у 1916, партызанка Ельскай брыгады, прапала без вестак 20.7.1943.

КАСЦЮКЕВІЧ Марыя Антонаўна, н. у 1923, працавала настаўніцай, партызанка Ельскай брыгады, загінула 27.7.1943, пахавана ў в. Вярхі Ельскага р-на Гомельскай вобл.

ЛІТВІНЧУК Андрэй Віктаравіч, н. у 1912, партызан Ельскага атрада, загінуў 1.1.1943.

ЛІТВІНЧУК Якаў Андрэевіч, н. у 1898, партызан, загінуў зімой 1941 у в. Новы Славечанскага р-на Жытомірскай вобл.

СТАРАВОЙТ Аляксандр Дзям'янавіч, н. у 1919, партызан Ельскай брыгады, загінуў 29.11. 1943 у г. Ельск Гомельскай вобл.

ВЁСКА ЗЯЛЁНЫ МОХ

ЖУРАЎСКІ Сямён Станіслававіч, н. у 1898, старшыня калгаса ў в. Махнавічы, партызан Махнавіцкага атрада, расстраляны ў 1942.

ВЁСКА МАХНАВІЧЫ

ЗАЯЦ Іван Еўдакімавіч, н. у 1921, партызан Махнавіцкага атрада, расстраляны 14.3.1942.

ЗАЯЦ Павел Якаўлевіч, н. у 1916, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 5.1.1945 у баі з нацыяналістамі ў пас. Тарчын Ровенскай вобл.

ЗАЯЦ Піліп Міхайлавіч, н. у 1914, партызан злучэння С. Каўпака, прапаў без вестак у ліпені 1943.

КАНОПЛІЧ Апанас Дзмітрыевіч, н. у 1912, старшыня Махнавіцкага сельсавета, партызан Махнавіцкага атрада, расстраляны 14.3.1942.

КАНОПЛІЧ Іван Дзям'янавіч, н. у 1902, партызан Махнавіцкага атрада, расстраляны 14.3.1942.

КАНОПЛІЧ Рыгор Калінікавіч, н. у 1893, партызан Махнавіцкага атрада, расстраляны 14.3.1942.

КАНОПЛІЧ Сцяпан Дзям'янавіч, н. у 1904, партызан Махнавіцкага атрада, расстраляны 14.3.1942.

ВЁСКА ПАДЛЯДЗІЧЫ

КАНОПЛІЧ Мікалай Максімавіч, н. у 1912, партызан Ельскай брыгады, загінуў 8.1. 1944 у в. Рамязы Ельскага р-на Гомельскай вобл.

КАНОПЛІЧ Фёдар Архіпавіч, партызан, прапаў без вестак у 1943.

СТЭЦКІ Васіль Фёдаравіч, н. у 1904, партызан Махнавіцкага атрада, расстраляны ў 1941.

МІХАЛКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА КУСТАЎНІЦА

ДЗЕРАНГОЎСКАЯ Ірына Антонаўна, н. у 1919, студэнтка Маскоўскага медыцынскага інстытута, у 1942 у складзе разведвальнай групы накіравана ў тыл ворага і прапала без вестак.

ШАРАЙ Адам Іосіфавіч, н. у 1919, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1944.

ШАРАЙ Мікалай Пятровіч, н. у 1915, настаўнік, палітрук роты Лельчыцкай партызанскай брыгады, загінуў 15.7.1943, пахаваны ў в. Стадолічы Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.

ВЁСКА МАЛЫ БАКАВЕЦ

АНТОНЕНКА Іван Рыгоравіч, н. у 1902, партызан, памёр ад ран 5.2.1943, пахаваны ў Маскве на Прэабражэнскіх могілках.

ЧЫРЭЦ Іван Апанасавіч, н. у 1915, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1944 у Польшчы.

І. А. Чырэц

М. У. Андрыеўскі

П. М. Бандарэнка

А. П. Тарасаў

ВЁСКА МІХАЛКІ

АНДРЫЕЎСКІ Мікалай Уладзіміравіч, н. у 1923, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 27.11.1942, пахаваны ў в. Капішчы Алеўскага р-на Жытомірскай вобл.

БАНДАРЭНКА Піліп Мікалаевіч, н. у 1910, старшыня роты партызанскага злучэння А. Сабурава, загінуў 7.5.1944, пахаваны ў в. Ястмэмбіца Ровенскай вобл.

ТАРАСАЎ Аляксандр Паўлавіч, н. у 1917, камандзір разведкі партызанскага атрада брыгады імя М. В. Фрунзе, загінуў 5.8.1943.

ВЁСКА ПРАЎЦЮКІ

АСТРОЎСКІ Пётр Сцяпанавіч, н. у 1920, партызан злучэння С. Каўпака, загінуў у 1943 у Кіеўскай вобл.

ДОРДАЛЬ Мікалай Цярэнцьевіч, н. у 1924, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1942.

ЖОЛУДЗЬ Міхаіл Васілевіч, н. у 1923, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943 у Ровенскай вобл.

ЖОЛУДЗЬ Міхаіл Піліпавіч, н. у 1922, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 27.10. 1943 у Кіеўскай вобл.

ЗУЕЎ Андрэй Кузьміч, н. у 1920, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943 у Ровенскай вобл.

ТАКВЕЛЬ Іван Кандратавіч, н. у 1915, партызан Ровенскага злучэння, памёр ад ран 28.12.1943 у в. Навасёлкі Марачаўскага р-на Ровенскай вобл.

ПРУДКОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ЗАГОРЫНЫ

ГАРЛЕВІЧ Рыгор Андрэевіч, н. у 1898, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, расстраляны ў 1943.

МАСПАН Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1923, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 16.11.1943, пахаваны ў в. Палахачаў Оўручскага р-на Жытомірскай вобл.

СІКОРСКІ Ісак Аляксеевіч, н. у 1894, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, прапаў без вестак у студзені 1944.

ВЁСКА МЕРАБЕЛЯ

ЛУК'ЯНОВІЧ Захар Іосіфавіч, н. у 1901, старшыня Прудкоўскага сельсавета, партызан Мазырскага атрада і ўдзельнік падполля, расстраляны 30.8.1942, пахаваны ў двары школы № 4 г. Мазыр.

ВЁСКА ПРУДОК

КАШПЕЙ Аляксандр Гаўрылавіч, н. у 1917, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1944 каля г. Роўна.

ЛЕПЕШ Павел Іларыёнавіч, н. у 1915, партызан, прапаў без вестак 4.6.1944.

ЛЯВОНАЎ Карп Яўціхіевіч, н. у 1910, старшыня калгаса ў в. Раманаўка, партызан Мазырскага атрада, расстраляны ў 1942 у г. Мазыр.

МІСЕВІЧ Максім Ігнатавіч, н. у 1920, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, памёр ад хваробы ў 1944.

ВЁСКА РЭДЗЬКА

ДУБАВЕЦ Гаўрыла Аляксандравіч, н. у 1903, старшыня сельсавета, затым калгаса, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, прапаў без вестак у 1943.

Г. А. Дубавец

СКРЫГАЛАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БАЛАЖЭВІЧЫ

ДАМАСЕВІЧ Пётр Трафімавіч, н. у 1926, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў 18.3. 1944 у в. Яварнік Львоўскай вобл.

СУЛКОЎСКІ Іван Фёдаравіч, партызан 1-га Малдаўскага злучэння, загінуў 20.2.1944 у Цярнопальскай вобл.

ШАСТАВЕЦ Кузьма Апанасавіч, н. у 1923, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў у 1944 у Заходняй Украіне.

ВЁСКА БЕЛАЯ

ВЯРАКСІЧ Гаўрыла Міхайлавіч, н. у 1906, партызан Мазырскага атрада, загінуў 19.6.1943 у в. Міхнавічы Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.

ВЯРАКСІЧ Дзяніс Рыгоравіч, н. у 1922, партызан злучэння А. Іванова, загінуў 13.7. 1944 у Валынскай вобл.

ВЯРАКСІЧ Нікіфар Міхайлавіч, н. у 1906, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, памёр ад хваробы 19.1.1944.

ГРАМОВІЧ Аляксандр Герасімавіч, н. у 1904, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у разведцы 10.4.1943.

ВЁСКА ЖАХАВІЧЫ

ПАЗНЯК Мяфодзій Паўлавіч, н. у 1920, партызан злучэння А. Сабурава, закатаваны ўкраінскімі нацыяналістамі ў 1943 у Валынскай вобл.

ТКАЧ Кандрат Радзівонавіч, н. у 1910, настаўнік, партызан Мазырскага атрада і падпольшчык, расстраляны ў ліпені 1942 у г. Мазыр.

ШАХЛЕВІЧ Антон Давыдавіч, н. у 1906, старшыня калгаса, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 23.12.1943.

ВЁСКА ЛЕШНЯ

БАКАВЕЦ Арцём Іванавіч, н. у 1914, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1944.

БАКАВЕЦ Мікалай Ісакавіч, н. у 1918, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак 1.6.1944.

БРЭЎКА Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1908, машыніст паравоза, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 10.5.1944 у Львоўскай вобл.

ГРАМОВІЧ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1920, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1944.

ДУБАВЕЦ Рыгор Дзмітрыевіч, н. у 1908, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у жніўні 1943.

ДУБАВЕЦ Уладзімір Цімафеевіч, н. у 1920, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у жніўні 1943.

ДЗЯЦЕЛ Іван Лявонавіч, н. у 1925, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у студзені 1943, пахаваны ў в. Картынічы Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.

МІЦУРА Іосіф Міронавіч, н. у 1923, настаўнік, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1943.

ВЁСКА НАДАТКІ

ІЛЬЮК Міхаіл Мацвеевіч, н. у 1922, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1944 у г. Высоцк Ровенскай вобл.

ПАЛЯШЧУК Сямён Ціханавіч, н. у 1919, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1944.

ВЁСКА РУДНЯ СКРЫГАЛАЎСКАЯ

РАЖАЛОЎСКІ Іван Міхайлавіч, н. у 1922, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 4.9.1943 у в. Хлупяны Оўруцкага р-на Жытомірскай вобл.

ВЁСКА СКРЫГАЛАЎ

БАЧЭЎСКАЯ Ніна Ільінічна, н. у 1921, партызанка злучэння А. Сабурава, прапала без вестак у снежні 1942 у Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл.

МАЙКОВА Вольга Міхайлаўна, н. у 1922, партызанка злучэння А. Фёдарава, загінула 20.3.1943 у в. Ніцы Валынскай вобл.

ПАДЗІЛА Павел Сцяпанавіч, н. у 1911, аграном МТС, партызан 130-й Петрыкаўскай брыгады, загінуў 13.7.1943.

ПРАЦЭНКА Уладзімір Іванавіч, н. у 1926, камандзір разведгрупы злучэння А. Сабурава, загінуў у 1944 у Заходняй Украіне.

ПРЫХОДЗЬКА Іван Іосіфавіч, н. у 1920,

Ф. А. Клімчанка

партызан злучэння С. Каўпака, загінуў восенню 1942 у Хойніцкім р-не Гомельскай вобл.

ПРЫХОДЗЬКА Уладзімір Мікітавіч, н. у 1912, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 7.6.1944 каля в. Гарай Львоўскай вобл.

ВЁСКА ЯСЕНЕЦ

ПІСАНІК Васіль Апанасавіч, н. у 1912, партызан атрада імя Будзённага, загінуў у 1943 у Валынскай вобл.

СЛАБАДСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БУДА КАЗІМІРАЎСКАЯ

ГЛУХАТАРЭНКА Уладзімір Фёдаравіч, н. у 1923, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у 1943.

ВЁСКА ВЯЛІКІЯ ЗІМОВІШЧЫ

ЗУБРЫЦКІ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1926, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 3.4.1944 у в. Завідуў Львоўскай вобл.

КЛІМЧАНКА Фядос Антонавіч, н. у 1915, працаваў старшынёй калгаса, сувязны партызанскага атрада, расстраляны ў 1943.

ВЁСКА КАЗІМІРАЎКА

ДЗЕМІДЗЕНКА Іван Парфенавіч, н. у 1917, настаўнік, расстраляны за сувязь з партызанамі і падпольную дзейнасць у пачатку лютага 1942.

КАМЕНСКІ Фёдар Апанасавіч, н. у 1893, старшыня сельсавета ў Калінкавіцкім р-не, партызан Мазырскага атрада, расстраляны ў студзені 1942.

ЛАГОЎНІК Іван Іванавіч, н. у 1900, старшыня Баброўскага сельсавета, партызан Мазырскага атрада, расстраляны ў 1942.

ЛУЗАН Лявон Савіч, н. у 1909, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у верасні 1943.

ПАДЛОБНІКАЎ Павел Васілевіч, н. у 1910, настаўнік, партызан Мазырскага атрада, загінуў у лістападзе 1942.

РАДАЎНЯ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1914, партызан злучэння А. Сабурава, памёр ад ран у жніўні 1944.

ТУРКО Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1923, партызан атрада імя Чапаева 1-й Карэльскай партызанскай брыгады, загінуў 20.8.1942 у Мядзведжагорскім р-не, Карэлія.

ЧУБ Максім Мікалаевіч, н. у 1895, старшыня Казіміраўскага сельсавета, партызан Мазырскага атрада, расстраляны ў студзені 1942 у г. Мазыр.

ВЁСКА МАЙСЕЕЎКА

КОЗЕЛ Аляксандр Сяргеевіч, н. у 1903, партызан Мазырскага атрада, загінуў 7.7.1943, пахаваны ў в. Колкі Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.

ПАДАЛЯК Трафім Сцяпанавіч, н. у 1918, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 30.7. 1943 у в. Заліўе Ракітнянскага р-на Валынскай вобл.

ВЁСКА МАЛЫЯ ЗІМОВІШЧЫ

АСТАПЕНКА Максім Міхеевіч, н. у 1916, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 7.6.1943 у в. Гарай Жытомірскай вобл.

КОЛАС Мітрафан Пятровіч, н. у 1917, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 30.8. 1943 у в. Шчакатава Мазырскага р-на.

КОЛАС Навум Сцяпанавіч, н. у 1912, партызан, загінуў 22.4.1944 у в. Будзячаў Валынскай вобл.

ВЁСКА РАМАНАЎКА

ЛУШНА Пётр Сямёнавіч, н. у 1927, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, працаваў у органах НКУС пасля вызвалення раёна, загінуў у баі з нацыяналістамі 13.10. 1944, пахаваны ў в. Лапачы Валынскай вобл.

ЛУШНА Сямён Кандратавіч, н. у 1890, партызан Мазырскага атрада, расстраляны зімой 1942.

ВЁСКА РУДНЯ КАМЕНСКАЯ

ШЧЫПЕР Арцём Цімафеевіч, н. у 1896, старшыня калгаса, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 10.1.1944.

ВЁСКА СЛАБАДА

БАНДАРЭНКА Аляксандр Міхайлавіч, н. у

1912, партызан Мазырскага атрада, паранены ў красавіку 1943, захоплены ў палон і закатаваны.

ГАНЕЦКІ Павел Іванавіч, н. у 1923, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 21.6.1943.

ГАНЧАР Дзям'ян Пятровіч, н. у 1908, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у лістападзе 1943.

ГАНЧАР Сцяпан Пятровіч, н. у 1913, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, паранены ў жніўні 1943, захоплены ў палон і закатаваны.

ГАНЧАР Яўхім Трафімавіч, н. у 1906, партызан, загінуў 21.5.1944.

ГНЕДЗЬКА Дзяніс Максімавіч, н. у 1901, старшыня калгаса, партызан Мазырскага атрада, расстраляны ў студзені 1943.

ГНЕДЗЬКА Ігнат Фёдаравіч, н. у 1924, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1944 у Валынскай вобл.

ГРАМОВІЧ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1920, бухгалтар калгаса, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 12.1. 1944.

ДАШКЕВІЧ Сцяпан Рыгоравіч, н. у 1927, партызан, загінуў у 1943.

КАЛЕСНІК Максім Мікалаевіч, н. у 1917, партызан злучэння А. Сабурава, памёр ад ран 20.2.1944 у Маскве.

КЛІМЧАНКА Васіль Лук'янавіч, н. у 1912, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у маі 1944 у Польшчы.

КЛІМЧАНКА Ілья Іванавіч, н. у 1909, працаваў у органах НКУС, партызан злучэння С. Каўпака, загінуў у 1943 у Шапятоўскім р-не Вінніцкай вобл.

КРАСЮК Андрэй Паўлавіч, н. у 1913, працаваў у органах НКУС, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 4.9.1943, пахаваны ў в. Хлупляны Оўруцкага р-на Жытомірскай вобл.

В. Л. Клімчанка

ЛАХАНСКІ Канстанцін Рыгоравіч, н. у 1910, партызан атрада «За свабоду славян» Пінскага злучэння, павешаны ўкраінскімі нацыяналістамі летам 1943 у Брэсцкай вобл.

МІСЕВІЧ Андрэй Іванавіч, н. у 1904, партызан атрада імя Фурманава Валынскага злучэння, загінуў 27.5.1943 у Валынскай вобл.

НЕСЦЯРЧУК Васіль Паўлавіч, н. у 1915, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, прапаў без вестак у 1943.

РУХЛО Павел Арцёмавіч, н. у 1918, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у лістападзе 1943.

СІЛІЧ Сяргей Кірылавіч, н. у 1903, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 5.9.1943, пахаваны ў в. Хлупляны Оўруцкага р-на Жытомірскай вобл.

СІТНІК Міхаіл Іванавіч, н. у 1905, пар-

Помнік партызанам у в. Раманаўка

тызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 13.7.1943.

СІТНІК Яўхім Данілавіч, н. у 1901, старшыня Скрыгалаўскага сельсавета, член падпольнай арганізацыі і партызан Мазырскага атрада, расстраляны 20.1.1943 у г. Мазыр.

ТУРБАЛ Дзяніс Нікіфаравіч, н. у 1923, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 24.9.1943, пахаваны ў в. Раманаўка Мазырскага р-на.

ТУРЧЫН Аркадзь Якаўлевіч, н. у 1910, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у кастрычніку 1943.

ШАСТАКОЎСКІ Аркадзь Раманавіч, н. у 1910, партызан, загінуў у 1943 у г. Высоцк Ровенскай вобл.

ШАЎЦОЎ Барыс Аўрамавіч, н. у 1908, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у верасні 1943 на чыгунцы ў Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл.

ВЁСКА ХАМІЧКІ

НІКІЦЕНКА Міхаіл Васілевіч, н. у 1926, партызан 125-й Капаткевіцкай брыгады, загінуў у 1943.

М. І. Сітнік

ВЁСКА ЧАРАМАШНЯ

ГАФШТЭЙН Шолам Мееравіч, н. у 1893, старшыня калгаса, партызан Мазырскага атрада, закатаваны ў 1941 у в. Каменка Мазырскага р-на.

Па матэрыялах архіваў Беларусі, Украіны, Малдовы спіс падрыхтаваў

М. Капач

Вызваленне

Восенню 1943 г. войскі Цэнтральнага фронту (у кастрычніку 1943 г. перайменаваны ў Беларускі) выйшлі да Дняпра. Злучэнні 65-й арміі ў выніку паспяхова праведзенай аперацыі фарсіравалі Днепр у раёне Лоева, захапілі шэраг плацдармаў.

26 лістапада пасля ўпартых баёў нашы войскі авалодалі Гомелем, вызвалілі першы абласны цэнтр Беларусі. Набліжаўся час вызвалення Мазыра. Была распрацавана аперацыя, якая ўвайшла ў гісторыю Вялікай Айчыннай вайны як Калінкавіцка-Мазырская.

Задача на правядзенне яе была пастаўлена камандаваннем фронту 2 студзеня 1944 г. (камандуючы — генерал арміі К. К. Ракасоўскі, член Ваеннага савета — генерал-лейтэнант К. Ф. Цялегін, начальнік штаба — генерал-палкоўнік М. С. Малінін). На падрыхтоўку аперацыі адводзілася пяць сутак. Ва ўмовах лясіста-балоцістай мясцовасці і бездарожжа асаблівае значэнне набывалі камунікацыі. Гітлераўскае камандаванне прыняло ўсе меры для ўмацавання сваёй групоўкі. Калінкавіцкаму чыгуначнаму і шасэйным вузлам, абласному цэнтру Мазыру яно надавала выключнае значэнне. Абарону трымалі 9 пяхотных і 2 танкавыя дывізіі, 3 дывізіёны штурмавых гармат, кавалерыйскі полк і іншыя часці. Былі пабудаваны даўгачасныя абаронныя збудаванні, дзоты, лініі траншэй, мясцовасць была густа замініравана.

Калінкавіцка-Мазырская аперацыя ажыццяўлялася войскамі дзвюх армій: 65-й (камандуючы — генерал-лейтэнант П. І. Батаў, член Ваеннага савета — генерал-маёр Н. А. Радзецкі, начальнік штаба — генерал-маёр М. В. Бабкоў) і 61-й (камандуючы — генерал-лейтэнант П. А. Бялоў, член Ваеннага савета — генерал-маёр Д. Г. Дуброўскі, начальнік штаба — генерал-маёр А. Д. Пулко-Дзмітрыеў). У склад 65-й арміі быў уключаны 1-шы гвардзейскі Данскі танкавы корпус пад камандаваннем генерал-маёра М. Ф. Панова.

АПЕРАЦЫЯ ВОЙСК 61-й АРМІІ ПА ВЫЗВАЛЕННІ МАЗЫРА



У вызваленні Мазыра асноўную ролю адыграла 61-я армія, якая прайшла вялікі баявы шлях. Сфарміраваная загадам Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ад 2 лістапада 1941 г. як рэзервовая, армія прызначалася для арганізацыі абароннага рубяжа на Волзе. У склад арміі ўвайшло 7 стралковых і 2 кавалерыйскія дывізіі з Прыволжскай і Сярэднеазіяцкай ваенных акруг. Абставіны на фронце патрабавалі ўвядзення ў бой рэзерваў. І ўжо ў снежні 1941 г. армія была кінута ў бой у раёне ст. Павялец. Пад камандаваннем генерал-лейтэнанта П. А. Бялова 61-я армія ўдзельнічала ў Курскай бітве, у фарсіраванні Дняпра, у вызваленні Чарнігава, Брагіна, Хойнік.

У баях за Мазыр у аператыўным падпарадкаванні 61-й арміі знаходзіўся 2-гі гвардзейскі кавалерыйскі корпус, створаны на базе кавалерыйскай групы легендарнага генерала Л. М. Даватара. Асабліва вызначыўся корпус у баях пад Масквой, за што быў удастоены звання гвардзейскага. Пасля гібелі Л. М. Даватара корпусам камандаваў І. А. Плеў, з 1942 г.— В. В. Крукаў.

М. П. Канстанцінаў

І. Т. Чаленка — камандзір 15-й гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі

Н. Р. Белацаркоўскі — камандзір роты знішчальнага батальёна

У баях за вызваленне Мазыршчыны ўдзельнічалі таксама 7-мы гвардзейскі кавалерыйскі (камандуючы — генерал-маёр М. П. Канстанцінаў) і 9-ты гвардзейскі стралковы корпусы — 12-я, 15-я і 16-я, 86-я і 356-я стралковыя дывізіі; 77-я дывізія, 415-я, 55-я стралковыя дывізіі, 5-я і 6-я артылерыйскія дывізіі артылерыйскага корпуса, якім камандаваў генерал-маёр Н. В. Ігнатаў, 5-я гвардзейская мінамётная дывізія. Для інжынернага забеспячэння аперацыі была накіравана інжынерна-сапёрная брыгада генерал-маёра М. Ф. Іофе, некалькі асобных батальёнаў. Актыўны ўдзел у аперацыі прымалі часці 16-й паветранай арміі (генерал-лейтэнант С. І. Рудэнка). Злучэнні войск, якія рыхтаваліся да Калінкавіцка-Мазырскай аперацыі, панеслі вялікія страты на Дняпры і атрымалі папаўненне з мабілізаваных у армію жыхароў Чарнігаўшчыны і першых вызваленых раёнаў Гомельшчыны.

У складзе 61-й арміі на Мазырскім напрамку не было танкавых часцей. Адзіная 68-я танкавая брыгада не была поўнасцю ўкамплектаваная. Яна дзейнічала на Калінкавіцкім напрамку і панесла сур'ёзныя страты.

Аперацыя планавалася так: ударамі левага фланга з поўдня і правага фланга 61-й арміі з раёна Глінная Слабада (25 км на ўсход ад Калінкавіч) у агульным напрамку на Калінкавічы і Мазыр з адначасовым ахопам раёнаў Калінкавічы — Мазыр з паўднёвага захаду сіламі 2-га і 7-га гвардзейскіх кавалерыйскіх корпусаў разбіць войскі ворага, авалодаць гарадамі Мазыр і Калінкавічы і выйсці на рубеж р. Пціч. У дырэктыве камандуючага фронтам камандуючаму 61-й арміі гаварылася: «...61-й армии с утра 8.1.44 г. перейти в решительное наступление с задачей: а) силами не менее четырех с. д. при поддержке 6-й артиллерийской дивизии прорвать фронт обороны противника»[1].

Дырэктыва прадугледжвала авалодаць горадам Калінкавічы 10.1.44 г., а 11.1.44 г., развіваючы поспех на Мазыр, галоўнымі сіламі выйсці да р. Прыпяць на ўчастку Рудня Гарбавіцкая — Града.

На світанні авіяцыя 16-й паветранай арміі нанесла ўдар па абароне ворага, а ў ходзе наступлення атакавала яго артылерыю, рэзервы, чыгуначныя эшалоны. Нашы войскі прарвалі галоўны рубеж абароны ворага і ў першы дзень прасунуліся на 2—6 км. Найбольшы поспех быў дасягнуты на левым флангу арміі, дзе разам з кавалерыйскімі корпусамі дзейнічала 415-я дывізія. У ноч на 8 студзеня 1321-шы полк гэтай дывізіі пачаў з поўдня абыходзіць Ельск і выйшаў у раён вёскі Рамазы.

[1] Цэнтральны архіў Міністэрства абароны (ЦАМА РФ). Ф. 61-й арміі. Воп. 16 695. Спр. 373.

9 студзеня 415-я дывізія і кавалерысты працягвалі рухацца наперад. Часткі 7-га кавалерыйскага корпуса выйшлі ў раён вёскі Мялешкавічы. Камандзір корпуса генерал М. П. Канстанцінаў прыняў рашэнне разбіць варожыя гарнізоны ў вёсках Раманаўка і Слабада, перарэзаць шлях Мазыр — Скрыгалаў.

З'яўленне нашых кавалерыстаў у гэтым раёне, на захад ад Мазыра, было нечаканым для гітлераўцаў, якія лічылі мясцовасць непраходнай. Але 10 студзеня супраціўленне гітлераўцаў узмацнілася. У раёне Ельск, Санюкі, Кустаўніца, Барбароў вораг кінуў у бой рэзервы. Пехацінцы і кавалерысты адбівалі бясконцыя контратакі.

Камандаванне фронту і арміі палічылі тэмп руху кавалерыстаў нездавальняючым. У баявым распараджэнні камандзіру 7-га корпуса камандуючы арміяй пацвердзіў, што, па разведданых, перад кавалерыстамі ворага няма, яны ўпускаюць спрыяльны момант. Папрок быў несправядлівым. У гэты дзень кавалерысты дасягнулі поспеху. Часці 14-й дывізіі ўварваліся ў вёску Прудок. У рукапашным баі было знішчана звыш 400 гітлераўцаў, захоплена 130 палонных, 11 складаў, знішчана інтэнданцкая служба 2-й нямецкай арміі.

Каб ліквідаваць прарыў, нямецкае камандаванне высунула насустрач кавалерыстам 1-ю лыжную брыгаду, якая толькі што прыбыла з Германіі, кавалерыйскі полк «Міттэ», які знаходзіўся ў рэзерве, часці 102-й пяхотнай дывізіі і пяць батальёнаў аховы. Супраціўленне ўзмацнілася, але гвардзейцы працягвалі рухацца наперад. Яны павялі наступленне на вёску Козенкі, але былі атакаваны дзвюма ротамі ворага з 6 танкамі і 8 самаходнымі гарматамі «Фердынанд». Кавалерысты панеслі сур'ёзныя страты. У гэты час гвардзейская кавалерыйская дывізія, авалодаўшы вёскай Раманаўка, выйшла да Слабады і пасля цяжкага бою вызваліла вёску.

Важныя падзеі адбыліся 11 студзеня. 3-я кавалерыйская дывізія (генерал-маёр Ягадзін) нечаканым ударам авалодала вёскай Скрыгалаў, за 30 км на захад ад Мазыра. Страціўшы каля 100 чалавек, рэшткі нямецкага гарнізона адступілі на паўночны бераг Прыпяці і ўзарвалі мост. Адначасова 53-ці кавалерыйскі полк маёра Сысоева, які наступаў на вёску Козенкі, выйшаў да чыгункі. Часці 415-й дывізіі з дапамогай партызан актывізавалі свае дзеянні ў раёне Ельска. Каля 8 гадзін раніцы 1326-ты полк уварваўся ў раённы цэнтр. Пад пагрозай акружэння немцы пачалі адыход у напрамку Мазыра, аказваючы ўпартае супраціўленне на прамежкавых рубяжах. Былі вызвалены вёскі Барбароў, Чырвоная Горка, В. Млынок, Праўцюкі, Кустаўніца, Акулінка, Міхалкі, Міцькі, Пянькі, Тварычаўка, Матрункі і іншыя. Вораг замацаваўся на рубяжы Бабраняты — Булаўкі — Козенкі і контратакаваў нашы войскі.

Перад 55-й дывізіяй была пастаўлена задача: двума палкамі разам з лыжным батальёнам перайсці ў наступленне ў напрамку Града — Малая Лубня, авалодаць населенымі пунктамі Шарэйка і Града, аказаць садзейнічанне 415-й стралковай дывізіі ў разгроме ворага на паўночны ўсход ад Ельска.

Баі набывалі ўсё больш жорсткі характар. У раёне Козенак супраць 53-га кавалерыйскага палка былі кінуты танкі. Агнём ворага знішчаны ўсе 45 гармат. Панёсшы сур'ёзныя страты, полк мусіў адысці, бо аказаўся пад пагрозай акружэння. 54-ты кавалерыйскі полк пакінуў вёску Барыскавічы, вызваленую напярэдадні. На ранейшыя пазіцыі адышла ўся 15-я дывізія. Корпус страціў забітымі каля 550 чалавек.

Разам з кавалерыстамі часці 415-й дывізіі пасля ўпартага бою ў той жа дзень авалодалі вёскамі Бабры і Булаўкі.

12 студзеня пачала актыўныя дзеянні 55-я дывізія. Яе часці авалодалі населенымі пунктамі Ігнатаўка, Фабіянаўка, Шарэйкі, Пеніца (Калінкавіцкі раён), Лубня, выйшлі да шляху

Р. А. Бялоў

М. М. Заіюльеў

Мазыр — Калінкавічы ў раёне вёскі Баравікі, але перарэзаць дарогу не змаглі.

415-я стралковая дывізія заняла рубеж каля вёскі Акулінкі. Камандуючы арміяй загадаў паскорыць наступленне дывізіі на Мазыр, а 55-й дывізіі авалодаць пераправай цераз Прыпяць. 14-я кавалерыйская дывізія палкоўніка Г. П. Коблава вызваліла вёску Загорыны, выйшла на паўднёвы бераг Прыпяці за 10 км на паўночны захад ад Мазыра. Асноўныя шляхі адыходу войск ворага былі перарэзаны, але ён, падцягнуўшы рэзервы, узмацніў супраціўленне. Камандаванне 7-га кавалерыйскага корпуса вырашыла абысці вузлы супраціўлення ворага. 14-я дывізія пачала дзеянні ў напрамку чыгуначнай станцыі Мазыр, 15-я дывізія наступала на Каменку і разам з 415-й стралковай дывізіяй выйшла ў раён вёсак Бібікі і Бабраняты. 16-я дывізія пераправілася цераз Прыпяць каля Касцюковіч і наступала на ст. Клінск.

Найбольшага напружання баі за Мазыр дасягнулі 13 студзеня. Вораг працягваў контратакі. 415-я стралковая дывізія на працягу дня адбівала 9 атак пяхоты і танкаў. У 4.00, сабраўшы рэшткі разбітых часцей, вораг контратакаваў нашы войскі ў раёне вёскі Бабры. У цяжкіх умовах камандзір 3-га батальёна 1321-га стралковага палка капітан Цакурын вывеў асабовы склад з вёскі і замацаваўся на новым рубяжы.

Упартае супраціўленне ворага, складаныя ўмовы надвор'я, вялікія страты замарудзілі тэмпы наступлення нашых войск. Вызначаныя планам тэрміны аперацыі не вытрымліваліся. У сувязі з гэтым камандуючы фронтам загадаў: «Войскам 61-й армии, стремительно преследуя противника ... 13.1.44 г. занять гг. Калинковичи и Мозырь». Камандуючы арміяй аддаў загад камандзіру 9-га стралковага корпуса 13 студзеня вызваліць Калінкавічы і перакінуць адну дывізію ў раён Мазыра. Камандзіру 415-й дывізіі была пастаўлена задача цалкам авалодаць Мазыром да 22.00 13 студзеня, гнаць ворага ў напрамку вёсак Прудок, Майсееўка, хутара Надаткі і да канца дня 15 студзеня пераправіцца цераз Прыпяць у раёне Скрыгалава.

7-мы кавалерыйскі корпус узяў напрамак на поўдзень ад Мазыра. З наступленнем цемры кавалерысты 15-й дывізіі і часці 415-й стралковай дывізіі абышлі ворага ў раёне вёскі Булаўкі і пачалі рухацца да Мазыра. Вораг заўважыў коннікаў прыкладна за 1 км ад горада. У гэты час 1321-шы полк адбіў пяць контратак ворага, перайшоў у наступленне і каля 22.00 авалодаў вёскай Бабры. Апоўдні вучэбная каманда 55-й дывізіі на чале з маёрам Далінскім і рота супрацьтанкавых гармат 128-га асобнага дывізіёна пачалі фарсіраваць Прыпяць у раёне вёскі Навікі.

Часці 415-й стралковай дывізіі, якія вызвалілі Козенкі, Дразды, Булаўкі, Бабры, разам з кавалерыстамі ўвайшлі ў Мазыр у 23.00. За імі горад займалі 1321-шы, затым 1326-ты і 1323-ці стралковыя палкі. Адным з першых уварваўся ў Мазыр батальён капітана Мурашкіна з 1321-га палка. 5-я рота, якой камандаваў малодшы лейтэнант Прыстанішчаў, гераічна адбівала ворага.

На світанку пазіцыі ворага з поўначы атакавалі часці 55-й стралковай дывізіі, якія перапраўляліся цераз Прыпяць. Першымі ўварваліся ў горад байцы малодшага лейтэнанта Бойчанкі.

Ветэраны 15-й гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі — удзельнікі вызвалення Мазыршчыны на сустрэчы ў 1994 г. у Мазыры

Да 2.00 14 студзеня асноўная частка горада была вызвалена. Поўнасцю Мазыр вызвалены да 6 гадзін раніцы. У вызваленні Мазыра актыўны ўдзел прымала і Мазырская партызанская брыгада пад камандаваннем А. Л. Жыльскага.

У баявым данясенні камандуючага 61-й арміі паведамлялася: «Войска армии, сломив сопротивление противника, овладели Калинковичами и Мозырем. 415 с. д., сломив сопротивление противника на рубеже Бобренята, Булавки, Бобры, к 7.00 овладели г. Мозырь и к исходу дня вышли в район Загорины, Костюковичи, Мерабель...

В боях за Мозырь нанесены значительные потери преимущественно 86 пехотной дивизии противника, убиты 1500 человек солдат и офицеров. Освобождено 710 кв. километров, занято более 80 населенных пунктов».

У дзень вызвалення ў горадзе налічвалася ўсяго 4700 жыхароў. Змучаныя, галодныя людзі выходзілі з падвалаў, паўразбураных дамоў. У армейскай газеце «Боевой призыв» 17 студзеня ваенны журналіст П. Бляхін апісаў гэтую сустрэчу: «Жители выходят из подвалов и со всех сторон стекаются на площадь. Радостные слезы, крепкие объятья, горячие приветствия... Старики и женщины угощают бойцов чем могут. Люди наперебой зазывают бойцов к себе на квартиры. Ставят самовары и за семейным столом принимают красноармейцев, как родных сыновей».

На плошчы адбыўся мітынг, у якім удзельнічалі жыхары горада, воіны-вызваліцелі, партызаны. Горача віталі яны выступленні камандуючага 61-й арміі генерала П. А. Бялова, першага сакратара Палескага абкама КП(б)Б П. А. Лявіцкага. На мітынгу выступалі ўдзельнікі баёў за горад — воіны Чырвонай Арміі, партызаны, жыхары горада.

У баях за вызваленне Мазыра войскі панеслі вялікія страты. Толькі часці 61-й арміі страцілі каля 5 тысяч байцоў, 12 тысяч былі паранены. Нашы войскі не змаглі стварыць перавагі ў жывой сіле і матэрыяльных сродках на галоўных напрамках. Не хапала боепрыпасаў, гаручага. Аперацыю ўсклад-

МУДРАГЕЛЬ Калінік Цімафеевіч, н. у 1900, рад., прапаў без вестак 27.5.1944.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Іван Васілевіч, н. у 1913, рад., прапаў без вестак у 1941.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Юрый Васілевіч, н. у 1910, рад., прапаў без вестак у 1941.

НАЖОЎНІК , Рыгор Іванавіч, н. у 1918, загінуў у палоне 26.2.1942 у Германіі.

НАЗАРЧУК Аляксей Аўдзеевіч, н. у 1924, мал. сяржант, загінуў 18.7.1944 у Львоўскай вобл.

НЕКРАШЭВІЧ Аляксандр Паўлавіч, н. у 1906, лейтэнант, загінуў 3.9.1944 у Польшчы.

НІКУЛІН Леанід Міхайлавіч, н. у 1917, рад., памёр ад ран 14.7.1944 у с. Салавіча Валынскай вобл.

НОСКА Рыгор Іосіфавіч, н. у 1918, ст. сяржант, прапаў без вестак 1.5.1943.

ПАЛЯК Даніла Уласавіч, н. у 1904, рад., загінуў 27.10.1944 у Латвіі.

ПАПОВІЧ Ігнат Міхайлавіч, н. у 1917, рад., памёр ад ран 1.10.1944 у Латвіі.

ПАСЕЧНІК Дзмітрый Іосіфавіч, н. у 1915, рад., загінуў 3.4.1943 у Ленінградскай вобл.

ПАСЮК Ілья Дзмітрыевіч, н. у 1919, рад., загінуў 29.6.1944 у г. Бабруйск Магілёўскай вобл.

ПАЎЛЮК Мікалай Васілевіч, н. у 1920, рад., загінуў 8.1.1943 у с. Дзмітрыеўка Сталінградскай вобл.

ПАШУН Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1926, рад., прапаў без вестак 19.10.1944.

ПІКУЗА Андрэй Дзмітрыевіч, н. у 1913, лейтэнант, прапаў без вестак у сакавіку 1945.

ПІНЧУК Мікалай Цімафеевіч, н. у 1924, старшына, памёр ад ран 3.1.1945 у Польшчы.

ПІСКУН Іван Антонавіч, н. у 1920, рад., загінуў 4.10.1944 у Польшчы.

ПЛЯШЭЎСКІ Аляксей Пятровіч, н. у 1924, мал. сяржант, загінуў 29.4.1945 у г. Кёнігсберг.

ПРЫШЧЭП Пётр Паўлавіч, н. у 1910, загінуў 4.8.1944 у Польшчы.

РАБАК Яўхім Іванавіч, н. у 1925, рад., загінуў 29.6.1944 у г. Бабруйск Магілёўскай вобл.

РАМАНОЎСКІ Даніла Трафімавіч, н. у 1918, рад., загінуў 29.6.1944 у г. Бабруйск Магілёўскай вобл.

САВІЦКІ Пётр Авяр'янавіч, н. у 1915, рад., памёр ад ран 12.2.1943 у Сталінградскай вобл.

САРОЧАНКА Рыгор Емяльянавіч, н. у 1911, рад., прапаў без вестак у верасні 1944.

СЕЛЬВІЧ Іосіф Іванавіч, н. у 1900, ст. сяржант, памёр ад ран 7.9.1944 у г. Пскоў.

СЕРЫНКАЎ Дзяніс Яўхімавіч, н. у 1901, рад., памёр ад ран 31.1.1944 у в. Карпавічы Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.

СІГАЙ Захар Мінавіч, н. у 1910, рад., загінуў 21.7.1944.

СІРАЖ Аляксей Аляксеевіч, н. у 1909, рад., загінуў 15.11.1941 у в. Нікуліна Тульскай вобл.

СІТНІК Павел Мацвеевіч, н. у 1917, рад., памёр ад ран 2.4.1942 у Ленінградскай вобл.

СКІДАН Уладзімір Мінавіч, н. у 1922, рад., загінуў 10.7.1944 у с. Вальк Валынскай вобл.

СЛІЗЕЎСКІ Іван Марцінавіч, н. у 1916, лейтэнант, прапаў без вестак у 1943.

СТАНКЕВІЧ Андрэй Іванавіч, н. у 1894,

рад., загінуў 29.2.1944 у в. Хорупань Ровенскай вобл.

СТУДЗЯНЕЦ Васіль Канстанцінавіч, н. у 1920, мал. лейтэнант, загінуў 12.4.1944 у с. Кандор Крымскай вобл.

СУХОЦКІ Сідар Іванавіч, н. у 1898, рад., загінуў 17.9.1943 у в. Каменка Смаленскай вобл.

СЯМЕЙКА Парфён Адамавіч, н. у 1908, рад., загінуў 29.6.1944 у г. Бабруйск Магілёўскай вобл.

ТАЛТЫНАЎ Рыгор Сяргеевіч, н. у 1911, рад., загінуў 15.10.1943 у с. Пухараўка Днепрапятроўскай вобл.

ТАРАСЕВІЧ Трафім Фёдаравіч, н. у 1905, рад., загінуў 9.3.1944 у г. Сольцы Наўгародскай вобл.

ТУРМОВІЧ Васіль Казіміравіч, н. у 1925, рад., загінуў 26.10.1944 ва Усходняй Прусіі.

ЦЕЛЯШ Рыгор Піліпавіч, н. у 1912, рад., загінуў у лютым 1944 у в. Іванава Слабада Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.

УРУБЛЕЎСКІ Іван Андрэевіч, н. у 1909, рад., памёр ад ран 7.2.1944.

ФАКТАРОВІЧ Максім Барысавіч, н. у 1919, ст. сяржант, загінуў 31.12.1943 у г. Крамянчуг Палтаўскай вобл.

ФЕШЧАНКА Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1914, рад., загінуў 8.8.1944 у Літве.

ХАЛАДОВІЧ Кузьма Васілевіч, н. у 1919, рад., памёр ад ран 30.3.1945 у Чэхаславакіі.

ХАЛАДОК Міхаіл Трафімавіч, н. у 1920, рад., загінуў 29.6.1944 у г. Бабруйск Магілёўскай вобл.

ХЛІСТУН Іван Макаравіч, н. у 1914, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЦАЛУЙКА Кузьма Пятровіч, н. у 1907, рад., памёр ад ран 29.3.1945 у Латвіі.

ЦЫПЛЯНКОЎ Рыгор Якаўлевіч, н. у 1918, рад., загінуў у красавіку 1945.

ЧАРНЯК Якаў Нікіфаравіч, н. у 1903, рад., загінуў 11.1.1945 у Польшчы.

ЧАРНЯЎСКІ Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1906, рад., загінуў 2.8.1943 у Смаленскай вобл.

ЧАСАК Іван Цімафеевіч, н. у 1925, рад., загінуў 29.12.1943.

ЧУБ Фама Рыгоравіч, н. у 1914, рад., загінуў 16.8.1942 у в. Чыжоўка Варонежскай вобл.

ЧУБАР Самуіл Іванавіч, н. у 1904, рад., памёр ад ран 10.7.1944 у в. Перасека Валынскай вобл.

ЧЫЖЭЎСКІ Аляксандр Піліпавіч, н. у 1910, рад., загінуў 11.10.1944.

ЧЭРСКІ Раман Антонавіч, н. у 1898, рад., прапаў без вестак у 1941.

ШАСТАВЕЦ Сцяпан Фаміч, н. у 1907, рад., загінуў 24.6.1944 у Польшчы.

ШЭХТМАН Зусь Яўгенавіч, н. у 1908, рад., прапаў без вестак у чэрвені 1942.

ШТОЛЬМАН Аляксандр Аркадзьевіч, н. у 1914, лейтэнант, памёр ад ран 19.4.1943.

ШУМАК Клім Абрамавіч, н. у 1900, рад., загінуў 28.3.1944 у в. Бечы Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.

ШУМАК Лука Васілевіч, н. у 1907, рад., памёр у палоне 23.2.1942 у г. Славута Хмяльніцкай вобл.

ШЫШКОЎ Іван Арцёмавіч, н. у 1918, рад., загінуў 14.9.1943 у в. Азеранск Смаленскай вобл.

ЮДЗІЦКІ Рыгор Гаўрылавіч, н. у 1912, мал. лейтэнант, прапаў без вестак у ліпені 1943.

ЮНІЦКІ Уладзімір Карлавіч, н. у 1921, рад., загінуў 24.11.1944 у Латвіі.

ЮРКОЎ Мікалай Прохаравіч, н. у 1907, рад., загінуў 23.3.1945 ва Усходняй Прусіі.

ЮХНЕВІЧ Уладзімір Іванавіч, н. у 1918, рад., памёр ад ран 3.7.1944 у с. Сіманіцкі Млынок Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.

ЮШКАВЕЦ Мікалай Пятровіч, н. у 1894, рад., памёр у палоне 16.11.1941 у г. Мінск.

ЯВОРСКІ Канстанцін Рыгоравіч, н. у 1917, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЯРАШЭЎСКІ Сцяпан Уласавіч, н. у 1911, рад., прапаў без вестак у снежні 1941.

ЯРМАК Павел Іванавіч, н. у 1917, рад., загінуў 29.3.1944 у с. Раманаўка Львоўскай вобл.

ЯРМОЛЕНКА Мяфодзій Данілавіч, н. у 1915, тэхнік-інтэндант 2-га рангу, прапаў без вестак у 1943.

ЯРМОЛЕНКА Пётр Савельевіч, н. у 1896, рад., загінуў 1.3.1944.

ЯСКАВЕЦ Сяргей Кузьміч, н. у 1923, рад., памёр ад ран 7.4.1945 ва Усходняй Прусіі.

ЯСКЕВІЧ Станіслаў Аляксандравіч, н. у 1902, рад., загінуў 21.3.1944 у в. Бечы Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.

ЯСТРЭМСКІ Пётр Арцёмавіч, н. у 1921, сяржант, загінуў 13.9.1943.

ЯСТРЭМСКІ Тарас Дзянісавіч, н. у 1914, рад., прапаў без вестак у 1944.

Па матэрыялах ЦАМА РФ спіс падрыхтаваў

М. Капач

Праз пяцьдзесят гадоў

14 студзеня 1994 г. Мазыр святкаваў 50-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Цёпла, сардэчна, са слязьмі на вачах прымалі мазыране сваіх вызваліцеляў. З Валгаграда прыехаў кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў, былы гвардзеец 14-й кавалерыйскай дывізіі А. І. Васкоўскі. Ён прывёз свяшчэнную зямлю горада-героя на Волзе, пасведчанні, значкі, кнігі. Р. І. Папушын прыбыў з Краснаярскага краю, палкоўнік Я. М. Пакроўскі — з Севастопаля, І. Б. Хамякоў — былы начштаба 1323-га палка — з Масквы, Герой Савецкага Саюза П. М. Маштакоў — з Уладзіміра. Сярод ганаровых гасцей — П. П. Собалеў — старшыня Савета ветэранаў 6-й артылерыйскай дывізіі прарыву рэзерву Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, былы камандзір вучэбнай роты 55-й стралковай дывізіі В. І. Турчанінаў. Прыехалі зенітчыцы 546-га палка Т. А. Панфілава з Караганды, М. С. Рахматуліна, М. В. Шміт з Томска, былы камсорг палка Р. А. Сямёнаў з Мінска. Сярод прадстаўнікоў 157-га Брэсцкага Чырванасцяжнага знішчальнага авіяпалка сакратар Савета ветэранаў І. М. Цімафеенка, М. М. Барбарыч і іншыя. Прыбыў на свята былы сакратар Палескага падпольнага абкама камсамола У. Г. Козыр.

«Нас усё менш і менш...» — гэтыя словы з песні «Жывая памяць» часта гучалі ў гэты незабыўны дзень. Час ідзе, але не меркне слава герояў XX стагоддзя, пераможцаў у самай страшнай і крывавай вайне. Ветэраны павезлі з сабой часцінку сардэчнай цеплыні ўдзячных мазыран, якія змаглі захаваць і зберагчы ўсё, што звязана з вяліка Перамогай. Нішто не забыта, ніхто не забыты...

Т. Піліпчук

Ускладанне вянкоў да брацкай магілы воінаў, якія загінулі за вызваленне Мазыра ў студзені 1944 г.

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

ПЯЦЬ МІРНЫХ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯЎ

Поступ працоўных будняў

Пакуль ішла вайна, усе думкі, спадзяванні, намаганні мазыран былі звязаны з падзеямі на фронце. Імкнучыся наблізіць канчатковы разгром ворага, працоўныя вызваленых раёнаў Палесся ўнеслі ў фонд Чырвонай Арміі на будаўніцтва танкавай калоны 2 млн. 415 тыс. рублёў і прасілі перадаць танкі ў часці, якія носяць найменне «Мазырскіх» і «Калінкавіцкіх».

Аднаўленне Мазыра, якое пачалося адразу пасля яго вызвалення ад ворага, у 1945 г. набыло новы размах. Было адрамантавана 15 тыс. кв. м жылля, да канца года ўзнавілі работу 15 прадпрыемстваў і прамысловых арцеляў, якія выпусцілі прамысловай прадукцыі і тавараў народнага спажывання на 3 млн. 400 тыс. рублёў. У маі 1946 г. пушчана ў эксплуатацыю першая чарга Мазырскай ГЭС. Прадпрыемствы горада выпусцілі ў гэтым годзе прадукцыі на 5 млн. 916 тыс. рублёў, што амаль удвая больш, чым у 1945 г. Значна ўзрасла прадукцыйнасць працы.

У 1947 г. у Мазыры пачата будаўніцтва рамонтна-экскаватарнага завода, у верасні першую прадукцыю дала мэблевая фабрыка. 10 чэрвеня 1947 г. адкрыўся анкалагічны дыспансер і бальніца пры ім на 20 ложкаў. 5 красавіка пачалася пасадка дрэў у парку Перамогі.

Ужо ў 1948 г. народная гаспадарка горада была не толькі адноўлена, але і пераўзышла даваенны ўзровень. Працавалі швейная і мэблевая фабрыкі, аўтарамонтныя майстэрні, лесазавод «Чырвоны пралетарый», піўзавод, малочны завод, друкарня і іншыя прадпрыемствы. З пачатку 50-х гадоў мяняецца характар прамысловасці ў параўнанні з даваенным перыядам. Да вайны ў Мазыры развівалася ў асноўным дрэваапрацоўчая прамысловасць, на долю якой прыходзілася тры чвэрці ўсёй валавой прадукцыі. У пасляваенны час узніклі такія галіны, як машынабудаванне, кабельная вытворчасць, швейна-трыкатажная, вытворчасць будматэрыялаў і інш.

У 1958 г. у горадзе налічвалася 18 прамысловых прадпрыемстваў. Найбольш буйныя з іх — завод меліяратыўных машын, дрэваапрацоўчы камбінат, завод «Мазыркабель», ліцейна-механічны завод, завод жалезабетонных канструкцый, станцыя перапампоўвання нафты «Дружба» і іншыя. Шэраг арцеляў пасля аб'яднання ўтварылі камбінат бытавога абслугоўвання насельніцтва. Вытворчасць валавой прадукцыі прамысловых прадпрыемстваў горада склала больш як 13,5 млн. рублёў і пераўзышла ўзровень 1947 г. больш чым у 15 разоў. У снежні 1958 г. адкрыўся рух па жалезабетонным мосце цераз Прыпяць. У гарадской аўтагаспадарцы налічвалася 79 аўтобусаў, іх новыя маршруты звязалі розныя раёны горада. У Мазыры было 8 сярэдніх школ, адна сямігадовая, школа-інтэрнат, 4 ся-

рэднія школы рабочай моладзі, два дзіцячыя дамы. У школах працавалі 332 настаўнікі і займалася 4860 навучэнцаў.

За першыя пасляваенныя пяцігодкі значна развілася сетка лячэбных устаноў. У 1956 г. у Мазыры дзейнічалі: гарадская бальніца на 250 ложкаў, інфекцыйная бальніца на 75, радзільны дом на 40, супрацьтуберкулёзны дыспансер на 75, вендыспансер на 30 ложкаў, анкалагічны дыспансер, урачэбна-фізкультурны дыспансер, дом дзіцяці на 100 ложкаў, санітарна-эпідэміялагічная станцыя, станцыя «Хуткай дапамогі», два ўрачэбныя здраўпункты, 5 фельчарскіх здраўпунктаў. На ахову здароўя выдаткавана 11 744,7 тыс. рублёў — 50 працэнтаў гарадскога бюджэту. У горадзе працавала 116 урачоў.

У 60-я гады далейшае развіццё атрымала прамысловасць горада. Так, дрэваапрацоўчы камбінат наладзіў вытворчасць драўнянастружкавых пліт, сінтэтычных смол, новых узораў мэблі і інш. Яго прадукцыя карысталася попытам далёка за межамі рэспублікі. Тут выраблялася мэбля для Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. У 21 краіну свету экспартавалася прадукцыя завода меліярацыйных машын. Завод атрымаў два дыпломы ВДНГ, а фрэзерны канавакапальнік КФН-1200 на міжнароднай выставе сельскагаспадарчай тэхнікі ўзнагароджаны вялікім залатым медалём. Заводу «Мазыркабель» у 1965 г. прысвоена ганаровае званне прадпрыемства высокай культуры вытворчасці Саўнаргаса БССР. Прадукцыя завода па якасці не ўступала лепшым сусветным узорам. Для пошуку радовішчаў нафты былі створаны экспедыцыі разведачнага свідравання, глыбіннага даследавання свідравін, дзве геолагаразведачныя экспедыцыі, у гэты ж час пачала дзейнічаць Прыпяцкая сплаўная кантора і іншыя арганізацыі. Капітальнае будаўніцтва ажыццяўляў трэст «Мазырсельбуд».

У 60-я гады ў горадзе было 11 сярэдніх школ, 3 васьмігадовыя і адна пачатковая, педагагічны інстытут, палітэхнікум, медыцынскае вучылішча, сямігадовая музычная і дзіцячая спартыўная школы, музычнае вучылішча. У школах працавалі 544 настаўнікі. У 15 лячэбных установах працавалі 700 спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. На кожную тысячу жыхароў прыходзілася 1383 экземпляры газет і часопісаў (у 1925 г. на 70 чалавек — адна газета). Дзейнічалі 3 кінатэатры, гарадскі Палац культуры, клубы на прадпрыемствах, народны тэатр, які на Усесаюзным аглядзе атрымаў званне лаўрэата.

Другую маладосць Мазыр атрымаў з пачаткам будаўніцтва нафтаперапрацоўчага завода. Побач з ім у паўднёва-ўсходняй прамысловай зоне была пабудавана цеплаэлектрацэнтраль. У 1983 г. даў першую прадукцыю завод кармавых дражджэй, які ў 1986 г. з увядзеннем у дзеянне 4-га пускавога комплекса выйшаў на поўную праектную магутнасць — 300 тыс. тон бялкова-вітамінных канцэнтратаў у год. З 1983 г. пачаў працаваць солевыварачны камбінат. Узведзены завод буйнапанельнага домабудавання магутнасцю 72 тыс. кв. м жылля ў год.

У горадзе пабудаваны буйнейшы ў Беларусі рачны вакзал. На высокім беразе Прыпяці ўзведзена гасцініца на 460 месцаў, на плошчы імя М. Горкага — сучасны крыты рынак, побач з ім — Дом быту. Пабудаваны Палац культуры нафтаперапрацоўчага завода, плавальны басейн, аэрапорт; трамвай звязаў горад з прамысловай зонай. У 1991 г. здадзены ў эксплуатацыю другі аўтамабільны мост цераз Прыпяць працягласцю каля 1000 м, які даў магчымасць накіраваць па абвадной дарозе транспарт і разгрузіць гарадскія магістралі.

Цяпер горад займае тэрыторыю каля 38 кв. км, ён працягнуўся ўздоўж Прыпяці амаль на 12 км. Планіровачную структуру горада вызначаюць асаблівасці берагавога рэльефу. Уздоўж набярэжнай праходзіць вуліца Савецкая, ад

якой па ўпадзінах між узгоркаў адгаліноўваюцца астатнія вуліцы: Ленінская, Калініна, Пушкіна, Саета, Куйбышава. На вуліцы Савецкай знаходзіцца цэнтральная гарадская плошча. У Мазыры 135 вуліц і завулкаў. Новыя жылыя раёны падступілі да самай чыгуначнай лініі Калінкавічы — Корасцень, аддаленай ад былых межаў горада на 5 км.

Насельніцтва Мазыра складае 107 тыс. чалавек. У 1986—1987 гг. прырост яго значна скараціўся, а ў 1990 г. скарачэнне колькасці насельніцтва перавысіла прырост на 354 чалавекі, што з'явілася вынікам аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Сённяшні Мазыр — даволі буйны індустрыяльны горад, яго прадпрыемствы вырабляюць пятую частку ўсёй прамысловай прадукцыі Гомельскай вобласці. Многія прадпрыемствы сваёй прадукцыяй вядомы далёка за межамі рэгіёна.

З больш чым ста дваццаці прадпрыемстваў горада найбольш значнымі з'яўляюцца:

Нафтаперапрацоўчы завод. У 1963 г. урадам прынята рашэнне аб праектаванні і будаўніцтве МНПЗ. З 1971 г. разгортваецца ўзвядзенне многіх аб'ектаў будучага завода. 31 студзеня 1975 г. атрыманы першы палескі бензін. МНПЗ пастаўляе народнай гаспадарцы таксама карбюратарныя, дызельныя і кацельныя віды паліва, бытавыя газы і сыравіну для нафтахіміі, вадкія парафіны для вытворчасці бялкова-вітамінных канцэнтратаў, нафтавыя бітумы, серу і серную кіслату, бензол. У 1986 г. асвоена вытворчасць тавараў народнага спажывання: дзіцячых, школьных і жаночых боцікаў з полівінілхларыду. Штогод завод перапрацоўваў 16 млн. тон нафты. Колькасць працуючых дасягала 2 тысячы чалавек. Да 40 працэнтаў вырабляемай прадукцыі пастаўлялася за межы былога СССР. Сёння завод з'яўляецца акцыянерным таварыствам «Мазырскі НПЗ».

Завод кармавых дражджэй. Будаўніцтва пачалося ў 1978 г. пры долевым удзеле краін Савета Эканамічнай Узаемадапамогі. Першая прадукцыя была атрымана ў снежні 1983 г. 1 снежня 1986 г. завод выйшаў на праектную магутнасць 300 тыс. тон бялкова-вітамінных канцэнтратаў.

Па маштабах вытворчасці, навізне тэхналогіі, аснашчанасці сучасным абсталяваннем, узроўні аўтаматызацыі вытворчасці і кіравання завод не меў аналагаў сярод існуючых прадпрыемстваў мікрабіялагічнай прамысловасці. У 1995 г. завод перайшоў на выпуск этылавага рэктыфікаванага спірту і гарэлкі. Распачата вытворчасць ласьёнаў, зубных эліксіраў, духоў, мыйных сродкаў. На заводзе працуе 780 чалавек.

Завод меліярацыйных машын. Будаўніцтва пачалося ў 1945 г., спачатку гэта быў рамонтна-экскаватарны завод. Першы капітальна адрамантаваны экскаватар выйшаў у 1954 г. У 1955 г. асвоена вытворчасць чыгуннага ліцця, а пазней — стальнога. Выраблялі таксама пантоны, балотныя лыжы для канавакапальнікаў, цэнтрабежныя насосы і інш. З кастрычніка 1958 г. прадпрыемства стала называцца «Завод меліярацыйных машын». Карэнным чынам змяніўся асартымент прадукцыі: матавозы, нафтарухавікі, 40-тонныя тралеры, карчавальнікі, скрэперы і г. д. Канавакапальнік КФН-1200 удастоены вялікага залатога медаля на міжнароднай выставе ў Маскве. З 1960 г. прадукцыя стала пастаўляцца на экспарт: у Еўропу, Азію, Афрыку, Лацінскую Амерыку. Цяпер завод выпускае дрэнаўкладчыкі, бульдозеры, пагрузчыкі, маніпулятары для лясной гаспадаркі, тралы грузападъёмнасцю 50 тон, тратуарапрыбіральныя машыны для камунальнай гаспадаркі і інш. На заводзе працуе звыш 1600 чалавек.

Вытворчае дрэваапрацоўчае аб'яднанне. Будаўніцтва завода «Кіпратэх» пачалося ў 1915 г. для ваенных патрэб. Яго прадукцыя — піламатэрыялы. У 1931 г. пачаўся выраб піламатэрыялаў на экспарт у Германію, Францыю, Чэ-

хаславакію. У 1945 г. адноўлены і пушчаны дзве лесапільныя рамы. З 1948 г. завод пачынае развівацца як дрэваапрацоўчы камбінат. У 1955 г. пачаўся выпуск мэблі, драўнянастружкавых пліт, а ў 1971 г. на базе камбіната створана вытворчае дрэваапрацоўчае аб'яднанне «Мазырдрэў», у склад якога ўвайшлі Мазырская, Ельская і Калінкавіцкая мэблевыя фабрыкі. У аб'яднанні працуе звыш 3,5 тыс. работнікаў.

Вытворчае мэблевае аб'яднанне. У 1945 г. быў пабудаваны Мазырскі прамкамбінат, у яго склад з 1955 г. увайшла арцель «Чырвоны мэбельшчык». У 1971 г. прамкамбінат перайменаваны ў Мазырскі мэблевы камбінат, затым было створана вытворчае мэблевае аб'яднанне, у якое ўключана больш як пяць дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў і цэхаў, размешчаных у суседніх рэгіёнах. Аб'яднанне спецыялізуецца на выпуску мяккай і кухоннай мэблі. У аб'яднанні працуе каля 1000 чалавек.

Завод «Беларускабель». Будаўніцтва завода пачалося ў 1958 г. У кастрычніку 1959 г. былі выпушчаны першыя сотні метраў праводу. У 1964 г. завод выйшаў на праектную магутнасць, асвоіў выпуск сілавых і кантрольных кабеляў, кабелю мясцовай сувязі, мантажныя правады, тавары народнага спажывання. На заводзе працуе звыш 2 тысяч чалавек.

Завод «Мазырсельмаш». Гісторыя завода пачынаецца ў лістападзе 1924 г. — з кавальскай майстэрні. У 1928 г. да яе далучылі бляшаную майстэрню і была створана арцель «Молат». 23 студзеня 1944 г., адразу пасля вызвалення Мазыра, прадпрыемства пачало даваць прадукцыю: калёсы, ложкі, формы для хлебапякарняў, сталы і г. д. Да 1947 г. арцель «Молат» была адноўлена поўнасцю. У 1948 г. асвоены выпуск веялак, цвікоў, прасаў, іншых тавараў народнага спажывання.

Солевыварачны камбінат. На базе багатых запасаў каменнай солі Мазырскага радовішча ў 1974 г. пачалося будаўніцтва солевыварачнага камбіната, праз год прабурана першая свідравіна. У 1982 г. атрыманы першы кандыцыйны расол і першая соль.

У лютым 1987 г. камбінат выведзены на праектную магутнасць — 360 тыс. тон солі «Экстра» ў год. Працуе на камбінаце каля 700 чалавек.

Акрамя вышэйпералічаных прадпрыемстваў у горадзе працуюць:

Цеплаэлектрацэнтраль (ЦЭЦ). Уведзена 1 студзеня 1974 г. магутнасцю 195 Мвт.

Піваварны завод. Існуе з 1885 г. Асноўная прадукцыя: піва і безалкагольныя напіткі.

Аўтарамонтны завод магутнасцю звыш 5600 капітальных рамонтаў у год. Працуе звыш 300 чалавек.

Трыкатажная фірма «Славянка». Пачатак паклала ў 1927 г. арцель з 19 чалавек па вырабе панчох. Зараз фабрыка — стабільнае прадпрыемства, якое працуе на сучасным абсталяванні і па сучаснай тэхналогіі. Асноўная прадукцыя: верхні трыкатаж і пальчатачныя вырабы. Працуе каля 900 чалавек.

Швейная прамыслова-гандлёвая фірма «Надэкс». Заснавана 20 красавіка 1944 г., спецыялізуецца на пашыве мужчынскіх сарочак, дзіцячых і жаночых блуз з усіх відаў тканін з штогадовым выпускам да 1 млн. штук, занята каля 1000 чалавек.

Фабрыка мастацкіх вырабаў. Працуе з мая 1956 г. Асноўная прадукцыя: ткацтва, лазапляценне, мастацкая кераміка, мастацкае вязанне і вышыўка. Працуе 240 чалавек.

Фабрыка індпашыву і рамонту абутку.

Малочны завод. Працуе з 1965 г. Магутнасць — да 190 тон перапрацоўкі малака ў суткі. Гэта другое прадпрыемства ў рэспубліцы, дзе дзейнічае цэх дзіцячага харчавання. Працуе 280 чалавек.

Мазырская ўзбуйненая друкарня. Заснавана ў 1900 г. Цяпер у ёй дру-

куецца 8 газет для Палескага рэгіёна, а таксама этыкетачная прадукцыя, кнігі, розныя бланкі. Працуе 130 чалавек.

Фірма рознабытавых паслуг «Сузор'е».

Два хлебазаводы.

У Мазыры працуюць дзве буйныя будаўнічыя арганізацыі:

Аб'яднанне «Мазырсельбуд». Гісторыя аб'яднання пачынаецца з 1939 г. Зараз у яго склад уваходзіць 14 міжгаспадарчых перасоўных механізаваных калон, 5 спецыялізаваных перасоўных механізаваных калон, упраўленне механізацыі, аўтабаза, 4 дарожна-будаўнічыя перасоўныя механізаваныя калоны, завод жалезабетонных вырабаў, завод буддэталяў, жыллёва-камунальная кантора. У Мазыры размешчаны 11 з пералічаных арганізацый. Аб'яднанне выконвае будаўнічыя работы на тэрыторыі 11 раёнаў Гомельскай вобласці, у ім працуе звыш 5 тыс. чалавек.

Дзяржаўна-кааператыўная фірма «Трэст № 6». Створаны ў 1970 г. для будаўніцтва аб'ектаў нафтаперапрацоўчага завода. За 25 гадоў трэстам пабудаваны акрамя НПЗ заводы зборнага жалезабетону № 12, мантажных загатовак, керамзітавага гравію ў Петрыкаве, солевыварачны камбінат і многія іншыя аб'екты прамысловасці і сацкультбыту.

Зараз у склад трэста ўваходзяць 7 будаўнічых упраўленняў, шэраг кааператываў.

У Мазыры **два аўтобусныя паркі і два прадпрыемствы грузавых аўтамашын, трамвайнае дэпо.** Працуюць **экспедыцыі:** нафтаразведачная глыбокага бурэння, геафізічнага даследавання свідравін, комплексная геафізічная партыя і іншыя прадпрыемствы.

У горадзе шырока развіта сістэма гандлёвых прадпрыемстваў. Статус юрыдычнай асобы дадзены 40 магазінам і 14 прадпрыемствам грамадскага харчавання, якія не ўвайшлі ў гаспадарчыя структуры. Пад фірменны гандаль перададзена 19 магазінаў, у тым ліку 5 прадпрыемстваў дзяржаўнай формы ўласнасці: аб'яднанне школьнага харчавання, два аб'яднанні студэнцкага харчавання, аб'яднанне грамадскага харчавання, рэстаран «Юнацтва». Дзейнічаюць гандлёвыя, у тым ліку і фірменныя прадпрыемствы некаторых іншых міністэрстваў і ведамстваў. Гандлёвая ж сетка камерцыйных структур прадстаўлена 45 магазінамі.

У апошнія гады ствараюцца і ўносяць свой уклад у развіццё горада прадпрыемствы недзяржаўных формаў уласнасці. Зарэгістравана больш як 340 таварыстваў з абмежаванай адказнасцю, 57 малых прадпрыемстваў, сярод іх 97 прыватных, больш як 40 кааператываў, 22 акцыянерныя таварыствы і каля дзвюх тысяч прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць сваю дзейнасць як фізічныя асобы.

Мазыр сёння — развіты цэнтр падрыхтоўкі кадраў для Палесся. Тут працуюць педагагічны інстытут, палітэхнікум, медыцынскае і музычнае вучылішчы, чатыры прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, 15 сярэдніх школ. Вось некаторыя навучальныя ўстановы:

Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут. 23 лютага 1944 г. Савет Народных Камісараў БССР прыняў пастанову аб адкрыцці Мазырскага дзяржаўнага настаўніцкага інстытута. У сакавіку таго ж года інстытут прыняў 210 студэнтаў на тры аддзяленні: фізіка-матэматычнае, гісторыка-філалагічнае і прыродазнаўча-геаграфічнае. У 1946 г. адбыўся першы выпуск: 86 настаўнікаў гісторыі, мовы і літаратуры, 32 — фізікі і матэматыкі, 36 — прыродазнаўства і геаграфіі. Праз год 36 чалавек закончылі інстытут без адрыву ад вытворчасці.

У 1952 г. настаўніцкі інстытут быў рэарганізаваны ў Дзяржаўны педагагічны інстытут, які пачаў рыхтаваць настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй. Адначасова была зменена і структура інстытута. На два факультэты было прынята: філалагічны — 100, фізіка-матэматычны — 75 першакурснікаў. У той час на 7 кафедрах працавала 25 выкладчыкаў, у тым ліку 2 кандыдаты навук.

За 50 гадоў існавання інстытут стаў буйной ВНУ. На 6 факультэтах (дзённым і завочным аддзяленнях) навучаецца каля 5 тыс. студэнтаў па 20 спецыяльнасцях. На 23 кафедрах працуюць 294 выкладчыкі, у тым ліку 97 кандыдатаў, 2 дактары навук, 3 прафесары. Ёсць аспірантура, навукова-даследчы сектар, падрыхтоўчае аддзяленне. За час існавання інстытута падрыхтавана амаль 19 тысяч настаўнікаў.

Мазырскі політэхнічны тэхнікум. Заснаваны 19 лістапада 1963 г., першапачаткова як вячэрні. Спецыяльнасць — апрацоўка металаў рэзаннем. У 1964 г. адкрыты спецыяльнасці «прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва» і «электраабсталяванне прамысловых прадпрыемстваў і ўстановак». У 1965 г. адкрыта дзённае аддзяленне са спецыяльнасцю «прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва», у 1979 г. — «вытворчасць будаўнічых дэталяў і жалезабетонных канструкцый», у 1983 г. — «тэхнічнае абслугоўванне і рамонт аўтамабіляў», у 1988 г. — «тэхнічнае абслугоўванне станкоў з праграмным кіраваннем і робата-тэхнічных комплексаў», «інструментальная вытворчасць». Зараз тэхнікум рыхтуе спецыялістаў на дзённым аддзяленні па 4 спецыяльнасцях. За ўвесь час падрыхтавана звыш 5 тысяч спецыялістаў.

ПТВ-131 будаўнікоў. Вучылішча заснавана ў 1976 г. На 1-шы курс у 1977 г. было залічана 275 навучэнцаў па спецыяльнасцях будаўнічага профілю для падрыхтоўкі да работы ў базавым трэсце «Мазырнафтахімбуд».

Вучылішча падрыхтавала 2700 кваліфікаваных рабочых. Зараз у ім працуе 45 майстроў вытворчага навучання і 18 выкладчыкаў.

Медыцынскае вучылішча. Двухгадовая школа медыцынскіх сясцёр, якая да вайны зрабіла тры выпускі, пасля вайны была перайменавана ў фельчарска-акушэрскую, а ў 1954 г. — у медыцынскае вучылішча, якое мела тры аддзяленні: фельчарскае, акушэрскае і сястрынскае. У 1981 г. уступіў у дзеянне новы будынак вучылішча, а ў 1990 г. — інтэрнат на 350 месцаў. Навучэнцаў — звыш 1300 чалавек, педагогаў — 56. За гады існавання падрыхтавана каля 8,5 тысяч спецыялістаў.

Ахову здароўя жыхароў Мазыра ажыццяўляюць 14 лячэбных устаноў, аб'яднаных у тэрытарыяльнае медыцынскае аб'яднанне: бальніца на 1495 ложкаў, развітая сетка паліклінік і амбулаторый. У горадзе 2754 медыцынскіх работнікаў, у тым ліку 386 урачоў, 1652 медыцынскія сястры.

Дзякуючы дапамозе шэрага гарадскіх прадпрыемстваў бальніцы і паліклінікі маюць самае сучаснае абсталяванне, вядзецца будаўніцтва новых лячэбных устаноў.

У горадзе дзейнічаюць 12 палацаў, дамоў культуры і клубаў, выставачная зала, мастацкая школа, 4 музычныя школы, краязнаўчы музей, 53 бібліятэкі.

Л. Арлоў, Т. Піліпчук

Не толькі горад Мазыр непазнавальным стаў за пяць мірных дзесяцігоддзяў, выдатныя перамены адбыліся і ва ўсім Мазырскім раёне. А пачынаў падымацца ён на пасляваенных папялішчах, у далёкім 1944-м. Адбудоўваліся разбураныя вайной вёскі, гераічнай працай аднаўлялася гаспадарка калгасаў. У гэтай справе вяскоўцам актыўна дапамагалі жыхары горада.

Яшчэ ў 1944 г. у асобных калгасах ураджайнасць збожжавых склала 80—90, а ў некаторых — 100 пудоў з гектара, ураджайнасць бульбы каля 1000 пудоў з гектара. А хлебаробы калгаса імя Кірава ўзялі абавязацельствы дабіцца ў 1946 г. 100-пудовага ўраджаю збожжавых і 1500 пудоў бульбы з гектара. Маладыя калгаснікі Уладзімір Глоз з калгаса «Чырвоная Зорка» і Рыгор Панфіленка з калгаса «Партызан» за дзень узорвалі 0,65 гектара пры норме 0,50. Адам Паўлюк з вёскі Малыя Зімовішчы выпрацаваў за год 400 працадзён. Скончыўшы потым Беларускую

Першае пасляваеннае збожжа — дзяржаве. Калгаснікі в. Жахавічы даставяць яго па Прыпяці на збожжапрыёмны пункт. 1946

сельгасакадэмію, Адам Фёдаравіч звыш 20 гадоў узначальваў калгас імя Фрунзе.

На працягу 1945—1947 гг. да мірнай стваральнай працы прыступіла больш як 5 тысяч былых франтавікоў, якія гарэлі жаданнем хутчэй аднавіць народную гаспадарку, палепшыць жыццё людзей. Сярод тых, хто вярнуўся з вайны, былі: І. М. Букіш з вёскі Раеўскія — 40 гадоў адпрацаваў на трактары; М. А. Кунгер і Р. А. Рудзько — доўгі час былі кіраўнікамі калгасаў; П. Д. Анціпенка, які залажыў славу гурыноўскіх садоў; А. Н. Пікуза і П. Д. Вягера, якія 40 гадоў працавалі ва ўстановах народнай адукацыі; І. Т. Аўдзейчык і П. П. Крывянчук — кіраўнікі органаў мясцовай улады раёна; кавалер двух ордэнаў Славы І. Ф. Пісанік і баявы кавалерыст К. Р. Ткач — жывёлаводы з вёсак Касцюковічы і Жахавічы, і многія, многія іншыя, — усе, хто сваёй шчырай працай залечваў раны вайны, будаваў новае жыццё.

Да 1950 г. у раёне быў адноўлены даваенны ўзровень вытворчасці ў калгасах. Чацвёртую пяцігодку раён выканаў паспяхова. Ураджайнасць збожжавых склала 12 цэнтнераў з гектара, пэўныя поспехі былі дасягнуты і ў развіцці жывёлагадоўлі. У калгасах раёна стала болей сельскагаспадарчай тэхнікі, павялічылася пагалоўе жывёлы. У новую, пятую пяцігодку сельская гаспадарка раёна ўступіла значна ўмацаванай. Уплыў на яе развіццё аказалі рашэнні вераснёўскага (1953 г.) Пленума ЦК КПСС. З калгасаў была знята запазычанасць, калгаснікі вызвалены ад цяжкіх падаткаў. Ураджайнасць збожжавых за пятую пяцігодку была даведзена да 13,9 цэнтнера з гектара, бульбы — да 91 цэнтнера, а надоі малака ад каровы склалі амаль 1200 кілаграмаў за год.

Шмат намаганняў прыклала кіраўніцтва раёна ў падборы і выхаванні кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў. Жыхары памятаюць старшынь калгасаў, якія працавалі на гэтай пасадзе не адзін дзесятак гадоў, — М. А. Кунгера, М. Н. Кузьменку, І. Н. Купермана, М. С. Радкевіча, К. С. Гарулю, а таксама А. Ф. Паўлюка, П. І. Сітніка. З 1968 па 1996 г. узначальваў калгас «Прамень Кастрычніка» В. А. Сазонаў. Шмат зрабіў, каб вывесці калгас «Радзіма» з адстаючых, і старшыня М. У. Саўчык.

Жыхары вёсак за першыя пяць пасляваенных гадоў перасяліліся з зям-

М. А. Кунгер

Р. А. Рудзько

І. Ф. Пісанік

лянак у новыя хаты. Былі пабудаваны ўсе вытворчыя памяшканні калгасаў, школы, клубы, магазіны. У раёне працавалі Слабадская і Мазырская машынна-трактарныя станцыі. Пачалося ўз'яднанне дробных калектыўных сельскіх гаспадарак. Да 1956 г. з 80 калгасаў было ўтворана 26, а ў 1970 г. іх было ўсяго 20. Гэта давала магчымасць больш эфектыўна выкарыстоўваць зямлю, тэхніку, кваліфікаваныя кадры. У першай палове 60-х гадоў на базе эканамічна слабых гаспадарак былі створаны саўгасы — «Мазырскі» з цэнтрам у вёсцы Міхалкі і «Каменка».

Адбыліся змены тэрыторыі раёна. У студзені 1963 г. у склад Мазырскага раёна ўключаны 13 вёсак Асавецкага сельскага Савета Петрыкаўскага раёна, 6 вёсак Махнавіцкага сельсавета Ельскага раёна, а таксама Барбароўскі сельскі Савет Нараўлянскага раёна (9 вёсак і пасёлкаў). Сталі буйнейшымі іншыя сельсаветы за кошт ліквідацыі Бабраняцкага, Глініцкага, Казіміраўскага і Мялешкавіцкага.

Ішлі гады, умацоўвалася эканоміка калгасаў і саўгасаў. Перад вайной у калгасах раёна мелася 6670 галоў буйной рагатай жывёлы, 3500 авечак, 3000 свіней, а ў 1968 г. — 18 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, 10 тысяч свіней, 3600 авечак. Умацавалася тэхнічная база калгасаў і саўгасаў. Пасля ліквідацыі машынна-трактарных станцый і перадачы тэхнікі калгасам і саўгасам у гаспадарках налічвалася 250 трактароў, 78 камбайнаў, 170 грузавых аўтамабіляў і іншая тэхніка.

Паглыблялася спецыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці. У 1973 г. на базе былога саўгаса «Рудня», створанага раней у адным з аддзяленняў саўгаса «Мазырскі», была арганізавана Мазырская птушкафабрыка, цэнтральная сядзіба якой размяшчалася ў вёсцы Лясхаўцы. У 1975 г. на асушаных і асвоеных землях у ваколіцах Мазыра створана міжгаспадарчае прадпрыемства па вытворчасці корму «Прыпяць» (цяпер саўгас). У студзені 1989 г. на аснове саўгаса «Каменка» арганізавана Мазырская агароднінная фабрыка. На частцы каменкаўскіх земляў быў створаны саўгас «Чырвоны Сцяг» (цэнтр вёска Мялешкавічы).

У сувязі з вялікім прамысловым будаўніцтвам на тэрыторыі раёна, перасяленнем жыхароў вёсак Кустаўніца і Міхалкі былі пабудаваны добраўпарадкаваныя пасёлкі Крынічны і Рудня Міхалкаўская (цэнтр саўгаса «Мазырскі»). У 1976 г. у пасёлак Крынічны была перабазіравана з суседняга Калінкавіцкага раёна Палеская сельскагаспадарчая доследная станцыя. Сам пасёлак у гэтым жа годзе стаў цэнтрам новай гаспадаркі — эксперыментальнай базы «Крынічная», якой быў падпарадкаваны новы буйны комплекс па вырошчванні і адкорму 54 тысяч галоў свіней у год. У 1996 г. комплекс стаў самастойнай гаспадаркай — саўгасам-камбінатам

«Зара». Такой жа спецыялізаванай гаспадаркай (20 тысяч свіней у год) стаў калгас «Прамень Кастрычніка». Буйныя жывёлагадоўчыя комплексы ў 70—80-я гады былі пабудаваны ў вёсках Перадрэйка, Слабада, Рудня Міхалкаўская, Козенкі. Практычна нанава былі адбудаваны і рэканструяваны ўсе вытворчыя памяшканні калгасаў і саўгасаў — фермы, машынныя двары, гаражы, майстэрні, склады, сховішчы і інш.

Значная работа была праведзена па асушэнні і асваенні забалочаных і пераўвільготненых, зарослых хмызняком земляў, створана раённая меліярацыйная арганізацыя — ПМК-27 трэста «Калінкавічыводбуд». Пабудаваны польдэрныя (з водарэгуляваннем) участкі. Усяго больш як 11 700 гектараў былых балот, дзе расла асака ды іншыя балотныя травы, ператвораны ў высокаўраджайныя палеткі. На 8800 гектарах закладзены закрыты дрэнаж, пабудаваны насосныя станцыі. Для захавання вільгаці створаны дзесяткі штучных вадаёмаў (каля вёсак Тварычаўка, Каменка, Махнавічы, Мялешкавічы, Майсееўка, Лешня і іншых).

Вялікая работа праведзена ў раёне па зберажэнні прыроднага асяроддзя. Лясны фонд Мазыршчыны складае 80,9 тыс. гектараў — больш як палова тэрыторыі раёна. У 1962 г. створаны Мазырскі лясгас, у склад якога ўваходзяць 10 лясніцтваў. Штогод на плошчы 300—500 гектараў праводзяцца пасадкі лесу. За 30 год праведзены лесааднаўляльныя работы на плошчы 15 тыс. гектараў, пятая частка лесу — штучныя насаджэнні. У вытворчасць укараняюцца новыя тэхналогіі лесанарыхтоўчых і аднаўляльных работ, ствараюцца зоны адпачынку і заказнікі.

На Мазыршчыне здабываецца будаўнічы пясок і гравій. Непадалёку ад вёскі Раеўскія знойдзена каменная соль, прамысловыя залежы якой больш за 600 млн. тон, перспектыўныя — 24 млрд. тон. Больш за 10 гадоў назад тут адкрыты буйнейшы ў Еўропе солевыварачны камбінат. Разведаны таксама прамысловыя запасы гліны (Лешня, Рудня Скрыгалаўская). У раёне вёсак Васькаўка і Скрыгалаў з прабураных свідравін атрыманы прамысловы прыток нафты.

З 1967 г. на Мазыршчыне працуе Палеская геафізічная экспедыцыя, пабудаваны пасёлак геолагаў Сасновы, створана неабходная матэрыяльна-тэхнічная база.

У раёне на працягу многіх гадоў шырока вялося будаўніцтва жылля, вытворчых, адміністрацыйных і сацыяльна-культурных аб'ектаў. Для ажыццяўлення будаўнічай праграмы ў 1965 г. была створана Мазырская міжкалгасная будаўнічая арганізацыя, старшынёй якой больш як 10 год працаваў Д. Ц. Гузман, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, першым сярод працаўнікоў раёна ўзнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. За поспехі ў аднаўленні вёсак у 1971 г. Мазырская МБА ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны». Дзесяткі будаўнікоў атрымалі ордэны і медалі, а брыгадзір В. К. Чурыла стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі.

Пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у раён з пацярпеўшай зоны было перасялена каля 300 сем'яў, для якіх пабудавана 8 пасёлкаў.

У развіцці раёна вялікае значэнне надаецца дарогам, працягласць якіх складае звыш 350 км. Для іх будаўніцтва і рамонту ў 1965 г. створана ДЭУ-186. Да 1962 г. праз раён праходзіла адзіная дарога з цвёрдым пакрыццём — Мазыр — Оўруч. За апошнія 30 год рэканструявана і пабудавана 307 км дарог з цвёрдым пакрыццём, імі звязаны ўсе цэнтры калгасаў і саўгасаў, населеныя пункты.

У раёне адкрыта больш за 30 аддзяленняў сувязі, усе 93 вёскі і пасёлкі тэлефанізаваны. У дамах вяскоўцаў устаноўлена больш як 3500 тэлефонаў і каля 9 тысяч радыёкропак. Пабудаваны ўчастковыя бальніцы ў вёсках Асавец, Мялешкавічы, Слабада, Скрыгалаў, амбулаторыя ў вёсцы Рудня Міхалкаў-

Урач Н. М. Падаляцкая. Актыўная ўдзельніца Вялікай Айчыннай вайны, 30 гадоў працавала ў раённай паліклініцы

ская. Цяпер у раёне 4 участковыя бальніцы на 160 ложкаў, у тым ліку ў Слабадзе — на 75. Адкрыты 31 фельчарска-акушэрскі пункт, 1 амбулаторыя, 5 аптэк, раённая паліклініка.

У раёне 101 магазін, працуюць 4 аўталаўкі, 40 сталовых, кафэ і рэстаранаў. У вёсках Козенкі, Рудня Міхалкаўская, Слабада, пасёлку Крынічным пабудаваны гандлёвыя цэнтры.

У першыя пасляваенныя гады пачатковыя школы дзейнічалі ва ўсіх населеных пунктах. У вёсках, дзе налічвалася 100 і больш двароў, працавалі васьмігодкі і сярэднія школы. У 1960 г. у раёне было звыш 17 тысяч вучняў За апошнія 20 гадоў закрыта 46 васьмігодак і пачатковых школ. У 1995 г. у раёне налічвалася 11 сярэдніх, 9 базавых і 6 пачатковых школ, у якіх працавала 487 настаўнікаў, навучалася 3477 школьнікаў.

Пабудаваны тыповыя сельскія клубы ў вёсках Асавец, Бабраняты, Барбароў, Глініца, Вялікія Зімовішчы, Козенкі, Махнавічы, Лучажэвічы, Прудок, Рудня Міхалкаўская, Скрыгалаў, Слабада, у пасёлках Крынічны і Сасновы. У населеных пунктах раёна налічваецца 36 клубаў, 33 бібліятэкі з агульным кніжным фондам 363 тысячы кніг. Ва ўстановах культуры працуе 138 чалавек. Створана 18 калектываў мастацкай самадзейнасці. Сельскія клубы маюць 22 стацыянарныя шырокаэкранныя кінаўстаноўкі.

З 1976 г. у вёсцы Гурыны працуе раённая карцінная галерэя — філіял Беларускага дзяржаўнага мастацкага

Пераможцы раённага спаборніцтва школьных вытворчых брыгад на злёце ў Мазыры. 1977

музея. На грамадскіх асновах створаны музей партызанскай славы ў вёсцы Раманаўка, музей гісторыі вёскі ў Махнавічах, этнаграфічны музей у Міхалкаўскай Рудні, музей у Скрыгалаве.

Шчодрая Мазыршчына на выдатных людзей, яна дала шмат герояў вайны і мірнай працы. За ратныя подзвігі ў гады ваеннага ліхалецця звыш пяці тысяч яе жыхароў былі ўзнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі, больш як тысяча непасрэдных вытворцаў матэрыяльных даброт — рабочых, калгаснікаў, спецыялістаў узнагароджаны ў мірны час. А колькі вядомых людзей даў гэты невялікі куток беларускай зямлі! З вёскі Барбароў выйшаў акадэмік М. Я. Мацапура, з Кустаўніцы — акадэмік П. Ф. Ракіцкі, з Перадрэйкі — генерал-палкоўнік М. І. Шляга. У Лешні нарадзіліся Герой Савецкага Саюза М. П. Катлавец, генералы С. І. Ганчар і В. С. Пузан, начальнік Днепрагэса М. А. Дубавец. З вёскі Забалацце выйшаў пісьменнік І. І. Капыловіч, з Майсееўкі — журналіст, былы рэдактар «Сельскай газеты» А. Д. Колас. У Іванкаўшчыне ў хаце калгасніка Адама Гусака выраслі тры яго сыны Аляксей, Сяргей і Мікалай — тры беларускія вучоныя.

Настаўнікі былой Міхалкаўскай школы з дапамогай мясцовага насельніцтва прааналізавалі шлях сваіх выпускнікоў за 60 гадоў. Гэта каля 600 спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, 35 з іх — работнікі сельскай гаспадаркі, 60 — настаўнікі, 52 — афіцэры Савецкай Арміі і адзін генерал. Ёсць пісьменнік, кампазітар, тры журналісты, 17 інжынераў, 50 медработнікаў і інш.

С. Касцян, М. Капач

ПА СТАРОНКАХ МЯСЦОВЫХ ГАЗЕТ

ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА «ЗАРА»

Студэнцкая вуліца

Вуліца Рамашоў Роў з кожным годам мяняе сваё аблічча. Тут выраслі новыя жылыя дамы. Днямі будаўнікі здалі ў эксплуатацыю прасторны светлы чатырохпавярховы будынак. У ім размясціўся Мазырскі педагагічны інстытут.

20 сакавіка 1955 г.

Новая аўтобусная станцыя

На вуліцы Жытомірскай, каля калгаснага рынка, пабудавана новая аўтобусная станцыя. Тут ёсць вялікая зала, камера захоўвання ручнога багажу і дыспетчарскі пункт. Устаноўлены дынамік, па якім аб'яўляецца аб адпраўленні аўтобусаў у многія вёскі Мазыршчыны, суседнія раёны...

26 студзеня 1958 г.

Расце і прыгажэе Мазыр

За чатыры гады (1954—1957) разросся, раздаўся ўшыр, папрыгажэў Мазыр. Больш за ўсё мазыране ганарацца дрэваапрацоўчым камбінатам...

Рост выпуску прадукцыі прыдпрыемствамі Мазыра ў параўнанні з 1954 г. — 125 %, рост перавозак грузаў аўтатранспартам — 163 %, рост перавозак пасажыраў аўтатранспартам — 134 %, рост жыллёвага будаўніцтва — 161 %...

Першы навучальны год працуе ў горадзе школа-інтэрнат. На абсталяванне і ўтрыманне школы дзяржава выдаткавала да 4,5 мільёнаў руб. ...

Выдатны добраўпарадкаваны клуб здадзены ў эксплуатацыю ў лістападзе мінулага года ў пасёлку станцыі Мазыр...

Закончана будаўніцтва фае кінатэатра «Радзіма». У хуткім часе тут будзе абсталявана чытальня, буфет. Мазыран сёлета абслугоўваюць 6 стацыянарных установак і 2 кінаперасоўкі.

У 1956—1957 гг. расшырана тэрыторыя парку. Сёлета тут будзе ўстаноўлена карусель, абсталяваны спартыўныя і дзіцячыя пляцоўкі, тэніс-ны корт...

16 лютага 1958 г.

ГАЗЕТА «КАМУНІСТ ПАЛЕССЯ»

Новы малочны камбінат

Будаўніцтва Мазырскага малочнага камбіната ўступіла ў завяршаючы перыяд. Ужо ўзведзены галоўны корпус, падсобныя пабудовы. Зараз вя-

дзецца абсталяванне кампрэсарнай, кацельнай, трансфарматарнай падстанцыі. Неўзабаве пачнецца мантаж абсталявання...

17 студзеня 1963 г.

Будаваць хутка, якасна, прыгожа

Прыгажэе наш родны Мазыр. За апошнія гады ў горадзе выраслі шматпавярховыя дамы, пракладзены новыя вуліцы, пабудаваны новыя прадпрыемствы...

Расшыраецца сетка медыцынскіх установ. У новым мікрараёне непадалёку ад цэнтра горада ўзводзіцца радзільны дом на 100 месц. Задача будаўнікоў — умела выкарыстаць рэзервы, будаваць хутка, трывала, танна...

14 сакавіка 1963 г.

Ю. Левітан — госць Мазыра

Нядаўна Мазыр наведаў маскоўскі дыктар Ю. Левітан. У гарадскім парку ён сустрэўся з мазыранамі, дзе расказаў аб рабоце дыктараў сталіцы.

1 чэрвеня 1963 г.

Для народнай гаспадаркі

Калектыў эксперыментальнага ўчастка завода меліярацыйных машын выпусціў дослены ўзор новага канавакапальніка КФН-1200. Агрэгат прызначаны для пракладкі каналаў у забалочаных месцах. Нядаўнія выпрабаванні паказалі выдатныя эксплуатацыйныя якасці машыны.

Цяпер машынабудаўнікі прыступілі да серыйнага выпуску канавакапальніка. У верасні будзе выпушчана 10 канавакапальнікаў.

27 жніўня 1963 г.

Волжская нафта на беларускай зямлі

Волжская нафта рухаецца па стальных магістралях, пракладзеных на беларускай зямлі. Каб паскорыць рух чорнага золата, будаўнікі самай буйной помпавай станцыі, што на тэрыторыі Мазырскага раёна, з кожным днём узмацняюць тэмпы работ...

7 лістапада 1963 г.

Прадукцыі будзе больш

15 назваў вырабаў выпускае цяпер завод «Мазыркабель». Некаторыя з іх на ўзроўні лепшых сусветных узораў. Павелічэнню выпуску кабельнай прадукцыі садзейнічае ўкараненне новай тэхнікі. Значна абнаўляецца станочны парк валачыльнага цэха. За апошні час у ім установлена і запушчана 16 круцільных машын для выпуску гібкіх мантажных правадоў.

Днямі мантажнікі прыступілі да ўстаноўкі чатырох новых магутных круцільных машын, якія па прадукцыйнасці пераўзыходзяць дзеючыя круцільныя машыны больш чым у два разы.

У гэтай пяцігодцы завод значна павялічыць выпуск мантажных правадоў. Для гэтага пачалося будаўніцтва спецыяльнага вытворчага корпуса.

25 чэрвеня 1964 г.

Папоўніўся аўтобусны парк

У 1965 г. транспартам горада перавезена 11 мільёнаў пасажыраў. Аўтобусны парк папоўніўся 35 новымі аўтобусамі і 8 легкавымі таксі. На пасёлак станцыі Мазыр будуць курсіраваць мнагамесныя аўтобусы «ЛАЗ-695»... Адкрываюцца новыя аўтобусныя лініі па маршруце плошча Леніна — прамкамбінат. Ставіцца задача звязаць аўтамабільным рухам усе сельсаветы і цэнтры калгасаў раёна.

19 лютага 1966 г.

Прафілакторый для будаўнікоў

На базе піянерскага лагера «Сядзельнікі» трэста «Мазырсельбуд» ствараецца лячэбны прафілакторый на 50 чалавек...

17 верасня 1966 г.

Новая школа

Яшчэ здалёку прыцягвае позірк прыгожы белакаменны трохпавярховы будынак мазырскай сярэдняй школы № 5, які ўзведзены ў пасёлку завода жалезабетонных вырабаў. Бацькі і дзеці выказвалі сардэчную падзяку будаўнікам за падарунак. Цяпер заняткі вядуцца ў адну змену. Ёсць умовы для спартыўнай работы, правядзення пазакласных мерапрыемстваў.

25 лютага 1968 г.

Злёт былых партызан

У Казіміраўскім лесе, на адной з патаемных палян, адноўлены дзве зямлянкі, курэнь, калодзеж, сталы. Тут у 1943 г. размяшчаліся партызаны Мазырскай партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага. А цяпер яны правялі ў гэтым месцы свой злёт. У запаведным лесе адкрыты помнік героям-партызанам.

21 жніўня 1968 г.

Рапартуюць паліграфісты

Школьны дзённік. Сёй-той можа сказаць: дробязь. Але гэта далёка не так. Ён крайне неабходны настаўнікам, вучням, бацькам. Не так даў-

но дзённікі завозілі ў Мазыр з іншых гарадоў рэспублікі, прытым не заўсёды ў дастатковай колькасці. Зараз такімі дзённікамі наша друкарня забяспечвае ўсіх школьнікаў рэспублікі. З пачатку гэтага года іх ужо выпушчана 800 тысяч.

Паспяхова выконвае калектыў нашай друкарні і іншыя заказы Міністэрства асветы Беларусі. Ужо выпушчана, напрыклад, 110 тысяч класных журналаў. Адгружана таксама 5 тысяч кніг дашкольнай дакументацыі. А колькасць маляўніча афармленых цэлафанавых пакетаў і ярлыкоў для гомельскай трыкатажнай фабрыкі «8 Сакавік» складае некалькі мільёнаў.

20 снежня 1968 г.

І загамоняць хвоі

Сёлетняй вясной калектыў Мазырскага лясгаса паспяхова справіўся з лесапасадкамі. На былых пясчаных пустэчах плошчай 469 гектараў высаджаны сеянцы сасны.

17 чэрвеня 1970 г.

Госці з Чэхаславакіі

Добрыя сяброўскія сувязі ўстаноўлены цяпер паміж СССР і ЧССР, і ў прыватнасці паміж працоўнымі Мазыршчыны і г. Страканіцэ Паўднёва-Чэшскай вобласці. Чэхаславацкія сябры прыязджаюць да нас, а прадстаўнікі Мазыра і раёна былі гасцямі Чэхаславакіі...

4 ліпеня 1970 г.

Магутная ЦЭЦ на Мазыршчыне

Для нафтаперапрацоўчага комплекса, які ўзводзіцца на Мазыршчыне, спатрэбіцца вялікая колькасць цеплавой энергіі. Рашэннем урада Саюза ССР у раёне прамысловага комплекса намечана будаўніцтва буйной цеплавой электрастанцыі. Гэтая ж станцыя будзе забяспечваць цяплом і жылы масіў Мазыра, які ўзводзіцца ў раёне Баброў.

27 лістапада 1970 г.

Даражаць славай бацькоў

Хлопцы з Мазыршчыны У. Грышчанка і В. Каханоўскі з гонарам выконваюць свой абавязак перад Радзімай у гвардзейскай часці, якая ў гады вайны прайшла слаўны баявы шлях. Бацька Уладзіміра Сяргей Мікалаевіч прымаў удзел у кровапралітных баях пад Старой Русай, у вызваленні Беларусі.

15 красавіка 1971 г.

Помнік мужным патрыётам

У двары школы № 4 Мазыра ўзвышаецца манумент. Гэта помнік мужным патрыётам-падпольшчыкам горада, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—1943 гадах.

І. М. Букіш

22 лютага з выпадку адкрыцця помніка тут адбыўся мітынг. Яго адкрыў старшыня Мазырскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных Рыгор Фядосавіч Ганчар. Затым на мітынгу выступілі старэйшы камуніст горада А. П. Эльман, удзельнік гераічнага падполля А. С. Мураўёў, былы народны мсціўца К. С. Гаруля, піянерважатая школы Н. К. Байдзюк.

23 лютага 1972 г.

Воін, настаўнік, выхавацель

Звыш трыццаці гадоў настаўнікам Бокаўскай школы працуе Антон Пракопавіч Царэнка, жыхар вёскі Бокаў. Толькі вайна адрывала Антона Пракопавіча ад любімай справы. З вайны ён вярнуўся з трыма ордэнамі і некалькімі медалямі. Сотні навучэнцаў прайшлі перад настаўнікам за многія гады, атрымалі неабходныя веды, рыхтаваліся да ўступлення ў свядомае жыццё.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 29 верасня 1972 г. А. П. Царэнку прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

20 кастрычніка 1972 г.

Яго ведаюць у раёне

Івана Міхайлавіча Букіша ведаюць у раёне як аднаго са старэйшых механізатараў калгаса імя Калініна. У гады першых пяцігодак стаў ён трактарыстам і вось ужо каля 40 гадоў вырошчвае хлеб. У гады вайны храбра змагаўся з ворагам. Сведчанне таму — ордэн Славы і некалькі баявых медаляў.

Пасля вайны ён зноў на трактары. Дапамагае таварышам па рабоце, навучае іх механізатарскаму майстэрству. Аўтарытэт Івана Міхайлавіча ў калгасе вялікі, а павага і падзяка за работу самі знаходзяць дастойных. Толькі за апошнія пяць гадоў І. М. Букіш удастоены ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга...

20 чэрвеня 1977 г.

* * *

На прыватным прадпрыемстве «Кентаўр Прамсервіс» ідуць апошнія работы па падрыхтоўцы да выпуску каўбасных вырабаў.

Абсталяванне закуплена ў Германіі...

У Мазыры працуюць прадпрыемствы камерцыйных структур па вытворчасці мэблі, швейных вырабаў і іншых тавараў.

Рынечная эканоміка становіцца ў горадзе рэальнай перспектывай і канкурэнтам дзяржаўных прадпрыемстваў.

«Жыццё Палесся», 21 студзеня 1995 г.

Каб не згасла зорка...

Рэканструкцыя Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода дасць прыбаўку больш за мільён тон бензіну. Доля Мазырскага НПЗ у валавым прадукце рэспублікі складае каля 4 працэнтаў, што само па сабе сведчыць аб яго значэнні. А калі ўлічыць, што тут вырабляецца прадукцыя стратэгічная для ўсёй эканомікі, то і праблемы прадпрыемства, несумненна, становяцца ў шэраг агульнадзяржаўных.

Ва ўмовах сусветных цэн на нафту яе перапрацоўка пры ўстарэлай тэхналогіі ўсё больш стратная. Толькі рэканструкцыя, якая дае дадатковы выхад высакаякасных светлых прадуктаў, дазволіць забяспечыць рэнтабельную работу завода. Таму прынята спецыяльная пастанова ўрада аб будаўніцтве ў Мазыры комплекса глыбокай перапрацоўкі нафты, а праект рэканструкцыі ўключаны ў лік прыярытэтных.

Са студзеня 1994 года завод стаў акцыянерным таварыствам, што таксама звязана з будучай рэканструкцыяй. Яе кошт складае 400 млн. долараў. Акцыяніраванне дазваляе прыцягнуць дадатковыя капіталы. Тым больш што курс акцый, якія маюць адносіны да нафты, пастаянна расце.

Вучоныя, спецыялісты, замежныя эксперты высока ацэньваюць перспектывы нафтаперапрацоўкі ў Мазыры. На прадпрыемстве склаўся кваліфікаваны калектыў, працуюць высакакласныя спецыялісты. За два дзесяцігоддзі сваёй гісторыі завод заявіў аб сабе унікальнымі дасягненнямі. Яшчэ зусім нядаўна НПЗ быў буйным пастаўшчыком рэактыўнага паліва для авіяцыі былога Саюза. Тут вырабляюць высокаактанавы бензін А-95 і экалагічна чыстае дызпаліва, у якім утрыманне серы — меней за 0,1 працэнта, што вышэй сучасных сусветных стандартаў. Прадукцыя завода адзначана Міжнароднай брыльянтавай зоркай якасці. У ліку пяці прадпрыемстваў СНГ ён з'яўляецца членам асацыяцыі нафтаперапрацоўшчыкаў ЗША.

Будаўніцтва ўстаноўкі каталітычнага крэкінга, а гэта — галоўная мэта рэканструкцыі, дазволіць давесці вытворчасць светлых нафтапрадуктаў да 79 працэнтаў (зараз — меней за 50).

Перспектыўнасць рэканструкцыі зацікавіла шэраг замежных фірм, у чым пераканаў міжнародны тэндэр, арганізаваны мазыранамі. У ім удзельнічала восем замежных кампаній. З пераможцамі — нарвежскай фірмай «Норынга» і італьянскай «Снампраджэці» — заключаны кантракты на дэтальную распрацоўку і здзяйсненне праекта. Праграма рэканструкцыі разлічана на 52 месяцы.

«Каб забяспечыць надзейнасць праекта рэканструкцыі, — гаворыць дырэктар завода Уладзімір Мікалаевіч Здабноў, — мы ідзем па шляху ўзмацнення звязкі «здабыча — перапрацоўка — збыт». Разам з двума расійскімі прадпрыемствамі, якія разведваюць і здабываюць нафту ў Цюменскім рэгіёне, ствараем холдзінгавую акцыянерную кампанію «Славнафта». Павялічваем і ўласны статутны фонд з наступным продажам акцый насельніцтву і юрыдычным асобам...»

Кіраўніцтва завода прыкладае энергічныя намаганні па рэалізацыі прыярытэтнага для рэспублікі праекта. Для ўстаноўкі паглыбленай перапрацоўкі нафты (па сутнасці гэта новы завод) ужо падрыхтавана пляцоўка.

В. Логвін

«Рэспубліка», 29 верасня 1994 г.

Соль зямлі мазырскай

«Экстра. Соль Палесся» — так напісана на пачку солі, якую выпускае Мазырскі солевыварачны камбінат.

Расказваюць, як нехта са старажылаў горада, калі даведаўся, што ўсё жыццё мясцовы люд хадзіў па солі (а раней яна была на вагу золата), усклікнуў: «Гэта ж трэба, якая багатая наша зямля. Да рэвалюцыі ў пана жменькі не выпрасіш, а яе, аказваецца, тысячы тон пад нагамі, бяры — не выбераш...»

Так, вякамі залягала соль у нетрах мазырскага Палесся. Але даведаліся аб гэтым толькі ў XX стагоддзі. У XIX стагоддзі соль на Мазыршчыну дастаўлялі па Прыпяці з Краменчуга. А яшчэ раней — з Галіцыі, Прусіі. Цяжка перавозіць яе. Калі быў вецер, уверх па цячэнні Прыпяці судна плыло пад ветразямі. У спакойнае надвор'е яго гналі вёсламі.

З Пінска да Краменчуга судна ішло каля трох тыдняў. Там выменьвалі соль на жыта, дровы, клёпку, брусы, мёд.

Баркі ўмяшчальнасцю да 2000 пудоў і больш хадзілі з Прыпяці праз Агінскі канал да Шчары і Нёмана, а па Каралеўскім канале — да Мухаўца і Буга. Доўгім і цяжкім быў саляны шлях.

Сёння на солевыварачным камбінаце прымяняецца арыгінальная тэхналогія здабычы солі. Пасля бурэння свідравін іх пад вялікім ціскам запаўняюць вадой, якая насычаецца соллю да 35 працэнтаў. Атрыманы расол пад ціскам падымаецца на паверхню і па трубаправодах падаецца ў аддзяленне ачысткі, дзе з яго выдзяляюцца солі кальцыю і магнію. Пасля гэтага ачышчаны раствор паступае ў выпарныя агрэгаты і адтуль праз шэраг службаў дастаўляецца ў сушыльныя печы. Далей шлях солі пралягае ў цэх расфасоўкі.

Першыя вагоны з палескай соллю былі адпраўлены рыбакам Поўначы. З'явілася соль і на прылаўках мясцовых магазінаў. У 1985 годзе камбінат выдаў 193 тысячы тон солі. Праектная магутнасць — 360 тысяч тон.

Мазыране заўсёды рады сябрам, якія прыязджаюць з розных гарадоў. Асабліва дарагіх гасцей сустракаюць тут па старадаўнім звычаі — хлебам-соллю. Хлебам, які вырошчваюць на Палессі, і соллю, якую здабываюць у яго нетрах.

Ю. Герасіменка

ПРАМЫСЛОВЫ МАЗЫР ВАСЬМІДЗЕСЯТЫХ

Адзін дзень горада ў лічбах

№ п/п	Паказчыкі	1985 г.	1986 г.	1987 г.
1.	Вытворчасць таварнай прадукцыі (тыс. руб.)	2823,7	3076	3220
2.	Удзельная вага ў аб'ёме прамысловасці вобласці (%)	17,7	17,9	17,9
	Важнейшыя віды прамысловай прадукцыі			
1.	Электраэнергія (тыс. квт-гадзін)	2502	2974	2944
2.	Кабельная прадукцыя (км)	5614	6025	6096
3.	Меліярацыйныя машыны (тыс. руб.)	228,3	238,2	249,5
4.	Кармавыя дрожджы (тон)	238,3	428	643
5.	Соль (тон)	528	728,3	913
6.	Швейныя вырабы (тыс. руб.)	55,5	56,8	61,2
7.	Трыкатажныя вырабы (тыс. руб.)	56,1	62,4	64,5
8.	Мэбля (тыс. руб.)	108,4	111,3	121,7
9.	Перавозка пасажыраў аўтамабільным транспартам (тыс. чал.)	135,4	139,5	147,7
10.	Перавозка грузаў аўтамабільным транспартам (тыс. тон)	45,0	47,0	49
11.	Уведзена ў дзеянне жылой плошчы (кв. м)	152	199,5	222,6
12.	Рознічны тавараабарот (тыс. руб.)	282,5	291,2	315,6
13.	Жалезабетон (куб. м)	713,0	742,0	760

«Камуніст Палесся», 20 лістапада 1988 г.

Усё пачынаецца з праекта...

Часткай пейзажу нашага горада даўно стала вялікая колькасць вежавых кранаў. Там, дзе вецер гуляў з пяском ды падымаўся над зямлёй рэдкі хмызняк, выраслі новыя жылыя раёны сучасных пабудоў. А хто ж не ведае: вуліца, плошча горада ці пасёлка пачынаецца з праекта.

У Мазыры праектная арганізацыя была створана ў 1948 г., з 1966 г. — гэта Мазырскі архітэктурна-будаўнічы аддзел. У 1990 г. быў створаны Мазырскі філіял праектнага інстытута «Гомельграмадзянпраект», а ў чэрвені 1993 г. — праектны інстытут комплекснага праектавання — «Палессепраект».

Зараз у інстытуце працуюць чатыры архітэктурна-канструктарскія брыгады, сантэхнікі, электрыкі, дзве групы каштарысу, сектар інжынерных пошукаў, група афармлення і выпуску праектаў, машынапіснае і капіравальнае бюро, транспартная група. Вялікая ўвага ў інстытуце надаецца аўтаматызаванай сістэме праектавання. Створаны аддзел тэхнічнай інфармацыі і аўтарскага нагляду.

Асноўная мэта інстытута — комплекснае праектаванне аб'ектаў жыллёва-грамадзянскага і іншага прызначэння ў Мазыры, іншых гарадах і населеных пунктах Рэспублікі Беларусь. Інстытут удзельнічае ў рэалізацыі дзяржаўнай праграмы па пераадоленні вынікаў аварыі на ЧАЭС, выконвае комплексныя інжынерныя пошукі для капітальнага будаўніцтва і на аб'ектах, дзе праводзяцца дэзактывацыйныя работы.

Інстытут «Палессепраект» робіць праекты дэталёвай планіроўкі і забудоў жылых мікрараёнаў, электразабеспячэння і сувязі, газа- і цеплазабеспячэння, тэхніка-эканамічныя разлікі, тэхнічную дакументацыю жыллёвых, школьных і дашкольных, сацыяльна-культурных, бытавых, гандлёвых, лячэбна-прафілактычных і іншых грамадзянскіх забудоў у гарадах і сельскай мясцовасці.

Акрамя гэтага, інстытут выконвае праекты забудоў, пашырэння і тэхнічнага пераабсталявання прадпрыемстваў, дапамагае ім кансультацыяй і паслугамі ў праектаванні, будаўніцтве і ўвядзенні ў вытворчасць прагрэсіўных тэхналогій.

Абмеркаванне праекта будучай забудовы Мазыра

Дзякуючы творчай працы калектыва інстытута і будаўнічых арганізацый горад Мазыр, іншыя гарады і вёскі маладзеюць і прыгажэюць.

Т. Піліпчук

Порт Мазыр раней і цяпер

На левым беразе Прыпяці раскінуўся порт Мазыр (да 1985 г. — порт Пхоў). Старажылы расказваюць, што тут, на пясчаных курганах, у далёкія дарэвалюцыйныя часы стаялі ўсяго два невялікія домікі, у якіх жылі вартаўнікі прымітыўнай прыстані Стралкоўскі і Лаўрэн. Але вось з чыгуначнай станцыі Калінкавічы ў пачатку гэтага стагоддзя на Пхоў была праведзена чыгуначная ветка. І невялічкая прыстань паступова пачала ажываць, разрастацца. Грузы дастаўляліся па Прыпяці з Екацярынаслава (зараз Днепрапятроўск), Краменчуга, Чаркас, Кіева і іншых гарадоў на драўляных баржах — ганчаках. На такіх суднах, якія належалі прыватным уладальнікам, працаваў старэйшы рачнік Прыпяці Афанасій Рыгоравіч Ус (ён узнагароджаны ордэнам Леніна). Сваю працоўную дзейнасць на водным транспарце ён пачаў яшчэ ў 1905 г. У 1916 г. на беразе затона была пабудавана эстакада для выгрузкі і складзіравання грузаў. У час першай сусветнай і грамадзянскай войн у Пхове сканцэнтравалася ваенная флатылія, маракі якой прымалі актыўны ўдзел ва ўстанаўленні Савецкай улады на Палессі.

У 1932 г. быў расчышчаны затон Пхова, пачалося будаўніцтва жылых дамоў. Па рацэ ў напрамках Мазыр — Кіеў, Мазыр — Тураў пачалі курсіраваць пасажырскія судны.

У 1935 г. на Прыпяці разгарнулася спаборніцтва за буксіроўку велікагрузных плытоў. Рачнікі ў ліку першых у горадзе падтрымалі стаханаўскі рух. Праз год пачаўся і кругласутачны рух параходаў. Ініцыятарам такога прагрэсіўнага метаду выступіў капітан парахода «Парыжская камуна» П. М. Кебец. З кожным годам порт папаўняўся новым флотам, павялічваўся аб'ём грузаперавозак. Прыгажэйшым і багацейшым станавілася жыццё рачнікоў.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны частка флоту адразу ж была перададзена ў распараджэнне Чырвонай Арміі, а частка была занята эвакуацыяй прамысловага абсталявання і насельніцтва Мазыра. За гады вайны ўся рачная гаспадарка, флот порта Пхоў былі знішчаны. Аднак рачнікі не палі духам і дружна ўзяліся за аднаўленне гаспадаркі. З дна Прыпяці былі падняты патопленыя параходы «Парыжская камуна», «Арктыка», «Рулявы», «Амур», «Матрос», «Урал» і іншыя. Гераічнай працай рачнікоў пры брацкай дапамозе народаў нашай краіны порт быў хутка адноўлены. Да 1950 г. рост грузаперавозак намнога павялічыўся. Па Прыпяці пайшлі грузы ў Польшчу, ГДР. Гэта былі ў асноўным каменны вугаль і жалезная руда.

У 1958 г. на месцы прыстані пачалося будаўніцтва буйнога рачнога порта, магутнасць якога з кожным годам узрастала. Так, калі адразу ў пасляваенныя гады перапрацоўка грузаў за год складала 70—75 тысяч тон, то цяпер яна складае каля 1 мільёна тон. На дапамогу людзям прыйшла магутная сучасная тэхніка — партальныя электрычныя краны, цеплаходы на дызельным паліве і іншыя механізмы і абсталяванне. Шырокае распаўсюджванне атрымаў новы метад суднаваджэння — штурханне суднаў. Прыкметна развіваецца пасажырскі флот. Па Прыпяці курсіруюць судны на падводных крылах...

«Камуніст Палесся», 15 ліпеня 1967 г.

Ад рэдактара-складальніка

Мінула 30 гадоў з моманту публікацыі артыкула. Не пазнаць порта Мазыр цяпер. Паявілася самая сучасная тэхніка. Перапрацоўка грузаў у 1991 г. склала 4,5 млн. тон. Побач з портам вырас новы мікрараён Зарэчны з усёй інфраструктурай. Тут жыве каля 10 тысяч жыхароў.

У апошнія гады, у сувязі з распадам Савецкага Саюза, роля порта Мазыр у перавозках і перапрацоўцы грузаў зменшылася ў некалькі разоў. У 1996 г. яны склалі паўмільёна тон. Амаль не стала і перавозак пасажыраў. Але збярогся калектыў, не парушана матэрыяльная база. Ёсць перспектыва — перавозка да Чорнага мора салігорскіх мінеральных тукаў і будаўнічых матэрыялаў. Порт будзе жыць і працаваць...

М. С. Бабарыкін

Багацце наша — лес

Мазырскі лясгас, створаны ў 1962 годзе, вядомы сваімі поспехамі ў лесакультурнай справе. Праводзіцца вялікая работа па стварэнні ландшафтных культур на тэрасах Мазырскага ўзвышша, а насаджэнні вакол горада — гонар гаспадаркі. Адметны па сваім рэльефе і наборы расліннасці заказнік Мазырскія кручы. Значная работа праводзіцца лясгасам па зберажэнні і ахове лесу ў прамысловай зоне, рэкультывацыі зямель, абсталяванні месцаў для адпачынку ў лясах. Для захавання рэдкай флоры і фауны створаны заказнік Зялёнамошскі. Лясгас выступіў ініцыятарам у справе рэканструкцыі дуброў і іх зберажэнні. У 1987 годзе створана лесанасенная плантацыя дуба чарэшчатага.

Тут ёсць гадавальнік плошчай 36 га, у якім штогод вырошчваецца каля 4 млн. сеянцаў. Выяўлены і ахоўваюцца рэдкія віды пород — элітная сасна, карэльская бяроза, бук заходні, лістоўніца сібірская, кедр, бархат амурскі. Закладзены плантацыі для прамысловай нарыхтоўкі ароніі, ці чарнаплоднай рабіны, абляпіхі, арэха грэцкага і фундука, шыпшыны, вярбы тэхнічнай.

У сярэднім за год нарыхтоўваецца каля 100 тысяч кубаметраў лесаматэрыялу. Частка дробнатаварнай драўніны ідзе на экспарт у Фінляндыю і Швецыю, што дае магчымасць купляць сучасную тэхніку і абсталяванне. Лясгас выпускае шырокі асартымент тавараў народнага карыстання. Дрэваапрацоўчы цэх у Слабадзе апрацоўвае каля 20 тыс. кубаметраў драўніны ў год.

У лясгасе працуюць шмат ветэранаў,



Маладыя пасадкі лесу на тэрасах мазырскіх узгоркаў

сапраўдных майстроў сваёй справы — леснікі Г. М. Буйнавец, В. С. Перапеча, Л. Д. Мельчанка, В. І. Кунцэвіч. З дня ўтварэння гаспадаркі пачаў сваю працоўную дзейнасць шафёр М. В. Пакацін. Лепшыя ляснічыя гаспадаркі — М. С. Вянгура, Г. С. Канопліч, Д. П. Кашэвіч, Г. П. Ганчароў. Творча кіруе лесаапрацоўчым цэхам А. П. Ліс. Ад бацькі — патомнага лесавода пераняў любоў да прыроды і М. Д. Дадзько, які прайшоў шлях ад майстра лесу да дырэктара лясгаса. Да яго на гэтай пасадзе за трыццаць гадоў змяніліся толькі два чалавекі: М. С. Бабарыкін і Р. Е. Бондар, якому прысвоена званне «Заслужаны лесавод Беларускай ССР».

М. Капач

За тысячы міль ад Палесся

Гэта буйное акіянскае судна водазмяшчэннем 18 тысяч тон пабудавана ў 1966 годзе. Сотні рэйсаў здзейсніў за гэты час цеплаход «Мазыр», наведаў каля 100 партоў больш чым 30 краін свету. За кармой «Мазыра» — некалькі мільёнаў кіламетраў.

У першым жа рэйсе, калі «Мазыр» ішоў з Ленінграда на Кубу, экіпаж чакала сур'ёзнае выпрабаванне. Атлантыка сустрэла маракоў моцным штормам, а ў трумах стаялі экскаватары. Яны сарваліся са стопараў і сталі біцца аб борт. Некалькі гадзін змагаўся экіпаж з небяспекаю, пакуль не замацавалі машыны.

24 гады працаваў цеплаход без капітальнага рамонту, узнагароджаны Ганаровымі граматамі Чарнаморскага марскога параходства, Ганаровым дыпломам. У жніўні 1969 года «Мазыр» абгінаў паўднёвую частку Афрыкі, калі на судна абрушылася велізарная акіянская хваля, якая сарвала фальшбот паўбака, вентыляцыйныя трубы, выклікала іншыя пашкоджанні. Такое ж выпрабаванне выпала цеплаходу і ў 1974 годзе ў Біскайскім заліве, калі з-за перамяшчэння грузу ўзнік небяспечны крэн, і толькі самаадданыя дзеянні экіпажа вярнулі судна ў нармальнае становішча, і цеплаход не выйшаў з графіка руху. Экіпаж памятае і агнявыя рэйсы 1967—1969 гадоў у В'етнам, калі пад грукат бомб і свіст асколкаў маракі не спынялі разгрузку. «Мазыр» быў адным з першых савецкіх суднаў, якія ўвайшлі ў Хайфон пасля размініравання. Баразніць цеплаход акіянскія воды і цяпер...

Т. Піліпчук

Імі ганарыцца Мазыршчына

Героі Сацыялістычнай працы

Галка Уладзімір Мікітавіч (н. 13.10.1923 г.) — перадавік нафтаздабывачай прамысловасці.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля заканчэння мінамётнай школы накіраваны на савецка-кітайскую граніцу (вострaў Даманскі). У пачатку 1942 г. — курсант Чэлябінскага танкавага вучылішча, быў механікам-вадзіцелем танка. Удзельнічаў у баях пад Курскам, многіх іншых баявых аперацыях. Вайну закончыў у Чэхаславакіі, быў тройчы паранены.

З 1951 г. — дызеліст, буравы майстар Беларускай канторы разведачнага бурэння ў Мазыры, затым працаваў буравым майстрам Рэчыцкай нафтаразведачнай экспедыцыі глыбокага бурэння трэста «Беларусьнафтагазразведка». Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1971 г. за паспяховае выкананне заданняў 8-га пяцігадовага плана.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны, Славы III ст., медалямі.

У. М. Галка

І. М. Рудкоўскі

А. І. Ліс

П. Н. Антоненка

Рудкоўскі Іосіф Максімавіч (н. 15.2.1931 г.) — перадавік нафтаздабываючай прамысловасці, буравы майстар. У 1971 г. прызначаны галоўным інжынерам буравой № 1 Мазырскай канторы разведачнага бурэння ўпраўлення геалогіі. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1966 г. за поспехі ў развіцці геолагаразведачных работ, адкрыццё і разведку радовішчаў карысных выкапняў.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі. Трагічна загінуў у 1996 г.

Д. Ц. Гузман

А. П. Сарокін

А. У. Міцкевіч

В. Л. Казлова

Заслужаныя работнікі Рэспублікі Беларусь

Прамысловасць

ГАЦКО Іван Андрэевіч (г. Мазыр).
КАВАЛЕНКА Уладзімір Германавіч (г. Мазыр).
ПАДГАРЭЦКАЯ Валянціна Савічна (г. Мазыр).

Сельская гаспадарка

ЛІС Аляксандр Ільіч (в. Тварычаўка).
САЎЧЫК Міхаіл Уладзіміравіч (в. Козенкі).

Будаўніцтва

АНТОНЕНКА Павел Нікіфаравіч (в. Малы Бокаў).
БАГЛАЙ Рыгор Міхайлавіч (г. Мазыр).
ГУЗМАН Давыд Цодзікавіч (г. Мазыр).
КЕНІК Іван Альбінавіч (г. Мазыр).

Транспарт

СЕРДЗЮКОЎ Віктар Мікалаевіч (г. Мазыр).

Геалогія

ЛЕБЕДЗЕЎ Васіль Рыгоравіч (г. Мазыр).

У. Н. Капусцянскі

Ф. Ф. Касуха

З. С. Гуло

М. Ф. Гусак

М. І. Красоўскі

А. І. Пярлоў

Б. А. Файнштэйн

Н. М. Агалец

САРОКІН Аляксандр Прохаравіч (г. Мазыр).

СКАЛАБА Павел Анісімавіч (г. Мазыр).

Сувязь

МІЦКЕВІЧ Аляксей Уладзіміравіч (г. Мазыр).

Медыцына

ІОЗЕФСОН Якаў Ісакавіч (г. Мазыр).

КАЗЛОВА Вольга Лукінічна (г. Мазыр).

КАПУСЦЯНСКІ Уладзімір Нікіфаравіч (г. Мазыр).

КАСУХА Філімон Фёдаравіч (г. Мазыр).

КРАСОЎСКІ Мікалай Іванавіч (г. Мазыр).

ПЯРЛОЎ Аляксандр Іванавіч (г. Мазыр).

СКАКУН Іван Пятровіч (г. Мазыр).

ФАЙНШТЭЙН Барыс Аронавіч (г. Мазыр).

ЧАРНЫШОВА Наталля Васілеўна (г. Мазыр).

Народная адукацыя

АГАЛЕЦ Надзея Міхайлаўна (в. Скрыгалаў).

БАБЫР Еўдакія Емяльянаўна (г. Мазыр).

БІСКІН Майсей Барысавіч (г. Мазыр).

БЯСПАЛАВА Муза Уладзіміраўна (в. Міхалкі).

ГУЛО Захар Сямёнавіч (г. Мазыр).

ГУСАК Мікалай Фёдаравіч (в. Скрыгалаў).

ДВОРАК Мікалай Мікалаевіч (в. Каменка).

ДЗІВАК Галіна Іванаўна (г. Мазыр).

ДЗМІТРЫЕВА Кацярына Васілеўна (г. Мазыр).

ЗАЙЧЫК Леў Навумавіч (Мазырскі раён).

ЗАМЫКА Вера Васілеўна (г. Мазыр).

ЗАРЭЦКАЯ Ала Іванаўна (в. Каменка).

ЗАХАР'ЯШ Канстанцін Міхайлавіч (в. Скрыгалаў).

КАТЛЯРОВА Лідзія Рыгораўна (пас. Крынічны).

КРАСОЎСКАЯ Таццяна Аляксандраўна (г. Мазыр).

КУДРЫС Дзмітрый Анікеевіч (в. Прудок).

ЛЫСЕНКА Кацярына Еўдакімаўна (в. Навікі).

МАРОЗ Ірына Іванаўна (в. Слабада).

МІХАЛЬЧУК Надзея Хрыстафораўна (в. Міхалкі).

М. М. Дворак

Г. І. Дзівак

Л. Р. Катлярова

Т. А. Красоўская

Л. Н. Зайчык

В. В. Замыка

Д. А. Кудрыс

К. Е. Лысенка

А. І. Зарэцкая

К. М. Захар'яш

І. І. Мароз

Н. Х. Міхальчук

МУРАШКА Томас Іванавіч (г. Мазыр).
НЕКРАШЭВІЧ Аляксандра Парфіраўна (г. Мазыр).
РЭВУЦКІ Ігар Мікалаевіч (г. Мазыр).
САВЕНКА Вольга Іванаўна (г. Мазыр).
САДОЎСКАЯ Любоў Мітрафанаўна (в. Мялешкавічы).
САЕВІЧ Ніна Васілеўна (г. Мазыр).
САЛАВЕЙ Уладзімір Дзянісавіч (г. Мазыр).
САЧАНКА Ніна Дзмітрыеўна (в. Каменка).
СМІРНОВА Надзея Фёдараўна (г. Мазыр).
СЦЁПІН Канстанцін Мікалаевіч (г. Мазыр).
ТУРСКІ Фёдар Антонавіч (в. Слабада).

В. І. Савенка

Л. М. Садоўская

А. П. Царэнка

В. П. Шульга

У. Д. Салавей

Н. Д. Сачанка

Г. С. Яўстратчык

І. І. Бадроў

К. М. Сцёпін

Ф. А. Турскі

К. Г. Высоцкі

Б. І. Цімафееў

ФЯДОСАВА Галіна Апалінар'еўна (г. Мазыр).

ЦАРЭНКА Антон Пятровіч (в. Вялікі Бокаў).

ШУЛЬГА Валянціна Пятроўна (Мазырскі раён).

ЯЎСТРАТЧЫК Ганна Сцяпанаўна (г. Мазыр).

Прафесіянальна-тэхнічная адукацыя

СУВОРАЎ Вячаслаў Трафімавіч (г. Мазыр).

СУВОРАЎ Мікалай Гаўрылавіч (г. Мазыр).

Культура

БАДРОЎ Іван Іванавіч (г. Мазыр).

Я. А. Хомчанка

Р. Е. Бондар

К. Л. Пятроўскі

У. К. Чурыла

А. М. Казлоў

М. П. Савіч

ВЫСОЦКІ Канстанцін Гаўрылавіч (Мазырскі раён).

СКВАРЦОЎ Аляксей Мікалаевіч (г. Мазыр).

Меліярацыя

ЦІМАФЕЕЎ Барыс Іванавіч (Мазырскі раён).

Землеўпарадкаванне

ХОМЧАНКА Ягор Апанасавіч (Мазырскі раён).

Лясная гаспадарка

БОНДАР Рыгор Елісеевіч (Мазырскі раён).

Юрыдычная служба

ГЕРМАНАЎ Павел Паўлавіч (г. Мазыр).

Спорт

ДЗЕРАВЯНКА Леанід Андрэевіч (г. Мазыр).

ТАРАСАЎ Мікалай Барысавіч (г. Мазыр).

ХАРАШУК Іван Мікалаевіч (г. Мазыр).

Мастацтва

ПУШКАР Мікалай Мікітавіч (г. Мазыр).

Лаўрэаты

Дзяржаўнай прэміі СССР

ПЯТРОЎСКІ Казімір Люцыянавіч — будаўнік г. Мазыр.

Дзяржаўнай прэміі БССР

ЧУРЫЛА Уладзімір Канстанцінавіч — будаўнік Мазырскага р-на.

Адзначаныя вышэйшай урадавай узнагародай — ордэнам Леніна:

АДЗІНЦОВА Ніна Андрэеўна (г. Мазыр).

АРЦЮШЭНКА Марыя Ісакаўна (в. Дразды).

БУКІШ Іван Міхайлавіч (в. Раеўскія).

ВІКЕНЦЬЕЎ Казімір Францавіч (г. Мазыр).

ВЯГЕРА Мікалай Арцёмавіч (г. Мазыр).

ГУСАК Мікалай Фёдаравіч (в. Скрыгалаў).

ДЗЕСЯНЦЁР Якаў Рыгоравіч (в. Козенкі).

ДРАВІЛА Адам Мітрафанавіч (в. Гурыны).

ДУБРОВА Мікалай Кузьміч (г. Мазыр).

ЗАХАР'ЯШ Канстанцін Міхайлавіч (в. Скрыгалаў).

ЗАЯЦ Мікалай Апанасавіч (в. Махнавічы).

КАЗЛОЎ Аляксандр Мацвеевіч (г. Мазыр).

КАРАЛЕНКА Фёдар Пятровіч (г. Мазыр).

КАШПУР Іван Кірылавіч (г. Мазыр).

КНІГА Піліп Міхайлавіч (г. Мазыр).

КОНІК Міхаіл Уладзіміравіч (г. Мазыр).

КРАСОЎСКАЯ Таццяна Аляксандраўна (г. Мазыр).

КРЫЛОЎ Сямён Фадзеевіч (в. Бібікі).

КУРОЎСКАЯ Вольга Сямёнаўна (г. Мазыр).

КУРОЎСКІ Роберт Іосіфавіч (г. Мазыр).

Працаўнікі сельскай гаспадаркі Мазырскага раёна, узнагароджаныя ордэнам Леніна. У першым радзе (злева направа): В. С. Куроўская, М. І. Арцюшэнка, Г. Г. Савенка, Г. А. Шумак. У другім радзе: Р. І. Куроўскі, А. І. Мірцюк, І. М. Букіш

ЛІС Яўгенія Аляксееўна (в. Тварычаўка).
МАІСЕЕНКА Аляксандр Міхайлавіч (в. Козенкі).
МАКАРАНКА Рыгор Платонавіч (г. Мазыр).
МІРАЦЮК Антаніна Іванаўна (в. Тварычаўка).
МІТКЕВІЧ Якаў Пятровіч (г. Мазыр).
МІЦІН Анатоль Андрэевіч (г. Мазыр).
ПАПЕР Міхаіл Якаўлевіч (г. Мазыр).
ПЕРАПЕЧА Сцяпан Рыгоравіч (г. Мазыр).
ПЛЫШЭЎСКІ Рыгор Іванавіч (г. Мазыр).
РУХЛО Надзея Арцёмаўна (в. Слабада).
САВЕНКА Ганна Герасімаўна (в. Козенкі).
САВІЧ Міхаіл Піліпавіч (г. Мазыр).
СУЗЬКО Міхаіл Іванавіч (в. Козенкі).
УС Апанас Рыгоравіч (г. Мазыр).
ХРАМЕЦКІ Іосіф Сямёнавіч (г. Мазыр).
ШАТАЛАЎ Якаў Апанасавіч (г. Мазыр).
ШВЕЦ Філімон Антонавіч (г. Мазыр).
ШУМАК Ганна Антонаўна (в. Белая).

Ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Працоўнай Славы, Дружбы народаў, медалямі «За працоўную доблесць», «За працоўную адзнаку», Ганаровымі граматамі і Граматамі Вярхоўнага Савета БССР у 1948—1990 гг. узнагароджана каля дзвюх тысяч чалавек.

Падрыхтавалі
М. Капач, І. Піліпчук

Ганаровыя грамадзяне Мазыра

Аляксееўскі Яўген Яўгенавіч (н. 7.3.1906 г. у г. Баброў Варонежскай губерні), вучоны-аграном, меліяратар. У 1923—1929 гг. быў на камсамольскай рабоце, у 1929—1932 гг. працаваў у партыйных органах Таджыкістана. У 1931—1941 гг.— намеснік наркама земляробства, намеснік наркама воднай гаспадаркі Таджыкскай ССР, начальнік Калінінскага абласнога сельскагаспадарчага ўпраўлення, загадчык сельскагаспадарчага аддзела Калінінскага абкама партыі.

У гады вайны — камісар і начальнік палітаддзела гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі, удзельнік вызвалення Мазыра і Мазырскага раёна.

У 1946—1962 гг. быў першым намеснікам міністра сельскай гаспадаркі Украіны, затым працаваў начальнікам Галоўнага ўпраўлення воднай гаспадаркі пры Савеце Міністраў Украіны, старшынёй Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў Украіны па воднай гаспадарцы.

З 1963 г. Я. Я. Аляксееўскі працаваў старшынёй Дзяржаўнага камітэта па арашаемаму земляробству і воднай

К. Ф. Вікенцьеў

гаспадарцы, міністрам меліярацыі і воднай гаспадаркі СССР.

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, іншымі ордэнамі і медалямі.

Вікенцьеў Казімір Францавіч (н. 14.11.1910 г. у Мазыры). Працоўную дзейнасць пачаў у 1928 г. рабочым лесапільнага завода. У 1930 г. прызваны ў Чырвоную Армію. У якасці камандзіра артылерыйскай батарэі прымаў удзел у баях на савецка-фінляндскай вайне.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны на Ленінградскім фронце, быў начальнікам артылерыі стралковага палка, затым камандзірам артылерыйскага дывізіёна, камандзірам мінамётнага палка. У сакавіку 1944 г. накіраваны ў Войска Польскае для фарміравання гаўбічнай артылерыйскай брыгады, з якой ваяваў да дня Перамогі. Удзельнічаў у вызваленні Польшчы, штурме Берліна.

Пасля вайны К. Ф. Вікенцьеў служыў на розных пасадах у Савецкай Арміі, звольнены ў запас у званні палкоўніка. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, чатырма — Чырвонага Сцяга, двума — Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ст., Аляксандра Неўскага, двума ордэнамі Польшчы, многімі медалямі. У 1931—1935 гг. з'яўляўся членам ЦВК Беларусі. Многа гадоў узначальваў камітэт садзейнічання афіцэрам запасу і ў адстаўцы пры Мазырскім ваенным камісарыяце.

Памёр у 1995 г.

Ганчар Рыгор Фядосавіч (н. у 1932 г. у в. Дарашэвічы Петрыкаўскага р-на). У 1949—1951 гг. вучыўся ў Мазырскім педагагічным вучылішчы. У 1951—1956 гг. служыў на Чарнаморскім флоце. Пасля заканчэння педвучылішча ў 1957—1959 гг. працаваў настаўнікам Асавецкай сярэдняй школы Мазырскага р-на. У 1959 г. быў выбраны сакратаром партарганізацыі калгаса «Чырвоны маяк», затым — «Зара камунізму».

У 1961 г. паступіў на вучобу ў Мінскую вышэйшую партшколу, па заканчэнні якой у 1965—1970 гг. працаваў інструктарам, другім сакратаром гаркама КПБ, лектарам партыйных органаў.

У 1970 г. быў выбраны старшынёй Мазырскага гарвыканкама, які ўзначальваў на працягу 17 гадоў. У 1987—1993 гг. працаваў сакратаром Гомельскага абвыканкама. З 1993 г. узначальвае Фонд бяспекі дарожнага руху.

Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў, двума ордэнамі «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. 24.10.1994 г. у сувязі з 70-годдзем утварэння Мазырскага гарсавета за шматгадовую працу і вялікі ўклад у развіццё горада Р. Ф. Ганчару прысвоена званне ганаровага грамадзяніна Мазыра.

Патоцкая Галіна Канстанцінаўна (н. у 1923 г. у в. Дудзічы Магілёўскай вобл.). Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Працоўную дзейнасць пачала ў лютым 1941 г. загадчыцай фельчарска-акушэрскага пункта ў Чэрвеньскім раёне Мінскай вобласці. У пачатку Айчыннай вайны была мабілізавана ў Чырвоную Армію і служыла ў першым запасным палку 21-й арміі. Была паранена, вярнулася ў родную вёску. Пасля таго як ворагі захапілі Дудзічы, пайшла ў партызанскі атрад імя Варашылава. У жніўні 1943 г. атрымала раненне і была эвакуіравана на лячэнне ў Маскву.

Пасля вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працавала ў

горадзе дзяржінспектарам райздраўаддзела, затым — загадчыцай дзіцячых ясляў № 1, фельчарам, рэнтгеналабарантам. Добра ведаюць Галіну Канстанцінаўну ў горадзе па яе грамадскай дзейнасці, яна неаднаразова выбіралася старшынёй жаночага савета пры райваенкамаце.

Знаходзячыся на заслужаным адпачынку, Г. К. Патоцкая — актыўны арганізатар гарадскога хору ветэранаў, які зараз носіць званне «народны». У 1995 г. Галіна Канстанцінаўна стала ганаровым грамадзянінам Мазыра.

Былая партызанка ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі, Ганаровымі граматамі.

Падрыхтавала
Т. Піліпчук

А. П. Эльман

Эльман Андрэй Пятровіч (н. у 1903 г. у г. Елабуга Вяцкай губерні). Працоўную дзейнасць пачаў у 1919 г. Працаваў у камсамольскіх і партыйных органах у Віцебску і Гомелі. Скончыў Інстытут чырвонай прафесуры пры ЦВК СССР. У 1937—1939 гг. — дырэктар Гомельскага педагагічнага інстытута, з 1940 г. — сакратар Гомельскага, Беластоцкага, Новасібірскага, Гродзенскага абкамаў КПБ. У 1948 г. — намеснік старшыні Савета Міністраў БССР. У 1949—1952 гг. — намеснік старшыні Палескага аблвыканкама, у 1952—1968 гг. — дырэктар, рэктар Мазырскага педагагічнага інстытута. У сувязі з 90-годдзем з дня нараджэння А. П. Эльману прысвоена званне ганаровага грамадзяніна Мазыра.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі.

Памёр у студзені 1995 г.

В. Шур

Тут іх карані

Многія ўраджэнцы Мазыршчыны праславілі свой палескі край, жывучы і працуючы далёка ад роднага дому. Гэта знакамітыя вучоныя і дзеячы культуры, відныя военачальнікі, вядомыя спарстмены...

Ад каваля да акадэміка

У старажытнай вёсцы Барбароў пачынаў у 20-я гады сваю працоўную дзейнасць Міхаіл Мацапура. Тут на землях мясцовага памешчыка Горвата гнулі спіны яго бацькі, тут у 1909 г. нарадзіўся будучы акадэмік. З малых гадоў ён цягнуўся да кавальскай справы, працаваў малатабойцам, памочнікам каваля, зімой вучыўся ў школе.

У 1932 г. Міхаіл Мацапура скончыў Ленінградскі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Яшчэ ў студэнцкія гады ён імкнуўся ўдасканальваць і ствараць новыя віды машын. Гэта і прывяло маладога інжынера ў Маскву, дзе ён стаў загадчыкам лабараторыі машын па вырошчванні і перапрацоўцы бульбы УНДІ механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. У 1945 г. ён абараніў доктарскую дысертацыю па праблемах сельскагаспадарчага машынабудавання, з 1947 г. — акадэмік Акадэміі навук БССР. У гэтым жа годзе Міхаіл Яфрэмавіч назначаны дырэктарам Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай

М. Я. Мацапура

гаспадаркі нечарназёмнай зоны СССР. Многа гадоў аддаў навуковай рабоце па вырашэнні праблем земляробчай тэхнікі, ствараў новыя сельскагаспадарчыя машыны.

У першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі пачаліся вялікія работы па асушэнні і асваенні беларускіх балот. Тут вельмі дарэчы аказаліся плужныя кнавакапальнікі, балотныя плугі, створаныя ў інстытуце пад кіраўніцтвам М. Я. Мацапуры. Старэйшае пакаленне аграрнікаў Беларусі памятае мацапураўскія плугі, з дапамогай якіх асвоены і ўведзены ў севазварот першыя тысячы гектараў забалочаных земляў. Намнога пазней на балотах з'явіліся новыя ўдасканаленыя меліярацыйныя машыны.

За вялікі ўклад у распрацоўку праблем землеапрацоўчай тэхнікі М. Я. Мацапура быў узнагароджаны многімі высокімі ўрадавымі ўзнагародамі, ён тройчы ўдастоены звання лаўрэата Дзяржаўнай і Ленінскай прэмій, чатыры разы выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Памёр М. Я. Мацапура ў 1971 г.

Памяць пра славутага земляка, колішняга каваля з Барбарова, выдатнага вучонага, які смела і настойліва пракладваў у навуцы і тэхніцы свой адметны шлях, жыве на Мазыршчыне. У роднай вёсцы М. Я. Мацапуры адна з вуліц названа ягоным іменем.

М. Капач, В. Шур

Жыццё ў навуцы

Ракіцкі Пётр Фаміч (н. 2.8.1903 г. у в. Кустаўніца) — вучоны ў галіне агульнай біялогіі, генетыкі і селекцыі. Акадэмік АН БССР, доктар біялагічных навук. Скончыў Маскоўскі універсітэт імя Ламаносава, працаваў у шэрагу навукова-даследчых устаноў рэспублікі. Апошнія гады жыцця загадваў лабараторыяй тэарэтычнай генетыкі Інстытута генетыкі і цыталогіі АН БССР. П. Ф. Ракіцкі сфармуляваў і эксперыментальна абгрунтаваў паняцце аб полі дзеяння гена, упершыню ў краіне пачаў даследаванні па рацыянальнай генетыцы млекакормячых. Ён распрацаваў шэраг пытанняў генетыкі колькасных прыкмет і генетычных асноў селекцыі жывёл. З'яўляўся прэзідэнтам Беларускага таварыства генетыкаў і селекцыянераў імя Вавілава. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

З успамінаў П. Ф. Ракіцкага

Да шасцігадовага ўзросту я жыў разам з маці ў Кустаўніцы (цяпер гэтай вёскі няма, на яе месцы пабудаваны Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод). У памяці — пераправа ранняй вясной цераз Прыпяць, пацямнелы лёд...

Перад першай сусветнай вайной мы пераехалі ў Мазыр, мне трэба было вучыцца. Жылі мы на вуліцы Свідоўка. Нядаўна, прыехаўшы ў Мазыр, я адшукаў той дом, дзе мы кватаравалі з 1913 па 1915 год. Мазыр я вельмі любіў — за яго ўзгоркі і яры, месцы дзіцячых гульняў, Прыпяць і прыбярэжны пясок.

Напярэдадні рэвалюцыі мы пераехалі ў Чэрыкаў. Там М. Н. Лепяшынскі, брат вядомага рэвалюцыянера-бальшавіка П. Н. Лепяшынскага, арганізаваў у 1920 г. у былым маёнтку Лемень школу-камуну другой ступені, якая потым называлася доследна-паказальнай. Я быў у першым яе выпуску, і М. Н. Лепяшынскі прапанаваў мне, 18-гадоваму юнаку, застацца ў камуне настаўнікам. На працягу двух гадоў выкладаў біялогію, якой захапляўся з дзяцінства. Пасля работы ў Лемені ў 1923 г. паступіў у Маскоўскі універсітэт.

Яшчэ студэнтам я пачаў весці навуковую работу ў інстытуце эксперыментальнай біялогіі пад кіраўніцтвам выдатных вучоных Н. К. Кальцова і С. С. Чацверыкова. Там на пачатку 30-х гадоў напісаў вялікую кнігу — першы савецкі падручнік генетыкі для ВНУ, а ва ўзросце 36 гадоў у Маскоўскім універсітэце абараніў дысерта-

П. Ф. Ракіцкі

А. І. Захарава

цыю, стаў доктарам біялагічных навук, прафесарам.

У 1960 г. мяне запрасілі ў Мінск загадваць кафедрай заалогіі пазваночных Беларускага універсітэта. Я з радасцю пераехаў, мяне ніколі не пакідала пачуццё горычы, што я адарваўся ад Беларусі. Нягледзячы на ўзрост, многа пішу, друкую артыкулы, выступаю з дакладамі. Паранейшаму займаюся матэматычнымі пытаннямі генетыкі, штучным выкліканнем спадчынных змяненняў уздзеяннем радыяцыі і хімічных рэчываў, пошукам ахоўных сродкаў ад уздзеяння радыяцыі. Удзяляю ўвагу тэарэтычным пытанням селекцыі сельскагаспадарчых жывёл. Работы многа, цікавай і карыснай, спадзяюся яшчэ нямала зрабіць і здзейсніць...

Захарава Алена Іванаўна (н. у 1907 г. у Мазыры) — доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар. З 1943 г. працавала ва Усерасійскім навукова-даследчым інстытуце вінаградарства і вінаробства ў Новачаркаску.

Двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі (1951, 1971), аўтар больш як 200 кніг, брашур, артыкулаў, рэкамендацый па вінаградарстве і вінаробстве. Мае пяць аўтарскіх пасведчанняў за распрацоўкі па вінаградарстве. Узнагароджана трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнамі Дружбы народаў, «Знак Пашаны», медалямі.

Некрашэвіч Ілья Рыгоравіч (н. 20.7.1905 г. у Мазыры) — беларускі фізік, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі. Скончыў Белдзяржуніверсітэт і Маскоўскі універсітэт, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў у БДУ загадчыкам кафедры фізікі, у фізіка-тэхнічным інстытуце АН БССР. Працы па фізіцы кантактаў металаў з паўправаднікамі і з газаразраднай плазмай. Выявіў частотную інверсію выпрамлення пераменных токаў высокай частаты пунктавым кантактам паўправадніка з металам.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі.

Піліпенка Уладзімір Аляксандравіч (н. 18.5.1949 г. у Мазыры) — вучоны ў галіне электронікі, доктар тэхнічных навук. У 1971 г. скончыў факультэт радыёфізікі і электронікі Белдзяржуніверсітэта. З 1971 г. працаваў у СКТБ вытворчага аб'яднання «Інтэграл», вядучы тэхнолаг вытворчага аб'яднання. Распрацаваў і ўкараніў у вытворчасць рад навуковых распрацовак па дыпалярнай тэхналогіі інтэгральных мікрасхем на аснове імпульснай фатоннай тэрмаапрацоўкі.

Піліповіч Уладзімір Антонавіч (н. 5.1.1931 г. у в. Слабада) — фізік, доктар фізіка-матэматычных навук. У 1954 г. скончыў Белдзяржуніверсітэт, быў накіраваны на работу ў Інстытут фізікі АН БССР, загадваў лабараторыяй электронікі, з 1973 г. працаваў дырэктарам Інстытута электронікі. Працы па квантавай электроніцы ў дастасаванні да патрэб аптычных метадаў апрацоўкі інфармацыі, паўправадніковай оптаэлектроніцы, спектральналюмінісцэнтных уласцівасцях арганафасфатаў.

Сітэрман Лазар Якаўлевіч (н. у 1894 г. у Мазыры) — беларускі вучоны-медык, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі. Скончыў Юр'еўскі універсітэт, ваенны ўрач. Пасля грамадзянскай вайны да канца жыцця працаваў у Мінску галоўным урачом цэнтральнай паліклінікі, загадчыкам кафедры ў Мінскім медінстытуце. Працы па пытаннях этыялогіі, клінікі і лячэння сардэчна-сасудзістых хвароб.

Памёр у кастрычніку 1941 г.

Трызна Сямён Іванавіч (н. 18.4. 1890 г. у Мазыры) — беларускі вучоны, доктар сельскагаспадарчых навук. Скончыў Кіеўскі універсітэт, у 1924 — 1931 гг. працаваў дырэктарам Палескай пясчана-балотнай доследнай станцыі, затым — загадчыкам аддзела апрацоўкі глеб у НДІ балотнай гаспадаркі УАСГНІЛ. У пасляваенны час — у БелНДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі. Працы па агратэхніцы і селекцыі збожжавых культур на тарфянабалотных глебах.

Шляга Мікалай Іванавіч (н. 1.5. 1935 г. у в. Перадрэйка) — генерал-палкоўнік, да 1992 г. — начальнік Галоўнага палітычнага ўпраўлення Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту Міністэрства абароны. Скончыў ваеннае аўтамабільнае вучылішча, у 1972 г. — завочную Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС, у 1975 г. — Ваенна-палітычную акадэмію імя У. І. Леніна. З 1958 г. на камандных пасадах у Савецкай Арміі — камандзір узвода, з 1969 г. на палітычнай рабоце. Працаваў інструктарам, намеснікам загадчыка сектара Аддзела адміністрацыйных органаў ЦК КПСС. У 1987 г. прызначаны загадчыкам сектара Аддзела адміністрацыйных органаў ЦК КПСС, у 1989 г. — намеснікам загадчыка пададдзела Дзяржаўнага прававога аддзела ЦК КПСС. З 1989 г. — першы намеснік начальніка Галоўнага палітычнага ўпраўлення Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, з ліпеня 1990 г. — начальнік Галоўнага палітычнага ўпраўлення Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту Міністэрства абароны.

Гальперына Юдзіф Самуілаўна (н. 5.3.1914 г. у Мазыры) — беларуская і руская актрыса, заслужаная артыстка БССР. У 1937 г. скончыла Беларускую студыю пры Цэнтральным тэатральным вучылішчы ў Ленінградзе. Працавала ў Беларускім тэатры юнага гледача, Пінскім абласным драматычным тэатры. З 1954 г. у Магілёўскім абласным драматычным тэатры. Характарная актрыса. Ролі: Снежная Каралева ў аднайменнай п'есе Я. Шварца, Негіна ў п'есе А. Астроўскага «Таленты і паклоннікі», Насця ў п'есе В. Вольскага «Несцерка», Лявоніха ў п'есе А. Макаёнка «Лявоніха на арбіце» і інш.

Пікман Ізраіль Цурыелевіч (н. 20.5.1918 г. у Мазыры) — беларускі кінааператар і рэжысёр. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Скончыў інстытут кінематаграфіі, з 1946 г. працуе на кінастудыі «Беларусьфільм». Зняў мастацкія фільмы «Дзяўчынка шукае бацьку», здымкі якога праводзіліся на Мазыршчыне, «Наперадзе круты паварот», «Вуліца малодшага сына», «Сорак хвілін да світанку». Рэжысёр дакументальных фільмаў «Вясновыя галасы», «Штрыхі да партрэта», «Пастух», «Мы — сіняблузкі», «Я, крэпасць, вяду бой», «Брэсцкая крэпасць», «Мазырскія сустрэчы» і інш.

Фінберг Міхаіл Якаўлевіч (н. 21.2.1947 г. у Мазыры) — народны артыст Рэспублікі Беларусь, дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.

Вучыўся ў СШ № 7 і дзіцячай музычнай школе № 1. З 1962 па 1966 г. — выхаванец ваенных аркестраў у Курску і пры штабе БВА, у 1967—1970 гг. — артыст эстраднага аркестра Дзяржтэлерадыё Беларусі. Затым на працягу 17 гадоў Міхаіл Якаўлевіч працаваў галоўным дырыжорам аркестра Мінскага дзяржаўнага цырка.

З 1987 г. — галоўны дырыжор Дзяржаўнага сімфанічнага канцэртнага аркестра Беларусі. Дыпламант 3-х фестываляў «Славянскі базар», лаўрэат прэміі камсамола Беларусі (1990), конкурсу «Лепшы дырыжор» (1995).

Т. Піліпчук, В. Шур

Тры браты — тры вучоныя

Тры браты, усе тры сыны хлебароб з вёскі Іванкаўшчына Адама Макарэвіча Гусака — Аляксей, Сяргей і Мікалай — вядомыя вучоныя: два кандыда

А. А. Гусак

С. А. Гусак



М. А. Гусак

ты і адзін доктар навук, усе прафесары вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі...

У Іванкаўшчыне і цяпер успамінаюць старога Гусака: і хлеб расціў, і калгас арганізоўваў, і радзіму абараняў, і ў вясковым гандлі многа гадоў працаваў. А галоўнае — вырасціў, вывеў у людзі трох сыноў і дзвюх дачок. Ды якіх сыноў! Нібы тры волаты з вядомай казкі. Не ўзялі яны сілай, узялі іншым — розумам, спагадаю, навуковым пошукам...

Мала давялося вучыцца ў свой час Адаму Макаравічу. Двухкласнае народнае вучылішча ў суседніх Мялешкавічах не закончыў, такі час быў, грамадзянская вайна, — не да вучобы. Недахоп ведаў папаўняў самастойна, на курсах «Далоў непісьменнасць». Імкненне да ведаў было такім моцным, што ён не ўяўляў сваіх дзяцей без вышэйшай адукацыі.

Бацькава мара здзейснілася. Трое скончылі універсітэт, двое — інстытуты. Вучоныя — матэматык, філолаг-пісьменнік, фізік, дзве настаўніцы.

«Да вайны паспеў скончыць толькі сем класаў, — успамінае старэйшы Аляксей Адамавіч. — Пасля вызвалення раёна паступіў у Мазырскае педвучылішча. У 1947 г. атрымаў дыплом настаўніка. А хацелася большага...»

Беларускі універсітэт, аспірантура, абарона кандыдацкай, з 1976 г. — прафесар. Звыш 30 гадоў жыццё Аляксея Адамавіча непарыўна звязана з буйнейшай навуковай установай рэспублікі — БДУ, дзе ён — дэкан факультэта, загадчык кафедры агульнай матэматыкі, аўтар больш як 110 апублікаваных работ, у тым ліку 20 кніг па гісторыі матэматыкі, методыцы яе выкладання і г. д. ...

Сцежка ў навуку сярэдняму брату — Сяргею — была ўжо пратаптаная. Філалагічны факультэт БДУ, работа настаўнікам, аспірантура, абарона кандыдацкай, рэктар Брэсцкага педінстытута, аўтар кніг «Аляксей Кулакоўскі» і «Пафас праўды», член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Раптоўная смерць у 40 гадоў абарвала таленавіты шлях...

Зусім было зразумелым, што прыклад са старэйшых братоў возьме і Мікалай... З 1956 г. вучоба на фізічным факультэце БДУ, аспірантура, кандыдацкая і доктарская дысертацыі па праблемах фізікі. Цяпер ён прафесар Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі...

Апусцела бацькоўская хата ў Іванкаўшчыне. Праўда, непадалёку жыве сястра Мальвіна, якая ўсё жыццё вучыла дзяцей аднавяскоўцаў. Але ж гады ідуць. Ужо даўно ржа пабіла косы, якія звінелі калісьці роснымі раніцамі ў руках братоў, што сумавалі ў гарадах па сялянскай працы, але і далёка ад дому родных мясцін ніколі не забывалі.

М. Капач

Яго помніць Палессе

Цэнтрам Мазырскага раёна ў 1926—1927 гг. была вёска Слабада. Межы раёна значна адрозніваліся ад сучасных. Тэрыторыі сучасных Барбароўскага, Міхалкаўскага, Махнавіцкага, Мялешкавіцкага, Скрыгалаўскага і Асавецкага сельсаветаў адносіліся да іншых раёнаў, значная ж частка Калінкавіцкага раёна — да Мазырскага. Менавіта тады ў райвыканкам па размеркаванні Наркамзема рэспублікі прыехаў 18-гадовы выпускнік сельгастэхнікума Міхаіл Кліменка. Працаваў аграномам у райземаддзеле, затым старшым аграномам у Мазырскім райкалгассаюзе. Для падрыхтоўкі кіруючых кадраў калгасаў і саўгасаў на Палессі была створана двухгадовая сельскагаспадарчая школа. Выкладчыкам, намеснікам дырэктара і дырэктарам яе да вайны быў М. А. Кліменка.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Кліменка — дырэктар МТС у Сталінградскай вобласці, з лістапада 1943 г. — намеснік начальніка і начальнік Палескага зямельнага аддзела.

У 1948 г. М. А. Кліменка выбраны на пасаду намесніка старшыні Палескага абласнога выканаўчага камітэта, праз тры гады — старшынёю аблвыканкама. Многа ўвагі ён удзяляў умацаванню ролі мясцовых органаў улады ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве. Высокім быў аўтарытэт М. А. Кліменкі сярод насельніцтва, яго ведалі ў самых аддаленых вёсках Палесся.

Пасля таго як у 1954 г. была ліквідавана Палеская вобласць, М. А. Кліменка становіцца намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама, затым — старшынёй абласнога выканаўчага камітэта. На гэтай высокай пасадзе таленавіты, вопытны кіраўнік працаваў да 1970 г. Ён быў дэпутатам Вярхоўнага Савета рэспублікі трох скліканняў.

М. Капач, Л. Шут

Пакінуў добры след

А. А. Малафееў

У 1971—1975 гадах Анатоль Аляксандравіч Малафееў быў першым сакратаром Мазырскага гаркама Кампартыі Беларусі. У гэты перыяд асабліва інтэнсіўна рос і развіваўся горад: было пабудавана шмат жылля, школ, узведзена новая бальніца, уступіла ў строй дзеючых першая чарга Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода. У працоўныя дасягненні мазыран вялікі ўклад унёс Анатоль Аляксандравіч, таленавіты арганізатар, чулы партыйны кіраўнік.

Яшчэ да Мазыра А. А. Малафееў прайшоў немалы жыццёвы шлях: скончыў чыгуначны тэхнікум, працаваў слесарам, служыў на флоце, зноў вучыўся — у інстытуце народнай гаспадаркі, працаваў у райкаме і абкаме партыі ў Гомелі. Але яшчэ больш маштабнай і плённай была яго дзейнасць пасля Мазыра: з 1975 года ён на адказных партыйных і дзяржаўных пасадах у Гомелі і Мінску, а ў 1990 годзе яго выбіраюць першым сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі і членам Палітбюро ЦК КПСС.

Мінулі больш як два дзесяцігоддзі з часу, калі Анатоль Аляксандравіч працаваў у горадзе над Прыпяццю, але ўдзячныя мазыране не забываюць таго добрага, што зрабіў ён для горада і раёна. І калі ў 1995 годзе праводзіліся выбары ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, ён быў вылучаны тут кандыдатам у дэпутаты. Мазыране горача падтрымалі праграму, у якой А. А. Малафееў адстойвае інтарэсы чалавека

працы, выступае «за пераўтварэнні грамадства, якія паляпшаюць жыццё людзей».

У 1996 годзе дэпутат ад Мазыра Анатоль Аляксандравіч Малафееў быў выбраны Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Т. Піліпчук

І. М. Харашук

Воін, спартсмен, выхавацель

Іван Мікалаевіч Харашук у 1940 г. пасля савецка-фінляндскай вайны, у якой ён удзельнічаў артылерыстам, быў звольнены ў запас і вярнуўся ў родны Мазыр. Яго накіравалі ў вучылішча авіятэхнічнай службы. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны пайшлі ваяваць з фашыстамі тры Харашукі — Уладзімір, Юрый і Іван. Уладзімір прапаў без вестак у першыя дні вайны. Загінуў у 1944 г. і Юрый. Іван Мікалаевіч з сакавіка 1942 г. служыў у складзе 95-га авіяпалка Паўночнага флоту, затым — у 9-м Чырванасцяжным Кіркінескім мінна-тарпедным авіяпалку. Ён быў фотаграмметрыстам, рабіў аэрафотаздымкі Нарвегіі, Баранцава мора і інш. У ягоным альбоме і сёння захоўваюцца унікальныя фатаграфіі, сярод іх — гібель фашысцкага лінкора «Цірпітц», лётчыкі 9-га мінна-тарпеднага авіяпалка, аб якіх напісаны кнігі, створаны кінафільм «Тарпеданосцы».

Усё пасляваеннае жыццё Івана Мікалаевіча звязана са спортам. Газета «Североморский летчик» 2 ліпеня 1946 г. пісала: «На параде североморских авиаторов-физкультурников в одной из первых колонн шагал лучший из наших спортсменов-легкоатлетов гвардии старшина т. Хорошук. Известный хорошими спортивными достижениями в прошлых сезонах, т. Хорошук и в этот день показал, что новое заполярное лето он встречает в отличной спортивной форме. Являясь участником многих состязаний, 30 июня гвардии старшина т. Хорошук занял первое место в ВВС по прыжкам в высоту (1 м 55 см), показал отличные результаты по прыжкам в длину, в шведской эстафете и других соревнованиях. Он спортсмен с отличной подготовкой...»

У 1946 г. І. М. Харашук вярнуўся ў Мазыр, працаваў інструктарам у абласным камітэце фізкультуры, з 1954 па 1978 г. быў старшынёй гарадскога камітэта фізкультуры і спорту. Ужо на пенсіі да 1993 г. працаваў дырэктарам стадыёна «Спартак». У 1972 г. І. М. Харашуку прысвоена званне «Заслужаны трэнер Беларусі».

Т. Піліпчук

Чэмпіён свету — з Мазыра

Дзеравянка Леанід Андрэевіч (н. 10.6.1949 г. у Мазыры) — спартсмен і трэнер па грэблі на байдарках і каноэ, заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны трэнер БССР. Скончыў Беларускі інстытут фізічнай культуры, з 1976 г. дзяржаўны трэнер зборнай каманды па грэблі на байдарках і каноэ. Чэмпіён свету на байдарцы-чацвёрцы на дыстанцыі 10 км, бронзавы прызёр чэмпіянату свету на байдарцы-адзіночцы ў эстафеце 4×500 м і чэмпіянату свету і Еўропы на байдарцы-чацвёрцы на дыстанцыях 1 км і 10 км.

Спартыўная слава

Мазыране паспяхова выступаюць у многіх відах спорту.

Выдатна паказалі сябе на розных

спаборніцтвах грабцы. Пяціразовым чэмпіёнам Рэспублікі Беларусь стаў студэнт педагагічнага інстытута Мікалай Хільман. Удзельнік Алімпійскіх гульняў у Барселоне Аляксандр Грамовіч — трохразовы чэмпіён рэспублікі. Пераможцамі рэспубліканскіх спаборніцтваў на розных дыстанцыях сталі грабцы Сяргей Яўменаў, Сяргей Казлоў і Надзея Пайграй.

Пасля чэмпіянату рэспублікі па грэблі прайшоў матч дзяржаў СНД, у якім прымалі ўдзел спартсмены Украіны, Узбекістана, Літвы, Латвіі і Беларусі. У гэтых спаборніцтвах пераможцам стаў на трох дыстанцыях М. Хільман, на дзвюх дыстанцыях першыя — А. Грамовіч і С. Яўменаў, С. Казлоў заняў другое месца. Чэмпіёнка Рэспублікі Беларусь Надзея Пайграй на першынстве свету па грэблі сярод юніёраў, які праходзіў у Чэхіі, заняла восьмае месца.

Міхась Руцкі ўдзельнічаў у Першай сусветнай велагонцы свету (выступалі спартсмены 35 дзяржаў) і заняў 15 месца. Ён прызнаны самым актыўным гоншчыкам. Міхась Руцкі стаў таксама пераможцам міжнародных спаборніцтваў у Польшчы, чэмпіёнам Рэспублікі Беларусь. З поспехам выступалі на міжнародных і рэспубліканскіх спаборніцтвах веласіпедысты Марыля Тарасава і Павел Здрок. Яўген Сянюшкін — пераможца па веласпорце на юнацкіх спаборніцтвах дзіцячай алімпіяды ў Галандыі, чэмпіёнамі і прызёрамі рэспубліканскіх спаборніцтваў сталі Віктар Здрок, Аляксандр Казлоў, Андрэй Кардаш, Міхаіл Руцкі.

Барцы Аляксандр Хацкевіч і Анатоль Вараны — пераможцы рэспубліканскіх маладзёжных гульняў.

У маі 1993 г. у Англіі праходзіў чэмпіянат свету па бадмінтоне. Член беларускай каманды мазыранін Алег Маразевіч быў прызнаны адным з лепшых.

Радуе прафесійны рост баксёраў. Пераможцамі маладзёжных гульняў Рэспублікі Беларусь, а таксама міжнародных турніраў сталі Аляксандр Палуянаў, Вячаслаў Астапенка, Фёдар Яшчанка.

Удзельніцай чэмпіянату свету па лёгкай атлетыцы і ўладальніцай кубка Еўропы сярод клубных камандаў стала Алена Бычкоўская. Срэбныя медалі ў чэмпіянаце Рэспублікі Беларусь па футболе заваявала каманда Мазырскага вытворчага камерцыйнага цэнтра.

Усяго ў Мазыры жывуць і працуюць звыш 50 майстроў спорту. Сярод іх — 5 майстроў міжнароднага класа, 8 заслужаных трэнераў.

А. Клімаўцаў

У родным краі ёсць крыніца...

Гісторыя і прырода Мазыршчыны таленавіта апісаны ў сучаснай беларускай літаратуры. Варта прыгадаць многія творы Я. Коласа, К. Крапівы, І. Мележа, Б. Сачанкі, Р. Сабаленкі, У. Караткевіча, В. Вольскага, М. Капыловіча, Л. Прокшы... Тут пачыналі свой шлях у вялікую літаратуру І. Навуменка, Д. Сергіевіч, У. Верамейчык, У. Краўчанка, І. Капыловіч, А. Бароўскі, — у аснове сюжэтаў многіх іхніх твораў пазнаецца рэальнае жыццё Мазыршчыны. Плённа працуе аб'яднанне мазырскіх літаратараў «Прыпяцкія хвалі», актыўна выступаюць у друку А. Малюк, Ю. Герасіменка, У. Рудзінскі, Г. Дашкевіч, В. Андрыеўскі і іншыя мясцовыя аўтары.

Цудоўнае апісанне Мазыра першых пасляваенных гадоў можна знайсці ў творах Івана Навуменкі, беларускага пісьменніка, які ў 1945—1951 гг. працаваў у абласной газеце «Бальшавік Палесся» і добра ведаў Мазыршчыну. У кнізе «Замяць жаўталісця» ён пісаў: «Гарадок заўсёды быў перанаселены. Але тады, у пасляваенны час, зусім па іншай прычыне. Яго зрабілі абласным цэнтрам, і вузкія вулачкі, прысадзістыя дамкі з цяжкасцю размяшчалі мноства абласных устаноў, арганізацый, якім трэба былі памяшканні, кабіне-

ты, транспарт. На цэнтральнай вуліцы, што паката спускалася да Прыпяці, шыльды віселі, бадай, на кожнай будыніне. Вясной, калі на схілах пагоркаў пачынаў раставаць снег, мутны паток імчаў па галоўнай магістралі, нібы па горнай цясніне, — міма дамкоў з шыльдамі, людзей з абшарпанымі партфелямі, якія снавалі ўзад-уперад па вузкай панелі, міма куцых, нібы абрубкі, таполяў з абрэзанымі вярхушкамі. Ледаход на Прыпяці ў трэскі разносіў часовы драўляны мост, якім гарадок звязваўся з астатнім светам, машыны, падарожнікі да самага лета, пакуль не наводзілі новы мост, перапраўляліся на процілеглы бераг на пароме і лодках».

Горад Мазыр не без падстаў называюць сталіцай беларускага Палесся, беларускай Швейцарыяй — за дзівоснае спалучэнне маляўнічых узгоркаў і гор сярод неабсяжных балот у марыве малочна-белых туманоў, лясістых раўнін і вады, якой тут значна больш, чым у іншых кутках Беларусі. Галоўная водная магістраль Палесся — рака Прыпяць, апетая многімі паэтамі і пісьменнікамі. Вось як апісвае яе ў ваколіцах Мазыра Віталь Вольскі: «Залатая восень уладарыць над Прыпяццю ва ўсёй сваёй непаўторнай красе. На адных гарах — дубы і клёны, на другіх — сосны. Ля падножжа гор з'явілася і хутка знікла сяло Барбароў, імя якога ўпамінаецца ў гістарычных дакументах. Тут, на беразе возера, знаходзіўся калісьці вялікі сярэдневяковы замак з высокімі вежамі, валам і ровам... Цячэ Прыпяць шырока, велічна. Дыхае глыбока, на поўныя грудзі. З такім жа эпічным, казачным спакоем цякла яна і ў часы далёкай старажытнасці, і ў гады нядаўніх цяжкіх выпрабаванняў. Так цячэ і ў нашы дні. Шырокія плёсы змяняюцца перакатамі, пясчанымі косамі і водмелямі.

...Прыпяць — самы вялікі прыток Дняпра, самая вялікая і самая суднаходная рака Беларусі. Калі толькі не глянеш на Прыпяць, заўсёды ўбачыш ці цеплаход, ці рудавоз, ці буксір, ці катэр, ці караван плытоў, ці проста маторную лодку... Цяпер, у кастрычніку, глыбіня Прыпяці каля Мазыра невялікая — у асноўным два метры, як сказалі мне воднікі на прыстані. Але вясною, у час паводкі, узровень вады ў рацэ паднімаецца на чатыры. Прыпяць залівае ўсю сваю бязмежную пойму. Тады шырыня Прыпяці дасягае дваццаці — трыццаці кіламетраў. Рака паглынае нізоўі прытокаў, а іх нямала — Піна, Ясельда, Бобрык, Уна, Смердзь, Лань, Случ, Пціч, Іпа і Брагінка з левага боку, Стыр, Гарынь, Ствіга, Убарць, Славечна — з правага. Далёкім мінулым вее ад гэтых старадаўніх, язычаскіх назваў і разам з прытокамі, разам з безліччу малых рэк, ручаёў, азёр і лужын Прыпяць месяцы на два ператварае сярэднюю частку палескай нізіны ў адно вялікае мора.

Славутая рака спрадвеку мела вялікае значэнне ў эканамічным жыцці не толькі Палесся, але і ўсёй нашай краіны. У старажытныя часы сплаўлялі па Прыпяці ў Кіеў плыты з карабельным і будаўнічым лесам, везлі на невялікіх суднах смалу і дзёгаць. У Мазыр прывозілі з Кіева соль і розныя тавары, патрэбныя для насельніцтва Палесся. Прыпяць была адзіным надзейным шляхам, які звязваў Мазыр, Тураў, Пінск і іншыя палескія гарады з поўднем.

Левы бераг вельмі нізкі, плоскі і роўны да самага далягляду. Белыя палосы і плямы пяску, часам вельмі шырокія, відаць здалёку. Яны кантрастна бялеюць на фоне сіняй вады, сіняга неба і зялёных зараснікаў лазы. І над усім гэтым прасторам пануе вялікі, непарушны, бязмежны спакой далёкіх летапісных часоў... Гляджу на шырокія пясчаныя пляжы, што бясконца бялеюць уздоўж берага, і пачынаю разумець, чаму людзі і назвалі гэтую раку Прыпяццю, ці Прыпеццю, як пісалі ў старажытныя часы. У гэтай назве адчуваецца сувязь са словам «прыпеч», якое паходзіць ад дзеяслова «прыпякаць»,

«прыпячы». Так яшчэ і ў нашы дні называюць па Палессі нізкі пясчаны бераг без расліннасці, з усіх бакоў адкрыты сонцу. Тое, што цяпер называем — «пляж». Мабыць, ад слова «прыпеч» атрымала назву вялікая палеская рака...»

З кнігі «Беларускі савецкі нарыс»: «Адзінаццаты дзень падарожжа застаў нас у цудоўным узгоркавым горадзе Мазыры, адным з буйнейшых гарадоў беларускага Палесся. Горад з нечаканасцю вуліц... Дамы-рамантыкі ўзбіраліся на высокія, у дваццаць метраў, грэбні зялёных хваль. І нібы злякнуўшыся такой вышыні, здзіўлена глядзяць на сваіх трохпавярховых суседзяў, як ім там, унізе... Паглядзіш — і галаву міжвольна адкідаеш назад. Прытрымай шапку, падарожнік!

Пагоркі, некалі сабраўшыся ў цэнтр горада, нібы на веча, так і асталіся стаяць. Мазыр — горад сівой даўніны. Ён, які плавіў руду, лавіў рыбу, варыў у смольнях дзёгаць, не памятае, калі нарадзіўся. Як і многія былыя гарапашнікі, што тут жылі. За працай не было яму калі спраўляць дні свайго нараджэння. Адзіная міжвольная метрыка — Іпацьеўскі летапіс — пад 1155 год успамінае, што «тады Георгій прывёў Ізяслава ў Корчаск, а Святаслава Ольгавіча ў Мазыр і, тут уладкаваўшы яго, пайшоў у свой Кіеў».

Здаецца, гісторыя на Мазыршчыне больш, чым у іншых палескіх мясцінах, пакінула сваіх слядоў. Ад тых стаянак першабытнага чалавека ў Жахавічах, Салаўёўцы, Акулінцы да гэтых яшчэ свежых курганоў, насыпаных апошняй вайной, — трыццаці брацкіх магіл...»

В. Шур

Мазыру, Прыпяці прысвечаны многія творы беларускіх пісьменнікаў, чыя жыццёвая або працоўная біяграфія звязана з гэтым палескім краем.

Натхняе родны кут...

Бароўскі Анатоль Мікалаевіч (н. 12.5.1942 г. у вёсцы Крушнікі Мазырскага р-на) — беларускі пісьменнік.

Пасля заканчэння Асавецкай сярэдняй школы (1960) працаваў у калгасе, потым на заводзе жалезабетонных вырабаў у Мазыры, настаўнікам пачатковых класаў у вёсцы Турбінка.

У 1961—1967 гг. — студэнт Мазырскага педагагічнага інстытута.

Працаваў у мазырскай раённай газеце, у гарадской арганізацыі таварыства «Веды», інструктарам райкама і гаркама партыі, намеснікам дырэктара вучылішча геалогіі.

З 1975 па 1991 г. працаваў уласным карэспандэнтам газеты «Чырвоная змена» па Гомельскай і Брэсцкай абласцях.

Друкуецца з 1963 г. Аўтар кніг аповесцяў і апавяданняў «Каліна пад акном», «Азірніся ў каханні», аповесці «Тросніца» і іншых.

У аповесці «Азірніся ў каханні» шмат старонак прысвечана старажытнаму гораду над Прыпяццю — Мазыру.

Дзень ужо ўбіраўся ў сілу.

Пушкарчук на мокрых прыступках спусціўся ў падвал разбуранага дома. З сабой прыхапіў ліхтарык. Ведаў, што там цемнавата — пазаўчора так і не дабраўся да таго месца, як мерыўся. Злаваў, што нават і сярнічак не прыхапіў з сабою — не курыў.

Ён не хацеў, каб хто быў сведкам яго пошукаў. Таму нейкі час, перад тым як спусціцца ў сутарэнне, аглядваўся.

З-пад апошняй прыступкі ён дастаў малаток і кірку — імі зручней было выбіваць тую цэглу, якую намеціў.

Дом будавалі задоўга да рэвалюцыі. Праёміна была закладзена цэглай знакамітага завода братоў Карповічаў. На тыльным баку цагліны і ініцыялы стаялі «брК». У народным музеі, які ён марыў адкрыць, былі розныя маркі, а вось такой не было. І ён радаваўся, як малое, што набудзе новую рэч.

Нейкі будаўнік кладку рабіў сумленна, — нельга было і падступіцца: ні ломам, ні кіркай не ўгрызешся. Таму першыя цагліны проста выбіў, вытрушчыў, каб можна было асцярожна падступіцца да наступных. Яны паддаліся лёгка — нават і драпінкі на іх не было. Цаглін назбіралася з дзесятак.

За дзіркай было пуста. Цікавасць узяла — а што там, за сцяной? Некалькі ўдараў кіркай — і можна было ўжо прасунуцца ў праёміну.

Перад тым як ступіць туды, у невядомасць, прыслухаўся: было ціха. Толькі даносілася слабае гудзенне машын, што праносіліся па бліжэйшай дарозе.

Адразу ў нос ударыў пах гнілі і сырасці. Святло ліхтарыка выхапіла з цемры шэрыя абрысы наступнай сцяны, ужо каменнай, паросłай слізкім шэрым мохам. Са сцяны вываліліся асобныя камяні і звузілі праход — не ўціснуцца. Прыйшлося трошкі папрацаваць, каб прабіць сабе дарогу шырэй.

Ногі ступілі на слізкую каменную падлогу.

Скляпенне было доўгае, метраў з дзесяць. Столь выгнулася дугой. Ушыркі памяшканне было крокаў з пяць-шэсць, не болей. І ніякіх дзвярэй. Ні ўвахода, ні выхаду. Ніякай шчылінкі святла — як пастка.

Што тут было, у гэтым мураваным гроце? Чый ён, каму належаў? Для каго быў зроблены? Напаткала расчараванне — нічога добрага для сябе не адшукаў. Хацелася толькі абмацаць кожны камень, дакрануцца рукой.

Пра сутарэнні Пушкарчук ніколі не чуў. Год назад ён праглядваў у музеі матэрыялы пра горад. Прачытаў, што некалі, пяцьсот гадоў назад, на гары стаяў каралеўскі замак. Яго два ці тры разы перабудоўвалі, але ў час вялікіх паўстанняў і пажараў ён быў знішчаны і ніколі не аднаўляўся...

Малюнкаў ці якіх накідаў гісторыя не пакінула. І таму ніхто не ведаў, як ён выглядаў.

Памяць выхапіла з летапісу некалькі радкоў: «...таго ж року 1506 зноўку зкупіўшыся татар 30(л) тысяч уторгнулі ў літоўскую зямлю, бурачы, палячы і пляндруючы, якія, прыцягнуўшы да Клецка каля замка сталі кошам. Загоны распусцілі, а Літва яка будучы ад паганых зубажоны толькі ся ледзьве 10 тысяч сабраўшы, ударылі па кошу. З помачы божай якіх паграмілі із лукамі прыходзячых да коша білі, мардавалі і ўсіх нагалаву разграмілі. А гетманам над Літвою быў князь Міхайла Глінскі».

Праз два гады горад быў захоплены князем, які перайшоў служыць да Вялікага князя Маскоўскага Васіля Іаанавіча. Але потым чамусьці нечакана быў вернуты да Сігізмунда І.

А праз трынаццаць гадоў горад быў спалены татарамі...

Ці не да тых часоў належаць гэтыя скляпенні?

Пушкарчук раптоўна для сябе адкрыў выснову: тут, у скляпенні, і думалася інакш, чым там, на святле. Да драбніц успаміналася гісторыя — і тады чуўся лязгат коп'яў і дзідаў аб шлемы, свіст вострых стрэлаў.

Вялікі пажар у горадзе прымусіў прызначыць спецыяльны збор. І ўжо на пачатку 1613 года ўмацаванні горада былі адноўлены, пры гэтым горад быў абнесены высокім валам з сямю вежамі і фортамі...

Замак адыгрываў тады вялікую ролю ў жыцці палешукоў. На яго тэрыторыі знаходзіліся цэрквы і касцёлы. Гісторыкі і летапісцы сцвярджалі, што ўмацаванні і падземныя схроны існавалі яшчэ дзесяць — дваццаць стагоддзяў назад...

Замак, ці гарадзішча старажытнага горада, знаходзіўся ў яго цэнтры — на Спаскай, а пазней Замкавай гары. Месца палешукі-дрыгавічы выбралі ўдала — ведалі ў гэтым толк. Над рэчкай, з абодвух бакоў абмежаванай глыбокімі і шырокімі канавамі. Праз іх ворагу нельга было прабрацца. Што ўяўляў тады каралеўскі замак? Першы ўспамін пра яго адносіцца да 1519 года, калі Вялікі князь Сігізмунд аддаў «у заставу замак папу Альбрэхту Марцімавічу Гаштальду... за 1500 коп грошай».

Пушкарчук тады не ўтрымаўся, перапісаў у свой сшытак скупыя паведамленні гісторыка, каб самому ведаць і памятаць даты таго часу. Тады яны зацікавілі не вельмі, а вось цяпер гісторыя набывала нейкую рэальную значнасць.

Першы вядомы інвентар адносіцца да 1552 года. Аб тым часе гаворыць «Калодзеж» — такі летапіс. «У замку... 30 сажняў углыб, і месцэ зруйнавана... а рабіў яго нейкі Міхаіл Гашын, староста і гараднічы Прыпяцкі... а як збудавалі — стаіць 70 гадоў».

Было вядома яшчэ, што замак быў з трох вежаў з гароднямі і некалькімі дамамі паміж імі, якія выконвалі ролю сцен.

«Вежа воротная старая... Па правы бок той вежы дзве городні старых, за імі — 4 новых зроблены ў тры сцяны... За імі — дом цёсаны, ні печаў, ні каміноў, ні лаў... За тым домам — вежа на вуглу замка, у чатыры сцяны, у сем гмахаў... Па другі бок той вежы — дом другі тым жа чынам зроблены, не скончаны... ад таго дома да трэцяе вежы городзен новых дзесяць... Вежа на вуглу ад паркана. Адна гарадня новая і восем старых. У замку: царква святога Спаса на падрубе, святліца і камора для гараднічага. Яшчэ камора, два свірны і жытнік. Хата чорная і піўніц дзве...» Ведаў Пушкарчук, што была яшчэ царква святога Міколы.

Рукі абмацвалі кожны камень сцяны. Было жаданне дакрануцца да гісторыі, адчуць яе дыханне.

«Таемнасцю вабіць жыццё...»

Басуматрава Святлана Міхайлаўна (н. 22.11.1946 г. у Мазыры) — беларуская паэтэса. Друкуецца з 1966 г., аўтар зборніка «Белая Бярэзіна», «Далеч-далячынь» і іншых паэтычных кніг. Лірычныя героі яе кніг, нягледзячы на жыццёвыя цяжкасці, няўдачы і памылкі, знаходзяць у сабе сілы для таго, каб паверыць у чалавечую дабрыню, вышэйшую справядлівасць, бессмяротнасць чалавецтва.

МАЛАДОСЦЬ, ЗАТРЫМАЙСЯ

Па мазырскай
Абветранай вуліцы
Я спяшаюся
Лёгкай хадой.
...Зноў аб'явяць
Даверлівай публіцы
Паэтэсай мяне
Маладой.

Што ж, няхай,
Выглядаць маладзейшымі —
Натуральная
Мэта жанок.
Маладосць жа пацвердзіцца
Вершамі:
Я знайду
Адпаведны радок.

Ў год,
Калі былі травы няскошаны
Ля пакутнай
Палескай ракі,
Прыляцеўшы
Нязвана-няпрошана,
Адляцелі
Мае саракі.

Мо ў хвіліны апошнія,
Цяжкія,
Як на горкую стану
Мяжу,
Прыйдуць словы
Скупыя і важкія,
Як астатнія кроплі
Дажджу.

А пакуль
У душы маёй весніцца
І таемнасцю
Вабіць жыццё,
Шчодра словы ў радку маім
Цесняцца,
Кружыць іх, быццам вір,
Пачуццё.

Незнаёмы
З нудою і стомаю,
Пеніць май
У садах сырадой...
Будзем жывы,
Шчэ траплю ў вядомыя.
Мне пабыць бы даўжэй
Маладой!

Улюбёны ў Прыпяць

Верамейчык Уладзімір Міхайлавіч (н. 1.11.1937 г.) — беларускі паэт. Вучыўся ў Мазырскім педагагічным вучылішчы, з 1955 г. на педагагічнай рабоце, быў настаўнікам Міхалкаўскай школы. Друкуецца з 1955 г., выдаў зборнікі вершаў «Прыпяць», «Яснасць», «Люблю», «Клянуся Прыпяцю». Многія творы паэта прысвечаны Мазыру і яго людзям. Уладзімір Верамейчык — часты госць у рабочых калектывах і навучальных установах Мазыра.

Асабліва шчыра ён любіць прыгажуню Прыпяць, Мазыр, які прывольна раскінуўся на ўзгорках...

МАЗЫР

Ля Прыпяці дужай спыніўся,
Пад шум прыбярэжнай лазы
Да самай вады нахіліўся
Мой сонечны горад Мазыр.

Садоў панадпрыпяцкіх квецень
Шугае у вокны дамоў,
Вызвоньваюць пчолы над веццем
Адвечную песню без слоў.

Мне сорам і кветку адную
Сарваць на красе гарадской,
Здаецца, дакоры пачую
Ад вуліц, абходжаных мной.

Мой горад, цябе я пакінуў,
Каб тут, на граніцы, без сну,
Шынелем сваім штохвілінна
Прыкрыць твой спакой і вясну.

Мой горад, вярнуся я ўлетку
З далёкіх краёў, дзе служыў.
І веру: з садоў тваіх кветку
Сумленна я тут заслужыў.

МАЗЫРСКІ КІРМАШ

Пахне сырадоем і цыбуляю,
Агуркамі з роснае грады.
Ліпай і калодкавымі вуллямі
Пахнуць наздраватыя мяды.
На бязмене з гіраю-цаглінаю
Важыць сала хітраваты дзед.
Сонна водзяць выгнутымі спінамі
Шчупакі ў калодзежнай вадзе.
Тут патэльні з жоўтаю яечняю,
Дудкі, капялюх на галаву.
У кашах лазовых рэжуць клешнямі
Ракі вірлавокую траву.
Вось каробак з маладымі вішнямі —
Слаўная лубовая сям'я.
Падміргне гандлярачка увішная —
І за банку плоціш утрая.
Дзед з Міхалак словамі таропкімі
Прапануе яблыкі з кулак.
А пахваліш жытнікі салодкія,
То насыпле яблыкаў і так,
Тут люблю хадзіць, глядзець гадзінамі,
Слухаць гоман роднае зямлі.
І такое ўчую тут часінамі,
Што нідзе не купіш за рублі.

Час сплочваць даўгі

Капыловіч Іван Іванавіч (н. 2.2. 1944 г. у в. Забалацце Мазырскага р-на) — беларускі пісьменнік. Маці — настаўніца ў роднай вёсцы, бацька ваяваў — спачатку ў адным з партызанскіх атрадаў Палесся, а пасля вызвалення быў мабілізаваны ў Савецкую Армію і загінуў на фронце.

Сярэднюю школу Іван Капыловіч адольваў у суседняй вёсцы Рамязы, скончыў яе з залатым медалём і паступіў на аддзяленне журналістыкі БДУ імя Леніна. Пасля універсітэта быў накіраваны на работу карэспандэнтам у газету «Чырвоная змена». У час адной камандзіроўкі на Палессе трапіў у аўтакатастрофу, на ўсё жыццё застаўся інвалідам першай групы.

Але маладосць, прага да жыцця, да творчасці дапамаглі Івану Капыловічу вярнуцца ў строй, ён стаў пісьменнікам. У кнігарнях рэспублікі адна за адной пачалі з'яўляцца яго кнігі: «Сонца садзіцца ў травы», «Бяроза на мяжы», «Асенні гром», «Сны не вяртаюцца», «Імянны гадзіннік», «Пасынак».

На Мазыршчыне бязлітасна смаліла сонца. Травы, бульбоўнік, палеткі кукурузы, буракоў павыгаралі да таго, што здавалася, яшчэ дзень-два гэтакай засухі — і ўсё загіне. На душы Міхаіла Саўчыка, старшыні калгаса «Радзіма» не надта радасна: а калі і сапраўды не будзе дажджу ні заўтра, ні паслязаўтра?

Стаяла сярэдзіна ліпеня. Распачалася ўборка: спалавелі, наліліся цяжкім коласам жыта, ячмень, пшаніца. Аб'язджаючы палі, Саўчык прыкідваў, колькі возьмуць ячменю, пшаніцы, ці не давядзецца наступнай вясною бедаваць ад бяскорміцы.

Пяць мірных дзесяцігоддзяў

Неўпрыкмет наблізіліся да шашы Мазыр — Лельчыцы, па абодва бакі якой — палі і выпасы калгаса «Радзіма». Пасля доўгага маўчання Саўчык прагаварыў:

— У мінулыя гады такая сухмень здаралася, але дужа рэдка. Цяпер жа — як правіла. Чаму? Меліяратарам трэба сказаць дзякуй...

Дарма спяшаліся палешукі прымаць у абдымкі меліяратараў. Бо тое, што сталася з Чэртнем ды і не толькі з ім, інакш як варварствам назвать нельга. Рэчышча Чэртня выпрамілі, зрабілі роўненькім, і адразу ж ён змялеў, стаў вераб'ю па калена, а ўлетку і зусім перасыхае, так што і вераб'ю няма дзе напіцца.

Добра памятаю, як яшчэ хлапчуком разам з маці па нейкай патрэбе на рэйсавым аўтобусе ехалі ў Мазыр. На Палессе прыйшоў красавік, і драўляны масток праз Чэрцень затапіла-заліло вадой, змыла насціл. Шафёр прытармазіў, выбраўся з кабіны, зняў з галавы шапку-шасцікліпку, пашкроб патыліцу: «Ёры-моры, не перабрацца праз етую прорву, патонем».

І тут нехта з пасажыраў заўважыў на старой алешыне, што стаяла на беразе рэчкі, глушца. Ён быў вялікі, прыгожы, з пышным хвастом і чорненькім грэбнем і нікога не баяўся — сядзеў на верхавіне і быццам пазіраў на тое, што рабілася каля мастка...

Цяпер праз Чэрцень пабудавалі новы мост — надзейны і трывалы — жалезабетонны, не раўня колішняму, драўлянаму. Заўсёды, калі я бываю на Палессі, то спыняюся на гэтым месце. Кожнага разу ў такія хвіліны мяне агортвае сум ад навакольнай здзічэлай цішыні: Чэрцень амаль высах, на месцы колішняга лазовага кустоўя жаўтапесак, як у пустыні. А мне ўсё мроіцца альха з глушцом на верхавіне, хмары дзікіх качак, што праляталі нізка-нізка над балотам, кнігаўка, што кружыла недзе ў высі і абуджала наваколле сваім «кігікігі»... На месцы зялёнага аазіса — пустка.

Саўчык выказвае думку, што сухмень, якая апошнімі гадамі здараецца на Палессі даволі часта, няйнакш з-за таго, што асушылі вялікія і малыя балоты, бо яны ж акумуліравалі ваду, стваралі мікраклімат. Дый лес. Хіба не дасталося яму?

Калі ён згадаў пра лес, то ў маіх вачах паўстала родная вёска. Колісь вакол яе стаялі-шумелі бары, гаі, дубровы. У які бок ні пойдзеш — усюды лес, лес... А сёння? Як ставіліся да навакольнага багацця кіраўнікі? Старшыні калгасаў да самага апошняга былі не з мясцовых, прыезджыя. А ў іх адно наўме: выслужыцца перад вышэйшым начальствам. Дзеля гэтага трэба былі добрыя паказчыкі, і кожны старшыня імкнуўся са скуры вылузацца, праўдамі і няпраўдамі лез у перадавікі... У калгаснай касе не хапала грошай. Не бяда, затое быў лес. Апошні старшыня не выключэнне. Быццам ён і вывеў з адстаючых калгас у маёй роднай вёсцы, але няма ў мяне павагі да яго. За гады старшынёўства ён павыцярэбліваў многія дзіўныя куточкі, дзе раслі бук, граб, таўшчэзныя кляны...

А чарнобыльская бяда? Хіба яна не дакацілася да палёў і лугоў «Радзімы»? Адразу ж пасля пажару на чацвёртым блоку Чарнобыльскай АЭС мясцовае кіраўніцтва пераконвала ўсіх, што на Мазыршчыне ўсё добра, ніякай лішняй радыяцыі і ў паміне няма. Нехта ў пацвярджэнне такой думкі нават пусціў чутку, што Мазыр быццам стаіць на ружы вятроў і таму ўсе нягоды, звязаныя з Чарнобылем, абышлі «сталіцу» Палесся і яе навакольныя лугі, палі, лясы. Людзі верылі, ім хацелася верыць у такі цуд, ім не хацелася пакідаць абжытыя іх дзядамі і прадзедамі мясціны. Але ж... Напрамую да Чарнобыльскай АЭС ад Мазыра ўсяго восемдзесят кіламетраў, і тыя, хто хоць трохі разумеў, што гэта за штуковіна атам, дужа сумняваліся, пачалі звязваць вузлы і лавіць у газетах аб'явы, дзе патрэбна рабочая сіла. Такіх лічылі панікёрамі, але іх станавілася ўсё больш і больш. Асабліва сталі пакідаць Мазыр пасля таго, як у некаторых калгасах і саўгасах у сцельных кароў пачалі з'яўляцца выродкі-цяляты: з галавой большай за тулава, з нейкімі двайнымі шыямі, без вачэй... Тыя, хто гэта ўбачыў сваімі вачыма, кінулі добраўпарадкаваную кватэру, у чарзе на атрыманне якой стаялі не адзін год, і папёрліся куды вочы глядзяць...

З кнігі «Зона бяды», 1990

За ціхай цёплай рэчкай

Прокша Леанід Януаравіч (н. у 1912 г.) — беларускі і рускі пісьменнік. У 1955 г. скончыў ваенна-палітычную акадэмію. У 30-я гады працаваў настаўнікам на Мазыршчыне (в. Кустаўніца), з 1937 г. — у рэдакцыях газет і часопісаў. Друкуецца з 1937 г. Аўтар зборнікаў памфлетаў «Інтрыгі прэзідэнцкага двара», «Візітная картка народа», гумарыстычных апавяданняў «Не ў тым поездзе».

Памёр у снежні 1994 г.

У дакументальнай аповесці «За Добрыцай-рэчкай» Л. Прокша на дакумен-

тальнай аснове паказвае будаўніцтва гіганта на Палессі — Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода.

...Ёсць на Палессі невялікая рэчка Добрыца. Выцякае яна з крыніц за вёскай Кустаўніца. На другім канцы вёскі крынічная вада Добрыцы ўпадае ў большую рэчку — Нараўлянку, а тая недзе пад Нароўляй — у Прыпяць. Далей, у шырокай рацэ, плыве добрыцкая вада ў слаўны Днепр і праз усю братнюю Украіну, стольны горад Кіеў — у Чорнае мора.

Больш паўтысячы гадоў таму назад пасяліліся ў гэтым глухім кутку Палесся тры браты: Міцька, Санька і Косця. З гадамі вокал іх сяліб выраслі вёскі: Міцькі, Санюкі і Кустаўніца. Вякамі цішыню над Добрыцай парушалі стук молата ў кузні, сякеры на зрубе, цапоў на таках, скрып непадмазаных колаў, клёкат буслоў, дуда пастуха на досвітку, а ў святочныя дні гукі бубна, скрыпкі і цымбалаў.

У пачатку дваццатага стагоддзя ў гэтыя прывычныя гукі раптам уварваўся рэзкі гук матора. Карэта, у якой сядзеў пан Горват, рухалася па дарозе без каня... Старыя людзі, якім давялося бачыць такое дзіва, з усмешкай успамінаюць цяпер той аўтамабіль. Прайшоў час, і стала не навіной бачыць кустаўняка на сваім аўтамабілі.

За Добрыцай пачыналася дарога на Міхалкі, адтуль шлях з прысадамі бяроз паўз вёскі Бібікі, Тварычаўку, Раеўскія, Матрункі, Бабраняты, Бабры вёў у Мазыр, горад, вядомы з дванаццатага стагоддзя. Да рэвалюцыі 1917 года выходзілі на гэты шлях усе, каму цесна і голадна было ў роднай хаце. За вёскамі бедалагі азіраліся на саламяныя стрэхі і вандравалі ў свет, як крынічная вада з Добрыцы, і губляліся ў людскім моры. А потым прыходзілі пісьмы: «Гарую глыбока пад зямлёю», «Узялі мяне ў служанкі»... і рэдка — «вучуся...».

Але самыя вялікія падзеі за ўсё існаванне Кустаўніцы пачаліся з канца шасцідзесятых гадоў. За Добрыцай разгарнулася будаўніцтва завода-гіганта. Палескую глуш парушыў гул бульдозераў, скрэпераў, самазвалаў. Пра вялікую будоўлю загаварылі па радыё, тэлебачанні, у газетах. І стала вядома ўсёй краіне назва вялікай палескай вёскі, у якой давялося і мне некалі жыць і працаваць...

Бабры.

— Бабры? — За драўлянымі хацінамі віднеліся дамы і краны над імі. — Дык гэта мы ўжо за Мазыр выехалі?

— Яшчэ не. Цяпер Бабры — горад. У гэтых дамах будуць жыць нафтавікі. А той вялікі гмах — вучылішча геолагаў.

Выскачылі на шырокую асфальтавую дарогу. Па ёй амаль упрытык рухаліся нагружаныя пяском, гравіем, жалезам, бетонам магутныя самазвалы, трактары з прычэпамі.

— Гэта дарога на Міхалкі? — не перастаю пытацца.

— На Міхалкі. Там жа вузел нафтаправода «Дружба», і там пачынаюцца тры яго лініі: адна ў Венгрыю, другая — у Чэхаславакію, трэцяя — у Польшчу і Германію. А непадалёку, у раёне Рэчыцы і Ельска, ідзе здабыча беларускай нафты. Таму і выбралі гэта месца над Прыпяццю пад будаўніцтва завода.

— А тут, — Леанід Уладзіміравіч ківае ў бок шырокага поля, — ля вёскі Раеўскія, знайшлі багатыя залежы спажыўнай солі.

Вякамі палешуку не ставала солі. Па гэтай жа дарозе ў ваенныя гады мужыкі ехалі ў горад, каб выменяць соль на сала, муку, бульбу. А яна ляжала побач, у зямлі...

У пачатку трыццатых гадоў я не раз тупаў па гэтай дарозе. Абапал яе шумелі разгалістыя старыя бярозы. Пасярод так званага кацярынінскага шляху, у сыпучым пяску, ішла каляя, пракладзеная калёсамі. Ідзеш, бывала, стомішся, прысядзеш адпачыць пад бярозай і сумна ўглядваешся, ці не пакажацца якая фурманка. А цяпер вунь гудуць, равуць машыны, аж зямля дрыжыць. Не думаў я, ды і не мог думаць, што такое будзе тут, на Мазырскім Палессі. Сам на ўроку гаварыў вучням, стоячы ля карты (зрэшты, тое, чаму нас вучылі): «Бедны наш край. Няма ў нас ні нафты, ні каменнага вугалю, ні жалезнай руды, ні солі». Аказваецца, ёсць! У нас, на Беларусі, нафта! Гэтая звестка ўсхвалявала і гарапашных старых эмігрантаў, якія да рэвалюцыі з беднай Беларусі выехалі шукаць хлеба за акіян...

У сны прыходзіць Радзіма

Федарэнка Андрэй Міхайлавіч (н. 17.1.1964 г. у в. Бярозаўка Мазырскага р-на) — беларускі пісьменнік. Вучыўся ў Мазырскім палітэхнікуме, працаваў мулярам. Дэбютаваў у 1987 г. у часопісе «Маладосць» апавяданнямі «Сачыненне» і «Пісьмо». У 1990 г. скончыў Мінскі інстытут культуры. Працуе загадчыкам аддзела ў часопісе «Полымя». Друкаваўся ў калектыўных зборніках «Жнівеньскі праспект», «Перад маімі вачыма», «Гісторыя хваробы».

Член саюза пісьменнікаў Беларусі.

У 1991 г. за апавяданне «Пеля» атрымаў першую прэмію на Усесаюзным літаратурным конкурсе «Молодые дарования». Лаўрэат прэміі тыднёвіка «Літаратура і мастацтва» за апавяданне «Бляха» (1992) і літаратурнай прэміі імя Івана Мележа за кнігу прозы «Смута» (1995).

У творах Андрэя Федарэнкі, насычаных складанай сацыяльнай праблематыкай, багата прадстаўлены наш палескі пейзаж, пра што сведчыць і ўрывак з ягонага апавядання «Пеля».

Стаяла ноч.

Час ад часу я ўсхопліваўся, хапаў палку, кідаўся то ў адзін бок, то ў другі. Палка лезла ў прорву. Твар распух ад камароў; ад іхняга звону, ад густога балотнага паху, ад укусаў п'явак і ад нерваў у мяне кружылася галава. Чужым, сіпатым голасам я пачаў гаварыць да балота:

— Ты хочаш, каб я тут здох... Але я выжыву, мне проста смешна!.. Я ж усё роўна за гэтую ноч не змянюся, ніяк яна на мне не адаб'ецца... Ты папсуеш матцы здароўя за гэтую ноч, паламаеш мне лета — вось і ўсё, самае большае... Нават і лета не паламаеш — я знайду занятак, хоць платы параблю! І я плюю на цябе, смарод, гадзючнік,— мала вас паасушалі!.. У мяне яшчэ ўсё наперадзе, я ўбачу новыя гарады, новае жыццё,— я буду жыць, а ты — смярдзець тут, зарастаць, пакуль не высахнеш к чорту!..

У адказ мне толькі звінела, чмокала, булькала, і калыхаўся такі густы туман, што яго відаць было нават у цемры.

Раніца надышла надзіва хутка. Ужо ў сярэдзіне ночы без сонца пачало святлець, паменела камароў, зашчабятала птушка. Я змог разглядзець ваду, свае ногі, кусты. Пасярод пелі плавала вудка, ад якой разбіваліся дробныя хвалі — карась тармасіў... Здранцвелымі нагамі, паўз саменькую ваду, каля ямкі, якая ўчора ледзь не стала маёй магілаю, я выбраўся на свой учарашні след і хутка быў ужо на сухім беразе. На пелю мне не хацелася нават азірацца...

Цяпер, праз пэўны час, ужо не сорамна ўспамінаць, як каля самай сваёй хаты ўмудрыўся заблудзіцца і ледзь ацалеў. Але і не смешна. Пажыў я за гэтыя гады «новым жыццём», пабачыў новыя гарады, нават у Крым з'ездзіў. А згадваюцца чамусьці не інтэрнатаўскія пракураныя скразнякі, не аднастайныя, на ноч, бязрадасныя п'янкі, не блуканні па чужых кватэрах, калі баішся прызнавацца гаспадарам, якія баяцца радыяцыі, што родам — з Гомельскай вобласці... Пеля згадваецца.

Можна сказаць — ну і што, дужа нам цікавая твая настальгія па нейкіх балотах.

А я скажу: тым летам атрад наш быў расфарміраваны, бо на другі дзень па прыездзе, у Крыму, аўтобус, які вёз студэнтаў на вінаградник, урэзаўся ў скалу. Адзін чалавек загінуў і два асталіся калекамі. Мог я сярод іх апынуцца? І калі гэта выпадковасць, дык што ж тады — наканаванне?

Радзіма мая — вёска, балота... Няўжо і цяпер я яшчэ нешта значу для цябе, няўжо і цяпер ты абараняеш мяне ад нечага? Нашто ж ты ўсё часцей і часцей прыходзіш у думкі, ва ўспаміны, у сны, і так упарта, кожнай травінкаю з пасохлых пеляў — не адпускаеш?..

Героі і ахвяры

І ў мірны час здалёку і зблізку прыходзіла ў нашы хаты вялікае гора. Тут, на Палессі, не рваліся бомбы і снарады, не стракаталі аўтаматы і кулямёты, але недзе, за многія тысячы кіламетраў...

Па рашэнні ЦК КПСС і Савецкага ўрада ў канцы 1979 г. на тэрыторыю Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан былі ўведзены савецкія войскі. Гісторыя дасць канчатковую ацэнку афганскай вайне, але, якою б ні была гэтая ацэнка, ніколі не забудуцца гераічныя подзвігі нашых воінаў у далёкай краіне. Учарашнія вучні, студэнты, рабочыя і калгаснікі цаною ўласнага жыцця ратавалі сваіх сяброў, верныя салдацкай клятве, праяўлялі непахісную сілу волі і духу. Не ўсе вярнуліся з той вайны. Васьмярых сваіх юнакоў не дачакалася і Мазыршчына.

Звыш 200 воінаў-афганцаў жыве цяпер у горадзе і раёне. Большасць з іх добрасумленныя працаўнікі, паважаныя людзі. Яны памятаюць сваю баявую маладосць, не забываюць загінуўшых сяброў.

Не забудзе Мазыршчына і тых, хто ў розныя пасляваенныя гады загінуў пры выкананні службовых абавязкаў у радах Савецкай Арміі і Ваенна-марскога флоту. Помнім мы і адважных мі-

ліцыянераў, што ахвяравалі сабою ў смяротных схватках са злачынцамі. І ніколі не забудзем чарнобыльскіх ліквідатараў, якія не шкадавалі свайго жыцця, каб утаймаваць мірны атам.

Не вярнуліся з Афганістана

Белашыцкі Васіль Мікалаевіч (н. 4.10.1962 г. у в. Шугалеі Лельчыцкага р-на). У 1978 г. скончыў васьмігадовую школу, вучыўся ў прафесійна-тэхнічным вучылішчы. У лістападзе 1983 г. прызваны ў Савецкую Армію. Малодшы сяржант В. М. Белашыцкі загінуў 16.10.1984 г. пры выкананні службовага абавязку. Пахаваны на могілках у Мазыры. Узнагароджаны пасмяротна ордэнам Чырвонай Зоркі.

З пісьмаў В. М. Белашыцкага родным

5 чэрвеня 1984 г.

...Много ездим, воюем. У нас, короче, все как на войне, вот только «немцы» другие, да воевать с ними труднее: в горах с ними очень тяжело воевать.

У нас очень много здесь овощей и фруктов: дыни, арбузы, помидоры, абрикосы и всякая всячина.

3 кастрычніка 1984 г.

...Трудно очень писать, но что делать. Телеграмму вашу получил. Командир сразу же подписал приказ на отпуск, но высшее начальство не отпускает. Так как телеграмма не была заверена в райвоенкомате и райбольнице... Мама, крепитесь и не убивайтесь... Горе всегда тяжелое, смотрите себя. Ведь вам еще ждать своего сына из Афганистана. У меня все хорошо. Потихоньку воюем. Завтра недели на две уходим на операцию.

Ліст напісаны пасля атрымання весткі пра смерць бацькі М. К. Белашыцкага.

Бобр Уладзімір Аркадзьевіч (н. 14.3.1949 г. у в. Бабры). Скончыў Мазырскае медыцынскае вучылішча і працаваў фельчарам Мялешкавіцкай участковай бальніцы. У 1968 г. прызваны ў Савецкую Армію, застаўся на звыштэрміновую службу. Восенню 1982 г. добраахвотнікам пайшоў служыць у Афганістан санінструктарам. 22.4.1984 г. прапаршчык У. А. Бобр быў цяжка паранены ў час нападу душманаў.

В. М. Белашыцкі



У. А. Бобр

Памёр у Ташкенце 28.4.1984 г. Пахаваны ў в. Бабры. Узнагароджаны медалямі «За службу Радзіме», «60 год Узброеных сіл СССР».

Вяракса Уладзіслаў Антонавіч (н. 29.12.1967 г. у Мазыры). У 1983 г. скончыў 8 класаў сярэдняй школы № 5, Мазырскае ПТВ № 68. Працаваў у Мазырскім вытворчым мэблевым аб'яднанні. У лістападзе 1986 г. прызваны ў Савецкую Армію, з мая 1987 г. служыў у Афганістане. Радавы У. А. Вяракса загінуў 30.10.1988 г. Пахаваны ў в. Дразды. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна), медалямі «За адвагу» і іншымі.

З пісьма камандзіра часці бацькам У. А. Вяраксы

25 лістапада 1989 г.

...Это случилось в 9 час. 30 мин. Ваш сын находился в составе боевой колонны,следовавшей по маршруту Гульбахар – Джабальус – Сирадж. В районе населенного пункта Намазджан колонна была обстрелена мятежниками из стрелкового оружия и гранатометами. Одна из гранат попала в кормовую дверь боевой машины, где находятся топливные баки. В результате сильного взрыва Владислав погиб.

За время прохождения службы в нашей части зарекомендовал себя с положительной стороны как дисциплинированный, инициативный, грамотный солдат. Он всегда мужественно переносил все тяготы и лишения воинской службы.



У. А. Вяракса

А. М. Дубень

А. М. Мельнічэнка

Вы можете гордиться своим сыном — верным защитником нашей Родины, не дрогнувшим перед лицом опасности и до конца выполнившим свой долг.

Дубень Аляксандр Міхайлавіч (н. 18.2.1964 г. у в. Летавішча). Скончыў 8 класаў Асавецкай сярэдняй школы, вучыўся ў Мінскім ПТВ № 34 чыгуначнікаў. Працаваў у Светлагорску.

Радавы А. М. Дубень загінуў 19.3. 1984 г. у час абароны аэрадрома. Пахаваны ў в. Асавец Мазырскага раёна.

Мельнічэнка Анатоль Міхайлавіч (н. 11.10.1955 г. у в. Малы Бокаў). Скончыў Міхалкаўскую сярэднюю школу, затым Чарнігаўскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў. Служыў у Афганістане. Штурман верталётнай эскадрыллі старшы лейтэнант А. М. Мельнічэнка загінуў 25.10. 1983 г. Пахаваны ў в. Малы Бокаў. Вуліца, дзе знаходзіцца дом бацькоў адважнага лётчыка, носіць яго імя. На будынку школы, дзе вучыўся Анатоль Міхайлавіч, устаноўлена мемарыяльная дошка.

З пісьма С. Е. Гафштэйна, настаўніка-метадыста Міхалкаўскай СШ

Эти строки не только дань уважения павшему в бою воину. Анатолий действительно был таким: целеустремленным, волевым, настойчивым, скромным, милым пареньком, очень красивым юношей и в то же время уже мужчиной с волевым и мужественным лицом.

Нас, учителей, поражали его работоспособность, его добросовестное отношение к порученному делу, которые он унаследовал от своей матери Ольги Александровны Мельниченко, замечательной труженицы совхоза «Мозырский». Он все делал на совесть. И совесть, порядочность были, пожалуй, главными чертами его характера.

За годы работы в школе я видел много разных учеников: ленивых и трудолюбивых, настойчивых и безвольных, целеустремленных и таких, которые вообще не знали, что они намерены делать после школы. Такого, как он, другого я не помню. У него была одна мечта — небо. Ей он подчинил весь свой распорядок дня. Он любил физический труд и физическую культуру, но в равной степени уделял внимание всем предметам. Учился он прекрасно. Не помню случая, чтобы он пришел на урок неподготовленным.

Вежливый, всегда уравновешенный, рыцарь по отношению к девушкам — таким он запомнился нам всем.

Он был нашим общим любимцем, нашей гордостью.

Он любил жизнь, любил свое небо, был прекрасным сыном, мужем, отцом своим детям, горячо любил Родину.

Таким он навсегда остался в памяти его учителей.

Семяненка Уладзімір Васілевіч (н. 28.11.1964 г. у г. Томск). У1981 г. скончыў сярэднюю школу № 11 у Мазыры, у 1983 г.— Полацкі палітэхнікум. У тым жа годзе прызваны ў Савецкую Армію, з кастрычніка 1983 г. служыў у Афганістане.

Радавы У. В. Семяненка загінуў 18.6.1984 г. Пахаваны ў Мазыры. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З пісьма Уладзіміра Семяненкі бацьку

Здравствуй, папа!

Вот пишу тебе еще одно письмо. Дела идут нормально. Чего я только не насмотрелся за эти

У. В. Семяненка

С. У. Сіліч

І. В. Сніцарэнка

3 месяца, которые я здесь. 15 дней были на операции — прочесывали кишлаки. В этой операции много погибло человек, в нашей роте тоже есть потери. В одном ауле брали «духов», сильный был бой. Брали целый день почти — не могли живыми взять, потом расстреляли из гранатометов.

Да, досталась мне служба, но я не променял бы ее сейчас на службу в Союзе. Тут по-настоящему поймешь жизнь, Родину — ты не подумай, это не громкие слова.

Вот завтра опять уезжаем куда-то. Главное, за меня не беспокойтесь, все будет нормально.

Папа, я прошу тебя, как прочитаешь письмо, сразу сожги его, не дай бог оно попадет к маме или Наташе.

До встречи, Вова.

Сіліч Сяргей Уладзіміравіч (н. 18.2.1968 г. у в. Касцюковічы). У 1983 г. скончыў Майсееўскую васьмігадовую школу, Мазырскае ПТВ № 68 будаўнікоў. З 1987 г. служыў у Афганістане. Радавы С. У. Сіліч загінуў 8.9.1987 г. пры выратаванні ваеннай тэхнікі. Пахаваны ў в. Касцюковічы. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. На будынку Майсееўскай школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

З пісьма С. У. Сіліча родным

8 лютага 1987 г.

...Дела у меня идут хорошо. Вы говорите, что еще долго ждать, так это не так. Служить мне осталось всего лишь год. А год этот пролетит незаметно. Вы только не волнуйтесь. Все будет хорошо, ведь здесь много таких же парней, как и я, служат, а их тоже ждут матери, отцы, братья, сестры. Так что вы только не переживайте и ждите. Я обязательно вернусь к вам...

Сніцарэнка Іван Васілевіч (н. 21.12.1959 г. у Мазыры). У 1974 г. скончыў 8 класаў мазырскай сярэдняй школы № 4, у 1978 г. — Нараўлянскае ПТВ № 117. У лістападзе 1978 г. прызваны ў Савецкую Армію, з 1980 г. служыў у Афганістане.

Радавы І. В. Сніцарэнка загінуў 1.3.1980 г. Пахаваны ў Мазыры. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З пісьма І. В. Сніцарэнкі родным

14 студзеня 1980 г.

Здравствуйте, дорогие родные мама, сестра Мария и Володя!

Начинаю свое письмо с того, что я уезжаю в командировку на длительное время. Если от меня не будет долго письма — не переживайте, со мной будет все хорошо. Письма на Слуцк больше не пишите, завтра утром я уезжаю. Высылаю вам все фотографии...

З пісьма намесніка камандзіра батальёна маці І. В. Сніцарэнкі

В нашей памяти Ваня всегда был и останется живым героем. Мы продолжаем его подвиги. Батальон добился звания отличного подразделения. Многие воины удостоены высоких правительственных наград... Пишите нам всегда, что Вас интересует. Заботы Ваши — это и наши заботы, горе Ваше — и наше горе. Прасковья Терентьевна, мы Вас очень хорошо понимаем...

Тут шануюць іх памяць

У ПТВ № 68 створаны музей воінаў-інтэрнацыяналістаў. Пачынаецца ён з карты Афганістана, на якой адзначаны баявы шлях нашых воінаў. На стэндах — асабістыя рэчы, дакументы, узнагароды загінуўшых — Сяргея Сіліча, Івана Сніцарэнкі, Уладзіслава Вяраксы і іншых воінаў. За што яны аддалі свае маладыя жыцці, за якія ідэалы — хто з экскурсаводаў можа сёння растлумачыць гэта?..

На стэндах — здымкі загінуўшых воінаў-мазыран: Анатоля Мельнічэнкі, Ігара Патапчука, Уладзіміра Баўра, Аляксандра Дубеня, Уладзіміра Семяненкі.

Памяць аб загінуўшых захоўваюць іх баявыя сябры, якія прайшлі вогненнымі дарогамі Афганістана. У музеі праводзяцца сустрэчы моладзі з ветэранамі, з бацькамі загінуўшых герояў. Памяць пра ахвяры далёкай, чужой вайны жыве...

Т. Піліпчук

РЭКВІЕМ

З краіны афганскай вярнуліся ў цынку —
Не суджаны быў ім шчаслівы працяг.
Сівее матуля няўцешная: «Сынку!..»
І бацьку пячэ невыносна ў грудзях.

За светам забітыя іх летуценні
Навекі засыпалі родным пяском.
Блукаюць між намі іх светлыя цені
З хлапечым над верхняй губою пушком.

Іх бардамі мужнасць герояў апета,
І чуецца ў песні бравурны трубач.
А ці ж на жалобу накладзена вета? —
Аплач жа, зямля мая, хлопцаў, аплач.

Згадаюць сябры, не забудзе нявеста.
І скрозь, дзе яны дарагімі былі,
О маці-зямля! Ад Чукоткі да Брэста
Слязамі дажджоў іх магілы палі.

Хай слёзы твае нам сумленне апаляць,
Бо ці ж перад імі няма ў нас віны?
Няхай збераж наша горкая памяць
Абраннікаў гэткай нянашай вайны.

Мікола Кусянкоў

Мазыране, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў у радах Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту

АЛІКЕВІЧ Генадзь Велюсавіч, н. у 1972 у в. Шчакатава, прапаршчык, загінуў 19.11.1992.

АРЦЮШЭНКА Іван Васілевіч, н. у 1951 у в. Майская, рад., памёр 10.5.1970.

БАРАНОЎСКІ Аляксандр Уладзіміравіч, н. у 1961, сяржант, загінуў 29.5.1981.

БАРЫСЕНКА Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1962 у г. Мазыр, рад., загінуў 5.5.1982.

БАТУРЭВІЧ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1957, мал. сяржант, загінуў 27.2.1976.

БЕЗВУГЛЯК Віктар Міхайлавіч, н. у 1961 у г. Мазыр, рад., памёр 15.4.1981.

БОБР Аляксандр Сяргеевіч, н. у 1968 у в. Козенкі, ст. матрос, загінуў 1.4.1988.

ГАРБАТОЎСКІ Міхаіл Адамавіч, н. у 1934, рад., загінуў 9.3.1956.

ГЕРАСІМОВІЧ Віктар Мацвеевіч, н. у 1927 у в. Гіневічаў Груд, рад., загінуў у 1950.

ГЛЮЗ Анатоль Уладзіміравіч, н. у 1967 у в. Стараселле, матрос Паўночнага флоту, загінуў 7.3.1985.

З характарыстыкі камандзіра вайсковай часці

Матрос Анатоль Глюз служыў шафёрам БТР у дэсантна-штурмавой роце марской пяхоты Чырванасцяжнага Паўночнага флоту.

Таварышы па службе ведалі яго як дысцыплінаванага, добрасумленнага матроса. Ён карыстаўся заслужаным аўтарытэтам у камандзіраў і таварышаў па службе, заўсёды выдатна выконваў свае абавязкі.

Служба Анатоля праходзіла ў складаных умовах далёкай Поўначы, дзе немагчыма без вайсковага таварыства і сапраўднай флоцкай дружбы паспяхова выконваць абавязкі па абароне Радзімы. 7 сакавіка 1985 года пры выкананні службовых абавязкаў, ратуючы сябра, Анатоль трагічна загінуў...

ДАШКЕВІЧ Генадзь Антонавіч, н. у 1952 у в. Лешня, прапаршчык, загінуў 2.11.1977.

ДЗЕМІДОВІЧ Іван Фёдаравіч, н. у 1944,

А. У. Бараноўскі

А. У. Глюз

С. Д. Дзяцел

М. Г. Казак

А. М. Корнеў

М. Я. Літвінчук

рад., загінуў 18.12.1964, пахаваны ў г. Будапешт, Венгрыя.

ДЗЯЦЕЛ Сяргей Дзмітрыевіч, н. у 1932 у в. Лешня, мал. сяржант, загінуў на вайсковых вучэннях 27.9.1953 у Грузіі.

ЕЎЖЫК Іван Дзмітрыевіч, н. у 1949 у в. М. Зімовіщчы, рад., загінуў у 1971.

ЖДАНАЎ Анатоль Дзмітрыевіч, н. у 1945, прапаршчык, загінуў 2.7.1987.

ЖУРАЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1970 у г. Мазыр, рад., загінуў 30.11.1989 у Нагорным Карабаху.

ЗАДВОРСКІ Уладзімір Якімавіч, н. у 1926 у в. Міхалкі, рад., памёр 8.7.1950.

КАДОЛ Міхаіл Іванавіч, н. у 1957 у г. Мазыр, прапаршчык, загінуў 25.10.1991.

КАДОЛ Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1936 у в. Васькаўка, рад., загінуў 11.7.1956.

КАЗАК Мікалай Гаўрылавіч, н. у 1940, рад., загінуў 21.8.1962.

КАНАВОД Аляксандр Іванавіч, н. у 1958, рад., загінуў 21.9.1977.

КАНОПЛІЧ Васіль Фёдаравіч, н. у 1957 у в. Дзербінка, рад., загінуў 11.10.1976.

КАНОПЛІЧ Міхаіл Кузьміч, н. у 1948 у в. Махнавічы, прапаршчык, загінуў у 1970 у Германіі.

КАРЖЭЎСКІ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1955 у в. Скрыгалаў, рад., загінуў у 1974.

КЕБЕЦ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1937, рад., загінуў 22.8.1960 у г. Смаленск.

КІРЫЧЭНКА Ігар Уладзіміравіч, н. у 1965 у г. Мазыр, рад., загінуў 4.3.1985.

КІРЭЕЎ Віктар Сцяпанавіч, н. у 1945, капітан, памёр 5.4.1973.

КОРНЕЎ Аркадзь Мікалаевіч, н. у 1946, палкоўнік, загінуў 16.10.1987, пахаваны ў г. Мазыр.

ЛАЎШУК Сяргей Уладзіміравіч, н. у 1964 у г. Мазыр, рад., загінуў 5.8.1984 у Германіі.

ЛІС Сафія Аляксееўна, н. у 1955 у в. Барыскавічы, рад., памерла 21.10.1977.

ЛІТВІНЧУК Міхаіл Якаўлевіч, н. у 1931 у в. Заводны Востраў, яфрэйтар, загінуў 26.10.1956 у Венгрыі.

МАЗУРКЕВІЧ Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1959 у в. Слабада, рад., загінуў 29.7.1980.

МАЙСТРОВІЧ Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1962 у в. Гурыны, рад., загінуў 19.9.1982.

МАШКОЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1954 у в. Нагорныя, рад., загінуў 15.7.1973.

МЕЛЕХАЎ Якаў Мікалаевіч, н. у 1950, рад., памёр 8.1.1970.

МІШЧАГІН Уладзімір Анатольевіч, н. у 1972 у в. Бабраняты, рад., загінуў 9.3.1992.

МУРАШКА Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1953, прапаршчык, памёр 7.11.1993.

НАВУМЕНКА Сяргей Мікалаевіч, н. у 1969 у в. Надаткі, сяржант, загінуў 19.9.1988.

НЯХАЙ Васіль Уладзіміравіч, н. у 1955, сяржант, загінуў 9.4.1975.

ПАНГЛІШ Віктар Пятровіч, н. у 1932 у в. Барбароў, рад., загінуў 31.10.1951 у г. Гусеў Калінінградскай вобл.

ПАРХОМЕНКА Сяргей Васілевіч, н. у 1965, рад., загінуў 4.7.1985 у Германіі.

ПАТАПЧУК Ігар Андрэевіч, н. у 1950, ст. лейтэнант, ваяваў у Афганістане, цяжка паранены, загінуў у чэрвені 1988.

Я. У. Работнаў

ПІКУЗА Валянцін Уладзіміравіч, н. у 1935 у в. Скрыгалаў, рад., загінуў 6.11.1956 у Венгрыі.

ПРАХАРЭНКА Аляксей Емяльянавіч, н. у 1938 у в. Раманаўка, мал. лейтэнант, загінуў 7.7.1961 у г. Востраў Пскоўскай вобл.

РАБОТНАЎ Ян Уладзіміравіч, н. у 1968 у г. Мазыр, рад., загінуў 24.11.1988 у г. Уладзівасток.

РАБЧАНКА Рыгор Майсеевіч, н. у 1962, рад., загінуў 7.2.1982.

РАВУЦКІ Уладзімір Валянцінавіч, н. у 1958 у в. Дразды, рад., загінуў 11.8.1978.

РАШАНЦАЎ Андрэй Барысавіч, н. у 1963 у в. Лучажэвічы, рад., загінуў 6.1.1988.

РУДЗЬКО Аляксандр Яўхімавіч, н. у 1955, сяржант, загінуў у 1974.

САВІЦКІ Васіль Фёдаравіч, н. у 1952 у г. Мазыр, рад., загінуў 19.9.1973.

САВІЦКІ Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1963 у в. Заводны Востраў, ст. прапаршчык, загінуў 7.8.1991.

СІТНІК Рыгор Аляксеевіч, н. у 1935 у в. Хамічкі, матрос, загінуў у 1955 у г. Севастопаль.

СУЗЬКО Юрый Мікалаевіч, н. у 1975 у в. Козенкі, сяржант, загінуў 21.3.1995.

СУЛІМСКІ Аўрам Фёдаравіч, н. у 1935 у в. Майсееўка, ст. матрос, загінуў у 1955 у г. Севастопаль.

ХМЯЛЕЎСКІ Валянцін Ціханавіч, н. у 1943 у в. Скрыгалаў, памёр 10.6.1965 у Германіі.

ЦЫБЛІЁНКА Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1968 у в. Лучажэвічы, прапаршчык, загінуў 25.11.1990.

ЧАРЭЎКА Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1943 у в. Скрыгалаў, рад., загінуў 15.6.1963.

ЧОРНЫ Іван Фядосавіч, н. у 1925 у в. Лешня, сяржант, загінуў 8.2.1950.

ЧУБ Дзмітрый Сцяпанавіч, н. у 1920 у в. Слабодка, ст. лейтэнант, загінуў у 1970.

ШЭРАШ Міхаіл Васілевіч, н. у 1952 у в. Барбароў, рад., загінуў 3.7.1972.

ЮРГА Валерый Пятровіч, н. у 1973, рад., загінуў 17.6.1992.

ЮШЧАНКА Андрэй Нічыпаравіч, н. у 1909, рад., загінуў у баі з нацыяналістамі 7.11. 1946 у Драгобыцкай вобл.

ЯВОРСКІ Леанід Браніслававіч, н. у 1960 у в. Акулінка, рад., загінуў 17.5.1986.

Спіс падрыхтавалі
М. Бялоў, І. Піліпчук

Цаною жыцця

Марціновіч Міхаіл Аляксандравіч (н. у 1955 г.) — лейтэнант міліцыі, камандзір узвода патрульна-паставой службы Мазырскага гарадскога аддзела ўнутраных спраў. Загінуў у барацьбе з бандытамі 30.4.1983 г. Узнагароджаны медалём «За выдатную службу пры ахове грамадскага парадку».

Царэнка Аляксандр Платонавіч (н. у 1959 г. у в. Вялікі Бокаў). Скончыў Каменкаўскую сярэднюю школу, потым служыў у Савецкай Арміі. Ваяваў у Афганістане. У 1981 г. паступіў на службу ў органы МУС. Сяржант Царэнка быў у ліку лепшых міліцыянераў патрульна-паставой службы ў мазырскай міліцыі. Загінуў пры затрыманні злачынцаў 30.4.1983 г. За ўзорнае выкананне службовых абавязкаў узнагароджаны медалём «За адвагу» і Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

...Машыну яны заўважылі на дарозе, якая вяла да чыгуначнай станцыі Мазыр. З патушанымі фарамі, без габарытных агнёў, яна на вялікай хуткасці мчалася па шашы. На каманду спыніцца ў грузавіку не адрэагавалі. «Дагнаць!» — загадаў Марціновіч шафёру, сяржанту Царэнку, і зняў трубку рацыі. Зразумеўшы, што ад «Жыгулёў» на роўнай дарозе не ўцячы, парушальнікі павярнулі з шашы ў пералесак. Папераджальны стрэл у паветра. За хмызняком, які адгароджваў шашу ад пасёлка, грузавік спыніўся. Праз ліченыя хвіліны, скрыпнуўшы тармазамі, побач стала міліцэйская машына. Марціновіч і Царэнка кінуліся да грузавіка...

...Доўгі час ГРАУС Мазыра вёў па-

шукі асабліва небяспечных злачынцаў, якія выкрадалі жывёлу — забівалі, выпатрошвалі тушы і вывозілі мяса. Была спроба вынесці сейф з бухгалтэрыі калгаса «Радзіма», але, калі спрацавала сігналізацыя, злачынцы ўцяклі. Было відаць, што дзейнічаюць нахабныя, дзёрзкія грабежнікі. У тую ноч яны ўкралі ў нарыхтоўчым пункце «Прудок» быка, мяса пагрузілі ў рэфрыжэратар.

Але іх дагнала міліцэйская машына.

Злачынцы кінуліся на міліцыянераў, бліснула лязо нажа... Яны аказаліся тварам да двару — двое бамбізаў, якіх асляпіла звярыная прага і нянавісць, і міліцыянеры. Раптоўнасць зрабіла сваю справу — выкарыстаць зброю міліцыянеры не паспелі. Удар нажа ў спіну лейтэнанта! Царэнка бачыў, як пахіснуўся, потым упаў камандзір. Цяпер яму аднаму прыйшлося адбівацца ад злачынцаў. І ён не адступіў. Ужо смяротна паранены, яшчэ змагаўся з бандытамі...

Цаною свайго жыцця М. Марціновіч і А. Царэнка садзейнічалі затрыманню асабліва небяспечных бандытаў, якія ўчынілі шэраг злачынстваў, у тым ліку і забойстваў. Імёнамі Марціновіча і Царэнкі названы вуліцы ў Мазыры.

В. Шур

Чарнобыльскі попел

Чорным днём назаўсёды ў нашай гісторыі застанецца 26 красавіка 1986 г. Дзень перасцярогі... Чарнобыль надзвычай блізка ад Мазыра, усяго некалькі дзесяткаў кіламетраў напрамкі. Горад на Прыпяці пацярпеў найбольш з беларускіх буйных гарадоў. У першыя месяцы і гады забруджанасць глебы на тэрыторыі Мазыршчыны ў розных месцах дасягнула ад 1 да 10 кюры на адзін кв. км. Толькі 20 сельскіх населеных пунктаў раёна з 92 не былі пасыпаны чарнобыльскім попелам. Не намнога забруджанасць меншая і цяпер. Больш як тры тысячы мазыран прымалі ўдзел у ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай катастрофы. Звыш дваццаці з іх ужо памерлі... 11 чалавек засталіся інвалідамі. Сярод іх — урач Л. Д. Аўгусціновіч, якая ў час аварыі выратоўвала людзей з зоны. Яна інвалід першай групы, добрыя людзі з Аўстрыі ў 1994 г. запрасілі яе на лячэнне. У многіх бяда і сягоння стаіць ля парога.

З 1986 г. у горад з зоны пераехала 510 сем'яў. Для іх тут пабудавана 600 кватэр. У Мазырскі раён з забруджанай зоны было таксама пераселена каля 300 сем'яў. Для іх пабудавана 8 пасёлкаў у вёсках Асавец, Бабраняты, Глініца, Вялікія Зімовішчы, Раманаўка, Скрыгалаў, Слабада і Хамічкі. Многія перасяленцы прыязджалі на



Вуліца перасяленцаў з Чарнобыльскай зоны

новае месца цэлымі вёскамі і вуліцамі, каб і тут жыць побач з родзічамі і сябрамі. А жыхары вёскі Белы Бераг Нараўлянскага раёна на новым месцы, у вёсцы Скрыгалаў, захавалі памяць аб сваёй вёсцы ў назве вуліцы, дзе пасяліліся.

У снежні 1992 г. арганізавана Мазырскае аддзяленне фонду інвалідаў — удзельнікаў ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС «Дапамога». У адпаведнасці са статутам фонд клапоціцца аб інвалідах-ліквідатарах, сем'ях памерлых удзельнікаў ліквідацыі аварыі. Створаныя на грамадскіх пачатках таварыствы «Дапамога», саюз «Прыпяць» праяўляюць міласэрнасць да ўсіх грамадзян, якія пацярпелі ад аварыі.

Т. Піліпчук

* * *

Таемна-задумны палескі мой краю,
Шчымлівая песня і казка.
З мазырскіх вышыняў цябе сузіраю,
А сэрцу пакутліва-цяжка.

Знудзілася маці-зямля пад нагамі
Ад гора-бяды невыноснай:
Праклятый Чарнобыль мой дзень апаганіў,
І сумна, і тлумна, і слёзна.

Я трызню цнатлівымі ў росах лугамі,
Раскошаю прыпяцкіх плёсаў.
Мне б чыстымі зноўку прайсціся гаямі,
Заснуць у духмяных пракосах.

Нямее краса, ды квітнее надзея,
І ёй, быццам Богу, малюся,
А боль неадступны са мною падзеліць
На досвітку клёкатам бусел.

Васіль Андрыеўскі

Духоўныя скарбы Мазыршчыны

Палеская зямля шчодра дзеліцца з людзьмі сваімі скарбамі. Але скарбы не толькі ў зямлі, — багатая Мазыршчына і сваёй культурнай спадчынай, глыбокімі фальклорнымі вытокамі. Гэтым краем захаплялiся і не раз прыязджалі сюды беларускія, рускія, польскія, украінскія этнографы і фалькларысты XIX — XX стст.: П. Шпілеўскі, А. Васільева, В. Сакалоў, Ю. Кручкоўскі, А. Кольберг, П. Чубінскі, В. Тур, М. Доўнар-Запольскі, Я. Карскі, З. Даленга-Хадакоўскі, А. Сержпутоўскі, К. Машынскі, Ч. Пяткевіч, А. Крукоўскі, І. Сербаў, П. Бузук і многія іншыя.

Багаты сваімі культурнымі традыцыямі горад Мазыр, і іх тут не толькі берагуць, але і памнажаюць. У горадзе працуе краязнаўчы музей, выставачная зала, парк культуры і адпачынку «Перамога». У розных гуртках, секцыях і клубах па інтарэсах, створаных пры ўстановах культуры, займаецца звыш 2 тысяч мазыран. 11 калектываў мастацкай самадзейнасці атрымалі званне «народны» і «ўзорны». Вялікую канцэртную дзейнасць ажыццяўляюць гарадскі духавы аркестр, ансамбль народных музыкаў «Явар», калектывы мастацкай самадзейнасці Палаца культуры «Будаўнік» трэста «Мазырсельбуд», Палаца культуры нафтаперапрацоўчага завода.

У горадзе праводзіцца шмат масавых мерапрыемстваў — святы, народныя гульні, кірмашы, фестывалі мастацтваў, агляды-конкурсы калектываў мастацкай самадзейнасці. Многія святы сталі традыцыйнымі і жаданымі для мазыран: «Каляды», «Гуканне вясны», свята горада, асеннія кірмашы і інш.

Кніжны фонд цэнтральнай сістэмы бібліятэк складае 480 тыс. экземпляраў, налічвае 29 350 чытачоў. Бібліятэкі праводзяць вялікую асветніцкую работу: створаны клубы па інтарэсах, праводзяцца сустрэчы з паэтамі і пісьменнікамі, абмеркаванні кніг, тэматычныя выставы літаратуры, агляды кніжных навінак.

Хор ветэранаў Мазыра

Ансамбль «Радуніца»

У гарадской выставачнай зале традыцыйна праводзяцца выставы прафесійных і самадзейных мастакоў, персанальныя выставы членаў Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь: Пятра Захарава, Мікалая Дубровы, Валерыя Сідоркіна. Папулярнымі і традыцыйнымі сталі вечары «Жывапіс і музыка ў сям'і муз», «Калядныя вечары», на якіх гучаць музыка, вершы і песні прафесійных і самадзейных выканаўцаў.

Гэтак жа і работнікі культуры Мазырскага раёна асаблівую ўвагу ўдзяляюць зберажэнню і развіццю беларускай культурнай спадчыны, народных звычаяў і традыцый. Таму і рэпертуар калектываў мастацкай самадзейнасці — гэта найперш мясцовы фальклорны матэрыял. Амаль пры кожнай установе культуры ёсць пакоі-музеі альбо куткі народнай творчасці, сялянскага побыту. Усяго на тэрыторыі раёна ў клубных установах працуюць каля 20 фальклорных дарослых калектываў, 178 гурткоў мастацкай самадзейнасці, клубаў па інтарэсах, у якіх займаюцца больш за 1800 чалавек.

Работнікамі культуры сабрана больш за 400 народных абрадавых і пазаабрадавых песень, легендаў і паданняў пра гісторыю населеных пунктаў раёна, прыказак і прымавак і іншых твораў вусна-паэтычнай народнай творчасці. Асаблівую цікавасць заваяваў ансамбль народнай музыкі «Радуніца», які створаны пры РДК. Песні, якія выконвае гэты калектыў, запісаны ў вёсках Мазыршчыны. Два калектывы мастацкай самадзейнасці («Радуніца» — РДК і «Валошкі» — Прудкоўскі СДК) носяць ганаровае званне «народны».

В. Палазнік, А. Шаўчэнка

З любоўю да роднай зямлі

Краязнаўчы музей у Мазыры заснаваны 18 чэрвеня 1948 г. У аснову яго леглі экспанаты Палескай абласной выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі ў 1949 г. Паступова павялічвалася колькасць экспанатаў і дакументаў. 7 лістапада 1949 г. Палескі абласны краязнаўчы музей быў адкрыты. Размясціўся ён у будынку з трох пакояў агульнай плошчай 202 кв. м. Узначальваў музей І. В. Пісарчук, вялікі аматар сваёй справы, краязнаўца і гісторык. Сярод новых дакументаў былі матэрыялы аб першых кроках і развіцці рэвалюцыйнага рабочага руху, аб стварэнні першых суполак РСДРП, падзеях першай рускай рэвалюцыі 1905—1907 гг., удзельніках грамадзянскай вайны. Стараннем супрацоўнікаў А. П. Эльмана, М. М. Васілюк і іншых удалося знайсці многа новых фотаздымкаў, вайсковае абмундзіраванне і амуніцыю партызан.

Вялікі ўклад у вывучэнне Мазыршчыны ўнёс краязнаўца А. Г. Бобр. У горадзе і сельскай мясцовасці пачалі праводзіцца раскопкі, якія дазволілі высветліць археалагічнае мінулае нашага краю. Экспедыцыі, вывучэнне архіваў, краязнаўчай літаратуры, азнаямленне з вопытам работы іншых музеяў, збор успамінаў удзельнікаў мінулых падзей — усё гэта зрабіла музей сапраўднай навуковай установай горада. Выдаваліся адозвы да насельніцтва з заклікам збіраць звесткі аб сваіх продках і паселішчах. Удалося захаваць калекцыю каштоўных музейных прадметаў — рукапісаў, кніг, фотаздымкаў, рэчаў. Не толькі мінулае, але і сённяшні дзень цікавіць супрацоўнікаў музея.

Мазырскі краязнаўчы музей размешчаны сёння ў старажытным будынку на славутай Гары Камунараў. Мае залу для выставаў, а таксама філіялы — музей дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва М. М. Пушкара і музей развіцця народнай адукацыі ў Мазыры, які адкрыты ў сярэдняй школе № 13. Заканчваецца рамонт будынка па вуліцы Камсамольскай, 15, дзе размесціцца музей рамёстваў і промыслаў на Палессі. Створаны таксама музеі на грамадскіх пачатках у сярэдніх школах.



Хата, пакрытая чаротам у пачатку XX ст. у в. Малы Бакавец

Гара Камунараў — гістарычнае месца, запаведнае ў Мазыры, адсюль браў пачатак горад. Экспазіцыя музея разглядваецца ў двух вялікіх раздзелах: «Гісторыя дасавецкага перыяду» і «Прырода нашага краю». Прадстаўлены ўзоры жаночых упрыгожанняў — бранзалеты са шкла і фібула (бронзавы век), амфара другой паловы XII ст., калаўрот XII — XIII стст., узоры кафляных плітак, гліняны посуд XVI — XVIII стст. Сярод экспанатаў — калекцыі мінералаў і горных парод, насякомых, чучалы птушак і звяроў, вялікі гербарый.

Экспазіцыя прыродазнаўчага аддзела распрацоўвалася і стваралася навуковым супрацоўнікам музея А. Я. Кнышчук і малодшым навуковым супрацоўнікам Н. І. Анфілатавай. Тэматыку — экспазіцыйны план дасавецкага перыяду распрацаваў навуковы супрацоўнік В. В. Шабасовіч. Мастацкае аздабленне і мантаж экспазіцыі выкананы мастаком Г. В. Говарам. У 1984 г. да дня вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адкрыты зал для выставаў. Першая выстава была прысвечана гэтай знамянальнай падзеі. Зала — месца экспаніравання мастацкіх вырабаў народнай творчасці, сустрэч з цікавымі людзьмі. Добрай традыцыяй стала штогадовае адкрыццё гарадскіх выставаў мастакоў Мазыра.

Добра ведаюць у Мазыры мастакоў братоў Віктара і Мікалая Дуброваў, У. Сідоркіна, А. Захарава. Адкрыццё кожнай выставы — з'ява ў культурным жыцці горада. Зала — цэнтр эстэтычнага выхавання насельніцтва. Тут часта выступае ансамбль старадаўняй музыкі. Адкрыты мастацкі салон, дзе можна набыць карціну.

У 1991 г. у склад краязнаўчага музея ўвайшоў як філіял музей дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва М. М. Пушкара. Мастак-керамаліст, заслужаны дзеяч мастацтва Беларусі, член Саюза мастакоў М. М. Пушкар — нястомны падарожнік і збіральнік народных скарбаў, які сабраў багатую этнаграфічную калекцыю. У невялікай хаце размясціліся і работы самога мастака — творы дробнай пластыкі, выкананыя ў тэхніцы тэракоты.

Цяпер у Мазырскім краязнаўчым музеі, які мае фондасховішча, фотолабараторыю, бібліятэку, налічваецца каля 20 тысяч адзінак захоўвання асноўных фондаў. Гэта палеанталагічныя і нумізматычныя калекцыі, зброя і даспехі воінаў розных вякоў, этнаграфічныя калекцыі, вопратка, хатнія рэчы векавой даўніны, карты, дакументы, фотаздымкі і іншыя экспанаты. Галоўны скарб музея — тысячы прозвішчаў мазыран, якія захаваны для гісторыі...

І. Васількова

Ажывала пад рукамі гліна

Мікола Пушкар быў чалавек шчыры і даверлівы, таварыскі і заўсёды вясёлы...

Нарадзіўся Мікола Мікітавіч на мяжы Расіі і Украіны — паміж Белгарадам і Харкавам, а лёс закінуў яго на Палессе, у Мазыр. Бацькоў сваіх не памятаў, ведаў толькі, што бацька меў нейкае дачыненне да мастацтва — маля-



М. М. Пушкар са сваімі героямі

ваў абразы, як казалі ў народзе, быў багамазам...

Галодныя гады дзяцінства. Працоўная калонія А. Макаранкі. Расказваў Мікола, як намаляваў партрэт Максіма Горкага перад прыездам яго ў калонію. Партрэт пісьменніку спадабаўся, і ён нават папрасіў кіраўніцтва Харкаўскага мастацкага вучылішча, каб яго прынялі на вучобу,— хлопцу не ставала гадоў. Пасля вучылішча выкладаў маляванне ў школе...

Потым вайна. Цяжкая кантузія. Канцлагер. Цудам выжыў, дачакаўся светлага дня вызвалення. Жыў у Калінінградзе. Там пачынаў як керамічст. Потым пераехаў у Мазыр, уладкаваўся мастаком на завод меліярацыйных машын. Днём маляваў ці пісаў аб'явы, а вечарамі мясіў гліну і ляпіў тое, што мроілася не адну ноч...

Любіў Мікола Пушкар мазырскі рынак, кожную нядзельку заглядваў туды. Аднаго разу запаў у душу дзядок, які прадаваў з бочачкі мёд, а побач з ім і каларытная маладзіца — родам з-пад Лельчыц. Асабліва ж уразіў яго сівы, мо за сто год, дзед — вясёлы, гаваркі, дасціпны. Цэлыя вершы-паэмы чытаў пра сваю гліну, з якой выраблялў макітры і гладышы...

Гадзіну назіраў за ім Пушкар, другую. І тады ж яго асяніла: «Во мая тэма, во каго ляпіць трэба! Гэта ж не трэба нічога прыдумваць, фантазіраваць, бяры і капіруй жыццё — а прыгажэй за яго нічога не бывае!..» Пальцы, як даўно вынашанае, вылепілі таго старога, ды так удала і трапна, што на твары Пушкара міжволі засвяцілася ўсмешка. Паляшук затоена падміргваў свайму творцу, нешта хітрае і смешнае таіў у сваёй кудлатай кужэльнай барадзе, быццам пасміхаўся, што так доўга хадзіў Мікола за сваімі тэмамі і сюжэтамі, а тут за такі кароткі час адбылося неверагоднае. У ім, дзядку-палешуку, было штосьці ад палескай зямлі, ад настрою і мудрасці працавітых і нястомных людзей...

Вось тады і адчуў, зразумеў найперш Мікола Мікітавіч, што галоўным яго героем будзе Паляшук. Бо жыццё яго мае шмат адценняў і рысаў характару. Яно спакойнае і бясконцае ў сваёй прастаце і мудрасці, памяркоўнасці, яно — як цячэнне старажытнай Прыпяці, журботнае і самотнае, як тужлівы крык жорава, які пакідае родны край і павінен ляцець у невядомую далячынь, вясёлае і дасціпнае, з хітрынкай і радасцю, якое толькі і можа быць у палешука.

Мікола Пушкар вывучаў гісторыю Беларусі, чытаў паданні і казкі. Мастака ўражвалі і натхнялі літаратурныя вобразы Сымона-музыкі, Лявона і Лявоніхі, Тараса на Парнасе, Несцеркі, Бандароўны, сівога гусляра... У марах жылі, стукаліся ў сэрца вобразы вясёлыя, смешныя і няўрымслівыя. І ён ужо не мог адпрэчыць іх ад сябе — рукі прасілі гліны.

«Паляшук-лапатнік», «Каваль», «Дрывасек», «Сваты», «Паронкі» —

дзесяткі, і сотні іншых работ і вобразаў. Мікола Пушкар услаўляў у сваіх творах чалавека працы, чалавека-дабрадзея і мудраца. А колькі жанравых сцэнак-апавяданняў, насычаных дабрадушным гумарам, непадробленай праўдай жыцця, выйшла з-пад яго нястомных і пяшчотных рук! Чаго там толькі не было — і колішні побыт палешукоў, і народныя гулянні, сівыя паданні, казкі, анекдоты пра цешчу і зяця, прымакоў і выпівох — «Пасварыліся», «Дудар», «Жылі стары са старою», «Цярабавец», «Да цешчы на аладкі», «Браткі-беларусы»... Немагчыма ўсіх пералічыць. Некаторыя творы апавядаюць пра цяжкае мінулае палескага краю і яго жыхароў, пра іх клопаты і надзеі. А гэтай тэме ён супрацьпастаўляе сённяшні дзень: нараджаліся вобразы «Прыпяцкі капітан», «Палящук з транзістарам», «Савецкі волат».

У Міколы Пушкара сваё бачанне жыцця, па-свойму ён і адлюстроўваў яго ў кераміцы. Мастак ствараў вобразы, адметныя яркай своеасаблівасцю, непаўторнасцю манеры выканання, унутранай глыбінёй.

Бадай, галоўная з усіх яго прац — «Сейбіт». У сціплай паставе апусціў Сейбіт натруджаныя рукі — адна выцягнута ўздоўж цела, а другая абаперлася на сявеньку. Вочы ж скіраваны некуды ў неба і з такой надзеяй просяць: «Божа літасцівы! Я адсеяўся, аддаў раллі апошняе зярнятка і хачу восенню сабраць ураджай, каб пракарміць сям'ю. Не падвядзі, дождж, а я ўжо не пашкадую сілаў для матухны-зямелькі!..» Вось такія словы яскрава чуеш кожны раз, калі глядзіш на Сейбіта, і шчыра верыцца, што той дождж, якога так чакае паляшук-сейбіт, абавязкова неўзабаве пральецца на зямлю...

У клопатах старога палешука, у яго неспакоі і сумненнях, у жартах і весялосці б'ецца сэрца нашага народа, пульсуе яго паэтычнасць і непаўторнасць, яго духоўная моц. На тую ж тэму — «Гліна спявае», «Ярыла», «Пастух», «Паляўнічы», «Рыбакі», «Мармышка», «Плацінавы ўзрост»...

Можна шмат расказваць і расказваць пра творчую дзейнасць і жыццё цудоўнага майстра і чалавека Міколы Мікітавіча Пушкара. І пра тое, як ён арганізаваў у Мазыры музей народнай творчасці; як перадаваў свае сакрэты майстэрства малодшаму пакаленню; пра добрую і спагадлівую спадарожніцу Ганну Міхайлаўну, жонку керамічста, якая шмат яму аказвала дапамогі і натхняла ў творчасці; пра тое, як аб'ездзіў сотні паляшуцкіх вёсак і за свае грошы купляў андаракі і спадніцы, рушнікі і каптуры, прасніцы і жорны, самапрадкі і кросны — усё для таго ж музея... Але пра ўсё немагчыма расказаць, ды, бадай, і не трэба. За мастака раскажуць найлепш яго творы — у іх душа і сэрца мастака.

Шмат было задумак, планаў і мараў... Не паспеў ажыццявіць, не вытрымала сэрца — напаміналі пра сябе часы, праведзеныя ў гітлераўскіх, а потым і сталінскіх канцлагерах...

Але памяць аб ім будзе жыць доўга. Бо гэта сапраўды народны мастак. Выдатны талент будзе радаваць не адно пакаленне, і не толькі ў Беларусі: творы М. М. Пушкара ёсць у Польшчы і Славакіі, Канадзе і Амерыцы, Расіі і Нямеччыне...

А. Бароўскі

Музей 61-й арміі

Цэнтрам працы па ваенна-патрыятычным выхаванні вучняў у сярэдняй мазырскай школе № 4 з'яўляецца адкрыты ў 1977 г. музей 61-й арміі 1-га Беларускага фронту. У выніку доўгай і карпатлівай пошукавай работы сабраны матэрыялы і дакументы аб баявым шляху арміі і яе злучэнняў, у тым ліку 415-й і 55-й Мазырскіх, 86-й і 356-й Калінкавіцкіх, 12-й, 76-й, 77-й гвардзейскіх стралковых дывізій і іншых злучэнняў. Сабраны таксама матэрыялы аб баявым шляху 2-га і 7-га гвардзейскіх кавалерыйскіх карпусоў.

Баявы шлях 61-й арміі высветлены ад пачатку яе фарміравання ў лістападзе 1941 г. да завяршэння Берлінскай аперацыі, у якой армія прымала ўдзел. У музеі ёсць матэрыялы пра яе камандуючых — генералаў М. М. Папова і П. А. Бялова, члена ваеннага савета арміі Д. Р. Дуброўскага, начальніка палітаддзела арміі А. Г. Коцікава, камандзіраў дывізій, Герояў Савецкага Саюза, славутых воінаў. Асобна выдзелена экспазіцыя «Калінкавіцка-Мазырская аперацыя».

Музей падтрымлівае пастаянную сувязь са шматлікімі ветэранамі 61-й арміі, 2-га і 7-га гвардзейскіх кавалерыйскіх карпусоў, ветэранамі вайны, якія жывуць на Мазыршчыне і ў іншых месцах былога Савецкага Саюза. Атрымана шмат успамінаў, фотаздымкаў, дакументаў. У музеі захоўваюцца франтавыя вершы салдата П. Жанатава, лістоўкі з тэкстам песні 14-й кавалерыйскай дывізіі, кнігі. Штогод вучні ідуць у паход па месцах баёў 61-й арміі, сустракаюцца з ветэранамі. Групай «Пошук» праводзяцца гутаркі на тэмы: «Калінкавіцка-Мазырская аперацыя», «61-я армія ў Вісла-Одэрскай аперацыі», тэарэтычныя канферэнцыі і іншыя мерапрыемствы. У святочныя дні каля помніка закатаваным падпольшчыкам і партызанам у школьным двары нясуць ганаровую вахту лепшыя вучні школы.

У 1980 г. музей стаў пераможцам рэспубліканскага агляду школьных музеяў баявой славы.

У. Чулкоў

Ад Кірылы Тураўскага да нашых дзён

Гэты музей адкрыты ў 1993 г., усе яго экспанаты расказваюць аб развіцці народнай адукацыі на Мазыршчыне.

Першыя матэрыялы музея былі сабраны кіраўнікамі гурткоў дзіцячай турбазы і іх выхаванцамі. Збору экспанатаў садзейнічалі многія мазыране, якія захоўвалі матэрыялы, што маюць дачыненне да гісторыі адукацыі на Мазыршчыне. Вось даведка, дзе сказана, што першыя навучальныя ўстановы на Мазыршчыне ствараліся пры праваслаўных цэрквах. Іх з'яўленне адносіцца да часоў старажытнай Тураўскай епархіі (пачатак XII ст.). Развіццё адукацыі на Палессі непасрэдна звязана з асветніцкай дзейнасцю Кірылы Тураўскага.

У XVII — XVIII стст. у Мазыры і павеце існавала некалькі каталіцкіх школ пры касцёлах і манастырах. Адкрыццё чатырохкласнай павятовай школы адносіцца да 1799 г. У 1801 г. у ёй навучаліся 64 вучні, працавалі чатыры настаўнікі. Вывучаліся граматыка рускай, польскай і лацінскай моў, арыфметыка, паэзія, гісторыя, геаграфія, рыторыка, геаметрыя, фізіка, маляванне, замежныя мовы.

Старэйшы па часе экспанат — таблі-ца лагарыфмаў, яна адносіцца да 1882 г. Ёсць «Грамматика русского языка» (1908), «Евангелие» (1913) — падарунак Кіеўскага апякунскага савета Мазырскай гімназіі. Захоўваецца вучнёўскі сшытак (1913), «Буквар» (1914)...

Мазыране памятаюць будынак жаночай гімназіі, які не так даўно быў знесены. У 1907 г. працавала ў горадзе рамесніцкая школа.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў Мазыры было 10 агульнаадукацыйных школ, у тым ліку 6 сярэдніх, сярэдняя школа працуючай моладзі, педвучылішча, медшкола, дзіцячая музычная школа, шэраг дзіцячых садкоў. Працавала 148 настаўнікаў. Быў ажыццёўлены пераход да ўсеагульнай сямігадовай адукацыі.

У дні вайны многія работнікі асветы змагаліся з ворагам на фронце, у партызанскіх атрадах, у падполлі — настаўніцы Г. В. Родэ, А. Г. Папрацінская, выкладчыкі педвучылішча А. С. Мураўёў, К. В. Катлінскі і іншыя.

У лютым 1944 г. беларускі ўрад прыняў рашэнне аб адкрыцці ў Мазыры настаўніцкага інстытута. Ён пачаў працаваць у красавіку, першым дырэктарам быў прафесар А. Г. Карафан. Вялі-

кую дапамогу маладой навучальнай установе аказалі працоўныя Ульянаўскай вобласці, якія перадалі ў Мазыр падручнікі, сшыткі, абутак, вопратку. У 1952 г. настаўніцкі інстытут пераўтвораны ў педінстытут.

Гэтай навучальнай установе адведзены асобы раздзел экспазіцыі.

Цяпер у Мазыры працуюць педінстытут, палітэхнікум, медыцынскае і музычнае вучылішчы, чатыры ПТВ, 15 агульнаадукацыйных школ, санаторна-лясная школа і школа працуючай моладзі.

А. Бобр

Гучыць купалаўскае слова

У сярэдняй школе № 3 (школе-гімназіі) амаль 10 гадоў назад быў адкрыты музей Янкі Купалы. Вялікі ўклад у стварэнне і папаўненне музейнай экспазіцыі ўнеслі настаўнікі В. У. Грышко і Н. П. Протас. Шмат дапамагалі ў гэтым супрацоўнікі Дзяржаўнага музея Я. Купалы ў Мінску Я. Ю. Раманоўская і С. С. Майхровіч, якія перадалі школьнаму музею не толькі копіі дакументаў, але і шэраг арыгіналаў.

Сярод экспанатаў — ксеракопія газеты «Северо-Западный край», дзе ў 1905 г. быў змешчаны купалаўскі верш «Мужык», фотаздымак групы студэнтаў Пецярбургскага універсітэта, членаў літаратурнага гуртка, з якімі не раз сустракаўся Янка Купала. Зацікавіць наведвальнікаў дублікат першай кнігі паэта «Жалейка» (1908), фотаздымкі, адзін з якіх зроблены ў 1934 г. у час I Усесаюзнага з'езда пісьменнікаў.

У музеі праводзяцца пасяджэнні клуба старшакласнікаў — «Купалінка», які арганізаваны пры бібліятэчным філіяле № 1. Аднойчы госцяй клуба была В. І. Казлоўская, якую мазыране ведалі як артыстку гарадскога народнага тэатра. Вера Іванаўна прыгадала час, калі выхоўвалася ў дзіцячым доме ў Мінску, над якім бралі шэфства Янка Купала і яго жонка. Магнітафонны запіс успамінаў В. І. Казлоўскай захоўваецца ў музеі. Лічаць сваім абавязкам дапамагаць рабоце клуба старшакласнікаў і артысты драматычнага тэатра імя І. П. Мележа. У дні такіх сустрэч паказваюцца ўрыўкі са спектакляў па творах Янкі Купалы, гучаць яго вершы, ідзе гаворка аб творах беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Музей наведваюць вучні з іншых школ, студэнты, турысты.

Т. Піліпчук, У. Шарай

Мастацкая галерэя ў вёсцы

У маляўнічай мазырскай вёсцы Гурыны, у будынку былой школы па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле вялікіх аматараў і знаўцаў жывапісу і краязнаўцаў раёна А. Я. Бычкова і С. І. Касцяна ў 1976 г. была адкрыта Мазырская карцінная галерэя. У васьмі залах выстаўлены работы вядомых беларускіх і замежных, а таксама мясцовых мастакоў, скульптараў, майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Ёсць творы М. Савіцкага, Т. Вашчанкі, В. Волкава, Л. Рана, Я. Шмялёва, С. Вакара, А. Кашкурэвіча, А. Паслядовіч.

Асноўны раздзел экспазіцыі — рэтраспектыўная выстава пасляваеннага беларускага мастацтва 40—90-х гадоў. Пастаянна працуе раздзел заходнееўрапейскага мастацтва, у якім прадстаўлены творы сусветна вядомых мастакоў Леанарда да Вінчы, Рафаэля, Рэмбранта, Веласкеса, Рубенса і іншых. Гэта высакаякасныя і унікальныя факсімільныя рэпрадукцыі, створаныя ў Францыі. Калекцыя падаравана Надзеяй Лежэ, што нарадзілася ў Беларусі, арыгіналы гэтых твораў зберагаюцца ў скарбніцах Заходняй Еўропы, прыватных калекцыях.

У экспазіцыі цяпер каля 400 твораў сусветнага мастацтва. Музей з'яўляецца філіялам Дзяржаўнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і знаходзіцца ў творчым кантакце з супрацоўнікамі

галоўнага музея рэспублікі, ажыццяўляецца пастаянны абмен карцінамі.

З вялікім поспехам прайшлі ў галерэі выставы беларускіх майстроў, якія працавалі ў канцы XIX — пачатку XX стст. у Расіі: В. К. Бялыніцкага-Бірулі, С. Ю. Жукоўскага, амерыканска-беларускай мастачкі Н. Русак, В. Жолтак. Арганізоўваюцца тэматычныя выставы «Бытавы жанр», «Партрэт», «Пейзаж»...

Часта выстаўляюцца і знаходзяцца ў галерэі работы мазыраніна М. М. Пушкара. У музеі можна ўбачыць таксама творы мінскіх мастакоў, якія працавалі на Мазыршчыне, пісалі партрэты лепшых працаўнікоў раёна. Тут змешчаны партрэты ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны І. Букіша і І. Ахраменкі, даяркі калгаса «Радзіма» С. Сузько работы В. Гомана. Ёсць партрэт работы У. Бараноўскага П. М. Лузана, актыўнага ўдзельніка партызанскага руху. Непаўторную прыгажосць мазырскага краю адлюстравалі на сваіх палотнах пейзажысты У. Бараноўскі, В. Мінейка, В. Цюрын, А. Ландарскі.

Адзін з пакояў музея з'яўляецца мемарыяльным. Тут адноўлены рабочы кабінет, сабраны матэрыялы, кнігі, рэчы вядомага вучонага-генетыка, выхадца з Мазыршчыны акадэміка АН Беларусі П. Ф. Ракіцкага.

Сюды прыязджаюць турысты з розных краін і гарадоў з адной мэтай — на сустрэчу з прыгожым. І музей дорыць ім гэтую радасць.

Н. Краўчанка

Фільм здымаецца ў Мазыры

Кінастудыя «Беларусьфільм» і браціслаўская «Каліба» (Чэхаславакія) пачалі ў Мазыры здымкі фільма «Капітан Ян» па сцэнарыі Анатоля Дзялендзіка.

Чэхаславацкай кіназдымачнай групай кіруе кінарэжысёр Марцін Цяпак, а беларускай — заслужаны дзеяч мастацтваў Аляксандр Карпаў.

Гэты кінарэжысёр ужо даўно вядомы нашым кінагледачам. Ён з'яўляецца стваральнікам такіх фільмаў, як «Далёка ў гарах», «Цішыня», «Сказ аб шчасці», «Дарога ў тысячу вёрст» і інш.

Фільм «Капітан Ян» раскажа аб нацыянальным Героі Чэхаславакіі і Героі Савецкага Саюза Яне Налепку, які ў гады мінулай вайны перайшоў на бок палескіх партызан і разам з імі змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Камандзір партызанскага атрада Налепка загінуў у лістападзе 1943 г. у баі за г. Оўруч.

У галоўнай ролі Яна Налепкі здымаецца акцёр браціслаўскага тэатра Мілан Княшко.

Ролю камісара партызанскага атрада выконвае народны артыст Беларускай ССР Фёдар Шмакаў, а партызанскай сувязной Кузуркі — папулярная кінаактрыса савецкага кіно Нона Мардзюкова. У карціне здымаюцца таксама артыстка Мая Булгакава, акцёр беларускага тэатра Белахвосцік і іншыя.

Падзеі, аб якіх будзе расказвацца ў кінастужцы, адбываліся менавіта ў гэтых краях. 101-шы славацкі полк, начальнікам штаба якога быў Ян Налепка, дыслацыраваўся ў 1943 г. у Мазыры і Ельску.

М. Кулыба

«Камуніст Палесся», 15 сакавіка 1972 г.

Ад рэдактара-складальніка

Назва фільма «Капітан Ян» існавала ў працэсе вытворчасці кінастужкі. На экраны ж СССР праз год выйшаў кінафільм «Заўтра будзе позна». Акрамя гэтага фільма ў Мазыры і яго ваколіцах здымаліся кінастужкі «Дзяўчынка шукае бацьку», «Паводка» («Беларусьфільм»), «Адзіноцтва» (Адэская кінастудыя) і іншыя.

Калі спявае душа...

«Песні роднага краю» — так называецца зборнік твораў мазырскіх самадзейных кампазітараў. Адзін з іх — І. М. Казелька, былы выкладчык му-

зычнай школы, кіраўнік некалькіх харавых калектываў Дамоў культуры і прадпрыемстваў. Песні Івана Мікітавіча даўно вядомы ў Беларусі.

Яшчэ адзін самадзейны кампазітар, творы якога ўвайшлі ў гэты зборнік, — А. М. Аўсіюк, выкладчык кафедры музыкі Мазырскага педінстытута. Яго песні гучаць у выкананні студэнцкіх хораў, ансамбляў, салістаў, а таксама хору ветэранаў вайны і працы, якім шмат гадоў кіруе А. М. Аўсіюк. Складальнік зборніка — выкладчык дзіцячай музычнай школы В. Р. Сярэбранікаў. Яго песні і аркестравыя п'есы заўсёды ў рэпертуары дзіцячых самадзейных калектываў.

Многія паэты, на вершы якіх напісаны песні, таксама мазыране. Гэта выкладчыкі педінстытута Галіна Дашкевіч і Ніна Аксёнчык, супрацоўнік краязнаўчага музея Васіль Андрыеўскі, выпускніца сярэдняй школы № 2 Святлана Леў. У зборніку музычныя творы на вершы беларускіх паэтаў Пятра Глебкі, Адама Русака, Уладзіміра Верамейчыка, Генадзя Бураўкіна, расійскіх — Аляксандра Пракоф'ева, Сяргея Астравога і іншых. Для некаторых сваіх песень І. М. Казелька піша вершы сам.

Меладычнасць песень, іх зручны для выканання дыяпазон сведчаць аб высокім прафесійным майстэрстве нашых самадзейных кампазітараў.

Са зборніка «Песні роднага краю».

ПРИПЯТЬ-МАТУШКА

Слова и музыка И. Н. Козелько

Припять-матушка ненаглядная
В синем мареве, как в дыму,
Вечно юная и нарядная,
Сердцу дорога моему.
А вокруг луга золоченые,
Все поет и звенит, как струна.
Ароматом трав напоенные
Ветерок, пески и волна.

Припять-матушка,
Сколько бурь и гроз
У твоих берегов пронеслось,
Сколько разных дум,
Сколько горьких слез
На волну твою пролилось.

Припять-матушка, над тобой плывут
В дали дальние облака,
Далеко плывут, к светлому зовут,
К доброму зовут на века.

МОЗЫРСКАЯ ЛИРИЧЕСКАЯ

Слова и музыка И. Н. Козелько

Погляжу на глобус, вижу горы, реки,
Океаны, степи, все как дивный сон,
А в средине вижу,
В самом, самом центре,
Точечку родную — Мозырский район.

За селом Булавки стоит холм высокий,
А вокруг палетки, лес со всех сторон.
За рекою дали сине-голубые,
Это — край родимый, Мозырский район.

Солнце поднимает белые туманы,
Припять дарит небу розовую гладь.
Эти все картины так вошли нам в душу,
Где б мы ни бывали — будем вспоминать.

Знаем мы, что в мире много мест красивых,
Городов, сиянье золоченых крыш,
Но не променяю наш холмистый Мозырь
На туманный Лондон, даже на Париж.

Захоўваецца гісторыя

На падставе пастановы Савета Міністраў БССР «Аб мерах па паляпшэнні архіўнай справы ў БССР» ад 11 лістапада 1963 г. ліквідаваны гарадскія і раённыя дзяржаўныя архівы і ўтвораны філіял Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці ў Мазыры. Ён абслугоўвае гарады Калінкавічы і Мазыр, Ельскі, Жыткавіцкі, Калінкавіцкі, Мазырскі, Петрыкаўскі, Лельчыцкі і Нараўлянскі раёны. У задачы філіяла ўваходзіць ажыццяўленне арганізацыйна-метадычнага кіраўніцтва і кантролю за ведамаснымі архівамі і справаводствам 370 арганізацый і ўстаноў, размешчаных у зоне абслугоўвання філіяла.

У архіве працуе 13 спецыялістаў, якія праводзяць навукова-тэхнічную экспертызу каштоўнасці дакументаў ва ўстановах, арганізацыях, захоўваюць і выкарыстоўваюць іх. У Мазырскім філіяле захоўваецца звыш 230 тысяч

спраў, у кожнай справе — 100—200 дакументаў. Вялікая ўвага была ўдзелена на працягу апошніх гадоў зняццю абмежаванняў на доступ да дакументаў. Сярод іх — спісы так званых сацыяльна чужых элементаў 20—30-х гг. гэтага стагоддзя.

За 30 гадоў работы філіяла архіва над рознымі тэмамі працавалі сотні чалавек. За апошнія гады актывізавалася работа з прадстаўнікамі школ, бібліятэк, сельскіх Саветаў, членамі камісій па стварэнні кніг «Памяць». За 1963—1992 гг. паступіла звыш 75 тысяч запытанняў грамадзян аб пацвярджэнні працоўнага стажу работы, прымусовым угоне ў Германію і г. д. Архіў наведалі за гэты час звыш 15 тысяч чалавек. Апрацавана і прынята ад арганізацый 110 тысяч спраў. Філіял Дзяржархіва неаднаразова быў прызёрам сацыялістычнага спаборніцтва сярод філіялаў Гомельскай вобласці, узнагароджваўся Ганаровымі граматамі Камітэта па архівах і справаводстве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

З вялікай увагай і высокай адказнасцю да сваіх абавязкаў адносяцца паважаныя, вопытныя супрацоўнікі архіва Л. П. Патук, М. В. Біднюк, А. І. Трафімава, М. Ф. Бандарэнка і іншыя.

Т. Вахрушава

Нашчадкам у спадчыну

Любоў да роднага краю — гэта ці не найперш любоў да ягонай прыроды. Таму ва ўмовах абвастрэння экалагічнай сітуацыі на Мазыршчыне клапоцяцца пра яе і ўсяляк аберагаюць. У прыватнасці, вызначаны і старанна ахоўваюцца помнікі прыроды рэспубліканскага і мясцовага значэння.

Каменныя валы — на паўночна-заходняй ускраіне пасёлка Крынічны. Тры вялікія валуны ледніковага паходжання: два большыя — побач і трэці меншы — воддаль. Пра іх ёсць некалькі паданняў. Вось два з іх.



Каменныя валы

Селянін Іван на Вялікдзень паехаў араць валамі сваё поле. А гэта быў вялікі грэх. Арэ Іван і раптам чуе голас з неба: «Іван, не гняві мяне, кінь араць, паважай нашу веру». Не паслухаў селянін Бога, як араў, так і арэ. І раптам у ясным небе загрымеў гром, бліснула маланка, а гаспадар і ягоныя валы ператварыліся ў тры вялізныя камяні. З таго часу ляжаць яны пры дарозе як напамін пра тое, што нельга ісці супраць Бога...

Па другім паданні, валы ў селяніна вельмі стаміліся, перасталі цягнуць саху. Ён пачаў сцябаць пугай знясіленых жывёлін і крычаць на іх. У гэты час па дарозе ішоў вельмі стары чалавек, увесь белы, з кіёчкам у руцэ. Убачыўшы, як Іван здзекуецца з жывёлы, пачаў яго дакараць... Але скнарнасць засціла Івану розум — ня добрымі словамі абазваў ён старога. Вечарам не дачакаліся дома гаспадара з валамі. На тым месцы, дзе Іван араў, людзі ўбачылі тры вялізныя камяні... Вось да чаго давяла скнарнасць і непавага да старога чалавека.

ЗАКАЗНІКІ

Мазырскія кручы — дзяржаўны ландшафтны заказнік, пл. 1140 га (ваколіцы Мазыра).

Зялёнамошскі — дзяржаўны заказнік па зберажэнні і ўзнаўленні фауны і флоры, пл. 22,9 тыс. га (у заходняй частцы раёна).

Стрэльскі — дзяржаўны ландшафтны заказнік, пл. 15 га (ваколіцы в. Стрэльск).

Белае — мікразаказнік у Ляшнянскім лясніцтве па зберажэнні рэдкіх відаў раслін, пл. 20 га.

Гай карэльскай бярозы — 32 экземпляры на плошчы каля 2 га (паўночная ўскраіна в. Слабада).

ЖУРАВІННІКІ

Махнавіцкае лясніцтва, ур. Качуры, пл. 40 га.

Раманаўскае лясніцтва, пл. 13 га.

ДУБРОВЫ

Мазырскае лясніцтва, пл. 209 га.
Слабадское лясніцтва, пл. 121 га.
Асавецкае лясніцтва, пл. 6 га.

САСНОВЫ БОР

Мазырскае лясніцтва, ур. Вялікі Бор, пл. 86,4 га.

Падрыхтаваў
М. Капач

Іх подзвіг не забыты

Непазнавальна змяніўся ў пасляваенныя гады Мазыр. Мазыране ўжо даўно прывыклі да яго шматпавярховых дамоў і прамысловых карпусоў. Даўно пабудаваныя заводы і фабрыкі не толькі адноўлены пасля вайны, але і рэканструяваны.

Дружнай сям'ёй жывуць і працуюць рускія і беларусы, украінцы і азербайджанцы, казахі і літоўцы, латышы і яўрэі — прадстаўнікі 22 нацыянальнасцей былога Савецкага Саюза. Знік з сусветнай карты вялікі і магутны агульны дом, які аб'ядноўваў пад сваім дахам братнія народы. Але з памяці людзей ніколі не сцерці слаўныя імёны тых, чый бессмяротны подзвіг, самаадданая любоў да Радзімы і свайго народа далі магчымасць нам сёння жыць пад мірным небам. Памяць пра іх удзячныя нашчадкі ўвекавечылі ў назвах вуліц і плошчаў роднага горада, пра іх подзвігі нагадваюць курганы Славы, абеліскі на брацкіх магілах, мемарыяльныя дошкі і іншыя знакі памяці...

Названы іх імёнамі

Многія вуліцы Мазыра названы імёнамі Герояў Савецкага Саюза:

БУМАЖКОВА Ціхана Піменавіча — удзельніка партызанскага руху на Палессі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

КАТАЕВА Міхаіла Максімавіча — удзельніка вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

КАТЛАЎЦА Міхаіла Паўлавіча — ураджэнца Мазырскага раёна.

НЯЖНОВА Валянціна Сцяпанавіча — удзельніка вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

РЫЖКОВА Антона Андрэевіча — удзельніка вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

ЦІХАНАВА Рыгора Мацвеевіча — удзельніка вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў;

Імёнамі ўдзельнікаў вызвалення Мазыршчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны:

ІВАНЕНКІ Арсена Сяргеевіча — удзельніка баёў за Мазыр у гады Вялікай Айчыннай вайны.

НЯЛІДАВА Фёдара Гаўрылавіча — удзельніка вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў;

Імёнамі кіраўнікоў камуністычнага падполля і партызанскага руху на Палессі ў гады Вялікай Айчыннай вайны:

ХАРУЖАЙ Веры Захараўны,
ЯЗЫКОВІЧА Фёдара Міхайлавіча.

У назвах вуліц увекавечаны імёны ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны:

АПАНСКАГА Іосіфа Казіміравіча,
ДАНІЛЕЎСКАГА Мікалая Сцяпанавіча,
САЕТА Гаўрылы Рыгоравіча,
ТРУСЕВІЧА Івана Данілавіча.

Помняць мазыране і супрацоўнікаў міліцыі, якія загінулі ў мірныя дні ў барацьбе з бандытамі пры іх затрыманні. Дзвюм мазырскім вуліцам дадзены імёны:

МАРЦІНОВІЧА Міхаіла Аляксандравіча,
ЦАРЭНКІ Аляксандра Платонавіча.

І. Піліпчук

Узнагарода знайшла героя

У час ваеннага ліхалецця нярэдка здаралася так, што воіны, якія здзейснілі гераічныя подзвігі, не паспявалі атрымаць заслужаную ўзнагароду. Толькі праз шмат гадоў пасля вайны ўзнагароды знаходзілі герояў.

Пасля 1960 г. уручаны жыхарам Мазыршчыны:

ОРДЭН ЛЕНІНА

ХАРАМЕЦКАМУ Іосіфу Сямёнавічу

ОРДЭН АЛЯКСАНДРА НЕЎСКАГА

ГАРШКОВУ А. П.

ОРДЭН ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

ГВАЗДЗЮ Аркадзю Андрэевічу
ГАНЧАРЭНКУ Аляксандру Міхайлавічу
ЛЯДВІГУ Уладзіміру Міхайлавічу

ОРДЭН ЧЫРВОНАЙ ЗОРКІ

ЕРАМЕЕВУ Івану Якаўлевічу
МАШУРАВУ Міхаілу Васілевічу
РУДЗІНСКАМУ Казіміру Казіміравічу

ОРДЭН СЛАВЫ III СТУПЕНІ

БАБРУ Мацвею Дзям'янавічу
БАРЫНАВУ Аляксею Андрэевічу
ГРЫШКОВУ Яўхіму Маркавічу
МЕЛЬНІКАВУ Міхаілу Дарафеевічу
МІЦУРУ Аўгусту Мацвеевічу
РУДЗІНСКАМУ Івану Валяр'янавічу
ФІЛІСТАВУ Дзмітрыю Іванавічу
ЮНІЦКАМУ Міхаілу Пятровічу

Ішлі радыёграмы з Мінскага падполля...

Сасноўская Вера Іванаўна нарадзілася ў 1923 г. у в. Навікі Мазырскага раёна. Да 1941 г. вучылася ў тэхнікуме. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. У 1943—1944 гг. на падпольнай рабоце ў Мінску. З 1946 г. жыла ў Мазыры.

...У навагоднюю ноч 1943 года праз лінію фронту ў Мінск была закінута з групай разведупраўлення Генеральнага штаба Чырвонай Арміі Вера Іванаўна Сасноўская, ураджэнка Мазыршчыны, дзе і знаходзілася доўгіх 550 дзён і начэй.

Цяжка нават уявіць сабе работу падпольнай радысткі ў перапоўненым варожымі войскамі горадзе, з развітай сістэмай падслухоўвання і кантролю за эфірам. Зверставалі СС і СД — службы бяспекі. Былі выпадкі, што на працягу сутак месцазнаходжанне рацыі мянялася двойчы. А што значыць перанесці рацыю з цяжкімі батарэямі сілкавання ва ўмовах пастаяннага пат-

В. І. Сасноўская

руліравання вуліц і смяротнай рызыкі! Але рэдкае шанцаванне: Вера Іванаўна ў складанай сітуацыі выжыла, не ведала правалаў, вытрымала і забяспечыла работу такой неабходнай для разведчыкаў рацыі.

А як жа дзейнічаў на псіхіку чалавека акупацыйны рэжым! Што ні дзень, што ні гадзіна — трывожная нечаканасць: тут перастрэлка, там аблава, на суседняй вуліцы арышты, у парку зноў вешалі падпольшчыкаў... Не ўсякі мог бы вытрымаць гэта...

Але ў эфір ішлі сігналы: «Цэнтр! Прыміце радыёграму з Мінска...» Цяжка цяпер падлічыць перададзеныя ў эфір паведамленні. Проста не ставілася тады такой задачы. Працавала, і ўсё! Але некалькі сотняў, а то і тысяча, магчыма, набярэцца. І пасля кожнай перадачы — смяротная рызыка. Гэта ж былі звесткі аб размяшчэнні сіл праціўніка, іх руху, паводзінах і планах акупацыйных улад, становішчы ў горадзе і многае іншае. І вельмі вялікую плату далі б фашысты за тое, каб ведаць, хто пасылае такую інфармацыю...

Пасля вайны Вера Іванаўна вярнулася на радзіму — у Мазыр. Амаль 23 гады працавала загадчыцай раённага аддзела сацыяльнага забеспячэння. У першыя мірныя гады гэта была нялёгкая работа — з людзьмі, якія перанеслі вайну, сем'ямі загінуўшых, параненымі — без ног, без рук, сляпымі, тымі, хто вытрымаў страшныя мукі, застаўся без здароўя, нерваў, каму патрэбна была маральная і матэрыяльная падтрымка. Але хутка Вера Іванаўна навучылася распазнаваць людзей, а многіх ведала ўжо асабіста. Адзін вярнуўся інвалідам са шпіталя ў зямлянку (хата згарэла), другі прыпоўз з палону ледзьве жывы, а трэці ў сорак першым вярнуўся з акружэння на пары добрых коней і цяпер вялікія правы «качае»... Дапамагала ў рабоце ваенная загартоўка.

Памерла Вера Іванаўна ў 1996 годзе.

М. Капач

Гераічная вёска

...З 1924 года Мялешкавічы былі цэнтрам сельскага Савета. Спаленая ў 1920 годзе белапольскімі акупантамі, да 1925 года вёска поўнасцю адбудавалася.

...1930 год. У вёсцы арганізаваны калгас «Палескі партызан». Амаль усё сталае насельніцтва ўключылася ў калектыўную сельскагаспадарчую вытворчасць. У тыя ж 30-я гады ў вёсцы пачалі працаваць васьмігадовая школа і хата-чытальня.

...Не мінула вёску і горкая доля 1937—1940 гадоў. Восем яе жыхароў былі без падстаў арыштаваны, як «ворагі народа». Бікша Іван Аўгуставіч, Бягляк Васіль Каленікавіч, Бягляк Васіль Парфенавіч, Петрушкевіч Баляслаў Феліксавіч і Шурынаў Яўхім Платонавіч расстраляны ў Мазыры.

...Звыш 400 чалавек жыхароў Мялешкавіч у 1941 годзе сталі ў рады абаронцаў Радзімы. Мужчыны таксама пайшлі ваяваць у партызанскія злучэнні С. А. Каўпака і А. Ф. Сабурава, Мазырскую партызанскую брыгаду імя Аляксандра Неўскага. Камандзірам брыгады стаў жыхар Мялешкавіч Аляксандр Лукіч Жыльскі, камісарам — былы дырэктар Мялешкавіцкай школы Міхаіл Кузьміч Ільінкоўскі. Жыхары вёскі змагаліся як маг-

лі. Не выконвалі распараджэнняў нямецкіх улад, хаваліся ў мясцовых лясах, дапамагалі партызанам.

Правалілася спроба фашыстаў арганізаваць з мясцовых жыхароў паліцыю. Амаль усе 13 аднасяльчан, што паступілі на службу да акупантаў восенню 1941 года, праз месяц-другі агледзеліся: некаторыя з іх наладзілі сувязь з камуністычным падполлем, другія проста зразумелі, што хаўрусы з «новымі ўладамі» да дабра не прывядуць. У першую ж ваенную зіму большая частка паліцэйскіх была расстраляна самімі акупантамі.

З вайны не вярнулася 155 чалавек — загінулі на франтах і ў партызанскіх атрадах, прапалі без вестак; расстраляна, павешана і спалена жывымі больш як 80 мірных жыхароў. Але і гэтыя лічбы яшчэ не канчатковыя: прайшлі гады, памяць людзей і архівы ўсіх не зберагліі... У 1943 годзе вёска другі раз у гэтым стагоддзі была цалкам знішчана.

...Да 1950 года на папялішчах вайны выраслі новыя дамы і вытворчыя памяшканні калгаса. Жыццё ў вёсцы аднавілася...

...1989 год. Вёска стала цэнтрам новага саўгаса «Чырвоны Сцяг» — назва ў памяць аб гістарычных падзеях у гады грамадзянскай вайны, мужнасці яе жыхароў пры абароне Радзімы. Пачалося трэцяе ў стагоддзі адраджэнне населенага пункта. Будуецца жыллё, грамадскія і вытворчыя пабудовы. У вёсцы працуюць сярэдняя школа, участковая бальніца, сельскі Дом культуры з бібліятэкай, тры магазіны, аддзяленне сувязі, лясніцтва...

Вёска Мялешкавічы — якая ўзнікла ў сярэдзіне ці канцы XV стагоддзя — частка гісторыі нашага Палесся. Працавітыя людзі паклалі пачатак гэтай вёсцы, не адзін раз яе адраджалі, за яе жыццё гінулі. І жыццё працягваецца...

М. Галенка, М. Капач

Помнікі гісторыі

ГОРАД МАЗЫР

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА аб рэвалюцыйных падзеях і расстрэле дэманстрацыі рабочых у Мазыры ў 1905 г. (вул. Ленінская, 5).

ПОМНІК НА БРАЦКІХ МОГІЛКАХ змагароў за Савецкую ўладу, якія загінулі ў 1918 — 1920 гг. (вул. Фрунзе, каля стадыёна).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА на доме № 32, дзе 5.3.1920 г. у баі з белапалякамі загінуў камісар брыгады 41-й дывізіі, дзяржаўны і ваенны дзеяч Украіны М. С. Данілеўскі (вул. Ленінская).

МЕМАРЫЯЛЬНЫ ЗНАК на месцы дома, у якім у 1917—1920 гг. праходзілі з'езды рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў Мазырскага павета (вул. Ленінская).

АБЕЛІСК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ падпольшчыкаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вул. Крупскай, на тэрыторыі сярэдняй школы № 4).

КУРГАН СЛАВЫ, БРАЦКІЯ МОГІЛКІ савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў 1943—1944 гг. (вул. Рыжкова).

ПОМНІК ХАРУЖАЙ ВЕРЫ ЗАХАРАЎНЕ — зямлячцы, дзеячу рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, арганізатару і кіраўніку камуністычнага падполля ў Віцебску ў Вялікую Айчынную вайну, публіцысту, Герою Савецкага Саюза (вул. Ленінская).

ПОМНІК У ГОНАР САВЕЦКІХ ЛЁТЧЫКАЎ, якія ўдзельнічалі ў Мазырска-Калінкавіцкай аперацыі (вул. Інтэрнацыянальная).

ПОМНІК 100 РАБОТНІКАМ дрэваапрацоўчага камбіната, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вул. 8 Сакавіка).

ПОМНІК 7 РАБОЧЫМ металаапрацоўчай арцелі «Молат», якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вул. Ленінская).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА на доме, дзе быў палявы шпіталь, у якім лячыліся ў 1944—1945 гг. параненыя воіны (вул. Фрунзе, 1).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА на доме, дзе быў прызыўны пункт ваеннага камісарыята ў 1941 г. (вул. Пралетарская, 98).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ў гонар воінаў 111-га палка 55-й стралковай дывізіі 61-й арміі Беларускага фронту, якія ў студзені 1944 г. удзельнічалі ў вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (вул. Гогаля, 100).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ў гонар воінаў лыжнага батальёна і вучэбнага атрада 55-й стралковай дывізіі Беларускага фронту, якія ў студзені 1944 г. удзельнічалі ў вызваленні

горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (вул. Інтэрнацыянальная, 63).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ў гонар Талкачова Яўгена Іосіфавіча – падпольшчыка, які вучыўся ў сярэдняй школе № 2, загінуў у гады вайны (вул. Ленінская, 1).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ў гонар землякоў – работнікаў Мазырскага тэхнічнага Верхнедняпроўскага басейнавага ўпраўлення рачнога параходства, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вул. Савецкая, 105).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ў гонар воінаў 14-й і 15-й гвардзейскіх дывізій Беларускага фронту, якія ў студзені 1944 г. удзельнічалі ў вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (вул. 8 Сакавіка).

ПОМНІК У. І. ЛЕНІНУ на цэнтральнай плошчы горада.



АСАВЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска АСАВЕЦ

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні раёна (цэнтр вёскі).

ПОМНІК НА МАГІЛЕ воіна-інтэрнацыяналіста А. М. Дубеня, які загінуў 19.3.1984 г. у Афганістане (мясцовыя могілкі).

Вёска КРЫНІЧНАЯ ГРАДА

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні раёна (паўднёва-заходняя ўскраіна вёскі).

Вёска КАМЕНЬ

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў баях ці памерлі ад ран у шпіталі ў 1941—1944 гг. (усходняя ўскраіна вёскі).

ПОМНІК НА МАГІЛЕ ахвяр фашызму — мірнага насельніцтва, якія былі закатаваны ў 1941—1943 гг. (усходняя ўскраіна вёскі).

Вёска КРУШНІКІ

ПОМНІК ЮНІЦКІМ, якія загінулі ў гады неабгрунтаваных палітычных рэпрэсій у 1937—1939 гг. Устаноўлены на магіле А. Б. Юніцкай, у якой расстраляны муж, 5 сыноў і нявестка (вясковыя могілкі).

Былая вёска СПРЫМАЧОЎ

ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ — жыхарам гэтай і навакольных вёсак, якія закатаваны ў 1943 г. (на паляне па дарозе Крушнікі — Раманаўка).

БАРБАРОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска БАРБАРОЎ

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (цэнтр вёскі), у тым ліку грамадзянін Славакіі Я. Генжэль.

КАМЕНКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска БЯРОЗАЎКА

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў баях ці памерлі ад ран у шпіталі ў 1943—1944 гг. (усходняя ўскраіна).

Вёска ВЯЛІКІ БОКАЎ

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вясковыя могілкі).

ПОМНІК НА МАГІЛЕ воіна-інтэрнацыяналіста, работніка органаў міліцыі Царэнкі А. П., які загінуў пры выкананні службовых абавязкаў 31.5.1983 г. (вясковыя могілкі).

Вёска КАМЕНКА

ПОМНІК, МЕМАРЫЯЛЬНЫЯ КУРГАН І ПАРК, створаныя ў памяць аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (цэнтр вёскі).

Вёска МЯЛЕШКАВІЧЫ

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (на вясковых могілках).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ў гонар узнагароджання вёскі ў 1928 г. ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР — за мужнасць і гераізм яе насельніцтва ў гады грамадзянскай вайны (на будынку школы).

КОЗЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска БАБРАНЯТЫ

ПОМНІК М. І. КАЛІНІНУ каля будынка праўлення калгаса імя М. І. Калініна.

Вёска КОЗЕНКІ

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў баі ці памерлі ад ран у шпіталі ў 1944 г. (вясковыя могілкі).

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (цэнтр вёскі).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА на будынку Дома культуры ў памяць аб падпольнай патрыятычнай групе А. Б. Няпомняшчага, якая дзейнічала ў вёсцы ў 1942 г.

КРЫНІЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска БІБІКІ

ПОМНІК НА МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні раёна (на вясковых могілках).

ПОМНІК НА МАГІЛЕ аднавяскоўца маёра Тарасава Мікалая Апанасавіча, які загінуў 24.6.1944 г. пры вызваленні Палесся (на вясковых могілках).

Вёска ТВАРЫЧАЎКА

ПОМНІК Ф. Э. ДЗЯРЖЫНСКАМУ. У цэнтры вёскі, каля праўлення калгаса імя Ф. Э. Дзяржынскага.

МАХНАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска ЗАБАЛАЦЦЕ

ПОМНІК НА МАГІЛЕ ахвяр фашызму — мірных жыхароў вёскі, якія закатаваны ў Вялікую Айчынную вайну (цэнтр вёскі).

Вёска МАХНАВІЧЫ

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вясковыя могілкі).

ПОМНІК НА МАГІЛЕ ахвяр фашызму — мірных жыхароў вёскі, якія расстраляны ў Вялікую Айчынную вайну (у лесе за 0,5 км на ўсход ад вёскі).

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (цэнтр вёскі).

МІХАЛКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска МАЛЫ БОКАЎ

ПОМНІК НА МАГІЛЕ ст. лейтэнанта А. М. Мельнічэнкі, лётчыка Савецкай Арміі, які загінуў 25.10.1983 г. у Афганістане (вясковыя могілкі). У вёсцы адна з вуліц носіць яго імя. На будынку школы, дзе ён вучыўся, устаноўлена **МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА.**

Былая вёска МІХАЛКІ

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вясковыя могілкі).

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вясковыя могілкі).

Былая вёска КУСТАЎНІЦА

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вясковыя могілкі).

Вёска ПРАЎЦЮКІ

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА (на будынку сельскага магазіна) у памяць аб камандзіры брыгады Чырвонай Арміі В. Д. Каўшове, які загінуў у вёсцы 11.11.1920 г. у баі з бандамі Булак-Балаховіча. Пахаваны ў Маскве на Краснай плошчы.

Вёска РУДНЯ МІХАЛКАЎСКАЯ

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (цэнтр вёскі).

Дарога РУДНЯ МІХАЛКАЎСКАЯ — МІХАЛКІ

КРЫЖ З МЕМАРЫЯЛЬНАЙ ДОШКАЙ аб тым, што ў гэтым лесе ў 1937—1939 гг. было расстраляна і пахавана каля 700 чалавек — ахвяр неабгрунтаваных палітычных рэпрэсій.

ПРУДКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска ЗАГОРЫНЫ

ПОМНІК НА МАГІЛЕ юнгі Дняпроўскай ваеннай флатыліі Краўчанкі Эміля Андрэевіча, які загінуў 23.6.1944 г. (вясковыя могілкі).

Вёска ПРУДОК

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў студзені 1944 г. пры вызваленні раёна (вясковыя могілкі).

СКРЫГАЛАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска БЕЛАЯ

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (у цэнтры вёскі).

Вёска ЖАХАВІЧЫ

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні раёна (вясковыя могілкі).

Вёска ЛЕШНЯ

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА на будынку Ляшнянскай школы ў памяць аб земляку, былым вучні школы, Героі Савецкага Саюза М. П. Катлаўцу, які загінуў у 1944 г.

Вёска РУДНЯ СКРЫГАЛАЎСКАЯ

ПОМНІК НА МАГІЛЕ воіна Чырвонай Арміі А. Багданава, які загінуў у 1944 г. пры вызваленні раёна (вясковыя могілкі).

Вёска СКРЫГАЛАЎ

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вясковыя могілкі).

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (цэнтр вёскі).

ПОМНІК на месцы мяркуемага пакарання смерцю ў 1497 г. крымскімі татарамі мітрапаліта Кіеўскага і Усея Русі Макарыя (на беразе старога рэчышча Прыпяці за 1 км ад вёскі). У цэнтры вёскі ў канцы XIX ст. пабудавана капліца з іконай святапакутніку Макарыю.

СЛАБАДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска БУДА КАЗІМІРАЎСКАЯ

ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ – мірным жыхарам вёскі, якія закатаваны 22.3.1943 г. (на заходняй ускраіне).

Помнік жыхарам в. Казіміраўка

АБЕЛІСК ва ўрочышчы Белакор'е на месцы лагера партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага (за 3 км на паўночны захад ад вёскі).

Вёска ВЯЛІКІЯ ЗІМОВІШЧЫ

ПОМНІК М. В. ФРУНЗЕ. У цэнтры вёскі, каля праўлення калгаса імя М. В. Фрунзе.

Вёска КАЗІМІРАЎКА

ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ – мірным жыхарам вёскі, расстраляным і спаленым жывымі 22.3.1943 г. (у цэнтры вёскі).

Вёска КАСЦЮКОВІЧЫ

ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ – мірным жыхарам вёскі, 30.6.1943 г. патопленым, спаленым, расстраляным, а таксама **ТРЫ ЖАЛЕЗАБЕТОННЫЯ ПЛІТЫ** на месцы калодзежаў, ператвораных карнікамі ў брацкія магілы (у цэнтры вёскі).

МАГІЛА П. М. ДЗЯНЬГУБЕНКІ, воіна Чырвонай Арміі, які загінуў у студзені 1944 г. пры вызваленні вёскі (за 1 км на поўдзень ад вёскі).

ПОМНІК НА МАГІЛЕ воіна-інтэрнацыяналіста С. У. Сіліча, які загінуў 8.9.1987 г. у Афганістане (вясковыя могілкі). На будынку школы ў в. Майсееўка ў памяць аб яе былым вучні ўстаноўлена **МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА.**

Вёска РАМАНАЎКА

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ трох партызан, якія загінулі ў Вялікай Айчыннай вайне, у т. л. грамадзянін Славакіі Ш. Шверцал (заходняя ўскраіна вёскі).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА аб тым, што «В годы Великой Отечественной войны в 7, 11, 36, 37 кварталах Буда-Казимировского лесничества размещались партизанские отряды» (заходняя ўскраіна вёскі).

Вёска СЛАБАДА

ПОМНІК У. І. ЛЕНІНУ. У цэнтры вёскі, каля праўлення калгаса імя У. І. Леніна.

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ маракоў Прыпяцкай ваеннай флатыліі, чырвонаармейцаў, мірных жыхароў, якія загінулі ў 1918—1920 гг. у баях супраць кайзераўскіх і белапольскіх захопнікаў (вясковыя могілкі).

ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні раёна і памерлі ў шпіталях ад ран (вясковыя могілкі).

МЕМАРЫЯЛЬНЫ ПАРК і ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ, якія загінулі ў 1941—1945 гг. на франтах, у партызанскіх атрадах і патрыятычным падполлі (у цэнтры вёскі).

Вёска ШЧАКАТАВА

МЕМАРЫЯЛЬНЫ ЗНАК аб разгроме нямецкага гарнізона партызанамі Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага і злучэння А. Сабурава 30.8.1943 г. (вясковыя могілкі).

МЕМАРЫЯЛЬНЫ ЗНАК на месцы бою партызан брыгады імя Аляксандра Неўскага з калонай войск праціўніка 3.10.1943 г. (дарога Слабада — Белая).

Падрыхтавалі
М. Капач, І. Піліпчук

Паміж мінулым і будучым

Дзевяць пасляваенных гадоў Мазыр заставаўся адміністрацыйным цэнтрам Палескай вобласці. 8 студзеня 1954 года Вярхоўны Савет БССР выдаў указ аб яе скасаванні, і Мазыр стаў раённым цэнтрам. Аднак горад працягваў інтэнсіўна расці і развівацца, ішло будаўніцтва новых прадпрыемстваў, пашыралася яго тэрыторыя. Значныя зрухі — эканамічныя, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя, дэмаграфічныя адбыліся за пасляваенны час і ў раёне. Некаторыя падагульняючыя звесткі такога характару — пра сённяшні Мазыр, пра сельскія населеныя пункты — прыводзяцца ніжэй.

Сённяшні дзень Мазыршчыны — гэта вынік таго гістарычнага шляху, які



Мазыр. Сходы ад гасцініцы «Прыпяць» да берага ракі

прайшла яна ад старажытнасці да нашага часу, і шлях гэты падрабязна прасочваецца ў храналагічнай табліцы, што змяшчаецца ў канцы кнігі.

ЭКСПЛІКАЦЫЯ ЗЯМЕЛЬ г. МАЗЫРА НА 1.1.1996 г.

Агульная колькасць прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў — 482.

Агульная плошча зямлі г. Мазыр — 3674,17 га.

Прамысловыя, транспартныя і іншыя прадпрыемствы — 1255,43 га.

Прыродаахоўныя землі — 1030,5 га.

Землі, занятыя:

— прыватным сектарам — 657,0 га,
— вуліцамі, плошчамі, тратуарамі — 249,41 га,
— капітальным будаўніцтвам — 1590 га,
— дзяржлесфондам — 102,0 га,
— паркамі, скверамі — 21,83 га,
— садамі — 125,0 га,
— ягаднікамі — 31,0 га,
— ракой Прыпяць — 199,0 га,
— заліўным лугам — 12,0 га,
— равамі — 457,0 га,
— лесапаркамі — 511,0 га,
— балотамі — 8,0 га,
— азёрамі — 14,5 га.

Са справаздачы архітэктурнага аддзела Мазырскага гарвыканкама

Калгасы і саўгасы Мазырскага раёна на 1.1.1996 г.

Калгасы

«Серп і молат»	— в. Барбароў
імя Калініна	— в. Бабраняты
імя Дзяржынскага	— в. Тварычаўка
«Радзіма»	— в. Козенкі
«Прамень Кастрычніка»	— в. Махнавічы
імя Леніна	— в. Слабада
імя Фрунзе	— в. Вялікія Зімовішчы
імя Крупскай	— в. Раманаўка
«Перамога»	— в. Майсееўка
«Беларусь»	— в. Белая
«Дружба»	— в. Скрыгалаў
«Асавец»	— в. Асавец
«Палессе»	— в. Глініца

Саўгасы

«Прыпяць»	— г. Мазыр
«Мазырскі»	— в. Рудня Міхалкаўская
«Чырвоны Сцяг»	— в. Мялешкавічы
Эксперыментальная база «Крынічная»	— пас. Крынічны
Сартавыпрабавальная станцыя «Прудок»	— в. Прудок
Мазырская агароднінная фабрыка	— в. Каменка
Мазырская птушкафабрыка	— в. Ляхаўцы
Саўгас-камбінат «Зара»	— пас. Крынічны

Населеныя пункты Мазырскага раёна на 1.1.1996 г.

Населеныя пункты	колькасць гаспадарак	колькасць жыхароў	у тым ліку	
			працаздольныя	дзеці
Асавецкі сельскі Савет				
в. Асавец	252	672	298	233
в. Асавецкая Буда	11	24	4	2
в. Гіневічаў Груд	5	9	3	—
в. Глініца	179	420	165	103
в. Зімавая Буда	31	53	5	—
в. Камень	13	27	11	2
в. Крушнікі	70	154	54	30
в. Крынічная Града	6	9	—	—
в. Летавішча	13	21	3	2
в. Перадрэйка	35	58	14	6
в. Скалодзін	48	73	11	1
в. Турбінка	12	19	1	—
пас. Глініцкі	23	50	11	7
Барбароўскі сельскі Савет				
в. Барбароў	120	221	75	43
в. Верхні Млынок	10	13	2	—
в. Горная (Капліца)	15	19	4	—
в. Ніжні Млынок	15	18	—	—
пас. Новая Ніва	6	9	1	—
пас. Перадавы	52	183	84	78
пас. Прагрэс	25	36	2	12
пас. Чырвоная Горка	8	12	3	2
Каменкаўскі сельскі Савет				
в. Антонаўка	29	48	7	1
в. Бярозаўка	32	49	3	—
в. Васькаўка	55	87	15	—
в. Вялікі Бокаў	76	153	48	19
в. Гостаў	22	33	3	—
в. Зялёнка	13	24	3	—
в. Іванкаўшчына	114	215	62	18
в. Каменка	235	648	310	185
в. Млынок	19	39	19	3
в. Мялешкавічы	257	570	197	141
в. Свірынаўка	26	44	9	2
пас. Сасновы	200	650	327	273
Козенскі сельскі Савет				
в. Бабраняты	118	330	137	67
в. Булаўкі	106	309	147	63
в. Дразды	149	344	164	64
в. Козенкі	1032	3248	1727	924

Населеныя пункты	колькасць гаспадарак	колькасць жыхароў	у тым ліку	
			працаздольныя	дзеці
в. Лучажэвічы	106	278	124	43
в. Навікі	147	385	211	70
в. Нагорныя	150	409	197	68
в. Нараўшчызна	58	188	87	72
в. Пранькі	59	140	68	18
в. Раеўскія	21	43	11	3
Крынічанскі сельскі Савет				
в. Акулінка	75	116	16	4
в. Бібікі	164	326	140	50
в. Гурыны	143	333	129	52
в. Лубня	21	38	7	—
в. Матрункі	69	105	24	—
в. Пянькі	6	12	2	2
в. Стрэльск	52	73	12	—
в. Тварычаўка	106	314	140	100
пас. Крынічны	353	1163	631	411
хут. Молажава	6	7	1	—
Махнавіцкі сельскі Савет				
в. Дзербінка	53	107	27	23
в. Забалацце	69	118	30	8
в. Заводны Востраў	37	58	17	2
в. Зялёны Мох	8	12	3	—
в. Махнавічы	304	836	313	223
в. Падлядзічы	18	51	23	11

Населеныя пункты	колькасць гаспадарак	колькасць жыхароў	у тым ліку	
			працаздольныя	дзеці
Міхалкаўскі сельскі Савет				
в. Малы Бокаў	52	94	37	16
в. Міцькі	60	90	37	7
в. Ляхаўцы	17	28	13	—
в. Праўцюкі	33	45	14	4
в. Рудня Міхалкаўская	369	994	473	310
в. Стараселле	36	81	27	14
пас. «Дружба»	35	94	56	25
пас. Міхалкі	14	48	31	16
Прудкоўскі сельскі Савет				
в. Барыскавічы	172	298	85	24
в. Загорыны	86	139	19	7
в. Мерабель	26	37	5	—
в. Прудок	325	842	390	189
в. Рэдзька	12	18	—	—
Скрыгалаўскі сельскі Савет				
в. Балажэвічы	106	213	84	29
в. Белая	129	304	129	67
в. Жахавічы	116	189	33	3
в. Лешня	139	257	79	40
в. Надаткі	62	104	31	6
в. Рудня Скрыгалаўская	51	102	36	9
в. Скрыгалаў	364	891	361	196
в. Ясенец	27	41	7	1

Вёска Козенкі. Новая вуліца

Населеныя пункты	колькасць гаспадарак	колькасць жыхароў	у тым ліку	
			працаздольныя	дзеці
Слабадскі сельскі Савет				
в. Буда Казіміраўская	12	18	—	—
в. Вялікія Зімовішчы	132	300	105	82
в. Казіміраўка	5	5	—	—
в. Касцюковічы	86	125	23	1
в. Майсееўка	151	416	115	68
в. Малыя Зімовішчы	149	339	129	82
в. Раманаўка	188	382	100	61
в. Рудня Каменская	42	81	19	16
в. Слабада	410	866	349	207
в. Слабодка	69	103	13	4
в. Хамічкі	113	191	58	20
в. Чарамашня	3	4	—	—
в. Шчакатава	23	33	—	—

Населеныя пункты, якія зліліся з г. Мазыром

Вёскі: Бабры, Баравікі, Кімбараўка, Майская (да 1964 г. Лапці), Салаўёўка, Целяпуны.

Населеныя пункты, якія перасталі існаваць

Асавецкі сельсавет: в. Спрымачоў (спалена ў Вялікую Айчынную вайну).

Крынічанскі сельсавет: в. Лубня Малая (у 1984 г. злілася з в. Лубня).

Міхалкаўскі сельсавет: в. Кустаўніца (знесена ў 1980 г.) і Міхалкі (знесена ў 1992 г.) у сувязі з будаўніцтвам Мазырскага прамвузла.

Абнавілася Майсееўка...

Вёска знаходзіцца за 18 кіламетраў ад Мазыра. Старажылы сцвярджаюць, што назву вёска атрымала ад імя яе заснавальніка — Майсея. У 1909 г. у вёсцы было 64 двары і 456 жыхароў. Зямлі ў сялян было вельмі мала. Затое палосы пана Снядзецкага падступалі да самай Майсееўкі. Да яго ішлі працаваць вяскоўцы.

Школы ў вёсцы да рэвалюцыі не было. У першыя гады Савецкай улады школа пачала працаваць у прыватным доме, у адным пакоі — тры класы. Навучаў іх адзін настаўнік. Працягвалі вучобу ў Слабадзе, дзе працавала сямігодка, якую пасля пераўтварылі ў дзесяцігодку. Да вайны Слабадскую сярэднюю школу заканчвалі двое-трое майсееўскіх дзяцей.

Асноўным заняткам майсееўцаў было земляробства, жывёлагадоўля, рыбалоўства, лесанарыхтоўкі. За пасляваенны час спаленая датла Майсееўка ператварылася ў прыгожае сяло. З аднаго боку — агромністы сад, з другога — рукатворнае возера, дзе можна і пакупацца, і парыбачыць.

Паўночная ўскраіна вёскі ўпрыгожылася новымі цагляными дамамі, а новы пасёлак, пабудаваны пад лесам для перасяленцаў з чарнобыльскай зоны, амаль што злучыў Майсееўку з Хамічкамі.

Замест дарог з сыпкім пяском і непралазнай граззю, дзе буксавалі нават трактары, пракладзена асфальтавая шаша, якая звязвае Майсееўку з Мазыром і вёскамі.

А. Колас

На чале горада і раёна

Перыяд пасляваеннага аднаўлення і далейшага развіцця народнай гаспадаркі і сацыяльнай сферы Мазыршчыны — гераічная старонка яе найноўшай гісторыі. У гэтай кнізе названы дзесяткі гарадскіх і сельскіх калектываў, сотні лепшых людзей надпрыпяцкага краю, якія ў пасляваенны час нястомнай працаю спрыялі яго матэрыяльнаму і духоўнаму ўздыму. Несумненна, вялікае значэнне для агульнага поспеху мела мабілізуючая дзейнасць былых партыйных структур, але апошнія падзеі паказалі, што сапраўды незаменнай на гэтым гістарычным этапе была актыўная, дзейсная роля органаў гарадской і раённай выканаўчай улады. Тут, у гарвыканкаме і райвыканкаме, вырашэнне складаных праблем агульнага, гарадскога або раённага маштабу заўсёды спалучалася з паўсядзённым клопатам аб асобным, канкрэтным чалавеку, які ішоў сюды са

сваёй жыццёвай патрэбаю, са сваім болем, сваёй бядою... Таму і людзі, якія ў розны час на працягу апошняга паўвека стаялі на чале нашага горада і раёна, заслугоўваюць таго, каб іх імёны таксама былі названы ў кнізе Памяці.

У пасляваенны час Мазырскі гарвыканкам узначальвалі:

Кароль А. П.	1944 г.
Кавальчук	
Іван Рыгоравіч	1944—1945 гг.
Раеўскі	
Антон Паўлавіч	1946 г.
Ваўчкоў	
Яўціхій Кірылавіч	1947—1950 гг.
Сякач	
Барыс Міхайлавіч	1951—1954 гг.
Зярноў	
Рыгор Васілевіч	1955—1958 гг.
Напрэеў	
Лявон Азаравіч	1959—1961 гг.
Коханаў	
Генадзь Міхайлавіч	1962—1970 гг.
Ганчар	
Рыгор Фядосавіч	1971—1986 гг.
Кенік	
Іван Альбінавіч	1987—1990 гг.
Шырай	
Валянціна Міхайлаўна	1990—1991 гг.

Мазырскі райвыканкам узначальвалі:

Жыльскі	
Аляксандр Лукіч	1944—1949 гг.
Крывянчук	
Пётр Паўлавіч	1949—1953 гг.
Паўтаран	
Іларыён Піліпавіч	1953—1954 гг.
Каралёў	
Сцяпан Міхайлавіч	1954—1958 гг.
Дворак	
Уладзімір Пятровіч	1958—1963 гг.
Міцкевіч	
Анатоль Іванавіч	1963—1967 гг.
Жамойдзік	
Вольга Віктараўна	1967—1972 гг.
Курылаў	
Уладзімір Якаўлевіч	1972—1982 гг.
Шаўцоў	
Уладзімір Міхайлавіч	1982—1991 гг.

З 1991 г. старшынёй Мазырскага гарвыканкама з'яўляецца Іван Данілавіч Замулка, старшынёй Мазырскага райвыканкама — Міхаіл Уладзіміравіч Саўчык. Яны і выступаюць у гэтай кнізе з заключным артыкулам.

І. Д. Замулка

М. У. Саўчык

Заглядваючы ў дзень заўтрашні

Наш палескі край мае багатую, непаўторную гісторыю. На працягу сваіх васьмі з паловай стагоддзяў Мазыр, як цэнтр рэгіёна, а з 1413 г. цэнтр Мазырскага павета, паказваў прыклады мужнасці і гераізму ў адстойванні свайго права на існаванне. Вякамі развіваўся горад, а разам з ім, у цеснай сувязі, узнікалі і развіваліся сельскія пасяленні жыхароў Палесся. Іх цяпер у раёне каля сотні. І хаця ў кожнай вёсцы свая гісторыя, усіх іх нябачнымі шляхамі, палітычнымі, адміністрацыйнымі і эканамічнымі адносінамі прыцягваў Мазыр. Так было з яго равеснікам Скрыгалавам, крыху маладзейшымі — Мялешкавічамі, Міхалкамі, Барбаровам і Слабадой. Гэтыя вёскі вякамі былі валаснымі цэнтрамі — прамежнымі пунктамі для кіравання сельскай мясцовасцю. Многа цяжкіх выпрабаванняў выпала на долю жыхароў Мазыршчыны, але горад і вёскі вытрымалі, выжылі.

З вышыні птушынага палёту асабліва добра відаць іх маляўнічыя краявіды. Упэўнена і спакойна нясе свае воды

прыгажуня Прыпяць, што ўжо за межамі раёна ўпадае ў Дняпро і разам з ім сімвалізуе непарыўную сувязь славян: беларусаў, рускіх, украінцаў. Інакш, чым некалькі стагоддзяў назад, выглядае сёння рака. Берагі яе ўпрыгожаны новымі вёскамі, пасёлкамі, гарадамі, квітнеючымі палямі і садамі. У яе воды глядзяцца шматпавярховыя дамы, а мнагатонныя краны час ад часу схіляюць перад ёю свае шыі-стрэлы, масты выгінаюць над ёю свае аркі. Мазыране і госці горада любяць адпачываць на набярэжнай, у парку «Перамога». На вуліцах Мазыра шумяць каштаны, ліпы, квітнеюць клумбы. Вышынны будынак Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, які паўстае на высокім правым беразе Прыпяці, гасцінна сустракае ўсіх, хто прыязджае ў горад. У будучым — гэта Палескі дзяржаўны універсітэт.

А сельская Мазыршчына? Узгоркі, палі, лугі, лясы, а сярод іх размясціліся вёскі і пасёлкі. Яны цяпер амаль усе звязаны добраўпарадкаванымі дарогамі, усюды новыя школы, клубы, жылыя дамы, памяшканні машынных двароў і жывёлагадоўчых ферм.

Жылыя кварталы Мазыра і вёсак захоўваюць у сваёй памяці імёны герояў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Як сімвал бессмяротнасці тых, хто здабыў у жорсткай барацьбе з фашызмам светлы Дзень Перамогі, гарыць ля падножжа Кургана Славы Вечны агонь, дзесяткі помнікаў узведзены на брацкіх магілах і ў гонар загінуўшых землякоў. Алея Памяці, пасаджаная ветэранамі вайны ў гонар 50-годдзя Перамогі, праз некалькі год расправіць сваё вецце і будзе нагадваць нашым нашчадкам аб велічы неўміручага подзвігу іх дзядоў.

На ўскраіне горада размешчана прамысловая зона, дзе працуюць калектывы гігантаў індустрыі горада і рэспублікі: Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода, завода кармавых дражджэй, завода «Мазырсельмаш», солевыварачнага камбіната. Пасля рэканструкцыі НПЗ будзе ўяўляць сабой сучаснае прадпрыемства з канкурэнтаздольнай на Захадзе прадукцыяй. Рэканструкцыя дасць значны штуршок і для развіцця іншых галін прамысловасці.

Каб больш упэўнена глядзець у будучае, гарадскі выканаўчы камітэт стварае новую праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна. Да яе распрацоўкі прыступілі вучоныя, эканамісты, сацыёлагі, кіраўнікі прадпрыемстваў. Разам з вырашэннем іншых гарадскіх праблем праграма прадугледжвае і тэхнічнае пераабсталяванне некаторых прамысловых аб'ектаў. Укараненне найноўшых тэхналогій дасць магчымасць выпускаць прадукцыю на ўзроўні сусветных стандартаў.

Маецца праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця і ў райвыканкаме. Для яе выканання ёсць неабходныя перадумовы. Галоўная з іх — стабільныя кадры сельскагаспадарчай вытворчасці і сацыяльнай сферы. Сёння да нашых карэнных жыхароў далучыліся больш за 300 сем'яў, перасяленых з чарнобыльскай небяспечнай зоны.

Мазыршчына жыве, працуе, развіваецца. Ад гараджан не адстаюць вяскоўцы. Умацоўваюцца шэфскія сувязі. Працягваецца дарожнае будаўніцтва. Узводзяцца новыя дамы, магазіны, медыцынскія ўстановы, школы і клубы, гаспадарчыя пабудовы. На прыкладзе вёсак Мялешкавічы, Хамічкі, Лучажэвічы і іншых можна ўбачыць, як мяняюцца да лепшага абрысы сельскіх пасяленняў.

Жыхары Мазыршчыны не толькі старанна працуюць, але і прыгожа адпачываюць. Традыцыйнымі сталі ў горадзе і раёне конкурсы, святы, агляды мастацкай самадзейнасці.

Мазыршчына — край спартыўны. Усеагульнай любоўю карыстаецца ў мазыран гарадскі футбол, праслаўлілі свой горад вольныя грабцы, веласіпедысты. Многія мазыране — спартсмены з'яўляюцца прызёрамі чэмпіянатаў Еўропы і Свету, удзельнікамі Алімпійскіх гульняў. Нашай гордасцю з'яўля-

ецца і клуб парашутыстаў, які выраслі нямала класных майстроў. Ніводнае агульнагарадское свята не абыходзіцца без іх.

Любячы і шануючы сваю малую радзіму, жыхары Мазыршчыны ў думках і справах імкнуцца ў будучыню. Усё, што назапашана гістарычным вопытам і мудрасцю далёкіх продкаў, бацькоў і дзядоў, мы не толькі захаваем, але і абавязкова памножым.

І. Замулка,
старшыня гарвыканкама,

М. Саўчык,
старшыня райвыканкама

Храналогія гісторыі Мазыра і Мазырскага раёна

35—10 тысяч гадоў назад	Эпоха верхняга палеаліту, станаўленне чалавека сучаснага вобліку. З'яўленне першага чалавека на Мазыршчыне.
9—5 тысячагоддзе да н. э.	Эпоха мезаліту. Першае пасяленне чалавека на тэрыторыі Мазырскага раёна.
Канец 5-га — 3-е тысячагоддзе да н. э.	Эпоха неаліту — паселішчы чалавека на Прыпяці, каля вёсак Лубня, Загорыны.
Канец 3-га тысячагоддзя — 8—7 ст. да н. э.	Бронзавы век на тэрыторыі Мазыршчыны. Пасяленне Зарубінецкай і Мілаградскай археалагічнай культуры.
2—1,5 тысячагоддзе да н. э.	Першае пасяленне на тэрыторыі Мазыра (вул. Гогаля).
7—6 ст. да н. э.	Пачатак жалезнага веку на тэрыторыі Мазыршчыны.
6—9 ст. н. э.	Пераход насельніцтва да феадальнага ладу.
9—10 ст. н. э.	Пасяленні дрыгавічоў на тэрыторыі Мазыршчыны (г. Мазыр, вёскі Акулінка, Стрэльск, Барыскавічы, Слабада, Ясенец, Скрыгалаў, Глініца, Махнавічы, Надаткі і інш.).
10—13 ст. н. э.	Эпоха Тураўскага княства.
1155 г.	Першыя летапісныя звесткі пра Мазыр.
1170 г.	Бітва пад Мазыром між князямі Давыдам Расціслававічам і Міхаілам Юр'евічам.
1174 г.	Мазыр захоплены літоўскім князем Скірмундам.
Каля 1130—1192 гг.	Гады жыцця Кірылы Тураўскага.
XII ст.	Першыя дакументальныя ўпамінанні аб в. Скрыгалаў.
1227 г.	Першае з'яўленне пад Мазыром татара-манголаў.
1240 г.	Літоўскі князь Ердвіл разбіў каля Скрыгалава татара-мангольскіх заваёўнікаў.
1241 г.	Мазыр захоплены і спалены татара-манголамі.
1259 г.	Разгром захопнікаў Мазыра, іх паражэнне на р. Акунёўка.
1267 г., 1275 г., 1315 г.	Набегі золатаардынскіх ханаў на літоўскія землі.
40-я гады XIV ст.	Канчатковае ўваходжанне Мазыршчыны ў склад Вялікага княства Літоўскага.
1413 г.	Мазыр становіцца павятовым цэнтрам Мінскага ваяводства.
Каля 1432 г.	Першыя ўпамінанні пра вёскі Міхалкі, Барбароў.
1497 г.	Аблога Мазыра войскам крымскіх татар.
7 мая 1497 г.	Забойства ў Скрыгалаве крымскімі татарамі мітрапаліта Кіеўскага і Усея Русі Макарыя.
1506 г.	Мяцеж М. Глінскага і ўзяцце ім Мазыра.
1509 г.	Першае ўпамінанне пра Мазырскі замак.
1515 г.	Першае ўпамінанне пра в. Прудок.
1521 г., 1534 г.	Набегі на Мазыр і яго ваколіцы крымскіх татар.
1536 г.	Разбурэнне Мазыра трэцяй маскоўскай раццю пад кіраўніцтвам Ф. Аўчыны — Целяпнёва — Абаленскага.
1568 г.	Першыя ўпамінанні пра в. Мялешкавічы.
1566—1569 гг.	Уваходжанне Мазыра ў склад Кіеўскага ваяводства.
1577 г.	Атрыманне Мазыром поўнага Магдэбургскага права.
1592 г.	Суд Галоўнага літоўскага трыбунала над Стэфанам Лованам, мазырскім земскім суддзёй, абвінавачаным у матэрыялізме і атэізме, вальнадумстве.
1601 г.	Вялікі пажар у Мазыры, які знішчыў замак.
1609 г.	Зацверджаны герб Мазыра.

Кастрычнік 1615 г. — 1616 г. Бунт гараджан Мазыра супраць замкавай адміністрацыі.

1645 г. Заснаванне бернардзінскага манастыра ў Мазыры.

1647 г. Заснаванне жаночага каталіцкага манастыра ордэна марнавітак.

20 студзеня 1649 г. Антыфеадальнае паўстанне гараджан Мазыра і сялян навакольных вёсак. Гераічная абарона горада. Штурм і знішчэнне горада войскамі Радзівіла.

1676 г. Апошняе ўпамінанне пра Мазырскі замак.

1736 — 1761 гг. Антыфеадальныя выступленні сялян Мазырскага павета.

1744 — 1745 гг. Заснаванне ў Мазыры жаночага каталіцкага манастыра ордэна цыстэрцыянцаў па вул. Гогаля (помнік архітэктуры барока).

1750 г. Адкрыццё ў Мазыры езуіцкай школы.

1756 г. Паўстанне мазырскіх сялян супраць польскіх феадалаў.

1772 г. Адкрыццё ў Мазыры ніжэйшай трохкласнай школы.

1793 г. Пераход Мазыршчыны ў склад Расійскай імперыі.

1794 г. Высылка ў Салавецкі манастыр Язэпа Яленскага, ураджэнца Мазыршчыны, асветніка, бунтара супраць прыгоннага права, педагога і мысліцеля.

1799 г. Трохкласная ніжэйшая школа ў Мазыры пераўтворана ў павятовую школу.

1800 г. Складзены геаграфічны атлас Мінскай губерні, дзе ўпершыню дадзена падрабязная характарыстыка Мазыра і яго ваколіц.

1803 г. Пераўтварэнне павятовай школы ў вучылішча.

1812 г. Удзел насельніцтва Мазыршчыны ў баявых дзеяннях супраць французскай арміі. Корпус генерала Эртэля ў Мазыры.

1821 г. Адкрыццё ў маёнтку в. Барбароў школы для дзяцей сялян.

30 красавіка 1828 г. Праезд праз Мазыр імператара Расіі Мікалая I з сям'ёй.

1831 г. Удзел мазырскай шляхты і каталіцкага насельніцтва пад кіраўніцтвам Ф. Кяневіча ў паўстанні супраць расійскага панавання і за аднаўленне Рэчы Паспалітай.

1835 г. Адкрыццё першага аднакласнага прыходскага вучылішча ў Мазыры.

1850 г. На Прыпяці з'явіўся першы параход «Вісла».

1853 — 1857 гг. Падарожжа па Беларусі П. М. Шпілеўскага, беларускага этнографа, пісьменніка, публіцыста, апісанае ў некалькіх ягоных кнігах, у т. л. і «Мазыршчына».

1855 г. Адкрыты ў Мазыры чатырохкласны жаночы пансіён.

1859 г. Адкрыццё ў Мазыры мужчынскай гімназіі — першай на Палессі сярэдняй навучальнай установы.

Сярэдзіна XIX ст. Пабудова ў в. Барбароў палаца і пейзажнага парку на плошчы 5 га.

1863 г. Хваляванні сярод шляхты і каталіцкай часткі жыхароў Мазыршчыны ў падтрымку паўстання ў Польшчы і Беларусі пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага.

6 чэрвеня 1864 г. Пакаранне смерцю ў г. Казань ураджэнца Мазыра Іераніма Кяневіча — аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863 г.

1863 — 1865 гг. Адкрыццё народных вучылішчаў для дзяцей сялян у мястэчку Скрыгалаў, вёсках Мялешкавічы, Барбароў, Сідзельнікі, Міхалкі, Слабада.

1865 г. Асвяшчэнне сабора св. Міхаіла ў Мазыры.

1 сакавіка 1881 г. Забойства ў Петраградзе членамі народніцкай арганізацыі «Народная воля» цара Аляксандра II, за якое была асуджана і ўраджэнка Мазыра Геся Гельфман.

1889 — 1891 гг. Работа на Палессі археалагічнай экспедыцыі беларускага археолага, прафесара У. З. Завітневіча (ваколіцы Мазыра, вёскі Скрыгалаў, Слабада, Барыскавічы, Надаткі і інш.). Даследаваны звесткі аб жыцці ў IX — XII стст. дрыгавічоў.

1892 г. Вялікі пажар у Мазыры.

1894 — 1896 гг. У Мазыры створана вольнае пажарнае таварыства.

1895 г. Заснаванне ў Мазыры запалкавай фабрыкі «Маланка» — першага прамысловага прадпрыемства.

Красавік 1896 г. Першая забастоўка работніц мазырскай запалкавай фабрыкі «Маланка».

1896 г.	Адкрыццё мазырскага піваварнага завода.
Май 1897 г.	Адкрыццё капліцы ў мястэчку Скрыгалаў і помніка на беразе возера — месцы забойства ў 1497 г. мітрапаліта Кіеўскага і Усея Русі Макарыя крымскімі татарамі.
1899 г.	Пачатак дзейнасці ў Мазыры і на Палессі народніцкай арганізацыі «Трудовая воля».
1900 г.	Заснавана Мазырская друкарня.
26 кастрычніка 1902 г.	Створаны ў Мазыры гарадскі камітэт РСДРП.
1902 г.	Адкрыццё ў Мазыры фабрыкі «Прыма».
Студзень 1904 г.	Першая палітычная стачка мазырскіх рабочых.
Май 1904 г.	Забастоўка рабочых Мазыра.
25 студзеня 1905 г.	Данясенне памочніка начальніка Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў дэпартамент паліцыі аб стачцы фабрычных рабочых Мазыра.
1 красавіка 1905 г.	Стачка рабочых запалкавай фабрыкі ў Мазыры.
25 красавіка 1905 г.	Дэманстрацыя рабочых запалкавай фабрыкі.
26 сакавіка 1905 г.	Забастоўка і дэманстрацыя рабочых у Мазыры.
11 мая 1905 г.	Забастоўка і дэманстрацыя рабочых запалкавай фабрыкі «Маланка».
27 мая 1905 г.	Забастоўка рабочых фанернай фабрыкі «Прыма».
21 ліпеня 1905 г.	Дэманстрацыя моладзі і навучэнцаў гімназіі ў Мазыры.
21 жніўня 1905 г.	Забастоўка батракоў у в. Дудзічы Мазырскага павета, хваляванні сялян вёсак Міхалкі, Прудок, Рудня.
17—26 кастрычніка 1905 г.	Усеагульная кастрычніцкая палітычная забастоўка рабочых Мазыра.
30 кастрычніка — 7 лістапада 1905 г.	Утрыманне ўлады Мазырскім рэвалюцыйным камітэтам, т. зв. «Мазырская рэспубліка».
5 лістапада 1905 г.	Дэманстрацыя і ўзброеныя сутычкі рабочых з паліцыяй у Мазыры.
Сакавік 1906 г.	Байкот рабочымі запалкавай фабрыкі акцыянернага таварыства «Маланка» ў Мазыры. Выбары ў Дзяржаўную думу.
19 студзеня 1907 г.	Лакаўт на запалкавай фабрыцы «Маланка».
3 чэрвеня 1907 г.	Забастоўка рабочых фанернай фабрыкі «Прыма».
1907 г.	Першы прыём навучэнцаў у Мазырскую рамесную школу.
1907 г.	Адкрыццё чатырохкласнага начальнага вучылішча ў Мазыры.
1911 г.	Адкрыццё ў Мазыры жаночай гімназіі.
Студзень, сакавік 1914 г.	Забастоўкі рабочых у Мазыры.
1 жніўня 1914 г.	Уступленне Расіі ў першую сусветную вайну. Масавая мабілізацыя жыхароў Мазыршчыны на фронт.
Жнівень, верасень 1914 г.	Хваляванні мабілізаваных на вайну сялян. 60 удзельнікаў асуджаны ваенна-палявымі судамі. Тры чалавекі за разгром маёнтка ў в. В. Бокаў павешаны 18.12.1914 г.
1915 г.	Пабудаваны завод «Кіпратэх» на ст. Мазыр (цяпер дрэваапрацоўчае аб'яднанне).
1915 г.	Пабудаваны развадны мост цераз Прыпяць.
Ліпень 1915 г.	Забастоўка рабочых фанернай фабрыкі «Прыма» з патрабаваннем павысіць аплату працы.
1916 г.	Пабудаваны чыгуначны мост цераз Прыпяць і чыгунка Калінкавічы — Корасцень.
Люты 1917 г.	Сходы і мітынгі жыхароў Мазыршчыны з выпадку Лютаўскай рэвалюцыі ў Петраградзе.
Сакавік 1917 г.	Утварэнне Мазырскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.
Красавік 1917 г.	Утварэнне валасных Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мазырскага павета.
8 красавіка 1917 г.	Прынята рашэнне Мазырскага Савета аб увядзенні 8-гадзіннага рабочага дня.
29 красавіка 1917 г.	Адбыўся 1-шы з'езд сялян Мазырскага павета. Прыняцце рашэння аб перадачы ўсёй зямлі сялянам.
Красавік 1917 г.	Стварэнне аб'яднанай арганізацыі РСДРП у Мазыры.
Май 1917 г.	Пачала выходзіць газета «Известия Мозырского Совета рабочих и солдатских депутатов».
Май 1917 г.	Створана бальшавіцкая ячэйка на фабрыцы «Маланка».
Май 1917 г.	Адбыўся 2-гі з'езд сялян Мазырскага павета.
Май 1917 г.	Сяляне в. Рудня Мазырскага павета прынялі рашэнне «бесплатно изъять помещичьи, монастырские, церковные, кабинетские и др. земли».

Чэрвень 1917 г.	Забастоўка рабочых лесапільна-фанернага завода Бермана ў Мазыры.
Чэрвень 1917 г.	Адбыўся 3-ці з'езд сялянскіх дэпутатаў павета.
5—6 верасня 1917 г.	Адбыўся 4-ты з'езд сялянскіх дэпутатаў павета.
Верасень — кастрычнік 1917 г.	У Мазырскім павеце адбылося больш як 20 сялянскіх выступленняў з патрабаваннем перадачы сялянам памешчыцкіх, царкоўных і ўдзельных земляў.
6—7 кастрычніка 1917 г.	Адбыўся 5-ты сялянскі з'езд Мазырскага павета, які прыняў рэзалюцыю аб канфіскацыі памешчыцкай зямлі.
11 лістапада 1917 г.	Стварэнне Мазырскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, які ўзяў уладу і арганізаваў работу па стварэнні новага бальшавіцкага Савета. Пачатак устанаўлення Савецкай улады на Мазыршчыне.
Студзень 1918 г.	Стварэнне народнай міліцыі ў Мазыры.
Сакавік 1918 г.	Акупацыя Мазырскага павета нямецкімі і пятлюраўскімі войскамі. Увядзенне ваеннага становішча і акупацыйнага рэжыму. Актывізацыя бальшавіцкага падполля.
Лета — восень 1918 г.	Разгортванне партызанскага руху на Палессі, дзейнасць Слабадскога, Скрыгалаўскага і Мялешкавіцкага партызанскіх атрадаў.
21 снежня 1918 г.	Перагаворы ў Мазыры прадстаўнікоў савецкага ўрада Д. З. Мануільскага, В. Р. Мянжынскага, Д. Гурэвіча з нямецкімі ўладамі аб аднаўленні Савецкай улады. З вялікай прамовай перад жыхарамі горада выступіў Мануільскі. Часці Чырвонай Арміі ўступілі ў горад.
Канец снежня 1918 г.	Улада ў Мазыры перайшла ў рукі пятлюраўскай дырэкторыі. Рэўкам пачаў падпольную дзейнасць. Актывізацыя падпольшчыкаў і партызан.
Снежань 1918 г.	У Мазыры створана камсамольская арганізацыя.
31 снежня 1918 г.— 1 студзеня 1919 г.	Арганізацыя Саветаў у Мазырскім павеце.
1 студзеня 1919 г.	Уваходжанне Мазыра і павета ў склад БССР.
11 студзеня 1919 г.	Чырвоная Армія ўступіла ў Мазыр. Аднаўленне Савецкай улады ў павеце. Стварэнне камітэтаў беднаты ў вёсках, у в. Слабада — саўгаса.
25 студзеня 1919 г.	Адбыўся першы сялянскі з'езд Мазырскага павета, які прыняў рашэнне — сабраць прадукты для галадаючага пралетарыяту Піцера і Масквы.
30 сакавіка — 10 красавіка 1919 г.	Горад Мазыр і частку павета захапілі пятлюраўцы. Масавыя грабяжы і забойствы. Баі Чырвонай Арміі супраць дырэкторыі.
11 красавіка 1919 г.	Адноўлена дзейнасць Мазырскага рэвалюцыйнага камітэта.
Красавік 1919 г.	Пачатак белапольскай акупацыі Палесся. Пагроза захопу Мазыра, яго абарона.
Ліпень — жнівень 1919 г.	Абарона Палесся. Фарміраванне Прыпяцкай ваеннай флатыліі, Мазырскага стралковага палка.
З 10 жніўня 1919 г.	У горадзе і павеце аб'яўлена асаднае становішча.
Верасень 1919 г.— сакавік 1920 г.	Баі на заходніх рубяжах Мазыршчыны. Многія вёскі некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі.
5 сакавіка 1920 г.	Белапалякі захапілі Мазыр. У баі з белапалякамі загінуў камісар брыгады 47-й дывізіі М. С. Данілеўскі, дзяржаўны і ваенны дзеяч Украіны.
Сакавік — чэрвень 1920 г.	Дзейнасць мазырскіх падпольшчыкаў і партызанскіх атрадаў Палесся.
6 чэрвеня 1920 г.	Смяротныя пакаранні групы падпольшчыкаў польскімі ўладамі.
29 чэрвеня 1920 г.	Вызваленне Мазыра ад белапольскіх захопнікаў войскамі беларуска-літоўскай Чырвонай Арміі.
29 чэрвеня 1920 г.	Арганізавана Упраўленне мазырскай міліцыі.
1 ліпеня 1920 г.	Вызваленне ад польскіх захопнікаў вёсак Слабада, Скрыгалаў, Казіміраўка.
8 ліпеня 1920 г.	Вызваленне ад польскіх захопнікаў вёсак Асавец, Глініца.
18 жніўня 1920 г.	Адбыўся з'езд валасных ваенна-рэвалюцыйных камітэтаў Мазырскага павета, які прыняў рэзалюцыю аб аказанні падтрымкі Чырвонай Арміі ў барацьбе з белапольскімі акупантамі.
1 верасня 1920 г.	У Мазыры адбылася канферэнцыя беспартыйных жанчын-сялянак.
10 лістапада 1920 г.	Мазыр і павет захоплены бандамі С. Булак-Балаховіча.

20 лістапада 1920 г. Вызваленне Мазыра войскамі Чырвонай Арміі ад банд Булак-Балаховіча.

25 снежня 1920 г. Адбыўся з'езд работнікаў зямлі і лесу, дзе абмеркаваны задачы сельскагаспадарчай вытворчасці і лесаводства ў павеце.

5 студзеня 1921 г. Скасаванне павятовага і валасных ваенна-рэвалюцыйных камітэтаў. Перадача ўлады мясцовым Саветам.

Май 1921 г. У Мазыры пачала выходзіць мясцовая газета.

Снежань 1922 г. Адбыўся 7-мы з'езд Саветаў Мазырскага павета, які абмеркаваў пытанні ўзнаўлення эканомікі.

1922—1924 гг. Стварэнне першых калектыўных гаспадарак валодання зямлёй: арцеляў «Сіла» (в. Прудок), «Чырвоная зорка» (в. Лешня), камуны «Міна» (в. Хамічкі), калгаса «Серп і молат» (в. Барбароў).

3 лістапада 1922 г. Адбыўся першы павятовы з'езд сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі.

1922 г. Пачатак работы адноўленай фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» (былая фабрыка «Прыма»).

6 лістапада 1922 г. Адбыўся сход сялян Слабадской воласці Мазырскага павета.

Сакавік 1923 г. Адбылася 6-я павятова-гарадская партыйная канферэнцыя ў Мазыры.

Кастрычнік 1923 г. Адбылася 7-я павятова-гарадская партыйная канферэнцыя ў Мазыры.

Снежань 1923 г. Адбыўся 8-мы павятовы з'езд Саветаў.

17 ліпеня 1924 г. Ліквідаваны ў Беларусі паветы і воласці. Утворана Мазырская акруга і Мазырскі раён.

Лістапад 1924 г. Створана ў Мазыры кавальская майстэрня (цяпер завод «Мазырсельмаш»).

1925 г. Пачала дзейнічаць Палеская пясчаная сельскагаспадарчая станцыя ў в. Скрыгалаў.

1926—1927 гг. Цэнтр раёна знаходзіўся ў в. Слабада.

1926 г. Адкрыццё ў Мазыры педагагічнага тэхнікума.

9 чэрвеня 1927 г. Пастанова ЦВК і СНК БССР аб узбуйненні Мазырскай акругі.

1927 г. Створана арцель па вырабе панчох (трыкатажная фабрыка).

1928 г. Створана арцель «Молат» у Мазыры.

1 студзеня 1929 г. Узнагароджанне ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР перадавых прадпрыемстваў — завода «Чырвоны Кастрычнік» і в. Мялешкавічы.

1929—1932 гг. У Мазыры пабудаваны клуб-тэатр (цяпер гарадскі будынак культуры) — помнік архітэктуры канструктывізму.

1930 г. Арганізавана машынна-трактарная станцыя ў в. Слабада.

1932 г. Адкрыццё першай у БССР транспартнай авіялініі Мінск — Глуск — Парычы — Мазыр.

1932 г. Пачалося будаўніцтва жылых дамоў у пас. Пхоў.

1932 г. Пераўтварэнне пясчанай станцыі ў в. Скрыгалаў у сельскагаспадарчы тэхнікум.

25 сакавіка 1935 г. Адкрыццё ў Мазыры калгасна-саўгаснага тэатра (у 1938—1941 гг. Палескі абласны драматычны тэатр).

1936 г. Пераўтварэнне сямігадовых школ у вёсках Слабада і Міхалкі ў сярэднія.

1936—1938 гг. Масавае перасяленне хутароў у вёскі.

1936 г. Пачаўся кругласутачны рух параходаў па Прыпяці.

1937 г. Адкрыццё ў Мазыры двухгадовай школы медсясцёр (цяпер медыцынскае вучылішча).

15 студзеня 1938 г. Утварэнне Палескай вобласці з цэнтрам — г. Мазыр.

1939 г. Створана ў Мазыры аб'яднанне «Мазырсельбуд».

22 жніўня 1941 г. Акупацыя нямецка-фашысцкімі захопнікамі Мазыра і Мазырскага раёна.

Жнівень—кастрычнік 1941 г. Дзейнасць Мазырскага партыйна-патрыятычнага падполля.

Стварэнне і дзейнасць партызанскіх атрадаў (Мазырскага, Махнавіцкага і інш.).

Восень 1941 г.—зіма 1942 г. Масавае знішчэнне мірных жыхароў Мазыршчыны нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Студзень 1942 г. Расстрэл групы мазырскіх падпольшчыкаў.

Верасень — снежань 1942 г. Разгром асноўных сіл Мазырскага падполля.

18 лістапада 1942 г. Каля в. Барбароў цераз Прыпяць з баямі перапраўліся партызанскія злучэнні С. Каўпака, А. Сабурава

	і А. Фёдарава для арганізацыі ўсенароднай барацьбы з ворагам.
Люты 1943 г.	У лясах Мазыршчыны пачалася арганізацыя партызанскіх атрадаў.
22 сакавіка 1943 г.	Знішчаны з насельніцтвам вёскі Казіміраўка (372 чал.), Буда Казіміраўская (131 чал.).
25 красавіка 1943 г.	Сфарміраваны склад Мазырскага падпольнага райкама КП(б) Беларусі.
Май 1943 г.	Створаны падпольны райкам ЛКСМБ.
4 чэрвеня 1943 г.	Разгром нямецкага гарнізона ў в. Скрыгалаў.
5 чэрвеня 1943 г.	Знішчана фашыстамі в. Спрымачоў (больш за 100 чал.).
30 чэрвеня 1943 г.	Знішчана з насельніцтвам фашыстамі в. Касцюковічы (162 чал.).
30 жніўня 1943 г.	Знішчаны нямецкі гарнізон ў в. Шчакатава.
Лета і восень 1943 г.	Масавыя дыверсіі партызан на чыгункі.
Верасень 1943 г.	Партызанскія атрады Мазыршчыны аб'яднаны ў Мазырскую партызанскую брыгаду імя Аляксандра Неўскага.
8 студзеня 1944 г.	Пачатак Калінкавіцка-Мазырскай аперацыі.
9 студзеня 1944 г.	Вызваленне вёсак Іванкаўшчына і Мялешкавічы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
11 студзеня 1944 г.	Вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вёсак Скрыгалаў, Слабада, Барбароў, Прудок, Міхалкі.
14 студзеня 1944 г.	Вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Мазыра. Мітынг на цэнтральнай плошчы ў гонар вызвалення.
15 студзеня 1944 г.	Салют у Маскве ў гонар вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Прысвоена найменне «Мазырскіх» 18 злучэнням і часцям 61-й арміі і 16-й паветранай арміі Беларускага фронту.
Студзень 1944 г.	Сфарміраваны кіруючыя партыйныя і камсамольскія органы, адноўлены мясцовыя Саветы, пачатак работы прадпрыемстваў, калгасаў і ўстаноў.
Студзень 1944 г.	Адноўлена работа хлебазавода і электрастанцыі.
23 студзеня 1944 г.	Арцель «Молат» пачала даваць прадукцыю.
Люты 1944 г.	Урад Беларусі прыняў рашэнне аб адкрыцці ў Мазыры настаўніцкага інстытута.
Люты 1944 г.	Работа Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
19 красавіка 1944 г.	Выканкам гарадскога Савета прыняў пастанову аб аднаўленні жылога фонду і камунальных прадпрыемстваў.
20 красавіка 1944 г.	Заснавана швейная фабрыка ў Мазыры.
Май 1944 г.	Прыезд прадстаўнікоў Ульянаўскай вобласці для дапамогі ў аднаўленні народнай гаспадаркі і культуры Мазыршчыны.
1944 г.	Мазырская школа медсясцёр перайменавана ў фельчарска-акушэрскую.
1945 г.	Пачата будаўніцтва рамонтна-экскаватарнага завода (цяпер МЗММ).
1945 г.	Пабудаваны Мазырскі прамкамбінат (цяпер ВМА).
Май 1946 г.	Пушчана ў эксплуатацыю першая чарга Мазырскай ГЭС.
1946 г.	Асвечаны Свята-Міхайлаўскі храм.
Кастрычнік 1947 г.	Заснавана ПТВ-68 будаўнікоў.
1948 г.	Пачата будаўніцтва дрэваапрацоўчага камбіната.
7 лістапада 1949 г.	Адкрыццё ў Мазыры краязнаўчага музея.
1950 г.	Адноўлены даваенны ўзровень сельскагаспадарчай вытворчасці. Насельніцтва з зямлянак пераселена ў пабудаваныя дамы.
1950 г.	Пачатак уз'яднання дробных калектыўных сельскіх гаспадарак.
Верасень 1952 г.	Пераўтварэнне Мазырскага настаўніцкага інстытута ў педагагічны інстытут імя Н. К. Крупскай.
8 студзеня 1954 г.	Скасавана Палеская вобласць. Г. Мазыр і раён уключаны ў склад Гомельскай вобласці.
1956 г.	Завершана ўз'яднанне дробных калектыўных сельскіх гаспадарак.
Май 1956 г.	Створана ў Мазыры фабрыка мастацкіх вырабаў.
1958 г.	Пачалося будаўніцтва рачнога порта.
1958 г.	Прынята рашэнне аб арганізацыі ў Мазыры завода «Мазыркабель».

Кастрычнік 1959 г. Атрымана першая прадукцыя на заводзе «Мазыркабель».

Снежань 1958 г. Адкрыўся рух па жалезабетонным мосце цераз р. Прыпяць.

1960 г. Створаны саўгас «Мазырскі».

Снежань 1962 г. Узбуйненне Мазырскага раёна. Далучана 28 населеных пунктаў.

1962 г. Створаны Мазырскі лясгас.

1963 г. Пачаты работы па праектаванні ў Мазыры нафтаперапрацоўчага завода.

19 лістапада 1963 г. Заснаваны Мазырскі політэхнічны тэхнікум.

1964 г. Створаны саўгас «Каменка».

1964 г. Кабельны завод выйшаў на праектную магутнасць.

1964 г. Пабудаваны корпус фабрыкі мастацкіх вырабаў.

Снежань 1964 г. Закончана будаўніцтва буйнейшага ў БССР рачнога порта Пхоў. Цяпер порт Мазыр.

1965 г. Створана Мазырская міжкалгасная будаўнічая арганізацыя (цяпер МПМК-105).

1965 г. Пачаў працаваць у Мазыры малочны завод.

1966 г. Заснавана ў Мазыры ГПТВ-84.

1969 г. Адкрыццё ў Мазыры музычнага вучылішча.

1970 г. Сфарміравана дырэкцыя і пачата будаўніцтва ЦЭЦ.

14 студзеня 1970 г. Створаны ў Мазыры трэст № 6 «Мазырнафтахімбуда» (цяпер КПФ «Трэст № 6»).

1971 г. Пачата будаўніцтва нафтаперапрацоўчага камбіната.

1971 г. Узнагароджанне МПМК-105 ордэнам «Знак Пашаны».

1971 г. Пачата будаўніцтва мікрараёна НПЗ.

1971 г. Створана вытворчае дрэваапрацоўчае аб'яднанне «Мазырдрэў».

1971 г. Мазырскі прамкамбінат пераўтвораны ў мэблевы. Створана мэблевае аб'яднанне.

1972 г. Узведзены новы будынак бібліятэкі імя Пушкіна.

1972 г. Уведзена ў эксплуатацыю 1-я чарга завода зборнага жалезабетону № 12.

1973 г. Узведзены новы будынак швейнай фабрыкі.

1973 г. У в. Ляхаўцы створана Мазырская птушкафабрыка.

14 студзеня 1974 г. Пуск ЦЭЦ у Мазыры, першая турбіна магутнасцю 60 тыс. квт. дала ток.

1974 г. Пачата будаўніцтва трамвайнай лініі ў г. Мазыры.

1974 г. Узведзены будынак аўтавакзала.

1974 г. Пачата будаўніцтва солевыварачнага камбіната.

1975 г. На СВК прабурана першая свідравіна.

30 студзеня 1975 г. Пуск 1-й чаргі Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода.

31 студзеня 1975 г. Атрыманы першы палескі бензін.

1975 г. Завод «Мазырсельмаш» атрымаў назву завод «Мазырптушкамаш».

1975 г. Створана міжгаспадарчае прадпрыемства па вытворчасці кармоў «Прыпяць».

1975 г. Пабудаваны корпус цэха мантажных правадоў завода «Мазыркабель».

1975 г. Пушчана ў эксплуатацыю другая турбіна на Мазырскай ЦЭЦ магутнасцю 130 тыс. квт.

1975 г. Прынята пастанова аб будаўніцтве завода кармавых дражджэй (ЗКД).

1976 г. Арганізавана ГПТВ-131.

1976 г. Узведзены новы будынак палітэхнікума.

1976 г. Перабазіравана з суседняга раёна ў пас. Крынічны Палеская сельскагаспадарчая доследная станцыя.

1976 г. Створана ў пас. Крынічны эксперыментальная база «Крынічная».

1976 г. Адкрыццё ў в. Гурыны раённай карціннай галерэі — філіяла Беларускага Дзяржаўнага мастацкага музея.

1977 г. Узведзены мемарыяльны комплекс Курган Славы.

1978 г. Узведзены новы будынак аэрапорта ў Мазыры.

1979 г. Пабудаваны санаторый-прафілакторый трэста № 6 на 100 ложкаў.

1979 г. Пачата будаўніцтва ЗКД з удзелам дзяржаў СЭУ.

1979 г. У Мазыры пабудаваны бальнічны комплекс.

1980 г. Узведзены новы будынак медвучылішча.

1981 г. На НПЗ атрыманы першы парафін.

2 снежня 1982 г. На Мазырскім заводзе па вытворчасці солі (СВК) атрымана першая соль.

1982 г. Узведзены новы будынак Мазырскага педагагічнага інстытута.

Храналогія гісторыі Мазыра і Мазырскага раёна

1982 г.	Пабудаваны рачны вакзал.
30 снежня 1983 г.	Атрымана першая прадукцыя на ЗКД.
1983 г.	Пачата будаўніцтва моста цераз Прыпяць каля в. Навікі.
1984 г.	Адкрыццё ў Мазыры кінатэатра «Мір».
1984 г.	Узведзены новы будынак музвучылішча.
1984 г.	Пабудавана стаматалагічная паліклініка ў Мазыры.
30 снежня 1985 г.	Атрыманы першыя грануляваныя дрожджы на ЗКД.
1985 г.	Рэканструявана цэнтральная плошча імя У. І. Леніна.
1986 г.	Пачата будаўніцтва Палаца культуры НПЗ.
1986 г.	Створана ПТВ-228 хімікаў.
1986 г.	Створаны завод па рамонце бытавой тэлеапаратуры.
26 красавіка 1986 г.	Аварыя на Чарнобыльскай АЭС, у выніку якой Мазыр і вёскі Мазырскага раёна аказаліся забруджанымі радыенуклідамі.
1987 г.	На праектную магутнасць выйшаў СВК.
Жнівень 1988 г.	Пачаўся рэгулярны трамвайны рух у Мазыры.
Студзень 1989 г.	Пачала дзейнічаць Мазырская агароднінная фабрыка.
31 верасня 1989 г.	Адбыўся марш-пратэст «Чарнобыльскі шлях» і мітынг жыхароў Мазыра.
1990 г.	Пабудаваны другі мост цераз Прыпяць каля в. Навікі.
1991 г.	Пабудавана сярэдняя школа № 14 у Мазыры.
1993 г.	Мазырскі філіял праектнага інстытута «Гомельграмадзянпраект» пераўтвораны ў самастойны праектны інстытут «Палессепраект».
1994 г.	Пабудавана сярэдняя школа № 15 у Мазыры.
1994 г.	Пачата перапрафіліраванне завода кармавых дражджэй.
19 студзеня 1995 г.	Асвечана Свята-Мікалаеўская царква ў Мазыры.

14996
Мозырская городская ЦБС

Змест

Да чытача	17-20
ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ	
Пра што расказалі курганы	21-31
У складзе Кіеўскай Русі	32-35
У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай	35-49
У складзе Расійскай імперыі	49-63
Напярэдадні буры	63-81
Слаўныя імёны	81-92
З гісторыі вёсак	92-102
У АГНІ РЭВАЛЮЦЫЙ І ВОЙНАЎ	
За ўладу Саветаў	103-110
Адпор інтэрвентам	110-141
Ваеннаслужачыя і мірныя жыхары Мазыршчыны, якія загінулі ў гады першай сусветнай і грамадзянскай войнаў (1914-1920)	141-143
Загінуўшыя землякі, месца нараджэння якіх не ўстаноўлена	143-144
ПАД ЗНАКАМ СЯРПА І МОЛАТА	
Змаганне за сацыялізм	144-168

Трагедыя народа	169-189
Загінулі ў 1939-1940 гг.	189-190
ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ	
У прыфрантавой паласе	191-197
Чорныя дні акупацыі	197-204
Ахвяры фашысцкага тэрору	204-235
Не скарыліся ворагу	235-250
Уздзельнікі антыфашысцкага падполля, якія змагаліся на Мазыршчыне і загінулі на тэрыторыі раёна і за яго межамі	250-253
Мазыршчына партызанская	253-277
Жыхары Мазыршчыны, якія змагаліся ў партызанскіх атрадах і загінулі на тэрыторыі раёна і за яго межамі	277-287
Вызваленне	287-311
Савецкая ўлада вяртаецца	311-314
Баявая слава Мазыршчыны	314-318
Воіны Чырвонай Арміі і партызаны, якія загінулі ў баях за вызваленне Мазыршчыны ў 1941-1944 гг. І пахаваны на тэрыторыі раёна	318-354
Прапалі без вестак пры вызваленні Мазыра 11-12 студзеня 1944 г.	354-355

Воіны Чырвонай Арміі – землякі, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны загінулі, прапалі без вестак і памерлі ад ран	355-479
Грамадзяне, чыё дакладнае месца нараджэння не ўстаноўлена, якія былі прызваныя Мазырскім ваенным камісарыятам і загінулі, памерлі ад ран або прапалі без вестак у 1941-1945 гг.	480-484
Праз пяцьдзесят гадоў	484
ПЯЦЬ МІРНЫХ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯЎ	
Поступ працоўных будняў	485-503
Імі ганарыцца Мазыршчына	503-511
Тут іх карані	511-526
Героі і ахвяры	526-530
Мазыране, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў у радах Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту	530-534
Духоўныя скарбы Мазыршчыны	534-548
Помнікі гісторыі	548-553
Паміж мінулым і будучым	553-559
Храналогія гісторыі Мазыра і Мазырскага раёна	559-566